# Барыс
# САЧАНКА

*Выбранае*

**1**



# Барыс
# САЧАНКА

Выбраныя
творы
ў трох
тамах

# 1

# Барыс
# САЧАНКА

# Вялікі
# Лес

*Раман у трох кнігах*

**КНІГА ПЕРШАЯ**
**І ДРУГАЯ**

Мінск
«Мастацкая
літаратура»
1993

ББК 84Бел7
С22
УДК 882.6-31

*Прадмова Серафіма Андраюка*

С $\frac{4702120200-100}{М302(03)-93}$ 100—93

ISBN 5-340-01225-5 (Т. I)
ISBN 5-340-01224-7

© Б. І. Сачанка, 1993
Прадмова. С. А. Андраюк, 1993

## I лёс пакалення

Барыс Сачанка ў сваіх «Думках уроссып» аднойчы запісаў: «І яшчэ дзень адзін адышоў, кануў у вечнасць. Здаецца, нічога асаблівага і не зрабіў я ў гэты дзень. І ўсё адно шкада яго. Ніколі ж больш ён не вернецца, не паўторыцца». Быццам усё проста і зразумела: кожны прайшоўшы дзень — незваротны; ён з тых дзён, якія адпушчаны кожнаму з нас лёсам. Мінуў гэты дзень — і ён страчаны для нас назаўсёды.

У дадзеным выпадку, у адносінах да самога Сачанкі, выказванне набывае яшчэ і свой дадатковы сэнс: «нічога асаблівага і не зрабіў я ў гэты дзень».

Сачанка-пісьменнік вылучаецца выключнай працавітасцю. Нават сярод прадстаўнікоў свайго пакалення. А гэтае пакаленне да лёгкага хлеба не прывыкла. (Дарэчы, як і папярэдняе — ваеннае.) І не толькі таму, што прыпала на гнятлівыя ваенныя і бясхлебныя пасляваенныя гады. «Дома, у роднай вёсцы,— успамінае Барыс Сачанка,— першыя гады (сям'я ў канцы вайны была вывезена ў Нямеччыну.— *С. А.*) таксама жылося не соладка. Пакуль пабудавалі хату, агоралі карову, узбіліся на сякуютакую гаспадарку — хапіла ўсім, а найбольш бацьку — ён захварэў на раматус і праляжаў у бальніцы мала не год, не могучы стаць на ногі...» Падобнае, блізкае гэтаму, напэўна, мог бы сказаць (ды і гаварыў) не адзін празаік ці паэт з пакалення дзяцей вайны. Была і ёсць, думаецца, і прычына іншага характару, прычына больш глыбінная.

Самыя жахлівыя гады сталіншчыны (перадваенныя і першыя пасляваенныя), а таксама фашысцкая акупацыя вытравілі душу народа, духоўнае жыццё імкнуліся давесці (і паспяхова гэта рабілі) да самага нізкага ўзроўню. Яно тагачасным гаспадарам было не патрэбна. У вайну быў адчайны рывок да самасцвярджэння, бо трэба было выжыць. І вось калі стварыліся больш-менш спрыяльныя ўмовы ў сярэдзіне 50-х гадоў, як узнялася, як забурліла духоўная энергія народа. Каб выжыць, каб жыць, арганізм народны трэба было напоўніць духоўнай энергіяй. Прага

духоўнасці вызначала стан грамадства. У найбольшай ступені гэта адчулі, усвядомілі і выявілі пісьменнікі ўдзельнікі вайны і пісьменнікі дзеці вайны. Апошніх потым называлі філалагічным пакаленнем. Менавіта тут, у філалогіі і праз філалогію, літаратуру чэрпалі яны духоўную энергію.

Сачанка піша: «Цэлымі днямі я не выходзіў з бібліятэкі, спачатку сваёй, універсітэцкай, пасля і ленінскай — «Ленінкі», як мы яе называлі. Чытаў. Якраз тады рэабілітавалі многіх пісьменнікаў, і кожны дзень я адкрываў для сябе ўсё новых і новых аўтараў. Сярод іх асабліва многа было беларускіх, пра якіх я чуў краем вуха яшчэ ў школе ад настаўнікаў,— Дубоўка і Хадыка, Скрыган і Зарэцкі, Галавач і Гартны, Чарот і Гарэцкі, Александровіч і Пушча, Дудар і Баранавых, Каваль і Астапенка...»

Напісана гэта было ў верасні 1964 года.

Ужо значна пазней, у 1987 г., у гутарцы з Алесем Бяляцкім пісьменнік скажа: «Няўвага да мінулага свайго народа, да яго гісторыі, культуры, мовы бясследна не праходзіць. Бездухоўнасць — страшная рэч, яна нараджала варвараў, вандалаў, фашыстаў...

Таму, мне думаецца, трэба ўсе сілы кінуць на тое, каб павесці рашучую барацьбу з бездухоўнасцю».

Сёння адносіны да праблемы духоўнасці, як бачым, глыбока свядомыя, гістарычна абгрунтаваныя. Яна бачыцца даволі шырока, пераважна ў плане агульнаграмадскім — як асноўная задача дзейнасці творчай інтэлігенцыі.

Тады ж, у тыя часы, на пачатку творчай дарогі, трэба было духоўна наталіць душу і розум. Яны былі галодныя. То быў голад пакалення, а мо больш дакладна, то быў духоўны голад народа, які пакаленне дзяцей вайны адчула фізічна і выявіла найбольш непасрэдна, адкрыта.

Асабліва інтэнсіўнае духоўнае наталенне адбывалася ў другой палове 50-х гадоў, пасля XX з'езду Камуністычнай партыі, пасля выкрыцця культу асобы Сталіна. Нельга сказаць, што да гэтага душа народа драмала, а розум быў нерухомы. Усенародны ўздым у гады Вялікай Айчыннай вайны разбудзіў глыбінныя духоўныя народныя сілы. У першыя пасляваенныя гады яны стрымліваліся, часам даволі рашуча, жорстка. Але душа народа, душа моладзі жыла, была падрыхтавана прыняць духоўную энергію навакольнага свету, гісторыі. І яна яе актыўна прымала.

Духоўнае наталенне ішло як бы з дзвюх крыніц — нацыянальнай і сусветнай. Адна — нацыянальнае мінулае, нацыянальная гісторыя, другая — сусветная літаратура, набыткі сусветнай культуры. І няхай сабе не дужа працяглы быў тады перыяд духоўнай свабоды, нашай адкрытасці свету і гісторыі. Галоўнае — чалавек адчуў радасць свабоды (хоць сабе і далёка няпоўнай), вялікую радасць жыццятворнага духоўнага

наталення. Гэта засталося. Пазней, у часы не самыя лёгкія для чалавечай свабоды, радасць свабоды і радасць духоўнага наталення жыла і давала жыццё чалавеку і народу. Чакала свае пары, выкарыстоўвала любую магчымасць.

Узятае чужое (народаў іншых і народа свайго) апладняла асабістае — багатае, жывое, балючае, уводзіла яго ў гісторыю нацыянальную, падключала да падзей агульназначнага зместу і сэнсу.

Сёння так усё бачыцца.

Тады ж, напэўна, было жаданне, было імкненне, унутраная неўсвядомленая патрэба. Прычым патрэба не толькі ўзяць, але і аддаць, сказаць.

У вышэйпамянёных «Думках уроссып» ёсць і такое разважанне Барыса Сачанкі:

«Адламала галіну, на якой поўна зялёных яблык. Я як гэтая галіна. Поўна ва мне задум, якія прападуць са мною» (І. Мележ, «Дзённікі. Запісныя кніжкі»).

Колькі іх — гэтых без пары адламаных галін... Ні ў адной, здаецца, літаратуры няма так многа, як у нашай, беларускай... С. Палуян... Цётка... М. Багдановіч... А. Гарун... П. Трус... У. Жылка... Л. Калюга... М. Чарот... П. Галавач... Э. Самуйлёнак... М. Гарэцкі... Я. Купала... Р. Мурашка... З. Астапенка... К. Чорны... С. Крывец... М. Сурначоў... В. Таўлай... Б. Мікуліч... А. Чарнышэвіч... М. Лупсякоў... У. Нядзведскі... А. Сербантовіч... С. Блатун... Сам Іван Паўлавіч Мележ... Ды і пасля яго ўжо... Е. Лось... Р. Семашкевіч... У. Караткевіч... В. Бечык... Колькі няздзейсненых задум, надзей, колькі недапісаных ці і зусім ненапісаных твораў!

Крыўдна і горка! І галоўнае — ніхто нічым памагчы не можа, каб спыніць гэта...

Быццам наканаванне, пракляў нас хто...»

Так бачыць пісьменнік лёс народа — праз лёс літаратуры, праз лёс яе творцаў. Бачанне трагічна-балючае. Але роспачы няма. Няма ні ў Сачанкі, ні ў пакалення, да якога ён належыць. Пра гэта сведчыць творчасць, літаратурна-грамадская дзейнасць, чалавечыя паводзіны.

Зразумела, не толькі сённяшнія. Усе.

Адчуванне (спачатку), усведамленне (пазней і сёння) сваёй адказнасці за духоўны стан народа выклікала жаданне працаваць, рабіць усё для яго, для сваёй зямлі. Рабіць тое, што не зроблена іншымі пакаленнямі, рабіць за тых, хто па той ці іншай прычыне не змог зрабіць таго, што было наканавана яму зрабіць, што мог бы зрабіць, зрабіў бы. Каб не...

Няхай не здасца гэта занадта гучным. Суб'ектыўна пра гэта, можа, ніхто і не думае. Але аб'ектыўна робіцца так. Дастаткова паглядзець на зробленае гэтым пакаленнем. Колькі твораў, кніг...

Адметны і сам характар твораў і творчасці. Нікога з іх (а гэта ж пакаленне філалагічнае), асабліва на пачатку творчага шляху, мастацкасць сама па сабе не цікавіла. Мала хто займаўся эксперыментатарствам, фармальнымі пошукамі. Хоць, зразумела, мастацкая культура іх творчасці даволі высокая, высокая і філалагічная адукаванасць: гэта ж філалагічнае пакаленне. Трэба мець на ўвазе і тое, што на пачатку творчага шляху ўсе яны ў той ці іншай ступені прычыніліся да выдатных здабыткаў літаратуры XX стагоддзя.

І ўсё ж фармальныя мастацкія пошукі іх не захапілі. Ва ўсякім разе больш-менш прыкметна.

Чаму?

Найперш, мусіць, таму, што ўся іхняя асабістая жыццёвая біяграфія з жахлівым ваенна-акупацыйным дзяцінствам і пасляваенным галодна-нішчымным, абарваным юнацтвам не штурхала іх да пошукаў чыста фармальных, да засяроджанасці на чыстай мастацкасці. Сама літаратура, перадваеннымі рэпрэсіямі і ваенным ліхалеццем адарваная і адрываная ад жыватворных зямных крыніц, зусім не мела эстэтычнага грунту, эстэтычнага імкнення займацца чыстай мастацкасцю. Зноў жа чытач, народ беларускі, яго згаладалая душа і апустошаны татальнай уніфікацыяй розум прагнулі жывога жыцця, чорнага хлеба праўды. То быў час, калі інтарэсы агульныя, грамадскія, народныя былі вышэй за ўсё. І яны ні ў якой ступені не супярэчылі інтарэсам асобы, у тым ліку інтарэсам творчай асобы. То было адзінства інтарэсаў і пакаленняў. Адзінства, народжанае жыццём, нашай гісторыяй.

З цягам часу, у працэсе творчага станаўлення, творчага выяўлення асобы, усё больш акрэсліцца непаўторнасць кожнай творчай індывідуальнасці, больш устойлівы характар набудзе адметнасць. Але агульнасць прынцыпаў асноватворных, тых, што вызначаюць узаемаадносіны мастака з рэчаіснасцю, разуменне чалавека ў свеце, характар мастацкага ўзнаўлення жыцця і навакольнага свету, застануцца адзінымі і ў прынцыпе нязменнымі.

Час, жыццёвыя ўмовы, самаадчуванне народнае і творчае, усведамленне свайго прызначэння як бы штурхалі літаратуру, кожнага творцу да непасрэднага дзеяння, да актыўных узаемадачыненняў з жыццём, з духоўна-эстэтычнай атмасферай, з людзьмі іншымі. Кожны пісьменнік, кожны творца наогул не толькі імкнуўся як мага больш узяць — ад жыцця, ад гісторыі, ад літаратуры, але і аддаць — выказаць сваё,— набалелае, перажытае, найперш асабістае. Ды ў гэтым асабістым адбіты быў лёс народны, трагічны і гераічны лёс краіны. Вось гэтая творчая тэндэнцыя актыўнай непасрэднай эстэтычнай аддачы, нягледзячы на індывідуальныя асаблівасці, для гэтага пакалення засталася і па сённяшні дзень.

Пра творчае самаадчуванне сярэдзіны 50-х гадоў Сачанка, напры-

клад, пісаў: «Першая кніга маёй прозы «Дарога ішла праз лес» убачыла свет у 1960 годзе. Тады я, студэнт пятага курса універсітэта, працаваў ужо ў штаце рэдакцыі часопіса «Вожык», рыхтаваўся да абароны дыпломнай работы і амаль не думаў над рознымі «праблемамі, задачамі, цяжкасцямі і складанасцямі», якія ўзнікалі, імкнуўся проста іх пераадольваць. Сказаць па праўдзе, на ўсё астатняе ў мяне не хапала часу — перажытае ў вайну ды і потым аж распірала, прасілася на паперу. І я выбіраў кожную вольную хвіліну, каб пісаць ці чытаць тое, што пісалі іншыя».

Ёсць у гэтай тэндэнцыі і свае пэўныя слабасці: бывае, створанаму не хапае перажытасці, філасофскай асэнсаванасці — што ўзяў, тое і аддаю, не заўсёды суб'ектыўныя адносіны ўзгоднены з аб'ектыўнай жыццёвай асновай творцаў, часамі больш ці менш выразна выяўляюцца сімптомы публіцыстычнасці і агульшчыны. Гэта хвароба, калі можна назваць яе так, агульная, аб'ектыўнага характару. А можа, гэта і не хвароба, а адметнасць, адзнака жыццёвага і творчага лёсу пакалення і яго прадстаўнікоў. Ад лёсу ж нікуды не ўцячэш. Ён твой і ў табе.

Барыс Сачанка — прадстаўнік свайго творчага пакалення. Пра гэта ён сам неаднойчы гаварыў, ганарыцца гэтым пакаленнем.

У прыватнасці, адзначаючы пастаянна дасягненні свайго пакалення ў прозе і паэзіі, пісьменнік падкрэслівае і такое:

«Да гонару свайго пакалення можна сказаць і яшчэ адно: мы мала сварыліся між сабою, мала высвятлялі адносіны адзін да аднаго, мы працавалі. Працавалі дружна, да самазабыцця — кожны з нас нібыта спяшаўся выказаць усё, што ведае, бачыў, перажыў... Гэта мы робім і цяпер».

Так, працавалі і шмат працуюць сёння, па сутнасці, усе з гэтага пакалення. Сачанка — сярод тых, хто асабліва. Зразумела, маецца на ўвазе праца творчая і як вынік яе — кнігі, кнігі...

За 37 гадоў творчасці (першае апавяданне было надрукавана ў 1956 г. у часопісе «Маладосць») выдадзена 40 кніг. Выбраныя творы ў 3-х тамах, якія выходзяць на падыходзе да шасцідзесяцігадовага юбілею пісьменніка (нарадзіўся 15 мая 1936 г.) і куды амаль нічога не ўключана з папярэдніх Выбраных твораў у 2-х тамах, змяшчаюць далёка не ўсё, створанае ім толькі за апошняе дзесяцігоддзе.

І вось перачытваючы творы трохтомніка, суадносячы іх з творамі папярэднімі, разглядаючы іх як творы, напісаныя прадстаўніком пісьменніцкага ці больш шырока — творчага пакалення дзяцей вайны і пасляваеннай нішчымніцы, можна выдзеліць даволі выразныя ідэйна-тэматычныя творчыя лініі ці напрамкі. Па-першае, творы, звязаныя з мінулай вайной. Яны па аб'ёму, па ідэйна-мастацкай значнасці займаюць, відаць, галоўнае месца. Па-другое, творы, якія не толькі сваёй праблематыкай, але і жыццёвым матэрыялам, рэальнай жыццёвай асновай звязаны з су-

часнасцю. Па-трэцяе, гэта ўсё, што звязана з гісторыяй — далёкай ці больш блізкай. У творах публіцыстычных і эсэістычных апошнія дзве лініі пераплятаюцца, часта зліваюцца. Увогуле ж вылучэнне гэтых трох ліній вельмі ўмоўнае.

Пачынаючы з першай кнігі «Дарога ішла праз лес» і да нашых дзён, да рамана «Вялікі Лес», да сучаснай публіцыстыкі, тэма вайны ў творчасці Барыса Сачанкі прысутнічае нязменна.

У сваёй аўтабіяграфіі пісьменнік згадвае: «Помню барвовыя пажарышчы на ўсё неба, плач асірацелых дзяцей, жахлівыя размовы пра немцаў, пра тое, што ўсіх нас чакае тут, у акупіраванай ворагам вёсцы... Потым прыйшлі і самі немцы — пачалося жыццё, поўнае трывогі і страху. Па вечарах выюць сабакі — значыць, уночы з лесу прыйдуць партызаны. Пасля партызан удзень абавязкова прыедуць з Хойнікаў карнікі і будуць расстрэльваць тых, хто чым-небудзь памагае партызанам. Зноў усю вёску зганяць на майдан да клуба, зноў будуць апытваць людзей і зноў забіваць... Маці мая ўвесь час калоціцца і за сябе, і за пецярых дзяцей, якія не падымуць яшчэ і адзін аднаго,— бацька ж на фронце! — і за таго старога яўрэя, што кожны раз, як прыязджаюць немцы, прыбягае хавацца да нас на гарышча, пад ляжак... У хаце холад, есці... няма чаго...»

Былі ўцёкі, разам з аднавяскоўцамі, з акружанай фашыстамі вёскі. Была Нямеччына, куды вывезлі ў чэрвені 1943 года ўсю сям'ю.

І ці трэба здзіўляцца, што Сачанка, як і іншыя пісьменнікі і паэты яго пакалення, зноў і зноў вяртаецца да тых незабыўных у жыцці народа і ў жыцці асабістым дзён. Вяртаецца, каб хоць у малой ступені пазбыцца цяжару ўспамінаў пра тыя дні, каб праз шмат гадоў усё ж разабрацца ва ўсёй складанасці і заблытанасці нацыянальнай драмы, каб словам сваім прылучыцца да сённяшніх клопатаў чалавецтва аб захаванні міру на нашай планеце.

Пачаўшы з паказу асобных фактаў, падзей, у аснове сваёй драматычных, а то і трагічных, пісьменнік мэтанакіравана ішоў да шырокага эпічнага ўзнаўлення і асэнсавання беларускай вёскі ў гады вайны. На гэтым шляху даволі прыкметнымі вехамі вылучаюцца аповесці «Пакуль не развіднела» (1965), «Апошнія і першыя» (1966), »Аксана» (1968), раман у навелах «Чужое неба» (1969—1973), нарэшце, раман «Вялікі Лес» (1976—1982).

Сёння ў гэтай невычэрпнай, неабдымнай тэме мінулай вайны Сачанку найперш цікавіць драматычны лёс нацыянальнай інтэлігенцыі, нацыянальнай культуры. Тут ён у многіх адносінах выступае першаадкрывальнікам. Творы ягоныя, крытыка-публіцыстычныя артыкулы, эсэ, насычаныя багатым канкрэтным матэрыялам, грунтуюцца на зноў жа салідНай дакументальна-фактычнай аснове, прасякнуты клопатам пра нашу літаратуру, пра нашу культуру.

Асаблівае месца ў творчасці Барыса Сачанкі займае аповесць «Апош-

нія і першыя». У гэтым творы моцна адбілася тое, што сёння называюць «памяць Хатыні». Разам з аповесцю І. Пташнікава «Тартак» (1967) ён, твор гэты, па сутнасці, адкрывае ў нашай літаратуры гэтую трагічную тэму.

Родная вёска Сачанкі ў 1943 годзе была спалена, а жыхары яе выгнаны ў Нямеччыну. А былі ж вёскі, знішчаныя разам з людзьмі. Пра гэта ведалі ўсе — і дарослыя, і дзеці. Дзіцячым розумам, дзіцячым сэрцам успрымалася ўсё гэта як штосьці невытлумачальна жахлівае, як насланнё нейкае. І калі пазней Сачанка пісаў пра спаленую разам з яе жыхарамі вёску Рудню (а менавіта пра гэта аповесць «Апошнія і першыя»), то памяць яго жывілі ўспаміны тых гадоў. Было б, відаць, няправільна шукаць рэальнага пацвярджэння ўсіх падзей, сітуацый, якія ёсць у творы. Не ў гэтым прызначэнне мастацкай літаратуры. Галоўнае — праўда чалавечых пачуццяў і перажыванняў у экстрэмальных умовах, праўда агульнай эмацыянальнай атмасферы, адпаведнасць іх таму, што было ў сапраўднасці.

Чытаючы першыя старонкі аповесці, суадносячы іх з тым, што напісана ў аўтабіяграфіі пісьменніка, лёгка заўважыць, што пісаў ён пра асабіста перажытае, адчутае, пабачанае на ўласныя вочы.

У кнізе «Я з вогненнай вёскі...» (у расказах людзей, якія перажылі жахі карных экспедыцый-вынішчэнняў) неаднаразова падкрэслены своеасаблівы ўнутраны стан чалавека, які толькі што глядзеў у вочы смерці, бачыў, як гінулі тыя, з кім ён дагэтуль жыў, як гінуў і сам. Пасля пабачаных і перажытых жахаў амаль у кожнага з'яўлялася адчуванне, што ён застаўся адзін на свеце, больш нідзе нікога жывога няма.

Герой аповесці «Апошнія і першыя» таксама перажывае нешта падобнае. Прыходзячы на папялішча знішчанай разам з людзьмі роднай вёскі, ён думае, што нічога ўжо няма таго, з чым ён зжыўся. «Ёсць толькі хіба вось гэтае папялішча ды шырокае, неабдымнае неба над галавою... Ды яшчэ цішыня... Дзень і ноч цішыня. Так ціха, што, здаецца, нідзе, на ўсім белым свеце, ніхто ўжо не жыве — усіх пастралялі, папалілі немцы. Ні смеху, ні крыку, ні лаянкі — усё супакоіла, прыглушыла смерць».

Або вось яшчэ адчуванне: «Я і сам не ведаў, чаму я ўсе гэтыя дні нават не падумаў ісці шукаць людзей. Я зусім забыўся, што яшчэ дзе, акрамя нашай вёскі і Замошак (суседняй спаленай вёскі.— *С. А.*), могуць быць жывыя людзі».

Тады, калі была напісана аповесць, яшчэ не было кнігі «Я з вогненнай вёскі...», не было іншых пісьмовых сведчанняў людзей, якія неяк выжылі пасля карных экспедыцый.

Адкуль жа тады гэтая праўдзівасць у паказе ўнутранага стану чалавека ў тых жахлівых умовах?

Памяць, учэпістая дзіцячая памяць змагла захаваць сапраўднае аблічча тагачаснага жыцця, аблічча вайны, змагла захаваць атмасферу

тых дзён, своеасаблівасць чалавечых паводзін. Талент дазволіў па-мастацку пераканальна перадаць гэта.

Увогуле ў гэтай аповесці ёсць тыя істотныя якасці, якія заўсёды выклікаюць давер да твора мастацтва — узаемаадпаведнасць зместу і формы, арганічная ўзгодненасць эмацыянальнай атмасферы і ўзноўленых падзей, адпаведнасць характару апавядальнай манеры ўнутранаму стану героя, ад імя якога вядзецца апавяданне. У апавяданні натуральна зліваецца голас хлапчука і голас дарослага мужчыны. Само апавяданне насычана нязбытным чалавечым болем.

Памяць Хатыні — трагічная памяць народная. І як памяць народная, яна невымерная і невычэрпная. Увогуле той жыццёвы вопыт вайны, які выпаў на долю пакалення сённяшніх шасцідзесяцігадовых, унікальны. Жахліва унікальны. Тое, што кожны змог убачыць у жыцці, убачыць у іншых умовах немагчыма. Багацце жыццёвых фактаў самага рознага характару, разнастайнасць падзей, сітуацый — ад трагічных да фарсавых, праяўленні чалавечай псіхалогіі такія, якія ў звычайным жыцці ці ў сто гадоў магчымы. Выключная скандэнсаванасць і сканцэнтраванасць жыццёвага матэрыялу. Матэрыялу рознага характару, рознага ўнутранага зместу, рознай эмацыянальнай насычанасці.

Калі ж мець на ўвазе Сачанку, то для ягонай памяці, ягонага «вывучэння» жыцця, для ягонага духоўна-эмацыянальнага пасталення вялікае значэнне мела Нямеччына. Гэта цэлая гісторыя — выгнанне, жыццё і праца ў няволі на чужыне, вяртанне, вынікі ўсяго гэтага ў пазнейшыя гады. Шмат што ўжо сказана, шмат яшчэ — не. Можа, не будзе і ніколі сказана.

Матыў, тэма «чужога неба» прысутнічае, па сутнасці, ва ўсёй творчасці пісьменніка, напаўняючы яе драматызмам, затоеным сумам і ціхім роздумам. У сённяшніх творах матыў гэты і адпаведны настрой некалькі ўжо прыглушаны.

Асвойваючы, творча ўвасабляючы неабдымна складаную тэму вайны, засяроджваючы асаблівую ўвагу на найбольш «блізкіх» яму падзеях і праявах, тых, што сталі часткай ягонага жыццёвага лёсу, Сачанка ўвесь час усё ж адчуваў нейкае творчае незадавальненне — ад невычарпанасці таго матэрыялу, ад творчай неўвасобленасці больш поўнага ведання, разумення, адчування трагічнага і гераічнага народнага (ды і асабістага) вопыту. Так, відаць, можна вытлумачыць з'яўленне найбольш эпічнага твора пісьменніка — рамана «Вялікі Лес». Твор заняў свае належнае месца ў літаратуры, знайшоў свайго шматлікага чытача, стаў прыкметнай вяхой на творчым шляху самога празаіка.

Адчуванне такое, што ён зняў нейкі цяжар з ягонай душы, з яго лёсу. Цяжар ведаў, памяці, перажытага, цяжар абавязку. Вайна — гэта палярызацыя, яркае выяўленне, актыўнае ўзаемадзеянне і разам моцная ўзаемазалежнасць, глыбінная счэпленасць розных сацыяльных сіл, груп людзей, розных чалавечых лёсаў, асабістых памкненняў. Усё залежна

адно ад другога, непадзельна. Усё выразна акрэслена, бачыцца няўзброеным вокам.

І вось гэтае агульнае цэласнае тагачаснае бачанне, успрыманне рэчаіснасці пісьменніку трэба было ўвасобіць — зняць з душы, забраць з памяці. Але на ўзроўні сённяшніх ведаў, сучаснага ўсведамлення мінулага гэтага ўзнаўлення было ўжо мала. Захацелася карціну ўзбагаціць і пашырыць, падзеі разгарнуць. Атрымалася, што часта пашырэнне і разгортванне не насычалася эмацыянальна, арганічна не ўваходзіла ў свет Вялікага Лесу. Сам жа свет гэты багаты, складаны, рухомы, напоўнены жывымі чалавечымі характарамі. Сачанку ўдалося паказаць вайну як народную — не толькі ў супраціўленні, але і ва ўсёй як складанасці, супярэчнасцях. Гэта вайна палескай вёскі, яе жыхароў, і адначасна вайна Беларусі. Гэта вайна пісьменнікава, якой ён яе захаваў у памяці, у сэрцы.

За Вялікім Лесам выразна бачыцца Вялікі Бор, родная вёска Барыса Сачанкі. Менавіта пра яе так лірычна-ўсхвалявана напісаў ён у сваім рамане «Чужое неба»: «На Палессі, на самым поўдні Беларусі, ёсць куточак зямлі, асабліва мілы, дарагі майму сэрцу. Дзе б ні быў я, куды б ні закінула мяне доля, не-не дый згадаю яго. У радасці і ў журбе, з блізкіх і далёкіх дарог я вяртаюся зноў і зноў туды, дзе сярод старых, пракаветных лясоў і вялізных, неабсяжных балот на пясчанай выспе раскінулася вёска, у якой я нарадзіўся, у якой жыве і сёння мая маці, жывуць браты».

Напісаў у самым пачатку твора, тым самым як бы надаўшы адпаведную танальнасць і вызначыўшы для чытача аўтарскі пункт гледжання на падзеі — адкрыта лірычна-суб'ектыўны.

«Як Антэй, дакрануўшыся маці-Зямлі, набіраўся новых сіл, так і я, наведаўшы родныя мясціны, гаюся, на доўгі час пазбываюся сноў...

Сноў свайго трывожнага, абпаленага нягодамі маленства...»

Словамі гэтымі «Чужое неба» канчаецца. Яны перадаюць асноўны сэнс таго, што турбавала і хвалявала пісьменніка, калі ён пісаў гэты твор, і пра што яму трэба было расказаць чытачу. Расказаць не толькі дзеля таго, каб скінуць цяжар з душы, вызваліць памяць ад пакутлівых успамінаў: такое застаецца з чалавекам да канца дзён яго. Цяжар да канца скінуты не быў. Пісьменнік тут расказаў як бы пра вайну сваю асабістую. Пра вайну іншых, якую ён бачыў і ведаў, пазней напісаў «Вялікі Лес». Але як у адным творы, так і ў другім падзеі ў пераважнай большасці разгортваюцца ў родных мясцінах пісьменніка. Ды не толькі ў гэтых творах. А вялікі нарыс «Зямля маіх продкаў» (1963)? А палеская быль «Агліцкая сталь» (1964) ці «Дыярыуш Мацея Белановіча» (1973)? А «Дзік-бадзяга» (1963) ці тыя ж «Апошнія і першыя»? А творы адной з апошніх кніг «Родны кут» (1989)? А «Запіскі аб радыяцыі» ці «Паездка ў «зону» (1990)? А шматлікія — лепшыя — апавяданні?..

У аснове іх — падзеі (рэальныя ці выдуманыя), якія адбываліся на Палессі. Прырода ў іх палеская, героі — людзі, надзеленыя своеасаблівай паляшуцкай псіхалогіяй, глыбокім арыгінальным розумам, насычаны творы паветрам палескіх лясоў і балот, у іх роднае і чыстае неба бацькоўскай зямлі.

Існуе ў літаратуры (відаць гэта і ў творчасці Барыса Сачанкі) у пэўным сэнсе парадаксальная заканамернасць: чым далей па часе пісьменнік адыходзіць ад сваёй «малой радзімы», тым бліжэй у творчасці падыходзіць да яе. І тут не толькі ўзроставая настальгія. Раней у Сачанкі бачыўся творчы рух як бы ад публіцыстычна-лірычнага захаплення родным кутком зямлі, яго мінулым і сучасным да глыбока гістарычнага, сацыяльна-этнаграфічнага і філасофскага яе спасціжэння. Праўда, у апошні час гэтая творчая заканамернасць парушылася, прычым даволі прыкметна. Пачатак востра публіцыстычны, у многім выкрывальны, эмацыянальны настрой болю, глыбокай узрушанасці вызначаюць сёння лад Сачанкавых твораў.

«Раней ездзіў я ў сваю вёску, каб набрацца сіл, асвяжыць памяць, памаладзець душою, падужэць.

Цяпер пасля паездак дадому падоўгу хварэю. І фізічна, і маральна. Мілы, дарагі куточак — і яго атруцілі, так раптоўна адабралі ў мяне ды і ў многіх, хто нарадзіўся там, жыў...»

Адабралі пасля чарнобыльскай катастрофы, што адбылася ўсяго за якую паўсотню кіламетраў ад роднай пісьменнікавай вёскі. Катастрофа прынесла страшэннае парушэнне ўсёй рэспубліцы, народу. Для Сачанкі ўсё гэта стала асабістым, асабліва балючым. Агульныя лічбы, агульныя разважанні і прагнозы адразу ж афарбоўваліся ў колеры асабістых успрыманняў і перажыванняў.

Прачытаем вось хоць бы гэты запіс з «Запісак аб радыяцыі» (1986—1990):

«Нарэшце, праз тры гады пасля аварыі, надрукавана карта, дзе і якія грыбы можна збіраць. Мае родныя мясціны ў першай зоне, куды, як сказана ў каментарыях, у лес «з кошыкам уваходзіць не трэба». Паўраспад цэзію-137 доўжыцца каля трыццаці трох гадоў... Значыцца, я больш ніколі ўжо не патрымаю ў руках, не з'ем ні баравіка, ні падасінавіка, ні рыжыка, ні якога іншага грыба са свайго лесу. А насіў жа я іх калісьці кашалямі. І калі вучыўся ў школе, ды і потым. Бывала, падхопішся з пасцелі на досвітку, яшчэ нацямочку,— і ў лес. Ідзеш па аднаму табе вядомых сцежках, ад грыбовішча да грыбовішча. Збочыш у малады бярэзнік, потым — на хвойнік. Пашастаеш па ягадніку, верасе, выскачыш на дубняк — «дубіну», як у нас кажуць, і, вядома ж, абтупаеш, аббяжыш граду, дзе растуць надта ж прыгожыя, рэліктавыя баравікі з белым тоўстым коранем і чорнай, проста аксамітнай шапкаю...

Дадому вяртаешся ў позняе снеданне. І паставіўшы кашэль перад сабою, перабіраеш грыбы — адны сушыць, другія смажыць, трэція саліць.

І зноў бачыш сябе ў лесе, успамінаеш, дзе якога грыба браў, як ён сядзеў, як ты яго шукаў...

Няўжо ўсяго гэтага я больш не спазнаю?..»

Боль пытання так зразумелы. Для Сачанкі, пісьменніка і чалавека, знікае цэлы свет, свет для яго самы блізкі і дарагі, свет, з якога ён выйшаў, але які ўзяў з сабою і панёс у сабе, свет, дзе знаходзіліся тыя крыніцы, якія жывілі яго духоўна, жывою вадою загойвалі душэўныя раны і наталялі пачуцці.

Неба дзяцінства, неба бацькоўскай зямлі, такое чыстае, блакітнае і празрыстае, не так даўно яно ўзвышала чалавека, узнімала да жыцця. Паветрам гэтага неба, гэтай зямлі Палесся насычаны лепшыя творы пісьменніка.

Сёння неба гэтае пацямнела, яно гняце чалавека. Зямля тоіць небяспеку. Трывога і неспакой ахоплівае ўсю існасць, боль працінае сэрца.

А як жа Сачанку-пісьменніку?! Ён жа так «прывязаны» ў сваёй творчасці да роднага кутка зямлі, яго людзей, іхніх звычаяў і нораву, да прыроды і гісторыі краю.

Менавіта такая нязменнасць жыццёвых сімпатый надае ягонай творчасці пэўнасць, мэтанакіраванасць і ўстойлівасць, з'яўляецца галоўнай крыніцай яе жыццёвасці і адметнасці, яе ідэйна-мастацкай глыбіні. І пра што б ні пісаў Сачанка, якую б жанравую ці апавядальную форму мастацкага ўзнаўлення ні выбіраў, усё ў канчатковым выніку вырашае ступень заглыбленасці ў канкрэтную жыццёвую аснову, яе ўнутраная, этычная і псіхалагічная, арганічная адпаведнасць пісьменнікаваму светаўспрыманню.

Так было...

Сёння, калі свет рэальны (і ў гэтым вялікім свеце жыццёвы свет пісьменнікаў) парушаны, а над яго (свету) існаваннем Лёс увогуле паставіў пытальнік, гаварыць пра арганічнасць узнаўлення, пра гарманічнасць перастварэння, пра жыццятворнасць пафасу праблематычна. Асабліва для прозы. Час пакажа, якое выйсце знойдзе, які шлях выбера тут мастацтва. Для яго гэта выпрабаванне на жыццёвасць вялікае.

У ранейшых Сачанкавых творах тыя героі былі найбольш прывабныя, цэласныя і жыццёвыя, якія нібы выраслі з роднай ім глебы, неслі ў сабе яе законы, яе дух і сілу. Яны, героі гэтыя, надзелены былі актыўна-гуманнымі адносінамі да жыцця, менавіта з імі быў звязаны аўтараў роздум пра месца чалавека ў сучасным свеце, пра сапраўдныя чалавечыя каштоўнасці.

Шмат давялося перажыць, выцерпець, выпакутаваць Сымону Гарапашку, ягоным родным і блізкім («Чужое неба»). І ў вайну, і пасля вайны. Ды ў складаных жыццёвых стасунках, у нdroўным сутыкненні з жорсткаю сілай абставін надавала ім сілу, веру ў лепшае іхняя любоў

да роднай зямлі, упэўненасць у тым, што толькі яна ўратуе ад любых нягодаў. Маці Сымона, напакутаваўшыся на чужыне, сэрцам, думкамі, усёй сваёй істотай імкнецца дадому. «Хай галодныя, хай голыя — абы дома, на зямельцы сваёй, ля свайго поплава, пад сваім небам».

Сімвалічна, што Трахім, герой аднаго з лепшых апавяданняў Сачанкі «Соль» (1970), памірае ў дарозе, везучы касцам соль. Ягоная жыццёвая дарога заўсёды вяла яго да людзей. Усё, што ні рабіў ён, рабіў не толькі для сябе. Можа, нават менш за ўсё для сябе. У апошнія хвіліны жыцця, у паўзабыцці, Трахім думае, што «недарэмна пражыў сваё жыццё. У вёсцы стаіць зрубленая яго рукамі хата, расце пасаджаны ім сад... У горадзе жыве сын, яго сын Раман, унук Артурык... Паднімаецца ўгору, імкне да святла, да сонца... пасаджаны таксама яго, Трахімавымі, рукамі хвойнік... А колькі пахадзіў ён за плугам, пераараў зямлі! Колькі памалаціў збажыны, нарыхтаваў стагоў сена, памалоў зерня, колькі папасвіў кароў...» І няма тут нічога незвычайнага, хоць трохі выключнага. Звычайнае жыццё звычайнага чалавека, селяніна-працаўніка. Затое якая жыццёвая моц, натуральнасць, пэўнасць!

Сачанка добра бачыць і тое, што нясе час, што нясе навукова-тэхнічная рэвалюцыя простаму чалавеку, як яна, парушаючы звыклы, усталяваны вякамі, склад жыцця, руйнуе і маральныя асновы чалавечага быцця, людской супольнасці.

Глыбока народныя, засвоеныя спрадвеку адносіны да жыцця, да навакольнага свету ўласцівы бабе Адарцы («Навальніца», 1975). Драматызм яе лёсу—у пэўнай несуадпаведнасці бурнага тэхнічнага прагрэсу і ўстойлівага, традыцыйнага чалавечага бытавання і светаўспрымання. Значныя пераўтварэнні ў свеце, як у грамадска-сацыяльных узаемаадносінах, так і ў прыродзе, далёка не заўсёды, а можа, і ніколі, не абыходзяцца без болю для чалавека. За вякі ва ўзаемаадносінах яго з навакольнай прыродай выпрацаваліся пэўныя законы ўзаемаўзгодненасці, натуральнай раўнавагі. І ўсялякае гвалтоўнае парушэнне гэтай раўнавагі, гэтай узаемаўзгодненасці адразу ж адбіваецца і на прыродзе, і асабліва драматычна на чалавеку. Навука ўсведамляе сёння гэта глыбока і востра. Літаратура — не ў меншай ступені. Літаратуру найперш цікавіць і хвалюе духоўны, маральны змест праблемы.

Апавяданне «Навальніца» напісана даўно, яшчэ ў 1975 годзе. Сёння, пасля Чарнобыля, яно чытаецца з асаблівым адчуваннем. У ім бачыцца папярэджанне ад таго, што адбылося, і ад таго, што можа чакаць нас, чакае. Унутранае чалавечае непрыняцце, чалавечая трывога ніколі не бываюць дарэмнымі, не пацверджанымі.

Іншы бок глабальных і разам з тым самых канкрэтных (што называецца на бытавым, штодзённым узроўні) узаемаадносін чалавека з навакольным светам паказаны Сачанкам у адным з самых дасканалых яго апавяданняў «Ваўчыца з Чортавай Ямы» (1975). Пафас твора скіраваны

супроць бяздумна-жорсткіх адносін да свету жывой і нежывой прыроды; тактоўна, неназойліва, усім эмацыянальным ладам і мастацкай логікай сцвярджаецца думка: усялякая бяздушная жорсткасць у адносінах да жывога і нежывога навакольнага свету выклікае жорсткасць у адказ, парушае ўсталяваную ў свеце раўнавагу, пэўнасць. Думка сама па сабе не такая, відаць, ужо і новая. Але ў мастацтве мае сэнс яе канкрэтнае ўвасабленне, мастацкае абгрунтаванне.

Часта здараецца, што той ці іншы празаік ва ўсіх сваіх творах (ці амаль ва ўсіх) распрацоўвае як бы адну асноўную сацыяльна-этычную, псіхалагічную мадэль характару. І гэта ні ў якой меры не недахоп. Бываюць тут дасягненні выключныя. Але ёсць у мастацтве і іншы шлях узаемаадносін з рэчаіснасцю, шлях не менш плённы і ўдзячны — спасціжэнне жыцця ва ўсім яго багацці, у самых розных праяўленнях. Ды і тут можа існаваць таксама пэўны нібыта падзел: аднаго пісьменніка ў жыцці найперш цікавяць якіясьці новыя з'явы, факты; другога — выключныя падзеі, незвычайныя сітуацыі; трэцяга — вострыя канфлікты; чацвёртага — чалавек, ягоныя паводзіны ў самых розных сітуацыях.

Ва ўсіх ягоных творах Сачанку найперш цікавіць чалавек, чалавек часам у самых нечаканых жыццёвых стасунках. Творчасць пісьменніка і прываблівае чытача багаццем жывых чалавечых характараў, разнастайнасцю гісторый, сітуацый. Беручы розныя рэальныя гісторыі, розныя жыццёвыя калізіі, па-мастацку іх распрацоўваючы, даследуючы, Сачанка імі і праз іх правярае і выварае чалавека. І аказваецца, што чалавек гэты вельмі розны, надзвычай па-рознаму сябе паводзіць у неаднолькавых абставінах, у розных сітуацыях. Супрацьстаяць жорсткай сіле абставін, не паддацца іх уладзе ўдаецца не кожнаму. Хутчэй атрымліваецца наадварот: раз паддаўшыся іх уздзеянню, чалавек становіцца поўнасцю падуладны абставінам. А яны мяняюцца пастаянна.

Усю складанасць, увесь драматызм узаемаадносін чалавека са светам абставін, асабліва грамадска-сацыяльных,Сачанка добра пабачыў за пражытыя гады на лёсе свайго пакалення, пакаленняў старэйшых, пералсыў асабіста.

У гэтым сэнсе характэрныя аповесці «Не на той вуліцы» (1970) і «Запіскі Занядбайлы» (1974). З'ява, супроць якой скіраваны творы,— вельмі небяспечная была ў свой час у жыцці грамадства, не менш небяспечная і сёння. З'ява гэтая — бездухоўнасць, спажывецкія адносіны да жыцця. Чалавек, пазбаўлены высокіх духоўных памкненняў, чалавек, які згубіў ці нават не знайшоў у жыцці сваю сапраўдную дарогу, згублены для грамадства, асабіста абкрадзены. Такімі з'яўляюцца і Занядбайла ў сваіх «запісках», і Тарасюк («Не на той вуліцы»). У іх няма ўнутранага духоўнага стрыжня, жыццёвай пэўнасці і ўстойлівасці. Сфармаваны яны ў сваёй сутнасці быццам выпадковасцю. Але выпадковасцю

пэўнага часу, пэўных умоў — умоў таталітарызму, чалавечага бяспраўя, пастаяннага страху, жыццёвай няпэўнасці. Такія людзі ва ўсім падуладны непасрэдным абставінам, больш таго, усяляк імкнуцца выкарыстаць іх дзеля сваіх асабістых мэт. І Тарасюк, і Занядбайла — гэта савецкія абываці, асноўнай зброяй якіх ва ўзаемаадносінах з грамадствам (безумоўна, і з асобнымі людзьмі) з'яўляецца дэмагогія, спекуляцыя высокімі словамі, паняццямі, гульня ў шчырасць і даверлівасць. Такія людзі шкодныя для грамадства, для чалавечай супольнасці не толькі самі сабою. Яны адмоўна ўплываюць на іншых, распаўсюджваюць хваробатворную інфекцыю. Пісьменнікам схоплены ў нашым жыцці цікавы тып чалавечых і грамадскіх паводзін, тып страшэнна шкодны і небяспечны. Дарэчы, гэта відаць яшчэ больш у першапачатковай аўтарскай рэдакцыі аповесці «Не на той вуліцы» (а менавіта яна ўключана ў трохтомнік).

Наперадзе — і для аўтара, і для літаратуры — больш глыбокае, сацыяльна-філасофскае даследаванне і асэнсаванне гэтага характару, гэтай грамадскай з'явы.

Сам пісьменнік гэтым творам (таксама, як і іншым — творам ці мясцінам у творах) выкрывальнага характару надае асаблівае значэнне. Яны для яго дарагія выяўленнем — адкрытым, прамым — ягонай грамадзянскай пазіцыі. Аўтар нібы спадзяецца на непасрэдную жыццёвую рэакцыю, на нейкі станоўчы вынік. Але аб'ектыўныя законы мастацтва не заўсёды падуладны суб'ектыўнай волі пісьменніка, не заўсёды супадаюць з ёю. Законы ж мастацтва патрабуюць не толькі непасрэднай рэакцыі, не простага выяўлення асабістых адносін, а глыбокай перажытасці, вынашанасці і погляду на тыя ці іншыя факты і падзеі як бы праз прызму гэтай перажытасці. Час крышталізуе маральныя ацэнкі, дае магчымасць канкрэтнага чалавека, канкрэтную падзею бачыць глыбінна, у суаднесенасці з лёсам іншых, з падзеямі вялікага жыцця.

У прыватнасці, для мяне найбольш блізкія тыя Сачанкавы творы, у падзейнай, жыццёвай аснове якіх ляжаць факты пісьменнікавай біяграфіі, ягоны асабісты духоўны і душэўны вопыт, што выверапы ўжо часам, вопытам іншых людзей. Вопыт, які стаў жыццёвым і духоўным набыткам іншых. Найперш гэта творы пра родны кут, пра Палессе, шматпакутны і высокі лёс яго людзей.

Горад, а менавіта з ім звязана пераважная большасць твораў, прысвечаных сучаснасці, ён ужо сам па сабе не ў такой ступені духоўна глыбокі, як вёска. Ён зменлівы, рухомы, менш пэўны. Асабліва горад сучасны, горад малады. А калі ён яшчэ бачыцца вачыма вяскоўца, успрымаецца ягоным сэрцам...

Духоўная і эмацыянальная ўгрунтаванасць значна ў большай ступені адчуваецца ў творах, заснаваных на матэрыяле гісторыі. Сённяшняя Сачанкава цікавасць да гісторыі прадыктавана асабліва адкрыта сучаснасцю, яе духоўнымі патрэбамі.

На X з'ездзе Саюза пісьменнікаў Беларусі (красавік 1990 г.) Барыс Сачанка гаварыў: «...Мы, беларусы, шчаслівыя і разам з тым няшчасныя людзі. Шчаслівыя, бо ў нас, як у большасці народаў, ёсць свая зямля, свая мова, свая культура, сваё мінулае і сваё будучае. Няшчасныя, бо,маючы, здаецца, усё, што трэба, мы тым не менш не мелі цягам стагоддзяў сваёй дзяржаўнасці. І не мелі не таму, што не дараслі да яе ці не хацелі, а таму, што, як пісаў Якуб Колас:

Тут сходзіліся плямёны
Спрэчкі сілаю канчаць,
Каб багата адароны
Мілы край наш зваяваць,
А нас цяжка ў сэрца раніць,
Пад прыгон узяць навек,
Нашы скарбы апаганіць,
Душу вынесці на здзек,
Каб у віры той ашукі
Знішчыць нашы ўсе сляды,
Каб не ведалі і ўнукі,
Хто такія іх дзяды.

І кожны, хто прыходзіў з агнём і мячом на нашу зямлю, прыносіў сюды і свае парадкі, імкнуўся калі не фізічна знішчыць нас, дык духоўна».

Гэтае разуменне гісторыі Беларусі, драматычнага лёсу народа, гэтыя духоўныя пастаянныя высілкі народа: каб выжыць, разуменне набытае і дзякуючы гістарычным грамадскім зменам, і, можа, у першую чаргу дзякуючы вялікім асабістым намаганням Сачанка сёння імкнецца актыўна аддаць і перадаць іншым. Менавіта гэтаму падпарадкавана ягоная творчая энергія. Ён ведае, што ў нашай гісторыі вельмі бедная фактычная аснова. Тыя факты, на падставе якіх рабіліся нейкія гістарычныя вывады, выключна бедныя, падабраныя тэндэнцыйна. Каб народ паверыў у нешта новае, патрэбны факты. Факты, якія ён не ведаў, факты, якія ад яго ўсяляк утойваліся. Факты, багацце фактаў — самае галоўнае. Шырокія абагульненні, абгрунтаванні і ацэнкі будуць пазней.

Сёння Сачанка піша пра невядомыя ці вельмі малавядомыя старонкі жыцця і творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа, пра драматычны лёс беларускай эміграцыі, пра Ф. Скарыну і М. Доўнар-Запольскага, В. Ластоўскага і А. Гаруна, Я. Лёсіка і К. Сваяка, Я. Радзівіла і Л. Геніюш, пра Мураўёва-вешальніка, Бэндэ...

Творы гэтыя адкрыта публіцыстычныя. Нават па сваім жанры — артыкулы, эсэ. Але публіцыстычнасць гэтая грунтуецца на багатым фактычным матэрыяле, яе эмацыянальны лад узмоцнены, вывераны гісторыяй народа і сучаснымі патрэбамі нацыі.

Жыве Барыс Сачанка асабліва актыўным грамадскім і творчым жыццём. Дзейнасць грамадская і творчасць літаратурная для яго непадзельная. Бо клопат адзіны тут і мэта адна — нацыянальнае духоўнае адраджэнне. І яго дзейнасць, яго творчасць успрымаецца, бачыцца не толькі і не так сама па сабе, а як выяўленне даволі пэўнай глыбіннай грамадска-літаратурнай тэндэнцыі. А менавіта — выяўленне, вельмі характэрнае, адметнае, глыбінных духоўных намаганняў пакалення, якое шмат перажыло, шмат адчула болю, пакалення, якое жыве ў высокім унутраным напружанні, адраджае і мацуе духоўныя асновы нацыі.

*Серафім Андраюк*

# Вялікі Лес

*Раман у трох кнігах*

**КНІГА ПЕРШАЯ**



# Частка першая

Калісьці, тысячы, а можа, і мільёны гадоў таму назад, тут было мора. Вада і вада, куды ні паглядзі, куды ні кінь вокам. Вада ды яшчэ неба — у ясныя, пагодлівыя дні яно спакойна блакітнела, гнала і гнала кудысь беспрытульныя валацугі-аблокі, а ў змрочныя, ветраныя і зусім злівалася з вадою, не пазнаць, дзе варочаюцца, цяжка бурляць хвалі, а дзе перакатваюцца, кіпяць хмары. Ды ўсяму, кажуць, свой час — час нараджацца і час паміраць, час быць і час нябыту. Быў час — было мора, і прыйшоў час, калі мору не трэба больш быць. І мора пачало мялець, высыхаць. Падняліся, тлуста зачарнелі мокрымі спінамі астравы, выспы, пагоркі. Там-сям бучна забуяла трава, зазелянелі кусты, дрэвы. Плоймы быстракрылых гарластых птушак і чароды пражорлівых дзікіх звяроў прывабіла да сябе мёртвае мора. Вольнаму ж — воля: было дзе гуляць, было што спажыць, чым паласавацца. Услед за птушкамі і звярамі прыблукаў сюды, а потым і асеў, пасяліўся на нядаўнім дне мора чалавек. Чалавек паляваў на звяроў і птушак, лавіў рыбу — яе аж кішэла ў ціхіх утульных завадзях,— з таго і жыў. Калі ж, каб пракарміцца, звяроў і птушак не стала хапаць, чалавек прылаўчыўся сеяць збожжа, садзіць гародніну. Выпаліць дзель лесу, пасее на пажарышчы жыта, ячмень, а калі тыя адкаласяцца, паспеюць — сажне, абмалоціць. З абмалотам — ураджаем — не так проста расстацца, пакінуць каму-небудзь. І цягнуць на сабе на плячах таксама нялёгка. Чалавек масціў жытло, гламаздзіў курэнь, хату. Так поле, зямля прыручалі, прывязвалі да сябе чалавека. З валацужніка, вандроўніка ён рабіўся гаспадаром. На астравах, выспах, пагорках паўставалі людскія паселішчы — хутары, вёскі.

А мора між тым мялела і мялела, высыхала і высыхала, аслабаняючы ад вады новыя і новыя абшары. Гэтыя абшары імкліва ўкрываліся густою — не прадрацца — раслінансцю, злучаліся з іншымі такімі ж вольнымі ад вады абшарамі, утвараючы велізарнейшыя абсягі балот і лясоў. Заставалася яшчэ дзе-нідзе, найдаўжэй у нізкіх, спадзістых

мясцінах, і мора. Але яно ўжо не бурліла, не шпурляла з лютай апантанасцю і злосцю, як бывала, хвалі, а сонна драмала, дажывала век свой. Летам яно зацягвалася жабурыннем, раскай, спавівалася рагазою, плюшнікам, чаротам, асакою; зімою ж раўнела — іскрылася лёдам, бялела снегам. І толькі вясною нібыта прачыналася, ажывала — вада затапляла ўсё навокал, нават некаторыя астравы. Але мінаў месяц, другі — і вада спадала. Зноў падымалі, сушылі на сонцы мокрыя спіны астравы, выспы, пагоркі, зелянелі дрэвы, кусты, трава. У мора не было ранейшай моцы, не ставала ўжо сілы не аддаць таго, што аднойчы было аддадзена. Нават больш: з кожным годам, з кожным новым і новым летам яно мізарнела, меншала, пераставала быць морам, рабілася балотам. Самым звычайным гнілым балотам, у якім чорнымі бяздоннымі прорвамі-ямамі зеўралі страшныя «чортавыя вочы», бруднымі лужамі плеснела густая ржавая вада, вытыркаліся купы лазы, шапацела, шастала асака. Рачулкі, рэчачкі, рэкі — іх стала тут раптам безліч,— упадаючы ў самую вялікую раку краю — Прыпяць, і ўдзень, і ўночы рабілі сваю наканаваную лёсам работу — нястомна, настойліва і цягавіта неслі і неслі воды гэтага гіблага мора, пералівалі іх хоць і ў далёкае, ды жывое іншае мора. Рачулкі, рэчачкі, рэкі і былі тымі дарогамі, па якіх, сеўшы ў выдзеўбаны з дрэва човен, тады якраз і падарожнічаў чалавек. Вельмі можа быць, што і жыць у гэты край чалавек не прыблукаў па нейкіх не вядомых сёння сцежках і дарогах, а прыплыў па вадзе, спачатку, як гэта вадзілася і водзіцца, на розведкі, а потым і назусім. Менавіта — і гэта пацвярджаюць даследчыкі-вучоныя — і першыя больш-менш значныя людскія паселішчы ў тым краі — Лоеў, Брагін, Юравічы, Мазыр, Тураў, Пінск — узніклі не дзе-небудзь, а на высокіх сухіх берагах рачулак, рэчачак і рэк.

Паблізу Вялікага Лесу няма ніякай ракі. А можа, калі якая-небудзь рака і была, ды высахла. Не дзіва ж — мінулі дзесяткі, сотні гадоў. Няма ўжо і тых пракаветных, няходжаных лясоў, што гаманілі з небам, няма і тых бяскрайніх багністых балот, што гібелі навокал, няма і тых рэчачак, рачулак, што ляніва бруіліся, беглі адсюль шукаць вялікіх рэк. Змянілася, багата чаго змянілася з тых дзён, як прыйшоў сюды, паставіў першую хату чалавек. Толькі ва ўспамінах, у былях, што расказваюць старыя людзі, пачуеш ін-

шы раз пра параход, які плыў ды сеў на мель, ці пра сома, што праглынуў «Петракова» ці «Сідоркава» ягня... Вядома, параход мог плыць толькі па рацэ, як і той сом, што глытаў цалкам ягнят, мог вырасці ў глыбокай, вялікай вадзе. Ды гэта ўжо былі, згадкі пра раку, а не сама рака...

У апавяданнях старых велікалесаўцаў асталіся згадкі не толькі пра раку, але і пра тыя часы, калі па тутэйшых лясах і балотах туляліся «лесаўчыкі», ішлі біць польскую шляхту «чаркесы» — «а шляхта на конях была і ўзброена надта ж добра — шаблямі, мушкетамі, дзідамі». Асталіся, жывуць у згадках, ва ўспамінах і шведы — «яны ад цямна да цямна ехалі, перапраўлялі гарматы цераз грэблю і так былі яе размясілі, што потым папраўляць давялося — насыпаць жвірам, аплятаць лазою. Людзі ж хаваліся ад шведаў, у лясы, балоты паўцякалі. Нават звон з царквы знялі, баяліся, што шведы забяруць яго. Бо то чужыя зусім людзі былі і гаварылі так, што і не разабраць, што яны гаворацъ». Інакшую памяць пакінулі пра сябе «хранцузы». «Етыя есці надта ж хацелі і цяпла шукалі. Халады нашы не па іх былі. Як натрапілі на Вялікі Лес, дык узрадаваліся. Пазалазілі на печы і сядзелі, не раўнуючы, бы каты, аж покі войска з-пад Масквы не прыйшло. Пасцягвалі іх з печаў, у палон пазабіралі. А чалавек колькі, што добраахвотна не здаваліся, штыхамі пакалолі, шаблямі пасеклі. У кургане — вунь тым, што па дарозе ў Шапчын,— закапалі. На могілках хаваць поп не дазволіў. Хранцузы ж — нехрысці...»

Круцілася, круцілася кола часу. Ішлі, ляцелі гады, дзесяцігоддзі...

Вялікі Лес разрастаўся, з хутара на некалькі хат стаў прасторнаю люднаю вёскаю. Гэтаму спрыяла векавая пушча, што распасціралася наўкруг, і тое, што попыт на дрэва большаў з кожным днём. Спачатку лес высякалі на паташ, на будоўлю хат і хлявоў, а потым і на шпалы, на дровы дзеля заводскіх печаў і паравозных топак. Велікалесаўцы ахвотна памагалі прамыслоўцам — па-першае, зараблялі капейку, якой ім — ды хіба толькі адным ім! — ніколі не хапала; па-другое, дзялянкі можна было расцярэбліваць, карчаваць і сеяць. Падалі, гупалі пышнымі вершалінамі вобзем дубы, сосны, клёны, бярозы, агалялася, лысела пушча. Масціліся грэблі, клаліся цераз балоты і рачулкі масты. То тут, то там будаваліся пільні, смалакурні. Аснавалася неяк па вясне пільня і непадалёку ад Вялікага Лесу. Штораніцы яна абуджала векавую ці-

шыню басавітым гудком, склікаючы на працу наймітаў. Вялікалесаўцы так па гудку і празвалі тую пільню — Гудоў. У Гудове рэзалі дошкі, гнулі абады, а потым, калі пачалася вайна з аўстрыякамі і немцамі, пачалі штукаваць для вайсковых абозаў фуры, передкі для гармат. Да пільні правялі і чыгунку — каб лацвей было адпраўляць перадкі і фуры на фронт. Вайна зацягвалася, фронту патрабавалася ўсё больш і больш перадкоў і фураў, таму з самай звычайнай пільні ў Гудове імкліва вырастаў завод. Вялікі Лес падзяліўся як бы на дзве вёскі — адны гэтак жа, як і раней, аралі, сеялі поле, а другія, найчасцей моладзь, хадзілі працаваць на завод. Заробак на заводзе быў не авохці які, але да таго ўраджаю, што збіралі на расцяробах, ён быў не лішні. За грошы можна было прыкупіць які пуд хлеба, калі таго не хапала да новага, можна было і набыць сувой крамніны ці боты. Завод між тым набіраў моцы, будаваліся новыя і новыя цэхі. Адных вялікалесаўцаў мала было для работы на заводзе. І тады ў Гудоў пачалі прыходзіць і прыязджаць не вядомыя нікому людзі — з б р о д, як зняважліва празвалі іх вялікалесаўцы. З б р а д ы не мелі зямлі, не мелі хат, жылі толькі з працы рук сваіх, з капейкі. Завод акружаўся куранямі, хаткамі, дамамі. Жыць на завод перабіраліся і некаторыя вялікалесаўцы — беднякі, малазямельнікі. Але самастойнасці Гудоў ніяк не набываў. Мо таму, што там не было царквы, могілак. Калі трэба было хрысціць дзіця ці вянчаць маладых, ехалі ці ішлі ў вялікалесаўскую царкву. Хаваць нябожчыкаў таксама вазілі з Гудова на вялікалесаўскія могілкі. І святы гулялі не дзе-небудзь, а ў Вялікім Лесе. Вялікалесаўцы не любілі з б р а д о ў, гэта былі людзі галодныя, яны не цураліся любой работы, самай ганебнай і чорнай, абы за яе плацілі, нават іншы раз кралі. Вялікалесаўцы лавілі зладзеяў, учынялі самасуды. І тады найміты, асабліва калі самасуды канчаліся забойствамі, кідалі работу і гуртам ішлі біць вялікалесаўцаў. Жалезныя пранты, колле, кулакі, а іншы раз і сякеры, пускаліся ў ход. Наязджала паліцыя, разганяла раз’ятраных людзей: некаторых арыштоўвалі, судзілі, ссылалі ў Сібір. З Сібіры вярталіся «рыштанты» рэдка, а тыя, хто ўсё ж вяртаўся, гаварылі, што рабочыя і сяляне — браты, ім няма за што біцца і варагаваць: і тыя, і другія — такія ж самыя гарапашнікі; рабочым і сялянам трэба сябраваць, аб’ядноўвацца, каб агульнымі сіламі змагацца з багацеямі, тымі, хто сварыць рабочых і сялян — кулакамі-міраедамі, панамі, уладальнікамі заво-

даў, фабрык. Гэтых сібіракоў-агіціраікаў зноў арыштоўвалі, зноў садзілі ў турмы, высылалі. Але зярняты, пасеяныя ў людскіх душах, прарасталі, давалі ўраджай. Забастоўкі, маніфестацыі адна за адной выбухалі ў Гудове. Велікалесаўцы ў гэтых забастоўках і маніфестацыях удзелу амаль не бралі, але калі ў семнаццатым годзе пранеслася вестка, што ў Піцеры рабочыя і салдаты скінулі цара, то і велікалесаўцы — не ўсе, вядома, а беднякі і малазямельнікі — з віламі і косамі рынуліся на панскі палац, што стаяў у садзе крыху зводдалі ад Вялікага Лесу. Пана Халявіна ў палацы ўжо не было, ён паспеў некуды ўцячы. Ды пан нікому асабліва і не трэба быў — трэба былі людзям панскае багацце і тая зямля, якую ў свой час дзе хітрасцю, дзе гвалтам адабраў у велікалесаўцаў пан. Рабочыя-агіцірнікі расказалі пра р э в а л ю ц ы ю, якая адбылася ў Расіі, пра б а л ь ш а в і к о ў, пра правадыра рэвалюцыі Л е н і н а, пра тое, што заводы і фабрыкі цяпер будуць належаць рабочым, а зямля — сялянам.

У Вялікі Лес, Гудоў, ва ўсе вёскі і гарады былога мора — Палесся — прыйшло іншае — н о в а е — жыццё...

## I

Як толькі раставаў, сцякаў гаманлівай ручаістай вадою снег, падсыхалі дарогі, зелянелі лясы, балоты, палі, цераз Вялікі Лес ехалі цыганы. Ехалі звычайна ў канцы дня, перад самым захадам сонца, калі людзі, напрацаваўшыся, былі ўжо дома, у сваіх хатах, сядзелі сем'ямі за сталамі, елі тое, што каму паслаў бог. На вуліцу адразу ж высыпалі дзеці. Беглі за цыганскімі вазамі, на якіх былі напяты з тоўстага палатна ці крамніны буды, галёкалі, крычалі. Цыганы, цыганкі, а таксама іхнія заўсёды мурзатыя чорнагаловыя прадаўжальнікі роду глядзелі на ўсё, што траплялася на вочы, з нейкім як бы зацятым спакоем і думнасцю. З гэтага спакою, думнасці іх нішто-нішто не магло выбіць. Нават галёканне, крыкі басаногай вясковай дзятвы.

Ляскочучы вазамі, рыпучы сухімі раменнымі гужамі, цыганы міналі вёску, выязджалі на луг, што быў за невысокім, спадзістым пагоркам, і там, у рэдкім маладым бярэзніку, спыняліся. Распрагалі коней, путалі ім ногі і пускалі на траву папасвацца. Самі ж рабілі з вазоў табар, раскладалі агні. Варылі есці, і калі наядаліся, выносілі з будаў бубны, гітары, іншыя, толькі ім адным вядомыя, галаснікі. Пачыналася цыганскае ігрышча. Увесь Вялікі Лес ад мало-

га да старога збіраўся да цыганскага табара. Цікава было паглядзець зблізку на гэтых крыху дзівакаватых людзей, якія ніяк не хацелі асесці і жыць, як жывуць усе, а валацужнічалі, вандравалі з месца на месца па свеце, цягнула і паглядзець на іхнія імклівыя скокі, калі цела быццам без касцей і не разабраць, дзе ў чалавека рукі і галава, а дзе ногі, цікава было і паслухаць іхнія то аж занадта вясёлыя, то зусім панылыя сумныя песні. А самае галоўнае — гэта пачуць, што будзе прарочыць аднавокі, худы, бы смерць, лысы Пецка. Бо Пецка не памыляўся, не маніў: што казаў — тое збывалася.

І сёлета калі не ўвесь Вялікі Лес, дык ва ўсякім выпадку большая палавіна яго сабралася надвячоркам на лузе ў бярэзніку. Як на тое, і надвор'е выдалася бы на заказ: было цёпла, ціха і гнюс, камарэча яшчэ вачэй не засыпалі, не лезлі сляпіцаю куды папала. Хадзілі, тоўпіліся вяскоўцы вакол цыганскага табара, глядзелі на скокі, слухалі песні і чакалі, чакалі, што будзе прарочыць Пецка. А ён не спяшаўся, маўчаў і маўчаў. І раз, і два, і тры падбягалі да таго воза, на якім, нібы на памосце, сядзеў, захутаны па самую шыю ў пярыны, Пецка, абутыя ў чырвоныя боты маладыя цыганы білі ў блішчастыя талеркі, што трымалі ў абедзвюх руках, а ён не адклікаўся, маўчаў і толькі засяроджана глядзеў адным вокам, у якім скакалі крывавыя водбліскі агнёў, некуды далёка-далёка ў цемру і мыліў, мыліў сухімі тонкімі губамі, быццам нешта жаваў.

— Гавары ўжо, што маеш сказаць,— не вытрываў нехта з велікалесаўцаў.

Але і на гэтыя словы Пецка нічога не адказаў, як бы і не пачуў іх, прапусціў міма вушэй, нават галавы не павярнуў.

Толькі калі маладыя цыганы стукнулі ў блішчастыя талеркі сёмы ці восьмы раз і ўпалі на калені, падняўшы высока ўгору, быццам у літанні, рукі, Пецка быццам схамянуўся, уздрыгнуў.

— Людзі! — крыкнуў апантана, нібы ў нейкім адчаі, ён.— Страшнае ўсіх нас чакае, таму і маўчаў я, хацеў упэўніцца, ці не памыляюся. Не, не памыляюся. Пасеялі хлеб, а есці яго не ўсе будуць. Чорныя груганы наляцяць, і будуць хадзіць па дарогах і без дарог людаеды. Гарэць будуць хаты і гінуць дарослыя і дзеці. Але канец таму, як і ўсяму на свеце, прыйдзе. Груганоў-людаедаў пазбавімся. І жыць астанемся. Не ўсе, але астанемся. Набірайцеся ж цярплівасці. Цярплівасці і вытрымкі!..

І Пецка, як і заўсёды пасля прароцтва, раптоўна схіліў набок лысую, з перавязаным сляпым вокам галаву, з рота ў яго пайшла пена, і ў наступную хвіліну ён паваліўся на пярыны і пачаў калаціцца, трасціся, быццам у ліхаманцы...

Грымнулі ў блішчастыя талеркі маладыя, абутыя ў чырвоныя боты цыганы, выбеглі аднекуль з вёдрамі цыганкі, заўзята ўзяліся тушыць, заліваць вадою вогнішчы...

Разам з іншымі вяскоўцамі быў у той вечар на лузе ля цыганскага табара і Мікалай Дарошка. Блукаў, таптаўся трохі воддаль людскога натоўпу і ўсё чакаў, чакаў, калі нарэшце пачне прарочыць аднавокі лысы Пецка.

Пецку Мікалай верыў, як сабе. Кожнаму яго слову, што б той ні сказаў. Ведаў: Пецка абы-чаго не гаворыць. Што скажа, тое і будзе. Пераканаўся, упэўніўся ў гэтым Мікалай за свой век. Некалі, яшчэ да таго, як скінулі цара, прарочыў Пецка вялікія няшчасці і беды. І так яно потым і сталася — усчалася вайна з аўстрыякамі і немцамі. За вайною — рэвалюцыя, вайна з белымі, чорнымі, зялёнымі... Прарочыў Пецка і калгасы, калектывізацыю... «Будуць забіраць у людзей нажытае. Было тваё, стане нічыё».

«Што, што скажа Пецка сёння?» — мучыла — не ўтрываць — Мікалая.

І калі ў цішыні, якая раптоўна запанавала, насцярожана наблізіўся да табара і пачуў тыя страшныя, несамавітыя словы, што выкрыкнуў, нібыта цяжкія камяні кінуў, аднавокі Пецка, перш чым паваліла, пачала біць яго падучая, быццам прасвятленне найшло, вочы адкрыліся ў Мікалая. «А праўда ж, ета, мусіць, вайна будзе. З немцам. Даўно, даўно погалас паўзе між людзей — нехта недзе дзядка сівога як лунь бачыў, і той дзядок святыя лісты даў і наказаў, каб перапісвалі іх і чыталі, раздавалі людзям — няхай моляцца госпаду богу, можа, злітуецца, не дасць крыві нявіннай праліцца». Адзін такі ліст трапіў у рукі і яму, Мікалаю: сусед, Тхорык, паказаў, нават перапісаць даў. «Дзьмуць вятры з мора. Дзьмуць вятры на мора. А гора дзьме на чалавека з усіх бакоў»,— згадаліся словы з таго ліста. «Дый газеты друкуюць — неспакойна ў свеце,— вёў свае развагі-думкі далей і далей Мікалай.— Захапіў немец многія народы і краіны, цяпер на Расію рот разявіў, зубамі, бы воўк, клацае... Няўжо не збаіцца, вайною пойдзе?»

Як і ў кожнай падзеі, што адбывалася ці павінна была

вось-вось адбыцца, Мікалай дбаў перш за ўсё пра сябе — што гэтая падзея можа даць і што можа забраць. І вяртаючыся да сваёй хаты — яна ў другім канцы вёскі была — гародамі (па вёсцы Мікалай не любіў хадзіць, не хацеў бачыць, сустракаць некаторых людзей), ён думаў пра вайну, якая, калі верыць Пецку — а не верыць яму нельга! — мусіць жа, неўзабаве ўсчнецца, пра тое, што яна, тая вайна, прынясе новага ў яго жыццё. Вядома, вайна — гэта мітрэнга, змены. Не можа быць, каб усё аставалася так, як цяпер ёсць. Гэта ж чортведама што... Забралі зямлю... Забралі коней, валоў, кароў... Забралі тое, чым жыў, што выношваў у душы столькі гадоў, пеставаў, як самае дарагое і запаветнае... Канечне, калі немец пойдзе вайною, калгас распадзецца. Рассыплецца, як сухая бочка. Кожная клёпка па сабе, абручы — па сабе... Але ці ўдасца вярнуць назад сваю зямлю? Тую, якую некалі раскарчаваў, умасліў гноем, якую перамацаў, перабраў рукамі. Кожны карэньчык, кожную былачку не раз і не два... Будзе ж усякі хапаць, ірваць сабе. І не горшае, а лепшае. Ды і з коньмі, валамі, каровамі як? Тыя, ранейшыя, якіх абагулілі, пастарэлі, а то і няма іх — пазаганялі на базу: на мяса, на каўбасы. Выраслі новыя... Як, як іх дзяліць? Разбярыся цяпер, дзе тваё, дзе не тваё... Ды калгас, зямля, коні, валы, каровы — ета адно. Вайна ж заўсёды згуба на людзей. Вунь і Пецка казаў: «Пасеялі хлеб, а есці яго не ўсе будуць. Чорныя груганы наляцяць, і будуць хадзіць па дарогах і без дарог людаеды. Гарэць будуць хаты і гінуць дарослыя і дзеці». Якое страхоцце, жах, жах, як падумаеш, уявіш!.. Каб адзін ён, Мікалай, быў, то няхай бы, што было б, тое было б. Але ж дзеці, дзеці... І не малыя — дарослыя. Піліпа ўжо ў тую вайну, калі чырвоныя з белымі ваявалі, ледзь не заграбасталі. Добра, што ён, Мікалай, здагадаўся сына ў «зялёныя» паслаць. Пераседзеў з год Піліп у лесе, а тады, як ні ў чым не бывала, дадому вярнуўся. К таму часу акурат і вайна скончылася. Пацягалі, праўда, Піліпа трохі па розных начальніках, але затое анігадкі — жывы, здаровы астаўся, калецтва ніякага не меў і не мае.

Іван таксама «дзяйсцвіцельную» адслужыў, так што і яго забяруць. Як міленькага забяруць. Хоць і пасварыліся з Іванам, не гавораць нават, а ўсё ж... сын... Як заб'юць — шкада будзе. Упарты надта ж ён, Іван! Бі, рэж яго — усё адно сваё. Не пераканаеш, нічым не пераканаеш. Паверыў бальшавікам, у партыю ўпісаўся, начальнікам сельсавецкім стаў. Бацькі выракся. Цяпер на сходах выступае,

галіфэ дыяганалевае насіць і кашулю доўгую суконную, з кішэнямі на грудзях; падпяразваецца шырокаю раменнаю дзягаю. І ані не хітры, што думае — кожнаму, і старому і маладому, у вочы кажа. Не пашкадуюць яго. Як заварушка якая ці закалот — адказваць Івану давядзецца, за ўсё адказваць. І што настырняўся з людзьмі, і што ў партыю ўпісаўся, і што начальнікам сельсавецкім стаў... Цень, вядома, падацьме і на бацьку, на яго, Мікалая. Але што, што ён мог зрабіць? Урадзіўся неслух, кол на галаве чашы, усё адно сваё. Яму стрыжанае, а ён голенае. Што ж, хай згадае бацьку, хай успомніць, што ён, Мікалай, казаў, як перасцерагаў, ад усяго, усяго перасцерагаў. «Жыві сённяшнім, але і на заўтрашні дзень не забывай!» Начальнікам надта быць захацелася, другіх вучыць, не працаваць, а гульма гуляць, камандаваць. Цьфу, і трэба ж, каб такое ўпартае дзіця ў яго, Мікалая, урадзілася!..

Івана як Івана, а Косціка... Косціка аж надта шкада будзе ў войска аддаваць. А давядзецца ж. Бо калі вайна зацягнецца, і яго гадок падаспее. Забяруць Косціка. А ён жа зусім дурніца, вецер у галаве. Пад першую кулю і трапіць. Што ён разумее, дзіця горкае. Ні схавацца, ні схітраваць... Такіх найбольш вайна і знішчае, у зямлю змоладу кладзе...

І Парасчынага чалавека, Хведара, таксама, пэўна ж, на хронт забяруць. Чаму б і не забраць, мацак такі, як вол, хоць боб на лбе малаці. А ці вернецца Хведар з хронту? Не вернецца — Параска з дзецьмі траіма астанецца. Хто паможа ёй? Давядзецца яму, бацьку, памагаць, якніяк, Параска ж — дачка. Забяруць Хведара на хронт — і памагай. Бо што яна адна зробіць, дзяцей як пракорміць?.. Аге, выходзіць, і яму, Мікалаю, таксама не соладка будзе. На хронт яго не возьмуць, белы білет, і на тую, ранейшую, вайну не бралі. Але ці жыць астанецца, ці ацалее ў калатэчы, калі тая ўсчнецца? Куля — сляпая, і ў вінаватага, і ў невінаватага цаляе. Дый разбярыся тады, хто вінаваты, хто невінаваты. Сёння здаецца, што праўда на баку етага, а заўтра... Заўтра і сам не ведаеш, дзе праўда, дзе няпраўда. Дый не пытае ніхто ў цябе вельмі волі твае, камандуюць толькі. Рабі, што загадваюць. Не паслухаешся — значыць, вораг. У каго вінтоўка, у таго і сіла, права. І каб хоць можна было ўбаку стаяць, рабіце што хочаце, толькі мяне не чапайце, дайце жыць так, як я хачу. Не-е! За чубы схапіліся, і ты хапайся, памагай... Не, не дваім памагай, а аднаму. І кожны хоча, каб памагаў яму. А ты... Ты не веда-

еш, каму памагаць. Дый не хочаш у бойку ўстраваць, табе б пастаяць, паглядзець, як б'юцца, насы адзін аднаму квасяць, юшку пускаюць. О-хо-хо! Перажыў не адну ўжо калатэчу, ведаю, добра ўсё ведаю! Наедуць, наляцяць, як груганнё, страляць пачнуць, хлеб са свірна да зярнятка выметуць, коней, кароў забяруць. Агрызніся — шампалоў усыплюць, а то і штыхом парнуць. Ета ў лепшым выпадку. А могуць жа і прыстрэліць, забіць... І так жыць, як жывецца, далей... І ад вайны чакаць дабра... О-о!..

## II

Спявалі, гарлапанілі, дралі горла па ўсёй вёсцы пеўні, калі прачнуўся Мікалай. Спахапліва расплюшчыў вочы, глянуў на акно — ці не заспаў? Не, выбавіўся ад сну, здаецца, у пору, хоць лёг у пасцель позна, нязвыкла позна, і доўга, аж бакі забалелі, не мог, ніяк не мог заснуць. Таму, мусіць, і мутарна, нясвежа, быццам пасля перапою, было цяпер у галаве, бязволле, нейкая несамавітая мляўкасць спавілі, абцяжарылі цела. Але Мікалай прымусіў сябе падняцца, спусціць з ложка ногі. Пасядзеў, пачухаў кулаком валасатую грудзіну, потым зашпіліў на цурубалкі расхрыстаную палатняную кашулю, прайшоўся босы па халаднаватых пасля цёплай пасцелі маснічынах.

У вокны цадзілася, лілося ўжо малодзіва яснага пагодлівага ранку. Косцік, вярнуўшыся дадому пазней за бацьку, спаў, уткнуўшыся носам у падушку, на сваім ложку. Паласатая посцілка ссунулася на падлогу, агаліўшы вострыя лапаткі спіны і худы, касцісты хрыбетнік. Спала на палку ля печы, уся неяк скруціўшыся і сагнуўшыся, падклаўшы пад шчаку, быццам дзіця, рукі, і Хора — яго, Мікалаева, родная сястра, што жыла пры ім. Заўсёды, калі Мікалай глядзеў на сястру, асабліва сонную, сэрца яго сціскалася не то ад жалю, не то ад шкадавання. Не выпала Хоры шчасця, ніхто не ўзяў яе замуж. Не ўзяў, мусіць, таму, што непрыгожая Хора, рабацяністая. Ды, да таго ж, яшчэ і кульгавая. І сёння ў Мікалая сціснулася сэрца: як усчнецца вайна, пра якую гаварыў учора на лузе Пецка, што Хоры, беднай, рабіць? Ні ўцячы, ні абараніцца...

Усунуў ногі ў шламакі-апоркі — яны, падраныя, растаптаныя — каравяк ды гразь,— стаялі ля ложка,— выйшаў на ганак. Пастаяў, жмурачы вочы: з-за небасхілу ўжо ўзыходзіла, паказвалася ранняе летняе сонца, імкліва і густа асыпала напоўніцу наваколле зыркімі, зіхатлівымі

промнямі. Успыхнула, загарэлася срэбра расы — на лісці груш, вішань, яблынь — імі быў абсаджаны скрозь паўз платы гарод; на бульбе, якая ладна ўжо адскочыла ад зямлі і ядрана лапушылася двума шырокімі загонамі аж да самага паркана; на траве-мураве — ёю густа зарасло дворышча, нават тая сцежачка, па якой хадзілі ў хлеў і з хлява. Дзесьці ў другім канцы вёскі трывожна рыпнулі вароты, загаўкаў, заліўся доўгім, заядлым брэхам сабака. На ліпе, што кучаравілася ля весніц, звісаючы густым голлем на чаратовую страху хаты, завалтузіліся, заклекаталі буслы. Пачуўся і раскацісты, басавіты голас пастуха Хомкі:

— Выганяй-яй!

І гэты голас як бы прагнаў рэшткі бязволля і сну, напомніў — ідзе новы працоўны дзень, трэба спяшацца. Хуценька завярнуўшы за вугал і захінуўшыся, Мікалай зрабіў тое, дзеля чаго і выходзіў на падворак. І ўжо рашуча, грукаючы знарок моцна шламакамі і дзвярыма, пакіраваўся назад у хату — трэба было будзіць Хору ды заадно і Піліпаву жонку, Клаўдзю (Піліп з жонкаю жылі праз сенцы ў навейшай палавіне хаты, той, што была ад вуліцы), каб уставалі, падымаліся з пасцелі, беглі даіць кароў.

Праўда, калі Мікалай пераступіў парог хаты, убачыў: Хору будзіць не трэба — яна ўжо сама прачнулася, ссунулася з палка і завіхалася ў мыцельніку — мылася, потым апаласквала даёнку. Мінула яшчэ трохі часу — і Хора вышмыгнула на двор, пасляшала ў хлеў. Ляснулі дзверы і ў Піліпавай палавіне хаты, няйнакш, усхапілася на ногі, памчала даіць карову і Клаўдзя. Аге-аге, яна, бо праз хвіліну мітнулася міма акон — проставалосая, заспаная, з амаль голымі грудзьмі і рукамі, нават на плечы нічога, ніякай кохты, не накінула; як спала ў палатнянай начной кашулі, так і падалася ў хлеў.

«Ну і хлюндра, — падумаў з нядобрасцю пра Клаўдзю Мікалай. — Ета ж каторы год жыве з Піліпам, а дзіця так і не нарадзіла... І ці народзіць? Дзіця, можа б, лад у сям'ю прынесла. А то... Цьфу, паскудства, дый годзе. І Піліп высах на цёску, і яна... Э-э, ды што ўспамінаць! Б'юцца як не штовечар. І вінаваты не Піліп, не-е. Вінавата яна, хлюндра. Юр на яе напаў ці мо ўрадзілася такая. Бачыш, мала ёй аднаго Піліпа, да іншых пацягнула. З Грышкам-брыгадзірам злыгалася. А то летась у каноплях заспелі людзі з Міцем Савасцеем. І не гультайка ж. Возьмецца што рабіць, дык зробіць. І не абы-як. Усё ў руках у яе гарыць. Але ж... Хлюндра. І кеб жа не казаў, не вучыў,

не перасцерагаў сына: «Падумай, не пары гарачкі». Дзе там! «Ці з Клаўдзяю, ці наогул жаніцца не буду!» Ну што ж, жаніўся, жыві цяпер, калі свет табе клінам на хлюндры сышоўся. Пабачым, што з жыткі твае будзе. Добра, за розум трохі ўзяўся, разоў колькі папабіваў. Але ж біццём, сынок, жонкі да сябе не прывяжаш, не ўтрымаеш. Не, не ўтрымаеш... Панадзіўся воўк у авечкі, дык пакуль ці ваўка не заб'юць, ці авечак не перарэжуць... Аге, во так, так, сынок! Трэба было бацькі слухацца. Нічога не скажаш, до-обранькіх сынкоў выгадаваў! Што хочаш, тое і рабі з імі. Адзін жаніўся насуперак бацькавай волі, а другі зусім ні ў кога нічога не пытае, чужы стаў... Праўда, жаніўся, не ў прыклад Піліпу, удала, пра жонку яго, Кацярыну Антонаўну, нічога благога не скажаш. І з твару не брыдкая, і так нічога сабе, рухавенькая, зграбненькая. Дзетак у школе вучыць. І людзі яе хваляць. Ветлівая, характарам мяккая, пакладзістая. Умее з усімі ладзіць. З-пад Камарына родам, у Гомелі вучылася. А прыехала сюды — быццам тут і жыла. Кожнага чалавека і па імю, і па бацьку ведае, з усімі павітаецца і пагаворыць. І з ім, Мікалаем, калі б ні сустрэліся, міма не пройдзе — спыніцца. Пра ўсё чысценька распытае — і ў сям'і, у гаспадарцы што, і здароўе як. Раскажа, нічога не ўтоіць, і пра Івана, і пра сябе, і пра дзетак сваіх — Петрыка і Андрэйку».

«От жа бывае,— думаў са скрухай, тупаючы сюд-туд па хаце, Мікалай.— Нявестка людская, дык сын... Піліп — сын нічога, з ім бы жыць ды жыць, дык нявестка...»

Павярнуўся на ложку, сонна заплямкаў губамі Косцік. «А еты ж... Еты...» І Мікалай, пакуль абуваўся, умываўся, потым, стоячы перад абразом, маліўся богу, думаў ужо пра самага меншага — Косціка. «Што будзе з яго, хто, хто вырасце?» Хлопец быццам не дурны, на ляту ўсё ловіць, вушлы. Але ж і басяк, якіх і ў раду іхнім не было. Быццам маленькі, дурыкі строіць, конікі выкідвае. Пеўня надоечы злавіў і ў школу прынёс, маўляў, певень таксама хоча навучыцца рашаць задачкі. Пачала настаўніца ўрок, а ён, Косцік, пеўня і не ўтрымаў — з рук выпусціў. Дзеці — у рогат, а певень — у акно. Шыбу з лёту разбіў, акрывавіўся аб шкло... Ге, назабаўляўся, са школы во выключылі, гульма гуляе цяпер, не ведае, чым заняцца, за што рукі зачапіць. Што, што рабіць з хлопцам? Біць — пазнавата. І так пакідаць сваволле... Да дабра ета не давядзе. Не, не давядзе...

Што Косцік вырас неслухам, Мікалай вінаваціў сябе. Сябе і Хору. Надта ж шкадавалі яны хлопца, ніколі ні за

што не ўшчувалі, не папракалі. А ўжо да розгі, папругі... Не, не ведае Косцік прыкрасці і смаку ніякай кары. Ды і... Як, як было яго караць, ушчуваць? Сірата ж Косцік, без маці, можна сказаць, люднеў...

«Спесцілі хлопца, зглумілі. Валэндаецца цяпер без усякага занятку... Курыць навучыўся. Трэба будзе пагаварыць з ім. Харашэнька пагаварыць,— завязаў сабе вузельчык на памяць, каб не забыцца, Мікалай.— Хай ведае — усяму бывае канец. Нават дурасці, сваволі».

І перад вачыма паўстала, згадалася раптам, быццам і без усякай прычыны, учарашняе — цыганскі табар, агні за вёскаю ў бярэзніку на лузе, словы, што быў выкрыкнуў апантана лысы аднавокі Пецка... Згадалася, паўстала ўсё так імкліва і яскрава, што Мікалай аж хіснуўся, страсянуў галавою ад нечаканасці.

«Няўжо і праўда вайна будзе? — спалохала, укалола ў самае сэрца.— Божа, што прынясе яна — мне, сям'і, наогул людзям?..»

## III

Снедалі ў Дарошкаў рана. Елі тое, што паспявала згатаваць не вельмі гаспадарлівая і акуратная Хора, і кожны выпульваўся з хаты — хто ў лес, хто ў поле. Адразу пасля жаніцьбы снедаць да бацькі хадзілі і Піліп з жонкай, Клаўдзяй. Але маладажоны — не так Пілій, як Клаўдзя,— любілі паспаць, паваляцца лішнюю гадзіну ў пасцелі. Выганяць на пашу карову — і зноў у ложак. Гэта і стала прычынаю сваркі, пасля якой Пілій з жонкай больш не хадзілі снедаць да бацькі, пачалі гатаваць і снеданне, і абед, і вячэру сабе самі. Ды інакш і быць не магло — Мікалая работа з дому гоніць, трэба есці ды бегчы, а замест таго сядзі, чакай Пілія з жонкаю, калі яны адаспяцца і зробяць ласку снедаць прыйсці. Пілію ж з Клаўдзяю таксама нязручнасць была — дзеля нейкай міскі булёну ці двух-трох дранікаў спяшайся шторанак, уволю ў пасцелі не паляжы, не паспі. Вось і падзяліліся Дарошкі, пачалі гатаваць есці кожная сям'я паасобку.

Хора над снеданнем ніколі асабліва не мудравала. Як і ўчора, як і пазаўчора, як і тыдзень таму назад, і сёння наварыла чыгунок картаплянага булёну з грыбамі, засквярыла яго салам з цыбуляй. Спякла і некалькі дранікаў, падсмажыла яечню. Сама Хора не прысаджвалася за стол, пакуль не пад'ядуць мужчыны. Не было калі — вішчалі свінні,

трэба было спяшацца ў першую чаргу накарміць іх. А тады ўжо, як напузуюцца свінні, наб'юць туга валлё ежай куры, качкі і гусі, можна будзе і самой да стала падсесці, перахапіць што-кольвек. Таму і сёння бацька з сынам, Косцікам, снедалі ўдвух. Снедалі, як і зазвычай, моўчкі, не падымаючы адзін на аднаго вачэй, глядзелі толькі ў міску, лыжку ды ў не надта чысты, увесь у плямах, абрус, якім быў засланы стары дубовы стол. Сёрбалі заўзята драўлянымі, зробленымі з сухой грушы-дзічкі, лыжкамі спярша булён, наліты ў вялікую, з абабітымі краямі, гліняную міску, а потым жавалі цягучыя, усё адно што гума, дранікі, падсмакоўваючы іх яечняй, падсмажанай на скрылях сала. Булён, дранікі і яечню запілі цёплым, толькі што з-пад каровы, яшчэ пеністым сырадоем.

Сын і бацька амаль адначасова падняліся з-за стала. Сын паправіў, расшпіліў на адно вочка на жываце папружку, бацька ж павярнуўся тварам у кут на абраз і перахрысціўся. Убачыўшы, што сын хоча неўпрыкмет уцячы, знікнуць з хаты, спытаў строга:

— Ты ета куды?

— А што? — азваўся, зіркнуўшы палахліва на бацьку, Косцік.

Здзівіла Мікалая: у голасе сына не было сёння задзірыстасці, нахабнасці, а чуліся нібыта сцішанасць, памяркоўнасць. І ў вачах, вялікіх, карых вачах — зусім як у нябожчыцы маці! — гэта заўважыў Мікалай — таілася насцярожанасць... «Нешта зноў утварыў, дальбог, утварыў...» — падумаў Мікалай. Сыну ж, Косціку, сказаў:

— Са мной пойдам. Проса трэба на палянцы ля Качайбалота агарадзіць. Пераказвалі — каровамі яго патроху спасваюць...

І Косцік — што яшчэ больш здзівіла Мікалая — не заўпарціўся, не пачаў адмаўляцца, выдумваць розныя прычыны, чаму ён не можа пайсці з бацькам, як гэта здаралася апошнім часам усё часцей і часцей, а моўчкі пагадзіўся, прыняў бацькавы словы як непазбежнае, як загад. Толькі спытаў:

— Зразу і пойдам?

— Аге.

«Утварыў, нештачкі ўтварыў, сукін сын. Іначай не быў бы такі пакладзісты, рахманы. Бач — цішэй вады, ніжэй травы. Ціхенькі, лагодненькі — хоць ты да раны яго прыкладай», — пакруціў галавою, падумаў зноў пра сына бацька, Мікалай.

На паляну да Качай-балота дабіраліся кожны сваёй дарогай — Мікалай дубняком, каб паглядзець, ці не спасваюць пастухі каровамі проса яшчэ на адной палянцы — яна была непадалёку ад Яўменавага броду,— сын жа, Косцік, напрасцяк — праз Цітаў Мох. І бацька, і сын былі заняты сваімі думкамі, таму і не заўважалі, якая ціхая, нібыта святочная, была ў той дзень раніца. Сонца, адарваўшыся, лёгка, бы мячык, ад зямлі, паднялося ўжо даволі высока над лесам і цёпла, ласкава ўсміхалася з чыстага блакіту неба. Блішчала ўсюды раса на траве, спявалі наўзахапкі, імкнуліся, няйначай, перакрычаць адна адну, птушкі. Лагоднасць, спакой, здавалася, былі разліты ў наваколлі і перадаваліся міжвольна ўсяму жывому, быццам удыхаліся разам з паветрам.

«Няўжо вайна груне? — думаў, пытаў сам у сябе са страхам, паволі перастаўляючы ногі, абутыя ў мяккія, паношаныя лутовыя лапці, Мікалай.— Не памыляўся ніколі аднавокі Пецка, а еты раз... Еты раз, можа, і памыліўся. Аге, можа, і памыліўся! Бо... Не тое што мне, нікому непасільна, перажыўшы на сваім вяку столькі ўсяго ўсякага, перажыць яшчэ адну, новую вайну...»

Сына ж, Косціка, займала, вярэдзіла іншае — што сталася, чаму ён непадуладны нават самому сабе, робіць што і не хацеў бы часам рабіць? Вось і ўчора... Усё добра было, пакуль не ўбачыў на лузе ля цыганскага табара Тасі. А ўбачыў яе — нібы падмяніў яго хто... Цяпер за тое, учарашняе, было прыкра, сорамна. Косцік дакараў, гатовы быў разарваць сябе, пасучы на кавалкі. А ўчора ж... Усё было быццам правільна, як і трэба, толькі так, а не інакш, ён і мог паступіць, зрабіць...

«Дзіўна, усё дзіўна,— думаў, шыбуючы сцежкаю праз мох, Косцік.— Што ета на мяне?.. Як усё адно замарачэнне найшло, у вір я трапіў... І круціць, круціць мяне еты вір, нясе і нясе, а куды — і сказаць не скажаш, бо і не ведаеш. Няўжо сам я ва ўсім вінаваты? А можа... Яна, *Т а с я?..»*

Мікалай з сынам ужо канчалі агароджваць паляну, як з хмызняку неспадзявана вынырнуў ляснік Яўхім Бабай. Не вітаючыся, панура прайшоўся сюд-туд па паляне, потым спыніўся, расставіў шырока кароткія свае ногі, абутыя ў абшарпаныя аб галлё і валежнік боты, паглядзеў на проса, якое густою зялёнаю шчоткаю драла зямлю, на свежы, толькі што зроблены з жэрдак, плот, моўчкі дастаў з

скураной торбы, што была перакінута цераз плячо, паперу, аловак, прагундосіў:

— Ну што ж, акт будам складаць.

— Які акт? — быццам нічога не зразумеў, навастрыўся Мікалай.

— А такі. Ссечана дваццаць сем маладых бярозак і сасонак. Ета адно. Выдрана з карэннем больш за дзве сотні маладняку. Не цяпер, вядома, а вясною, як сеялася паляна. Ета два. Можа, хопіць на адзін акт?

І Яўхім Бабай падняў свае белазорыя, амаль без веек вочы, утаропіў іх у Мікалая. Ды так хіжа, злосна, што Мікалай аж сцехануўся, зніякавеў, не ведаў, што і адказаць. А Бабай не сунімаўся, наступаў:

— Ты думаеш, як сын, Іван, у начальстве, дык табе ўсё дазволена, усё можна? Э не, брат. Складу акт, ніхто не ўратуе. Перад законам усе роўныя.

— Дык складай, складай,— сказаў раптам, нібыта натхняючы, ціха, вельмі нават ціха, амаль шэптам, Мікалай, дзівячыся сам, адкуль у яго гэтая лагоднасць, спакой.— Чаго ж ты грозішся, а не складаеш?

— І складу! — як ад запалкі, успыхнуў, загарэўся Бабай.— Складу!

— Складзі! Толькі ж... І я маўчаць не буду. Таксама складу.

— Што ты складзеш?

— Акт.

— Акт? Які акт?

— Дазнаешся, як пазавуць.

— За што ета мяне пазваць могуць?

— Цябе? Г-ге-е! Думаеш, усе сляпыя, глухія, нічога не бачаць, не чуюць?

— На што намякаеш? — зашыпеў, бы гусак, Бабай — ноздры ў яго раздзьмуліся, пашырэлі, вочы прыплюснуліся, а рот разявіўся — у ім заварочаўся, забіўся часта аб жоўтыя зубы слюнявы мясісты язык.

— На тое, што ты і сам до-обра ведаеш. У абходзе, што ў абходзе тваім робіцца?

— А што ў абходзе маім робіцца?

— Не прытварайся, ведаеш. Сам усё ведаеш. Сякуць, крадуць лес.

— Хто сячэ, хто крадзе?

— Каму трэба, каму не лянота, той і сячэ, той і крадзе. Ды і сам ты... Прадаеш налева і направа. Так што... Чыя б кароўка мычала, а твая б... Маўчала. А пісаць... Давай

паспрабуем пісаць. Ты — на мяне, я — на цябе. Пабачым, што з етага будзе?..

Яўхім Бабай зморшчыў лоб, насупіўся, апусціў у зямлю вочы, сцяў вусны, цяжка, нібыта звер, засоп.

— А ты... Ты...— Ад злосці ён аж не мог гаварыць, пырскаў слінаю.— Віжуеш?

— На ліха ты мне здаўся. Я цябе не чапаў і не чапаю. Хай цябе сарочка не чапае.

Яўхім Бабай зноў цяжка засоп, аж захроп, нібыта не хапала яму паветра, і, насунуўшы на самыя вочы кепку-шасціклінку, гэтак жа імкліва, як з'явіўся, знік з паляны, пашыўся ў хмызняк — нібыта яго ветрам здзьмула.

Хвілін колькі Мікалай маўчаў, стоячы ўсё ў той жа напружанай, ваяўнічай позе, бы забіяка-певень, які толькі што кідаўся на свайго праціўніка, дзёўб яго. Потым паступова супакоіўся, расслабіўся, зноў узяўся рукою за абсмаленае, загнутае на канцы тапарышча сякеры, якую перад гэтым быў уцюкнуў у абцярэбленую сасновую жэрдку.

— Ыш ты яго, ён акт складзе,— сказаў не то сыну, Косціку, не то сам сабе. І ўсміхнуўся.— Не на таго нарваўся... Мяне так, голымі рукамі, не возьмеш... Не-е!..

Косцік увесь час маўчаў, не ўстраваў у сварку. Ні гукам не абазваўся ён і цяпер на бацькавы словы. Абсякаў, абцярэбліваў голле з толькі што паваленай маладой бярозкі, потым цягнуў, валок яе, чырачы дол, да паляны, мацаваў да ўкапаных глыбока ў зямлю слупкоў гнуткай лазінаю. Калі ж зусім скончылі работу, абгарадзілі, як і належыць, як і мае быць, проса і збіраліся ўжо кіравацца дахаты, вінавата падышоў, наблізіўся да бацькі.

— Тата,— хутчэй папрасіў, чым сказаў Косцік.— Вы б забывалі ўжо етыя паляны. Колькі раскарчавалі за свой век і дзе яны? Маці праз паляны на той свет пайшла, а вы...

— Цыц, смаркач! — рашуча павярнуў галаву да сына бацька і паглядзеў так, што Косцік аж скалануўся. Здалося яму: калі не кінецца наўцёкі, не пабяжыць, бацька можа і ў каршэнь заехаць, а то, чаго добрага, і сякераю запусціць...

## IV

Іван Дарошка на працу ў сельсавет прыходзіў роўна ў дзевяць. Звычка — ніколі не спазняцца, быць заўсёды дакладным, далася яму нялёгка, ох як нялёгка. Былі гады, калі за кожнае спазненне яго бязлітасна каралі. Ды так,

што ледзь заробку хапала, каб разлічыцца са штрафамі. Тое было даўно, яшчэ да рэвалюцыі, калі Іван упершыню трапіў у Гудоў, на завод. Тады акурат грымела вайна, завод выконваў тэрміновыя заказы, і кожная хвіліна прастою жорстка каралася: прамыслоўцы ні з чым не лічыліся, нічога не бралі пад увагу, капейкі не хацелі губляць, ім патрэбны былі прыбыткі, толькі прыбыткі. Рабочых рук было ўдосталь, чэргі падлеткаў і жанчын тоўпіліся ў прахадной, чакалі, калі ім дадуць хоць якую працу. О, то жахлівыя, лютыя былі гады! І як добра, што яны мінуліся, адышлі ў нябыт. Багата чаго змянілася і ў жыцці краіны, і ў жыцці людзей, і ў жыцці самога Івана. Ліквідавана эксплуатацыя чалавека чалавекам, завод у Гудове стаў уласнасцю дзяржавы, Іван Дарошка з найміта-рабочага вырас у кіраўніка — старшыню сельсавета. Звычка ж не спазняцца, прыходзіць на працу заўсёды ў час у Івана Дарошкі асталася. Прывыклі пастулова да гэтай дакладнасці, дысцыпліны і падначаленыя, нават пачалі прыходзіць у сельсавет хвілін на колькі раней за старшыню. Вось і сёння, ледзь толькі Іван Дарошка ступіў на ганак — ён быў драўляны, сухі і скрыпучы,— адчыніў дзверы, убачыў: увесь невялікі штат на сваіх месцах. Ніна Варакса, справавод, блізарука нагнуўшыся над сталом, нешта піша. Вострыць сцізорыкам аловак, стоячы ля акна, і новы, усяго некалькі дзён таму назад залічаны на пасаду, сакратар сельсавета Апанас Харчэня — акуратна прычасаны, у чыстай белай крамнай кашулі, увабранай у чорныя велікаватыя, мабыць, яшчэ бацькавы, штаны. Сядзіць ля тэлефона і дзяжурная — чырванашчокая грудастая Надзя, дачка спрадвечнага суседа Дарошкаў — Тхорыка.

— Дзень добры! — сказаў Іван знарок гучна, каб яго ўсе чулі.— Што ў нас новенькага?

— Ды быццам нічога асаблівага,— адказаў за ўсіх, пакінуўшы вастрыць аловак, Апанас Харчэня.

— А не асаблівага?..

— Таксама нічога,— засмяяўся Харчэня.

— Ці званілі адкуль па тэлефоне? — павярнуўся, паглядзеў на дзяжурную Іван Дарошка.

— Не, ніхто ніадкуль не званіў,— бойка затараторыла Надзя і падхапілася з лавы, выпрасталася, апусціўшы па швах рукі, быццам у школе перад настаўнікам.

— Сядай, не стой,— ласкава ўсміхнуўся Іван. Дзяжурства ў сельсавеце ўвялі нядаўна, не так проста яго напачатку было арганізаваць, але выгода ад дзяжурства

ўжо адчувалася — па-першае, прывыкалі людзі, што на свеце не ўсё спакойна, могуць быць кожны дзень, кожную хвіліну нечаканасці, а гэта людзей дысцыплінавала, не давала лішне расслабляцца; па-другое, у сельсавеце заўсёды, удзень і ўночы, быў чалавек: адкуль ні пазвоняць — ёсць з кім пагаварыць, ёсць каму нешта тэрміновае перадаць.

— Ну, калі ўсе ў парадку, то я ў сваю хату...

І Іван Дарошка, грукаючы ботамі, пакіраваўся ў баковачку, што не так даўно зрабілі ў сельсавеце, перагарадзіўшы дошкамі вялікую, бы стадола, хату на дзве палавіны: у большай цяпер сядзелі падначаленыя, меншую займаў старшыня. Шчыра кажучы, Іван быў супраць таго, каб аддзяляцца ад астатніх саслужбоўцаў, рабіць баковачку. Але раённае начальства настояла на сваім. Баковачка не так трэба старшыні сельсавета, як тым, хто сюды прыязджае,— розным камандзіровачным, упаўнаважаным. Хоць пераначаваць ёсць дзе, не трэба па ўсёй вёсцы шукаць месца. Ды і пагаварыць з вока на вока можна з чалавекам, ніхто нічога не пачуе, не перадасць. Паступова Іван прывык і сам да баковачкі. Як толькі надаралася вольная хвіліна — хаваўся за дзверы, калі, вядома, у баковачцы ніхто не жыў, не было там ніякага камандзіровачнага ці ўпаўнаважанага. Сёння Іван таксама меркаваў пасядзець за сталом, падумаць, а калі ўдасца, то і накіды зрабіць таго, пра што варта было б выступіць перад дэпутатамі на чарговай сесіі выканкома... Надта ж шмат самых розных, часам неверагодных, чутак, а то і плётак распаўзаецца па вёсках, «бабскае радыё» не спыняе работы, працуе ўдзень і ўночы, поўныя дваццаць чатыры гадзіны. І што самае крыўднае — вераць яму людзі. Вераць, бо недастаткова ўвішныя нашы агітатары і прапагандысты. Ды і камуністы, дэпутаты не заўсёды паказваюць прыклад партыйных адносін да чутак і плётак. Ні аднаго непрадуманага слова! Калі ж камуніст ці дэпутат чуе, як нехта абы-што плявузгае ці выдумляе, яго абавязак — прымусіць балбатуна замоўкнуць, даказаць, што ўсё тое, што людзі толькі што чулі,— няпраўда, даць марксісцка-ленінскае вытлумачэнне падзей і фактаў, спаслацца на працы таварыша Сталіна, які нічога не хавае, гаворыць з народам пра ўсё і так, як і трэба гаварыць — шчыра, даходліва, ясна... Іван сеў за стол, дастаў з шуфляды чысты сшытак, нават быў разгарнуў яго, але ў гэты час дзверы асцярожна рыпнулі, прачыніліся і ў баковачку ціхенька,

бы кот, нерухома трымаючы перад сабою сагнутую ў локці сухую левую руку, не зайшоў, а ўціснуўся Апанас Харчэня.

— Іван Мікалаевіч,— неяк быццам таямніча прашаптаў ён.— Вас хоча бачыць Вера Сымонаўна Ручанка...

— Што ў яе? — не зводзіў вачэй з Харчэні Іван.

— Не ведаю. Сказала, хоча бачыць вас. І ўсё.

Веру Сымонаўну Ручанку Іван Дарошка ведаў мала. Была яна не тутэйшая, велікалесаўская, а прыезджая. Працавала ў школе, выкладала матэматыку. Па водгуках жонкі, Каці, і дырэктара Андрэя Макаравіча Сушчэні, гэта была сціплая жанчына, выдатна ведала свой прадмет, умела тактоўна яго выкладаць. Праўда, не актывістка, ні з кім не сябравала, не абмяркоўвала ніколі ніякіх навін, нічога нікому пра сябе не расказвала. Была, словам, быццам нечым напалоханая. Усё, што было па-за матэматыкай, яе не цікавіла. У Веры Ручанкі амаль дарослая дачка, вучылася ў дзевятым класе. Больш ні Іван, ні ў школе пра Веру Ручанку нічога не ведалі. Не, ведалі яшчэ адно — дагэтуль Вера Ручанка жыла ў Мінску. І вось месяцы два таму назад пакінула горад, пераехала жыць і працаваць на Палессе, у Вялікі Лес.

— Гм,— адарваўшыся ад сваіх думак, гмыкнуў Іван.— Што ж, калі хоча мяне бачыць, то няхай заходзіць...

— А можа... Сказаць, вы занятыя, няхай другім разам зойдзе,— асцярожна папытаў Харчэня.

— Не, Апанас, я табе пра гэта гаварыў ужо, запомні і надалей. Не можа быць ніякіх неадкладных спраў, калі прыйшоў чалавек. Мы жывём і працуем дзеля людзей. Таму найперш наша ўвага і павінна аддавацца ім. Кліч Веру Сымонаўну, няхай заходзіць.

— Добра, Іван Мікалаевіч.

Апанас Харчэня мітнуўся, знік за сцяною. І ў тую ж хвіліну ў баковачку неяк надта ж асцярожна, далікатна, быццам баючыся, увайшла, акуратна зачыніўшы за сабою дзверы, Вера Сымонаўна.

— Дзень добры вам,— сказала яна, як падалося Івану, збянтэжана і патупіла ў падлогу вочы.

Іван Дарошка падняўся з-за стала, рухам рукі запрасіў сядаць на той цяжкі самаробны табурэт, што стаяў пасярод баковачкі:

— Калі ласка...

Вера Сымонаўна не села, а як бы прымасцілася на краёк табурэта.

— Вось мы нарэшце з вамі і сустрэліся,— сказаў Іван Дарошка, каб хоць нешта сказаць, пачаць размову.

— А што? — насцярожылася, палахліва, калюча ўскінула на Івана Дарошку свае ясныя, блакітныя, хоць і прыкметна зажураныя вочы Вера Сымонаўна.— Хіба вам трэба было са мною сустрэцца?

— Вядома, трэба было,— дабрадушна ўсміхнуўся Дарошка.

— Дык чаго ж вы мяне не паклікалі? — яшчэ больш насцярожылася, нават быццам узлавалася Вера Сымонаўна — і белы прыгожы твар яе аж перасмыкнуўся.— Вам што?.. Напісалі пра мяне?.. Прыслалі дакументы?..

І ў голасе Веры Сымонаўны пачуліся слёзы.

Цяпер збянтэжыўся Іван Дарошка. «Што з ёю? Яна нібыта чагось чакае, баіцца? Натапыраная, калючая...» Выйшаў з-за стала, сказаў:

— Я сёе-тое чуў пра вас...

— Што вы чулі? — перапыніла Івана, сцяла, аж прыкусіла, тонкія вусны Вера Сымонаўна.— І ад каго?..

«Чаму яна так востра, нервова ўспрымае кожнае маё слова? — падумаў Іван.— Няўжо і ў школе яна такая? Трэба будзе ў Каці запытаць». Веры ж Сымонаўне сказаў:

— Добрае пра вас чуў... Толькі добрае. Ад жонкі, Каці. Яна захапляецца вамі, тым, як вы абыходзіцеся з вучнямі, выкладаеце прадмет... А што я хацеў сустрэцца... Дык гэта вы павінны разумець. Вы прыехалі ў наш Вялікі Лес, жывяце тут, працуеце з маёю жонкаю, а я вас так і не ведаю, не сустракаліся мы вось так, з вока на вока, ні разу, не гаварылі...

Дзіўна, але Іванавы словы не супакоілі жанчыну, а насцярожылі яшчэ больш. Вера Сымонаўна як бы паглыбілася ў сябе і хвілін колькі маўчала, не падымала ад падлогі вачэй.

— Я чула, што вы гаварылі свайму сакратару,— урэшце вымавіла яна.— Мне спадабаліся вашы словы: «Усё дзеля чалавека». Дык давайце ж чалавека і шанаваць...

«А хіба я не шаную?.. Ну хоць бы і яе? — падумаў зноў Іван Дарошка.— Дзіўна. То яна на нешта намякае, то раптам ледзь не папракае ў нечым?»

— Вера Сымонаўна, выбачайце, але я не зусім разумею вас,— сказаў, зрабіўшы асаблівы націск на слова «вас», Іван Дарошка.

— Затое я вельмі добра разумею вас,— зрабіла таксама націск на слова «вас» Вера Сымонаўна.

— Што вы разумееце? Скажыце.

— І скажу. Вы ўсё ведаеце пра мяне. І хочаце ўтаіць, каб я не здагадалася...

Вера Сымонаўна аж задыхалася — так нялёгка было ёй сказаць тое, што яна ўсё ж набралася смеласці і сказала.

— Гм,— усміхнуўся неяк быццам трохі нават роблена Іван Дарошка.— Што, напрыклад, як вам здаецца, я ведаю?

— Што? Тое, што і я ведаю...

І Вера Сымонаўна падняла вочы ад падлогі, паглядзела на Івана. Іван улавіў — пагляд халодны, ледзяны. І чужы-чужы.

— Ну, калі вы мне не гаворыце, дык я сама вам скажу,— зашаптала горача, хутка, амаль без пярэдыху, праз зубы Вера Сымонаўна.— Так, гэта праўда, я жыла з чалавекам, які цяпер... не са мною, не з намі... не тут...

«Вунь яно што!»

— Выбачайце, але я пра гэта нічога не ведаю,— спакойна глядзеў на жанчыну Іван Дарошка, у душы радуючыся, што нарэшце пачуў прычыну такой насцярожанасці і скрытнасці Веры Сымонаўны.

— Вы ўсё, вы ўсё ведаеце,— зноў калючым паглядам ледзяных вачэй пранізала Івана наскрозь Вера Сымонаўна.— І вы, і ваш брат Косцік...

— Пры чым тут мой брат Косцік? — здзівіўся яшчэ больш Іван.

— А пры тым...

І Вера Сымонаўна падхапілася з табурэта, падбегла да стала, за якім стаяў Іван Дарошка. Худымі, доўгімі пальцамі нервова расшпіліла сумачку, якую дагэтуль трымала, як бы хаваючы, збоку ў руцэ, і дастала адтуль даволі ладны камень-дзікар.

— Бачыце гэты камень? — спытала яна ў Івана.

— Ну-у, бачу,— нічога не разумеў Іван Дарошка.

— Дык вось, гэты камень учора ўночы ваш брат Косцік запусціў мне ў акно. Пабіў, вядома, шыбу і проста выпадкова не пацэліў у галаву... Каб пацэліў... Мне... Не жыць бы.

— Адкуль вы ведаеце, што камень, як вы кажаце, запусціў мой брат Косцік?

— Іншаму няма каму. Косцік, напэўна, думае, што я наскардзілася дырэктару і яго выключылі са школы з-за мяне. Але гэта не так, я нікому на яго не скардзілася.

Больш таго — я была супраць, каб выключаць вашага брата са школы. Але сам Косцік, мусіць, гэтага не ведае. І помсціць, чэпіцца да мяне і мае дачкі Тасі. Не так да мяне, як да Тасі. Праходу проста не дае. Калі ён думае, што я дарую яму, ён памыляецца. Я падам на яго... у суд...

Іван Дарошка цяжка апусціўся ў крэсла. Ашчаперыў рукамі галаву, упёрся локцямі ў стол. Задумаўся. «Нічога сабе размова! Збіраўся сустрэцца, пагаварыць... І вось сустрэліся, пагаварылі...»

Пачуў — Вера Сымонаўна ўсхліпвае, плача. Адарваўся ад сваіх думак, паглядзеў на Веру Сымонаўну — яна сядзела на табурэце і, адвярнуўшыся, схавала твар у далоні, плакала. Худыя плечы ўздрыгвалі разам з лёгкім кветастым плаццем, у якое была гожа, па-гарадскому апранута Вера Сымонаўна.

— Супакойцеся,— сказаў як мага лагодна, са спачуваннем Іван Дарошка.— Паверце шчыраму майму слову — я не ведаў нічога пра вашага мужа... Не ведае гэтага, я ўпэўнены, і Косцік... Тое, што Косцік, як вы кажаце, чэпіцца да вашай дачкі, Тасі, трэба будзе мне самому... Хоць сам я... Парваў усякія адносіны з бацькам, правільней, бацька са мной. Але з Косцікам я пагавару... Гэта я абяцаю. Бач, што вытварае! Аж брыдка чуць. Не, трэба заняцца ім сур'ёзна, пакуль хлопец зусім не адбіўся ад рук... Што ж да каменя, які Косцік кінуў вам уночы ў акно... Глядзіце самі. Лічыце, што трэба справу перадаваць у суд, калі ласка. Ніякіх перашкод чыніць вам ніхто не будзе. Не думайце, калі Косцік мне брат, я стану яго абараняць. Я камуніст, старшыня сельсавета... І сваяцтва... Ні пры чым... Я з бацькам родным... Э-э, ды не пра тое размова...

Вера Сымонаўна перастала плакаць. Дастала белую хустачку, выцерла, нібыта прамакнула, вочы. Сказала, усё яшчэ гледзячы не на Івана, а некуды ўбок:

— Не верыць вам... У мяне... Словам, я ведаю трохі вашу жонку — Кацярыну Антонаўну і хачу думаць: муж у яе такі ж шчыры і праўдзівы, як і яна сама. Даруйце, калі я... Пакрыўдзіла вас. Але зразумейце мяне. Я столькі перажыла, перахвалявалася. А тут раптам гэты яшчэ ваш Косцік... Гэта зусім выбіла мяне...

Вера Сымонаўна павярнулася тварам да Івана, і Іван зноў убачыў перад сабою тую Веру Сымонаўну, якую дагэтуль яму даводзілася разы два-тры бачыць з прэзідыумаў розных пасяджэнняў і сходаў,— сціплую, спакойную

і... прыгожую. Надта прыгожую, як адзначыў пра сябе Іван. Мо таму так кінулася цяпер у вочы прыгажосць Веры Сымонаўны, што ад хвалявання і слёз жанчына трошкі расчырванелася, на шчоках у яе прабіўся ледзь прыкметны румянец. Румянец як бы асвятляў блакіт вачэй, бялявыя, завітыя кудзеркамі валасы. «А яна ўмее трымацца»,— падумаў з павагай пра жанчыну Іван Дарошка.

— Акрамя таго, што я Тасіна маці, я яшчэ і педагог,— гаварыла між тым Вера Сымонаўна.— Таму я і прыйшла менавіта да вас, Іван Мікалаевіч. І як да старшыні сельсавета, і як да старэйшага Косцікавага брата. Вазьміце ў рукі Косціка, бо... Інакш ні за што ні пра што прападзе хлопец. Нехта ўплывае на яго. Уплывае не лепшым чынам...

— Добра, я пагавару з Косцікам... Гэта мой абавязак. І як старэйшага брата, і як старшыні сельсавета. Пра ўсё пагавару. Дзякуй, што папярэдзілі, сказалі пра тое, на што я не глядзеў, пра што не думаў...

Іван Дарошка падняўся з-за стала, бо адчуў: размова скончана, Вера Сымонаўна выказала ўсё, што было ў яе на душы, што хацела выказаць, і збіраецца пакінуць баковачку. Але Вера Сымонаўна не спяшалася выходзіць. Яна засяроджана пра нешта думала, думала, потым раптам папрасіла:

— А пра мужа майго... Пра тое, што ён... Не гаварыце. Нікому не гаварыце. Нават жонцы, Кацярыне Антонаўне. Добра?

І надта ж даверліва, амаль па-змоўніцку паглядзела проста ў вочы Івану, усміхнулася.

— Тым больш што яго... Ён хутка можа быць на волі, зноў з намі,— дадала яна ціха, амаль шэптам.

— Гм... Добра,— паглядзеў гэтак жа даверліва, па-змоўніцку і Іван Дарошка на Веру Сымонаўну і ўсміхнуўся, хоць сам сабе і падумаў: «А дзе, дзе яе муж?.. Што з ім магло здарыцца, чаму ён не з сям'ёю, не тут, не на «волі»? Ды і сама Вера Сымонаўна паводзіць сябе... Чагось баіцца, нешта не дагаворвае... Гм?»

Перад самым абедам у баковачку да Івана Дарошкі ўбегла загадчыца магазіна Ліда Шавейка. Была яна ўзрушаная, ад чаго вялікія чорныя вочы яе яшчэ пабольшалі, грудзі аж хадзілі — ім, тугім, пышным, цесна было ў

белай паркалёвай кофтачцы, здавалася, кофтачка не вытрымае, вось-вось лопне.

— Іван Мікалаевіч,— разгублена сказала Ліда, прыпыніўшыся ў парозе.— Не ведаю, што і рабіць...

— А што? — пільна глядзеў на Ліду Іван Дарошка.

— Проста бяда, магазін з усіх бакоў людзі асаджаюць. Соль па пуду, па два бяруць.

— Зноў нехта чутку пра вайну пусціў?

— Цыганы. Учора спыняліся на лузе, і аднавокі лысы Пецка напрарочыў вайну. Вось і кінуліся людзі соль браць.

— А ты?

— Што я?.. Спярша па дзесяць кілаграмаў давала, потым па кілаграму. Але людзі крычаць, патрабуюць. Я магазін зачыніла, быццам на абед мне пара. І да вас вось... Парайце, што рабіць?

Іван Дарошка і сам учора бачыў, як ехалі па Вялікім Лесе цыганы. Якраз з працы дадому, да свае сям'і, вяртаўся. Але ў бярэзнік, да цыганскіх вогнішчаў, разам з іншымі вяскоўцамі не хадзіў. «А дарма,— падумаў Іван.— Па-першае, чуў бы сам на свае вушы, што балбатаў гэты стары манюка Пецка. Па-другое, калі б што якое, прыстрашыў бы, а то і прагнаў бы з бярэзніку цыганоў, хопіць, маўляў, людзей адурманьваць ды страшыць, прэч адсюль...»

«Гм»,— пашкадаваў цяпер Іван Дарошка, што даў маху, не пайшоў да вогнішчаў. Лідзе ж сказаў:

— Правільна зрабіла, што зачыніла магазін. Ідзі абедай...

— А пасля абеду што рабіць?

— Пасля абеду...

Сапраўды, што рабіць пасля абеду?.. Адчыніць магазін, прадаваць соль — значыцца, патураць упадніцкім, нездаровым настроям. Калі паніцы паддаліся адзінкі, асобныя людзі, дык паддадуцца і астатнія, тыя, хто дагэтуль не паддаваўся. «Выходзіць, трэба не адчыняць магазін, не прадаваць солі. І наогул нічога ніякага не прадаваць, прымусіць, каб людзі разышліся па хатах».

— Пасля абеду... Можа, ты на базу паедзеш ці яшчэ куды?..— хітравата пачухаў патыліцу Іван Дарошка.

— Дык яно мне і трэба было б на базу з'ездзіць. Даўно збіралася, ды каня няма,— ухапілася за прапанову старшыні сельсавета, як за саломінку, Ліда Шавейка.

— Майго каня вазьмі,— усё глядзеў і глядзеў, не мо-

гучы адвесці вачэй ад Ліды, Іван Дарошка. («Слаўная, слаўная дзяўчына. Бачыш, не разгубілася, здагадалася ў сельсавет прыбегчы. Значыцца, палітычна свядомая»,— радаваўся за Ліду.) — Знайдзі конюха, Кузьму, і едзь з ім на базу...

— А з людзьмі як жа? Яны ж стаяць будуць ля магазіна, чакаць, калі я вярнуся...

— Не турбуйся, я сам з людзьмі пагавару,— паабяцаў Лідзе Іван Дарошка.

— Ну, то вялікае дзякуй вам,— трохі быццам засаромелася Ліда і адступіла за дзверы, збіраючыся пайсці.

— Гэта я табе павінен дзякаваць,— падняўшыся з-за стала, сказаў Іван Дарошка.

— За што? — аж залілася чырванню Ліда.

— За тое, што не разгубілася, у сельсавет прыбегла. І далей так рабі: калі што якое, прыходзь.

— Буду прыходзіць,— і Ліда лёгка, весела не выбегла — выпырхнула, вылецела з сельсавета.

З абеду зноў на працу Іван Дарошка пакіраваўся па вясковай вуліцы. Хацелася непрыкметна, быццам незнарок, падысці да магазіна — ён мясціўся ў старым драўляным доме былога кулака Сцяпана Пяхоты,— ды і даўнавата ўжо не хадзіў Іван па вёсцы. Розныя спешныя справы прымушалі заўсёды выбіраць карацейшую сцежку. Выйдзеш з дому, мінеш напрасткі людскія гароды — і ў сельсавеце. Хутка, а галоўнае зручна, дарога цвярдзейшая, не тое што ў вёсцы. У вёсцы ўсюды, на кожным кроку, пясок. Сухі, сыпучы. І глыбокі-глыбокі. Месіш, месіш яго — і ўсё адно як на адным месцы стаіш, бо едзе з-пад падэшваў пясок, апоры ніякай няма. Машыны буксуюць, калёсы па самыя панарады коламі ў пяску топяцца. Неаднойчы на сесіях выказваліся дэпутаты, каб нешта зрабіць з вуліцай, намасціць дарогу з камення, ці што. Ён, Іван, таксама пра гэта шмат разоў гаварыў у раёне. Але на такое паляпшэнне вуліцы трэба былі грошы. І немалыя. Будаўніцтва дарогі адкладвалася з году на год. І цяпер, беручыся паўз платы, дзе плялася, расла трава-мурава і было трохі цубчэй, Іван думаў, што адклад рэдка ў якой справе ідзе на лад, а ў такой, як іхняя дарога, і зусім прыносіць шкоду. З кожным годам большае і большае машын, і гэта марнатраўства не мець добрай дарогі. Буксаванне ў пяску зношвае раней часу машыны, без карысці згарае

бензін, дый што за дзесяць хвілін можна было б праехаць, траціцца па гадзіне...

«Трэба будзе ліст на імя старшыні райвыканкома падрыхтаваць,— вырашыў Іван.— Падключыць калёсаабозны завод, навакольныя калгасы... І дамагацца ўсімі сіламі, каб будаўніцтва дарогі ўсё ж паставілі ў план. Дый саміх людзей мабілізаваць... Варушыцца трэба, бо пад ляжачы камень вада не бяжыць...»

Вуліца пуставала. Мо таму, што дзень выдаўся цёплы, пагодлівы — свяціла, аж пякло, высокае паўдзённае сонца, неба было амаль без хмар — і кожны шчыраваў: хто на калгасным полі, хто дома, у сваім гародзе: палолі, капанічылі грады, абганялі бульбу. Паўз платы валюхалася, няйнакш, шукала дзіркі, каб залезці ў шкоду, рохкаючы і сонна водзячы сюд-туд выпацканым у гразь лычом, вялізная, што гара, свіння, ды бег, кудысьці спяшаўся рыжы перахлябісты сабака. Тут і там у пяску кешкаліся, грэбліся куры. Вёска аставалася вёскаю, здавалася, нічога ў ёй нідзе не мянялася — тыя ж пачарнелыя, месцамі нават парослыя зялёным мохам шулы, вароты, платы, крытыя чаротам, саломаю і дранкаю хаты з маленькімі падслепаватымі вокнамі, жураўлі калодзежаў амаль ля кожнага двара... Але гэта толькі здавалася, што ў вёсцы нічога не змянілася. Змянілася, за апошнія гады многае-многае змянілася! А найперш — змяніліся, па-іншаму пачалі жыць і думаць людзі. І хто-хто, а ён, Іван Дарошка, гэта ведаў. Вось хоць бы тая самая Ліда Шавейка. Бацька бядняк з беднякоў, ніколі хлеба ўволю не еў. А за гады Савецкай улады хату новую пабудаваў, дачка сем класаў скончыла, у магазіне каторы год працуе. Камсамолка, актывістка. І бачыш — у сельсавет прыбегла, не разгубілася... Вядома, нішто само па сабе не мяняецца. Патрэбны пэўныя ўмовы і сілы, каб нешта змяніць, асабліва ў такім заскарузлым укладзе, як сялянскі. Савецкая ўлада, бальшавікі знайшлі гэткія ўмовы і сілы. Вырвана з карэннем кулацтва, аднаасобніцтва. Новае калгаснае жыццё ўвайшло ў побыт вёскі. Гэтае жыццё нараджае і новыя адносіны між людзьмі. Калі раней чалавек дбаў і хваляваўся толькі за сябе, дык цяпер дбае і хвалюецца за ўсіх. Не толькі за суседзяў, тых, з кім жыве ў вёсцы, але і за тых людзей, што далёка—у Іспаніі, Германіі, Кітаі... Сочыць за падзеямі, хоча нейкім чынам паўплываць, а то і дапамагчы працоўным усяго свету. Вядома, усё новае не прыходзіць без барацьбы, без змагання. Не-не дый дае старое пра сябе

знаць, заглушае, а то і забівае новае, народжанае савецкім ладам... Вось хоць бы гэтая самая паніка з вайною. Варта было нейкаму цыгану нешта балбатнуць, як людзі з мяшкамі і торбамі кінуліся ў магазін. Напакутаваліся ў нядаўнім мінулым без солі. Баяцца, каб не паўтарылася тое, што было ў пятнаццатым, ды і ў шаснаццатым, семнаццатым, васемнаццатым гадах... Зразумець людзей можна. Хоць разбірацца, хто кажа праўду, а хто маніць, пускае розныя плёткі, і пара б ужо, даўно пара. Ды калі толькі... Хай асмеліцца Гітлер напасці на Краіну Саветаў, ураз скрышыць рогі... Гэта яму не Бельгія, не Польшча, не Францыя... І соль... Заўсёды ў магазіне будзе. Колькі трэба, столькі яе і прывязуць... Хіба няма адкуль і на чым прывезці?!

«Дурны мужык, як варона» — успомніліся Івану Дарошку словы паэта Францішка Багушэвіча, чытаныя ў школьным падручніку.

«Хоць і абразліва, і не пра цяперашняга селяніна... Але... Доля праўды ў словах Багушэвіча ёсць! — цвердзіў сам сабе Іван Дарошка.— Дурны-то дурны, а возьме нешта ў галаву, што ні рабі, як ні даказвай — не пераканаеш. Упартасці — як у быка... І страшыць, пагражаць не хочацца, і даказваць... Марная трата энергіі і часу...» Каго-каго, а свайго, вялікалесаўскага, селяніна Іван добра ведаў. Пражыў жа амаль усё сваё жыццё тут, у вёсцы. І сутыкаўся з ім штодня. Па самых розных справах. Часам важных, а часам і зусім дробязных. І вось сёння зноў давядзецца яшчэ раз сутыкнуцца. «Гм... Нідзе не дзенешся — давядзецца... Узяўся за гуж, не кажы, што не дуж...»

Магазіна яшчэ не відаць за пагоркам, але, па меры таго як Іван Дарошка ішоў, набліжаўся да яго, усё ясней, выразней і выразней чуліся людскія галасы і крыкі. «Няўжо ўсе тыя, хто не ў полі, да магазіна пабеглі? Сабраліся там і гарлапаняць, пуду адно аднаму паддаюць... Таму і на вуліцы, мабыць, нікога, ні чалавека няма...»

Не хацелася верыць у гэта, але і не верыць...

Рыпнулі, адчыніліся веснiцы, на вуліцу выйшла... «Ага, хто ж гэта? А-а, Коўдрава Мар'я, маці Піліпавай жонкі, Клаўдзі». Засяроджаная ў сабе, з мяшком у руцэ. Не азіраючыся, нікога не бачачы, пабегла, папылiла да магазіна.

З тых жа весніц усяго праз якую хвіліну паказалася дзяўчо. У доўгай, па пяты, бундзе, босае. Пайшло насустрач Івану.

«А гэта... Чыё?»

Калі дзяўчынка наблізілася, спытаў:

— Чыя ж ты будзеш, красуня?

— Дзям'янава,— адказала, спыніўшыся, дзяўчынка.

— Дзям'яна Сучка́?

— Аге.

— А да Коўдравых чаго хадзіла?

— Сказаць, кеб па соль ішлі. Бо калі разбяруць, тады ні за якія грошы нідзе не дастанеш...

— Хто цябе пасылаў да Коўдравых?

— Мама.

Успомніў Іван: Мар'я Коўдрава і жонка Дзям'яна Сучка, Аўдуля,— родныя сёстры.

«Гм»,— гмыкнуў, пакруціў галавою Іван Дарошка і пайшоў, пакіраваўся ўслед за Мар'яй да магазіна.

Аж млелі, не хацелі згінацца ў каленях ногі, не так, мабыць, ад напружання і гарачыні, як ад унутранага хвалявання, трывогі, калі падымаўся Іван Дарошка на той пагорак, за якім па левы бок вуліцы трохі зводдалі ад дарогі чырванеў бляшаным дахам магазін. Усміхнуўся, убачыўшы натоўп, што вірыў, таптаўся там, наперадзе, ля ганка магазіна.

«Хоць міліцыю выклікай...» — падумаў сам сабе.

Як кіраўнік Іван ведаў: цяпер многае будзе залежаць ад яго, старшыні сельсавета. Нават ад першага слова, што ён скажа, падышоўшы да людзей.

«Можа, усё ж прыстрашыць... Сказаць: «Тыя, хто сее паніку, адкажуць паводле законаў...»

Адразу ж адагнаў ад сябе гэтыя думкі — што заўгодна, толькі не страшыць людзей. Страх — дрэнны дарадчык. Страхам хваробу можна загнаць углыб, а не вылечыць.

«Трэба пераканаць людзей, рассеяць страх, зрабіць усё, каб людзі самі пасмяяліся з сябе, з таго, што паддаліся паніцы, паверылі прыблудзе — цыгану, і спакойна спалі, спакойна працавалі. Калі я гэта не зраблю — цана мне, кіраўніку, ломаны грош...»

«Але як гэта зрабіць?» — падкрадвалася, палохала, халадзіла ўсяго думка.

І Іван ішоў і ішоў па пяску вясковай вуліцы, грэбаўся і грэбаўся, у душы радуючыся, што пакуль не раззлаваўся, не паддаўся гарачнасці, не змяніў сваёй звыклай павольнай хады.

Падняўся на пагорак, вочы пачалі вылучаць асобныя знаёмыя постаці, твары жанчын, мужчын... Людзі, адчувалася, былі незадаволеныя, што магазін зачынены, што не

даюць таго, чаго ўсе так хочуць, прагнуць узяць. І таму размахвалі раз-пораз рукамі, нешта адзін аднаму наўзахапкі гаварылі, даказвалі, нават ці не пагражалі камусьці.

«Хм,— ухмыльнуўся сам сабе Іван Дарошка.— Што ж мне зрабіць? Падысці да людзей, пасарамаціць: маўляў, чаму паддаліся паніцы? Расказаць, што і дзе дзеецца на свеце... Пастаяць, пачакаць, калі людзі разбрыдуцца, а тады і самому пакіравацца ў сельсавет?»

Але нейкая падспудная, нутраная сіла супраціўлялася, не ахвоціла на гэта.

«Пачнуць задаваць пытанні. Ці змагу я на ўсе адказаць? Ды яшчэ так, як трэба. А раптам не паслухаюцца мяне людзі, не разыдуцца? Што тады рабіць? Настрой натоўпу можа перадацца і мне. Я раззлуюся, пачну страшыць, пагражаць... А гэта не хацелася б...»

Выйшла ж усё нечакана. І добра, проста, зусім не так, як уяўляў Іван Дарошка. Ледзь толькі наблізіўся да натоўпу, запрыкмеціў, вылучыў з усіх знаёмых брата, Піліпа,— ён гэтак жа, як і іншыя, тоўкся з парожнім мяшком каля магазіна. Нягледзячы на тое, што Іван парваў усякія адносіны з бацькам, з Піліпам па-ранейшаму і віталіся, і гаварылі, хоць у госці адзін да аднаго і не хадзілі. Піліп стаяў трохі збоку, непаголены, пануры, у карэлай, даўно не мытай, выцвілай кашулі і палатняных, па калена забрoджаных у ржу нагавіцах. «Мусіць, па ўюны нядаўна хадзіў»,— падумаў Іван і моўчкі папраставаў да брата, падаў яму руку. І толькі тады, калі Піліп сваёй мазолістай і клешчаватай рукою ашчаперыў яго руку, са смяшком не то сказаў, не то спытаў:

— І ты паддаўся паніцы?..

І, не пачакаўшы, што адкажа Піліп, адчуваючы ўсім сваім целам — натоўп павярнуўся да яго, старшыні, і застыў, стаіўся, ловіць кожнае слова, што ён, Іван, гаворыць брату, сказаў:

— Ідзі дадому. Усё адно працаваць магазін сёння не будзе, Ліда паехала на базу...

Перавёў дух і ўжо мацней, каб чулі яго ўсе:

— Ды і солі на ўсіх хопіць, можаш не запасацца. Спі спакойна, вайны не будзе, не бойся...

«Што яшчэ сказаць? А можа, нічога не казаць, даволі? І з людзьмі... Гаварыць ці моўчкі прайсці міма?»

Павярнуўся да натоўпу, убачыў насцярожаныя, дапытлівыя твары, пагляды... Знаёмыя і разам з тым быццам незнаёмыя, нейкія новыя, трывожныя.

«Не, не сказаць ні слова нельга. Людзі чакаюць гэтага слова, яны прагнуць што-небудзь пачуць, як, можа быць, ніколі яшчэ не прагнулі».

— Хіба не казала Ліда, што паедзе на базу і працаваць сёння не будзе? — спытаў ён нібыта ні ў кога і ва ўсіх.

— Казала,— прастагнала некалькі чалавек.

— Дык чаго ж вы не верыце, стаіце?.. І наогул не верыце нам, кіраўнікам, газетам нашым, а верыце нейкаму прыблудзе цыгану. Пра іншае, весялейшае думайце, а не пра вайну!..

Прымусіў сябе ўсміхнуцца і, ужо не прыслухоўваючыся, што будуць пытаць ці казаць людзі, паволі, вельмі нават паволі, як здалося яму, пайшоў, пагробся да сельсавета.

«Што далей будуць рабіць людзі? — віліся ў галаве неспакойным роем думкі.— Павераць мне, разыдуцца?»

Хацелася азірнуцца, паглядзець, што там, ля магазіна, пасля сказаных ім слоў, пасля таго, як скрануўся з месца, пайшоў. Але ён, Іван, пераадолеў у сабе гэтае жаданне. «Нельга, нельга азірацца. Я ўпэўнены ў сабе, у тым, што сказаў. І няхай гэта людзі бачаць. Не пасеяць ні цені сумнення, ні цені нявcovery. Так, і толькі так...»

Адчуў — аднекуль з сярэдзіны, падспудна, мімаволі яго ахапляе, перапаўняе радасць. «Усё ж вытрымаў, не сарваўся, не закрычаў, не пачаў страшыць людзей».

Гэтая радасць аж выбухнула ціхім смехам, калі праз паўгадзіны зайшоў у старшынёўскую баковачку Апанас Харчэня і далажыў: ля магазіна няма ні душы — усе людзі разышліся па хатах.

«Паверылі... Паверылі мне. Ды нават не мне — уладзе нашай, яе словам...»

## V

Косцік не разумеў сам сябе. Жыў, жыў, вучыўся ў школе, усё ішло ладна-складна, і раптам... Нібы чорт які ўсяліўся. І хацеў бы не пакрыўдзіць каго, а пакрыўдзіш, і хацеў бы не зрабіць глупства, а зробіш. Вось і ўчора, увечары... Хадзіў разам з іншымі ля цыганскіх агнёў, глядзеў не на такіх, як усе людзі, а нейкіх дзівакаватых цыганоў і цыганак, на іх напятыя з палатна і крамніны буды на вазах, слухаў вясёлыя, разгульныя песні, і на душы было ціхамірна, трохі нават тужліва. А ўбачыў Тасю — і быццам падмяніў хто, быццам штурхаць пачаў, на вуха шаптаць:

«Утвары, утвары нештачка такое, каб на цябе глядзелі, каб усе гаварылі: «Во ета Косцік дык Косцік!» Добра, што Тася на лузе доўга не забавілася, дадому пайшла. А так бы... Утварыў ён, Косцік, яшчэ там, ля цыганскага табара, глупства. Бо Тася — ганарыстая, і не паглядзела, вокам не кінула... Прайшлася, нібыта незнаёмая. Не ўбачыла, не пазнала? Не, убачыла, пазнала, проста прытварылася, што не ўбачыла, не пазнала. Пакрыўдзілася, няйнакш. А чаго? Ён жа, Косцік, нічога благога зрабіць ёй не хацеў і не хоча. Наадварот — пра добрае, толькі пра добрае марыць і дбае. «Эх, Тася, Тася! І чаму ты мяне так мучыш,— думаў, кіруючыся з лесу назад, у вёску, Косцік.— Быццам і не чалавек я зусім, быццам немаведама што... Канечне, я не жыў у горадзе, я не сын якога-небудзь начальніка. Але ж я, можа, таксама не буду вечна сядзець у вёсцы. Вось прызавуць у войска, папрашуся ў лётчыкі... Ці ў маракі... Прыеду — не пазнаеш. І пашкадуеш, што была са мною такая непрыступная, гордая... І чужая...»

І зноў, як і ўсе ранейшыя дні, калі заставаўся на адзіноце, сам-насам, пачаў выдумваць-уяўляць, як будзе гаварыць з Тасяю, стаўшы лётчыкам ці мараком. «Ах, гэта вы той Косцік? Я з вамі вучылася калісьці ў школе. Помніце? А я вас не пазнала»,— скажа, усклікне Тася. А ён пройдзе міма і не паглядзіць. Потым, вядома, крокаў праз колькі спыніцца. «Ах, это вы, Таиса... Здравствуйте, здравствуйте!» Пра што і як размаўляць яны будуць далей — ён, Косцік, не ведаў. Многае, вядома, будзе залежаць ад таго, куды выкіруюцца іх адносіны цяпер. «Цяпер...» Неаднойчы думаў ён, Косцік, над гэтым «цяпер» і кожны раз мусіў прызнаць — цяпер пакуль што ніякіх надзей на лепшае ў яго няма. Тася як была чужая, незнаёмая, такой і заставалася. Вучылася добра, адказвала настаўнікам на любое пытанне, апраналася лепш, чым усе астатнія дзяўчаты, і... Нягледзячы ні на што, не сябравала, не збліжалася асабліва ні з кім. Адна хадзіла ў школу, адна хадзіла са школы. Ідзе, горда падняўшы галаву, станістая, і амаль ні на каго не глядзіць, толькі партфельчыкам з бліскучымі спражкамі памахвае. «Тася, Тася! Ведала б ты, як чакаю я шторанак, калі будзеш ісці па вуліцы міма нашай хаты... Ад акна не адыходжу, пакуль не ўбачу... А потым чакаю, чакаю, калі назад са школы будзеш вяртацца... Чакаю і пішу, пішу табе запіскі, прызнаюся ў каханні. Напішу, прачытаю і са злосці падзяру. Не так, не так трэба пісаць, словы не тыя, дый почырк нейкі няроўны, адразу

пазнаць можна, што хваляваўся, рука калацілася, калі літары выводзіў...» І сустрэчы з Тасяю ён, Косцік, чакаў, даўно чакаў. Чакаў і рыхтаваўся. Неаднойчы ўяўляў, як будзе праходзіць тая сустрэча, сустрэча не ўдзень і не на людзях... І кожны раз уяўляў сустрэчу тую па-новаму. Вось ён набліжаецца, падыходзіць да Тасі, бярэ яе за руку, і... Што будзе за гэтым «і», ён, Косцік, не ведаў. Толькі б падысці, калі іх ніхто не бачыць, толькі б узяцца за руку. А там, адчуваў, будзе нешта вельмі прыемнае, трапяткое, добрае... Вядома, усяго, што на душы, не скажаш. Прынамсі, у першы раз. А сказаць трэба. Трэба, каб Тася ведала, чым ён жыве, што хвалюе яго, чаму паводзіць сябе не так, як паводзяць астатнія равеснікі. Таму ён, Косцік, і насіў заўсёды пры сабе запіску. Запіску да яе, Тасі. Запіска штодзень перапісвалася, мяняліся словы і сказы, аставалася нязменным толькі адно — пачуццё. Пачуццё да яе, Тасі. І ўчора запіска была пры ім. І ён памкнуўся быў перадаць запіску ёй, Тасі. Але...

Косцік ад крыўды аж кусаў губы, твар яго заліваўся сорамам, калі ён успамінаў учарашняе. «Ета ж трэба, каб усё зрабілася так бязглузда»,— дакараў ён сябе. Пакуль бавіўся з хлопцамі, не асмельваўся наблізіцца да Тасі, чакаў, калі яна хоць на хвіліну аддаліцца ад дзяўчат-аднакласніц, з якімі прыйшла на луг, тая знікла, усё адно як растала. Калі — Косцік і не заўважыў. Ён, Косцік, не стаў чакаць, што скажа, напрарочыць аднавокі лысы Пецка,— яго гэта зусім не цікавіла,— кінуўся бягом у вёску. І бег, бег, аж пакуль не дагнаў дзяўчат. Але ўбіцца ў іх гурт нешта стрымала яго, і ён паплёўся ўслед за імі назіркам, трохі здаля. І ўсё ж дачакаўся, калі Тася асталася адна. Бо астатнія дзяўчаты, з якімі Тася хадзіла на луг да цыганскіх вогнішчаў, жылі бліжэй, ім не трэба было ісці дадому так далёка, аж за грэблю. То адна, то другая, дайшоўшы да свайго двара, спынялася, шаптала ці крычала: «Дабранач» — і хавалася за весніцамі. Апошняя ж, Ліза Галушка, спытала ў Тасі: «Можа, правесці цябе дахаты?» — «Не, не трэба, і адна дайду».— «Ну, як хочаш»,— і Ліза мітнулася ў свой двор, а Тася як не бегма кінулася за грэблю, на Замосце, дзе жылі яны з маці ў старога Ахрэма Куляша. Ён, Косцік, таксама прыбавіў кроку, а потым і пабег, бо зразумеў: Тасю можа не дагнаць, калі не пабяжыць. Тася, пачуўшы, што за ёю нехта гоніцца, памчала яшчэ шпарчэй.

«Тася, не бойся, ета я!» — крыкнуў Косцік наўздагон.

Але Тася не спынілася.

«Не пачула? Не пазнала? А мо спыняцца не захацела?»

Косцік добра бегаў, бадай, лепш за ўсіх у школе. Таму Тасю ён хутка дагнаў. За грэбляю, адразу ж ля першых канцавых хат Замосця.

«Што табе трэба?» — задыхана спытала Тася і заплакала.

Ён хацеў наблізіцца, супакоіць, але Тася ў наступную хвіліну зноў кінулася з усіх ног уцякаць.

Косцік больш не даганяў Тасі, падаўся памалу ўслед за ёю, бачачы, як яна аддаляецца і аддаляецца ад яго: белая хустка нейкі час мільгала наперадзе, потым і зусім знікла ў цемры.

Параўняўшыся з хатаю старога Куляша, дзе жылі Тася са сваёю мамаю, ён, Косцік, спыніўся, паглядзеў на вокны. У адным акне, тым, што ад вуліцы, справа, была адчынена фортачка. І яму, Косціку, цюкнула: «А што, калі... Знайсці камень, прывязаць да яго запіску і... шпурнуць у фортачку? Тася падыме камень, убачыць запіску. І, вядома ж, прачытае... Хоць ведаць будзе пра мае пачуцці і другі раз не ўцякацьме...»

Астатняе ўсё рабілася само па сабе, міма яго волі. Намацаў нагамі камень, падняў яго. Камень быў халодны і мокры. Мокры, відаць, ад расы.

«А чым прывязаць запіску?»

Расшнураваў чаравік, дастаў з кішэні запіску, самую апошнюю, што напісаў надвячоркам, перад тым як пайсці да цыганскага табара на луг, прывязаў яе да каменя.

Сэрца білася ў грудзях, ад хвалявання аж перасохла ў горле.

Зрабіў крок, другі да плота, размахнуўся і... Адчуў: запіска і шнурок асталіся ў руцэ, а камень... Перш чым ён, Косцік, падумаў, дзе камень, пачуў, як дзынкнула, а потым і пасыпалася з акна пабітае шкло.

«Што я натварыў?»

З усіх сіл даў лататы ад хаты старога Куляша. І чамусьці бег не да грэблі, не ў той канец, дзе жыў, дзе была бацькава хата, а ў супрацьлеглы, туды, дзе перад уездам у вёску стаяў дубовы крыж, абчапляны вышыванымі палатнянымі ручнікамі.

Доўгая, упартая і зацятая барацьба ішла ў Вялікім Лесе з гэтым нямым драўляным крыжам. Некалькі разоў камсамольцы выкопвалі яго, палілі. Але крыж зноў і зноў,

як усё адно Іванька-ўстанька, паўставаў за вёскаю — знаходзіліся людзі, якія не маглі спаць, калі пры ўездзе ў вёску не было крыжа. Днём яны ішлі ў лес, валілі дуб, абчэсвалі яго, рабілі крыж, а ўночы ці то прывозілі, ці то прыносілі да вёскі і ўкопвалі. Вось і цяпер пры ўездзе ў вёску зноў стаяў крыж, хоць Косцік ведаў — тыдні два ці тры таму назад камсамольцы выкапалі той, ранейшы, што тут быў, і спалілі.

«Ёсцека ж такія, хто не баіцца, робіць насуперак»,— падумаў Косцік.

Спыніўся крокаў за колькі ад крыжа. Стаяў, аж пакуль не замлелі, не забалелі ногі, насцярожана ўглядаючыся то на лес, што няпэўна чарнеў сцяною ўдалечы, то на вёску, у якой патухалі адзін за адным у вокнах агні — пых! — і няма: людзі, вярнуўшыся ад цыганскага табара, укладваліся спаць. Глуха, таемна было навокал. І неяк быццам нават трохі вусцішна, трывожна. Выплыў, прарэзаўся вострым рогам з-за хмар нечакана месяц і пабег, паплыў хутка-хутка нізка над лесам. Запальваліся то тут, то там зоры — вясёлыя, мігатлівыя. Нібыта распагаджвалася: хмара-аблога, што зацягнула надвячоркам неба, рассоўвалася, знікала.

Ціхата і спакой, што панавалі ў наваколлі, незаўважна перадаваліся і яму, Косціку. Сталела, набывала пэўнасць думка: нічога асаблівага не здарылася. «Разбіў шыбу? Ну дык і што? Было б з-за чаго хвалявацца, перажываць... Дый... Ніхто ж не бачыў, што ета зрабіў я... Куды горш было б, каб запіска мая разам з каменем у хату трапіла... Тады б ведалі, хто камень у акно кінуў... І запіску тую... Добра ж, як бы Тася падняла. А каб не Тася, а маці — Вера Сымонаўна?..»

Расшчапіў кулак, падраў на дробныя шматкі запіску. Патаптаўся яшчэ трохі ля крыжа, потым паволі, нага за нагу, чуйна ўслухоўваючыся ў цішыню ночы, паплёўся сярэдзінаю вуліцы дадому.

Ля хаты старога Куляша спыніўся, падняў галаву, паглядзеў на акно, у якое хацеў праз адчыненую фортачку ўкінуць камень з запіскай. У акне зеўрала, чарнела амаль цалкам выбітая шыбіна. Здзівіўся: «Як ета я?.. Не пацэліў? Ета не падобна на мяне. Не, нешта са мной не тое, не тое... І Тасю з вока на вока бачыў і не пагаварыў, не сказаў, што мучыць мяне... І ў фортачку не пацэліў — шыбіну выбіў...»

Зноў зрабілася не па сабе, прыкра і непамысна.

Прыкрасць, непамыснасць і незадаволенасць сабою ляжалі цяжкім каменем на сэрцы і калі клаўся ў пасцель спаць, і калі, прачнуўшыся ўранні, умываўся, снедаў, ішоў у лес, апантана, нібыта са злосцю, валіў падлесак, церабіў яго, цягаў да паляны, гарадзіў плот. Ляжалі яны цяжкім каменем, нідзе не дзяваліся і пасля, калі, скончыўшы работу, сам таго не жадаючы, незнарок узлаваў не на жарт бацьку, вяртаўся ціхачом назад дадому, у вёску.

«Што скажу я Тасі, калі ўбачу яе зноў?.. Ці падыму вочы, ці пагляджу так, як глядзеў зусім нядаўна, да ўчарашняга? Каб узяў хіба ды з'ехаў куды з Вялікага Лесу?»

Але апошняя думка здалася праз хвіліну бязглуздай, Косцік з нянавісцю адагнаў яе.

«Як жа я адсюль куды паеду, калі тут... Тася...»

## VI

Не шанцавала, ані не шанцавала Піліпу Дарошку ў жыцці. Хоць... Напачатку складвалася ўсё быццам шчасліва. Бацька, як самага старэйшага, пакінуў яго на гаспадарцы, не паслаў, як Івана, працаваць на завод, у Гудоў. «Ты, Піліпок, да зямлі гарніся,— казаў яму тады бацька.— Запамінай, дзе што і калі сеяць, як і за чым завіхацца. Спрыт у рабоце і ахвоту пакажаш — адпішу табе гаспадарку». І Піліп стараўся. Усю весну, закасаўшы па калені калашыны штаноў, босы хадзіў то за плугам, то за бараною. Араў, сеяў, скародзіў. Потым касіў, жаў, кідаў стагі, вазіў снапы. Восенню капаў бульбу, зноў араў, сеяў жыта. Зіму ж — малаціў, вазіў малоць у млын збожжа, даглядаў кароў, валоў, коней. Хоць гаспадарка ў бацькі была не такая і вялікая, але таўкоты хапала. Адсеешся ці збажыну ўбярэш — адпачыць бы, паляжаць. Дык не — то хамут падраўся, трэба яго падшыць, то ў возе вось зламалася, трэба новую майстраваць, то граблі зрабіць ці капыл у полаз выстругаць. Ды і дроў навазіць трэба, і прызбу кастрыцай уцяпліць, і рэбры лат на хляве саломай прыкрыць, бо пазрываў жа, агаліў вецер, калі бура ўлетку была. Словам, чаго-чаго, а клопату, таўкоты заўсёды хоць адбаўляй. Нават у нядзелю і то ніколі ўволю ў пасцелі не паляжыш, не паспіш — у хляве ж галодныя валы, коні, каровы, іх накарміць, напаіць спяшацца трэба. І не адзін раз на дзень, а тры-чатыры. Летам — начлег, сон на лузе ці ў лесе пад адкрытым небам ля вогнішча. Замгнеш вочы, а табе нейкі свавольнік пад самы нос смуроду пад-

кладзе ці крыкне так, што на ногі ўміг падхопішся: «Ваўкі!» Злавацца на такога не будзеш, бо, калі зазлуеш, спакою табе ніхто ўжо не дасць, будуць штоначы будзіць і цвеліцца. А бацька быццам не разумее, што маладому і паспаць, і пагуляць хочацца. «У тваё гады, сынок, я не ведаў, што такое стома, сон і гулі. Не да таго было — з голаду б не памерці, пракарміцца б, выжыць. А цяпер, хвала богу,— яды хапае, еш, хоць распеража́йся...»

Яды і праўда ў Дарошкаў хапала, асабліва пасля таго, як цара з трона прагналі, поле панскае падзялілі, войны, тулянне, хаванне ў лесе, у «зялёных», скончыліся. Але яда тая іншы раз у рот не лезла, комам у горле перасядала — стома валіла з ног, падаў і засынаў, нават не павячэраўшы, ледзь толькі да ложка дабіраўся, а то часам і там, дзе сядзеў ці стаяў. У бацькі надта ж вочы зайздросныя, рукі заграбастыя, сквапныя, зямлі і дабра хацелася мець больш за ўсіх. Дазволілі дзялянкі карчаваць, то ён гатовы быў і дняваць, і начаваць на расцяробах. Выдзіраў з каранямі пні, ссякаў маладняк і падлесак, сцягваў у лаўжы і паліў, а потым ірваў, пераварочваў, аж косці трашчалі, скібы зляжалага вякамі дзірвану. І не адзін бацька гэта рабіў, а і ён, Пііп. Ды хіба толькі ён — і маці, пакуль не падарвалася і не пайшла раней часу на той свет, і Параска, і Хора. Хацеў тады бацька, каб і Іван завод у Гудове кідаў, назад, да зямлі, вяртаўся, дбаў пра свой уласны кавал поля. Але Іван адвык ужо ад гаспадаркі, карчаваць пні і не думаў — паехаў у горад вучыцца. Вярнуўся з вучобы — начальнікам стаў. Спярша там жа, на заводзе, а потым выбралі яго старшынёй сельсавета. Ажаніўся з настаўніцай, жыве цяпер прыпяваючы, ні ў чым асабліва патрэбы не мае. Дый жылле не рве. А ён, Піліп, як мучыўся, так і мучыцца. Бо дзялянкі тыя раскарчаваныя мала што давалі гаспадарцы, клопатаў жа прыносілі ўга колькі! Вясною — вадою затопіць, даводзілася стаяць па калені ў гразі, капаць канавы, аплятаць лазою. Летам жа на дзялянкі панаджваліся дзікі — рылі лычамі, таптал нагамі, дратавалі, перамешвалі з зямлёю ўсё, што б ні пасееў. Не абгародзіш, не абнясеш плотам — і насення не збярэш. А то часцяком, каб уратаваць ураджай, трэба было, узяўшы стрэльбу і намасціўшы на дрэве ў галлі седала, і начаваць ля тых дзялянак. Пачалася хутарызацыя, то бацька надумаў адсяліць Піліпа. «Бачыш, ты не адзін у мяне,— казаў бацька.— Параска знайшлася, дый Косцік... Ім жа таксама жыць ды жыць...»

Пад хутар Піліп выбраў сабе неблагі шматок поля, ля глінішчаў — тых ям, дзе капалі сабе гліну ўсе ў вёсцы. Радзілі на тым полі добра і бульба, і жыта, і ячмень. А гарох пасееш — струкі, бы ўсё адно ў фасолі. Зырыліся на гэты шматок поля многія ў вёсцы, але Піліп перамог — першы на новае селішча бёрны пад хату прывёз. За лета сяк-так удвух з бацькам і зруб склалі. На большае сілы не хапіла, ды і спяшацца асабліва не было куды — Піліп жа быў яшчэ нежанаты. Накрылі зруб пад шчотку чаротам, забілі вокны і дзверы дошкамі, так і зімаваць пакінулі. А вясною, калі ўжо і цэглы нарыхтавалі, каб печ зляпіць, згарэў зруб. Да самых штандараў згарэў. Нехта не мог дараваць, што не яму гэты шматок поля пад хутар дастаўся, адпомсціў Піліпу — падпаліў зруб. Падпаліў уночы, калі вёска спала...

Зноў Піліп лецечка ўсё шчыраваў з бацькам — валілі дрэвы, пілавалі, часалі, вазілі, запускалі ў сцены. І да зімы новы, яшчэ прыгажэйшы зруб закрасаваўся на тым шматку поля, якое аблюбаваў сабе пад хутар Піліп. Толькі і ў гэтым зрубе пажыць Піліпу не ўдалося — зноў па вясне хтосьці крывотлівы чырвонага пеўня падпусціў...

Невядома, чым бы тое і скончылася, бо Дарошкі ўпартыя, зацятыя былі, не хацелі саступаць, ды пачалася калектывізацыя. Закруцілася, завярцелася тады ўсё ў Вялікім Лесе! І хіба толькі ў Вялікім Лесе! Спярша размовы на вуліцы і на прызбах, потым сходкі, сходы, запісванне ў калгас, абагульванне... Чула ў тыя дні вёска і смех, чула і плач, галашэнне. Не было чалавека, які б не жыў калектывізацыяй, не думаў пра калгас. І Піліп таксама шмат думаў, куды падавацца, што рабіць. Неаднойчы гаварыў, спрачаўся з бацькам. Бацька ў адным быў перакананы — у калгас уступаць нельга. «Гуртавое — чартавое». Ён аж звярэў, калаціўся, калі яму хто-небудзь напамінаў пра калгас. «Як — кеб маё, нажытае мазалём, ды так ні за што ні пра што аддаць? Не-е! Ды і ў калгасе што? Я рабіцьму, жылы рвацьму, а хтосьці ляжацьме, гульма гуляцьме? Калгас — ета добраахвотнае дзела, хто хоча, той хай і ўступае. А мне і так добра». Каб менш хто зырыўся на багацце, жаніў сына, Піліпа. Нізашто б раней не дазволіў браць сыну ў жонкі, лічы, галадранку Клаўдзю, Коўдравай удавы Мар'і дачку. А тут згадзіўся. І на другі тыдзень пасля вяселля падзяліў гаспадарку, вядома, не на самай справе, а для выгляду, на дзве. Хацеў хоць гэтым ўратаваць што-кольвечы. Але дзе там! Нават на дзве сям'і і

коней, і валоў, і кароў, ды і зямлі было больш, чым дазвалялася мецць. Ладны кавал поля абрэзалі ў Дарошкаў, абчыкрыжылі і той шматок ля глінішчаў, які быў аблюбаваў сабе пад хутар Піліп. Давялося жыць Піліпу на бацькавым селішчы, прыбудаваўшы ад вуліцы чатырохсценку і злучыўшы яе сенцамі з старою бацькаваю хатай. У калгас Дарошкі не ўступалі, іх абкладвалі новымі і новымі падаткамі. Дзве каровы прадалі, а потым і каня, валоў пару, каб разрахавацца з дзяржавай. Разоў пяць ці шэсць ездзілі ў Ельнікі, хадзілі, бегалі ў сельсавет. Але з такімі, як Дарошкі, тады размова была кароткая. «Уступайце ў калгас, і ўсё будзе добра. А не ўступіце — не тое яшчэ будзе!» Якраз у тыя неспакойныя, клопатныя часы за старшыню ў іхнім Велікалесаўскім сельсавеце выбралі Івана. Бліснула надзея: ён свой, паможа, не дасць у крыўду. Ды дзе там! Іван чужы, зусім чужы стаў. «Вы ганьбіце мяне перад усімі людзьмі! — сказаў ён аднойчы, прыйшоўшы да бацькі ў хату.— Я іншых угаворваю ўступаць у калгас, а бацьку роднага, брата не ўгаварыў? Што ж палучаецца такое?» Слова за слова — і схапіліся сварыцца Дарошкі. Піліп больш маўчаў, сварыліся бацька і Іван. Іван успомніў, як бацька амаль выгнаў яго з хаты, пазбавіў гаспадаркі. «Ды яно, можа, і к лепшаму. Я затое цяпер вольны, уласнасць не ўсмактала мяне так, як вас. Хоць па багацці вы не дараслі яшчэ да кулакоў, але па натуры... Па натуры — кулаччо!» Бацька не астаўся ў даўгу перад сынам, Іванам. «Г..., ды кеб мяне вучыла! Не пайду ў калгас, раскулачвай, з селішча высылай!» І Іван, бадай што, выслаў бы бацьку, каб Піліп не паддаўся на ўгаворы брата, не ўступіў у калгас...

Папрацаваў Піліп у калгасе — і прывык, спадабалася. Думаць не трэба столькі, дбаць пра ўсё, як раней пры аднаасобніцтве — і пра плуг, і пра барану, і пра калёсы, і пра насенне, ды ці мала яшчэ пра што. У калгасе адзін адно робіць, другі — другое, адзін пра адно клапоціцца, другі — пра другое. Сяк-так і бацьку Піліп угаварыў не смяшыць людзей, не чакаць, што нешта зменіцца, бо той усё марудзіў, думаў — калгас доўга не адзержыцца, распадзецца пры першым зручным выпадку. Праўда, і Іван памог, наведаўшыся аднаго дня да іх у хату. «Вось што, бацька,— сказаў строга, па-казённаму, як прывык гаварыць з пэўнымі людзьмі начальніцкім голасам.— Калі не падасі днямі заявы ў калгас, вышлю. На Салаўкі ўпяку! Хопіць, каб мне табою калолі вочы». Бацьку як укусіў хто.

Падхапіўся з лавы, махануў рукою на дзверы. «Прэч, прэч з мае хаты, чуж-чужаніца! — закрычаў, шалеючы ад злосці.— Прэч! І кеб нага твая больш не пераступала мой парог!» Іван патупіў у падлогу вочы і пайшоў з бацькавай хаты, толькі дзвярыма ляснуў, аж тынкоўка пасыпалася са столі...

Бацька, счакаўшы дні тры, усё ж падаў заяву ў калгас. Але што калгас будзе, не распадзецца — не верыў. Таму і плуг навейшы, і барану лепшую схаваў, на гарышча ўсцягнуў; жарэбчыка-двухгодка таксама ў калгас не здаў — адгарадзіў у хляве закутак, абклаў, закідаў з усіх бакоў сенам і трымаў там да самай вясны. Вясною ж вывеў неяк на падворак і заплакаў: ад доўгага стаяння ў цемры жарабок нічога не бачыў — аслеп...

З калгасам быццам усё на лад пайшло, жыць бы Піліпу ды жыць. Дык не ж... Колькі ні спаў ён з жонкаю, колькі ні стараўся, не цяжарала яна. Год за годам мінаў, а дзяцей у іх як не было, так і не было. Спярша Піліп асабліва не браў гэтага да галавы. «Будуць яшчэ!» — верыў ён. А потым ахапіў Піліпа одум — калі дзяцей не будзе, навошта ж жыць, дзеля каго шчыраваць? Пачаў прапытоўваць у сяго-таго, як і што рабіць, каб жонка зацяжарала. Але з Піліпа смяяліся. «Пражыў столькі гадоў, чалавеча, а такой простай рабоце не навучыўся». А вясковы зубаскал Юлік Бязмен прапанаваў: «Мяне наймі. Хочаш на тыдзень, хочаш на месяц. І платы прасіць за работу не буду». Угаворваў Піліп і жонку, Клаўдзю, каб тая да сяго-таго з жанчын схадзіла, параілася, прапытала, хто ў бядзе іхняй вінаваты. «Можа, мы чагосьці і праўда не ведаем, што павінны б ведаць». Але жонка ўпарта ні да каго не ішла. А можа, і хадзіла, ды не гаварыла яму, Піліпу, не прызнавалася. Толькі зацінalася ўсё больш і больш, маўчала. Нават калі ў ложку абдымаў яе калі-нікалі Піліп, лез цалавацца, як чужая была, халодная. Усякая ахвота да любошчаў у Піліпа прападала. Змрачнеў, па тыдню, а то і па два не гаварыў ён з жонкаю, унурваўся ў работу, рабіў і ў полі, і на лузе, як вол. У калгасе яго прозвішча на Чырвоную дошку вывешвалі, на сходах часта ўспаміналі, прэміявалі як перадавіка. Але ўсё гэта не радавала Піліпа. Не было ў яго дзеля каго шчыраваць, не было дзеля чаго жыць. Выпіваць Піліп пачаў. Ідзе з работы, збочыць у магазін і перакуліць разам з іншымі шклянaчку...

Жонка ні ў чым не папракала яго, не раўнавала. Хочаш

позна ўвечары дадому вярніся, хочаш уночы ці раніцою. Не папытае, дзе быў, чаму затрымаўся,— ёй гэта быццам і не абыходзіць, ёй усё адно, хоць і зусім дадому не вяртайся. Мучыла, не давала жыцця Піліпу сумота, не ведаў ён, што з ёю рабіць, куды кінуцца ці падацца. З братам, Іванам, сустракаўся рэдка, дый, калі шчыра сказаць, асаблівай радасці ад гэтых сустрэч не меў — у брата было сваё жыццё, ён вечна быў нечым заняты, вечна кудысьці бег, спяшаўся, не да яго, Піліпа, яму было. І Косцік не дарос яшчэ, каб з ім можна было гаварыць пра ўсё, каб зразумеў ён цябе, як сябе. Бацьку ж таксама душы не адкрыеш, не прызнаешся, што хвалюе, клапоціць. Ледзь рот разявіш, вымавіш імя жонкі, адразу ж: «А я што казаў? А-а, не паслухаўся, дык радуйся цяпер, жыві!» Адзіная, хто хоць трохі шкадаваў Піліпа,— гэта сястра, Параска. «Хай бы вы ў бальніцу схадзілі, праверыліся. Хоць ведалі б, хто з вас вінаваты. Дый... Можа, і лекі якія ёсцека ад етай бяздзетнасці»,— раіла тая, калі б ні ўбачыла Піліпа. Але ісці ў бальніцу Піліпу было сорамна, не хацелася і жонку пасылаць, бо ў бальніцы трэба нагала раздзявацца, паказваць чужым людзям тое, што і свайму роднаму не зусім ёмка паказваць...

Не ведаў яшчэ Піліп тады, чаму жонка такая абыякавая да яго, халодная... А як дайшлі чуткі, што з Грышкам-брыгадзірам блытаецца, бачылі іх і ў каноплях, і ля нечага хлява цемнатою, месца сабе не знаходзіў, што і рабіць далей, прыдумаць не мог. Успамінаў — калі сватаўся да Клаўдзі, намякаў сёй-той, што хлопцы да яе начаваць ходзяць. Але тады... Ці мала што выдумаць ці сказаць людзі могуць? Язык жа без касцей... І вось бачыш — тое, пачутае, пацвярджалася...

Не прызнаўся Піліп Клаўдзі, што да яго чуткі не зусім добрыя пра яе дайшлі, што ён сёе-тое ведае. Цеплілася ў душы надзея — можа, пажартавалі, можа, выдумалі, каб распаліць рэўнасць. Пойдзе з хаты ўвечары быццам да суседзяў у карты гуляць, а потым праз якія паўгадзіны ў двор свой гародамі вернецца. Стоіцца за вуглом хлява, цікуе, ці жонка куды пойдзе. Толькі жонка па вечарах дома была, здаецца, нікуды асабліва не рупілася.

Неяк вяртаўся Піліп з поля, снапы на ток вёз. Бачыць — брыгадзіраў конь ля кустоў арэшніку папасваецца. «А Грышка дзе?» Воз спыніў, у кусты шуснуў. І ў першую хвіліну разгубіўся, убачыўшы на траве распластанага Грышку, а пад ім... жонку, Клаўдзю... Аж уваччу пацямне-

ла, кроў ударыла ў скроні. Як быў з пугаю ў руках, так і рынуўся на захопленую знянацку пару...

Грышка ад першага шлёгу пугі на ногі борзда ўсхапіўся, да каня свайго, штаны ў руках трымаючы, кінуўся. У сядло ўскочыў — ды ўгалоп. Тут быў, тут — няма. А Клаўдзя... Біў яе Піліп, апантана, не помнячы, што робіць. І пугаю, пакуль тая не пасеклася, і нагамі таптаў, і кулакамі мясіў... Аж сшалеў, бо Клаўдзя сцялася, ляжала, як нежывая. Ні крыкнула, ні войкнула, ні заплакала... Твар рукамі толькі закрывала, баялася, мусіць, каб не знявечыў. Забіў бы, мусіць, тады ён, Піліп, Клаўдзю, ды іншыя падводчыкі падаспелі, якраз з поля ехалі, адцягнулі яго сілком ад жонкі...

Думаў — усё, не зможа жыць з жонкаю, у той жа дзень выганіць з хаты. Аж нейкая сіла стрымала яго, не дала гневу да канца выліцца. Мо думка тая, што апомніцца Клаўдзя, не будзе больш з Грышкам, ды і іншымі мужчынамі, блытацца. Але дзе там! Нездарма ж кажуць: лёгка ўсё пачынаецца, ды нялёгка канчаецца. Яшчэ нахапляў Піліп сваю жонку з мужчынамі: і ў полі, у капе саломы, і ў лесе, у ягадніку, і нават неяк у хляве сваім, на сене... Дзівіла Піліпа адно: не толькі яго, Піліпа, Клаўдзі мала, але і Грышкі, хоць той... Быццам і не цураўся Клаўдзі. Ну і спрыцён жа, халера, нічога не скажаш! Як і калі паспяваў ён уцякаць ад Піліпа — дзіву трэба было дацца. Перш чым Піліп здагадваўся, што і да чаго, Грышка заўсёды знікаў, быццам яго і не было з Клаўдзяй. Кот, сапраўдны памаўзлівы кот!

Хадзіў Піліп да Грышкавай жонкі Анюты, расказваў ёй, што муж вытварае, чым займаецца. Але Анюце тое не навіна была — ведала, даўно, даўно ўсё ведала. Уразоніць жа мужа, спыніць заляцанні да чужых жонак не магла.

— Урадзіўся ён такі, такі, мабыць, і памрэ,— плакала Анюта.

Біў, таптаў нагамі Клаўдзю Піліп — не памагала. Як блыталася яна з мужчынамі, так і блыталася... Выганяць з хаты жонку няёмка было, сама ж яна ўпрочкі не ішла. І жыць, як жылося...

«...Няхай бы і праўда вайна пачалася якая,— думаў, вяртаючыся з парожнім мяшком дахаты пасля размовы з братам Іванам ад магазіна, Піліп.— Тады б на хронт мяне забралі. А яна, Коўдра, як бы хацела, хай бы так і жыла».

Ведаў: жадаць вайны нядобра, бо вайна — гэта разбу-

рэнні, гора, усім, усім людзям гора. І не жадаць вайны... Не жадаць нейкіх перамен у сваім жыцці...

«Ну не вайна, дык іншае што. Кеб толькі з дому мяне куды-небудзь забралі, кеб не быў я тутака. Бо пакінуць сам сваю хату... Клаўдзю... Сысці, з'ехаць адсюль... Не, не змагу я...»

## VII

Пераканаўшыся, што сын, Косцік, няйнакш, падаўся дадому, у вёску, Мікалай паволі, спыняючыся ледзь не на кожным кроку, абышоў паляну, яшчэ раз, цяпер больш прыдзірліва, уважліва, агледзеў свежую, толькі што зробленую, агароджу. Здаецца, усё як мае быць — колле ўкапана глыбока, жэрдкі пакладзены густа, ды і пераплеціны — трывалыя, надзейныя — лазовыя. Каровы не залезуць у проса, а вось што да дзікіх свіней... Але ж проса — гэта не бульба, на проса свінні не падкія. Убачыў — жэрдка ў адным месцы ляжыць крыва. Падышоў, паправіў, мацней прыціснуў яе лазінай.

«Складзе Бабай акт ці не складзе?» — варухнулася ў галаве думка.

Пастаяў, удыхнуў на поўныя грудзі пах свежай смалы-жывіцы, што ішоў, заглушаючы ўсе астатнія лясныя пахі, ад нядаўна ссечаных, абцярэбленых і пакладзеных у плот сасонак-жэрдак, і, сам не ведаючы, пэўна, чаму, вырашыў: «Не складзе — збаіцца».

Заныла, нібы незагойная рана, да якой неасцярожна дакрануліся,— што менавіта заныла, ён, Мікалай, не ведаў, толькі адчуваў, нешта глыбака-глыбака ўсярэдзіне,— успомніліся сынавы, Косцікавы, словы: «Тата, вы б забывалі ўжо етыя паляны. Колькі раскарчавалі за свой век і дзе яны? Маці праз паляны на той свет пайшла...»

«Смаркач, а бач ты яго... Бы ўсё адно шылам, бы ўсё адно ведаў, куды цаляе...»

Хвілін колькі быў зноў як аглушаны, не мог засяродзіцца на нечым адным, важным, цэлы рой думак апанаваў яго, і ён, Мікалай, не ў сілах быў саўладаць з гэтым роем, з гэтым хаосам, што так нечакана наваліўся, агаломшыў. Калі ж нарэшце злосць на сына схлынула, улеглася, не ятрыла кроў — «можа, ён сказаў, не падумаўшы, так, без жадання пакрыўдзіць мяне, бацьку»,— Мікалай з усяго рою-хаосу выбраў самае галоўнае — яно, гэта галоўнае, як здалося Мікалаю, абагульняла, заключала

ў сабе адно, толькі адно слова — «паляны»,— і страсянуў галавою, быццам хацеў адагнаць ад сябе насланнё, думкі-чары.

«І праўда, колькі я за свой век раскарчаваў, адабраў у лесу етых самых палян, колькі нарабіў поля!..»

Успомнілася тая, ці не першая ў яго жыцці, паляна, на якую прывёў яго, яшчэ зусім малога хлапчука, неяк на вясне бацька,— паляна была далёка ў лесе, ля вялізнага штабеля дубовых і кляновых плах, круглякоў. «Ета такую гару лесу нарыхтавалі на вугаль,— сказаў тады яму, паказваючы на штабель дроў, бацька.— Яе абкладуць дзірваном, засыплюць зямлёю і падпаляць. А паляну, дзялянку етую, можам карчаваць, сеяць...» На паляне, зводдалі, крокаў за дваццаць, гарэў, дыміў, распластаны сухім голлем, вывернуты з каранямі, мабыць, бурай, тоўсты, дуплянаты, з аблупленай карою дуб, гарэў, дыміў, адганяючы камароў і не патухаючы ні ўдзень ні ўночы. І яны з бацькам у дыме тым, які дзёр горла, выядаў вочы, капалі, варочалі чорную, месцамі аж рыжую, сырую, глёўкую, а таму і цяжкую зямлю. Правільней, варочаў, капаў зямлю бацька, а ён, Міколка, больш важдаўся ля агню — пёк у прыску пячонікі, смажыў на ражончыку сала...

З таго часу кожную вясну хадзіў ён, Мікалай, спачатку з бацькам, а потым і адзін, сам, асвойваць новыя і новыя паляны. Толькі два-тры гады дазваляў пан Халявін карыстацца раскарчаванай зямлёй, а тады, калі ўраблялася паляна, калі на ёй пачынала радзіць, забіраў сабе, далучаў да свайго поля...

Скінулі цара, заводы, фабрыкі аддалі рабочым, зямлю — сялянам. Думалася — цяпер кожная раскарчаваная паляна будзе вечна твая. Таму і шчыраваў, стараўся гэтак Мікалай, каб болей, болей зямлі захапіць. На асвоенай паляне ні пянька, ні карэньчыка нідзе не пакідаў — усё выкапвалася, выдзіралася, палілася. Асабліва бязлітасна вынішчаўся маладняк. Бо і агледзецца не паспееш, а ён тут і там зноў падымаецца, шчоткаю бярэцца. То пні, карані атожылкі пусцяць, то семя, занесенае бог ведае калі і кім на паляну, прарасце. Высякалі, церабілі маладняк жалезнякамі і сякерамі, скідвалі ў лаўжы. Кожны ж хацеў, каб не лапінка поля лысела сярод лесу, а ладнаваты быў пляц, на якім можна было б з канём і плугам развярнуцца, узараць і пабаранаваць. Шмат, шмат у тыя гады людзі асвоілі поля. Капалі канавы, аплятаілі іх лазою, спускалі з балот у рэкі твань — ваду. Дзе толькі можна

было, карчавалі пні, высякалі лазняк, алешнік, бярэзнік, асіннік. Колькі было зглумлена лесу! Поля, толькі б больш поля! Пра лес ніхто тады не думаў. Хапала лесу, куды ні пойдзеш — лес і лес, усюды лес. Неба і то праз яго не заўсёды ўбачыш.

І ён, Мікалай, у тыя гады, можа, больш чым хто стараўся, шчыраваў. Як толькі раставаў снег, ажывала, мякчэла зямля, можна было яе капаць — кіраваўся на расцяробы. Іншы раз нават зімою хадзіў. Ссякаў, церабіў маладняк, складваў, сцягваў яго ў лаўжы, паліў. А тады, як адтавала, выкопваў пні, карчаваў карэнне, дзе сахою, дзе капаніцаю, дзе жалезняком успорваў дзірван. Сеяў авёс, проса, садзіў бульбу... І не адзін на расцяробах жылле так ірваў, ірвала жылле сям'я ўся — Ганна, жонка, сын Піліп, дачка Параска, сястра Хора. На сутонні, да ўсходу сонца, з хаты выпраўляліся і вярталіся дадому, як змяркалася, на цямочку. Каб не калгас, не абагульванне гэтае самае,— які б багаты быў сёння ён, Мікалай Дарошка, колькі б поля ў яго было! А так... «Раскарчоўваў-раскарчоўваў паляны ўвесь век свой — і дзе яны?» Дзе? Косцік хоць і смаркач, а як у сук уляпіў. Не разбярэш цяпер, дзе поле маё, а дзе — чужое; не тое што паляны — межы заараны, меткі раскіданы. Было маё — стала калгаснае. Раней цягнула, вабіла да сябе поле. Хацелася яго ў пору і пераараць, і засеяць, і гною добра ўтаптаць... Кожная лапінка, кожнае каліўца, кожны каласочак, кожнае зярнятка бераглася... Яно ж — тваё, добра ўробіш, добра ўбярэш — напоўніш не чый-небудзь, а свой свіран, сваю клець... А цяпер... Не вабіць цяпер, не цягне да сябе поле. Чужое яно. Таму і арэцца не так, як трэба было б араць, і сеецца не тым насеннем і не так, як трэба было б сеяць, і ўбіраецца абы-як, абы хутчэй. Вязуць снапы з поля — сыплецца зерне, бо і не здагадаецца каторы дзяружку пад снапы паслаць, а мо і не ведае, што такое ў гаспадарлівых людзей рабілася спрадвеку. Ведама, абібокі, гультаі... Не дае поле таго, што магло б даваць. Таму і працадзень куцы. З дзяржаваю разлічыся, дай усім тым, хто ў канторы сядзіць, за брыгадзіраў, начальства пастаўлены,— і... Машыны, трактары прыдумалі, бо інакш бы не справіліся, зусім без хлеба былі б. Аге, былі б, як былі без хлеба ў першыя гады, калі калгас арганізавалі. Засуха, казалі, а тым часам... Хто ведае, як і што яно...»

Спыніўся, агледзеўся.

«Дзе я?»

З лесу, аказваецца, выйшаў, быў у полі. Не, не зусім у полі, а на паляне, што тупым клінам уразалася ў малады беластволы вясёлы бярэзнік.

«Ды ета ж... Мая палянка,— разгубіўшыся, зашаптаў не то ад радасці, не то ад сполаху Мікалай.— Тая, апошняя, якую карчаваў з жонкаю, Ганнаю...»

Яна, Ганна, не хацела карчаваць гэтай паляны, у цяжку хадзіла, на шостым ці сёмым месяцы. «Хай яны гараць, етыя твае палянкі! — плакала, агрызалася Ганна.— Жылле парвалі, рук не падняць, ног не пацягнуць».

Але ён, Мікалай, быў няўмольны, настояў на сваім — трэба, пакуль ніхто не захапіў, захапіць паляну.

...Тады, у той парны, па-вясноваму волкі, туманны дзень, ён, Мікалай, толькі ўдваіх з жонкаю, Ганнаю, прыйшлі сюды, на паляну. Піліпа паклікалі чагосьці ў Ельнікі, у ваенкамат, Хора асталася глядзець маленькага Косціка, дзесьці была занята і Параска. Павесіўшы на дубок, што рос зводдалі, торбу з харчамі, ён, Мікалай, надумаў з самай раніцы, пакуль яшчэ не стаміўся, узяцца карчаваць стары смаловы пень, што муляў вочы, па-багатырску сядзеў пасярод паляны. Пень быў невысокі, але шырокі, смольны. «Яго на лучыну можна будзе забраць»,— сказаў Мікалай. «Спярша выцягні, а тады ўжо будзеш меркаваць, што з ім рабіць»,— буркнула са злосцю жонка. «Ета ты, мажа, і праўду кажаш»,— ані не пакрыўдзіўся на жонку Мікалай. Не пакрыўдзіўся мо таму, бо жонка хоць і бурчала іншы раз, не згаджалася ў сім-тым, але не ўпарцілася, слухалася, заўсёды слухалася яго, Мікалая, рабіла тое, што ён загадваў.

Дастаў з-за пояса сякеру, даволі ўпраўна паабсякаў карані, што відаць былі зверху, падсунуў пад пень вагу. Падклаў пад вагу плашку, паклікаў жонку: «Ганна, хадзі падсабі!» Ганна збірала з паляны галлё, зносіла ў лаўжы. Пачуўшы мужаў голас, падышла да пня. Удваіх яны сяк-так падважылі пень. «Во, мы яго зараз і выцягнем!» — падахвоціў жонку Мікалай. «Глядзі, кеб ён нас на той свет не пацягнуў»,— адказала, але ўжо без злосці, лагодней, жонка. Ён, Мікалай, і гэтыя словы прапусціў міма вушэй, бо пень, сапраўды, хоць і хістаўся, ды не выцягваўся наверх — нешта яго трымала ў зямлі, няйнакш, корань. Прычым корань не бакавы, а старчматы. «Патрымай во так вагу,— папрасіў Мікалай жонку,— а я з сякерају яшчэ трохі пабегаю ля пянька». Жонка павісла на вазе, а ён, Мікалай, падскочыў да пня і раз, і два секануў з-за вуха. Вага,

сарваўшыся, слізганула па пні... І перш чым ён, Мікалай, здагадаўся, што і да чаго, убачыў, як паляцела потырч носам у зямлю жонка...

«Ой!» — крыкнула яна не сваім голасам і схапілася рукамі за жывот.

Ён, Мікалай, выпусціў з рук сякеру, кінуўся да жонкі — надта ж енчыла тая, качалася ў яшчэ неакрэплай, рэдкай траве.

«Што з табою?»

Ганна не адказала — сціснуўшы зубы, толькі застагнала.

Ён, Мікалай, быў раззлаваўся, крыкнуў:

«Ты што, без языка?»

Але жонка і пасля гэтых слоў нічога не адказала. Толькі, як заўважыў Мікалай, пабялела раптам, закаціла вочы.

«Што з табою, Ганна? — спалохаўся, упаў на калені Мікалай.— Ганна, Ганначка!» — зашаптаў.

Ганна павяла вачыма, як бы ачынаючыся.

«Ой, ой! — застагнала яна.— Жывот... Хоць бы роды не пачаліся... Бяжы ў вёску, Тэклю пазаві...»

Гаварыць Ганне было цяжка, яна з вялікай натугай, перасільваючы, мабыць, боль, вымаўляла нязвыкла доўгія словы, ледзь-ледзь варушыла непаслухмянымі, пасінелымі губамі.

Ён, Мікалай, устрывожыўся — усхапіўся на ногі, пабег.

Паляна была не вельмі далёка ад Вялікага Лесу. Але пакуль Мікалай ускочыў у свой двор, пакуль запрог у воз коней, пакуль заехаў да Тэклі — яна заўсёды прымала ў Ганны роды,— пакуль тая памыла рукі, бо капалася ў гародзе, нешта садзіла на градах, пакуль, гонячы на ўвесь дых коней, дамчаў да паляны — мінула ці мала часу.

«Хоць бы паспець!» — шаптаў, стоячы на возе, Мікалай. (Быў ён, як потым расказвала ўсім Тэкля, у тую хвіліну страшны — вочы ўпераны ўдалячынь, не міргаюць, ашклела глядзяць проста наперад, рот скрыўлены, нібыта ад болю, грудзіна палатнянай кашулі расхрыстана, у руках лейцы, канцамі якіх ён, Мікалай, апантана, з дзікай лютасцю хвастае раз-пораз коней, якія і так ужо не бягуць, а імчаць ва ўвесь апор, нясуць фурманку па няроўнай, калдобістай дарозе, нясуць так, што здаецца: не вытрымае фурманка, вось-вось рассыплецца, растрасецца.)

Не даязджаючы да паляны, на хаду, не спыніўшы

коней, саскочыў на зямлю, пабег да пня, дзе распластаная ў нейкай дзіўнай позе, небывала доўгая, выпрастаўшы ногі, ляжала Ганна, жонка. Згледзеў — з-пад жонкі сачылася кроў, збіралася ў след ад нейчага капыта — ямку,— там утварылася ўжо даволі ладная лужа.

«Ганна!» — крыкнуў у адчаі і прыпаў вуснамі да жончынага твару.

І тут жа адхіснуўся — твар быў закамянелы, нежывы, халодны.

«О-о!» — прастагнаў.

У роспачы, не разумеючы, што і дзеля чаго робіць, схапіў жонку на рукі, пачаў тармасіць, трасці, потым падняў, панёс да воза.

«Пачакай!» — закрычала Тэкля,— блытаючыся нагамі ў доўгім, па пяты, андараку, яна, спыніўшы коней, праставала цераз паляну да Мікалая. Мікалай на хвіліну як бы апамятаўся, апусціў, беражліва палажыў жонку на траву.

«Яна ахалодала ўжо! — агледзеўшы Ганну, прашамкала бяззубым ротам Тэкля.— Памерла!»

І тады, толькі тады нарэшце дайшла да Мікалая ўся непапраўная жудасць таго, што здарылася, тады, толькі тады ўцяміў ён, што адбылося, які грэх узяў ён, лёг на душу праз гэтую праклятую паляну. «Кеб жа знаццё... Э-э!»

«Ганна, Ганначка!» — закрычаў і ўпаў, паваліўся, пачаў біцца галавою аб зямлю, нема выць:

«А-а-а-а-а-а!»

...Успомніў, згадаў тое, даўняе, і аж застагнаў, зубы сцяў — так яскрава, жыва паўстала яно перад вачыма, быццам было ўчора ці пазаўчора. Адчуў — плача, слёзы самі міжвольна пабеглі, пацяклі з вачэй.

«Ганна, Ганначка, даруй, даруй мне! — зашаптаў.— Ета я ва ўсім вінаваты, я. Не трэба было браць цябе з сабою, не трэба было, кеб ты памагала карчаваць пень... Хай бы дзічэла етая палянка, хай бы скрозь зямлю яна правалілася. Бачыш — усё адно не на лад, не на дабро...»

## VIII

Да размовы з братам, Косцікам, Іван доўга рыхтаваўся. І так, і гэтак меркаваў, прыкідваў, як і пра што гаварыць. Некалькі разоў раіўся з жонкаю, гутарыў з дырэктарам школы Андрэем Макаравічам Сушчэнем. І сам сабе Іван наказваў, і іншыя разумныя людзі тое ж паўтаралі, перасцерагаючы:

— Не гарачыся толькі, спакойна, вельмі спакойна выслухай хлопца, можа, табе як брату ён скажа, што на душы, што мучыць яго. Ёсць, нештачка ж ёсць, не можа быць, каб так, без дай прычыны ліха ведае кім стаў. Быў хлопец як хлопец, і раптам... Не, тут лепш недасаліць, чым перасаліць...

Думаў Іван і пра тое, дзе б лепш сустрэцца з Косцікам. У сельсавеце — залішне казённа, афіцыйна; дома, у сваёй хаце,— занадта па-сямейнаму. А хацелася ж, каб хлопец зразумеў, адчуў: хоць ён, Іван, і брат, але нічым памагчы не зможа, калі справа дойдзе да суда. А яна амаль ужо да суда і дайшла. Вера Сымонаўна наўрад ці даруе Косціку, што ён выбіў ноччу акно. Ды і... Калі ўчора выбіў ён акно Веры Сымонаўне, заўтра ён можа і яшчэ каму-небудзь выбіць, а то і зрабіць такое, за што ўжо абавязкова давядзецца падаваць у суд. Не хацелася Івану, каб брат трапляў на лаву падсудных. З аднаго боку, яму, старшыні сельсавета, мінус, непрыемнасць, а з другога... Дадуць хлопцу год-два... Падпадзе пад уплыў якога-небудзь прайдзісвета ці абэлтуса... І тады... Нічым ужо не паможаш, каб і хацеў. Не, лепш цяпер, калі нічога яшчэ асаблівага не здарылася, пагаварыць з хлопцам, хай зразумее, усвядоміць: не па той дарожцы пайшоў, дарожка гэтая крывая і можа далёка завесці.

Круціў галавою Іван, разважаў сам з сабою і прыходзіў да аднаго яснага вываду: трэба ўсё зрабіць, каб вярнуць хлопца да нармальнага жыцця, каб хлопец рос чалавекам. Карысным, неабходным усім людзям і грамадству чалавекам!

Пасля доўгага роздуму намысліў Іван паклікаць Косціка ўсё ж у сельсавет. («Каб адчуваў хлопец: ён мае справу з Савецкай уладай!») Але гаварыць з ім у сваёй старшынёўскай баковачцы не стаў. («Усё ж браты, ды і гутарка павінна быць інтымная».) Выйшаў з Косцікам у сад, што быў за сельсаветам (сельсавет размяшчаўся ў доме былога, раскулачанага вясковага багацея Яўмена Гіры). У садзе цяпер нічога не сеялі, расла, буяла трава. Укапалі там і некалькі лавачак, каб было дзе людзям пасядзець, пагаманіць. Іван выбраў для размовы далёкую лавачку, тую, што стаяла ля самай агароджы — невысокага дашчанага плоціка, пафарбаванага ў светла-блакітны колер,— пад старою раскідзістаю яблыняй. На яблыні завязаліся ўжо яблыкі, маленькія, але ядраныя, і было іх многа, усё адно што вяхі.

— Бачыш, яблыкаў колькі,— паказваючы на яблыню, сказаў Іван, калі яны падышлі з Косцікам да лавачкі і селі.— Урадлівы сёлета будзе год. І на полі ўсё расце, аж зямлю дзярэ, і ў садах...

— Людзі кажуць — не на дабро ета,— уздыхнуў неяк па-старэчы Косцік і склаў на грудзях худыя, па локці закасаныя рукі, нібыта зрабілася яму холадна.

— І ты таксама верыш плёткам? — паглядзеў проста ў вочы брату Іван.

— Я не веру. Але людзі кажуць. А тут яшчэ Пецка еты з прароцтвамі сваімі...

— Бацька, канешне, Пецку паверыў. Думае, калгас распадзецца, зноў ён аднаасобна жыць будзе.

— Не ведаю я, што бацька думае. Маўчыць больш. І са мною рэдка гаворыць. Як толькі што — лаецца, крычыць. «Цыц, смаркач!» — во і ўсе яго словы. Наогул, бацька ў нас...

Косцік сцяў нітачкай і без таго тонкія вусны, пакруціў белаю, кужэльнаю галавою: відаць было, незадаволены ён бацькам.

— Бацькоў не выбіраюць. Якія ёсць, такія ёсць. І асуджаць, абгаворваць...— Іван памаўчаў, падумаў.— Быццам і няёмка. І разам з тым... Бацька вырас пры іншым ладзе, ён чалавек старарэжымны, па-свойму на ўсё глядзіць. Жыццё для яго — гэта свая лапіна поля, сваё гумно, свой конь, свая карова. Усё, словам, сваё. Падзяліцца чым-небудзь з суседам... Гм... Людской грамадзе не верыць, не верыць у сілу і магчымасці калектыву. Бядняк для яго — гультай, абібок. І толькі. Што ж, я спрабаваў яго пераконваць, з гэтага нічога не выйшла. Толькі пасварыліся. Жывём, бы чужыя. Нядобра гэта, не па-людску, не пасваяцку...

— Памірыцца вам трэба было б,— прашаптаў ціха, быццам сам сабе, Косцік.

— Трэба было б,— уздыхнуў цяжка, на ўсе грудзі, Іван.— Спрабаваў я, разоў колькі спрабаваў. Ды зацяўся бацька. Чужы я яму. Лічы — з пятнаццаці гадоў я не дома. Адвык і ён ад мяне, і я ад яго. Ды і жыву не так, як ён хацеў, каб я жыў. Я зусім інакш уяўляю ўсё, веру ў калектыў, ведаю, што толькі разам людзі могуць справіцца з галечаю, з любым горам, якое б ні навалілася. Адзін жа чалавек, які б ён дужы і разумны ні быў,— нішто ў параўнанні нават з маленькім калектывам. Вядома, калектыву таксама патрэбны дужыя, галавастыя людзі, калектыву па-

трэбны кіраўнікі. І вось задача — спалучыць адно з другім. Тады нам ніхто, нішто не будзе страшна. Мы будзем непераможныя. А бацька наш: «Калі я не за сябе, то хто ж за мяне...», «Мне ніхто нічога яшчэ ніколі проста так, дарма, не даваў, калі свайго не было», «Дзе многа гаспадароў — там мала парадку», «Калгас выдумалі етакія, як ты сам,— рабіць не хочаце, а смачна есці вам давай...». Э-э, ды што гаварыць...— махнуў рукою Іван.— Лепш раскажы, як вы там жывяце...

— Ды жывом,— мрукнуў быццам абыякава Косцік і адвёў ад брата вочы, паглядзеў некуды ўгору, на неба — па ім, высокім, шырокім, атласна-блакітным, плылі, кудзеліліся, беглі і беглі лёгкія, бы ўсё адно з ваты, воблакі, хмаркі.

— Чуў, са школы цябе выключылі,— сказаў Іван, хоць, перш чым выключыць Косціка са школы, прыходзіў да яго, Івана, дырэктар Андрэй Макаравіч, раіўся, што рабіць, маўляў, цярпець распусту больш нельга, бо і сам хлопец ані не вучыцца, і іншым вучыцца не дае, урок за ўрокам зрывае, і разам з тым выключаць... не зусім быццам і ёмка, канец навучальнага года, ды і Косцік — родны ж брат старшыні сельсавета. Ён, Іван, помніцца, узлаваўся: «Пры чым тут я і мая пасада? І ставіць у залежнасць... Гм...» І гэтыя словы, мабыць, вырашылі ўсё — дырэктар падпісаў загад, асмеліўся выключыць Косціка са школы.

— Ага, выключылі,— кіўнуў лабастаю, даўно непадстрыганаю галавою Косцік, і не зразумець было, ці то ён перажывае, шкадуе, што яго выключылі, ці то радуецца.

— І што ты думаеш рабіць далей?

— Пабачу, не было яшчэ калі вельмі думаць.

Іван глядзеў на брата, і яму шкада было яго, да слёз шкада. Рос, лічы, без маці, тая памерла, калі Косціку не было і пяці гадоў. Бацька, браты, сястра — у вечных сваіх клопатах, згрызотах. Не да Косціка ім усім! Вельмі можа быць, што ніхто ні разу па-добраму і не пагаварыў з ім, не выслухаў, што ў хлопца на душы, што ў яго ў думках. І апрануты... Чорныя, абы-як палапленыя на каленях, мабыць, Хорай, картовыя штаны, нямытая, нейкая выгаралая, аж жоўтая — калісь была зялёная,— плямістая кашуля. «І ў школу, пэўна ж, у гэтай апратцы хадзіў! А хлопец жа ладнаваты ўжо! Э-э, я ж мог яму памагчы, купіць што-небудзь з адзежы. Не падумаў пра гэта!» — пранеслася, мільганула ў галаве ў Івана.

— У калгас пойдзеш?

— Я ж кажу: не думаў яшчэ, куды мне ісці. Можа, у калгас, а можа...

Памаўчаў, праглынуў даўкі камяк, што засеў у горле і не даваў гаварыць, і дадаў праз хвіліну:

— ...можа, у Гудоў, на завод.

— А ў школу?

— Дык мяне ж выключылі са школы.

— А каб ты папрасіўся, паабяцаў, што не будзеш урокі зрываць, не будзеш іншым замінаць і сам будзеш добра вучыцца? Уразоніш сябе, распусту тварыць спыніш, га? А то ж... Сорамна слухаць, што ты вырабляеш. Ты ж вялікі хлопец ужо, не дзіця.

Косцік зноў сцяў нітачкаю губы, думаў — толькі варухаліся, блыталіся на галаве лёгкія, амаль белыя, кужэльныя валасы — аднекуль, з балота, падзімаў ветрык. Ласкавы, цёплы летні ветрык, які нёс з сабою густы, мядовы пах красак і травы.

— Не, прасіцца я ні ў кога не буду,— сказаў нарэшце рашуча, як вынашанае, даўно раз і назаўсёды вырашанае, Косцік.

— Гонар не дазваляе?

— Не, не гонар.

— А што?

Косцік нейкі час уважліва, заўзята, нібыта бачыў іх упершыню, разглядаў свае ногі, абутыя ў паношаныя, старыя, даўно не мазаныя гуталінам, з белымі, выцертымі наскамі, зашнураваныя чорнымі ніткамі чаравікі. Потым раптам сказаў, бы ўсё адно адрэзаў:

— Не, прасіцца назад у школу не буду.

— Значыцца, сорамна... Настаўнікаў, вучняў табе сорамна, на вочы ім боязна паказацца.

Косцік нічога не адказаў. Унурыў худую, жылістую, з вострым кадыком шыю ў плечы і маўчаў.

— Дык што, і зусім думаеш у школу ўжо не хадзіць? — спытаў, трохі счакаўшы, Іван.

— Пагляджу. Лета во пройдзе, тады ясней усё стане.

— Можа, ты і праўду кажаш. Бо нават калі ты папросішся... Могуць не прыняць. Асабліва пасля таго...— не казаў, марудзіў Іван.

— Чаго? — падняў галаву, паглядзеў на брата — настрыўся, насцярожыўся Косцік.

— Ды пасля таго, як... Ты ж Веры Сымонаўне камень у акно запусціў...

Косцік аж сцехануўся, падскочыў, нібы яго ўкусіў хто.

— Адкуль ты ета ўзяў? — спытаў.

— Вера Сымонаўна ў сельсавет прыходзіла. У суд хоча на цябе падаваць...

— За што ў суд? — у вачах у Косціка Іван убачыў страх. Сапраўдны, непадробны страх.

— Уночы вокны б'еш, помсціш...

— За што я помшчу? — зніякавеў, разгубіўся Косцік.

— Ды, кажа, што са школы цябе выключылі. Хаця яна... Супраць была, каб цябе выключалі.

— Супраць? — падаўся ўсім целам, прыўстаў, прыпадняўся з лавачкі Косцік.

— Кажа, супраць. Ды не ў гэтым справа. Калі ты пачнеш біць вокны ўсім настаўнікам, хто быў за тое, каб цябе выключыць са школы, ты...— Іван спасцярожліва пакруціў галавою.— Далёка зойдзеш.

— Я не помсціў Веры Сымонаўне,— сказаў цвёрда, рашуча Косцік.

— Не помсціў? Тады... Чаму ж ты ёй акно пабіў? Ды яшчэ ўночы?..

— Знячэўку.

— Як гэта — знячэўку? Камень такі... Во такенны,— паказаў Іван рукамі, які той камень, што кідаў Косцік у акно настаўніцы, вядома, значна перабольшыўшы.— Вера Сымонаўна ў сумачцы ў сельсавет прыносіла, паказвала. І ты такі камень... У акно? Ды каб камень той трапіў каму ў галаву, хана была б. Разумееш, што ты робіш, чым скончыцца тое магло?

Косцік зноў сцяў нітачкай губы — задумаўся. Сядзеў, апусціўшы галаву, глядзеў зноў на свае ногі, потым раптам перавёў вочы на траву, што густа буяла, сакаўна зелянела ля лаўкі.

«Цікава, пра што ён думае? — цюкнула ў галаву Івану.— І чаму ён кінуў у акно Веры Сымонаўне камень? Кажа, не помсціў... Не верыць яму... Гм... Здаецца, ён шчыра пра ўсё гаворыць. Калі ў чым не хоча прызнавацца — не прызнаецца. У Дарошкаў, значыцца, удаўся, не хітрыць. Але ж тады... Чаму ён кінуў у акно Веры Сымонаўне той камень?»

Косцік жа думаў пра іншае. Ад гутаркі з братам, Іванам, ён нічога добрага не чакаў. Ведаў: ушчуваць будзе той яго, вучыць, а можа, нават і лаяць — як, са школы выключылі, бандзюга! Але Іван не лаяў, не ўшчуваў. Гаварыў, як з дарослым, прызнаваўся ў тым, у чым ніколі раней не прызнаваўся. У сварцы з бацькам ні сябе не вы-

гараджваў, ні бацьку не вінаваціў: што ж, як ужо здарылася, так здарылася. Была дзесьці хвіліна, калі і Косціку хацелася шчыра ва ўсім прызнацца брату, маўляў, на душы цяпер у яго т а к о е, ш т о... ён іншы раз і сам сябе не разумее, хоча рабіць адно, а робіць зусім не тое. Але хвіліна тая прайшла — узнікла такое жаданне і знікла. Як мышка з норкі — паказала мордачку і схавала. І Косцік сядзеў, мучыўся, што не можа ён ва ўсім адкрыцца брату, бо не ведае, што той скажа, як паступіць. Прызнанне Івана, што на яго, Косціка, прыходзіла скардзіцца Вера Сымонаўна, што Вера Сымонаўна думае падаваць у суд, і зусім збіла з панталыку хлопца. У вушах гучалі і гучалі словы: «Ды каб камень той трапіў каму ў галаву, хана была б». «А камень жа мог трапіць у галаву. І каму... Ёй, Тасі! Што тады б я рабіў?» Косцік сядзеў як аглушаны, толькі білася, пульсавала ў скронях кроў.

— Ну што ж, не хочаш — не кажы, не прызнавайся,— гаварыў тым часам Іван, і голас яго далятаў да Косціка глуха і невыразна, як праз тоўшчу вады, калі летам, бывае, ныраеш у сажалку, а табе хтосьці з равеснікаў наўздагон з берага нешта крычыць, раіць. «Пра што ета ён? Што хоча ад мяне?» — напружваў, сіліў памяць, пакутліва думаў Косцік. «А-а, мусіць, усё пра той камень...» — здагадаўся нарэшце ён.

Іван жа не змаўкаў — гаварыў, гаварыў:

— На сёння хопіць. Будзем лічыць, пагутарылі. Па душах пагутарылі. Не чакай другі раз, калі я цябе паклічу. Сам да мяне заходзь. І ў сельсавет, і дадому. Дадому нават лепей. І куды падацца табе цяпер — падумай, добранька падумай. Не байбусуй. Гультайства да дабра не даводзіць. Як надумаеш — мне скажы. У калгас дык у калгас. А на завод захочаш, я дырэктару магу пазваніць. Ён залічыць цябе. Пазваню — і залічыць...

Іван знарок пра завод яшчэ раз напомніў. Лічыў: рабочая загартоўка — самая лепшая школа. Па сабе гэта ведаў. На заводзе працаваць — норму выконваць трэба, там дысцыпліна, ды і калектыў. Калі што — памогуць, падкажуць, навучаць...

## IX

З тае начы, як пастукаліся на кватэру невядомыя людзі і забралі, павялі з сабою бацьку — дзе ён і што з ім? — у Тасі ўвайшло ў звычку кожны дзень нібыта спавядацца

яму, расказваць, што з ёй здарылася, што яна перажыла. Спярша перад сном шапталася, паведамляла, што сказала б бацьку, калі б ён быў дома, побач. Потым праз некаторы час свае думкі і перажыванні яна пачала запісваць у тоўсты агульны сшытак, вясці як бы своеасаблівы дзённік. Паспавядаецца, выкажа, напіша, што яе трывожыла і хвалявала, і на душы спакайней, палягчэе. Быццам зваліла са сваіх плячэй цяжар, аддала яго камусьці іншаму, каб нёс.

У той вечар, як Косцік Дарошка знянацку дагнаў на грэблі, схапіў за руку і хацеў затрымаць, а Тася вырвалася і пабегла, уцякла дадому, і ён, нахаба, кінуў у акно камень, яна запісала ў дзённік літаральна вось што:

«Тата, татачка!

І сёння паслухай мяне, як заўсёды, кожны вечар слухаў і слухаеш. Ты ж ведаеш, якая я адзінокая. Асабліва тут, у вёсцы. Новых сябровак заводзіць баюся, а ранейшыя... Ах, не будзем таго ўспамінаць! А сёння ўвечары забеглі раптам да нас у хату дзяўчаты-аднакласніцы і ледзь не сілаю выцягнулі пагуляць. «Пойдзем, Тася, а то засохнеш над етымі (тут, у Вялікім Лесе, усе гавораць не «гэты», а «еты») кніжкамі». Ісці нікуды мне не хацелася, наогул, я пасля таго, як забралі цябе, усіх старанюся, не толькі аднакласніц. І проста дзіўна, як асмеліліся яны прыйсці да нас у хату. Упершыню. Але разам з тым і крыўдзіць іх... Словам, пайшла я. Якраз праехалі па вёсцы цыганы, спыніліся ў бярэзніку на лузе, расклалі вогнішчы. Многія людзі кіраваліся да цыганскага табара, пайшлі туды і мы. Дзіўны народ гэтыя цыганы! Дваццаты век, цывілізацыя, новыя адносіны і зносіны між людзьмі, гарадамі і вёскамі, краінамі і народамі, а яны валацужнічаюць па свеце, зусім гэтак жа, як валацужнічалі сто, а можа, і тысячу гадоў таму назад — на конях і калёсах. У мяне цікавасць да цыганоў з таго часу, як ты, татка, паэму Пушкіна «Цыганы» чытаў. Помніш:

Цыганы шумною толпой
По Бессарабии кочуют.
Они сегодня над рекой
В шатрах изодранных ночуют...

Ага, дык пайшлі мы да цыганскіх вогнішчаў разам з дзяўчатамі-аднакласніцамі, пастаялі трохі зводдалі, бо падыходзіць бліжэй і баяліся, і неяк сорамна было — людзі есці сабе вараць, вячэраюць, потым спаць укладвацца будуць, а нам назіраць за ўсім гэтым... Няёмка ж! Словам, пастаялі збоку, паглядзелі ды дахаты. Дзяўчаты, з якімі

я хадзіла за вёску на луг, бліжэй за мяне жывуць, я з усімі імі развіталася, а сама за грэблю, на Замосце, да той хаты, дзе мы з мамаю цяпер жывём, пайшла. Заўсёды, калі я па грэблі іду, нават удзень, дык боязна, вусцішна. Так і здаецца: нехта над самым вухам дыхае і вось-вось дагоніць, за плечы схопіць. Уяві: алешнік паабапал, дрыгва, самая што ні ёсць дрыгва, кажуць, нават уюны там плодзяцца, а ўжо да жаб! Ты б паслухаў, што яны, тыя жабы, па вечарах вытвараюць. Канцэрты, сапраўдныя канцэрты! І кумкаюць, і вохкаюць, і квакаюць, і бог ведае што яшчэ робяць. Пра гэтую грэблю чаго толькі не наслухалася я. Быццам і ваўкі часта ля яе шныпараць, падпільноўваюць: раптам парсюк які будзе бегчы, дык паласавацца можна; і лісы курэй, качак ды гусей тут падсцерагаюць. А то... і чэрці, кажуць, на гэтай грэблі водзяцца. Дзед Кулеш сур'ёзна ў гэта верыць, апавядае, як ён у маладыя гады з пагулянкі вяртаўся — бачыць, на грэблі чорны баран ляжыць. «Чый бы ета мог быць?» — падумаў дзед Кулеш (тады, вядома, ён яшчэ не дзед быў). Падышоў бліжэй, нагою барана варсануў. А той сабе ляжыць, хоць бы што. Дзед палку ўзяў ды як апяража барана. Баран на ногі падхапіўся ды, кажа, як зарагоча. Валасы ў дзеда на галаве дыбка ўсталі — уцякаць з усіх ног ад таго барана кінуўся. Толькі потым ужо, адбегшы, здагадаўся: ніякі то не баран быў, а чорт. Самы звычайны чорт. Чэрці, кажа, умеюць у каго хочаш перакідвацца, і ў барана таксама... Я, татка, вядома, не веру ні ў якіх чарцей, не веру, што ёсць яны наогул на свеце. Але, прызнаюся, калі іду па грэблі адна, ды яшчэ ўночы,— баюся, ой як баюся. І вось уяві сабе — вяртаюся я па грэблі ад цыганскіх вогнішчаў і раптам крокі чыесьці за сабою чую. Я, вядома, пабегла. І той за мною таксама пабег. Я хутчэй, і ён — хутчэй. Думала, сэрца разарвецца, з грудзей выскачыць. Азірнулася — Косцік Дарошка, аднакласнік мой, яго са школы нядаўна выключылі. Не даваў нікому вучыцца, урокі зрываў. Кажуць, да нашага прыезду сюды, у вёску, ён не такі быў. Але я не веру ў гэта — па ім відаць: разбойная ў яго морда. Ага. Дык азірнулася гэта я, убачыла, што Косцік Дарошка за мною гоніцца,— і расплакалася, разраўлася. Страх, мусіць, слязамі з мяне выходзіў. «Не набліжайся да мяне»,— крычу. А Косцік за руку мяне ўхапіў, шэпча нешта. Але я вырвала руку, уцякаць зноў з грэблі з усіх ног пусцілася. У двор, задыхаўшыся, ускочыла, весніцы за сабою на зашчапку зачыніла. Стаю і чакаю, што далей будзе. А ён, мусіць, са

злосці камень падняў ды ў акно нам. На друзачкі шыбіну пабіў, маці напалохаў да смерці. Што ён ад нас хоча, чаго чэпіцца? І раней я заўважала, на мяне ўсё глядзіць. Уставіцца сваімі бізюкамі і глядзіць, глядзіць. А цяпер, як са школы яго выключылі... Маці кажа, помсціць ён нам, бо думае: гэта яна настояла, каб яго са школы выключылі. Я не прызналася маці, што да мяне на грэблі Косцік прыставаў, даганяў, калі я ўцякала. А так бы!.. У сельсавет, кажа, пойдзе, у суд на Косціка падасць. А я адгавbooрваю маці — не рабі гэтага. У Косціка ў сельсавеце за старшыню родны брат, Іван, а мы ж... Ты ж ведаеш, хто мы... У вёску з горада ўцяклі, каб... Э-э, ды пра тое не толькі пісаць, а і гаварыць, успамінаць не хочацца. Тут, у Вялікім Лесе, маці нікому не прызнаецца, што яна выкладала матэматыку ва універсітэце. І пра цябе, татка, мы таксама нікому нічога не расказваем. Быў ты ў нас — і няма. Ці мала што магло здарыцца? Успамінаем толькі кожны дзень, чакаем, калі ты зноў з намі будзеш. Дзе ты, татка, што з табою, хоць бы абазваўся? Але як ты абзавешся — мы ж нікому не сказалі, куды паехалі, дзе мы цяпер. За кватэрай знаёмых папрасілі глядзець, а самі паехалі. Кажу іншы раз я маці — давай хоць адрас пашлём знаёмым нашым, раптам татка дадому вернецца, хоць ведаць будзе, дзе шукаць. Але маці не хоча адрас нікому пасылаць. Кажа, калі бацька на волю выйдзе, ён нас знойдзе. А не — мы яго знойдзем самі. А вось калі адрас трапіць непажаданым людзям, дык... Ой, страшна нават падумаць, што можа здарыцца, быць. Можа, маці і праўду кажа. Толькі, татка, нядобра тое, што мы зрабілі. Кінулі цябе аднаго. У бядзе. А самі збеглі, уцяклі. Таму, мабыць, і сумна-сумна нам. Іншы раз аж плакаць хочацца. Я і плачу. І маці плача. Паціхеньку, хаваючыся адна ад адной. Ой, татка, пра многае хацелася б расказаць табе, а галоўнае — што на душы ў мяне. Але на сёння хопіць, мабыць, і таго, што я ўжо расказала. Бывай, татка! Хай табе добрыя сны сняцца!..»

## X

Надвячоркам, калі Іван збіраўся ўжо кіравацца з сельсавета дадому, у яго баковачку не ўвайшоў, а ўбег Апанас Харчэня.

— Да тэлефона вас,— сказаў ён неяк насцярожана, амаль таямніча.— Нехта з начальства, з Ельнікаў.

Іван падхапіўся з крэсла, заспяшаўся да тэлефона —

тэлефон вісеў на сцяне ў агульным пакоі, паблізу стала сакратара. Узяў трубку, паднёс да вуха, крыкнуў:

— Алё-ё! Старшыня Велікалесаўскага сельсавета Дарошка слухае.

У трубцы суха кашлянулі, і па гэтым кашлі Іван пазнаў — звоніць першы сакратар райкома партыі Раман Платонавіч Багавік, Сам, як звалі яго ўсе ў раёне.

— Ну як ты? — пачуўся з трубкі знаёмы голас.

— Ды звычайна. Жывём, працуем,— бадзёра адказаў Іван.

— Зазнаўся, не звоніш, нічога мне не кажаш, таіцца пачаў,— зноў кашлянуў, прачысціў горла Раман Платонавіч.

— Хацеў бы што ўтаіць, дык няма чаго.

— Няма, кажаш? А соль? Што там у цябе ля магазіна было?

Іван прыкусіў губу — сапраўды, чаму б не пазваніць Раману Платонавічу, не расказаць пра ўсё, не параіцца... «Проста не падумаў!»

— Што маўчыш? Ты ўявіў, як не скажаш, то мы тут, у Ельніках, і ведаць нічога не будзем? Э-э, не, брат, чуткамі зямля поўніцца. І да нас, да райкома, бачыш, дайшло. Што-о, аціхла, не стаяць з мяшкамі ля магазіна людзі?

— Не, не стаяць. Цыганы, можна сказаць, свінню падсунулі.

— Якія цыганы?

— Ды прыязджалі тут, вайну прарочылі.

— Яшчэ адзін мінус табе як кіраўніку, што не пазваніў. Калі цыганы вам вайну, як ты кажаш, прарочылі, дык і ў іншым месцы маглі таксама тое ж прарочыць. А гэта ўжо агітацыя. Разумееш, а г і т а ц ы я? — ледзь не па складах паўтарыў апошняе слова Раман Платонавіч.

— Не падумаў пра гэта,— прызнаўся Іван.

— Не падумаў, кажаш? А галава нашто? Ты ж кіраўнік! Не пазнаю я цябе, Іван Мікалаевіч. Кульгаць нешта ты пачаў. І не на адну нагу, а адразу на дзве.

— Чаму на дзве? — не мог, каб не запытаць Іван Дарошка: як-ніяк, а з Раманам Платонавічам яны працавалі разам і даволі доўга ў Гудове, на заводзе, былі амаль сябрамі.

— Чаму на дзве? Не здагадваешся?

— Не, Раман Платонавіч.

— А на працу да сябе ў сельсавет за сакратара каго ты ўзяў?..

Думку Рамана Платонавіча Іван Дарошка, як яму здалося, улавіў. А таму адказаў даволі спакойна, нават нібыта са смяшком:

— Разумею, Раман Платонавіч. Так, ён пакуль што не член партыі. Але мы прымем яго ў бліжэйшы час у кандыдаты,— гледзячы на Харчэню, упэўнена гаварыў Іван Дарошка.

— Што-о?.. А дзядзька, дзядзька ў яго?.. Хіба забыў, га?

Толькі цяпер да Івана дайшло, на ш т о намякае Раман Платонавіч — дзядзька Апанаса Харчэні... Гм, дзе дзядзька Апанаса Харчэні, ніхто ні ў раёне, ні ў вёсцы сказаць не можа. Быў і няма...

— Дык то ж дзядзька,— ціха, глуха, зусім ужо іншым голасам дыхнуў у трубку Іван Дарошка, адчуваючы, як прыліла раптам да твару гарачыня, забілася, затахкала ў грудзях сэрца.— Ды вы... Вы ж, Раман Платонавіч, ведаеце ўсю тую гісторыю... Ён жа, той дзядзька, ні ў чым не вінаваты...

— Не будзем па тэлефоне высвятляць, хто вінаваты, а хто не вінаваты,— спыніў, лагодна абарваў Івана Раман Платонавіч.— Слухай, што начальства табе кажа. І выконвай. І перш чым што-небудзь рабіць, думай больш. І райся, звані, калі што якое ўзнікае. Ты ж не на неабжытым востраве, можа. Гэта адно. І другое — заўтра ў твой сельсавет лектар прыедзе. Міжнароднік. З Мінска, са сталіцы, кандыдат навук. Збяры людзей, хай паслухаюць, дзе што на свеце дзеецца. А то дажыліся... Цыга́ны нейкія ездзяць, чуткі розныя распускаюць. А мы... Маўчым, нават сакратару райкома не дакладваем.

— Вінаваты,— папярхнуўся Іван.

Раман Платонавіч сапраўды быў сёння не ў гуморы. Злаваць, гнявіць яго... Не, не варта было.

— Ты, брат, не крыўдуй. Сяброўства — сяброўствам, а служба — службай. Не забывай, які цяпер ч а с... Ч а с д ы і с і т у а ц ы я... Разумееш?

— Разумею, Раман Платонавіч.

— А калі разумееш, не дапускай, каб скаргі пісалі...

— Якія скаргі? На каго?

— Ды-ы...— цягнуў, мусіць, не хацеў гаварыць сакратар райкома.

— Калі нельга, не гаварыце.

— Няхай, пачаў ужо, дык скажу. На бацьку твайго, што лес нішчыць, паляны нейкія карчуе. Ды і... што Харчэ-

ню за сакратара ў сельсавет узяў. Мы, вядома, не надаём асаблівага значэння ананімцы гэтай, ведаем, даўно цябе ведаем. Але будзь на вышыні — поваду для скаргаў не давай. Разумееш?

— Разумею.

— Ну, то поспехаў табе! І не забывай званіць. А то і прыязджай. Не чакай, калі цябе паклічуць!

...Ішоў, вяртаўся з сельсавета Іван Дарошка дадому, і думкі яго віліся, віліся вакол аднаго і таго ж — размовы з Раманам Платонавічам. Успамінаў, перабіраў кожнае, сказанае сакратаром райкома, слова, так і гэтак паварочваў яго, спрабаваў, быццам арэх, раскусіць, каб здагадацца, уявіць увесь таемны і нетаемны сэнс пачутага. Не, не ўсё разумеў ён, Іван, з таго, што казаў яму Раман Платонавіч. Толькі падтакваў, рабіў выгляд, што разумее. Дый... Не прывык ён, Іван, каб з ім так размаўлялі. І хто... Багавік, Раман Платонавіч, можа быць, самы блізкі яму чалавек, сябар. Адчуваў: папрокі недарэмныя, справядлівыя. Гэта праўда, мог, не толькі мог, а абавязаны быў ён, Іван, пазваніць у раён, сказаць пра паніку з соллю. «Не падумаў пра гэта» — не апраўданне. Павінен, абавязаны быў падумаць! Потым... Гэтая скарга. Зноў, зноў я вінаваты! Трэба было пагаварыць, даўно пагаварыць з бацькам, наладзіць адносіны... Хоць бацька... Не новае гэта. Бацькам яго, Івана, і раней неаднойчы ўпікалі. Як толькі што — так і калолі вочы. «А бацька твой...» Гм, што і казаць, бацька ў яго, Івана, не такі, як у некаторых кіраўнікоў. Не рэвалюцыянер. Не перадавік. У калгас і то не хацеў уступаць, ледзь не сілаю яго туды, як быка на бойню, упіхнулі. Не шчыруе, не стараецца і цяпер асабліва ён на калгаснай ніве. Так, целюхаецца, абы з ранку да вечара дзень прайшоў, абы не плявузгалі, што адлыньвае, не хоча ў калектыве рабіць. Гэта праўда, усё, усё праўда. Але ж бацькоў не выбіраюць, якія яны ёсць, такія ёсць. І ён бы, Іван Дарошка, хіба ж не радаваўся б, каб у яго іншы быў бацька, такі, якіх маюць некаторыя кіраўнікі. Але ж такога бацькі ў яго няма. Няма! «Трэба было перавыхаваць!» Гм, у тым і штука ўся — не паддаецца перавыхаванню. Не перавыхоўваецца, трымаецца за даўняе, старое, усё адно як п'яны за плот, што хочаш з ім рабі. Бацька жыве зусім іншым жыццём, ён верыць не ў тое, не таму, у што я сам веру. Што ж, з такім бацькам астаецца толькі парваць усякія адносіны. Ды ён, Іван, і парваў іх, і гэта ведаюць у райкоме, у райвыканкоме. Так што за бацьку ён не адказвае, бацька

хай адказвае сам за сябе. Дзялянкі гэтыя ў пячонкі ўжо ўеліся. Даўно калгасы навокал, а ён, бацька, усё адно кожную вясну як хадзіў карчаваць дзялянкі, так і ходзіць. Нічога з ім не зробіш, прывык за свой век. Як вясна пачынаецца, так ён і ў лес, на расцяробы. Быццам своеасаблівы інстынкт выпрацаваўся ў яго. Як у птушкі да выраю ўвосень. З лясніцтва неаднойчы ўжо званілі яму, Івану. «Штрафаваць будзем!» — «Ну і штрафуйце, чаго вы мне пра гэта дакладваеце?» Але так ні разу і не аштрафавалі, баяцца: сын жа старшыня сельсавета... Але ж і не мне, сыну, штрафаваць роднага бацьку, тым больш што я з ім гадоў дзесяць і не размаўляю нават... «А дарэмна, дарэмна,— падказала, падкралася нейкая свавольная, упартая думка.— Трэба было і размаўляць, і адносіны наладзіць даўно. Тады б ты ўплываў на бацьку. А то... Надта ж лёгкі шлях гэта — парваў адносіны, не размаўляю — і ўсё».— «Можа, можа, і праўда. Але бацька — гэта старое, пра гэта гаварылі не на адным пасяджэнні, дзе ананімкі, скаргі розныя разбіралі».— «А новае? Што новае?» — «Харчэня»,— вынырнула аднекуль, апякло, як агнём. «Харчэня новае».— «Не забывай, які цяпер час. Час ды і сітуацыя». Што меў на ўвазе, гаворачы гэтыя словы, Раман Платонавіч?.. Ага, час... Час цяпер, вядома, неспакойны, напружаны, пра вайну чуткі паўзуць, ворагаў вунь усюды колькі выкрылі. І ў калгасах, на заводах, і ва ўстановах розных, і ў войску. Прытаіліся былі, сядзелі ціхенька, бы мыш пад венікам, а потым галовы пападымалі. Значыцца, пачулі нешта... Праўда, няма разгарнення ў нас ворагам, бачаць іх людзі, усюды бачаць, дзе б ворагі ні акапаліся. І выкрываюць, ловяць. Інакш і быць не можа. Вялікай крывёю заплацілі мы за ўсе заваёвы Кастрычніка, іх трэба абараняць ад ворагаў. Так што, чаму Раман Платонавіч гаварыў пра час, можна зразумець. А скарга, ананімка гэтая, Харчэня... Добра, што здагадаўся Апанас выйсці, калі пачуў, што размова ідзе пра яго. А так бы... Не зусім ёмка абодва сябе адчувалі б. І Апанас Харчэня, і ён, Іван Дарошка. Камусьці, мусіць, вочы муляе, спакою не дае, што ён, Іван Дарошка, за сакратара ў сельсавет Апанаса Харчэню ўзяў. Бачыш, у райком напісалі!.. Дзядзьку ўспомнілі!.. Але ж... Пры чым Апанас да таго дзядзькі... Ды і дзядзька той, калі разабрацца, таксама... Проста збег акалічнасцей, сітуацыя...

...Дзядзька Апанаса Харчэні — Нупрэй, па мянушцы Завадзіла (надта ж лёгка ён паддаваўся розным уплы-

вам, заводзіўся, і калі такое здаралася — нічым, нічым нельга было астудзіць, пераканаць Нупрэя; што б і хто б яму ні гаварыў, ён усё адно цвердзіў сваё!), у гады калектывізацыі таксама не спяшаўся ўступаць у калгас.

— Я газеты чытаю, палітыку ведаю,— казаў ён кожнаму, хто прыходзіў агітаваць яго падаваць заяву ў калгас.— Не пішуць такога газеты, кеб зямлю ў небагатага чалавека забіраць. Зямлю можна забіраць толькі ў кулакоў, падкулачнікаў. А ў бедняка нельга нічога браць. Ета ж лухта палучаецца — Савецкая ўласць давала бедняку зямлю, а потым забірае? Не можа такога быць! Пакажыце мне, дзе пра ета напісана?

Прыехаў з Ельнікаў упаўнаважаны, які захацеў пераканаць Нупрэя Харчэню, маўляў, ёсць указанне ліквідаваць межы — зямлю ўсіх аднаасобнікаў-сялян злучыць у адзін вялікі калгасны клін. І ўказанне тое самога таварыша Сталіна.

— Не можа етага быць, не веру! — стаяў на сваім Нупрэй.— Пакажы мне, дзе пра тое напісана...

— Я табе... Ды калі ты не верыш...— упаўнаважаны таксама быў з людзей гарачных, неспакойных.— Прыходзь у Ельнікі. Проста да мяне. З самім таварышам Сталіным пагаворыш...

— Як ета? — не паверыў, вырачыў ад нечаканасці і здзіўлення вочы Нупрэй.

— А так. Я цябе па тэлефоне з Масквою, з Крамлём злучу.

— А хіба ета можна? — усё яшчэ сумняваўся Нупрэй.

— Можна.

І Нупрэй, назаўтра ж, абуўшы на ногі новыя лутовыя лапці, накінуўшы на плечы лепшую сваю світку, падаўся ў Ельнікі. Знайшоў таго ўпаўнаважанага, зайшоў да яго ў кабінет.

— Ідзі, дзядзька, на пошту, да самога начальніка таварыша Гітовіча. Скажаш, хто ты і чаго прыйшоў. Гітовіч пра ўсё ведае, я з ім гаварыў ужо. Калі ты такі недаверак, злучыць ён цябе з Масквою, пагаворыш з таварышам Сталіным...

Вядома, і пасля гэтых слоў Нупрэй ані не паверыў упаўнаважанаму: «Маніць, за нос водзіць!» Але і адступаць не было як — і цікавасць брала, ды і завёўся ўжо Нупрэй. Таму, падзякаваўшы, пакланіўшыся ледзь не ў ногі, паскрыпеў сваімі новымі лутовымі лапцямі Нупрэй

на пошту. Пастукаўся ў дзверы да начальніка — ім аказаўся зусім малады хлопец.

— А-а, з таварышам Сталіным пагаварыць хочаш? — з усмешкаю на ўвесь твар сустрэў дзядзьку начальнік пошты.— Ідзі ў кабіну. Вунь тую, што ля сцяны. Трубку з тэлефона здымі, скажы, што хочаш пагаварыць з таварышам Сталіным...

Нупрэй чалавек быў рашучы — смела пакіраваўся ў кабіну, зняў з рычажка тэлефоннага апарата трубку.

— Мне б з Масквою, з таварышам Сталіным пагаварыць...— сказаў і аж пахаладнеў не то ад страху, не то ад радасці.

— Калі ласка,— адказаў яму бадзёры голас тэлефаніcткі.

«Глядзі ты, як усё проста!» — паспеў падумаць яшчэ Нупрэй, і ў наступную хвіліну ў трубцы пачуўся раптам голас Сталіна. Не чыста па-руску, з грузінскім акцэнтам, таварыш Сталін вельмі спакойна сказаў, што ўпаўнаважаныя праўду кажуць, трэба беднякам уступаць у калгасы, свае кліночкі зямлі злучыць у адзін вялізны калгасны палетак... Таварыш Сталін і яшчэ нешта гаварыў, але Нупрэй ужо не чуў, што менавіта — яго захліснула, перапоўніла радасць. Ён кінуў тэлефонную трубку, выскачыў з кабіны.

— Я з таварышам Сталіным гаварыў! Я з таварышам Сталіным гаварыў! — закрычаў ён апантана і выбег на вуліцу.

І ўжо не заходзіў у кабінет да таго ўпаўнаважанага — ляцеў, імчаў, не чуючы пад сабою ног, у Вялікі Лес. І, каго ні сустракаў, расказваў, як ён «гаварыў па тэлефоне з самім таварышам Сталіным»...

Не ведаў Нупрэй (адкуль яму тое ведаць было!), што з яго кпліва, жорстка пажартавалі — начальнік пошты, па папярэдняй, вядома, дамоўленасці, злучыў па тэлефоне «самаўпэўненага вясковага дурня», не з таварышам Сталіным, а з тым упаўнаважаным, які прыязджаў у Вялікі Лес і да якога наведаўся дзядзька, і той упаўнаважаны, як умеў, пагаварыў з Нупрэем...

Чутка, што велікалесавец Нупрэй Харчэня размаўляў па тэлефоне з самім таварышам Сталіным, хутка разнеслася па раёне. Ахвотнікаў пагаварыць з кіраўніком партыі і краіны, выказаць яму ўсё, што сабралася на душы, было нямала, яны рынулі на пошту, пачалі патрабаваць ад начальніка, каб той злучыў іх з Масквою, з Крамлём...

Начальнік пошты разгубіўся, каму дазваляў пагаварыць з таварышам Сталіным, каму не дазваляў.

— Ідзіце адсюль, таварыш Сталін заняты, яму дзяржавай кіраваць трэба, а не з вамі, лапцюжнікамі, цэлымі днямі языком мянціць...— праганяў ён асабліва настырных.

Пасыпаліся скаргі...

Скончылася гэтая гісторыя сумна, вельмі сумна. Таго ўпаўнаважанага, начальніка пошты, Нупрэя Харчэню, ды і некаторых іншых, хто гаварыў і нават не гаварыў, а хацеў, дамагаўся пагаварыць з таварышам Сталіным, арыштавалі, некуды звезлі. Вызвалілі ад пасад тады і першага сакратара райкома партыі, старшыню райвыканкома... Амаль усё раённае начальства за дзень-два памянялі...

...«Сітуацыя,— думаў, згадваў тое, што не так даўно здарылася, кіруючыся дахаты, Іван Дарошка.— І калі шукаць вінаватага, дык, вядома, найбольш вінаваты ва ўсёй гэтай прыкрай гісторыі ўпаўнаважаны. Вінаватыя і начальнік пошты, тэлефаністка. А дзядзька Нупрэй... Не паверыў упаўнаважанаму, хацеў сам, сваімі вачыма прачытаць, дзе, у якім дакуменце напісана, што трэба ўсім беднякам у калгас аб'ядноўвацца, свае кліночкі зямлі злучыць у агульны калгасны палетак. Дык... трэба было растлумачыць дзядзьку, паказаць тыя дакументы. А ўпаўнаважаны... Ашуканствам заняўся, пад каго, пад каго падрабляцца пачаў! І начальнік пошты Гітовіч, тэлефаністка... Замест таго каб спыніць гульню, яны і самі ў яе ўключыліся. Хто вінаваты, няхай той і адказвае. А Нупрэй... Хоць, калі добранька падумаць, можа, і Нупрэй у сім-тым вінаваты. Сумнявацца ні ў чым не трэба было, верыць таму, што гавораць, не настырняцца, не патрабаваць ад упаўнаважанага нейкіх дакументаў, не лезці сляпіцаю. А ён... Ды і гісторыя ўся гэта пачалася ж не з каго-небудзь, а з Нупрэя. Не было б яго, дык бы... Але ж... Нават калі так, то пры чым Апанас Харчэня? Ну сваяк, пляменнік ён Нупрэю. Дык і што? Караць яго, упікаць, не давяраць? І каб хоць хлопец быў ён гэтакі ж, як усе... А то ж... Бацьку ў лесе хвояй задавіла — павісла хвоя на дубе, калі з сынам, Апанасам, яе валіў. Палез бацька на дуб, каб сук той, на якім хвоя павісла, ссячы. А сук — хрась! — ададраўся. Хвоя віхлянулася і... Пахавалі бацьку, а ў сына, Апанаса, рука левая аднялася, сохнуць чагосьці пачала. Не валодае ёю ані. Маці старалася, каб вывучыць хлопца — не работнік ён у гаспадарцы з адной рукою. Вывучыла, хлопец дзесяцігодку

скончыў. Вучыцца далей... Сродкаў у маці няма. Пашкадаваў хлопца, у сельсавет за сакратара ўзяў, вылучыўшы таго, ранейшага, Васіля Кулагу, на больш адказную і самастойную пасаду — старшыні калгаса. Апанас старанны, сумленны... Ды-ы... Бачыш жа, некаму не падабаецца, за жывое кранае... У райком напісалі, паведамілі, дзядзьку ўспомнілі... Гм, сітуацыя...»

## XI

Ненавідзеў, багата каго ненавідзеў Яўхім Бабай, але, мабыць, люцей за ўсіх — Дарошкаў. Сам не ведаў, не мог сказаць, адкуль, чаму ў яго такая нянавісць менавіта да гэтай сям'і. Можа, хіба з «зялёных» яшчэ, калі разам з Пілiпам у лесе хаваліся — баяліся, што заграбастаюць іх у войска і пагоняць ваяваць. Піліпу тады з дому прыносілі торбы з хлебам і салам, той ні дня не галадаў, заўсёды-заўсёды быў сыты. А ён, Яўхім, галадаў. Не было яму каму насіць, дый пхаць, ладаваць у торбы не было асабліва чаго — дома, у вёсцы, жыла адна маці, жыла бедна, ледзь канцы з канцамі зводзіла. І ён, Яўхім, то прасіў, каб хоць дух прабавіць, у такіх жа, як сам, вясковых, але багацейшых, хлопцаў, у тым ліку і ў Піліпа, то прылаўчыўся быў патроху красці, абіраць людскія каморы і кубельцы, наведваючыся па начах у суседнія вёскі. Разы тры яго лавілі, ды Яўхім быў малы і вёрткі, выкручваўся, уцякаў. Нянавісць да тых, хто спакойна жыў дома, у вёсцы, а заадно і да тых, хто хаваўся разам з ім у лесе, але не галадаў так, як ён сам, аж раз'ядала, бы ржа жалеза, ятрыла Яўхіма. Скончылася вайна, чырвоныя перамаглі белых. Вярнуліся ў вёску, у свае хаты і тыя, хто адседжваўся ў лесе, быў у «зялёных». І ён, Яўхім, таксама вярнуўся. Але нянавісць да тых, у каго ёсць што есці, ёсць у што апрануцца, абуцца, хто ніколі ні ў чым не меў і не мае патрэбы, у Яўхіма не знікла. Наадварот, яна расла, займала думкі, вярэдзіла душу, пераварочвала ўсё Яўхімава нутро. Людзі кінуліся церабіць, раскарчоўваць дзялянкі — хацелі мець больш поля. Кінуўся быў і ён, Яўхім. Але што ты адзін вельмі зробіш! Пакуль сотку якую раскарчуеш, некаторыя сем'ямі па гектару за гэты час управяцца раскарчаваць. Асабліва шчыравалі Дарошкі, усе лепшыя палянкі захапілі. І зноў нянавісць да Дарошкаў, як учыненае ў дзяжы цеста, аж перапаўняла Яўхіма. Бо Дарошкі гэтыя — быццам мурашкі — куды ні паткніся, яны ўжо там. Нагледзіш кавалачак

ніштаваты, думаеш, ну вось заўтра ранічкаю сюды прыйду, церабіць вазьмуся. Прыйдзеш, а там ужо варушацца Дарошкі, ні свет ні зара на ногі паўсхопліваліся, прыбеглі. Не сам Мікалай, дык жонка яго, Ганна, ці Піліп, ці Параска, ці Хора. Іван жа таксама ў шапку не спаў — вучыўся, у начальства выбіваўся. Піліп хутар сабе аблюбаваў, хату ставіў. Параска замуж выйшла, таксама ўдала, не за бедняка. Дарошкі — як пырнік, разрасталіся, захоплівалі ўсё новыя і новыя абсягі. Ён жа, Яўхім, пераканаўся неўзабаве: багацеем не стане. Адзін! Куды ні падайся, за што ні вазьміся — адзін! Усё зрабіць, усюды ўправіцца, паспець, хоць разарвіся, не ўдасца. Ажаніўся, узяў сабе жонку рабую, але рабацяшчую, Соньку. Сонька была ўпраўная ў гаспадарцы, у яе ў руках усё гарэла, калі яна бралася рабіць. Гэта і прывабіла Яўхіма. Не ведаў толькі ён, Яўхім, што Сонька да таго ж яшчэ і пладавітая, як трусіха. Агледзецца не паспеў — поўную хату дзяцей нараджала. Як год, так і дзіця. Пракарміць такую плойму... Кінуў Яўхім гаспадарку, пайшоў у леснікі. Хоць жылле рваць не трэба. Цэлы дзень па лесе ходзіш, птушак слухаеш, на дрэвы глядзіш! Гэта не тое, зусім не тое, што на полі з ранку да вечара рачкуеш, пыл глытаеш. І яшчэ выгада адна лесніком быць — дома не стыкаешся, не чуеш, як дзеці плачуць, есці просяць, не бачыш, як Сонька то б'е каторага, то ўлагоджвае. Бяльмом на воку быў Яўхіму Піліпаў зруб. Ідзе ў лес Яўхім — стаіць, красуецца зруб, ідзе з лесу Яўхім — стаіць зруб, красуецца. Падкраўся ўночы, чырвонага пеўня пад страху пусціў. Піліп за лета адбудаваў зруб, яшчэ прыгажэйшы, прастарнейшы. Яўхім і яго падпаліў. І паліў столькі разоў, колькі разоў Піліп адбудоўваўся... «Гэ, ты так, а я етак...» — аж захлынаўся ад злосці Яўхім.

Піліп ажаніўся, жыў гадоў колькі з жонкаю, Клаўдзяю, а дзяцей тая так і не нараджала. Зноў Яўхім зайздросціў — бачыш, жыве і хоць бы што! А то ледзь прытуліся да жонкі — запузацее! Адно дзіця на ногі не паспееш паставіць — новае ў калысцы ляжыць, кугакае: кармі, адзявай, даглядай! Навучыўся Яўхім патроху прадаваць ціхачом то хвойку, то дубка, то бярозку, асабліва тым, хто ў палявых сёлах жыў, лесу свайго блізка не меў. А што рабіць было? Жыць жа з нечага трэба, трэба ж карміць сям'ю. Хто грошы даваў, хто жыта мяшок прывозіў ці ячменю, а хто і япручка. Купіў Яўхім стрэльбу, паляваць пачаў. Падстрэліць дзіка, зайца, а то і казу — не трапляй, дурная, на вочы,

не ўводзь у грэх. Не бяда, што забаранялася коз страляць: лес — бес, хто будзе бачыць, хто будзе ведаць. Праўда, калі-нікалі одум браў: а раптам? Быў бы на месцы Івана Дарошкі іншы чалавек, згаварыцца можна было б. А гэты... Не пашкадуе. Нікога не пашкадуе. Бацькі роднага не пашкадуе. Гэта законнік, лепш яму не пападайся. Бо калі пападзешся... І разам з тым карцела, карцела, аж спаць не мог, што б такое зрабіць гэтым Дарошкам, каб са свету зжыць, каб не было іх у Вялікім Лесе, карэнне нават павырываць. За Мікалаем, бацькам Іванавым і Піліпавым, доўга цікаваў, сачыў, каб злавіць на нечым. «Тады хай бы паскакаў Іван! Хай бы паспрабаваў бацьку ратаваць! Яго б тады... Заадно з бацькам і сын загрымеў бы!» — аж скрыгатаў зубамі Яўхім. Хацеў, намагаўся лавіць на нечым Мікалая Дарошку і разам з тым... баяўся. «Добра ж, як мой бок возьме, я перамагу. А калі раптам... Зжывуць мяне са свету тады Дарошкі! Іх многа, а я — адзін!»

І ўсё ж не ўцярпеў — асмеліўся. Надта ж багата злосці на Дарошкаў сабралася, аж бурліла, распірала нутро. Ды і Мікалай, бацька Піліпаў і Іванаў, вечна пад нагамі блытаўся. Як толькі высекуць дзе лес, ён ужо там: пні карчуе, маладняк цярэбіць. Ляснічы прыедзе, дзялянку перакапаную, бы ўсё адно свіным лычом успораную, убачыць: «Хто гэта тут калупаўся?» — «Бацька старшыні сельсавета, Мікалай Дарошка!» — «Акт складай, аштрафуем!» — «А Іван Дарошка тады мяне...» Пагаворацць, пагаворацць з ляснічым вось так, а акт і не складуць, не напішуць. І ён, Яўхім, баіцца, і ляснічы, мусіць, таксама не з тых, хто на ражон лезе, хто за праўду-матку гатовы хоць на той свет пайсці. Раней Мікалай Дарошка дзялянкі не агароджваў. А цяпер, калі па лесе пастухі кароў пачалі пасвіць, Дарошка абнахабеў — маладняк без літасці на жэрдкі ды слупы глуміць. Каб проса ад патравы ўратаваць, нічога не шкадуе. Колькі трэба, столькі і спусціць з пня сасонак ці бярозак. Дваццаць дык дваццаць, сорак дык сорак. І не падумае, што дрэўца тое гадамі расло, увысь, да сонца, святла, цягнулася. І каб жа проса ўжо там бог ведае якое было. А то ж на метр каліва ад каліва. Ды і пакуль паспее яно ў гусцяжы, птушкі яго вымалацяць. Коршунам наляцеў на Мікалая Дарошку Яўхім, калі ўбачыў, што натварыў у яго абходзе гэты... Ёлупень-зламыснік. Сапраўды надумаў акт скласці. «Што будзе, тое будзе, а правучу...» Толькі ж Дарошкаў... Голаю рукою не возьмеш. Не, не возьмеш... «Ета праўду Мікалай сказаў». Бачыш, што за-

пеў: «Чыя б кароўка мычала, а твая маўчала б. Давай паспрабуем пісаць — ты на мяне, я на цябе. Пабачым, што з етага будзе?» Ах ты паршывец, гадзіна падкалодная! Дык ты за мною сочыш, віжуеш!

І ў той жа вечар, вярнуўшыся з лесу, Яўхім доўга пісаў на Дарошкаў, на самага старога, Мікалая, на яго сыноў — Піліпа і Івана ўсё, што ведаў. Успомніў заадно і Апанаса Харчэню, дзядзьку Апанасавага Нупрэя. «Калі не адно, дык другое не даруецца. А то, бачыш, памочнікаў якіх сабе падбірае Іван, асмялеў... Выгадна Дарошку мець такога памочніка — як толькі што: хто ты, дзе дзядзька твой Нупрэй? А-а, маўчаць будзе і не пісне, не пікне нідзе!»

Куды пасылаць ліст, каму яго адрасаваць — і дзень, і два Яўхім думаў. Думаў і пра тое, ці падпісвацца пад лістом. Ставіць пад лістом сваё прозвішча... Не, не прывык Яўхім напралом на каго б там ні было лезці. Ціхачом куды спрытней. Ты ваюеш з чалавекам, а ён не ведае, хто ваюе, адкуль ліха чакаць, з якога боку на яго нападаюць. Хто нападае, не ведае. У тым і сіла тых, хто ціхачом нападае... Няма дурных сябе не шанаваць, вось так узяць ды і сказаць: «Во я!» Не-е!

І Яўхім не падпісаў ліста. Проста так, без подпісу, у канверт усунуў і адаслаў у райком, першаму сакратару таварышу Багавіку. Таму, мабыць, менавіта першаму сакратару таварышу Багавіку, бо нікога іншага з начальства ў раёне Яўхім Бабай не ведаў. А Багавіка трохі ведаў. З Гудова, калі той на заводзе яшчэ працаваў. «Хай Багавік прачытае, пазнаёміцца, хто такія Дарошкі. Хай...» — думаў Яўхім Бабай.

## XII

Клуба ў Вялікім Лесе пабудаваць яшчэ не паспелі. Часова пад клуб абсталявалі былую царкву. Знялі з яе верх, пабурылі страху. Па-новаму перакрылі, уставілі вокны. І ўсярэдзіне ачысцілі ад розных абразоў, выкінулі амбон. Зрабілі сцэну, нацягнулі заслону. Навазілі са стальмашні шырокіх дубовых лавак. Расставілі іх усцяж сцен і ўпоперак па ўсёй зале. Набожныя людзі доўга не маглі змірыцца з такім багахульствам, насміханнем з святога храма, не хадзілі ні на сходы, ні на канцэрты і спектаклі, якія наладжвалі камсамольцы. «Не пайду глядзець, як у святым месцы распусту твораць». І не ішлі на першым часе. Але паступова розум браў сваё, і ўжо сёй-той утры-

мацца не мог, каб не зазірнуць у клуб — надта ж цікавае, расказвалі тыя, хто глядзеў, паказвалі там кіно, ды і як моладзь гуляе, таксама многім спакою не давала, асабліва жанчынам — ім жа пляткарыць проста не было пра што, калі, бывала, сыходзіліся ля калодзежа ці на прызбе пасядзець вечарамі, языкамі паляскаць. Сабраліся людзі ў клуб і сёння — не было дзе ні сесці, ні прайсці. Тоўпіліся ў дзвярах, залазілі ледзь не на сцэну. Дзіва што — выступаць жа з лекцыяй будзе не абы-хто, а чалавек з Мінска, са сталіцы. Хто-хто, а ён-то напэўна ведае, скажа: будзе вайна, пра якую ўсе вунь трубяць, ці не будзе. Пакуль таго невядомага «чалавека з Мінска, Лапіцкага П. П.», як было напісана ў аб'яве, не было на сцэне, людзі тупацелі нагамі, смяяліся, жартавалі:

— Дуся, галаву схавай, не відно нічога! — крычаў у спіну паштарцы Дусі, якая навіла валасы, зачасала іх угору стаўбуном, вясковы зубаскал Юлік Бязмен.

— Ты лепш язык свой схавай, а то мне праз яго не чутно нічога,— агрызалася Дуся.

— Не курыце, задыхнуцца можна,— прасіў нечы пісклявы дзявочы голас, ці не Ніны Вараксы, сельсавецкага справавода.

— А ты не задыхайся, на двор ідзі,— раіў дзявочаму голасу мужчынскі.

Мая мілка, як кабылка,
Толькі не брыкаецца,—

дудзеў, зацягваў п'янаваты мужчынскі бас з сярэдзіны залы.

— Сціхні, дурыла,— таўхалі з розных бакоў кулакамі ў спіну мужчыну, вядомага абібока і п'яніцу Дзям'яна Сучка, жанчыны.— Знайшоў чым хваліцца! І не сорамна табе? Вечна вочы гарэлкай залітыя!

Але вось гамана і крыкі паступова пачалі сціхаць — на сцэну за стол, які быў пастаўлены загадзя і засланы чырвоным, з чарнільнымі плямамі абрусам, выйшаў Іван Дарошка, а за ім і той «чалавек з Мінска, Лапіцкі П. П.». Івана Дарошку добра ведалі, таму на яго ніхто асабліва не глядзеў — вочы вяскоўцаў былі прыкуты да «чалавека з Мінска, Лапіцкага П. П.». Усіх прыемна супакоіла, што «чалавек з Мінска» немалады векам («Што той малады ведае, можа, ветрагон які!»), у акулярах («Чытае, значыцца, шмат, таму і вочы не бачаць»), амаль лысы («Усе вучаныя людзі лысыя, як пакруціць мазгаўнёю штодзень, які волас

на галаве расці будзе!»). Апрануты «чалавек з Мінска» быў амаль як і Іван Дарошка — у чорную, з вялікімі кішэнямі на грудзях, доўгую суконную кашулю, падперазаную шырокаю папругаю, яшчэ на ім было цёмна-сіняе дыяганалевае галіфэ, на нагах — хромавыя боты з халявамі-дудачкамі. Абодва — і Іван Дарошка, і «чалавек з Мінска» — селі. Іван пастукаў алоўкам па графіне, што стаяў на стале і ў які была наліта не вельмі празрыстая, мутнаватая, рыжаватая іхняя велікалесаўская вада, потым, счакаўшы трохі, падняўся і аб'явіў:

— Дарагія таварышы, сёння ў нашым клубе выступіць лектар з Мінска, кандыдат гістарычных навук Пятро Пятровіч Лапіцкі. Тэму лекцыі вы ўсе ведаеце, таму, каб не марнаваць дарэмна час, дамо слова паважанаму нашаму госцю Пятру Пятровічу Лапіцкаму. Просім...

Іван Дарошка запляскаў у далоні, зала падтрымала даволі дружна свайго старшыню.

Калі апладысменты змоўклі, з-за стала паволі, нібыта нехаця, выйшаў на памост сцэны і важна стаў трохі збоку Пятро Пятровіч Лапіцкі. Перш чым вымавіць слова, ён кашлянуў нямоцна ў кулак. Абапёрся рукою аб стол і пачаў спакойным, вельмі нават спакойным голасам не чытаць напісанае загадзя, як гэта рабілі ранейшыя лектары, а проста гаварыць, расказваць тое, што ён ведаў, быццам перад чалавекам сядзела не мноства людзей, быццам выступаў ён не ў клубе, а быў на пасядзелках у якойнебудзь вясковай хаце. Людзі пападымалі галовы, насцярожыліся, баяліся прапусціць хоць што з таго, што гаварыў лектар. А гаварыў ён, як хутка заўважыў Іван Дарошка, ды і ўсе тыя, хто больш-менш рэгулярна чытаў газеты, сачыў за падзеямі ў сваёй краіне і ў свеце, самае звычайнае, вядомае ўсім. Праўда, гаварыў умеючы, прыводзіў цікавыя прыклады, аналізаваў, супастаўляў, дзесьці іншы раз быццам у сім-тым сумняваўся, каб потым нечаканым паваротам думкі ці фактам разбіць свае сумненні, пераканаць і сябе, і іншых, а найперш тых, хто ў зале, што справы ў нашай краіне ідуць добра, нават выдатна, што ў нас улада ў надзейных руках, моцная, як ніколі, эканоміка, што з Краінай Саветаў сёння лічацца літаральна ўсе, не могуць не лічыцца, бо мы будуем сацыялізм — светлую будучыню ўсяго чалавецтва. Не дзіва, працоўныя капіталістычных краін падтрымліваюць нашы пачынанні, яны таксама хочуць, каб у іх быў такі ж, як і ў нас, лад, быў пабудаваны сацыялізм.

Не спяшаючыся, не заглядваючы ні ў якія паперкі — іх і не было ў руках у лектара,— ён расказаў, што робіцца цяпер у Англіі, Францыі, ЗША, Італіі, доўга і падрабязна гаварыў пра Германію, пра яе захопніцкія планы і тыя войны, якія яна вядзе, ачмураная гітлераўскай прапагандай і фашызмам.

— Вядома, усіх цікавіць цяпер адно — будзе ў бліжэйшы час вайна з Германіяй ці не будзе? — задаў пытанне быццам сам сабе, а заадно і тым, хто сядзеў у клубе, у зале, Пятро Пятровіч Лапіцкі. І тут жа адказаў: — Працуйце спакойна, вайны не будзе. Вырошчвайце ўраджаі, касіце, жніце, малаціце. І не думайце пра вайну. У нас магутная Чырвоная Армія, моц яе зведалі імперыялісты. Таму нават такая агрэсіўная дзяржава, як Германія, прапанавала нам дагавор аб ненападзе і міры — і мы яго падпісалі...

Лектар — Пятро Пятровіч Лапіцкі — скончыў гаварыць, пацёр, нібы ад холаду, рукі і сеў.

Іван Дарошка, падняўшыся з-за стала, спытаў, ці будуць якія-небудзь пытанні. Пытанняў ніякіх ні ў кога не было — усім зрабілася ясна як божы дзень, што дарэмна хваляваліся, дарэмна верылі розным плёткам — вайны не будзе і не можа быць.

Калі пакідалі клуб, выходзілі на свежае паветра, нехта — ці не Юлік Бязмен — нават жартаваў:

— Цётка Аўдуля, здымай з гарышча соль! А то соль праломіць столь!

Пачуўся дружны рогат, і лектар усміхнуўся: таго, пра што прасілі яго ў райкоме, ён, здаецца, дамогся — супакоіў, абнадзеіў людзей...

...З клуба Іван Дарошка з лектарам Пятром Пятровічам Лапіцкім выйшлі разам, спакваля. Спяшацца асабліва не было куды — да адыходу цягніка, на якім меўся вяртацца назад у Ельнікі лектар, было яшчэ гадзіны чатыры.

— Можа, да мяне ў хату зойдзем, павячэраем? — прапанаваў Іван Дарошка.

— Чаму ж, можна,— згадзіўся лёгка і адразу лектар, быццам толькі і чакаў гэтага запрашэння.

Жыў Іван Дарошка на пасёлку, зусім блізка ад Гудова. Жыў не ў сваёй хаце, а ў хаце велікалесаўскага хутараніна-кулака Язэпа Мядзведзя, якога ў гады калектывізацыі раскулачылі і некуды выслалі. Як на адну сям'ю, то хата была аж занадта вялікая. Таму яе перагарадзілі на дзве хаты, зрабілі двое дзвярэй, два ўваходы. У адной, большай, што ад вуліцы, пасяліўся ён, Іван Дарошка,— старшыня сель-

савета, у другой, меншай, што ад хлява,— Андрэй Макаравіч Сушчэня — дырэктар школы.

Весці лектара па вёсцы, каб ён мясіў нагамі пясок, Іван не хацеў, таму прапанаваў пайсці сцежачкай.

— Бліжэй, дый дарога лепшая,— сказаў Іван лектару.

— Вядзі, як знаеш,— махнуў рукою лектар.

Удвух — Іван паперадзе, лектар услед за ім — яны перамералі нагамі напрасцяк каляіністую, пясчаную вуліцу, выкіраваліся на сцежачку, што вілася па сакаўной зеляніне людскіх гародаў. Па сцежачцы ісці поруч было нязручна, таму Іван як гаспадар зноў пайшоў першы, а за ім паволі, цяжка сапучы, гупаў ботамі, раз-пораз спатыкаючыся, лектар. Ішлі моўчкі, быццам і гаварыць не было пра што — усё было ясна без слоў.

— Ну як — пераканаў я вашых людзей? — спытаў раптам у Івана Лапіцкі.

— Думаю, так, пераканалі,— адказаў, не спыняючыся, Дарошка.

— А вас? — перайшоў на «вы» і Лапіцкі.

— Мяне...— Іван пакруціў галавою, задумаўся: «Казаць праўду ці не казаць?» Усё ж прызнаўся шчыра: — Мяне не вельмі...

— Чаму?

— Таму, што я трошкі больш за іншых нашых людзей ведаю. Я шмат чытаў і Маркса, і Энгельса, і Леніна, і Сталіна. Сутыкнёмся мы з фашызмам. Не можам не сутыкнуцца,— прашаптаў ціха, быццам скрозь зубы, ледзь не ў самы твар Лапіцкаму, знянацку спыніўшыся, Дарошка.

— Вы так лічыце? — быццам не паверыў, сцехануўся, таксама спыняючыся, Лапіцкі.

— Так, я так лічу, так думаю — вайна непазбежна,— цвёрда, упэўнена прамовіў Дарошка.

— Небяспечна так лічыць і думаць,— блізарука паглядзеў праз акуляры на Дарошку Лапіцкі.— Вы хоць ведаеце пра гэта? А тым больш — гаварыць амаль незнаёмаму чалавеку...

— Мы гаворым удвух. Да таго ж...— Дарошка памаўчаў.

— Што «да таго ж»?

— Да таго ж я адчуваю, вы таксама так лічыце, так думаеце. Адзінае, чаго ні я, ні вы, мабыць, не ведаем, гэта — калі тое сутыкненне будзе, калі тая вайна з фашызмам пачнецца. Апетыт прыходзіць у часе яды — Гітлер

не задаволіцца тым, што ён захапіў ужо, ён павядзе сваіх галаварэзаў на нас, на Савецкі Саюз.

— Хм,— ухмыльнуўся, аж круглы твар расплыўся ва ўсмешцы, Лапіцкі.— У мяне сябра адзін быў, Тодар Пракопавіч Несцяровіч. Па прафесіі ўрач. Дык вось — у тую бальніцу, дзе ён працаваў, немца параненага прывезлі. Перабежчыка. І той немец-перабежчык прасіў, патрабаваў, каб яму дазволілі як мага хутчэй сустрэцца з кім-небудзь з камандавання нашай арміі, маўляў, ён мае звесткі вялікай сакрэтнасці і дзяржаўнай важнасці. Не ведаю, як і што там далей было, але той немец прызнаўся ўрачу, Тодару Пракопавічу, дзеля чаго ён пакінуў фашысцкую армію, перабег да нас — ён хацеў папярэдзіць, што Гітлер рыхтуецца нападаць на Савецкі Саюз. Нават месяц і дзень назваў, калі тое будзе...

— І верыць можна таму немцу? — спытаў насцярожана Дарошка.

— Хм,— зноў ухмыльнуўся, але цяпер ужо без усмешкі, сурова, Лапіцкі.— Пажывём — пабачым. Але да вайны трэба рыхтавацца.

— А хіба мы не падрыхтаваны? Армія наша, ва ўсякім выпадку?

— Хм, чым далей у лес, тым болей дроў. Вам не здаецца, што мы гаворым не пра тое, пра што трэба было б гаварыць. На вашым месцы я спытаў бы: «Чаму вы пра свайго сябра, урача, гаворыце ў мінулым часе: «быў»?»

— А сапраўды,— усміхнуўся цяпер ужо Дарошка.— Чаму?

— Таму што сябра таго... Скажам мякка — ізалявалі.

— Што значыць — «ізалявалі»? — не зусім зразумеў Лапіцкага Дарошка.— Пасадзілі?

— Я ж вам сказаў: «Скажам мякка — ізалявалі».

— За што «ізалявалі»?

— Бачыце, я не магу з пэўнасцю сказаць — «за што»... У бальніцы, дзе працаваў мой сябар, здарылася непрыемнасць. Знікла, як усё адно ў ваду канула, некалькі бутляў спірту, нейкія вельмі дарагія лекі. Ці вінаваты ў тым Тодар Пракопавіч?.. Наўрад. Але выпадак зручны «ізаляваць» Тодара Пракопавіча, каб ён не хадзіў па розных установах, не расказваў, што ён чуў ад таго перабежчыка-немца. Цяпер вам, я думаю, зразумела, чым пахне тое, пра што мы гаворым.

— Я спадзяюся на вашу прыстойнасць,— няёмка пацепнуў плячыма, аж мароз у яго па скуры прабег, Дарошка.

— І я спадзяюся таксама на вашу прыстойнасць...

Памаўчалі. Чамусьці і Іван Дарошка, і Лапіцкі амаль адначасова паднялі галовы і ўставіліся вачыма на захад неба — мо таму, што там, здаецца, зусім нізка — качаргою можна дастаць — вісеў вялізны вогненна-чырвоны дыск сонца, нібыта, перад тым як упасці, схавацца за лес, нешта выглядаў, развітваўся не на ноч, а назаўсёды з такой мілаю, добраю, ласкаваю зямлёю. А мо... таму ўставіліся вачыма на захад неба, бо там, у тым баку, была тая, ачмураная гітлерызмам, Германія, была граніца, праз якую пранік перабежчык-немец...

— Не расказваў бы вам пра свайго сябра Несцяровіча,— парушыў першы маўчанне Лапіцкі,— каб сёння не ўбачыў яго жонкі.

— Дзе вы яе ўбачылі? — як ад электрычнага току, раптам здрыгануўся Дарошка.

— У вашай вёсцы.

— У нашай вёсцы? — здзівіўся, не паверыў Дарошка.— Наколькі я ведаю, у нас няма такой, не жыве.

— Вера Сымонаўна Ручанка,— ледзь варушачы губамі, прашаптаў Лапіцкі.— Яна не мяняла свайго дзявочага прозвішча.

— Вера Сымонаўна Ручанка?..— глядзеў проста ў вочы Лапіцкаму Іван Дарошка, як бы не разумеючы яшчэ ўсяго таго, што чуў.

— Так, Вера Сымонаўна Ручанка. Скажыце, кім яна працуе?

— Настаўніцай, выкладае матэматыку.

— У сельсавет вам паведамлялі пра яе што-небудзь?

— Пакуль не.

— Прашу вас, нават калі што-небудзь паведамяць,— абыдзіцеся з жанчынай па-чалавечы. Паверце мне, старому партыйцу, ні яе муж, ні тым больш яна ні ў чым не вінаватыя. Проста збег акалічнасцей. Кража гэтая... І той немец-перабежчык... А яна, Вера Сымонаўна, надта ж палахлівая. Хваравіта палахлівая. Я так і не асмеліўся да яе падысці, загаварыць. Яшчэ падумае невядома што! Пры выпадку перадайце ёй — Тодар Пракопавіч у Мінску... Ідзе следства... Робіцца ўсё магчымае, каб Тодар Пракопавіч быў зноў на волі, вярнуўся да сям'і, зноў па-ранейшаму працаваў у больніцы...

Пастаялі яшчэ трохі, памаўчалі.

— Ну што, хіба пойдзем? — сказаў, нібыта запытаў, Лапіцкі.

— Ага, пойдзем,— спахапліва згадзіўся Дарошка і першы зрабіў крок, рушыў наперад па сцежачцы, што чарнела сярод зяляніны гародаў.

...Вячэралі моўчкі, кожны думаючы сваё. Елі з сыраквашай сопкую, разварыстую бульбу, пілі грушавы ўзвар. Іванава жонка, Кацярына Антонаўна, звыклая, што ў іх часта абедаюць і вячэраюць незнаёмыя людзі, паставіўшы на стол яду, схавалася ў бакавы пакойчык — укладвала дзяцей спаць, правярала сшыткі.

Потым, пасля вячэры, Іван гэтак жа моўчкі праводзіў Пятра Пятровіча Лапіцкага аж да лесу.

Як развіталіся, Пятро Пятровіч пацісnuў Івану Дарошку руку, сказаў:

— Спадзяюся на вас. Мы гаварылі пра тое, пра што не з кожным гаварыць можна. Вы, я думаю, разумееце мяне. І раю вам... Другі раз быць больш асцярожным, не давярацца першаму сустрэчнаму. Людзі... Яны розныя бываюць.

— Будзем верыць у добрае, у добрых людзей,— паківаў па звычцы галавою Дарошка.— Як у нас тут кажуць: вол не стопча, свіння не з'есць.

— Векавы народны аптымізм. Ён нас іншы раз губіць. Але і ратуе. Так-так, ратуе...

Яшчэ раз пацісnулі адзін аднаму рукі — і рассталіся. Пятро Пятровіч Лапіцкі пакіраваўся да цягніка, у Гудоў, а Іван Дарошка павярнуўся і паволі пабрыў дахаты, у сваю вёску.

## XIII

— Ты ета куды? — спыніў бацька Косціка, калі той, паснедаўшы, аднойчы нейк надта ж хутка — ідаць было, спяшаўся — вылез з-за стала і ўзяўся за клямку дзвярэй, каб пайсці з хаты.

— У Гудоў,— азірнуўся палахліва на бацьку Косцік.

— Чаго ета ты ў Гудоў? Што табе там трэба?

— На завод пайду.

— На завод? — не зразумеў, набычыўся бацька.

— Аге, на завод. Наймацца на работу.

— Што, Іванам захацеў стаць?

— Не Іванам, а самім сабою.

Бацька паплямкаў губамі, думаў нешта яшчэ сказаць, але так і не сказаў — узяў з-пад лавы сякеру і, адштурхнуўшы ад дзвярэй сына, першы рушыў на падворак — ці не на дрывотнік дровы калоць...

За ім паволі, як бы баючыся, з асцярогаю, выйшаў і Косцік. Пастаяў ля сенцаў, пачакаў, мо спытае, скажа яшчэ што-небудзь бацька, потым хутка-хутка выпуліўся, вылецеў на вуліцу...

...І вось тры дні ўжо, як Косцік працуе ў Гудове, на заводзе. Два дні вазіў на тачцы тырсу ў тую кучу, што была за дашчанаю агароджаю завода, а сёння паставілі яго падкочваць да піларамы бярвенне. З непрывычкі баляць рукі, ломіць у паясніцы і лапатках, але Косцік шчыруе. І на ярус узлезе, падчэпіць дручком бервяно, спусціць яго на легары, і пабяжыць, спыніць у час, калі яно, разагнаўшыся, коціцца не туды, куды трэба, і падняць на станок, дзе з бервяна будуць рэзаць дошкі, паможа. Словам, шчыруе хлопец. Рукі ў яго, як і ва ўсіх рабочых, у рукавіцах, хоць і лета на дварэ,— абадраць можна рукі да крыві аб шурпатае дрэва ці кару, калі зняць рукавіцы. А так Косцік апрануты як і звычайна — штаны тыя ж картовыя, у якіх і ў школу хадзіў, кашуля тая самая, аблезлая, выцвілая, і чаравікі на нагах тыя ж — старыя, зашнураваныя чорнымі ніткамі.

Увечары, калі пратрубіў гудок («Значыцца, пара дадому, дахаты!»), да Косціка падышлі хлопцы, з якімі ён вазіў два папярэднія дні на тачках тырсу: нагала пастрыжаны пад машынку-нулёўку вушасты Эдзік, са шрамам на шчацэ, рослы, танклявы і чорны, бы цыган, Ігар і Кузя — гэты прысадзісты плячысты, старэйшы бадай што за ўсіх — з нейкімі быццам заспанымі вачыма, з пухам-вусамі пад носам.

— Гэй, новенькі,— крыкнуў да Косціка Кузя,— можа, у карты згуляем?

— У дурня? — паглядзеў на хлопцаў з недаверам, спадылба Косцік.

— У дурня толькі дурні гуляюць. Ды яшчэ вялікалесаўцы некаторыя, га-га,— рагатнуў Кузя.— У ачко.

І гэтая Кузева насмешачка, рагаток, яго словы: «У дурня гуляюць толькі дурні. Ды яшчэ некаторыя вялікалесаўцы, га-га!» — балюча ўкалолі Косціка. У кішэні ў яго якраз былі грошы, даў бацька, каб ён, Косцік, ідучы з работы, зайшоў у магазін, купіў сабе шапку: «Не будзеш жа ты без шапкі ўсё лета хадзіць».

— А дзе вы гуляеце ў ачко? — спытаў Косцік.

— Дзе захочам. Можам проста ў лесе...

І Кузя дастаў з кішэні штаноў калоду карт, правёў пальцам па іх бакавіне, ды так, што кожная карта, пера-

гнуўшыся, зваблiва блiснула то чорнай, то чырвонай фарбай. Карты былi хоць i старыя, але не самаробныя, а фабрычныя, куплёныя.

— Ну-у, дык як? — не зводзiў з Косцiка сваiх заспаных, шэрых, бы ў ката, вачэй Кузя.

Косцiк завагаўся.

— Што, баiшся?

— Ды не.

— Грошай няма?

— Ыум,— пакруцiў галавою Косцiк.

— Дык чаго ж ты? Мы табе не падабаемся?

Косцiк не адказаў. Падумаў толькi: «Можа, праўда паспрабаваць? Эт, было не было!»

— Пайшлi, шкадаваць не будзеш,— падмiргнуў Косцiку, як даўняму добраму сябру, Эдзiк.

А цыганiсты Iгар падхiхiкнуў, падкузьмiў:

— Слабачок ты... Кролiк, зайчык...

I гэтага было давол i, гэта была тая апошняя кропля, якая вырашыла ўсё.

Ад завода адышлiся недалёка. У хвойнiк. Селi проста на траву, пад старою карыстаю, з вузламi-нарастамi смалыжывiцы на камлi сасною. Кузя зняў са свае галавы пацёртую, запэцканую ў мазут кепачку, абыякава шпурнуў на зямлю.

— Па колькi гуляем? — спытаў.

— Па пятаку,— адказаў цыганiсты Iгар.

— Па пятаку дык па пятаку, спрачацца не будам,— адказаў Кузя.

— Мусiць... I па траяку хопiць,— паглядзеў спадылба на Косцiка Эдзiк.

— Мне ўсё адно,— кiўнуў галавою Косцiк.

— Дык па колькi ўсё ж гуляем? — не разумеў Кузя.

— Па пятаку,— стаяў на сваiм Iгар.

Кузя кiнуў у шапку пятак, узяўся раздаваць карты. Першаму, як i сядзелi, Iгару, другому — Эдзiку, трэцяму — яму, Косцiку. Палажыў на калашыну штаноў i сабе карту.

Косцiку трапiлася дзесятка. Замусоленая пальцамi, зададраным зверху рогам i чарнiльнаю плямаю на адвароце.

«Няйнакш, нехта пазначыў»,— падумаў Косцiк.

I Iгар, i Эдзiк адразу ж прайгралi.

— На пятачок? — спытаў у Косціка, калі дайшла да яго чарга, Кузя.

Спытаў быццам з насмешачкай, з падкусам. І гэта ўзлавала Косціка.

— На ўсе,— адказаў Косцік.

— Люблю смелых,— засмяяўся, рагатнуў Кузя.

Даў карту Косціку, узяў сабе. Перавярнулі — Косціку трапіў туз.

— Ачко! — ускрыкнулі ўсе ў адзін голас — і Косцік, і Эдзік, і Ігар.

Кузя паморшчыўся, аддаў калоду карт банкаваць Ігару. Косцік жа выграб з Кузевай шапкі тры пятакі.

І другі, і трэці раз узапар выйграў Косцік.

— Ды калі ты так... Ты нас усіх абгуляеш,— сказаў, нібы нервуючыся, Кузя. А Косцік падумаў сам сабе: «А не смейся, не кпі з велікалесаўцаў! А то такі вумны знайшоўся: «У дурня гуляюць толькі дурні!» Сам ты яшчэ дурань!»

Банк Косцік прайграў. Сабраў капеек трыццаць, хацеў зрабіць «стук», але не выйшла — улесціў картаю Кузю, і той забраў і грошы, і банк.

Зноў Кузя раздаў усім па чарзе карты. Гэты раз выйграў пяць капеек Эдзік, прайграў пяць капеек Ігар, а ён, Косцік, прайграў дзесяць. Прайграў, ужо трыццаць капеек, Косцік і ў наступны раз. «Нешта карта мне не ідзе!» — падумаў, але не збавіў у грашах, зноў, калі Кузя даў яму карту, рызыкнуў пайсці на трыццаць капеек.

І зноў прайграў.

«Гэтак, чаго добрага, і абгуляць мяне могуць. Грошы ж не мае, бацькавы. На шапку!»

Але калі прыйшла тая самая, што і першы раз, замусоленая пальцамі, з ададраным зверху рогам і чарнільнаю плямаю на адвароце дзесятка, не вытрымаў Косцік — асмеліўся «стукнуць» аж на шэсцьдзесят капеек — каб вярнуць прайгранае. «Вярну, і ну іх к чорту з іх картамі, з іх ачком,— падумаў з адчужанасцю пра сваіх знаёмых.— Устану і пайду. Скажу, мне дадому пара!»

На дзесятку прыйшла дама, потым валет. Давялося браць чацвёртую карту. Прыйшла сямёрка. Перабор.

Халадок прабег між лапатак. «Прайграю, абгуляюць мяне»,— падумаў. Але спыніцца ўжо не мог — хацелася вярнуць свае грошы. «Вярну — і ўсё. Ні хвіліны больш не буду гуляць».

На «стуку», калі банкаваў Ігар, выйграў. Выграб з

шапкі жоўтыя і белыя манеты, пералічыў. Рубель і дзевяноста пяць капеек. Якраз вярнуў усе свае прайграныя грошы. Нават капеек дваццаць выйграў.

«На етыя дваццаць яшчэ пагуляю. А да тых, што бацька даў на шапку... Не, нават не дакрануся».

На выйграныя дваццаць капеек выйграў яшчэ рубель.

«Карта зноў пайшла. Пагуляю!»

Кузя пераміргваўся ўжо са сваімі напарнікамі, нешта ім паказваў на пальцах, шаптаў. Але Косцік не зважаў на гэта — ён увайшоў у азарт, адчуў смак гульні. І нават калі прайграў выйграныя грошы і зноў палез у кішэню, пачаў выцягваць па рублю з тых грошай, што бацька даў на шапку, не кідаў гуляць, не падымаўся з травы, не казаў, што яму пара дадому, дахаты.

...Гуляць кончылі тады, калі Косцік прайграў усе, да капеечкі, грошы.

— Хлопцы,— ледзь не плакаў Косцік.— Але ж грошы былі... бацькавы!

— А нам якое дзела, чые грошы? — зрэзаў яго, нацягваючы зноў на галаву кепачку, Кузя.— Не твае грошы, не садзіся гуляць.

— Я ж не ведаў, што прайграю.

— А мы не ведалі, што выйграем,— рагатнуў Кузя.

Паўставалі, ляніва, неахвотна падняліся з зямлі і Ігар, Эдзік. Яны хоць таксама прайгралі, але трымаліся малайцамі і быццам ані не перажывалі.

— Нічога,— супакойвалі яны Косціка.— Ета гульня. Сёння ён выйграў, заўтра выйграем мы... Тут як каму пашанцуе...

Заходзіла, садзілася за лес чырвонае, што агонь, сонца, калі Косцік вяртаўся з Гудова дадому, у вёску. Доўгія худыя цені рэдкіх пагоністых сосен слаліся на пясчаную, каляіністую дарогу, пярэсцілі, як бы лінеілі яе. Вячэрні халадок хапаў за плечы, за шыю. З балот і алешніку цягнула, патыхала сырасцю. Сырасцю і волкасцю. Пішчала дзесьці збоку, у густым маладняку, мабыць, укладваючыся на ноч у гняздо, сойка. І адзінокі, самотны піск яе аж раздзіраў Косціку душу.

«Што я скажу бацьку, калі спытае, чаму не купіў шапкі?» — мучыла думка.

## XIV

Вера Сымонаўна, вядома, пазнала Лапіцкага. Ды і як было яго не пазнаць! Бываў жа — і неаднойчы — Лапіцкі са сваёю жонкаю Юляй Змітраўнай у іх дома, у гасцях. Бывала і яна, Вера Сымонаўна, са сваім мужам, Тодарам Пракопавічам, неаднойчы дома, у гасцях у Лапіцкіх. І святы разам адзначалі, і так, на вуліцы, калі дзе выпадкова сустракаліся, не праходзілі міма, спыняліся, гаварылі. Яна не сумнявалася, ані не сумнявалася, што і ён, Лапіцкі, пазнаў яе, Веру, хоць, калі шчыра прызнацца, ёй і не хацелася, каб хоць хто-небудзь са знаёмых ведаў, дзе яна. Баялася: а раптам скажа каму, той яшчэ каму скажа, і гэтак можа дайсці да тых, да каго б не варта, каб даходзіла. І на лекцыі Вера Сымонаўна сядзела ўсё адно што на патэльні. Ледзь канца дачакалася. А тады кінулася як не бегма да дзвярэй. Выскачыла на двор і тут... Спынілася раптам, не пайшла разам з усімі ад клуба. Чаму, што яе затрымала — і сама не ведала.

На вуліцу выйшлі Іван Дарошка і Пятро Пятровіч Лапіцкі. Паграбліся па пяску некуды міма сельсавета. На яе, Веру, ні Іван Дарошка, ні Пятро Пятровіч не звярнулі ніякай увагі. Гэта спачатку яе ўзрадавала: «Можа, я дарэмна турбавалася, Лапіцкі не пазнаў мяне». Але, трохі спагадзя, гэта і насцярожыла, усклапаціла. «Значыцца, баіцца падыходзіць. За рэпутацыю сваю баіцца»,— падумала з нядобрасцю пра Лапіцкага Вера Сымонаўна. З таго дня, як забралі мужа, звольнілася з працы ва універсітэце, такое здаралася ўжо. Ідзе па вуліцы, бачыць знаёмага чалавека, з якім і сустракаліся, а то і працавалі, а ён унурыць вочы ў тратуар, зробіць выгляд — не пазнае цябе. «Што ж, і Лапіцкі такі самы. Ані не лепшы, ані не горшы»,— думала Вера Сымонаўна, вяртаючыся з клуба дадому, дахаты. Вядома, на душы было прыкра. І крыўдна-крыўдна. Усё ж Лапіцкія былі даволі блізкія. Сам Пятро Пятровіч з Тодарам Пракопавічам з адной вёскі, вучыліся разам у школе. І ў Мінску таксама ўвесь час сябравалі. Тодар медыцыну асвойваў, Пятро Пятровіч — гісторыю...

Некалькі дзён і начэй думала, разважала, так і гэтак меркавала Вера Сымонаўна, перабірала ў памяці стасункі сям'і Лапіцкіх з іхняй, Несцяровічавай, сям'ёй і намысліла аднойчы зноў схадзіць у сельсавет да Івана Дарошкі. Быццам і прычына была, каб зайсці. Той, першы, раз як была, судом брату, Касціку, пагражала. Цяпер можна сказаць:

перадумала, не будзе на Косціка ў суд падаваць. Ці мала што здараецца, ну пагарачыўся хлопец, зрабіў глупства. І яна таксама пагарачылася, зрабіла глупства — паскардзілася яму, старшыні сельсавета Івану Дарошку, на брата, Косціка... Канфлікт, не варты выедзенага яйка... А... тым часам... Раптам пачуе што-якое... Ці Іван Дарошка выпадкова прагаворыцца, ведае ён хоць што-кольвечы пра яе мужа, Тодара Пракопавіча, больш, чым яна, Вера Сымонаўна, сказала, ці не ведае... Калі ведае, то... Паперы прыйшлі ў сельсавет з Мінска. Ці... Пятро Пятровіч расказаў...

«А калі знарок Пятро Пятровіч прыязджаў сюды? Можа, мяне даўно шукаюць там, у горадзе, у Мінску? — цюкнула Веры Сымонаўне ў галаву.— І Пятра Пятровіча папрасілі... Таму і не падышоў ён да мяне, зрабіў выгляд, што не пазнаў. Каб не спалохаць мяне, каб я ў іншае месца куды не ўцякла. Прыедуць — а мяне з дачкою і тут няма... Шукай зноў тады...»

«Але Пятро Пятровіч... Ён жа прыстойны чалавек быў...» — не згаджалася з Верай Сымонаўнай нейкая думка.

«Вось іменна — быў... А цяпер... Хто ён цяпер? За сябе не заўсёды ручайся, а за іншых — і пагатоў...»

Словам, думкі, што прыходзілі Веры Сымонаўне ў галаву, пераконвалі, настрайвалі, каб не марудзіць, зайсці ў сельсавет, пагаварыць з Іванам Дарошкам.

«Ён жа... Што ён мне зробіць? А ведаць... Раптам сёетое ўсё ж і пачую. Хоць у здагадках розных не буду мучыцца».

І, прыняўшы чарговы экзамен у дзевяцікласнікаў, Вера Сымонаўна не пайшла па звыклай дарозе за грэблю да той хаты, дзе жыла разам з дачкой у старога Куляша, а збочыла на сцежачку, пакіравалася ў сельсавет.

«Пагавару з Іванам Дарошкам»,— вырашыла цвёрда яна.

У сельсавеце ў агульным, даволі прасторным і светлым пакоі не было нікога.

«Дзе гэта ўсе? — падумала Вера Сымонаўна.— І дзверы не зачынены?»

На ўсякі выпадак пастукалася ў баковачку да Івана Дарошкі. Узрадавалася, калі пачула з-за перагародкі Іванаў голас:

— Калі ласка, заходзьце...

Яна адчыніла дзверы ў баковачку, зайшла. Здзівілася, убачыўшы на чыста паголеным Іванавым твары пахмурнасць і нейкую як бы зацятасць, незадаволенасць сабой — не прывыкла яна, Вера Сымонаўна, бачыць Івана не ў настроі. Як помніла — заўсёды ён быў сабраны, спакойны, ні адна рыска не выдавала яго нейкіх унутраных сумненняў, душэўных пакут.

— Я, можа, не ў час зайшла? — спытала насцярожана Вера Сымонаўна.

— Не, чаму ж, у час. Сядайце...

Вера Сымонаўна села на той цяжкі самаробны табурэт, на якім сядзела і той, першы раз, калі прыходзіла скардзіцца на Іванавага брата, Косціка.

Іван маўчаў, хмурыў бровы — нешта, мусіць, перабіраў у памяці, пра нешта думаў.

Але вось ён падняў ад стала вочы, паглядзеў на Веру Сымонаўну. Сказаў, як бы са шкадаваннем:

— Адна нялёгкая размова ў мяне была.

— Я гляджу, што вы...

— Што я?..— не даў дагаварыць, перапыніў Веру Сымонаўну, як бы спалохаўся Іван Дарошка.

— Ды нейкі... Не зусім такі, як прывыкла я вас бачыць...

— А-а,— і Іван Дарошка змоўк раптам, на хвіліну засяродзіўся ў сабе, потым сказаў: — А вы... Назіральная...

— Я ж педагог.

Вера Сымонаўна ўсміхнулася. Усміхнуўся — неяк роблена, ненатуральна — і Іван.

— Яшчэ што-небудзь Косцік утварыў?

— Не, прыйшла сказаць: пагарачылася я. Не трэба было мне вас турбаваць.

— Чаму ж? — не згадзіўся з Верай Сымонаўнай Іван.— Я лічу, вы добра зрабілі, што тады прыйшлі. Вы напомнілі мне: у мяне ёсць малодшы брат, у мяне ёсць пэўныя абавязкі перад гэтым братам. Я пагаварыў з ім, цяпер Косцік працуе ў Гудове, на заводзе. Дый...— Іван памаўчаў.— Каб не было таго прыкрага выпадку, мы б з вамі не ведаю як бы і пазнаёміліся. А так...

Пахмурнасць з твару ў Івана сышла, на вуснах з'явілася ўсмешка. Цяпер сапраўдная лагодная Іванава ўсмешка.

— Вы лічыце, што мы з вамі пазнаёміліся?

— Ага. А вы што, хіба так не лічыце?

— Не, чаму ж... Але вы мяне... Вельмі мала ведаеце.

— Ну-у,— цягнуў, не спяшаўся гаварыць Іван.— Усяго пра чалавека ніколі ведаць не будзеш...

«Пра мужа і нас з дачкою пачуў ён што-небудзь ці не? — глядзела проста Івану ў вочы Вера Сымонаўна, намагаючыся здагадацца.— Мабыць, усё ж не пачуў. А калі і пачуў, то не скажа. Не прызнаецца».

Вера Сымонаўна паднялася з табурэта.

— То я пайду,— сказала яна, папраўляючы, абцягваючы рукою прымятае ад сядзення на табурэце лёгкае, у гарошынку, паркалёвае плацце.

— Вы толькі дзеля таго і прыходзілі, каб сказаць, што ў суд не будзеце падаваць на майго брата? — таксама падняўся з-за стала Іван.

— Ум-гу,— кіўнула галавою Вера Сымонаўна.

— То дзякую вам.

Памаўчаў, потым усё ж дадаў:

— Хоць, прызнацца, я і тады ведаў, што не будзеце падаваць на Косціка ў суд.

— Па чым вы ведалі?

— Я хоць і не педагог, але таксама людзей бачу. Вы былі тады злосная. Я вас разумеў і разумею. Вы ўспомнілі свайго мужа...

Вера Сымонаўна насцярожылася. «Што, што яшчэ?»

— Не палохайцеся, я не скажу вам нічога непрыемнага. Жывучы на свеце, што я заўважыў?.. Ёсць розныя людзі. У аднаго чалавека гора, ён хоча, каб усе, свет увесь мучыўся, пакутаваў. У другога тое самае гора — ён ашерагае людзей, каб, не дай бог, і ў іх чаго-небудзь нядобрага не здарылася, хай хоць яны шчасліва жывуць... Вы — з такіх, добрых. І гэта ведаеце, калі я зразумеў?

— Калі? — глядзела, не зводзіла вачэй з Івана Вера Сымонаўна.

— Калі вы сказалі, што былі супраць, каб Косціка выключаць са школы.

Іван уздыхнуў, выйшаў з-за стала, наблізіўся да Веры Сымонаўны.

— Вера Сымонаўна,— сказаў як мага цішэй.— Не буду таіцца — мне сёе-тое сказаў пра вас Пятро Пятровіч Лапіцкі. Пра вас і вашага мужа, Тодара Пракопавіча. Калі верыць Пятру Пятровічу, ваш муж ні ў чым не вінаваты.

Вера Сымонаўна не вытрымала — уздрыгнула ўсім целам, слёзы пакаціліся ў яе з вачэй.

— Супакойцеся,— сказаў ужо зусім шэптам Іван.—

Давайце даверымся часу. Ён, час, паставіць усё на месца...

Вера Сымонаўна дастала з сумачкі хусцінку, выцерла слёзы. Падняла свае блакітныя вочы зноў на Івана.

— Але ж,— ціха, амаль шэптам, прамовіла яна,— калі б толькі было добра, з ім было ўсё добра...

— Лапіцкі прасіў перадаць: з вашым мужам пакуль што... Ідзе следства, ён у Мінску. Будзем спадзявацца, верыць — разумныя людзі ў нас усюды ёсць. Разбіраліся не ў такіх справах. Разбяруцца і ў справе вашага мужа...

— Больш ён нічога не казаў?

— Не.

У вялікім сельсавецкім пакоі пачуліся крокі — нехта туды зайшоў.

І гэта неяк адразу зноў як бы ўсклапаціла, устрывожыла Івана Дарошку.

— Словам, калі вам што-небудзь трэба, не саромейцеся, прыходзьце,— сказаў ён.— Раптам я змагу памагчы...

— Дзякую, шчыра дзякую, за ўсё-ўсё дзякую,— прашаптала Вера Сымонаўна і, апусціўшы ў падлогу вочы, нібыта змоўшчыца, пайшла са старшынёвай баковачкі.

## XV

Ён, Апанас Харчэня, можна сказаць, сам напрасіўся на гэтую размову. Пачуўшы, што сакратар райкома Багавік нешта гаворыць з Іванам Мікалаевічам Дарошкам пра яго, Харчэню, ён, каб не замінаць, пакінуў сельсавет, пайшоў дадому. Але тое, што пра яго гаварылі, і не абы-хто, а сам таварыш Багавік, не давала Апанасу спакою. «Пра што яны там? А-а, пра што?» — стрэмкай засела ў галаве ў Апанаса.

І, прыйшоўшы назаўтра на працу, Апанас усё чакаў, лавіў і лавіў момант, каб зайсці ў баковачку да старшыні, пагаварыць. Але, як на тое, Іван Мікалаевіч быў увесь час заняты — то ў Гудоў, на завод, ездзіў, то з лектарам навотным важдаўся.

І яшчэ, яшчэ некалькі дзён не ўдавалася, ніяк не ўдавалася Апанасу пагаварыць са старшынёй сельсавета. Толькі ў суботу выпадак такі надарыўся. І Апанас скарыстаў яго — зайшоў у баковачку да старшыні, дзверы за сабою шчыльна зачыніў.

— Іван Мікалаевіч,— сказаў, няёмка пацепваючы плячыма,— усё спытаць у вас хачу, пра што гэта вы з Раманам Платонавічам гаварылі? Мяне ўспаміналі...

Іван Мікалаевіч, па ўсім відаць было, чакаў гэтай размовы, рыхтаваўся да яе, бо галаву падняў і доўга, засяроджана глядзеў... Не, не на яго, Апанаса, а некуды міма, у кут...

— Вось што,— нарэшце сказаў, уздыхнуўшы, Іван Мікалаевіч.— Разашлі ўсіх з сельсавета па розных справах. Каб нікога не было. Тады і пагаворым... З вока на вока...

Апанас хутка знайшоў, куды каго паслаць. З ваенкамата якраз атрымалі цэлы стос позваў, і ён загадаў разнесці позвы, мабілізаваўшы на гэту справу ўсіх, хто на той час быў у сельсавеце.

Вярнуўся зноў у баковачку, сказаў Івану Дарошку:

— Ну, гаварыце...

Іван марудзіў, не спяшаўся гаварыць. Перабіраў, перакладваў на стале нейкія паперы, круціў у руках аловак (аловак быў надта ж тонка завостраны, на што звярнуў сваю ўвагу Апанас) і ўпарта хаваў і хаваў свае вочы, не глядзеў на свайго маладога сакратара.

Трывога ахапляла Апанаса. «Нешта, мусіць, непрыемнае?..— падумаў ён.— Інакш не марудзіў бы!» Не дачакаўшыся, калі пачне гаварыць старшыня, прамовіў:

— Што, нешта зрабіў я не так?

— Не, Апанас.

І зноў змоўк.

«Чаму ён цягне, не гаворыць?»

— Кажыце ўжо, што там,— траціў усякую цярплівасць Апанас.

— Гм, у райком напісалі...

— Што напісалі?

— Скаргу. Ананімку.

— Скаргу? Ананімку? І што там?

— Там... На мяне... Ну, і цябе ўспомнілі...

— Як успомнілі?

— Гм,— цягнуў, усё думаў і думаў — «Казаць ці не казаць?» — Іван. Не вытрымаў — сказаў: — Што ў сельсавет цябе на працу ўзялі...

— А хіба... Нельга было мяне браць? — нічога ані не разумеў яшчэ Апанас.

— Дзядзька ў цябе, Нупрэй... А праца ў сельсавеце...

— Аа-а...

І Апанас неяк раптам разгубіўся, звяў. Спытаў са спалохам:

— Дык што, звальняць... Звальняць цяпер з сакратара мяне будзеце?..

...Бачылі людзі як ішоў Апанас Харчэня ў той дзень чамусьці рана, нязвыкла рана з сельсавета дадому. Ішоў, быццам п'яны, ані не зважаючы на каго б там ні было, ні з кім не вітаючыся. «Што б магло здарыцца з хлопцам? Няўжо выпіў? Але ж... Ніколі, здаецца, Апанас не піў?» — думалі, дзіваваліся некаторыя.

## XVI

«...Дык што, звальняць... Звальняць цяпер з сакратара мяне будзеце?..» — вярцелася і вярцелася ў галаве ў Івана Дарошкі, гучала зноў і зноў у вушах як папрок, пякучы, недаравальны папрок. І ўчора, калі рассталіся з Апанасам, і сёння, калі, хоць і нядзеля была, не сядзелася дома, і ён, Іван, прыйшоў у сельсавет і, паглядзеўшы на сакратарскі стол, не ўбачыў за ім Апанаса Харчэні.

«Гм, вядома, куды б лепш было і не залічаць. А залічыўшы, праз які тыдзень звальняць... Паспяшаўся я, трэба было папярэдне ўзгадніць,— думаў цяпер Іван, ходзячы сюд-туд па баковачцы і ўспамінаючы, перабіраючы ўчарашнюю размову з Апанасам Харчэнем.— Але ж... Хто мог ведаць?.. Дзядзька гэты... Нупрэй... Апанас... Надта ж усё гэта... Далёка... Ды і пры чым адно да аднаго?..»

Уваччу стаяў Апанас Харчэня, рослы, худы, з нерухомай, прыціснутай да грудзей нежывой рукой, бледным, амаль дзяціным тварам, з зачасанымі набок, чорнымі як смоль валасамі, спалоханай, няпэўнай, але ветлівай усмешкай.

«Хоць бы ён... А то ж... Гм»,— згадвалася тое, пра што быў падумаў ён, Іван, перш чым адказаць Апанасу на яго не зусім дарэчнае пытанне: «Дык што, звальняць... Звальняць цяпер з сакратара мяне будзеце?..»

«— А можа... Падумаем, як лепш зрабіць... Каб і табе, і мне, і ўсім...»

Хацеў сказаць: «Каб і табе, і мне, і ўсім добра было». І не сказаў, бо ўлавіў у словах гэтых фальш. «Добра не будзе. Як ні зрабі, усё адно добра ўсім не будзе»,— успомніў пра тое, пра што думаў усе гэтыя дні, адкладаючы з дня на дзень размову з Апанасам.

«— Яно... Можа, і так,— ніякавата пераступіў з нагі на нагу, апусціў долу вочы Апанас.— Але ж... Калі пачалі пісаць... Дык свайго дамогуцца...»

«— Гм...»

«— І мне...— губы ў яго задрыжалі, на вачах з'явіліся слёзы.— Мусіць, лепш самому пайсці з сакратара, чым... Звольняць мяне, прагоняць...»

Не слухаў ужо, што гаварыў яму ён, Іван. Угнуў, унурыў у плечы галаву і пайшоў. Пайшоў паволі, спатыкаючыся, быццам сляпы...

«А з хлопца толк мог быць,— думаў і думаў пра тое, учарашняе, Іван.— І адукаваны, і выхаваны, і тактоўны. І працу сельсавецкую любіць, з людзьмі ладзіць. Дый... Калека ж... Дзе ён дзенецца, куды працаваць пойдзе? Цяжка, нязручна якую-небудзь работу, тую, што іншыя робяць, яму рабіць. Маці вучыла, старалася...» — пякло, мучыла Івана.

Не вытрымаў, выйшаў з баковачкі, пакіраваўся на падворак, на свежае паветра. Узрадаваўся, убачыўшы па другі бок вуліцы ля калгаснай канторы, новай,яшчэ жоўтай, смалістай, нядаўна пабудаванай, ранейшага свайго сакратара, цяпер старшыню калгаса, Васіля Кулагу,— ён стаяў у гурце жанчын і мужчын, махаў рукамі, нешта даказваў, гаварыў. Крыкнуў:

— Васіль Цімафеевіч, ты б зазірнуў на хвілінку, можа, да мяне?

Васіль Кулага павярнуўся тварам да Івана і адразу ж рашуча выбраўся з людскога гурту, пакрочыў да сельсавета.

— Пра што вы там? — паказваючы галавою на гурт людзей, спытаў Іван, калі наблізіўся Кулага, ашчарэпіў, сціснуў сваёй пудовай магутнай ручышчаю яго, Іванаву, руку.

— Ды ўсё пра тое ж... Пра вайну...— адказаў з прыкметнай занепакоенасцю Васіль.

— Што, зноў цыганы праязджалі? — знарок весела глядзеў Васілю ў вочы знізу ўверх Іван — Васіль быў на цэлую галаву вышэй за Івана, непаваротлівы, тоўсты, крутаплечы, што гара.

— Ды не. Кажуць, нешта надта ж гупала сёння ўночы. І пажар быў. Во, у тым баку...— махнуў рукою на захад, на лес, Васіль.— Сам бачыў, як на двор выходзіў... Быццам гарэла нешта, далё-ёка, далё-ёка...

— Кінь ты, відаць, манёўры,— супакоіў Васіля Іван, хоць і падумаў сабе: «Ліха ведае што там можа быць!» — Я вось пра што хацеў з табою пагаварыць...

— Ну?

— Ды...— не ведаў, як і пачаць Іван.— Ты б не мог да сябе ў кантору Апанаса Харчэню ўзяць?

— Чаму да сябе ў кантору? — здзівіўся Васіль.— Апанас жа ў сельсавеце працуе. Што, хіба не спраўляецца?

Давялося, хоць не так падрабязна, расказаць Васілю і пра гутарку з Багавіком, і пра сваю ўчарашнюю размову з Апанасам Харчэнем.

— Шкада хлопца, разумееш. Толк з яго мог быць,— такімі словамі скончыў сваё паведамленне Іван.

— Калі я залічу яго ў калгасную кантору, што Багавік на гэта скажа? — задумаўся Васіль Кулага.

— А мы давай яму пазвонім,— прапанаваў Іван.

— Нядзеля ж сёння.

— Багавік часта і ў выхадныя дні ў райкоме сядзіць, працуе.

Зайшлі ў сельсавет. Іван зняў трубку, пакруціў ручку тэлефоннага апарата.

— Алё, алё! — закрычаў.— Дарошка гаворыць, злучыце мяне з райкомам партыі, Багавіком...

У трубцы чуваць было, як тэлефаністка нешта таксама круціла, некаму крычала: «Алё, алё!» Праз хвіліну паведаміла:

— Занята!

— Як толькі вызваліцца, скажаце мне. Я ля тэлефона, чакаю...

Мінула хвілін пяць, а тэлефаністка ніяк не магла дазваніцца да райкома, звязацца з Багавіком.

— Ты тут звані,— сказаў, не вытрымаўшы, Васіль Кулага.— А я пайду. Нарады брыгадзірам трэба раздаць...

— Ідзі. Я сам перагавару з Багавіком.

— Добра, перагавары.

Васіль Кулага пагрукаў сваімі амаль паўметровымі ботамі з сельсавета — неўзабаве Іван праз шыбы акна бачыў ужо, як былы яго падначалены валюхаўся, перасякаючы вуліцу і кіруючыся па пяску да калгаснай канторы.

Злучылі з райкомам партыі Івана Дарошку толькі праз паўгадзіны.

Пачуўшы знаёмы голас у трубцы, Іван закрычаў з радасцю:

— Раман Платонавіч! Дарошка гаворыць, добры дзень!

— А-а, ты, Іван,— пачуўся на другім канцы провада

прыглушаны адлегласцю голас. — Толькі дзень сёння якраз нядобры.

— Чаму нядобры?

І сэрца ў Івана ёкнула.

— Вайна!

— Што? Якая вайна? — закрычаў у трубку Іван.

— Ты не чуў хіба? Немцы на нас напалі. Сёння бамбілі Кіеў, Мінск, Брэст...

Хтосьці перапыніў, перарваў размову, у трубцы пачуўся трэск, потым і зусім гудок — прапала сувязь.

Іван больш не прасіў злучыць яго з райкомам. Стаяў, нібы аглушаны, ля тэлефоннага апарата, сціскаў у руцэ трубку, а ў скроні біла, аж лямантавала, адно, толькі адно кароткае і страшнае, як крык адчаю, як сама смерць, слова:

— Вайна-а!

# Частка другая

Вайна...

У жыцці Вялікага Лесу быццам нічога не змянілася — усё было, рабілася, ішло па заведзеным невядома калі і кім парадку, так, як і тыдзень, як і месяц, як і год таму назад. Ледзь сплывала ноч, світала, вёску будзіла берасцяная труба: гэта кульгавы пастух Хомка, перакінуўшы цераз плячо пугу-смалянку, кіраваўся на калгасную ферму займаць гавяду. Даілі і выганялі на пашу кароў, палілі ў хатах печы — мірны, яшчэ нічым не азмрочаны дым камкаста клубіўся над камінамі, падымаўся ў неба, паволі раставаў, бясследна знікаў у паветры. Людзі, занятыя спрадвечнымі будзённымі клопатамі, сем'ямі снедалі за звыклым, па-сялянску ўтульным сталом, і кожны выпульваўся з дамоўкі — хто ў лес, хто ў поле. Палолі, капанічылі грады, абганялі бульбу. Аглядалі, рамантавалі вілы і граблі, кляпалі, мянташылі косы — пачынаўся сенакос. Працаваў на поўную загрузку і завод у Гудове — рэзалі дошкі, гнулі абады, майстравалі калёсы; тры разы на дзень — уранні, у абед і ўвечары — наваколле па-ранейшаму аглушаў густы, басавіты гудок, абвяшчаючы, што час не стаіць — спяшаецца, ляціць.

У жыцці Вялікага Лесу быццам нічога не змянілася...

І разам з тым змянілася, як, як усё змянілася!..

Бо вайна хоць была і далёка, але ўжо дыхала зубастай ашчэранай пашчай, вісела страхотліваю нябачнаю хмарай, глюгастым чорным груганом над усім, што б дзе ні рабілася, пра што б ні думалася, гаварылася...

Вось ехала на веласіпедзе з Гудова паштарка Дуся. І кожны насцярожваўся, ніякавеў — што вязе яна ў скуранай торбе? Позву ў войска? А мо... Цьфу-цьфу, крый божа! — каб не самае горшае...

Сабраліся, стоўпіліся ля калгаснай канторы людзі. Нешта чытаюць, нешта наўзахапкі абмяркоўваюць. І ўсе бягуць туды: «А раптам навіна, можа, пра вайну тое, чаго я не ведаю?»

Па вечарах доўга ніхто не кладзецца спаць. Сядзяць

на лавачках, на прызбах, ходзяць, сноўдаюцца, бы непрыкаяныя, па вуліцы, узіраюцца на захад, на неба — прысмеркне, ацямнее і палыхае яно крывавымі водбліскамі. Чуваць — стогне, ходзіць ходырам пад нагамі зямля. І ў кожнага на языку: «Што там, за лесам?..»

Вайна!

Багата, ой як багата іх, войнаў, прагрукатала, пранеслася вогненным смерчам міма Вялікага Лесу і па Вялікім Лесе...

І вось — яшчэ адна...

«Што прынясе яна?..»

Кожны пра гэта думаў. Думаў удзень і ўночы, ураніі ўвечары, думаў, што б ні рабіў, дзе б ні быў. І кожны адчуваў — тыя, ранейшыя, войны нічога добрага нікому не прынеслі, значыцца, і гэтая, новая, таксама нічога добрага не-е, не прынясе: ні яму самому, ні сям'і, ні вёсцы.

І гэта неяк непрыкметна мяняла людзей, рабіла іх стражэйшымі, сталейшымі ва ўсім. У клопатах, працы, каханні...

## I

«Выметываясь из русла, разбивается жизнь на множество рукавов. Трудно предопределить, по какому устремит она свой вероломный и лукавый ход».

Словы гэтыя, чытаныя калісьці — дзе, у якой кнізе, Іван Дарошка не мог нават сказаць,— усплылі раптам у памяці і ўжо не выходзілі з галавы з той самай хвіліны, калі пачуў ад Багавіка, што гітлераўская Германія напала на Савецкі Саюз, пачалася вайна. Зноў і зноў паўтараў Іван сам сабе гэтыя, як яму пачало ўяўляцца, поўныя таямнічасці і сэнсу словы і думаў: «І праўда — паспрабуй адгадаць, як, куды, па якім з рукавоў накіруе цяпер жыццё «свой вероломный и лукавый ход»? Вядома, Іван ані не сумняваўся: вораг атрымае належны адпор, Чырвоная Армія спыніць нашэсце фашыстаў, спыніць на самай граніцы, не даўшы ступіць на нашу зямлю і кроку. Ні пядзі, ні пядзі роднай зямлі не аддадзім мы нікому. Пра гэта спяваецца ў песні, гэтак яно і будзе. Не можа, не можа быць інакш!

І ўсё ж... Нейкая няўцямная, падспудная, як боль, трывога, глыбокі нутраны неспакой не пакідалі Івана, увесь час былі з ім — так звініць і звініць туга нацягнутая струна, нават калі яе ніхто не кратае рукою. Тое, чым жыў,

што хвалявала і клапаціла дні, месяцы і гады, неяк незаўважна аддалялася, здавалася дробным, мізэрным, не вартым увагі ў параўнанні з тым вялікім і страшным, што абрынулася і на Краіну Саветаў, і на яго, Івана, і на ўсіх, усіх людзей. «Як, куды, па якім з рукавоў накіруе жыццё «свой вероломный и лукавый ход»? Невядомасць, няпэўнасць таго, што здарылася, што мелася быць і заўтра, і паслязаўтра, і ў неаглядным будучым, турбавала, палохала Івана. Любую справу пачынаць лягчэй, чым канчаць. І вайну ж таксама трэба будзе канчаць. Гітлер, перш чым напасці на Савецкі Саюз, заваяваў амаль усю Еўропу. Армія ў яго вопытная, абстраляная, добра ўзброеная. Да таго ж гэта фашысты. Мараль іхняя звярыная. Яны толькі саміх сябе лічаць за людзей, астатніх жа... Тапчы, знішчай. Справіцца з імі... Нават такой краіне, такой арміі, як наша... Гм... На гэта і час трэба, і людзі, ды і шмат, вельмі шмат чаго...

Хацелася Івану пагаварыць з кім-небудзь, паразважаць, абмяняцца думкамі, супаставіць тое, што ведае ён, з тым, што, можа, ведае нехта іншы. «Разагнаць бы хоць трохі трывогу, абнадзеіцца, упэўненасць, грунт бы пад нагамі цвёрды зноў адчуць...»

Але такіх людзей, з якімі можна было б пра ўсё гаварыць шчыра, у Вялікім Лесе ў Івана не было. Не меў асаблівай патрэбы ў іх Іван, зусім блізка быў Гудоў, і Івана цягнула туды — там прайшла маладосць, там жылі сябры. І Багавік таксама там жыў... А Багавік... Умеў сабраць, згрупаваць вакол сябе цікавых, разумных людзей. Як толькі выхадны — маёўка ці проста сустрэча-гутарка ў лесе, а то і ў чыёй-небудзь хаце. Праўда, з ад'ездам Багавіка ў Ельнікі кампанія іхняя патроху сама сабой распадалася, не было іншага такога чалавека, які замяніў бы Багавіка, аб'яднаў бы вакол сябе людзей. «Мусіць, на нікога не трэба было спадзявацца, на самога сябе ўзяць гэты клопат. Каб жыў у Гудове, можа б, і ўзяў. А то... Закапаўся ў сваім — жонка, дзеці, сельсавет... А нельга, нельга было так... Тут, у Вялікім Лесе, таксама людзі разумныя і цікавыя ёсць... Васіль Кулага, напрыклад. Той жа сусед па кватэры, дырэктар школы Андрэй Макаравіч Сушчэня... З імі можна было б бліжэй сысціся, яны і чытаюць шмат, і думаюць... Ды і ў іншых вёсках таксама сяго-таго знайсці можна было б...»

Кінуўся Іван да радыёпрыёмніка, хацеў паслухаць, што перадаюць і Мінск, і Масква. Але, уключыўшы і па-

чуўшы слабы шум і трэск, успомніў: селі батарэі. Новых жа... набыць не ўдалося. У магазіне ў Вялікім Лесе іх ніколі няма, няма і ў Ельніках. Ехаць жа ў Мазыр ці ў Гомель... Знарок дзеля таго, каб купіць батарэі, не паедзеш, а выпадак, каб сам ці хто-небудзь са знаёмых туды ехаў, не надараўся...

«А што, калі... у Ельнікі, да Багавіка, падскочыць? — прыйшло ў галаву Івану.— Казаў жа надоечы Багавік: не чакай, калі паклічуць — сам прыязджай...»

Знайшоў конюха Кузьму, папрасіў, каб той добра накарміў і напаіў каня. І ў панядзелак, яшчэ нацямочку, запрог каня ў калёсы, укінуў у аглабцы свежанакошанай травы, заслаў яе пасцілкай, сеў у перадок і пакіраваў у Ельнікі.

З Вялікага Лесу выехаў рана. Пакуль узышло, заіскрылася ў небе сонца, мінуў Рудню і Паташню — дзве невялікія, хат па пятнаццаць — дваццаць, вёсачкі, што туліліся на берагах нешырокіх, але паўнаводных рачулак: Рудня — ля Старчанкі, Паташня — ля Балацянкі. Дарога ўвесь час ішла лесам, толькі зрэдку выбягала на поле, віхляла па пяску. І зноў шылася ў непралазь, у гушчар — колы весела ляскаталі ў засені магутных стогадовых дубоў, ясеняў, клёнаў. Кіраваць канём не трэба было — гэтую дарогу конь ведаў, даводзілася мераць яе сваімі нагамі туды і назад часта, па разу, а то і па два на тыдзень: вёскі ж Рудня і Паташня ўваходзілі ў Велікалесаўскі сельсавет, ды і ў Ельнікі карацейшай дарогі не было. Таму Іван, прылёгшы на пасцілку, глядзеў, як набягаюць, чаргуюцца карыстыя, з барадамі сівога моху камлі дрэў, адны аддаляюцца, астаюцца ззаду, губляюцца ў зелянiне кустоў, другія зноў і зноў набліжаюцца, і думаў, што яму надта ж міла і добра ехаць тут, па сваім, знаёмым змалку, лесе, што ён любіць і гэтую цесную, глухую дарогу, і змрочныя гаманкія дрэвы, кусты, што тут і там раскашуюцца паабапал, і неба — тое вялікае, неабсяжнае неба, што вісіць, блакітнее заўсёды-заўсёды над галавою, любіць усё-ўсё, што расце, жыве ў гэтым краі на небагатай, але да болю блізкай, роднай зямлі. «Чаму б гэта ў мяне сёння такая чуллівасць? — лавіў сябе Іван.— Дзесяткі, сотні разоў праязджаў і не думаў пра гэта. І раптам... Гм, аж усярэдзіне ўсё млее, ные, слёзы, здаецца, нагортваюцца на вочы, плакаць хочацца... Чаму б, чаму б гэта?..»

Конь выцягнуў падводу на поле — шырокае, пагорыстае. Зялёнаю сцяною да самай дарогі падступала густое, высокае жыта — яно рвала ўжо трубкі, выкідвала колас, а месцамі красавала, налівалася. Падзімаў, дыхаў лёгкі летні ветрык — жыта льснілася, лагодна шумела, гнулася, па ім перакатамі адна за адной беглі хвалі. Удалечы замаячыў млын-вятрак — стаяў у баку ад дарогі, на гары, нерухома, як падстрэленая птушка, апусціўшы ледзь не да самай зямлі крылы. Той вятрак, які ўсю восень і зіму круціў і круціў цяжкія камяні, малоў муку, драў крупы і куды ўсе велікалесаўцы, і ён, Іван, таксама, вазілі малоць збажыну, што вырастала на іхніх пясчаных і тарфяністых глебах.

Тым часам ужо ладнавата паднялося, слала святло, цяпло ўсяму жывому сонца. Заіскрылася, заблішчала раса на траве і лісці, ачнуліся ад начнога здранцвення камары, сляпні. А птушкі! Што выраблялі птушкі! Пырхалі, скакалі, пералятвалі з месца на месца. І, вядома ж, спявалі, кожная на свой лад, як умела, славіла новы дзень. У паветры, здавалася, навечна павіс шматгалосы згэлк — усё і ўсюды ценькала, гухала, бухала, вуркатала, свістала...

І да Івана нарэшце дайшло, чаму агарнула, спавіла яго такая чуллівасць. «Ды гэта ж... Вайна пачалася. І я... Не сёння, дык заўтра расстануся з усім гэтым... І калі зноў ту́т буду?.. А мажа, ніколі ўжо і не пабачу ўсяго гэтага... Бо вайна — гэта перш за ўсё слёзы і смерць... Слёзы і смерць блізкіх і знаёмых, слёзы і смерць соцень, тысяч людзей...»

Варухнулася нешта трывожна-шчымлівае, непамыснае ўсярэдзіне, укалола ў самае сэрца. Вастрэй, як ніколі яшчэ, адчулася радасць ад жыцця, ад таго, што ёсць вось гэтая цёплая летняя раніца, ёсць гэтая знаёмая змалку дарога, блакітнае чыстае неба над галавою; ёсць, урэшце, свае, хай сабе, мажа, часам і дробязныя, але так патрэбныя чалавеку турботы і клопаты, ёсць тое, з чым кожны дзень сустракаўся, пра што думаў, дбаў, чым жыў. І самае галоўнае — неяк не цаніў усяго таго, не ўяўляў нават, што яго мажа і не быць, лічыў, што тое, што ёсць, будзе заўсёды, вечна.

«Аж яно вунь як раптоўна павярнулася! Я во жывы, здаровы, еду па дарозе, любуюся небам, лесам, полем, слухаю птушыны згэлк, думаю пра ўсё, што прыходзіць у галаву, а гэтакія ж, як я, некаторыя ўжо і загінулі, няма іх на свеце... Безумоўна, загінулі, бо вайны без смярцей не

бывае... А-я-яй! Гэта аж не ўкладваецца ў галаве — цэлыя суткі ідзе вайна!»

На хвіліну Іван паспрабаваў уявіць, што робіцца цяпер, вось у гэтую самую хвіліну, там, на вайне...

І не змог — уяўлялася нешта агідна-пачварнае, неверагодна страшнае, жудаснае.

«А можа, няма нідзе ніякай вайны, можа, памыліўся Багавік, паспяшаўся сказаць, не праверыўшы тое, што сам ад некага пачуў?» — кальнула, як іголкай, нясмелая думка.

Тузануў за лейцы каня — паехаў шпарчэй.

Да райкома — ён разам з райвыканкомам мясціўся ў двухпавярховым цагляным былым панскім асабняку, што бялеў у вялікім старым, таксама былым панскім парку,— Іван пад'ехаў, калі не было яшчэ і васьмі гадзін. Прывязаў да канавязі каня, падкінуў яму пад пысу ахапак яшчэ не завялай, мокрай ад расы травы.

— Жуй, жуй,— сказаў ласкава і палэпаў даланёю, пагладзіў потную шыю.

Размяў закляклыя ад доўгага сядзення на падводзе ногі, прайшоўся сюд-туд па парку, дзівячыся той цішыні, таму спакою, што панавалі тут. У парку, гэтак жа як і ў лесе, спявалі, высвіствалі на ўсе лады птушкі, вусцішна шумелі дрэвы, капала, гучна падала з ліста на ліст — шпок-шпок, шпок-шпок-шпок — раса.

«Відаць, выдумка, няма нідзе ніякай вайны,— закрадвалася, набывала радасную пэўнасць думка.— Вунь жа і ў Ельніках, калі праязджаў, нідзе нічога ў вочы не кінулася... Ціхата, спакой».

Вярнуўся назад да каня — конь перабіраў губамі травінкі, шукаў смачнейшыя: падымаючы час ад часу галаву, касіў то левае, то правае вока і пырхаў, адганяў ад сябе заедзь — камароў і мошак, што віліся, віселі хмараю.

— Ранавата мы з табой прыехалі сёння,— сказаў Іван даверліва каню, як добраму даўняму сябру.— У райкоме нікога яшчэ, мусіць, няма...

Але чакаць дзевяці гадзін не стаў — падняўся па скрыпучай драўлянай лесвіцы на другі паверх асабняка, спыніўся ля дзвярэй таго пакоя, дзе быў адразу ж за прыёмнай кабінет Багавіка.

«А раптам Багавік у сябе? — падумаў Іван.— Ці мала

што... Ён наогул у райкоме заўсёды позна заседжваецца... І рана прыходзіць. А цяпер жа...»

Хацеў сказаць: «Цяпер жа вайна...» І не сказаў, не вымавіў нават у думках гэтае слова, схамянуўся, адагнаў, як недарэчны прывід, яго ад сябе.

Сакратаркі ў прыёмнай не было.

«Няма, напэўна, і Багавіка. Давядзецца пачакаць...»

Усё ж не вытрымаў — на ўсякі выпадак таўхануў рукою дзверы ў кабінет да першага сакратара. Дзверы лёгенька, без скрыпу адчыніліся, і Іван убачыў: Багавік на месцы, за сваім сталом. Толькі... Што ж гэта ён?.. Аблакаціўшыся на стол і схіліўшы, паклаўшы на рукі без пары пасівелую галаву, ён... няйнакш... ды ці не спіць?

— Раман Платонавіч...

Багавік адарваў ад стала галаву, непаразумела пагледзеў на таго, хто парушыў спакой, перапыніў сон — на яго, Івана.

— А-а, гэта ты, Дарошка,— сказаў Багавік і, усміхаючыся, падняўся з-за стала, размашыстым крокам пайшоў насустрач Івану.— Даруй, заснуў я... У райкоме цэлую ноч...

— Чаму? — спытаў, трохі зніякавеўшы, Іван.

— Ці мала каму я магу спатрэбіцца? Вайна ж... Трэба прывыкаць, да ўсяго прывыкаць.

— Дык такі праўда — вайна пачалася? — аж пахаладзеў увесь з галавы да ног Іван.

— Ты яшчэ не верыш? — утаропіўся вачыма, як на дзівака, сакратар райкома. (У вялікіх карых вачах добрага свайго сябра Іван убачыў не толькі стому, але і нейкую небывалую задуменнасць, заклапочанасць, якіх ніколі раней не бачыў.)

— Не веру, Раман Платонавіч. Не, не тое што не веру,— папраўіўся праз хвіліну Іван,— а не хачу верыць... Неяк надта ж усё гэта... Нават не нечакана, а як бы нязвычна. Гэта ж цалкам усё трэба на іншыя рэйкі ставіць. І прамысловасць, і сельскую гаспадарку. Ды і нам... Таксама трэба цалкам перабудоўвацца, перастрайвацца.

— Каб жа толькі гэта! А то ж... Ваяваць нам трэба, ворага спыніць...

— А хіба ён не спынены?

— Шчаслівы ты чалавек, Іван, нічога не ведаеш,— і Раман Платонавіч раптам перайшоў на шэпт.— Не для пераказу табе гавару — прарваўся вораг праз граніцу. Слухаў я і сваё, і нямецкае радыё. Немцы, вядома, брэ-

шуць, яны называлі гарады, якія ўзялі. І ўкраінскія, і беларускія, і літоўскія... Гэта няпраўда, я не веру! Але што прарваліся яны, не спынілі нашы войскі на граніцы... Гэта, мусіць, праўда.

— Няўжо? — верыў і не верыў таму, што чуў, Іван.— А Масква? Што перадае Масква?

— З Масквы Молатаў выступаў.

— І што ён гаварыў?

— Немцы парушылі пагадненне, напалі на Савецкі Саюз. Напалі вераломна, разбойна, без аб'яўлення вайны...

— М-га-а,— выдыхнуў, пакруціў галавою Іван.— Я, прызнацца, ніколі не верыў ніякім пагадненням з немцамі, ведаў: вайна з Гітлерам непазбежна...

— Мы пра гэта з табою гаварылі,— задумаўся на хвіліну, спыніўшыся і трымаючы ў сваіх руках Іванаву руку, Багавік.— І неаднойчы. Нам трэба было выйграць час. Але цяпер тое ўсё... Іншыя задачы паўсталі. Трэба мабілізаваць людзей на адпор ворагу, спыніць яго, выгнаць з нашай зямлі.

— Былі якія-небудзь указанні? — спытаў, гледзячы ў вочы Багавіку, Іван.

— Пакуль што... Ніякіх. Нядзеля ж была, выхадны. Але я і без указанняў ведаю — усё для вайны, усё для фронту...

...Іван быў у райкоме амаль увесь дзень, чакаў: можа, пазвоняць адкуль-небудзь і ён пачуе што-кольвечы пра вайну, пра тое, дзе нашы, што там, на фронце. Але нічога новага пачуць так і не ўдалося. Ніхто асабліва язык не распускаў. Ды, мабыць, і мала хто што ведаў. І Іван, пабываўшы ў райвыканкоме, ваенкамаце, пагаварыўшы яшчэ з Багавіком, выправіўся дадому, у Вялікі Лес. Ясна Івану пакуль што было адно — Германія напала на Савецкі Саюз, пачалася вайна. Вайна з фашызмам. Тое, чым дагэтуль жыў, чым жылі ўсе людзі, адыходзіла беззваротна ў мінулае. Насоўвалася нешта новае, невядомае. І пра яго, тое новае, невядомае, і думаў Іван, вяртаючыся з Ельнікаў.

Яно, тое новае, невядомае, насцярожвала і палохала.

## II

Вестку, што пачалася вайна, Дарошкам прынесла ў хату суседка, Тхорыха. Яна прыйшла пазычыць падсітак, каб прасеяць муку, і, убачыўшы, як, не спяшаючыся,

мірна, самавіта абедаюць за сталом Мікалай з сынам Косцікам, яшчэ з парога крыкнула:

— Ай не чулі хіба — немец жа, кажуць, напаў на нас...

— Хто ета кажа? — паволі павярнуў свой валасаты, з акуратна расчасанаю барадою твар, паглядзеў на Тхорыху Мікалай.

— Ды Муцік мой,— Муцікам Тхорыха звала мужа, Мацея.— Ля калгаснай канторы быў, то гаварылі там...

— А не брахня? — паклаў лыжку, перастаў есці Мікалай.

— Ой, Мікалайка, я сама б хацела, каб ета брахня была. Але не брахня ета, не-е, не брахня,— круціла галавою, стоячы ў парозе, Тхорыха.— Ета ж я і поцітак прыйшла прасіць, хлеб учыняць трэба. Мусіць жа, на хронт Муціка забяруць...

І Тхорыха шмарганула носам, усхліпнула...

Мікалай, сцяўшы губы, падняўся з-за стала. Пачакаў, калі Хора падасць Тхорысе падсітак і тая пойдзе з хаты, а тады павярнуўся да Косціка, які ўсё яшчэ сядзеў за сталом, хоць і не еў ужо нічога, толькі насцярожана, быццам чагосьці чакаючы, глядзеў то на бацьку, то на Хору, пэўна, не ведаючы, як далей быць, што рабіць, і сказаў:

— Во што, сын... Збегай да Піліпа, скажы, кеб сюды, да нас, мігам ішоў...

Сам Мікалай — Косцік гэта ведаў — з таго дня, як пасварыліся Піліп з бацькам, у хату да Піліпа і носа не паказваў.

Косцік вярнуўся хутка, усяго праз якую хвіліну, з Піліпам — той быў увесь абчапляны стружкамі, стругаў, хоць і нядзеля была, святы дзень, грабільны.

— Што, тата? — спытаў палахліва Піліп, ледзь толькі пераступіў парог.

— Тхорыха вунь кажа — вайна пачалася,— сказаў, паведаміў тое, што сам толькі што пачуў, Мікалай.

— Ва-айна-а? — аж злякнуўся, не паверыў Піліп.

— Так, сынок, вайна. Етага чакаць трэба было — Пецка ж казаў. А Пецка не памыляецца. Не-е, ніколі не памыляецца!..

Нейкі час у хаце панавала маўчанне. Нават Хора прыціхла, перастала соўгаць, перастаўляць у печы чыгуны: стаяла, падняўшыся на адну моцную, некульгавую нагу, нязвыкла тонкая і рослая, і, выцягнуўшы трубачкай губы,

уважліва, баючыся прапусціць хоць слова, слухала, пра што гаварылі мужчыны.

— То я во чаму цябе пазваў,— не спускаючы вачэй з Піліпа, паволі паварушыў губамі Мікалай.— Грошы, канешне, у цябе е?

— Е.

— Багата?

— Не вельмі кеб, але е. А навошта вы пытаеце пра ета?

— На тое, што расходаваць грошы трэба, пакуль не позна, пакуль не прапалі.

— Чаму ета будзе позна, чаму яны прападуць? — не разумеў бацькі Піліп.

— А таму, што заўсягды так. Як вайна пачынаецца, так грошы ў цане падаюць. Ды і не прадаюць за іх нідзе нічога. Не вераць людзі грашам. Трэба, пакуль не апомніўся ніхто, у магазін бегчы.

— Чаго ў магазін?

— Грошы расходаваць, купіць — што можна.

— Што ты там вельмі купіш?

— Што е, тое і купляць трэба. Бо заўтра... І таго не купіш,— казаў, вучыў бацька сына.— Крам, газа, соль... Дзе ты ў вайну ўсё ета купіш? Ні за якія грошы ніхто не прадасць...

— А можа...— Піліп памаўчаў.— Можа, выдумаў хто, можа, нідзе ніякай вайны няма. Было ўжо — паверыў Пецку, па соль у магазін пайшоў. А Іван, брат, убачыў мяне з мяшком — ад сораму падзецца не ведаў дзе...

— Іван твой вельмі начальнік, вельмі знае багата чаго. Вато набраў бы солі, анігадкі быў бы!

— Калі праўда, што вайна пачалася, мне, тата, соль не трэба.

— Чаму ета табе соль не трэба?

— Таму, што бясплатная соль мне будзе.

— Бясплатная? — вырачыў вочы, не зразумеў сына Мікалай.

— Бясплатная. Аге ж. Ваяваць мяне забяруць.

— Дурны, дык дурное і пляце. Вато не марудзь, ідзі грошы бяры, ды — у магазін, пакуль яшчэ не ўсе пра вайну ведаюць, пакуль не апомніліся, не кінуліся хапаць хто што... Бо тады... Не ўхопіш!

Піліп, хоць і без асаблівай ахвоты, усё ж схадзіў у сваю хату, узяў грошы. Назад, да бацькі, вярнуўся з мяшком пад пахай. Тым часам і бацька злазіў некуды на печ, пад бэльку, дастаў свае, загорнутыя ў хусцінку чырвонцы. Доў-

га храбусцеў імі, пералічваючы і штохвіліны збіваючыся з ліку. Урэшце, чартыхнуўшыся, засунуў хусцінку з грашыма за пазуху, злез з печы.

— Пайшлі,— сказаў, нібыта загадаў, ён Косціку, які моўчкі, быццам чужы, стаяў, не ведаючы, дзе прыткнуцца, пасярод хаты і назіраў за бацькам і старэйшым братам, Піліпам.

— Дык, можа, і мы які мяшок возьмем? — асмеліўся спытаць у бацькі Косцік.

— А ты хіба шчэ не ўзяў? — рэзка павярнуў да меншага сына свой валасаты твар, аж крыкнуў бацька.— Дык чаго ж ты, як ёлуп, стаіш?..

Хора кінулася ратаваць Косціка — выбегла з хаты, прынесла з сенцаў пук мяшкоў. Пыльных, лапленых, падраных.

— Цалейшыя выбірай. Два,— распараджаўся, загадваў Мікалай не то Хоры, не то Косціку.

Ліда Шавейка не разумела, што здарылася — з кожнай хвілінай людзей у магазіне большала і большала. І не таўкліся, як бывала, гадзінамі ля прылаўка, не прыкідвалі, не абмяркоўвалі, варта тое купляць ці не варта, а бралі, рашуча бралі,граблі ўсё, што бачылі, што ляжала на паліцах.

«Зноў нехта чутку пра вайну пусціў»,— думала яна.

Зачыняць магазін, бегчы ў сельсавет прасіць рады ў Івана Мікалаевіча Дарожкі сёння не выпадала — была нядзеля і Івана Мікалаевіча магло ў сельсавеце не быць.

«Дацягну, можа, да абеду. А тады... Відаць будзе, што далей рабіць»,— вырашыла Ліда і, не вельмі рупячыся, прадавала людзям, што тыя прасілі. А людзі, быццам ашалелі, бралі, проста мялі ўсё — мыла, цукеркі, рыбу, соль, гарэлку, віно, куплялі польта, хусткі, абутак, словам, усё-ўсё прытном, што ляжала, пылілася ў магазіне месяцамі і ніхто на яго нават не глядзеў, не тое што квапіўся. Прычым бралі, хапалі, сварачыся, падганяючы Ліду, бо яна, як некаторым здавалася, не спяшалася, марудна адпускала тавары.

— Ды варушыся ты хоць трохі барздджэй! — нерваваліся адны.

— Без чаргі, без чаргі не давай! — гарлапанілі другія.

— Не прадавай па стольні, іншым жа таксама, можа, узяць трэба! — перасцерагалі трэція.

У Ліды хапала вытрымкі — яна не ўстравала ніколі ў спрэчкі з пакупнікамі, старалася асабліва ні на кога не крыўдаваць. «Свайго не дакажаш, а адносіны з чалавекам сапсуеш» — было яе залатое правіла. І цяпер яна спакойна, не зважаючы на крыкі, важыла, мерала, потым брала грошы, лічыла, пералічвала, давала рэшту. Марудлівасць Ліды ўсё больш і больш злавала людзей. Разгарачаныя, злосныя ад думкі, што ім можа не хапіць таго, што некаторыя не бяруць, а проста грабуць, яны парушалі чаргу, ціснуліся бліжэй да прылаўка, бурчалі, сварыліся.

— Што такое, чаму сёння такая таўкатня? — не вытрымала, урэшце спытала Ліда.

— А ты не чула хіба — вайна ж! — адказаў, крыкнуў ёй нехта з чаргі.

Ліда не паверыла, заўсміхалася:

— Такая, мабыць, вайна, як была ўжо... Калі Пецка напрарочыў.

— Не, дзеўка, еты раз не такая. Вайна, самая сапраўдная вайна...

Ліда падняла галаву, паглядзела на чалавека, што не сказаў, а панура, быццам праз слёзы, выціснуў з сябе тыя словы. Не верыць... Не, не магла Ліда не верыць Пархвіру Рыкулю. Не брахлівы, надта паважаны чалавек быў Пархвір Рыкуль, сто разоў падумае, перш чым што-небудзь скажа. Ды і... Пархвір Рыкуль — бацька Міхася. Таго Міхася, з якім яна...

«Ах, што ж цяпер будзе?..»

Рукі апусціліся ў Ліды.

«Накаркалі... Усё ж накаркалі...»

Лічыла Ліда грошы, падавала людзям тое, што ў яе прасілі, патрабавалі, і не разумела, што яна робіць.

«Гэта ж... Калі і праўда — вайна, то мужчын усіх на фронт забяруць. І Міхася...»

У вачах у Ліды пацямнела — з Міхасём жа яны ўмовіліся пажаніцца. Нават дзень выбралі, калі ў сельсавет пойдуць заявы на шлюб пададуць... Пятніца той дзень. Міхась хацеў у чацвер у сельсавет пайсці, а яна настояла на пятніцу. У пятніцу ж яна нарадзілася... І замуж каб... Таксама ў пятніцу...

«А цяпер... Што цяпер?» — ліхаманкава мільгала, пранасілася ў галаве ў Ліды.

Зноў падняла вочы, акінула паглядам людзей. Здзівілася: поўны магазін! Ні стаць, ні павярнуцца. І лезуць, лезуць яшчэ. Кожны імкнецца дарвацца, прабрацца

хутчэй да прылаўка, бліжэй да яе, Ліды, узяць, схапіць хоць што-небудзь...

«Можа, выдумаў хто?.. Няўжо праўда — вайна?»

Твары ў людзей былі заклапочаныя, сур'ёзныя, вочы гарэлі хіжай, хцівай апантанасцю, прагавітасцю, ніхто не прытрымліваўся ўжо ніякай чаргі, распіхваў аднавяскоўцаў рукамі, сунуўся, прабіраўся наперад.

— Га-га-а! — крычаў жаночы голас — чый, не разабраць.— Куды ты лезеш, каб з цябе духі вылезлі.

— Нагу, нагу-у! — плакала, лямантавала дзіця.

— Стой, падла, не таўхай!

— Ліда, Ліда-а! — нема роў нечы бас.— Не давай яму, ён па галовах людскіх пёр!

— Га-а!

— Го-о!

— Гу-у!

Ліда ўжо не чула, што ёй і хто крычаў, што ў яе прасілі, патрабавалі. Хапала з паліцы тое, што там яшчэ стаяла ці ляжала, несла, кідала на прылавак, вырывала з рук грошы, наспех іх лічыла, давала рэшту і зноў бегла да паліц.

Апомнілася, схамянулася Ліда толькі тады, калі не было чаго прадаваць — паліцы былі пустыя, нібы іх падмялі.

— Са складу, са складу нясі!

— Аге, са кладу! Нясі, што е!

Ліда была памкнулася пайсці на склад — ён быў пры магазіне, за сцяною. Але ў час спахапілася, адумалася.

«Паспею прадаць тое, што на складзе. І так яшчэ... Што скажа старшыня сельсавета, Іван Мікалаевіч Дарошка, як даведаецца пра сённяшняе, што было ў магазіне».

— Няма нічога на складзе! — сказала яна.

— Не можа быць! — не верылі ёй.— Нясі!

Але Ліда ўпарта цвердзіла сваё:

— Няма! Няма чаго несці!

— Тады...

— Га-азу давай!

Гэта Ліду і выратавала. Газа была на двары, у знарок збітай з дошак будцы. І Ліда пачала прасіць усіх пакінуць магазін: ёй, маўляў, трэба газу, газу прадаваць. Людзі не хацелі выходзіць, патрабавалі, каб Ліда адчыніла склад, паказала, што там сапраўды нічога каштоўнага няма. Але сяк-так, з дапамогай тых, хто хацеў узяць газы і хто прадбачліва захапіў з сабою пасудзіну, яна павыганяла з магазіна людзей, замкнула яго на замок.

Газу разабралі хутка, за якое паўгадзіны. Ды і было яе небагата — дзве няпоўныя бочкі. Людзі самі налівалі, самі мералі, колькі ў якой пасудзіне,— Лідзе аставалася толькі лічыць грошы...

Мікалай Дарошка з двума сынамі паспеў трапіць у магазін, калі там былі ўжо людзі, але не столькі, колькі потым іх натаўхалася. Таму і сам ён, ды і Піліп, які надта ж неяк неахвотна і марудна ўсё рабіў, нават у магазіне быў непаваротлівы, як мядзведзь, яшчэ захапілі сёе-тое, набралі і солі, і крамніны, і кансерваў розных, і нават самі добра не помнілі чаго. Але грошы растрацілі, усе да капеечкі растрацілі. І з магазіна ішлі, вярталіся дадому з пакупкамі.

— Ну, што я табе казаў? — гаварыў Мікалай Піліпу, калі сустракалі людзей, якія беглі, спяшаліся ў магазін.— Кеб не я, і ты б вачамі цыўкаў...

— Ат, тата, мне ўсё ета не трэба,— абыякава махаў адною рукою — другою трымаў за плячыма мяшок — Піліп.

— Пачакай, ніхто не ведае, каму што трэба, а каму не трэба,— лагодзіў сына бацька.— Во прынясеш, дык будзе...

І Мікалай з любасцю падміргваў Косціку, хваліў — хітры, халера, і ўпраўны. І не заўважыў ніхто, як апынуўся ён ля прылаўка, прапусціў наперад сябе бацьку, а потым і Піліпа. Праўда, на Косціка накрычалі, таўханулі нават кулаком пад бок. Але тое ўсё лухта, забудзецца хутка. А вось што ўзялі, што купілі, нясуць у мяшках — тое іхняе, тое будзе, нідзе не падзенецца.

— Пасудзіны ніякай на газу не здагадаліся захапіць,— шкадаваў, журыў Косціка Мікалай.— А то б... Як мае быць атаварыліся... Аге, як мае быць...

І ўсміхаўся — быў задаволены.

## III

І раней, да размовы з Іванам Дарошкам, Вера Сымонаўна не зусім упэўнена была, што зрабіла правільна, падаўшы заяву на звальненне з працы ва універсітэце і кінуўшы-рынуўшы ўсё, як было, у Мінску, паехала, уцякла ў глушэчу, на Палессе. Надта ж баялася яна і за сябе, і за дачку. «Забяруць гэтак жа, як і мужа, паспрабуй тады даказаць, што ні ў чым не вінаватыя». Аж калацілася, рабілася сама не свая, калі ўспамінала позні, вельмі

позні начны стук у дзверы, візіт незнаёмых, грозных людзей. Тодар Пракопавіч якраз не дзяжурыў, дома быў. «Хто?» — спытаў, прахапіўшыся, ён. «Свае, з бальніцы». Адчынілі, а там... Тры мужчыны... «Збірайцеся, пойдзем з намі».— «Куды?» — «Мы скажам».

Яна, Вера Сымонаўна, не паехала з горада адразу ж, назаўтра, паспрабавала высветліць, у чым вінавацяць мужа. Але нічога пэўнага ёй нідзе не сказалі. Суседзі ж па кватэры, знаёмыя, спачуваючы, перасцерагалі, раілі: «Не абівай дарэмна парогаў, не шукай праўды. Пра сябе, дачку думай, а не пра мужа».

«Нікога не трэба было слухаць,— думала цяпер, пасля размовы з Іванам Дарошкам, Вера Сымонаўна.— Хто б нас чапаў, навошта мы каму?.. Што мы зрабілі такое, каб баяцца, уцякаць? Ды і муж, Тодар Пракопавіч, што зрабіў? Ён жа ні ў чым не вінаваты, а мы... І пагатоў. Пагарачылася я, глупства нарабіла...»

Нараджалася, спела жаданне — ні дня, ні гадзіны не быць больш тут, у Вялікім Лесе, ехаць, вяртацца назад, у Мінск.

«Раптам выпусцяць Тодара? Дзе ён шукаць нас з Тасяю будзе? Добра ж, як здагадаецца да Лапіцкіх зайсці і Пятро Пятровіч скажа, што нас бачыў. А як не здагадаецца?..»

Расказала Тасі пра сваю новую размову з Іванам Дарошкам, падзялілася тымі сумненнямі, што яе мучылі. Упершыню гаварыла з дачкою, як з дарослаю. Тася доўга не думала.

— Трэба вяртацца дадому, у Мінск,— сказала як даўно вядомае, вынашанае, вырашанае.

— А калі і нас заарыштуюць, забяруць гэтак жа, як забралі і бацьку? — глядзела, не зводзіла вачэй з дачкі Вера Сымонаўна.

— Усё адно трэба ехаць,— стаяла на сваім Тася.

— Чаму ты лічыш, што трэба ехаць? — пытала ў дачкі Вера Сымонаўна.

— Каб да бацькі бліжэй быць. Хоць перадачу яму занясём, запіску. А то... Пакінулі, быццам чужога, аднаго... Дый... Не вечна ж трымаць яго будуць, разбяруцца, выпусцяць...

Тасі надта ж шкада было бацькі — яна прыкрыла рукамі вочы, заплакала.

Шчыра кажучы, у Вялікім Лесе ні Веру Сымонаўну, ні Тасю нішто не трымала. Вера Сымонаўна прыняла экза-

мены, а Тася апошні экзамен здасць у панядзелак... І можна ехаць. Куды хочаш, туды можна і ехаць.

— Дык што — рызыкнём, паедзем?

— Паедзем, мамачка, паедзем!

— А з пажыткамі як жа? — узнікла ў Веры Сымонаўны праблема.— Забіраць з сабою?

— З пажыткамі?..

Падумаўшы, парашылі так: у Мінск паедуць без пажыткаў, быццам на розведкі. Паходзяць па горадзе, наведаюцца на сваю кватэру, паглядзяць, пачуюць, што і як... А тады, калі будзе ўсё добра, нішто не пагражацьме, вернуцца ў Вялікі Лес, забяруць тое, што трэба забраць.

— Гэта ж не так і цяжка прыехаць сюды яшчэ раз,— гаварыла, як бы пытала ў дачкі рады, Вера Сымонаўна.

— Вядома, не цяжка,— згаджалася з маці Тася.— Купіў білет, сеў на цягнік — і тут. Ноч, дзень — і ўсе турботы.

— Што ж, будзем лічыць — ты мяне пераканала,— усміхнулася, хоць і не зусім весела, Вера Сымонаўна.

З думкамі, што не будуць жыць больш у няпэўнасці, паедуць у Мінск, маці і дачка ляглі ў суботу спаць, з гэтымі думкамі яны і прачнуліся ў нядзелю. Тася з самай раніцы засела паўтараць «Гісторыю» — апошні экзамен быў па гісторыі,— а Вера Сымонаўна пачала рыхтавацца ў дарогу. Перамыла тое, што меркавала ўзяць з сабою ў Мінск, павесіла на двары сушыцца. З яды таксама трэба было нешта захапіць, і Вера Сымонаўна задумалася — ці не схадзіць ёй у Ельнікі, на рынак. Там, у Ельніках, можна было б сёе-тое купіць. Сказала пра гэта Тасі.

— Не трэба, мама,— быў адказ дачкі.— Што ёсць, з тым і паедзем...

— Дык у нас жа нічога няма,— прызналася шчыра маці.

Сапраўды — у Веры Сымонаўны нічога свайго не было, не паспелі абзавесціся гаспадаркай так, як астатнія настаўнікі, якія жылі і працавалі ў Вялікім Лесе даўно, гадамі.

— Купім, давай купім чаго-небудзь...

Пайшла Вера Сымонаўна да гаспадара хаты Ахрэма Куляша пытацца: можа, ведае, параіць, у каго што можна купіць з харчоў.

Ахрэм Кулеш хоць і лета было, але большую палову дня і ноч праводзіў на печы. На печы ён і спаў, на печы і еў. Стары зусім Ахрэм быў ужо. Летась пахаваў жонку. Дзя-

цей жа — дзве дачкі і сына — даўно пааддаваў замуж, пажаніў. Але са сваёй хаты нікуды не выбіраўся.

— Эт, тут я хадзяін,— казаў ён.— А ў чужых... Ні ступі, ні кашляні. Нашто мне такая жытка на старасць...

Ён, Ахрэм Кулеш, і цяпер ляжаў, падклаўшы пад галаву нейкія лахманы, на чаране — грэў бок.

— Ахрэм Патапавіч, га, Ахрэм Патапавіч! — падышоўшы да печы, як мага гучней сказала Вера Сымонаўна (стары Кулеш недачуваў).— Скажыце, у каго купіць можна што-небудзь з яды?

Ахрэм павярнуў галаву — ён, няйнакш, драмаў,— залыпаў вачыма.

— Ась? — прыставіў да вуха ён далонь.

— Можа, вы ведаеце, што хто прадае?

— Хто што дае?

— Ды не, прадае... Можа, хто з яды што прадае?

— Аа-а,— нарэшце здагадаўся Ахрэм.— Купіць што-небудзь хочаце?

— Ага.

Ахрэм узняў галаву, потым і сам, крэкчучы, прыпадняўся, сеў, звесіў ногі, абутыя ў падшытыя лямцам, палапленыя, старыя валёнкі.

— Да дачкі мае, Анюты, хіба схадзі,— сказаў Ахрэм, пачухаўшы патыліцу.— Певень у яе е, казала, прадала б, кеб пакупец знайшоўся. І масла ў яе таксама е. А яйкі ў мяне можаце браць, хвала богу, нанеслі куры...

Анюта-«брыгадзірыха», як усе звалі яе ў Вялікім Лесе (муж, Грышка Сапун, за брыгадзіра ў калгасе быў), меншая Ахрэмава дачка, жыла — гэта Вера Сымонаўна ведала — па другі бок грэблі, у вёсцы, ля пагону.

«Нешта, мабыць, купіць хоча, калі пеўня прадае»,— падумала Вера Сымонаўна.

Выпаліўшы ў печы і паснедаўшы, узяла грошы, кошык, пайшла да Анюты. Але да хаты яе не дайшла — сустрэла на грэблі самую Анюту. Анюта кудысьці надта ж спяшалася, аж бегла. І была ўсхваляваная — з-пад белай паркалёвай хусткі выбіліся пасмы русых валасоў, яны закрывалі вочы, шчокі, але Анюта, мусіць, гэтага не заўважала.

— Вы гэта куды? — спыніла Анюту, калі яны параўняліся, Вера Сымонаўна.

— Да бацькі,— задыхаўшыся, адказала Анюта.— Ета ж... Вайна пачалася... Дык бягу сказаць...

— Вайна пачалася? — перапытала, не паверыла Вера Сымонаўна.

— Аге, немец, кажуць, напаў...

— Хто кажа? — усё яшчэ не верыла Вера Сымонаўна.

— Усе кажуць. Грышка мой ля канцылярыі ў калгасе быў, дык чуў. А вы і не зналі?

Разгубілася Вера Сымонаўна — верыць Анюце ці не верыць?

— А вы куды ета з кошыкам?

— Да вас ішла.

— Да мяне? — здзівілася, аж плячыма пацепнула, Анюта.— Чаго ета вы да мяне?

— Ахрэм Патапавіч кажа, купіць у вас сёе-тое можна. З яды.

— Аге, а што?

— Ну, што лішняе...

— Гы-ы, ды лішняга быццам нічога няма,— усміхнулася Анюта.— Хіба... Певень... Масла... І то не таму, што лішняе, а грошы трэба... Хадземце, я вярнуся...

Збянтэжаная, агаломшаная страшнай навіною, уся нейкая абвялая, сама не свая, хутчэй па інерцыі, чым па жаданню, Вера Сымонаўна пайшла з Анютай да яе сядзібы, усё яшчэ не верачы ў тое, што пачула. «Можа, няпраўда гэта? Колькі разоў пра вайну гаварылі... І там, у Мінску, і тут, у вёсцы... І немец-перабежчык той, і Тодар вунь... Няўжо такі пачалася?»

Ля абгароджанага густа сухім альховым штакетнікам двара, што быў за грэбляю па правы бок і за якім стаяла крытая новаю гонтаю хата, збочылі на сцежачку, пакіраваліся да адчыненых нахлашч весніц.

Певень гробся разам з курамі на прызбе, на падворку. І Анюта, не заходзячы ў хату, злавіла яго, звязала аборкаю ногі і крылы, укінула Веры Сымонаўне ў кошык.

— Надта ж галасісты, спаць нікому не дае. Як закрычыць, залапоча ўночы — усе прачынаюцца,— расказвала Анюта.— Ды я яго і астаўляла да лета, пакуль курэй на яйкі не пасаджу. Зараз павыводзяцца, хопіць пеўняў... Нарастуць.

Вынесла Анюта з каморы і грудку масла, загорнутую ў зялёнае прывялае лісце хрэну.

— Тут хунты два,— паважыла яна на руцэ.— Бярыце.

Вера Сымонаўна адлічыла грошы, падала Анюце.

— Колькі ж тут? — спытала Анюта.

Вера Сымонаўна сказала.

— Ці не многа?

— Ат, бярыце... Дзякуй вам.

Цанавацца Вера Сымонаўна не любіла і не ўмела. Нават тут, у вёсцы, пераплачвала заўсёды, калі што-небудзь купляла. Гэта не падабалася яе калегам-настаўнікам, некалькі разоў яны не то ўшчувалі, не то папракалі за гэта Веру Сымонаўну, словам, вучылі.

— Дзякуй і вам,— у сваю чаргу падзякавала Анюта Веры Сымонаўне. Пастаяла, падумала.— Аге, дык я і не пабягу да бацькі, вы ўжо яму пра вайну скажаце. А я тым часам у магазін адскочу, можа, куплю якую дробязь... Бо потым не купіш.

Выйшла з Анюцінага двара Вера Сымонаўна, зноў на грэблю, на Замосце падалася. Паволі-паволі, трымаючы ў адной руцэ кошык з пеўнем, а ў другой — грудку масла, загорнутую ў зялёнае лісце хрэну.

«Калі праўда, што пачалася вайна,— мільгалі ў галаве ў Веры Сымонаўны думкі,— дык... Выходзіць жа, не памыляўся той перабежчык-немец, якога лячыў Тодар. Ведаў ён планы Гітлера. На які тыдзень толькі і памыліўся. Але Гітлер вайну мог пачаць і раней, чым меркаваў, планаваў. Значыцца, недарэмна Тодар па начальству хадзіў, пераказваў тое, што ад немца-перабежчыка пачуў. Папярэдзіць хацеў...»

Сказала Вера Сымонаўна пра вайну і дачцэ, Тасі, і Ахрэму-гаспадару.

Ахрэм адразу паверыў Веры Сымонаўне.

— Даўно гаварылі, будзе вайна,— сказаў, трасучы галавою, ён.— Яшчэ нябожчыца жонка мая крыж крывавы на небе бачыла. У поўнач. Выйшла паглядзець, ці карова не ацялілася, і бачыла. А крыж крывавы на небе — ета на вайну...

А Тася занепакоілася, устрывожылася:

— Мамка, што ж цяпер з таткам нашым будзе? — імкліва падхапілася яна з-за стала, за якім рыхтавалася да экзаменаў, забегала, замітусілася па хаце.

— З таткам?.. Не ведаю, не ведаю,— задумліва прамовіла Вера Сымонаўна.

— Можа, выпусцяць яго?

— Павінны выпусціць!

— Вось каб выпусцілі! Уяўляеш — мы былі б зноў з ім, такія, як усе!..

Глядзела Вера Сымонаўна на дачку, слухала, пра што тая, усхваляваная, шчабятала, і... расла, расла, большала і большала ў душы трывога. «Гэта ж... Вайна! Вай-на-а! Што прынясе яна? Ды і будзе што — са мною, мужам,

Тодарам Пракопавічам, дачкою, Тасяю? Усім-усім, чым жылі, да чаго прывыклі, без чаго ўжо не ўяўлялі нават свайго жыцця?»

«А можа... Не марудзіць — узяць ды сёння ж паехаць у Мінск? — закралася ў галаву думка.— Кінуць усё як ёсць і паехаць?»

«Экзамен жа ў Тасі»,— успомнілася раптам.

«Ну і што, як экзамен? Восенню здасць. Важнасць вялікая — экзамен».

«На суткі раней, на суткі пазней. Што за суткі зменіцца? А вісець экзамен лета над Тасяю не будзе. Здасць, ды адпачываць, як усе дзеці, будзе, нішто не будзе хваляваць на канікулах».

«І то праўда. Бо хто можа сказаць, як і куды ўсё павернецца, выкіруецца. Гэта ж не жартачкі — вайна».

Вайну Вера Сымонаўна помніла тую, ранейшую,— адступала ў выгнанне разам з бацькам з-пад Гродна. І пагаладаць давялося, і па чужых кутках патуляцца, і страху, пакут нацярпелася...

«Не, няхай Тася заўтра здае экзамен. Здасць — тады і паедзем!»

Пра свае думкі-сумненні не сказала Тасі. Узяла ў рукі кошык, пагладзіла рукою па пер'і агніста-рыжага пеўня, які, ваяўніча падымаючы шыю, круціў раз-пораз сюды-туды галавою, і пайшла прасіць Ахрэма-гаспадара, каб ён асвежаваў веселуна — сама Вера Сымонаўна яшчэ нічога жывога не забівала, баялася гэта рабіць.

«Вось асвяжуе Ахрэм пеўня, аскубу, выпатрашу ды ў печ пастаўлю, няхай варыцца. А сама тым часам збірацца ў дарогу буду. Заўтра ж, як Тася здасць экзамен, і паедзем. Што будзе, тое будзе, а паедзем»,— цвёрда вырашыла яна.

Яшчэ раз паглядзела на пеўня, які, нічога не ведаючы, нават, мабыць, не прадчуваючы, што чакае яго, круціў і круціў галавою, касіў і касіў то левае, то правае вока, быццам наважваўся, прымерваўся, каго б дзеўбануць, каму б нанесці свой сталёвы ўдар, уздыхнула:

«Ён не ведае... Нічога не ведае... А мы? Хіба ведаем, сказаць можам, што нас чакае наперадзе?»

## IV

З той самай хвіліны, як пачулі, дакацілася да Вялікага Лесу, што Германія напала на Савецкі Саюз — пачалася вайна, кожны ведаў, не забываў — будзе, прыйдзе гэты дзень.

І кожны яго чакаў, па-свойму рыхтаваўся. Мужчыны ўважлівей, пільней прыглядаліся да жонак, дзяцей, сваякоў — імкнуліся запомніць, увабраць у сябе іх пагляды і рухі, тыя словы, што гаварыліся быццам звычайна, як і заўсёды, і разам з тым ужо незвычайна, з пэўным сэнсам. Жанчыны, абліваючыся слязьмі, дарылі каханым апошнюю сваю ласку, мылі апратку, прышывалі адарваныя гузікі — неўпрыкмет збіралі мужа ў дарогу. Дзеці, хто быў меншы і не ўсё яшчэ разумеў, паводзілі сябе, нібыта нічога і не змянілася, не здарылася, як і раней: гойсалі, весяліліся, смяяліся; большыя ж, хто пра сёе-тое здагадваўся, не знаходзілі нідзе сабе занятку, моўчкі сланяліся сюд-туд, але так, каб быць бліжэй да бацькі.

І вось настаў, прыйшоў той дзень — дзень м а б і л і з а ц ы і...

Вялікі Лес абудзіўся рана. Абудзіўся плачам. Плакалі і старыя, і малыя, мужчыны і жанчыны. Тыя, каму трэба было пакідаць вёску, і тыя, хто тут заставаўся. Расставаліся ж не толькі з бацькамі, маткамі, жонкамі, дзецьмі — расставаліся з тым, да чаго кожны прывык, прырос душою, без чаго не ўяўляў свайго жыцця.

Павыганялі на пашу кароў, узышло, паказалася ў небе сонца — і пацягнуліся з усіх канцоў сем'ямі да сельсавета велікалесаўцы. Падыходзілі да Івана Дарошкі, які, вынесшы стол, засланы чырвоным абрусам, проста на вуліцу, сядзеў на табурэціку і адзначаў у спісе ўсіх, хто гатовы быў выканаць свой мужчынскі і грамадзянскі абавязак. Паказаўшыся на вочы Івану, адны адыходзілі ціхенька ўбок, стаялі купкамі пры сваёй радні; другія хаваліся за сельсавет, у сад, рассаджваліся на траве, аддавалі апошнія распараджэнні і парады; трэція, нягледзячы на ўсю важнасць і трагічнасць моманту, гыгыкалі, спрабавалі нават спяваць:

Паследні нонешні дзянёча-ак
Гуляю з вамі я, друззя...

Але галасістая радасць была не сапраўдная, а п'яная, горкая, са слязамі. Нават Дзям'ян Сучок і то расчуліўся, быццам і да яго залітай гарэлкаю памяці таксама нешта дайшло — сноўдаўся па натоўпе ад купкі да купкі, развітваўся з кожным, мармытаў:

— Давай, сусед, пацалуемся, можа, і не пабачымся ўжо ніколі...

— А ці ж ты калі хоць каго-небудзь праз гарэлку ба-

чыў? — адпускаў свае, не заўсёды, вядома, да месца, жарты Юлік Бязмен.

— Я... Я...— гарачыўся Дзям'ян Сучок.— Я сёння выпіў, дык прычына была. Гітлера ж, можа, іду біць...

— Ох і дасі ты Гітлеру. Адразу пабяжыць. Як толькі ўбачыць, так і пабяжыць... Праўда, убачыць цябе... Хіба, можа, у бінокль,— жартаваў Юлік Бязмен, намякаючы на надта ж малы рост Дзям'яна Сучка, бо быў ён хоць і немалады ўжо векам мужчына, а з выгляду — усё адно што хлапчук.— Цябе ж і таракан не збаіцца, не тое што Гітлер...

— Дылда, дылда ты!..— крычаў Дзям'ян Сучок на Юліка Бязмена.— Што ты разумееш? Якраз такія, як я, самыя салдаты. Схаваюся, дык куля нізашто не пацэліць. А ў цябе... Хоць з гарматы можна біць... Каланча!

Як і прызначалася, да дзесяці гадзін сабраліся да сельсавета ўсе, хто атрымаў позву, каму трэба было ісці ў войска. Не было, не з'явіўся толькі хіба адзін чалавек — Яўхім Бабай. Іван Дарошка паслаў да Бабая справавода Ніну Вараксу. Тая вярнулася хутка, сказала — Яўхіма Бабая няма дома.

— А дзе ж ён? — спытаў, занепакоіўшыся, Іван.

— Жонка кажа, торбу харчамі наладаваў ды ні свет ні зара некуды падаўся.

— Дэзерціраваў, няйнакш,— сціснуў зубы Іван.

— А можа, не зразумеў, што ў сельсавет з'явіцца трэба, у Ельнікі сваім ходам махануў? — падказаў Васіль Кулага — ён таксама ўвесь час быў ля Івана Дарошкі, памагаў яму чым мог.

— І то праўда,— кіўнуў галавою Іван, хоць у душы не згадзіўся з Васілём — «дэзерціраваў, падлюга...».

— Што рабіць будзем? — звярнуўся Іван да грамады.— Рушым хіба...

Ля клуба стаялі запрэжаныя ў фурманкі коні, і Іван сказаў, што торбы можна пагрузіць на вазы, падвязуць торбы да Ельнікаў. А самім мужчынам... Трэба ісці...

І адразу ж, быццам па камандзе, загаласілі, заляманталі жанчыны. Загаласілі, заляманталі, як па нябожчыках. Натоўп заварушыўся — зарыпелі, пацягнуліся па дарозе на Ельнікі падводы, пайшлі купкамі, кожны са сваёю раднёю, і людзі...

Дзень між тым разгараўся, уваходзіў у сілу. Паднялося ладнавата над лесам сонца і пякло, слала і слала зыркае сухое цяпло. На сонца набягалі лёгкія бездажджавыя

воблакі — іх звалі ў Вялікім Лесе сухмаркамі,— і тады яно хавалася, блыталася ў космах. Па вёсцы, па тварах людзей мільгаў цень. Але мінала хвіліна-другая, і сонца зноў паказвалася, смяялася, зноў слала на зямлю іскрыстыя промні, зноў грэла, пякло.

Нібыта яно, сонца, хацела высушыць тыя слёзы, якіх было не стрымаць, што ліліся і ліліся ў людзей з вачэй.

Цягнуліся, перамолвалі і перамолвалі коламі пясок падводы...

Ішлі, валюхаліся ўслед за падводамі, купкамі, суцэльным шэрым натоўпам жанчыны, мужчыны, дзеці...

За вёскаю, там, дзе стаяў невядома кім укапаны дубовы крыж, падводы і людзі спыніліся.

Пачалося развітанне — адны ішлі далей, у невядомасць, у свет як у капейку, другія аставаліся дома, у сваёй вёсцы. Што каго чакала? Ці сустрэнуцца, ці пабачацца яшчэ хоць калі?..

Жанчыны рвалі на сабе валасы, падалі ў пясок, заходзіліся страшным, няўцешным плачам. Мужчыны адварочваліся, махалі шапкамі, беглі, спяшаліся даганяць тых, хто паспеў ужо развітацца, хто кіраваўся далей, у Ельнікі...

Разам з усімі праводзіў на вайну двух сваіх сыноў і Мікалай Дарошка. Ад Піліпа ён не адставаў ні на крок з самай раніцы, памагаў збіраць, пакаваць торбу, не прамінаў выпадку, каб нешта не падказаць, не параіць.

— Ды пад кулю ета... Галавы надта не падстаўляй,— шаптаў Мікалай сыну.— Там розныя агіцірнікі будуць. Ты іх слухай, а свой розум май, сябе беражы. Бо героем... Добра быць, а жывым... Лепш...

Цягнула Мікалая, хацелася падысці і да Івана, сказаць яму хоць некалькі бацькоўскіх парад. І тады, як Піліп стаяў ля стала чырвонага, адзначаўся, што ён тут, ля сельсавета, і потым, калі Іван разам з жонкаю і дзецьмі ішоў па вёсцы, спыняўся, развітваўся з роднымі, з усімі, хто яго ведаў. І кожны раз нешта стрымлівала Мікалая. Не мог, не мог даравать сыну, што ўпарты такі ўрадзіўся, не слухае, ані не слухае бацькі, робіць, што можна і што няможна рабіць.

Піліп жа тым часам, пацалаваўшыся з жонкаю, з Хораю і Косцікам, якія таксама разам з усімі выйшлі за вёску, наблізіўся да бацькі, абняў яго, прытуліўся шчакою да яго барады.

— Тата, не памінай ліхам, даруй, калі што не так...
І не змог далей гаварыць — слёзы пырснулі ў яго з вачэй.

Пырснулі слёзы з вачэй і ў бацькі, у яго, Мікалая.

— Ты, сынок, таксама даруй, калі што не так,— зашаптаў Мікалай.— І беражы сябе, шануйся...

Як быццам жывое што адарвалі ад Мікалая, калі Піліп, расшчапіўшы абдымкі, адвярнуўся, бежкам пабег даганяць падводы, што, прыпыніўшыся на хвіліну, зноў зарыпелі, рушылі ў дарогу. Раскволіўся, расчуліўся зусім Мікалай. І да Івана крок зрабіў сам, першы. Можа б, і Іван таксама да бацькі падышоў, бо, развітаўшыся з жонкаю, з дзецьмі, да Косціка, а потым і да Хоры спяшаўся. Але так ужо атрымалася — ён, Мікалай, першы да сына падышоў.

— Што ўжо было, тое было,— сказаў прымірэнча Мікалай Івану, гледзячы не на яго, а сабе пад ногі, у зямлю.— А развітаемся давай як людзі...

— Бацька,— сказаў, абдымаючы Мікалая, Іван,— здараецца так — і не хацеў бы пакрыўдзіць, а пакрыўдзіш. Зразумей — я рабіў усё дзеля дабра, каб і вам, і ўсім у Вялікім Лесе добра было.

— Няхай, сын, не будам пра тое...— шаптаў Мікалай, прыціскаючыся барадою да сынавай шчакі.— Гора людзей мірыць. І мы, бачыш, памірыліся. Беражы сябе, шануйся. Дзеці вунь малыя, ім бацька трэба...

— Ведаю. Але ж, хочаш не хочаш, ваяваць трэба...

— Ну ваюй, ваюй... Але і пра дзяцей думай!..

— Буду думаць. Пра ўсё, усё буду думаць...

— Думай, думай, сынок. Ой як думай! Бо на вайне, ета не тое што ў мірны час. У кожнага ж зброя. Стрэліць — і ўсё, капец...

Хацеў і Івана перахрысціць на дарогу, як перахрысціў, ахінуў божым крыжам Піліпа, але не асмеліўся: камуніст жа Іван, раззлуецца, сварыцца пачне. А гэтага... Не хацеў Мікалай. Тым больш сёння, у такі дзень, пры расстанні...

Пуста, сіратліва зрабілася на сэрцы ў Мікалая, калі і Іван адарваўся ад бацькі, пабег даганяць падводы. Стаяў Мікалай, махаў шапкаю — каму, і сам не ведаў. А ў думках нібы застыла: «Сыны ж... Ці ўбачу яшчэ іх хоць калі?.. І ці мяне яны ўбачаць?..» Пякло, аж разрывала сэрца тое, што не па-людску з Іванам жыў, не адпускаўся, мала што калі было, трэба было дараваць, усё даўно дараваць і жыць як родны з родным. А то... Вось пайшоў, можа, і не вер-

нецца. А цяпла бацькавага з сабою не панёс... Не панёс... Не будзе бацькава цяпло грэць яго там, на вайне, у чужым, далёкім краі.

Доўга яшчэ не разыходзіліся, стаялі ў канцы вёскі людзі. Нават калі і падводы ў лес уехалі, схаваліся, людзі ўсё стаялі і стаялі. Махалі шапкамі, хусткамі, рукамі. Каму — і самі не ведалі, не бачылі ад слёз...

І ён, Мікалай, разам з усімі таксама стаяў... Стаяў нават тады, калі некаторыя заўздыхалі, павярнуліся, пайшлі дадому. Стаяў, бо не хацелася, не было сілы нікуды ісці.

Болем сціскалася сэрца, звінела, гуло ў скронях...

«Выгадаваў... Двух сыноў выгадаваў. І няма іх. Пайшлі. Куды пайшлі? Што чакае іх у невядомай дарозе, там, на в а й н е?..»

«Дадому б, толькі б дадому зноў вярнуліся! Жывыя, здаровыя кеб былі!» — нячутна шаптаў сам сабе Мікалай.

І хрысціўся, маліўся, гледзячы мокрымі ад слёз вачыма на ўкапаны ў канцы вёскі крыж, прасіў бога, каб злітаваўся, не даў сынам загінуць...

## V

Ціха, няўтульна стала ў Вялікім Лесе пасля провадаў на вайну мужчын. Вёска нібыта асірацела...

Сустракаючыся на вуліцы, жанчыны пыталі адна ў адной:

— Ну, мо чула, дзе цяпер нашы?

— Што ты цяпер пачуеш? Кажуць, вунь Тхорык ліст прыслаў.

— Няўжо? І адкуль?

— Во іду даведацца. Хоць знаць буду, куды іх, бедных, пагналі...

— То і я з табою пайду...

Ішлі жанчыны разам да Тхорыкавай жонкі Мальвіны, пыталі, ці праўда, што муж яе, Мацей, прыслаў з дарогі ліст. Тхорыха плакала — ніякага ліста ёй ніхто не прыслаў.

— Ета выдумаў хтось,— аднекваліся, бажылася Мальвіна.— Праўда, чула я, Анюта-брыгадзірыха ліст ад Грышкі свайго атрымала.

Хоць і не верылі жанчыны, што Грышка Сапун можа так пасляшацца, прыслаць ліст Анюце (такі атлёт, калі і ўспомніў бы каго ў дарозе, дык, пэўна, не Анюту!), але

ішлі, ужо ўтраіх, да Куляшовай Анюты. Ліста, як і трэба было чакаць, Анюце Грышка, вядома, не прысылаў.

— Калі і прыслаў хто ліст, дык ета Мішка Рыкуль,— казала Анюта.

— Каму? Бацьку? — дапытваліся жанчыны.

— Не, Лідзе Шавейкавай.

— А пры чым тут Ліда?

— Як пры чым? У іх жа любоў. Хіба не бачылі, як цалаваліся на провадах? Пры ўсіх. Быццам муж і жонка.

— Цю, а я і не ведала. Цяперашні маладзеж такі — стыда-сарама не мае...

Верылі — не верылі жанчыны Анюце, але ішлі, кіраваліся да Ліды Шавейкі — яна па-ранейшаму, нібыта нічога нідзе не змянілася, штодзень адчыняла магазін і выседжвала свае гадзіны за прылаўкам, хоць гандляваць і не было чым.

На пытанне жанчын, ці праўда, што прыслаў ёй ліст Мішка Рыкуль, Ліда чырванела і адмоўна хітала галавою:

— Няма. Ніякага ліста няма...

Вярталіся, разбрыдаліся жанчыны зноў па сваіх хатах, і на языку, у думках у кожнай былі, вярцеліся, не давалі спакойна жыць і працаваць тыя самыя словы:

— Дзе, дзе цяпер нашы?

З гэтымі словамі жанчыны клаліся позна ўвечары спаць, з гэтымі словамі падымаліся раным-рана з пасцелі (нязвыкла мулкая і халодная была тая без пары ўдовая пасцель!)...

А «нашы» тым часам шчасліва, без усякіх прыгод, дабраліся да Ельнікаў. Ля ваенкамата — новай, накрытай белай бляхай, драўлянай будыніны, што стаяла на ціхай бакавой вулачцы, абсаджанай па абодва бакі высачэннымі вастраверхімі таполямі,— тоўпіліся ўжо мужчыны з іншых бліжэйшых — палявых — вёсак. (Наогул, увесь Ельніцкі раён дзяліўся на палявы і лясны. Людзей з палявых вёсак звалі палевікамі, з лясных — лесавікамі.) З мабілізаваных тэрмінова групавалі аддзяленні, узводы, назначалі камандзіраў і пеша накіроўвалі па дарозе на Лоеў. То адсюль, то адтуль чуліся мужчынскія галасы:

— А лазня, лазня калі будзе?

— Хоць бы ў вайсковае апранулі, вінтоўку ў рукі далі. А то калі што якое...

— Адзенуць, абуюць і вінтоўку дадуць... Пачакайце,— адказвалі работнікі ваенкамата.

— А ісці доўга трэба будзе? Чаму на поездзе не адпраўляюць?

— Дзе, у якім баку фронт? Чаму мы не на захад ісці павінны, а на ўсход?

— Дык, перш чым на фронт, страляць жа навучыцца трэба!

— Таварыш начальнік, а на колькі сутак харчамі запасацца?

— Немец, дзе немец цяпер?

— Ці праўда, што Гітлер наступае, а мы адступаем?

— О-ё-ёй, кеб хоць сюды ён не прыпёрся. Тут жа жонкі, дзеці...

— А нас з табою дзеля чаго ж у войска бяруць? Захочам мы — то не прыпрэцца.

— Ета не ад адных нас з табою залежыць.

— Кажуць, сіла ў немца вялікая.

— А ў нас хіба малая?

— Размовы! Спыніць размовы! Вы дзе — на базары?

— У арміі нічога не пытаюць. Скажуць, усё, што трэба, скажуць.

Велікалесаўцы трымаліся ля ваенкамата сваім гуртам. Тоўпіліся ля падвод з торбамі, зацята курылі. Але вось Іван Дарошка, які перад гэтым адлучаўся, падымаўся на прыступкі таго драўлянага дома, дзе мясціўся ваенкамат, выйшаў адтуль з чалавекам у вайсковым.

— Хто з Вялікага Лесу, сюды! — аб'явіў Іван выразна, каб яго чулі.

Велікалесаўцы ўсім сваім гуртам падаліся наперад, бліжэй да ваенкамата. Калі натоўп, захваляваўшыся, зноў супакоіўся, Іван крыкнуў:

— Увага! — і збег з прыступак.

І тады загаварыў вайсковец, нізкаваслы, плячысты і ўжо немалады, загаварыў сурова, гучна вымаўляючы, быццам аддаваў каманду, кожнае слова:

— Таварышы, вы ўжо ведаеце, што фашысцкая Германія вераломна, без аб'яўлення вайны, напала на Савецкі Саюз... Нашы войскі вядуць кровапралітныя баі, абараняюць кожны рубеж, кожную пядзь нашай свяшчэннай зямлі. Неўзабаве вы таксама ўступіце ў бой. Таму вядзіце сябе па-ваеннму, як і належыць чырвонаармейцу. Слухацца толькі загадаў камандзіраў. Ніякай самадзейнасці! Вораг каварны, у любы час у любым месцы могуць быць бамбёжкі і дэсант! Таму дысцыпліна, дысцыпліна і яшчэ раз дысцыпліна! Напамінаю — усякае адставанне ад

сваёй каманды будзе расцэньвацца як дэзерцірства і карацца паводле законаў ваеннага часу...

Перадыхнуў, разгарнуў чырвоную папачку, якую дагэтуль трымаў пад пахай левай рукі, пачаў рабіць пераклічку, пры гэтым называючы, хто назначаецца ў якую каманду і дзе, у якім месцы яе збор.

Калі пераклічка была закончана, вайсковец спытаў:

— Усіх я назваў, нікога не прапусціў?

— Мяне не назвалі,— першы адгукнуўся Васіль Кулага.

— І мяне,— сказаў ціха, бо стаяў зусім блізка ад вайскоўца, Іван Дарошка.

Вайсковец зазірнуў у свой спіс, яшчэ раз прабег па ім вачыма зверху ўніз.

— Кулага Васіль і Дарошка Іван паступаюць у распараджэнне райкома партыі. Ясна?

Васілю Кулагу, ды і Івану Дарошку, не ўсё было ясна. Але пытаць пра што б там ні было ў вайскоўца не сталі: высветліцца, усё неўзабаве высветліцца.

— Калі ясна, прашу разабрацца па камандах...

Вялікалесаўцы пачалі развітвацца адзін з адным, шукаць тых, хто трапіў у «яго» каманду, каб быць ужо разам, не адставаць. Тут і там чулася:

— Бывай, Мацей!

— Шчасліва, Грышка!

— Дай бог яшчэ сустрэцца!

— Жывым бы вярнуцца дадому!

— Менш пі, Дзям'ян!

— А ты, Юлік, зубы хавай, а то выб'юць. Ета табе не ў Вялікім Лесе з усіх падхіхікваць.

— Даруй, калі што не так...

— Кінь, вайна спіша...

Іван Дарошка ды і Васіль Кулага таксама пашыліся ў людскі гурт. Таму падавалі руку, з тым абдымаліся, з тым цалаваліся. Знаёмыя ўсе былі не толькі твары, знаёмыя былі самі людзі. Колькі чаго разам было пражыта, зведана, перароблена! Не заўсёды клікалі адзін аднаго ў госці, не заўсёды бывалі адзін у аднаго ў хатах, але блізкасць, прысутнасць суседа адчувалі. Кожны адчуваў гэтую блізкасць, хоць услых пра гэта, можа, і не гаварыў.

Больш, чым ля каго, Іван затрымаўся ля брата, Піліпа. І рукі ціснулі адзін аднаму, і абдымаліся, і цалаваліся. Расставаліся ж,хто мог сказаць на колькі, мо і назаўсёды...

— Ты, Іван, хоць трохі хітрэйшы будзь,— наказваў

Піліп Івану.— А то ты ўвесь навідавоку. Такіх не ўсе любяць, кеб ты ета ведаў.

— Прывык я, інакшым быць не магу,— прызнаваўся Іван. І ў сваю чаргу таксама вучыў брата:— Не падвядзі, не схіб. Чэсна ваюй, каб потым не сорамна было нікому. Вораг страшны, але мы яму рогі скруцім. Не забывай, у самую цяжкую хвіліну не забывай пра гэта!..

Быццам не былі асабліва дружныя, жывучы ў вёсцы, Іван з Піліпам, кожны быў заняты больш самім сабою, сваімі клопатамі, аднак любілі адзін аднаго браты.

— Бывай, Піліп!

— Бывай, Іван!

І адвярнуліся, кожны ўгнуў галаву, пашыўся ў людскі натоўп, бо баяліся паказаць слязу-здрадніцу, што ўсё ж не выцерпела, выбегла на шчаку.

Ужо сонца ладне зрушыла з паўдня, а спякота не спадала — была ўсё тая ж задушлівая, сухая, зморная. Нават ветрык ніадкуль не павяваў. Млелі высачэнныя таполі ля ваенкамата, млелі, глытаючы ад смагі сліну і абліваючыся потам, і людзі. Мужчыны парасшпільвалі каўнерыкі сарочак, паскідвалі з сябе пінжакі, ватоўкі — хто што захапіў з сабою ў дарогу, адчуваючы, што нялёгкая яна будзе, будуць наперадзе і ядраныя ночы, і зацяжныя абложныя дажджы, і пранізлівыя, дубелыя вятры, халады. З торбамі, закінутымі за плечы, з насунутымі на самыя вочы казыркамі кепак, хадзілі, сноўдаліся сюд-туд, гаварылі адзін з адным, жартавалі, смяяліся, а больш — плакалі. Хто адкрыта, як бабёр, хто бясслёзна, нутрана, па-мужчынску глыбока і нявідна.

Вірыла, не магло супакоіцца людское мора ля ваенкамата ў Ельніках. Ды хіба ля ваенкамата толькі ў адных Ельніках!

Сакратар райкома партыі Раман Платонавіч Багавік прыняў Івана Дарошку і Васіля Кулагу толькі пад самы вечар.

— Выбачайце, таварышы,— папрасіў Раман Платонавіч прабачэння ў Івана Дарошкі і Васіля Кулагі, як толькі зайшлі яны да яго ў кабінет.— Ведаю, чакаеце мяне, але прыняць раней не мог.

Раман Платонавіч быццам яшчэ больш пасівеў, пад вачыма ў яго чарнелі цёмныя кругі. Мусіць, амаль не спаў Багавік начамі. Як і заўсёды, калі да яго заходзілі ў кабі-

нет, ён і цяпер шпарка выйшаў з-за стала насустрач, падаў і Івану Дарошку, і Васілю Кулагу цёплую, шырокую, што лапата, руку.

— Прысаджвайцеся,— паказаў ён на крэслы, што стаялі па абодва бакі вялікага, засланага чырвоным абрусам стала.

Доўгі, здавалася, бясконцы чэрвеньскі дзень канаў. Садзілася, хавалася за небакрай спякотнае летняе сонца, залоцячы пышныя вяршаліны дрэў у парку. Некалькі промняў, прабіўшыся праз густую лістоту, падалі ў акно — залацістая палоска паслалася праз увесь стол; у слупе святла плавалі, мітусіліся серабрыстыя пылінкі.

— Вы, вядома, недавольныя,— гледзячы сваімі карымі, як згусткі мёду, вачыма то на Івана Дарошку, то на Васіля Кулагу, пачаў Раман Платонавіч.— Толькі гаварыце шчыра.

Іван Дарошка і Васіль Кулага паапускалі, як усё адно па камандзе, галовы.

— Чым, Раман Платонавіч, нам быць недавольнымі? — сказаў, як бы ўздыхнуў, Іван Дарошка.

— Ну-у,— не спяшаўся гаварыць Раман Платонавіч,— што райком умяшаўся, не пусціў вас ісці разам з усімі мужчынамі на фронт.

— А чаму нас пакінулі ў распараджэнні райкома? Што гэта значыць, што мы рабіць далей будзем? — Васіль Кулага соп, як кавальскі мех — не прывык ён яшчэ бываць у райкоме, гаварыць з начальствам.

— Чаму вас пакінулі? Э-э, па-першае, не адных вас, а ўсё начальства. Сельсавецкае, калгаснае і раённае. Вайна, на фронце трэба людзі, але і тут, у тыле, таксама ж...

— Дык мы што, на фронт не пойдзем? — насцеражыўся Васіль Кулага.

— Пакуль што не.

— А дзе ж, дзе ж мы будзем?

— Дадому пойдзеце.

— Дадому? Дык нас жа... Што людзі пра нас скажуць?

— Скажуць тое, чаго варты, што заслужылі. Разумныя — зразумеюць, а дурныя... На кожны раток, як кажуць, не накінеш платок. І ты, Іван Мікалаевіч, гэтак думаеш, як таварыш Кулага?

Раман Платонавіч уважліва і доўга глядзеў, не зводзіў сваіх вачэй з Івана Дарошкі, быццам хацеў працяць навылёт сваім позіркам, здагадацца, што той думае, чым жыве.

— Я, Раман Платонавіч, салдат... Салдат партыі... Дзе

мне скажуць быць, там і буду... Што скажуць рабіць, тое і рабіць буду.

— Іншага я ад цябе і не чакаў,— відаць было, Раман Платонавіч узрадаваўся, бо сапраўды хацеў пачуць менавіта такі адказ ад свайго даўняга сябра.

— Вось што, хлопцы,— звярнуўся зусім па-свойску да Івана Дарошкі і Васіля Кулагі Раман Платонавіч, перайшоўшы амаль на шэпт:— Пакуль што... Словам, вайна складваецца не на нашу карысць. Вораг узяў Брэст, Баранавічы, рвецца ў Мінск...

— Не можа быць! — аж прыўзняўся, усклікнуў Іван Дарошка.

— Я сам не веры. Але...

Раман Платонавіч цяжка ўздыхнуў.

— Нашы войскі вядуць жорсткія баі. Без бою не аддаюць ворагу ні аднаго горада, ні адной вёскі. Але вораг моцны, да вайны, адчуваецца, падрыхтаваўся. Мы ж... Бачыце, праводзім толькі мабілізацыю... Перад намі вельмі шмат самых розных задач. Не хацелася б вас насцярожваць, палохаць цяжкасцямі, але... Трэба глядзець праўдзе ў вочы. Пакуль жа нашы войскі, як ні горка ў гэтым прызнавацца, адступаюць. Не выключана, што вораг прыйдзе і сюды, у наш раён...

— Панікуеце, Раман Платонавіч? — не вытрымаў, зноў перапыніў Багавіка Іван Дарошка.

— Я яшчэ раз паўтараю — трэба глядзець праўдзе ў вочы. Добра б, каб не здарылася таго, пра што я гавару. Але ж... Гэта можа здарыцца. І я кажу вам пра гэта, каб вы былі гатовы... Да ўсяго гатовы. І адчувалі сябе ўсюды, куды б вас ні паслалі салдатамі. На фронце цяпер цяжка. Але цяжка цяпер усюды. І ў тыле таксама. Гэта вы адчуеце хутка. Вось Васіль тут,— Раман Платонавіч перавёў свае вочы на Васіля Кулагу,— правільна кажа: «Што людзі пра нас скажуць?» Сапраўды, іншых правялі, на фронт адправілі, а самі асталіся? Значыцца, справамі вам давядзецца даказваць, справамі, дзеля чаго мы тут асталіся. Каб бачылі ўсе, што мы неабходны, наша месца тут, тут...

Раман Платонавіч памаўчаў, падумаў.

— Я не буду далёка наперад заглядваць, гаварыць, што мы будзем і як рабіць... Ну, скажам, праз месяц-два... Пра гэта сёння і гаварыць цяжка, ды і ці трэба. Сітуацыя падкажа сама, што і як рабіць... Спынюся на тым, што мы будзем рабіць заўтра, паслязаўтра...

Раман Платонавіч падняўся, падышоў да Івана Дарошкі

і Васіля Кулагі, стаў ззаду, за спінамі, абняў за плечы, як сяброў, аднаго леваю рукою, другога — праваю. Сказаў:

— Вяртайцеся ў Вялікі Лес, таварышы, дадому. Але не на тую «дому», дзе вы жылі. Правільней, на тую самую «дому», але жыць цяпер будзеце па-новаму. Давядзецца суткамі і не спаць, і не есці. Гэта не лягчэй, чым тым, хто пайшоў на фронт. Вы гэта ўбачыце, адчуеце. Бліжэйшая задача — заўтра-паслязаўтра знайдзіце людзей, падрыхтуйцеся, каб, як толькі мы скажам, вы гатовы былі да эвакуацыі жывёлы — коней, кароў, валоў, авечак... Перш за ўсё калгасных. Далей — складзіце з тых мужчын, што асталіся, падлеткаў і жанчын каманды, якія на выпадак чаго маглі б абяззбройваць варожых дыверсантаў... Скідвае вораг на парашутах такіх. І шмат... Не забудзьцеся — часам пераапранутых у форму чырвонаармейцаў. Ёсць задачы і яшчэ, але пра іх мы пагаворым іншым разам, лепшым часам... Пытанні да мяне будуць?

Былі пытанні ў Івана Дарошкі да сакратара райкома. Але, павярнуўшыся да Рамана Платонавіча і ўбачыўшы, які ён змораны, стомлены, не стаў Іван мучыць добрага сябра сваімі «чаму», «як», «калі» і «што». «Пагавару з Раманам Платонавічам. Можа, адзін на адзін...» — вырашыў Іван. А Васіль Кулага ўсё ж спытаў:

— Раман Платонавіч, а далей, далей з намі што будзе? Ну-у, скажам, як вы гаварылі, тады, як вораг сюды раптам прыйдзе?

— Тады?.. Сітуацыя падкажа, што рабіць. Можа, каго на фронт пашлём, сваіх даганяць... А каго...

Раман Платонавіч — і гэта відаць было — завагаўся: «Казаць ці не казаць?» Усё ж не сказаў, звёў на жарт:

— А каго і далей з жонкай спаць пакінем. Гэта будзе залежаць, хто на што здатны, хто і як пакажа сябе ў гэтыя нялёгкія і для краіны, і для кожнага з нас дні...

Іван Дарошка і Васіль Кулага, адчуваючы, што размова скончана, падняліся з-за стала.

— Поспехаў вам, таварышы! — і Раман Платонавіч, зноў абняўшы за плечы, дайшоў разам з мужчынамі да дзвярэй свайго кабінета і там, паціснуўшы абодвум рукі, развітаўся.

Аставацца начаваць у Ельніках ні Івану Дарошку, ні Васілю Кулагу было і не з рукі, ды і не хацелася. І, паблукаўшы трохі па мястэчку, памеркаваўшы і так, і гэтак, вырашылі яны вяртацца дадому, у сваю вёску.

— Нават лепш цёмначы дахаты прыйсці, чым повідну,— казаў, як бы падсумоўваючы ранейшую гаворку, прыціхлым голасам Васіль Кулага, калі пакінулі павілястыя, крывыя ельніцкія вуліцы, выбраліся на тую шырокую і роўную дарогу, што вяла ў Вялікі Лес.

— Чаму ты так думаеш? — спытаў, спыняючыся, Іван Дарошка.

— Ды бачыць ніхто не будзе, не будзе пытаць, чаму назад вяртаемся.

— Заўтра ўбачаць. І ад пытанняў нідзе не дзенешся...

— Яно-то так,— не то згадзіўся, не то не згадзіўся Васіль і таксама прыпыніўся.— І што ты думаеш казаць людзям?

— Я?.. Я салдат партыі. Дзе партыя лічыць, каб я быў, там і буду...

— А жонцы?

— Жонцы тое самае.

— Э-э,— Васіль нібы папярхнуўся.— І жонка зразумее, нічога не трэба будзе ёй тлумачыць?

— Не ведаю, ці зразумее, але... Калі я так кажу ці раблю — значыцца, так і трэба. Гэта яна засвоіла.

— Добрая, значыцца, жонка.

— А ў цябе хіба не такая?

Васілёву жонку, Полю, Іван ведаў малавата, хоць была яна і свая, вялікалесаўская. Дзічылася яна кампаній, рэдка бывала на людзях, у клуб амаль не хадзіла. І была... Прыгожая, станістая, не ў прыклад астатнім вясковым жанчынам.

— У мяне...— Васіль уважліва паглядзеў сваімі шэрымі задуменнымі вачыма на Івана, быццам абмацаў, хацеў пераканацца, ці можна яму ўсё шчыра даверыць, ва ўсім прызнацца, і сказаў: — І ў мяне дапытвацца ні пра што не будзе. Што скажу — таго ёй і даволі. Але...

— Пачаў, дык гавары,— ціха, амаль па-сяброўску не папрасіў, а параіў Іван.

І зацікаўлена паглядзеў — вочы ў вочы — на Васіля. Быў Васіль заклапочаны, нейкі не такі, як прывык Іван яго бачыць штодня.

— А табе... Няўжо ўсё ясна, нічога не хвалюе?

— Хвалюе, чаму ж, хвалюе. Ты ж чуў — нашы не ўтрымаліся на граніцы, адступаюць. Як магло здарыцца? А я ж... Верыў, што сапраўды ні пядзі роднай зямлі нікому не аддадзім!

— І не аддадзім, Іван!

— Дык жа аддалі!

— Вернем. Аддадзенае вернем,— спакойна, вельмі спакойна, як бы і не было нідзе ніякай вайны, як бы і не адступалі нашы, сказаў, стоячы насупраць, нібы ўрос у зямлю, Васіль.— Гэта толькі цябе хвалюе?

— А цябе, што яшчэ цябе хвалюе? — убачыўшы ў вачах у Васіля не то разгубленасць, не то страх, спытаў Іван.

— Мяне?.. Іншае хвалюе.

— Што?

— Ды хоць бы тое, што... У нехарошую гісторыю мы з табою патрапляем...

Іван Дарошка не зразумеў Васіля.

— Выбачай, але я... Не разумею цябе.

— Не разумееш — зразумееш. Вось пажывём яшчэ — і зразумееш,— гаварыў і далей неяк разважліва, загадкава Васіль.— Усё зразумееш. Трывога ў мяне недарэмная... Я іншы раз словамі сказаць усяго не ўмею, а адчуваць... Адчуваю.

Хоць і жылі Іван з Васілём у адной вёсцы, працавалі разам у сельсавеце, бывалі і неаднойчы адзін на адзін, але неяк не здаралася, каб гаварыць па душах. Івана заўсёды не тое што злавала, а быццам раздражняла марудлівасць у разважаннях Васіля; Васіль занадта доўга як бы перажоўваў тое, што трэба і не трэба, і толькі потым засвойваў, глытаў.

— Ну дык не трымай сваё адчуванне, выкажы,— падахвоціў Іван Васіля.— Раману Платонавічу не хацеў выказаць, дык мне выкажы...

— Яно, маё адчуванне, само сабою выкажацца... Дый... Хіба сам ты не адчуваеш... Вось прыйдзем у Вялікі Лес, але мы ўжо не тыя, кім былі...

— Чаму не тыя?

— Ды таму, што мы ўсім казалі, у галовы ўбівалі: «Вайны не будзе». А яна, вайна, ёсць. Гэта адно.

— А другое?

— Другое... Самі мы... Усе мужчыны нашага веку пайшлі на фронт, ваяваць. А мы... Адседжваемся, хаваемся ад фронту...

«А ён не такі прасцяк, як мне здавалася!» — падумаў пра Васіля Іван.

— Яшчэ што цябе хвалюе?

— Ды хоць бы... Не толькі людзі, а мы самі на сябе пачнём глядзець не так, як глядзелі. Іншыя ваююць, а мы...

Ва ўсіх мужыкі на фронце, некаторыя ўжо і загінулі...

«Глыбока плужыць, чорт! Глыбей, чым я... А маруда ж здаваўся, прасцячок»,— зноў варухнулася ў галаве ў Івана.

— Ну, усё? — ужо не падганяў, а ўважлівей і ўважлівей слухаў Васіля Іван.

— Не, не ўсё... Далей яшчэ непрыемнейшае. Калі немцы сюды, скажам, прыйдуць... Сям'я ў цябе і ў мяне ёсць. Мы — начальства, камуністы. Што немцы зробяць з нашымі сем'ямі, га? Ты думаў пра гэта?

— Не думаў,— прызнаўся Іван.

— І я не думаў да таго, як не пачуў сёння ад Рамана Платонавіча пра адступленне наша. А цяпер вось задумаўся. Не ўсе ў вёсцы намі з табой давольны, тым, што мы рабілі. І на кім злосць яны спагоняць?.. Не трэба быць прарокам, каб сказаць: на нас, на сем'ях нашых.

— Але ж немцы сюды могуць і не прыйсці?

— Могуць... А могуць і прыйсці.

— Калі прыйдуць, тады тое і будзе, тады будзем і думаць.

— Тады позна будзе думаць, Іван. Позна...

Васіль памаўчаў, прыжмурыў вочы, патупаў на адным месцы, дадаў:

— Дый калі не прыйдуць немцы сюды, усё адно нясоладка нам будзе.

— А дзе, каму цяпер соладка?

— На фронце ведаў бы хоць, хто ты і што ад цябе каму трэба. Салдат, як усе... А тут... З аднаго боку — з сям'ёю, жонкаю, быццам — дома... А з другога... Раздзіраць нутро будзе ўвесь час думка: не так, не так жывеш, як усе, не тое, не тое робіш...

— Але ж, Васіль, некаму ж і тое рабіць трэба, дзеля чаго пакінулі нас з табою.

— Разумею, Іван, таму і не супраціўляўся, не прасіўся ў Рамана Платонавіча, каб вызваліў мяне, не пакідаў у вёсцы. Я таксама, як і ты, што скажуць, загадаюць, тое і зраблю. Але думаць, думаць буду. І перад тым, як рабіць, і пасля, яшчэ больш, як зраблю. Я сам разумею — іншы раз не трэба пра сёе-тое думаць, трэба проста рабіць. А не магу, усё адно думаю. Чуў некалі фразу адну я, нельга пра ўсё думаць — мазгі згараць. Але ж і не думаць...

— Думаць, вядома, трэба,— згадзіўся з Васілём Іван.— І недзе ў нечым ты... Правільна, мабыць, разважаеш, перасцярогі твае недарэмныя... Але... Давай пакуль

што ў тое, далёкае, не заглядваць. Падумаем лепш пра бліжэйшае...

— Пра ўсё, пра ўсё, Іван, трэба думаць. І пра бліжэйшае, і пра больш далёкае.

«А ён не прасцяк. Не, не прасцяк,— зноў і зноў думаў пра Васіля Іван.— Шкада, я лічыў яго прасцяком і мала з ім сустракаўся адзін на адзін, мала гаварыў...»

Васілю ж сказаў:

— Будзе ў нас яшчэ час пра ўсё падумаць. І пра бліжэйшае, і пра больш далёкае. Падумаць і пагаварыць.

— Ды ўжо ж,— уздыхнуў, набраў поўныя грудзі паветра Васіль.— Варушыць мазгаўнёю давядзецца. На веру прымаць... Я і раней не вельмі прымаў, а цяпер... Буду яшчэ больш думаць, як думаў...

І першы зрушыўся з месца, пайшоў, павалюхаўся па дарозе. Шэрай шырокай пясчанай дарозе, што праставала, шылася ў асмужаную вячэрнім змрокам, ужо не зялёную, а нейкую няпэўную, амаль сінюю сцяну лесу — над ім яшчэ барвовела, быццам пазяхала, неба: там, дзесьці зусім блізка, толькі што села, схавалася ў касмыль хмары сонца.

Услед за Васілём падаўся і Іван, думаючы, «перажоўваючы» тое, што пачуў ад свайго напарніка, старшыні калгаса. «Дарэмна я мала гаварыў з ім раней, дарэмна. Карысць ад размоў была б. І мне, і яму, і справе, якую мы абавязаны былі рабіць і якую рабілі і, мусіць, будзем рабіць і далей»,— беглі, роіліся ў галаве ў Івана думкі.

## VI

З таго дня, як Сонька, жонка, прынесла ў хату навіну, нібыта пачалася вайна, Гітлер напаў на Савецкі Саюз, не меў спакою Яўхім Бабай. І ўдзень, сноўдаючыся па лесе, і ўночы, прачнуўшыся, думаў і думаў, што і як яму рабіць, каб у дурнях не астацца, галаву на плячах і далей насіць. Ведаў, добра ведаў Яўхім: раней нешта магло зрабіцца і без яго, маглі і забыць, што недзе ёсць, жыве такі чалавек — Яўхім Бабай. А ў вайну ўспомняць, не забудуць. Знойдуць, адшукаюць. Паклічуць, забяруць. Не, не абыдуцца без яго, Яўхіма Бабая, у вайну. І што рабіць будзеш? Давядзецца ісці. А пойдзеш у войска — дык ці вернешся? Добра ж, як толькі скалечаць, знявечаць. Але ж... І забіць могуць. За што, за што забіць? Што ён вельмі меў, каб абараняць, галаву сваю пад кулю падстаўляць? Ніколі нічога асаблівага не з'еў, не знасіў. Жыў, можна сказаць, як даводзіла-

ся. Вечныя клопаты, нястачы. Біўся бы рыба аб лёд. Дрэва якое каму прадасі, дык і то калоцішся: а раптам даведаецца хто ў лясніцтве, рэвізія наскочыць?.. Выкручвайся тады, брашы, што дрэва бура зламала ці ўкраў яго хто, а ты не ўпільнаваў, не ўгледзеў... Абход, маўляў, вялікі, дзе ты за ўсім усочыш. Ты тут, а ў другім баку што хочаш, тое рабі. І красці навучыліся ж: спляжаць дрэва, парэжуць яго, у мох схаваюць. Голле спаляць ці па гусцяжы расцягаюць, па галінцы адной, а пень так замаскіруюць, што міма пройдзеш і не ўбачыш, хіба, можа, толькі спаткнешся... Верыла яму начальства ці не верыла, але на працы трымала. Ды і ніхто не квапіўся на яго, Бабаева, месца. Дзень пры дні на нагах трэба быць, хадзіць і хадзіць. З людзьмі настырняцца, бо кожнаму і палена дроў трэба, і бервяно ў сцяну на хлеў ці хату... А не прывыклі ж людзі купляць, у лесе жывучы. Зловіш — сварыся з чалавекам, акт складай... І хоць бы плата людзячая была. А то... За тыя грошы, што плацяць за леснікоўства, сям'ю не пракорміш. Ды яшчэ такую сям'ю, як у яго, Яўхіма Бабая. Не жыў бы, а кеўляў, каб не прылаўчыўся красці лес, прадаваць яго сяму-таму з палявых вёсак. Але гэта ж заўсёды рызыка — прадаваць дзяржаўнае, як сваё. Ніколі не ўпэўнены да канца ў чалавеку. Ты яму ласку робіш, а ён — змяя падкалодная. Раптам заявіць, паскардзіцца, пісьмо каму напіша? Паспрабуй выкруціся тады!.. Таму ён, Яўхім, і не згаджаўся так з першага слова незнаёмаму чалавеку даваць, што той прасіў, упарціўся доўга, прымушаў сябе ўпрошваць. І не браў адразу ў яго нічога, ніякай платы. Браў, пачакаўшы трохі, калі бервяно клалася ў сцяну, а дровы рэзаліся, каloліся. І то, як ні асцярожнічаў, разы два ці тры «гарэў»... Праўда, гарэў «без дыму» — крычалі на яго, пагражалі з працы прагнаць, але... Не прагналі. Няйнакш, чалавека іншага на прымеце на яго, Яўхімава, месца не было. Дык за што, за што галаву сваю пад кулю падстаўляць? Не, няма дурных! Хай вунь Іван Дарошка ды Васіль Кулага ваяваць ідуць, ім ёсць за што... Яны — партыйныя, ім улада ўсё, усё дала. Што хацелі, тое і маюць. А ён, Яўхім Бабай... Ён ваяваць не пойдзе...

Вопыт хавання ад прызыву ў войска, ад вайны ў Яўхіма Бабая быў. Амаль два гады ж прасядзеў у лесе, у «зялёных»... «Дык то ж малады быў... А цяпер...»

І калі Яўхіму Бабаю прынеслі позву ісці ў войска, ён сказаў жонцы:

— Сонька, торбу ладуй!

— А божа ж мой! — успляснула рукамі без пары раз-бабелая, мусіць, ад частых родаў, Сонька.— На вайну пойдзеш?

Яўхім не прывык з жонкай раіцца, не прывык і казаць, куды ён і чаго ідзе. Таму буркнуў:

— Куды трэба, туды і пайду!

— А я... Як жа з дзецьмі астануся? — загаласіла на ўсю хату гарластая Сонька.

— Як іншыя. Што ты — лепшая хіба?

— У іншых дзяцей меней.

Пастаяўшы ж, падумаўшы, дадала:

— Папрасіўся б, можа б, і не ўзялі цябе на хронт?

— Чаму б ета мяне не ўзялі? — спытаў, зацікавіўшыся, Яўхім.

— Дзяцей у нас багата. Можа б, пашкадавалі іх...

— Чакай, пашкадуюць!.. Малых ніхто не бачыць. А падкармі, вырасці — усім трэба! І мяне не бачылі... А вайна — ідзі, ваюй!

Сонька, абліваючыся слязьмі, сабрала Яўхіму торбу. Палажыла пару споднікаў, кашулю чыстую, лыжку, конаўку, некалькі боханаў хлеба. Знайшла нават штыглік сала. На сенакос ашчаджала, хаваючы і ад дзяцей, і ад яго, Яўхіма, і ад самой сябе.

— Солі, солі болей сып,— раіў Яўхім жонцы, седзячы на лаве і паглядаючы, як жонка ладуе торбу, збірае яго ў дарогу.

— Нашто ж ета табе соль тая? Хіба несалёным карміць у войску будуць? — пытала непаразумела жонка.

— Не тваё дзела, дурная. Знаць вельмі багата ўсяго хочаш. І запалак паболей кладзі... А то, можа... І крэсіва пашукай ды ў торбу ўкінь...

— Ты ж не курыш, нашто табе тое крэсіва?

— Рабі, што кажуць...

Знайшла Сонька даўняе Яўхімава крэсіва. І губу, нарыхтаваную гадоў колькі таму назад, таксама знайшла. Укінула ў торбу і мяшочак з порахам і набоямі для стрэльбы. Усё, усё зрабіла, што казаў, загадваў зрабіць нешматслоўны, буркатлівы муж.

Ноч усю-ўсенькую, як, мабыць, і ўсе жонкі, прарумзала, праплакала Сонька на грудзях у Яўхіма. Хоць і быў ён скупы на добрае слова і ласку, а ўсё ж муж... За яго спіною зацішней, спакайней жанчыне. Калі што якое, ёсць ён, муж. Дый то капейку заробіць, у хату прынясе, то яшчэ чаго... А адной? Як адной дзяцей пракарміць, як жыць?..

Яўхім жа маўчаў, нічога не гаварыў жонцы — думаў нешта адвечнае, сваё. Ды зацята-зацята соп. А ледзь толькі пасвятлела, ноч на золак хіліць пачала, падняўся Яўхім з пасцелі, торбу, стрэльбу на плечы закінуў.

— Ну, я пайшоў,— сказаў змрочна.

— Куды, на хронт? — загаласіла, залямантавала Сонька.

Ад яе крыку папрачыналіся дзеці. Папрыбягалі да бацькі, акружылі яго, таксама пачалі плакаць. На розныя галасы. Адно пішчыць, другое верашчыць, трэцяе румзае.

— Во дурная,— пакруціў галавою Яўхім.— Пярэпалаху толькі нарабіла. Не на хронт я...

Сонька перастала плакаць.

— А куды ж?

— У лес.

— У лес? Што ты рабіць будзеш, у лесе тым?

— Ты не знаеш, а я знаю,— узлаваўся Яўхім: не хацеў нікому казаць, куды ён сабраўся, куды ідзе, а сказаў, прагаварыўся. Няйнакш, плач разжалобіў яго.— Дурная, дык дурное і пытаеш...

І не развітваючыся ні з кім, ні з дзецьмі, ні з жонкаю, нацягнуў на самыя вочы казырок кепкі-шасціклінкі і шмыгануў, бы ўсё адно злодзей, за дзверы.

Жонка, выйшаўшы з дзецьмі з хаты, згледзела неўзабаве, як яе муж Яўхім спрытна перамахнуў ля хлява цераз пералаз у гарод і там, узбіўшыся на сцежку, паволі, як і зазвычай гэта рабіў, пасунуўся, згорбіўшыся, не то ад цяжару торбы і стрэльбы, не то ад думак, сугнеем у лес.

## VII

*З дзённіка Тасі Несцяровіч*

Татачка, вось я і дзевяць класаў скончыла. Можаш мяне павіншаваць, скончыла на «выдатна». Не ўяўляеш, як я рада! І не толькі таму, што здала апошні экзамен, што я выдатніца... Але, татачка, і таму, што сёння мы з мамай едзем дадому, у Мінск, вяртаемся туды, дзе мы жылі і дзе — як нам перадалі — і ты. Дзеля цябе, татачка, мы пакідаем вёску. Бо як жа гэта так — ты там, мы тут. Мама кажа, пагарачылася яна, паспяшалася і з працы звольніцца, і з Мінска, куды вочы глядзяць, уцячы. Баялася, каб нам горш не было. Не ведаю я. І, можа, добра, што не ўсё ведаю. І мама, і я спадзяёмся, верым нават — ты ні ў чым не вінаваты, выпусцяць цябе. Во каб гэта было, во каб ты зноў быў з

намі, каб мы жылі разам, адною сям'ёю, як жылі некалі!

Мама пакуе ў чамадан розныя рэчы, гатуе яду, а я вось села на хвілінку да стала, думаю, хоць з табою пагавару.

Навіна ж якая,— вайна пачалася... З немцамі. Усё ж напаў Гітлер на Савецкі Саюз. У нас тут, у вёсцы, толькі гавораць пра вайну, а так яна зусім не відна. Ціха, мірна, як і раней было. Тое самае, мусіць, і ў Мінску. Калі вайна дзе-небудзь і ідзе, дык на граніцы. Чырвоная Армія — ты гэта ведаеш — моцная, яе ніхто не пераможа.

Татачка, бывай. Мама падганяе мяне, каб я збіралася таксама ў дарогу. А што мне збірацца? Вазьму сумачку, кніжку якую, каб было што чытаць у вагоне,— і ўсё...

Татачка, развіталася я сёння ўжо з табою, думала, і гаварыць больш не буду. А села з маці ў вагон — і сшытак свой дастала.

Людзей у вагоне мала. Маці, калі зайшла, нават не стрывала, сказала: «Мусіць, выдумалі вайну. Можа, яе і няма нідзе. Бо калі б была — у вагон бы не ўбіліся».— «Чаму?» — запытала я. «Ды таму, што людзі ехалі б».— «Куды яны могуць ехаць?» — «Ва ўсе канцы. Хто на фронт, а хто ў бежанцы». Мама жыве старым, яна забыла, што гэта іншая вайна, што ў нас ёсць Чырвоная Армія, яна надзейна абараняе нашы граніцы. І ўцякаць у бежанцы... Навошта? Немцы ж сюды не прыйдуць, каб ад іх уцякаць...

Маці ўкладваецца спаць, кажа, каб і я вачэй не сляпіла, таксама спаць лажылася. А мне ані не хочацца спаць. Усё, здаецца б, сядзела і сядзела, гаварыла б і гаварыла з табою. Занудзілася я па табе, татачка! Можа, таму, што ты ўвесь час быў са мною. Ты мяне і ў школу праводзіў, ты і сустракаў — усё баяўся, каб я пад трамвай ці пад машыну не трапіла. Разам з табою мы і на лыжах каталіся, і на каньках. Мама ж наша... Усё над дысертацыяй карпела, вечна ёй часу не хапала! А помніш, татка, як мы Гогаля, Пушкіна, Лермантава разам з табою чыталі! То ты чытаеш, я слухаю, то я чытаю, ты слухаеш... І нашу, беларускую, паэзію ты надта ж хораша чытаў! Помніш, я казала табе: «Ты б, татка, у настаўнікі пайшоў. Цябе б слухаліся, любілі дзеці».— «Чаму ты так думаеш?» — «А таму, што ты зацікавіць можаш, прывіць любоў да таго, што сам любіш». А ты мне: «А чым кепска доктарам быць? Баліць чалавеку нешта, жыць не дае. А прыйдзе да доктара, той

палечыць — і лёгка, добра, нішто не баліць». Успамінаю часта я твае словы гэтыя. Знайсці б і нам з мамаю доктара такога, каб нас палячыў, каб мы не перажывалі за цябе так, як перажываем. Адчуваю — гэтым доктарам будзеш у нас ты... Вось прыедзем у Мінск, выпусцяць цябе — і нам палягчэе, не будзем мы так хвалявацца, як цяпер хвалюемся...

Аднак жа, мусіць, хопіць. Маці проста сварыцца ўжо на мяне — кладзіся, маўляў, спаць, невядома, што чакае нас... А што можа нас чакаць? Дарога. Высплюся я яшчэ. Ну, ды няхай, не буду злаваць маму...

Татачка, а мама праўду казала мне ўчора: спі, адпачывай. І дарэмна я не слухала яе. Бо... Татачка, о-ё-ёй, вайна ж! Я яе сёння бачыла ўжо. Упершыню бачыла на свае вочы. У-у, страхоцце якое!.. Але раскажу ўсё табе па парадку. Легла я ўчора спаць, пра цябе яшчэ доўга думала. Успомнілася мне чамусьці, як у лес з табою па грыбы мы хадзілі і ты на неруш баравікоў натрапіў і не браў сам, а мяне паклікаў, каб я паглядзела, колькі іх і як прыгожа растуць... А потым яшчэ штосьці прыемнае згадалася, і не помню ўжо што, пакуль не заснула, не закалыхаў мяне вагон. А прачнулася — маці нада мною стаіць. І цёмна-цёмна ў вагоне. Грукат нейкі, аж трасецца, калоціцца ўсё. «Што гэта, мама? — спытала я.— Навальніца?» А яна мне: «Бамбёжка, дачушка». Сказала гэта мама, я тут жа на ногі ўсхапілася. «Дзе бамбёжка?» — і да акна. Зарыва вялікае над лесам убачыла, на паўнеба. А маці, напалоханая, прыхінулася да мяне, шэпча: «Гэта, мабыць, Гомель бамбяць...»

Доўга стаялі мы, нікуды не ехалі, на тым не вядомым нікому прыпынку і глядзелі, як палыхае за лесам зарыва, слухалі, як ірвуцца, выбухаюць бомбы, калоціцца, стугніць зямля. Развіднела, цягнік даў сігнал, рушыў. Але да Гомеля не даехаў. Правадніца прабегла па вагоне, аб'явіла, што далей цягнік не пойдзе — немцы разбамбілі пуці. Мы з маці, ды і іншыя людзі, вохкаючы, плачучы, лаючы фашыстаў, павылазілі з вагонаў, пайшлі ў горад пешкі...

Ой, што бачыла я па дарозе, калі мы з мамаю ішлі спачатку па прыгарадзе, потым па самім Гомелі! Полымем шугалі дамы, па вуліцах імчалі тушыць пажары пажарныя каманды і проста беглі з вёдрамі, рыдлёўкамі людзі. Карэты «хуткай дапамогі», сігналячы, імчаліся туды, дзе гарэ-

ла. Я таксама памкнулася туды, дзе гарэла, але маці схапіла мяне за руку. «Дачушка, нам трэба спяшацца на вакзал. Паехаць адсюль хутчэй! Інакш... Самалёты могуць вярнуцца, пачаць бамбіць».

Толькі, як потым выявілася, найбольш і бамбілі немцы вакзал, чыгуначныя пуці. Дым выядаў вочы, усюды мітусіліся людзі. Беглі хто на вакзал, хто з вакзала. Там, на вакзале, нешта гарэла, хтосьці крычаў, дзесьці галасілі, плакалі...

Маці спыніла нейкага дзядзьку, які знянацку наляцеў на нас, ледзь не збіў мяне з ног, спытала, дзе можна купіць на Мінск білеты.

«Якія цяпер білеты? — зароў немым голасам дзядзька.— На перон бегам прабірайцеся, адтуль якраз цягнік на Мінск адыходзіць...»

Мы з маці сяк-так прабраліся на перон. Але сесці на цягнік... Божа, што рабілася на пероне! Столькі людзей, што не прабіцца да вагонаў. І ўсе з дзецьмі, з клункамі, чамаданамі, мяшкамі...

«Дзе поезд на Мінск?» — пытала ў кожнага маці. Але ніхто толкам нічога не ведаў, ніхто пэўна нічога не мог нам сказаць. Цётка, праўда, адна параіла: «Садзіся, маладзічка, у любы, абы павёз, абы тут не быць. Бо калі наляцяць самалёты...»

Самалёты сапраўды наляцелі. Пачуўся гул, потым роў матораў. Мы з маці цераз пуці кінуліся ратавацца. Адбегліся ў чыйсьці гарод, пападалі ў разору. Я хацела паглядзець, што робіцца там, на вакзале, але маці крыкнула: «Галаву хавай!» І ўпала на мяне, прыкрыла сабою...

Самалёты доўга не бамбілі, хутка зніклі. І мы з мамаю пабеглі да цягніка, які меўся адыходзіць. Людзей на пероне многа цяпер не было. Не было амаль людзей і ў вагоне, у які мы ўскочылі.

«Хутчэй бы ён паехаў адсюль!» — шаптала маці.

І машыніст быццам пачуў нас — даў сігнал, цягнік скрануўся з месца. Да вагонаў беглі людзі, хапаліся за поручні. Але машыніст нікога не чакаў, рушыў, набіраючы хуткасць, са станцыі.

І добра, што ён гэта зрабіў, бо з акон вагонаў мы ўбачылі, як зноў, дзесьці развярнуўшыся, ляцелі на вакзал самалёты. Тры. Пачуліся выбухі, вагоны страсянула, ды цягнік не спыніўся.

Калі мы выехалі з Гомеля і трохі супакоіліся, пачалі пытаць людзі адзін у аднаго, куды ідзе гэты цягнік. Адны

хацелі, каб цягнік ішоў на Маскву, другія — на Кіеў, трэція — на Брэст. А мы з маці хацелі, каб ён ішоў на Мінск. І наша перамагло — цягнік сапраўды ідзе на Мінск.

## VIII

Піліп трапіў у тую самую каманду, што і Мацей Тхорык. Больш нікога са знаёмых у камандзе не было. Астатнія мужчыны былі з саміх Ельнікаў, з іншых навакольных вёсак — Драздоў, Гудова, Рудні, Замошак, Паташні. Таму, калі загадалі разабрацца па двух і пастроіцца, Піліп стаў поплеч з Мацеем — усё ж свой чалавек, сусед. Праўда, калі шчыра прызнацца, не ляжала асабліва душа да Мацея ніколі ў Піліпа Дарошкі. Надта ж Мацей быў, як у Вялікім Лесе казалі, ніцы і заўсёды хацеў здавацца нагата разумнейшым і хітрэйшым, чым быў на самай справе. Нават хадзіў з апушчанай галавою, быццам яна цяжкая ад думак і хітрасці была, аж шыю гнула. Ды і да жонкі Піліпавай, Клаўдзі, Мацей... Вельмі можа быць, што і да жонкі клінні падбіваў. Ці меў які поспех — Піліп з пэўнасцю сказаць не мог, хоць разоў колькі бачыў ля свайго хлява Мацея — той нешта не то вывіжоўваў, не то кагосьці чакаў. Неяк Піліп нават быў спытаў, што робіць ля іхняга хлява Мацей.

— Ды, панімаеш, кура згубілася. Дабрэнная кура, можна сказаць,самая лепшая, то я во шукаю,— адказаў як бы нехаця Мацей. Нічога не сказаў Мацею Піліп, зрабіў выгляд, што паверыў. Ды і што ты скажаш — не злавіў за руку, не заві злодзеем...

Словам, не ляжала асабліва душа ў Піліпа да Мацея. Але выбіраць не даводзілася. Хто са сваёй вёскі, з тым Піліп і стаў у строй.

За начальніка ў іхняй камандзе быў ельніцкі настаўнік Капуцкі, маленькі і рухавы, бы ртуць. Пастроіўшы мабілізаваных, ён аб'явіў: давядзецца ў сваім апранні і па сваёй ядзе пеша дабірацца на другі бераг Дняпра. Там, за Дняпром, іх пераапрануць у вайсковае, дадуць зброю, пачнуць карміць.

— І ў бой? — спытаў са страхам Тхорык.

— Можа, і ў бой,— адказаў настаўнік.— Усё ад абставін будзе залежаць...

— Дык мы ж страляць не ўмеем...

— Прыпрэ, то хутка навучышся. Ці немец цябе, ці ты яго,— адказаў за Капуцкага нехта з мужчын Тхорыку.

З Ельнікаў выйшлі ў той жа дзень. Адмахалі кіламетраў пятнаццаць, робячы праз кожную гадзіну невялікія прывалы-перакуры. У Піліпа нешта надта ж цёр, аж рэзаў пятку, на левай назе бот. І пераабуваўся разоў колькі, на кожным прывале, і анучу з правай нагі пераматаў на левую, а палепшыць так нічога і не ўдалося — бот па-ранейшаму цёр і цёр пятку. Увечары, калі спыніліся ў нейкай незнаёмай прыдарожнай вёсцы начаваць і Піліп разуўся, убачыў трошкі вышэй пяты крывавы падцёк — мазоль.

— Ум,— застагнаў Піліп.— Як жа мне заўтра рушыць у дарогу з такім мазалём?

Тхорык, з якім яны разам і на начлег у адну хату папрасіліся, пакруціў галавою, гледзячы на Піліпаву нагу:

— О-ё-ёй! З такім мазалём ты, Піліпе, далёка не зойдзеш...

Піліп і сам разумеў: ісці яму далей будзе нялёгка. Аднак духам не падаў.

— Разуюся і пайду. Босы.

— Хіба што босы,— і Тхорык загадкава, быццам з намёкам нейкім, засмяяўся.

— Чаму ты смяешся? — аж узлаваўся Піліп.

— Гы-гы,— гыгыкаў Тхорык.— Ваяваць — босы. Ты Капуцкаму мазоль пакажы, можа, не пагоніць цябе далей, дадому пусціць... Гы-гы!

Толькі зубы сцяў Піліп — не хацелася яму сварыцца, псаваць адносіны з суседам, Тхорыкам.

А назаўтра, калі прачнуліся, сапраўды не абуў на ногі Піліп боты, пайшоў на пастраенне босы. Капуцкі, убачыўшы Піліпа босага, сказаў:

— Трэба было ўчора вам, таварыш Дарошка, разуцца.

— Не здагадаўся,— адказаў, хаваючы боты, Піліп.

У гаворку камандзіра з падначаленым умяшаўся Мацей Тхорык.

— Вы б адпусцілі. Хай бы да жонкі вяртаўся. Гы-гы,— не то параіў Капуцкаму, не то пакпіў з Піліпа ён.

Капуцкі злосна зыркнуў вачыма на Мацея Тхорыка і, так нічога не адказаўшы, пайшоў наперад каманды, а Піліп зноў сцяў зубы: зразумеў — з Тхорыкам рана ці позна, а пасварыцца давядзецца.

Ісці босаму, ды яшчэ ў страі, было нязручна. Не відаць, куды ставіць нагу, ды і боязна, каб ззаду хто-небудзь ботам не наступіў на балючы мазоль, не садраў яго. Да таго ж гэты Тхорык... Гыгыкае ўвесь час, на нешта намякае, робіць выгляд, быццам нешта ведае такое, што ведае і

сам Піліп... І Піліп на першым жа прывале папрасіўся ў Капуцкага, каб яму ісці ззаду ўсёй каманды.

— Калі ласка, таварыш Дарошка, калі ласка...— дазволіў Капуцкі.

Наогул, як камандзір Капуцкі быў вельмі абыходлівы, клапатлівы. Не адмаўляў і вады папіць ля калодзежа, міма якога праходзілі, і перакурыць у цяні пад дрэвам, калі тое трапляла блізка ля дарогі. Не дзіва ж — настаўнік, прывык з дзецьмі лагодненька ды добранька ўсё рабіць. Але вольніцы асаблівай не дапускаў, напамінаў часта:

— Таварышы, не забывайце, дзе вы. Парадак павінен быць! Армія трымаецца на дысцыпліне. Дысцыпліне і парадку!

І ў паходзе, і на перакурах мужчыны гаварылі між сабою мала. Мо таму, што былі амаль незнаёмыя, дый кожны толькі што пакінуў дамоўку. Не гаварыць людзям хацелася, а маўчаць — думаць, успамінаць — жонку, дзяцей, вёску, тое, з чым нядаўна раптоўна рассталіся...

І Піліп, ківаючыся поплеч з Тхорыкам, толькі зрэдку перакідваўся з ім словам. Пасля ж таго, як Капуцкі дазволіў яму прыстроіцца ў самы канец каманды і Піліп апынуўся поплеч з высокім і худым, што жэрдка, насатым чалавекам (чалавек гэты нечым нагадваў знешне Юліка Бязмена), ён і зусім цалкам аддаўся развагам пра дамоўку — паплыў, паплыў, быццам па рацэ, на хвалях успамінаў у сваю вёску.

«Што цяпер там?»

Бацька, канечне, куёўшыцца, як курыца на сметніку, на гаспадарцы. То плот папраўляе, то дровы сячэ і складвае ў паленніцу ля хлява, то разам з Хораю ў гародзе бульбу акапвае, грады поле. Гэты работу сабе заўсёды знойдзе... Знойдзе, чым яму заняцца, і Косцік. А Клаўдзя? Што тая робіць? Будзе, вядома, хадзіць, як і хадзіла раней, на працу ў калгас. А вечары, ночы? Пры ім, Піліпу, яна злыгвалася з іншымі мужчынамі. А цяпер, калі яго, Піліпа, дома няма? Воля бабе, куды хочаш, туды і ідзі...

Аж скрыгатнуў зубамі Піліп, ды так, што вісус, які ішоў, ківаўся збоку, прамовіў са спачуваннем:

— Што, нагу ўразіў — баліць?

Піліп не адказаў, толькі яшчэ больш унурыў галаву ў плечы. Падумаў сабе:

«Хай з кім хоча, з тым і злыгваецца, ліха з ёю. Вочы мае нічога не будуць бачыць, вушы нічога не будуць

чуць... Дый... Вельмі не паблудзіць... Няма з кім. Пазабіралі ж мужчын у войска...»

Але праз хвіліну засумняваўся, не пагадзіўся з апошнімі сваімі думкамі.

«Такая знойдзе. Другая, можа б, не знайшла, а Клаўдзя... Ого, каб такая ды не знайшла. З-пад зямлі выкапае, дастане...»

Паліла, аж апякала вушы, сонца, пыліла, пыліла палявая дарога. Пыл лез у вочы, скрыпеў на зубах, асядаў на шыі, руках, твары. З-пад шапкі ручаямі цёк, ліўся пот. Даймала, мучыла смага. Але ісці ўсё адно трэба было. І мужчыны, пасядзеўшы на ўзбочыне пад дрэвам ці проста на траве, зноў падымаліся на ногі, зноў ішлі і ішлі. Ішлі міма пасаджанай роўнымі радамі і ўжо абагнанай па другому разу бульбы, міма зялёнай, рослай, месцамі паклычанай ветрам і палёглай збажыны — жыта, ячменю, аўса. Ішлі, добра не ўяўляючы, куды і чаго, не ведаючы, што чакае іх наперадзе, там, куды яны ідуць...

## IX

Пасля таго прыкрага вечара, калі ён, Косцік, пабіў акно ў хаце старога Куляша, калі трымаў ужо быццам за рукі Тасю, калі мог сказаць ёй усё, што хацеў, і не сказаў нічога, ён зненавідзеў сябе. Размова з братам Іванам, пагроза Веры Сымонаўны перадаць яго, Косціка, у суд трохі... не тое што напалохалі, а неяк быццам насцярожылі, астудзілі хлопца.

«Ліха яго ведае, так і да турмы недалёка»,— падумаў пра сябе Косцік.

Праца на заводзе ў Гудове яму не падабалася. Мо таму, што была яна аднастайная, не патрабавала ніякай развагі, выдумкі. Качай і качай бярвенне. Адно парэжуць, падавай другое. «Дзеля чаго я ў школе столькі гадоў вучыўся? Каб калоды качаць?» — думаў іншы раз, ідучы з Гудова ці ў Гудоў, Косцік. Але... Іншага нічога не аставалася, як качаць і качаць бярвенне. Бо байбусаваць, проста так без дай прычыны блукаць па вуліцы, лайдачыць... Не, ні бацька, ні Іван не дазволілі б...

Кузя, Ігар і Эдзік не забывалі на Косціка. І ў абед, і ўвечары падыходзілі да яго, даставалі з кішэні карты.

— Ну як, згуляем сёння? — пыталі яны.

Косцік патупліваў у зямлю вочы, нічога не адказваў. Хацелася, ой як хацелася яму згуляць хоць раз, яшчэ

хоць раз у ачко. І не проста згуляць, а выйграць. Каб не яны, збрады, з яго смяяліся, а ён, Косцік, з іх... Але... У кішэнях у яго гуляў вецер, не было ні капейкі. Прасіць у бацькі... Не, не будзе ён, Косцік, прасіць болей грошай у бацькі. І так лёгка яшчэ выкруціўся за тыя, што на шапку бацька даваў, а ён, Косцік, у карты прайграў. Сказаў, што згубіў, і бацька... Паверыў. А мо... Выгляд зрабіў, што паверыў...

— Баязлівец,— кпілі і разам з тым падзадорвалі Косціка новыя сябры.— Зайчык... Кролік...

«Пачакайце, я пакажу вам, хто я!» — марыў-пагражаў у думках Косцік.

А аднавясковец Саўка Лапаць, які таксама працаваў на пілараме, неяк узлаваўся.

— Кыш адсюль, абармоты,— прыкрыкнуў ён на прыставал.— Прычапіліся ўжо! Хлопец, можа, чалавекам стаць хоча, а вы... Куды яго цягнеце? У яму?!

Запісак Тасі Косцік больш не пісаў. Перастаў ён і ля акна стаяць штораніцы, каб убачыць, як Тася будзе ў школу ісці. Пачаліся ж экзамены, і Тася хадзіла ў школу ўжо не кожны дзень. І яму, Косціку, трэба было снедаць ды спяшацца ў Гудоў, каб не спазніцца, у час заступіць на змену. Дый... Неяк не па сабе, непамысна было на душы пасля ўсяго, што адбылося.

«Дурань, абэлтух я,— упікаў сябе Косцік.— Не ўмею нават з дзяўчынаю пагаварыць...»

Неаднойчы шчымела ў Косціка ў грудзях, неаднойчы хацелася забыцца на ўсё і пабегчы да хаты старога Куляша. Хоць бы, здаецца, здаля паглядзець на Тасю, адным краёчкам вока... А раптам і яна ўбачыць яго, Косціка, раптам даруе ўсё, загаворыць... О, якое б гэта было шчасце, якая радасць!

Але ён, Косцік, пераадольваў у сабе гэтае жаданне, не ішоў за грэблю, на Замосце. Чаму — ён і сам не мог сказаць. Ці то не дазваляў яму гонар, ці то іншае што кожны раз стрымлівала яго. «Дый, урэшце,— думаў ён,— хай і Тася надта не задаецца. Дачка настаўніцы, дык і заважнічала, нос задрала...»

Пачалася вайна, і ён, Косцік, нібы абнавіўся, ажыў, скінуў з сябе той цяжар, што давіў, гнёў яго, стаў зноў тым Косцікам, які быў і да таго, як выключылі са школы. Сіла, спрыт так і пёрлі з яго. На заводзе, у Гудове, ён рабіў усё, што яму ні загадвалі. Памагаў у гаспадарцы і дома, бацьку. Ахвотна памагаў, без прынукі. І ў магазін з

бацькам і Піліпам у першы дзень вайны Косцік з радасцю хадзіў. І быў там надта ўзбуджаны, паказаў бацьку і брату Піліпу, на што ён здатны. Вырваць у кагось што, схапіць ці пралезці туды, куды не кожны пралезе,— гэта, як здалося Косціку, яго стыхія. Бацькава пахвала натхніла Косціка. «Пачакай, тата, я яшчэ і не тое магу»,— думаў Косцік. Адзінае, пра што Косцік шкадаваў, дык гэта — што яго спрыту, яго ўменне пралазіць туды, куды, здавалася б, ніхто не пралезе, не бачыць Тася. «Калі б яна ў магазіне была, калі б мяне бачыла! Можа б, і яна падабрэла, гнеў змяніла на літасць...»

Так, у працы, роздумах-развагах, і ішлі, мiналі за днём дзень, за днём дзень...

Пра тое, што Вера Сымонаўна забрала Тасю і кудысьці паехала з Вялікага Лесу — ці не назад у Мінск,— Косцік даведаўся пазней за іншых. Даведаўся выпадкова. Ён, Косцік, правёўшы разам з усімі на фронт мабілізаваных, развітаўся з братамі Піліпам і Іванам і сумны, маркотны, як і ўсе ў той дзень былі, вяртаўся ў вёску. І напаткаў зусім выпадкова свайго аднакласніка Юрку Раманюка — у Юркі ніхто на фронт не ішоў, бацька яго быў белабілетнік, але ён, гэтак як і большасць падлеткаў, быў таксама на провадах, за вёскаю.

— Ну, як ты? — спытаў у Косціка Юрка, спытаў, як падалося Косціку, не таму, што яго гэта надта цікавіла, а каб не маўчаць, нешта сказаць.

— Я?..— спахапліва адказаў Косцік.— Нічога, на заводзе ў Гудове працую. А ты?

— Я экзамены толькі што паздаваў.

— І як? На пяцёркі?

— Цяжкія сёлета экзамены,— заківаў стрыжанаю галавою Юрка.— Ніхто з нашых на пяцёркі не паздаваў. Адна Тася Несцяровіч... Ды яе нашай і не назавеш. Прыехала і паехала.

— Куды паехала? — аж рот разявіў ад нечаканасці Косцік.

— Ф'ю-ю,— свіснуў Юрка.— А ты і не ведаў? У Мінск паджгала. Вайна пачалася, дык і паджгала.

— Не можа быць, брэшаш! — не паверыў Косцік.

— Што я, сабака, каб брахаць,— пакрыўдзіўся Юрка.

І не стаў больш ні пра што расказваць, гаварыць з Косцікам. Завярнуўся і пайшоў адзін дадому. А Косцік, пастаяўшы і падумаўшы, усё ж не паверыў Юрку.

«Пакпіць, няйнакш, з мяне захацеў. Аднекуль, мабыць, пачуў, што неабыякавы я да Тасі. І цвеліцца...»

Дайшоў да Куляшовай хаты, сеў насупраць на лавачку. Доўга глядзеў на выбітае, прыкрытае кавалкам фанеры акно — верыў і не верыў, што Тасі няма ў Вялікім Лесе, паехала яна.

«Няўжо Юрка не зманіў, праўду сказаў?»

Куляшоў двор быў абгароджаны невысокім, рэдкім, месцамі падгнілым і паламаным штакетнікам. З вуліцы двор праглядаўся ўвесь, аж да самага поплава. У двары раскашоўвалася бульба, плёўся гарбузнік, лапушылася некалькі каліўяў сланечніку. Пад старою галлістаю яблыняй — з дрэў яна адна расла ў гародзе — у пяску капашыліся, кешкаліся куры. Ад яблыні да хлява была працягнута вяроўка — на ёй, мабыць, вешалі сушыць на сонцы памытую сваю апратку Вера Сымонаўна і Тася. Бліжэй да хлява, на трасочніку, зеляне́ў тытунь — стары Кулеш курыў яшчэ, таму садзіў штогод тытунь. І не проста тытунь, а мультан — курцы казалі: такога духмянага і моцнага тытуню, як у Куляша, ні ў кога ў Вялікім Лесе няма. «Бо вяліць, сушыць умее!»

З гадзіну праседзеў Косцік на лавачцы насупраць Куляшовай хаты — старой ужо, з'едзенай шашалем, пакрытай парослым зялёным мохам чаротам. Ды ўпэўніцца, праўду казаў яму Юрка ці маніў, так і не змог.

«Мусіць, такі праўду. Бо выйшаў бы хоць хто з хаты на падворак. А то... Ніхто не выходзіць, не паказваецца нават».

Паволі пабрыў дадому, адчуваючы, як трацішца цікавасць да ўсяго, чым дагэтуль жыў, што яго радавала, мучыла, хвалявала. Быццам забраў, украў у яго хтосьці нябачны гэтую цікавасць, панёс невядома куды.

«Чаму б гэта? Няўжо, што Тася паехала?.. А мо што Піліп, Іван на фронт пайшлі?..»

Бацька быў дома — чакаў Косціка, каб абедаць...

— Дзе ета ты валочышся? — спытаў ён у сына, калі той пераступіў парог хаты. Спытаў не строга, не злосна.

— А што, хіба я трэба? — падняў вочы, паглядзеў спадылба на бацьку Косцік.

— Не, не таму пытаю... Проста сказаць хачу — адзін ты ў мяне астаўся. Адзін. Было трое, а цяпер ты адзін...

— Ну дык і што? — не зразумеў бацькі Косцік.

— Нічога...

Бацька, мусіць, пра нешта сваё думаў, хацеў паведаміць Косціку важнае, тое, што яго клапаціла, хвалявала. Але да Косціка тое важнае, бацькава, што той хацеў сказаць, не дайшло.

Хора дастала з печы чыгун, наліла ў міску шчаўе.

Бацька з сынам моўчкі селі за стол абедаць.

## X

Васіль Кулага быў не з тых людзей, якія прымаюць усё, што б ім ні сказалі, на веру. Пачуўшы пра што-небудзь, ён гадзінамі, а то і суткамі думаў і думаў, пакуль не пераконваўся, дзе праўда, а дзе мана, так, толькі так трэба было тое рабіць ці... Ці можна было б паспрабаваць зрабіць інакш. Дзіваваўся іншы раз з Івана Дарошкі, як той лёгка і хутка, ані не сумняваючыся, пагаджаецца ці не пагаджаецца з кім-небудзь, бярэцца рабіць адно і адкідвае як непатрэбнае, няслушнае другое. Яму, Васілю, перш чым прыняць нейкае пэўнае рашэнне, патрэбен быў час. Час на роздум. Працуючы ў сельсавеце сакратаром, ён нікому ніякай паперкі вось так, з ходу, з першага разу не даў на рукі, не падпісаў. «Добра, добра,— бывала, скажа ён таму, хто ў яго нешта просіць.— Прыйдзіце заўтра, я сам падумаю і з начальствам параюся...» І думаў сам, раіўся з начальствам — хадзіў да Івана Дарошкі. Таго на пачатку іх сумеснай працы злавала непаспешлівасць, а то і марудлівасць, залішняя перасцярога сакратара. «Мог бы мне пра гэта і не дакладваць»,— казаў ён Васілю. Але паступова Іван Дарошка прывык да Васіля, убачыў, мусіць, нават карысць у такіх радах-узгадненнях — ён як старшыня сельсавета заўсёды ў курсе ўсіх падзей, ведае, што каму з людзей трэба, што каго хвалюе. Ды пасмейвацца, нязлосна кпіць з Васіля не пакінуў. Гэта і аддаліла іх, не давала сысціся бліжэй, пасябраваць. І разам з тым... Доўгае жыццё ў адной вёсцы, праца ў сельсавеце з'яднalі іх, яны ўжо не маглі абысціся адзін без аднаго. Асабліва Васіль прывык да Івана. Нават калі старшынёй калгаса выбралі, не мог прыняць ні аднаго рашэння, не параіўшыся з Дарошкам. Мо таму, што ведаў: Іван Дарошка сябруе з сакратаром райкома партыі Багавіком і ўзгодненае рашэнне з Іванам Дарошкам набывала як бы ўзгадненне і з сакратаром райкома. Дый цяжка было яму, Васілю Кулагу, былому сельсавецкаму работніку, кіраваць калгасам. Ён і не хацеў,

не згаджаўся нізашто ісці старшынёй. Але райкому патрэбен быў чалавек. Калгас не мог быць без старшыні. Той жа, што быў дагэтуль, Рыгор Бяда, папрасіўся вызваліць яго ад пасады, граматы малавата ў чалавека, ды і стары, гады бралі сваё. І Васіля не тое што ўгаварылі, а проста паставілі, і ўсё. Не, дэмакратыя была захавана — правялі сход, рэкамендавалі калгаснікам, калгаснікі за Васіля прагаласавалі, нават паапладзіравалі даволі дружна — маўляў, як жа, ведаем яго, свой чалавек. Але Васіль Кулага нібыта і крыўду затаіў на Івана Дарошку: «Выжыў з сельсавета, быццам я яму замінаў».— «Людзі павінны расці. А то што ж палучаецца — усё жыццё праседзіш у маіх падначаленых. Ідзі на самастойную работу. А раптам талент кіраўнічы ў цябе прарэжацца. Калгасу выгада, а табе слава»,— казаў Іван, угаворваючы Васіля ісці на павышэнне. Васіль жа лічыў, што ён сваёй марудлівай непаспешлівасцю надакучыў Івану і той папросту захацеў ад яго пазбавіцца. І крыўдаваў на Івана Дарошку ў глыбіні душы, хоць выгляду і не падаваў. Вайна, размова з сакратаром райкома Багавіком, тое, што ўсіх мужчын з Вялікага Лесу мабілізавалі, а іх з Іванам Дарошкам пакінулі дома,— усё гэта не тое што зблізіла, а нават здружыла Васіля з Іванам. Не праходзіла і дня, каб яны не сустрэліся, не пагаварылі, не абмяняліся навінамі. Цяпер ужо не толькі Васіль Кулага заходзіў да Івана Дарошкі ў сельсавет, а Іван часцяком наведваўся ў кантору да старшыні калгаса.

— Ну як ты? — звычайна пытаў Іван у Васіля.— Прывыкаеш?

— А дзе ты дзенешся,— адказваў той.— Да чаго толькі чалавек не прывыкне! І да старшынства я прывык, і да таго, што вайна ідзе... Можа, чуў, што там, на фронце?

Газеты ў Вялікі Лес ужо не прыходзілі. Не прыходзілі і пісьмы. Радыёпрыёмнік так і не працаваў — ніхто нідзе не мог дастаць батарэй. Добра, што была яшчэ сувязь з Ельнікамі і Іван зрэдку пазваньваў у райком, каб даведацца, дзе што робіцца, пачуць хоць якое слова пра тое, што там, н а в а й н е, на фронце. Раман Платонавіч Багавік нічым усцешыць свайго даўняга сябра не мог — немцы наступалі, нашы войскі стрымлівалі іх, вялі цяжкія, крывапралітныя баі. І Іван Дарошка пераказваў Васілю Кулагу, што чуў ад сакратара райкома.

— Павінен жа ў вайне перералом быць! — упэўнена казаў Васіль Кулага.— Не можа такога быць, каб Гітлер нас пабіў!

— І я так думаю,— ківаў галавою Іван Дарошка.— Аднак жа, бачыш... Адступаюць пакуль нашы...

Васіль пахудзеў за гэтыя дні. Твар яго завастрыўся, і без таго вялікі нос быццам яшчэ пабольшаў; на лобе ляглі складкі-барозны, якіх Іван раней не заўважаў у Васіля. І вочы гарэлі ўвесь час нейкім незразумелым агнём. Хапала, хапала Васілю работы ў гэтыя дні. Трэба было арганізаваць нарыхтоўку сена, скасіць і застагаваць лугі. У калгасе была толькі адна конная касілка, ды і не пусціш яе касіць у куп'істае балота. Усіх, хто толькі ўмеў касіць — падлеткаў, дзядоў, жанчын,— паставіў на ногі Васіль. Ды справіцца з сенаваннем, з той работай, з якой ледзь спраўлялася вёска ў тыя гады, калі дома былі ўсе мужчыны, не мог калгас. І Іван Дарошка з'ездзіў у Гудоў, арганізаваў нядзельнік — усе рабочыя завода і чыгуначнай станцыі, якіх не забралі на фронт, прыйшлі на балота. І касілі, і граблі, і копы зносілі, і стагі кідалі. Якраз і з надвор'ем пашанцавала — сухі, цёплы, сонечны выдаўся дзянёк. Так што дзякаваў, вельмі ж дзякаваў Васіль Кулага гудоўцам, а заадно — і Івану Дарошку.

— Што б я без цябе рабіў? — гаварыў, прызнаваўся Васіль Кулага Івану.— А так... Калі што якое — іду да цябе...

— Кінь,— аднекваўся Іван Дарошка.— Адну ж справу робім, дзеля таго нас і пакінулі тут, каб працавалі...

— Але ж калгас у цябе не адзін. І ўсюды ўвага твая трэба.

— І астатнім калгасам я памагаю чым магу. У «Сейбіце» сход агульны днямі правялі.

— Сур'ёзнае што?

— Ды не, сенаванне раней за іншыя калгасы скончылі. Упершыню за ўсю гісторыю. Хацелася павіншаваць людзей, падахвоціць...

— З сенам і мы так-сяк справіліся,— радаваўся Васіль.— Але ж і жніво не за гарамі...

— І са жнівом управімся,— упэўнена гаварыў Дарошка.— Людзі, як шчыруюць людзі! Што ні скажы — зробяць.

— Ага,— згаджаўся з Іванам Васіль Кулага.— Проста аж дзіву даешся. Усе такія панятлівыя, разумеюць з паўслова... Не тое, што было. Па падваконню бегаць не трэба.

— А ты ж баяўся. Помніш, як з Ельнікаў дадому вярталіся... Гора людзей яднае...

— І раз'ядноўвае,— сумна ківаў галавою Васіль, намякаючы на тое, чаго Іван не разумеў.

— Пра што ты? — пытаўся Іван Дарошка.

— Ды ўсё пра тое ж. Як ты, а я сваіх людзей добра ведаю. Надта ж легкаверныя ёсць сярод іх. І недавольныя...

— Чым недавольныя?

— Ці мала чым?.. Калгасам. Намі з табой. Крутавата мы абыходзіліся з некаторымі. Чуць што не па-нашаму — пагражалі, а то і раскулачвалі, высылалі.

— А што было рабіць? — Іван аж злаваўся.— Ім як лепей хочаш. А яны... Нібы тыя валы — занатурацца, і хоць што з імі... Іх у рай вядзеш, а яны думаюць — у пекла...

— Яны сяляне. Цёмныя, непісьменныя. Іх не прымушаць, а пераконваць трэба.

— Дык жа пераконвалі! Сходаў колькі правялі!

— Не сходамі іх трэба пераконваць.

— А чым жа?

— Іншым. Калі калгас выгада, то каб кожны бачыў, што гэта выгада. І сам папрасіўся. А мы спяшаліся, нам абы хутчэй... Беднякі пайшлі, дык мы серадняка падганяць узяліся. «Давай стопрацэнтную калектывізацыю!» — і конча. Далі. І што?..

Іван Дарошка ўсміхаўся.

— Паслухаеш цябе, Васіль, дык ва ўсім усумнішся, нават у тым, у што верыў і верыш. Рэвізіяніст ты!

— А ведаеш, што і Маркс у сім-тым сумняваўся. І Ленін. Дзякуючы таму, што сумняваліся яны ў тым, што створана было да іх, і нарадзілася тое — а ці нельга зрабіць нешта інакш, ці нельга жыць па-другому?

— Бывае, думаць няма калі — рабіць трэба.

— І я таксама раблю іншы раз гэтак жа, як і ты, добра не падумаўшы. На жаль. А потым падумаю і бачу: можна было зрабіць інакш, паспяшаўся...

— Так, Васіль, было і будзе. Усяго ніколі не прадбачыш і не ўлічыш. Робячы нешта, здараецца, і не так зробіш. Не памыляецца той, хто нічога не робіць.

— А калі памылка на памылцы? Дый... Ці на дабро ўсё тое, што мы рабілі?..

— Пра што ты?

— Ды і пра калгасы гэтыя... І пра ўсё астатняе... Жылі людзі стагоддзямі, няхай бы і жылі... Дык мы перарабіць усё захацелі... На свой лад... Цара скінулі, разбурылі

царкву, веру ў бога знішчылі... А ўзамен... Што далі ўзамен?..

— Гм,— насупліваўся Іван.— Што было, тое было — не пераробіш. Ды і пра іншае сёння думаць трэба. Вораг жа, акупант на нашай зямлі, Радзіма, народ у небяспецы...

Гутаркі-спрэчкі між Васілём Кулагам і Іванам Дарошкам канчаліся заўсёды мірна. Ад агульных разважанняў звычайна пераходзілі да больш канкрэтных, надзённых спраў.

— Ну, падабраў ты людзей гавяду гнаць?

— Думаеш, усё ж давядзецца яе гнаць? — пытаў у сваю чаргу ў Івана Васіль Кулага.

— Казаў жа Раман Платонавіч, каб гатовы былі.

— Дык мы і гатовы. Хомка, думаю, не адмовіцца...

— Аднаго Хомкі мала.

— Жанчын падбяром.

— У жанчын — дзеці.

— А мы бяздзетных. Клаўдзю, скажам, тваю братавую, яшчэ сяго-таго пашукаем. Камсамольцаў, моладзь...

— Ты гаварыў з кім-небудзь пра гэта?

— Не, навошта ж паніку сеяць. І так прайдзіся па вёсцы — чаго толькі не пачуеш. Радыё працуе.

— Якое радыё? — насцярожваўся, цікавіўся Іван Дарошка.

— Бабскае. І ведаеш, мы вінаваты, што далі прастор гэтаму радыё. Трэба было ўсё ў свае рукі ўзяць.

— Як ты што возьмеш у свае рукі, калі мы самі нічога не ведаем. Дый тое, што на франтах робіцца, не суцешыць нікога. Наадварот.

— Усё адно ад людзей праўды не схаваеш. Так бы яна ішла ў нашым вытлумачэнні, савецкім. А так яна ідзе... Сам ведаеш... Іншы раз нават у варожым. Хто што хоча, тое і плявузгае.

— Сход хіба сабраць?

— Можна і без сходаў... Зводкі з фронту хоць бы дзе вывешваць. Хай бы чыталі людзі, ведалі...

«А ён, Кулага, з галавой! — адкрываў новае і новае для сябе ў Васілю Іван Дарошка.— Толькі чаму ён цяпер так язык развязаў, гаворыць са мной, раіць. А тады, як працавалі разам у сельсавеце, маўчаў. Дакладзе, што трэба, паслухае маю думку — і ўсё».

Неяк, калі былі ўдвух, Іван спытаў у Васіля:

— Слухай, а чаму ты раней нічога мне не раіў, маўчаў?

— Калі — раней?

— Ды як працавалі разам. У сельсавеце.

Васіль скрывіў губы ў мілай дабрадушнай усмешцы.

— Шчыра сказаць табе?

— Вядома, шчыра.

— Баяўся раскрывацца, баяўся гаварыць, што я думаю.

— Чаму баяўся? Не верыў? Мне не верыў?

— Табе-то я верыў. Але...

Васіль памаўчаў.

— Ну-ну, што ў цябе там за «але»?..

— Былі хвіліны такія, калі і сам сабе іншы раз не верыў. Асабліва, як раскулачванне ішло... Ды і потым... Ворагаў жа ўсюды шукалі. Як толькі зрабіў што не тое ці сказаў, так і вораг.

— А цяпер хіба змянілася што?

— Яшчэ і пытаеш, быццам не ведаеш,— трос і трос кудлатаю вялікаю галавою Васіль Кулага.— Мы з табою, можна сказаць, удвух асталіся. І што нас чакае наперадзе — адзін бог ведае. І таму не маем права памыляцца. Бо памылка — смерць!..

## XI

*З дзённіка Тасі Несцяровіч*

Татачка!

Мы ў адчаі. Маці кажа: ці не вярнуцца нам назад, у Вялікі Лес? Я не згаджаюся, цверджу сваё — нам трэба дабірацца ў Мінск, бо там — наша дамоўка, там — ты...

Мы ўжо даўно не едзем, а ідзём. Той цягнік, на якім мы ўцяклі з Гомеля, некалькі разоў бамбілі, абстрэльвалі нямецкія самалёты. Амаль у кожным вагоне забітыя, параненыя. У нашым — загінула правадніца. Куля трапіла ёй у галаву. І правадніца ляжала ў тамбуры на праходзе, пакуль яе, акрыўшы белым прасціradлам, не вынеслі на нейкай станцыі. Правадніца была маладая, светлавалосая, з яснымі блакітнымі вачыма. Перад гэтым яна бегала па вагоне, жартавала, смяялася, супакойвала тых, хто ўпаў у паняверку, спалохаўся вайны. І раптам... Яе няма, мёртвая. Страшна! Ды тады, калі ў нашым вагоне забіла правадніцу, мы ўсё ж, нягледзячы на бамбёжку, абстрэлы з самалётаў, ехалі. Не так, як раней,— гадзінамі стаялі на станцыях і нават у полі, але ехалі. І калі спыніўся цягнік зноў — каля лесу, пры выгінастай, пятлястай рэчачцы, мы пачалі выглядваць з акон — што здарылася, чаму цягнік спыніўся? Некаторыя павыходзілі з вагонаў. Выявілася — наперадзе

разбураны мост. Машыніст, чыгуначнікі, сабраўшыся разам, пачалі раіцца, што далей рабіць. І тут... З лесу, што быў насупраць мастка, па нашым эшалоне застрачылі з кулямётаў і аўтаматаў. Усе, хто быў у вагонах і ля вагонаў, кінуліся ўцякаць. І мы з маці таксама пабеглі. Не ў той бок, дзе быў лес, а ў другі, дзе была пасаджана радамі бульба, было поле і куды беглі ўсе людзі. Натрапілі на дарогу, па ёй дабрылі да шашы. Да цягніка ніхто ўжо не вяртаўся. І мы з маці таксама не вярталіся. Па шашы бясконцым патокам ішлі людзі. З клункамі, дзецьмі. Сёй-той ехаў на падводзе, гнаў паперадзе сябе карову. Мы з маці таксама ўліліся ў гэты паток. Калі звечарэла, пачало цямнець, мы хацелі спыніцца, дзе-небудзь пераначаваць. Але тыя людзі, з якімі мы ішлі, не параілі рабіць гэта. Бо, як нам сказалі, удзень шашу абстрэльваюць і бамбяць самалёты. Да таго ж па людзях адкрываюць агонь парашутысты і дыверсанты, якіх наскідвалі ўсюды з самалётаў немцы. Так што вельмі можа быць, што і цягнік наш затрымалі тыя ж парашутысты-дыверсанты. Вось як, татачка! Таму ўсю ноч мы ішлі і ішлі. Пастамляліся — ледзь ногі валаклі. І згаладаліся-згаладаліся. Мы ж, калі ўцякалі з вагона, сумачку з ядою з пярэпалаху забыліся захапіць. Уранні, як толькі пачало днець, і сапраўды наляцелі на нас самалёты. З-за лесу. Нізка-нізка апусціліся над шашою: я нават лётчыка ўбачыла ў адным. Праляцелі далей, мы думалі, нас не зачэпяць. Але праз якую хвіліну самалёты вярнуліся. І пачалося такое, што і расказаць не ведаю як табе. Апусціўшыся ледзь не на самую шашу, самалёты касанулі па нас з кулямётаў. Мы кінуліся хто куды, урассыпную. Маці пабегла ў адзін бок, я ў другі. Упала ў нейкі раўчук, закрыла вочы рукамі і ўнурылася, ушылася ў зямлю. Пачулася некалькі выбухаў, як пасля казалі — самалёты скінулі на шашу не то невялікія бомбы, не то гранаты...

Праўда, самалёты доўга не віселі над шашою, неўзабаве паляцелі. Я ўсхапілася на ногі, пабегла шукаць маці. І ўбачыла распластаных на шашы і паўз шашу людзей. Мужчын, жанчын, дзяцей... Яны былі параненыя ці забітыя. Тыя, хто быў паранены, крычаў, енчыў, плакаў... Асабліва жанчына адна, міма якой я бегла і якой куля пацэліла ў нагу. «Памажэце, людцы добрыя, памажэце...» Падбегла я да жанчыны, а там, сярод іншых людзей, і мама. Мы плакалі абедзве, радыя, што нас не зачапілі кулі, што мы жывыя. Схіліліся над жанчынай параненай, узя-

ліся перавязаць ёй нагу. Маці падрала сваю кашулю, бінтавала рану. Але кроў не спынялася, аж свістала... Мы не ведалі, што рабіць. Да нас падышлі яшчэ людзі, адзін дзядзька нагнуўся над параненай, вяроўкай перацісну ў нагу. Не ведаю, удалося спыніць кроў ці не, бо ў гэты час з-за лесу зноў вынырнулі самалёты. Штук шэсць. Татачка, каб ты бачыў, што яны выраблялі. Мо разоў з дзесяць пралятвалі нізка-нізка над шашою сюды-туды і кожны раз страчылі з кулямётаў, кідалі бомбы. Дзіву даёмся, як мы і жывыя яшчэ ўцяклі з таго пекла — шашы...

Цяпер прыбіліся ў лясок, сядзім пад старым галлістым дубам. Вяртацца назад на шашу баімся. Баімся ісці і па звычайнай прасёлкавай дарозе. Мусіць, будзем ночы чакаць, каб далей прабірацца. Спаць не хочацца ані, хоць і не спалі ўночы. Маці плача, а я ўзяла з сумачкі сшытак свой і, схаваўшыся за карысты камель, размаўляю вось, татачка, з табою, расказваю, у які нерат мы трапілі. Можа, маці і праўду кажа: не трэба было нам нікуды ехаць з Вялікага Лесу. Але ж хто мог ведаць наперад, што здарыцца такое. Гэта ж ні праехаць ні прайсці — усюды на дарогах лютуюць фашысты. Вяртацца назад? Але і там, там што? У Гомелі бамбілі, тут бамбяць...

Словам, татачка, не ведаю, як і дабяромся мы да Мінска. І ці дабяромся наогул, ці не заб'юць нас у дарозе? Ды і ў Мінску што? Можа, і там бамбяць і абстрэльваюць з самалётаў немцы? Баімся, каб ты хоць не загінуў. А то прыйдзем у Мінск, а ты... Не, не, татачка! Без цябе ж і жыць нам з маці не захочацца. І жывём толькі, бо надзея ў душы цепліцца — ты ў Мінску, мы з табою ўбачымся, пагаворым, як гаварылі заўсёды. А то я вось гавару, гавару, а голасу твайго не чую. Уяўляю толькі, як глядзіш на мяне, ціхенька так, быццам нават трошачкі хітраваценька ўсміхаешся... І ўсё. А калі цябе... І надзеі ніякай... Слёзы не даюць мне далей пісаць, таму на сёння... Бывай, татачка! І жыві, жыві, чакай нас! Можа, мы ўсё ж да цябе як-небудзь дабяромся. Быць таго не можа, каб не дабраліся!..

## XII

Каманда, у якой разам з іншымі мабілізаванымі ішоў Піліп Дарошка, на трэція суткі ў поўдзень дасягнула Дняпра. Магла каманда і раней дабрацца да ракі, калі б не спёка, калі б мабілізаваныя былі больш вопытныя хадакі, не панамульвалі, не пазбівалі ног. А то ж амаль кожны

другі ці кульгаў, ці ішоў зусім босы, несучы чаравікі альбо боты, перакінуўшы цераз плячо. Ды і не здагадаўся Капуцкі ўзяць з сабою падводу, якая б везла торбы. А мог жа ўзяць, як гэта зрабілі іншыя.

Пераправіцца на той, другі бераг Дняпра, таксама, як выявілася неўзабаве, было не проста. Ледзь прычальваў паром, на яго апантана кідаліся з усіх бакоў людзі. З дзецьмі, клункамі, мужчыны і жанчыны. Адкуль толькі і назбіралася тут столькі людзей! Вокам не ахапіць. І ўсе кудысьці спяшаюцца, ніхто і хвіліны чакаць не хоча. На паром налазіла так, што ён плыць не мог. Ніхто сам па сваёй ахвоце не хацеў сыходзіць, таму падоўгу ўпрошвалі адзін аднаго, каб хоць хто пакінуў паром. Але людзі, знявераныя, не згаджаліся — сварыліся, крычалі, плакалі, гнулі мацюкі. Крык стаяў — як у гамарні. Неразбярыха расла з кожнай гадзінай, бо людзей на пераправе большала і большала, яны прыбывалі, як, бывае, прыбывае ў разводдзе ці ў зліву вада. Прычым прыбывалі не толькі мабілізаваныя, а і вяскоўцы — з каровамі, з хатнім скарбам за плячыма ў вузлах — клятчастых посцілках, абрусах...

Капуцкі, высветліўшы, што на пераправе няма ніякай чаргі, паспрабаваў сам яе навесці. Але яму гэта не ўдалося — людзі, напалоханыя, знерваваныя, нікога не слухаліся. І ён, накрычаўшыся, намахаўшыся рукамі, вярнуўся ні з чым да свае каманды. Правёў мужчын да самай ракі, даў ім спачыць — пасядзець, паляжаць на траве,— ад вады надта ж прыемна павявала халадком, свежасцю. Потым пастроіў зноў каманду, спытаў, хто з мабілізаваных умее плаваць. З сарака двух чалавек умелі плаваць толькі дваццаць сем...

— Эге,— пачухаў патыліцу Капуцкі.— А я, грэшным дзелам, палічыў, што мы і без парома абыдземся. Ажно...

Аддаўшы загад «вольна», ён зноў кінуўся да парома, зноў паспрабаваў навесці на пераправе парадак. Ды з гэтага зноў нічога не выйшла.

— Што ж, братва,— сказаў Капуцкі, вярнуўшыся да каманды.— Навесці тут парадак наўрад ці зможа хто. Ды і задача ў нас іншая — нам трэба пераправіцца на другі бераг. Бачыце вунь там,— паказаў ён рукою за раку,— дрэва. Злева, дзе поле...

Усе як адзін паглядзелі туды, куды паказваў Капуцкі: сапраўды, там, непадалёку ад акуратных загончыкаў бульбы, зелянела раскідзістае, галлістае дрэва — грушадзічка, а можа, нават малады шатрысты дубок.

— Ля таго дрэва — збор.

І павёў каманду да парома, які акурат прычальваў да берага.

Пілiп не хацеў адставаць, пайшоў разам з усёй камандай да парома. Але як толькі ўлез у людскі натоўп, яму нехта наступіў ботам на нагу. Ад болю Пілiп войкнуў.

— Пачакай, сусед,— пачуў ён над самым вухам голас Мацея Тхорыка.— Не рвіся наперад бацькі ў пекла...

І ледзь не сілаю, схапіўшы за плячо, пацягнуў Піліпа з людской сумятні.

Калі, задыханыя, успацелыя, апынуліся зноў на вольным ад людзей месцы, хвілін колькі моўчкі стаялі і глядзелі, як прабіраліся да парома людзі, кожны імкнучыся трапіць туды першы, адзін аднаму перашкаджаючы — з крыкам і нейкай не то ашалелай радасцю, не то злосцю. Мацей Тхорык плюнуў сабе пад ногі.

— Цьфу, і куды так рвацца?..

— Вядома — на той бераг,— адказаў Пілiп: яму, бедаку, не да таго было, каб разважаць,— нехта здзёр, раздавіў мазоль, і жывая рана балела так, што хоць на сцену лезь.

— А я думаў...— зноў нешта нібыта недагаворваў, цадзіў скрозь зубы Мацей Тхорык.

— Што ты думаў? — перавёў свае вочы на непаголены, аброслы чорнай шчэццю твар суседа Пілiп.

— Ды... Што знарок ты нагу нацёр...

— Як ета — знарок?

— Ну-у...— не казаў, марудзіў Мацей.— Кеб на хронт не пагналі, дадому пусцілі... А ты... У героі лезеш...

— У якія героі?

— Ды ў тыя, што і ваш Іван... Хадзем, пакуль не позна, адсюль, падарожніку да раны прыкладзі... А то нарваць можа, нагу зусім разнясе. І не ступіш...

У апошніх словах Мацея Тхорыка была праўда. Перш чым перапраўляцца на другі бераг ракі, трэба было нагу ратаваць.

Адышліся ад пераправы, знайшлі ядранага, лапушыстага падарожніку, прылеглі на траву. Прамыўшы слінаю лісток, Пілiп прылажыў да нагі, на месца сцёртага мазаля. Але боль не сунімаўся, рана аж тузала. І Пілiп, і Мацей Тхорык маўчалі, не адрывалі вачэй ад ракі — была яна тут, на пераправе, шырокая, паўнаводная. Кусты ніцай лазы копнамі падыходзілі да самай вады. Але дзе-нідзе берагі былі і голыя, парослыя толькі асакой, шылегам, аерам,

блёкатам, чаротам, а то і зусім жоўтыя, пясчаныя, зрывістыя. На самую рачную роўнядзь аж няможна было глядзець — ад яе люстравалася, адбівалася сонца, сляпіла вочы.

Паром між тым, нагрузіўшыся, паволі, цяжка адчаліў ад берага. Паспакайнела трохі, крык і галас пацішэў. Людзі хто аставаўся стаяць ля ракі, хто адыходзіўся, каб прысесці ці прылегчы. Праляцелі, пранесліся нізка, ледзь не кранаючыся крыламі вады, дзве, адна пры адной, дзікія качкі-чыркі.

— Піліп,— адарваў першы свае вочы ад ракі Мацей Тхорык,— ты і праўда думаеш пераправіцца на той бераг?

— А як жа? — паглядзеў непаразумела на Мацея Пілііп.

За тры дні ў дарозе Мацей Тхорык пахудзеў, стаў падобны з твару на вераб'я — нос ды вочы.

— А я...— не казаў, цягнуў Мацей.— Думаю, варта ета рабіць ці не варта?

— Дык жа ніхто не пытае. Трэба!

— Каму трэба?

— І табе, і мне... Усім нам.

— Усім, кажаш. Умгу,— ныдзвеў, як надакучлівы камар над вухам, Мацей. Уздыхнуў, акінуў вачыма раку, нібыта змераў яе шырыню, і сказаў: — На той бераг цяжка пераправіцца. А з таго — на еты... Хіба лягчэй?

— Чаго ета табе з таго берага пераправіцца зноў на еты? — ніяк не здагадваўся, куды хіліць Мацей, Пілііп.

— Як ета чаго? Хаты ж нашы, сем'і — на етым беразе...

І змоўк — не сказаў больш ні слова, толькі неяк хітравата, шматзначна падціснуў свае тоўстыя губы, усміхнуўся сам сабе. Можа б, сказаў што-небудзь і яшчэ, але ў гэты час загуў, праляцеў над пераправаю самалёт. Пазадзіралі галовы, глядзелі, не міргаючы, хочучы здагадацца, чый гэта самалёт — наш, а можа, нямецкі? Самалёт жа праляцеў над ракою, вярнуўся, зноў праляцеў, зрабіў і адзін, і другі круг над пераправаю. І знік. Знік гэтак жа нечакана, як і з'явіўся. Ніхто асаблівай увагі не надаў гэтаму самалёту, мо таму, што не прывыклі яшчэ, не ведалі, чаму ў вайну лятаюць самалёты, дый не навучыліся распазнаваць, каторы наш, савецкі, а каторы чужы, нямецкі.

Мінула, можа, з паўгадзіны, паром за гэты час паспеў даплысці да таго, другога берага, разгрузіцца, з таго берага даплыў да гэтага берага. Зноў да парома кінуліся з усіх

бакоў людзі, абляпілі яго, зноў ён доўга стаяў, чакаючы, калі сёй-той злезе і можна будзе рушыць. Урэшце ён адплыў, людзі адхлынулі ад прычала.

— І нам, мусіць, пара да парома кіравацца? — сказаў Пілiп.

— Хто за што, а поп за малітву,— скрывіў ва ўсмешцы губы Мацей.

— Дык жа загадана.

— Загадана... А калі табе ў агонь, у пекла загадаюць ісці? Дык ты што — і пойдзеш?

Задумаўся, задумаўся Пiлiп. Загадваць, вядома, ахвотнікаў заўсёды хапае. А вось выконваць, рабіць... Дый загадваць лягчэй, лягчэй...

Да ракі, прычала падыходзілі і падыходзілі людзі — камандамі, відаць, мабілізаваныя, і проста так, па адным, па два, па тры, купкамі і купамі. З клункамі, дзецьмі, жанчыны і мужчыны. Хто адразу ж шыўся ў людскі натоўп, прабіраўся бліжэй да ракі, да таго месца, куды прычальваў паром, хто, пастаяўшы, паглядзеўшы, як кожны імкнецца прабіцца да ракі першы, наслухаўшыся ўволю людскога галасу і лаянкі, адыходзіўся ўбок, рассаджваўся на траве, стомлена выпростваў ногі, даставаў з торбы захоплены з дому сякі-такі правіянт, браўся спакваля перакусваць. Калі б не крыкі, не мітусня людзей на пераправе, магло б здацца, што нідзе ніякай вайны і няма — мірна, ціха, як і было ўсюды на зямлі.

І раптам... У першую хвіліну не толькі Пілiп, а, мабыць, ніхто не зразумеў, што адбылося. Адкуль, з якога боку наляцелі самалёты, знізіліся над пераправаю і... пачалося рабіцца на берагах ракі, на самой рацэ такое, што... людзі і не ведалі, дзе падзецца, куды кінуцца. Стрэлы, выбухі заглушылі людскія крыкі. Беглі, імчалі хто куды. Некаторыя падалі, бо былі параненыя, забітыя; некаторыя проста спатыкаліся ці не маглі ад страху рухацца — адымаліся ногі. Вакол парома забулькала, быццам закіпела, мусіць, ад куль, вада. Некалькі слупоў, кустоў пырскаў вырасла тут і там. І апамятацца ніхто не паспеў, а самалёты вярнуліся, зноў закружылі каршунамі над пераправай, не перастаючы страляць, кідаць бомбы, гранаты...

Пілiп, седзячы на траве, нібы зачараваны, глядзеў на тое, што рабілася навокал. Нешта незразумелае тварылася ў яго на душы, не пускала, трымала, бы магнітам, на зямлі, не давала падняцца, пабегчы.

Мацей, усхапіўшыся на ногі, страсянуў Піліпа за плечы.

— Уцякайма-а! — закрычаў, нема зароў ён не сваім голасам.

— Куды? — лыпаў непаразумела вачыма, быццам адарваўся ад сну ці глыбокага одуму, Піліп.

— Куды папала, абы не быць тут...

Піліп ачуўся, да яго раптам дайшло, пра што гаварыў яму Мацей.

— А-а-а... Пераправляцца? — выдыхнуў нарэшце ён.

— Пра якую пераправу ты гаворыш? Забудзь...

— Што?

— Забудзь, кажу. На ўсё забудзь.

— А ваяваць?

— Ваяваць? З голымі рукамі... Калі ў немца самалёты... Во, паваюй!..

І паказаў галавою на раку, туды, дзе быў паром. Толькі цяпер Піліп убачыў, што там рабілася. Людзі бултыхаліся ў вадзе, хто плыў да таго, дальняга берага, хто імкнуўся да гэтага, бліжэйшага. Тыя ж, хто аставаўся на пароме, махалі рукамі, крычалі, лямантавалі. Піліп паволі-паволі падняўся на ногі, хацеў сказаць Мацею, што пераправляцца праз Дняпро і ваяваць усё ж давядзецца, жадае ён таго ці не жадае, але не паспеў — у гэты час невядомая сіла падхапіла яго і кінула, шпурнула вобземлю. Ды так моцна, што... У вушах зазвінела-зазвінела, сціснула, схлупіла грудзі — не прадыхнуць...

Нехта падбег, тармаснуў Піліпа за плечы. Але не было ні сіл, ні волі падняць галаву, расплюшчыць вочы. Дзесьці зусім блізка зноў вухнула, страсянула, калатнула зямлю, пачуўся роў самалёта, свіст куль, тупат чыіхсьці ног — хтосьці імчаў, уцякаў далей, далей адсюль, ад гэтага жахлівага месца, дзе кружаць і кружаць самалёты, ірвуцца бомбы, гінуць людзі...

Здалося на хвіліну: гэта не хто-небудзь, а ён, Піліп, бяжыць, імчыць. Дзіка неяк: і быццам ляжыць і ў той жа час бяжыць, імчыць. Не, нават не бяжыць, не імчыць, а ляціць. Ляціць у чорную, як сажа, ноч, прорву, апраметную...

## XIII

Дзіўны сон прысніўся Мікалаю Дарошку. Быццам ішлі яны з Піліпам у Качай-балота на канаву лавіць уюноў. Комляю-таптухаю, як і заўсёды ў іхняй вёсцы ўлетку ла-

вілі. Моцна парыла, аж варыла — збіралася на дождж. Былі яны абодва, і ён, Мікалай, і Піліп, у забрoджаных у ржу нагавіцах-палатняніках, на нагах — лапці. Цераз плечы ў кожнага, усё адно што ў жабракоў ці ў пастухоў,— торбы.

— Як ты мяркуеш,— пытаў у Піліпа ён, Мікалай,— ці наловім мы сёння чаго?

Піліп ківаўся трохі збоку, нейкі пануры, быццам недаспаў. І што яму казаў бацька — не пачуў.

Ён, Мікалай, змушаны быў яшчэ раз паўтарыць сыну сваё пытанне.

— Вы штосьці кажаце? — адарваўся ад сваіх думак, паглядзеў на бацьку ўрэшце неяк асалавела сын.

— Пытаю, ці наловім мы чаго-небудзь сёння?

— Можа, наловім, а можа, і не,— абыякава адказаў Піліп.

— А мне здаецца, наловім. Добра наловім,— ані не пакрыўдзіўся Мікалай.

Ля канавы, той, што вужакай звіваецца сярод карчэўя па Качай-балоце, яны з Піліпам не распраналіся, не разуваліся — як ішлі, так і палезлі ў ваду. Вада была цёплая, густая, дно багністае, глейкае. Піліп трымаў комлю рукамі злева, ён, Мікалай,— справа. Асцярожна апусціўшы яе ў ваду, ціха наблізіліся да зарослага шылегам берага, таптанулі, заплёхалі нагамі. Амаль адначасова падышлі да комлі, паднялі яе над канаваю. Калі сцякла вада, убачылі ў комлі вялізную чарапаху.

— Цьфу, трэба ж,— ледзь не вылаяўся Мікалай.

Выкінулі на бераг комлю, перавярнулі. Чарапаха, каўзануўшы па лазовых прутках, спаўзла ў траву, упала на панцыр. Замахала чорнымі, з пазногцямі, амаль як у чалавека рука, нагамі, выцягнула на доўгай шыі галаву, паглядзела на яго, Мікалая.

— Цьфу,— плюнуў ён, Мікалай, і, каб не глядзець на чарапаху, адвярнуўся.

Але нейкая невядомая сіла прымусіла яго зноў паглядзець на чарапаху. Проста немагчыма было, каб не паглядзець. І ён, Мікалай, не маючы змогі стрымаць сябе, паглядзеў. І ад нечаканасці ледзь не ўскрыкнуў — гэта ж зусім не чарапаха ляжыць на траве і дрыгае нагамі, а Піліп, яго сын.

Ад неспадзяванасці і жаху ён, Мікалай, заплюшчыў вочы, страсянуў галавою. Зноў са страхам зірнуў на чара-

паху — не, і праўда не чарапаха ляжыць на траве — на траве ляжыць сын, Піліп.

— Што за ліха? — закруціў Мікалай галавою.

— Ніякага ліха няма,— адказала чалавечым, Піліпавым, голасам чарапаха.— Ета я, тата...

— Ты? — яшчэ больш здзівіўся Мікалай.

— Я. Але ты не бойся, я не буду вечна чарапахаю. Стану зноў тым, кім і быў. Толькі ты...

Мікалай прахапіўся, мусіць, ад жудасці, так і не пачуўшы, што сказаў яму напаследак сын. Перавярнуўся на другі бок, але заснуць ужо не мог — мучыла тое, што казаў яму, Мікалаю, Піліп, а ён так і не пачуў — прачнуўся. «Толькі ты...» — «Што я павінен зрабіць, каб перавернутая, бездапаможная чарапаха стала зноў маім сынам, Піліпам?» — цвіком сядзела ў галаве.

Варочаўся Мікалай у пасцелі, ахкаў, уздыхаў — расла і расла ў душы трывога. «Што з Піліпам? Няўжо нядобрае здарылася, можа, параніла дзе? Але ж Піліп толькі некалькі сутак як з дому выправіўся. Мабыць жа, не паспелі яшчэ ні адзець, ні страляць навучыць. І да хронту, пэўна ж, не дайшоў».

Успамінаў, што значаць уюны, перавернутая ўверх нагамі чарапаха, калі яны прысняцца. Нічога путнага не мог успомніць. «Трэба будзе ў людзей папытаць, можа, ведаюць»,— думаў і думаў Мікалай.

Урэшце не стрываў — вылез з-пад посцілкі, намацаў нагамі пад ложкам шламакі-апоркі, пашлэмаў на двор. Доўга стаяў спачатку на ганку, потым, адышоўшыся, ля хлява. Слухаў, як роўна і мерна жавалі жвачку каровы, як спявалі па ўсёй вёсцы пеўні — мабыць, толькі другія, бо неба на ўсходзе нідзе яшчэ не ружовела, не святлела. «Ку-ка-рэ-ку!» — хрыпата рваў горла, лопаў крыллем, галасіста адгукаўся на крык іншых пеўняў з курасадні і яго, Мікалаеў, певень. Дзесьці далёка-далёка на захадзе за лесам вухнула, потым загрукатала, быццам сыпалі са скрыні на дол бульбу. Пад нагамі дробна і часта задрыжала, закалацілася зямля. Мікалай паглядзеў у той бок, дзе стугнела, але нічога ніякага не ўбачыў — удалечы чарнеў лес, чарнела ўсеянае густа зоркамі неба. Ні водбліскаў пажару, ні так нічога іншага не зіхала. «Бамбяць нешта, мусіць, немцы. А мо навальніца?» — падумаў. Сцялася сэрца — успомніў зноў сон, Піліпа. «Што з ім, чаму прысніўся, ды яшчэ так?» Ад сына думкі незаўважна пераскочылі да сябе. «Га, а мне, мне як жыць далей? Добра ж,

як не прыйдзе сюды немец. А як прыйдзе? Піліпа няма дома. Іван вярнуўся, зноў тут, у начальстве. Калі што — і мяне не пашкадуюць. Што мы сварыліся з Іванам, не ладзілі — ведаюць у вёсцы. Але ж Іван усё адно сын, камуніст. Немцы такіх... Аге, не шкадуюць немцы такіх, страляюць. І Косцік нейкі шалапутлівы, кеб не скруціў галавы сабе. У вайну ай як лёгка скруціць галаву! Не, лепей бы ўжо як было, так было, а не пачыналася вайна. Прывыклася б як-небудзь да ўсяго таго, што не падабалася, і жылося б. Не так, як магло быць і як хацелася б, але жылося б. А так во... Думай — што да чаго і як... Дык кеб жа толькі думаннем і абышлося! А то ж... І дзеці ці жывыя астануцца, і сам... Ліхім часам... О, як лёгка ліхім часам без пары ў зямлю легчы, косці парыць...»

Клямкнулі дзверы сенцаў — і Мікалай схамянуўся, падняў галаву, паглядзеў на сваю хату — хто з яе выйшаў? Убачыў мужчынскую постаць, аж прыгнуўся:

«Косцік?»

Але мужчына ішоў не да хлява, а кіраваўся да весніц.

«Хто ета? І чаго поначы тут, у мяне ў двары, шляецца?»

Пайшоў услед за мужчынам, кашлянуў. Мужчына азірнуўся і, мусіць, спалохаўшыся, што яго ўбачылі, подбегам кінуўся да весніц. Адшчапіў зашчапку — і вопрамеццю выскачыў з двара.

«Злодзей?»

Прыадчыніў весніцы, высунуўся з-за шула — мужчына, беручыся бліжэй да платоў, пакіраваўся на сяло.

«Не павінна б, кеб злодзей. Здаецца, нічога не панёс. Тады...»

І ў наступную хвіліну нібы маланкай яго апаліла — здагадаўся пра ўсё.

«Ета... Ад Клаўдзі хтось...»

Забурліла, закіпела ў грудзях злосць.

«Піліп на вайне, можа, паранены ці забіты, а яна, хлюндра, вунь што... Асмялела! Па начах дадому мужыкоў водзіць. Ды ўжо ж, мабыць, так, бо хто ж іншы тут яшчэ хадзіў бы...»

Зірнуў на вокны Піліпавай хаты, убачыў белую постаць у акне. Стаіўшыся, постаць стаяла некаторы час, потым, мітнуўшыся, схавалася.

«Яна, яна, хлюндра,— падумаў з нянавісцю.— Ета ж трэба, мала таго, што абы з кім блыталася дзе папала, дык цяпер дадому хабалі пачалі хадзіць... На яго, Мікалаева,

селішча. Збаёдае, усё нажытае ім і Піліпам гадамі працы збаёдае. Трэба будзе пагаварыць. Харашэнька пагаварыць! І адвадзіць. Ні стыда, ні сарама. Добрую жоначку ўзяў сабе Піліп, до-обрую. Нічога не скажаш...»

Зачыніў весніцы, прымкнуў іх на зашчапку. Паволі, спыняючыся ледзь не на кожным кроку, падаўся назад у хату. У сенцах пастаяў, падумаў:

«А мо не адкладваць, зараз во і зайсці, накрычаць, кеб ведала надалей, што рабіць, а што не рабіць».

Усё ж не асмеліўся заходзіць.

«Няхай, дзень на тое будзе».

Рашуча рвануў на сябе дзверы свае палавіны хаты, пашлэмаў звыклай хадою да свайго ложка. Скінуў з ног шламакі-апоркі, лёг на пасцель, акрыўся посцілкай.

«Во шкура,— думаў, аж калаціўся ад злосці Мікалай.— Піліп з хаты, дык яна ў хату хабалёў... Асмялела, абнахабіла...»

Так больш і не заснуў, не звёў да самай раніцы вачэй Мікалай у тую ноч...

## XIV

І раней, калі не было вайны, Іван Дарошка меў звычку позна заседжвацца на рабоце. Ці мала што магло здарыцца, ці мала хто мог пазваніць? А справы розныя бываюць. Адну можна адкласці на заўтра, а другую не адкладзеш, трэба тэрмінова рабіць. Дый клопату рознага хапала. Якніяк у сельсавеце — чатыры вёскі, чатыры калгасы ды яшчэ і завод з цэлым рабочым пасёлкам, чыгуначная станцыя. Вялікі Лес і Гудоў — пад бокам, заўсёды навідавоку. А астатнія ж вёскі — Рудня, Паташня і Дразды — далёкія, глухія. Паедзеш у каторую з раніцы — толькі к вечару вернешся. Пакуль з заявамі разбярэшся, пакуль паперы розныя прачытаеш і падпішаш — глядзіш, і рабочы дзень даўно скончыўся. Цяпер жа, з пачаткам вайны, Іван і нагогул не пакідаў сельсавета да самага змяркання. І то, ідучы дадому, папярэджваў дзяжурную:

— Калі што — кліч мяне...

У той ліпеньскі дзень Іван Дарошка таксама вяртаўся дадому позна. Толькі што над вёскай прашугала навальніца, бурная, з громам і бліскавіцамі, спорным, абломным ліўнем. На сцежачцы, па якой Іван прывык хадзіць, тут

і там блішчалі лужы вады. Іван абыходзіў іх, некаторыя, меншыя, пераступаў, пераскокваў. Да хаты дабраўся амаль што цемнатою. Здзівіўся, убачыўшы ля весніц у свой двор дырэктара школы Андрэя Макаравіча Сушчэню. Хоць і жылі яны з дырэктарам у адной хаце, праз сцяну, але сустракаліся рэдка — Іван заняты быў сваімі справамі, дырэктар — сваімі. Пасля ж таго як дырэктар аддаў загад выключыць са школы брата — Косціка, яны і зусім амаль не сустракаліся. Дырэктар, мусіць, адчуваў перад Іванам Дарошкам віну, таму стараўся не трапляць на вочы, не гаварыць пра тое, што хвалявала яго і, пэўна ж, Івана. Іван здагадваўся пра тыя думкі, якія не давалі спакою Андрэю Макаравічу, і таксама стараўся не трапляць яму на вочы. Пераконваць Андрэя Макаравіча ў тым, што ён, Іван, не пакрыўдзіўся, не хацелася, бо мог жа і не праявіць Андрэй Макаравіч сваёй прынцыповасці — пакінуць Косціка ў школе, не выключаць. Тым болей у канцы навучальнага года, у дзевятым класе...

Іван павітаўся з Андрэем Макаравічам, суха, афіцыйна, не падаючы рукі.

— Вы, мусіць, кагосьці чакаеце? — спытаў, каб хоць яшчэ нешта сказаць, не прайсці моўчкі міма, Іван Дарошка.

— Вас,— адказаў проста, хаваючы ў зямлю вочы, Андрэй Макаравіч.

— Што такое?

— Ды-ы... Пагаварыць з вамі, Іван Мікалаевіч, хачу. Даўно, даўно хачу...

Андрэй Макаравіч адчуваў нейкую няёмкасць, глядзеў не на Івана, а сабе пад ногі, у зямлю. Адчуваў не тое што няёмкасць, а як бы адчужанасць да Андрэя Макаравіча і ён, Іван.

— Пра што вы хочаце са мною пагаварыць? — стрымана, не выдаючы таго, што ў яго на душы, прамовіў Іван.

— Ды-ы... Пра многае...

— Напрыклад?

— Ведаеце, нешта скрабе на сэрцы, спакою не дае. Мусіць, усё ж пакрыўдзіліся вы на мяне.

— За што?

— За Косціка.

— Гм,— гмыкнуў Іван.— Чаму вы так лічыце?

— Бачу. Па вас бачу.— Андрэй Макаравіч не ведаў, дзе падзець не толькі вочы, але і рукі (яны былі ў яго як бы лішнія, непатрэбныя, ён то апускаў іх, быццам вучань

перад настаўнікам, то хапаўся за гузікі пінжака, які быў накінуты на плечы наапашкі, то зноў апускаў).— Але прашу мяне зразумець — па-другому зрабіць я не мог. Ды і вы, помніце, калі я прыйшоў раіцца да вас, далі мне поўную волю. Я вас правільна тады зразумеў?

— Правільна.

— Дык чаго ж вы тады крыўдуеце?

— Адкуль вы ўзялі, што я крыўдую?

— Бачу, адчуваю. А я... Словам, я не хацеў бы, каб на мяне хтосьці крыўдаваў. Тым больш вы, Іван Мікалаевіч...

— Ды я і не крыўдую. Хоць...— Іван памаўчаў, падумаў, як бы сказаць так, каб і душой не пакрывіць, і не ўзлаваць Андрэя Макаравіча.— Уявіце сябе на маім месцы. Дырэктар школы прыходзіць раіцца, што рабіць з меншым братам, да старэйшага, які да таго ж старшыня сельсавета... Што я мог... Што б вы маглі, будучы на маім месцы, сказаць?

— Тое самае, што і вы...

— І не пакрыўдзіліся б ані на таго, хто зрабіў бы тое, што вы сказалі б? Толькі шчыра гаварыце — не пакрыўдзіліся б?

— Пакрыўдзіўся б,— прызнаўся Андрэй Макаравіч.

— І я пакрыўдзіўся. Але не на вас. На сябе. Што забыў у сваіх штодзённых турботах на брата, не памагаў яму...

— І трошачкі, хоць чуць-чуць, а пакрыўдзіліся і на мяне.

Андрэй Макаравіч падняў на Івана Дарошку свае вочы, паглядзеў з-пад калматых броваў ва ўпор. І Іван не змог больш таіцца, прызнаўся:

— І трошачкі пакрыўдзіўся на вас...

— Вось гэта я і хацеў пачуць. Паверце мне, я выключаў Косціка толькі дзеля таго, каб апомніўся ён, чалавекам стаў. Дый... Не назусім. Увосень мы прымем у яго экзамены, і няхай канчае школу...

Андрэй Макаравіч патаптаўся на месцы, неяк абыякава махнуў рукою.

— Як ужо зрабілася, так зрабілася. Давайце не будзем гаварыць больш на гэтую тэму...

— Давайце.

— Ну вось і добра, што канфлікт уладжаны,— аж перамінуўся з нагі на нагу Андрэй Макаравіч.— Пра іншае зможам спакойна пагаварыць.

— Пра што — іншае?

— Ды пра тое,— зноў патаптаўся на месцы Андрэй Макаравіч,— што ўсіх людзей цяпер хвалюе.

— А што ўсіх людзей цяпер хвалюе? — дапытваўся, рабіў выгляд, што нічога не ведае, Іван.

— Ды-ы,— цягнуў, не спяшаўся гаварыць Андрэй Макаравіч.— Вайна гэтая...

— А-а, вайна...

— Так-так, вайна...

Быў Андрэй Макаравіч худы, рослы і прыгорблены, сутулы, гаварыў як бы з вышыні з нейкай не то нясмеласцю, не то баязлівасцю. Апошняга раней за ім не заўважалася — заўсёды Андрэй Макаравіч быў упэўнены ў сабе, умеў пераканаць у тым, што ён гаварыў, і іншых. «Няўжо ён са мною такі, бо Косціка выключыў са школы? А можа... Разгубіўся чалавек...» — падумаў Іван Дарошка. Андрэю ж Макаравічу сказаў:

— Ну-ну, гаварыце...

— Ведаеце... У бежанцы мы з жонкаю сабраліся...

— У бежанцы? — здзівіўся Іван Дарошка.— Чаму гэта вы раптам?

— Як чаму? Немцы ідуць сюды. Быць пад імі... Не-е! — рашуча круціў галавою Андрэй Макаравіч.

— Адкуль вы ўзялі, што немцы сюды ідуць?

— Дык яны ўжо, можна сказаць, тут. Мінск у іхніх руках, іншыя гарады Беларусі — таксама.

— Хто вам гэта сказаў?

— У Ельніках я быў, там усе пра гэта гавораць. Пад Гомелем, кажуць, немцы. Значыцца, праз дзень-два будуць і тут.

— Гэтага не можа быць! — не верыў Андрэю Макаравічу Іван.

— Іван Мікалаевіч, я сам не веру... Але ж...— нарэшце зваладаў са сваімі рукамі Андрэй Макаравіч, шырока, як толькі мог, развёў іх, бы ўсё адно крыламі, махнуў крыссем і рукавамі пінжака.— Сам на свае вочы бачыў, як з Ельнікаў некаторыя ўцякаюць. Аж няёмка глядзець...

— Гэтага не можа быць,— паўтарыў, ужо больш рашуча, Іван.

— Іван Мікалаевіч, і я хацеў бы, каб не было. Але яно... Ёсць, на жаль...

Абодва памаўчалі, аддаўшыся кожны плыні сваіх думак.

— Дык мы...— загаварыў зноў Андрэй Макаравіч.—

З жонкай параіліся і таксама ў дарогу сабраліся... Не аставацца ж нам тут, пад немцамі, не сустракаць жа іх, нелюдзяў, хлебам-соллю.

— І куды ж вы сабраліся, куды ж пойдзеце, калі, як вам верыць, немцы ўсюды ўжо?

— Ну, не, не ўсюды,— засмяяўся ціхенька Андрэй Макаравіч.— Кішка ў іх тонкая, каб усюды быць...

— Дык, можа, і сюды яны не дойдуць?

— Не, Іван Мікалаевіч, мусіць, дойдуць... А не дойдуць — на лепшае. Вернемся і мы.

— Адкуль вы вернецеся?

— З дарогі. А пакуль што мы сабраліся ісці. На Лоеў. На пераправу.

— А адтуль — куды?

— Адтуль? На Кіеў ці на Стары Дуб. Паглядзім, куды можна будзе ісці... А можа...— Андрэй Макаравіч памаўчаў, перадыхнуў.— І ісці нікуды не трэба будзе. Нашы з сілаю збяруцца ды разаб'юць немцаў. Дык мы... Назад вернемся. А пакуль што... Вы ж, мабыць, тут астанецеся. То, можа б... За хатаю нашаю паглядзелі...

Цяпер усміхнуўся Іван Дарошка.

— Вы думаеце, калі немцы сюды прыйдуць, то я... Астануся, тут буду, як вы кажаце, хлебам-соллю іх сустракаць?

— Не, я так не думаю,— збянтэжыўся Андрэй Макаравіч.— Калі не вы, то сям'я ваша... Пэўна ж, астанецца...

Дзе астанецца яго сям'я — Іван Дарошка не ведаў. Мо таму не ведаў, што не ўяўляў, не дапускаў нават думкі, што сюды, у Вялікі Лес, прыйдуць немцы. Багавік, а потым і Васіль Кулага першыя загаварылі з Іванам пра тое, што сюды могуць прыйсці немцы, што трэба думаць пра сям'ю — што з ёю зробяць немцы, калі яна тут астанецца? І не толькі немцы, а і тыя, хто быў незадаволены ім, Іванам, пакрыўджаны — сваякі розных кулакоў, падкулачнікаў, ненавіснікі Савецкай улады.

— Гм... Не ведаю, дзе застанецца мая сям'я... Я пра гэта не думаў яшчэ,— адказаў Андрэю Макаравічу Іван Дарошка.— І раіў бы вам... Лепшае ўсё забраць з сабою. Бо быць вартаўніком вашай хаты... Гм-м, мяркую, у мяне і ў мае сям'і будзе хапаць іншага клопату...

Сказаў гэтак і падумаў у тую ж хвіліну: «Ці не жарсткавата?» І тут жа супакоіў сябе: «Не, не жарсткавата. Інакай з такімі людзьмі і гаварыць нельга. Бо яны... Думаюць не пра тое, як ворага спыніць, прагнаць з нашай зямлі, а

пра тое, як самім ўратавацца, жыць астацца, ды яшчэ і дабро сваё зберагчы. Не людзі, а анучнікі. Абываталі».

Хацеў пайсці ўжо, зрабіў нават крок убок, але Андрэй Макаравіч спыніў яго, сказаўшы:

— Ды ў мяне... Можна сказаць, нічога такога і няма... Правільней, нічога таго, што астаецца, не шкада... Шкада толькі кніжак...

— Ах, кніжак...

Іван застыў у нерашучасці. Сапраўды, хіба ж ён мог забыцца, што ў Андрэя Макаравіча была як для іхняй вёскі, то вялікая бібліятэка. Па кніжачцы збіраў яе Андрэй Макаравіч, збіраў гадамі. Дзе б ні быў, куды б ні паехаў — вёз дадому кніжкі. І не проста кніжкі, а тыя, якія яго цікавілі. Сам Андрэй Макаравіч выкладаў у школе гісторыю. Але гісторык ён, казалі, быў не толькі па адукацыі, а па натуры. У школе ён арганізаваў краязнаўчы гурток, вывучаў родны край. Жонка, Кацярына Антонаўна, неаднойчы казала Івану: «Ты б пагаварыў калі з Андрэем Макаравічам. Ён столькі ведае ўсяго, што ты... Рот разявіш. У яго ёсць кніжкі, дзе Вялікі Лес апісаны, якім ён быў і сто, і дзвесце гадоў назад...» Дзяцей у Андрэя Макаравіча не было, таму ён усе свае грошы траціў на кнігі. Многія з вёскі хадзілі да Андрэя Макаравіча браць пачытаць штонебудзь, бо сельсавецкая бібліятэка была небагатая, але ён, Іван, хоць і жыў па суседству, да Андрэя Макаравіча не заходзіў. Мо таму, што да вёскі так і не прывык — калі што, ішоў у Гудоў, да Багавіка ці яшчэ да каго-небудзь з даўніх сваіх сяброў.

— А вы іх не пакідайце проста так у хаце,— параіў Андрэю Макаравічу Іван.— Закапайце...

— Баюся, пагніюць... Замокнуць і... А ў мяне... Вельмі рэдкія, каштоўныя выданні ёсць... Іх потым нідзе не знойдзеш...

— Але ж і ў хаце не надта надзейная схованка. З хаты кнігі могуць парасцягваць, вынесці. Дый... Могуць яны згарэць разам з хатаю...

Андрэй Макаравіч апусціў галаву. Падумаў.

— Так,— уздыхнуў ён.— А вы... Праўду кажаце... Нельга кнігі пакідаць у хаце. Трэба іх сапраўды схаваць...

І, машынальна падаўшы на развітанне Івану Дарошку сваю старэчую халодную руку, пашыбаваў у двор.

## XV

Размова з Андрэем Макаравічам вывела з раўнавагі Івана Дарошку, устрывожыла, занепакоіла. Ноч амаль усю ён прагаварыў з жонкаю Кацярынай Антонаўнай — Кацяю, як прывык зваць яе Іван. Ісці ў бежанцы, эвакуіравацца Каця не хацела.

— Дзе будзеш ты, там і я,— упарта паўтарала і паўтарала яна сваё.

— А як мяне на фронт забяруць?

— Тады... Я сама прыдумаю, што рабіць. Ды... Можна сказаць, і прыдумала ўжо. Паеду ў сваю вёску, да бацькоў, у Будзілавічы. Вазьму дзяцей і паеду...

— А тут, у Вялікім Лесе, не астанешся?

— Не, не астануся.

— Чаму?

Жонка доўга маўчала, потым усё ж сказала:

— Бачыш, Іван, добра, як яно добра... А калі раптам сапраўды немцы сюды прыйдуць, га?.. Не думай, што ўсім падабаешся ты. Ды і... Я ж... Чужая тут, прышлая. Не хачу, каб сваю злосць, сваю нянавісць спаганяў нехта на мне, на нашых дзецях... Калі мы можам спакойна перачакаць навалу ў Будзілавічах.

— Ты лічыш, там вам лягчэй будзе, там не ведаюць, што я старшыня сельсавета, камуніст?

— Можа, хто і ведае. А тут... Усе ведаюць... Кожны чалавек.

Іван нічога не адказаў Каці. А сам сабе падумаў: «А што, можа, Каця і праўду кажа? Аставацца тут, у Вялікім Лесе, ды яшчэ калі ёй не хочацца — і не трэба. Што якое — сапраўды няхай едуць у Будзілавічы. Можа, там будзе і не лепей, але зацішней, спакайней — то гэта пэўна...»

Уранні, паснедаўшы, пайшоў у сельсавет і адразу ж пачаў званіць у Ельнікі — хацелася пагаварыць з кім-небудзь з начальства, даведацца, што дзе чуваць. Але, колькі ні круціў ручку тэлефона, колькі ні крычаў у трубку, ніхто не адгукаўся. Спытаў у дзяжурнай па сельсавеце, ці званіў хто-небудзь з учарашняга. Выявілася — ніхто не званіў.

— Можа, гэта тэлефон не працуе? — сказаў Іван уголас.

Падняў трубку, уважліва паслухаў — сапраўды, тэлефон не працаваў, не падаваў ніякіх адзнак жыцця.

«А што, калі Андрэй Макаравіч казаў праўду — немцы пад Гомелем? І за ноч... Прыйшлі ў Ельнікі?»

Мароз прабег па скуры, пахаладзела ўсярэдзіне.

«Не можа быць... Багавік бы мяне папярэдзіў. Не пакінуў бы вось так, у няведанні...»

«А можа, не мог папярэдзіць? Тэлефон жа не працуе».

«Знайшоў бы як і без тэлефона. Прыслаў бы каго».

Выйшаў з сельсавета, запрог каня. Пад'ехаў да калгаснай канторы, пугаўём пастукаў у акно.

— Васіль, га, Васіль?

Васіль Кулага быў на месцы. Убачыўшы пад акном на падводзе Івана Дарошку, выйшаў.

— Ты гэта куды? — спытаў насцярожана.

— У Ельнікі хачу пад'ехаць.

— Выклікаюць?

— Не, тэлефон нешта не працуе... Паеду, даведаюся, што і як там... Андрэй Макаравіч учора ў Ельніках быў...

— І што ён кажа?

— Нічога такога,— вырашыў лішне не страшыць Васіля Іван.— Вось паеду, сам усё ўбачу і пачую...

Васіль улавіў няшчырасць, скрытнасць у адказе Івана.

— А ўсё ж...

— Добрага мала... Кажа, немцы пад Гомелем, з Ельнікаў сёй-той выязджае...— як мага спакойна, нават быццам абыякава, сказаў Іван.

— Значыцца, і ў Вялікім Лесе хутка будуць немцы! — зрабіў вывад Васіль Кулага.

— Можа, будуць, а можа, і не,— ухіліўся ад прамога адказу Іван.— У страха, бачыш, вочы вялікія.

— Не, Іван, ты мяне не суцяшай,— трос галавою Васіль Кулага.— Па ўсім адчуваецца, прыйдуць сюды немцы. І нам з табою трэба добранька падумаць...

— Пра што?

— Пра ўсё. І што з калгасам рабіць, і самім, і з сем'ямі нашымі...

— Вось з'езджу ў Ельнікі, даведаюся, што там, тады і падумаем. Разам з табою падумаем,— улавіўшы непадробны страх у словах Васіля Кулагі, сказаў Іван.

Васіль Кулага засяроджана пастаяў, пасоп у нос.

— Добра. Едзь, а потым усё раскажаш мне...

І пайшоў, заклапочаны, назад у кантору.

Васемнаццаць кіламетраў праехаў хутка, нават не заўважыў калі. Прыпыніў каня, сцішыў яго бег толькі ў самых

Ельніках. Уважлівей, чым раней, пачаў прыглядацца да таго, што рабілася ў мястэчку. Ніякіх асаблівых змен, здаецца, не было, не кідалася ў вочы і паняверка, паніка. Звычайна, як і заўсёды, на вуліцах былі людзі, кожны спяшаўся, кудысь ішоў па сваіх справах. Адчынены былі магазіны, бойка гандлявалі і на рынку. Праўда, гэта заўважалася адразу,— паменшала яўрэяў. Раней у Ельніках яны траплялiся на кожным кроку, цяпер толькі дзе-нідзе, зрэдку. Але — і гэта ні для каго не было сакрэтам — яўрэі з першага дня вайны падаваліся пацiху ў эвакуацыю.

У парку, ля дома, у якім размяшчаліся райком і райвыканком, стаяла некалькі фурманак і паўтаратонка. На фурманкі і паўтаратонку грузіліся нейкія паперы. Сярод тых, хто выносіў паперы, Іван убачыў некаторых і райкомаўскіх, райвыканкомаўскіх супрацоўнікаў.

«Што б гэта магло значыць? — падумаў Іван.— Проста выгружаюць непатрэбныя паперы ці... Усё ж рыхтуюцца да эвакуацыі?»

Прывязаўшы каня да канавязі, падышоў да фурманак. Павітаўся са знаёмымі супрацоўнікамі, папытаўся, ці ў сябе Багавік.

— У сябе, у сябе,— адказалі хуценька на хаду яму.

Іван падаўся ў дзверы, але — чаго раней ніколі не было — дарогу яму загарадзіў міліцыянер.

— Дакументы? — спытаў строга.

Іван Дарошка дастаў з нагруднай кішэні партбілет, падаў міліцыянеру. Той доўга ўважліва гартаў яго, паглядзеў, ці заплачаны за апошнія месяцы ўзносы.

— Ідзіце,— дазволіў міліцыянер, сступіўшы ўбок з праходу.

Іван падняўся на другі паверх, дзівячыся, што дзверы ўсіх кабінетаў парасчыняны, на падлозе тут і там валяюцца пад нагамі рознакаляровыя лісткі папер. Зайшоў у дзверы прыёмнай першага сакратара. Сакратарка, убачыўшы Івана, узрадавалася.

— Раман Платонавіч з учарашняга шукае, як бы з вамі звязацца,— заспявала яна сваім пявучым галаскам.— Хацеў ужо чалавека пасылаць, каб вас паклікаць. Пачакайце, у Рамана Платонавіча людзі. Я далажу...

Яна падхапілася з-за стала, жвава затупала да дзвярэй сакратара. Праз хвіліну выбегла з кабінета, сказала:

— Раман Платонавіч зараз вас прыме... Пачакайце...

Сапраўды, не мінула і пяці хвілін, як з кабінета сакратара выйшаў, накульгваючы на левую нагу, незнаёмы

барадаты мужчына. За ім з кабінета выглянуў і сам Раман Платонавіч Багавік.

— Заходзь, Іван Мікалаевіч...

Іван Дарошка падняўся з табурэта, на які быў прысеў, пайшоў да Багавіка. Сустрэўшы працягнутую для вітання руку, моўчкі моцна паціснуў. Раман Платонавіч прапусціў Дарошку наперад, зачыніў за сабою дзверы, папярэдзіўшы сакратарку нікога да яго не пускаць.

Сваім упэўненым размашыстым крокам Раман Платонавіч падаўся да свайго стала, цяжка апусціўся ў крэсла.

— Садзіся і ты, Іван Мікалаевіч, бліжэй да мяне,— паказаў ён рукою на крэсла, што стаяла збоку стала.— Ёсць у мяне да цябе справа. І не адна...

Раман Платонавіч падняў вочы на Івана, і Іван убачыў у вачах страшэнную стому. Чорныя кругі былі пад вачыма, шчокі неяк абвіслі, твар увесь пацямнеў, азыз.

— Ці хоць спіце вы? — спытаў Іван у Багавіка.

— Па дзве-тры гадзіны ў суткі. І то — не выходзячы з кабінета...

Раман Платонавіч уздыхнуў, пакруціў галавою.

— Справы нашы дрэнь,— сказаў ён, трохі пачакаўшы.— Не спынілі немцаў, немцы наступаюць.

— А радыё, што па радыё перадаюць?

— Па радыё? «Нашы войскі з баямі адышлі на новыя абарончыя рубяжы...» — вось сэнс усіх зводак. У руках у ворага Смаленск...

— Ды вы што? — не паверыў, бліснуў вачыма на Багавіка Іван Дарошка.

— Так, Іван, так... І я не хацеў бы верыць, але...

Раман Платонавіч зноў уздыхнуў.

— Днямі немцы занялі Гомель. Так што... У бліжэйшы час яны будуць у Мазыры, а потым і ў Ельніках. Я атрымаў загад рыхтаваць раён да эвакуацыі. Чыгунка ўжо... Нас не ратуе. Што можам — на пераправу цераз Дняпро. Але і там немцы бамбяць. Так што...— Багавік падняў на Івана Дарошку зноў свае стомленыя вочы.— Але паспрабаваць трэба. Падабралі вы там людзей гнаць жывёлу?

— Падабралі,— кіўнуў галавою Іван.

— То заўтра і ганіце.

— Усё гнаць?

— Кароў і коней.

— А авечкі, свінні?

— Пакуль няхай астануцца. Калі сапраўды немцы

будуць блізка — раздайце, што можна, надзейным людзям. І хлеб, які зжалі, таксама малаціце і раздавайце. Астатняе — спаліць.

— Як спаліць? — прыўзняўся, не паверыў таму, што чуў, Іван.

— Так, спаліць. Ты што — не чытаў прамовы таварыша Сталіна?

— Не, не чытаў.

— Я дам табе, прачытаеш. І дырэктывы ЦК КП(б)Б таксама пакажу... Але каб ты ў курсе быў, коратка. Нічога не пакідаць ворагу. Зразумеў? Усё знішчаць, паліць... Немцам пакідаць голую зямлю.

— Але ж... Тут астаюцца нашы людзі! — вырачыў вочы на сакратара райкома Іван.— Ім жа жыць трэба!

— Дырэктыва такая — нічога не пакідаць. Гэта я ўжо адступленне раблю ад дырэктывы, кажу: сёе-тое раздайце надзейным людзям. У любы час яно можа спатрэбіцца нам. Астатняе — спаліць. Ні зерня не павінна трапіць ворагу. Ясна?

— Ясна.

— Далей, слухай мяне. Райком, усе савецкія органы пераходзяць на падпольную работу. Будзем змагацца з ворагам у тыле. І людзей арганізоўваць таксама для барацьбы, ствараць партызанскія атрады. Каб вораг адчуваў сябе не на пакоранай зямлі, а на савецкай. Дзе толькі можна — чыніць яму перашкоды, знішчаць тое, што вораг будзе спрабаваць стварыць. Райком падбірае па ўсіх сельсаветах і вёсках надзейных людзей. Ты трапіў таксама ў лік такіх людзей...

— Дзякую,— кіўнуў галавою Іван.

— Іншага ад цябе я і не чакаў пачуць. Будзем змагацца!

— Будзем! — Іван падняўся, лічачы, што размова скончана.

Але Раман Платонавіч не падымаўся.

— Сядай, Іван, яшчэ не ўсё я табе сказаў...

І, нагнуўшыся, як не на самае вуха, Раман Платонавіч зашаптаў:

— Райком па ўсім раёне стварае базы. Ёсць просьба ці загад — як хочаш, так і разумей — і да цябе. Знайдзі патаемнае месца, пажадана ў лесе. Завязі туды жыта, ячменю, пшаніцы. Словам, чаго можна. Схавай. Аддай трохі збожжа і людзям, у якіх мы можам у любы час узяць. Гэта — раз! Другое... Складзі баявую групу, з якой ты мог

бы на выпадак прыходу немцаў пайсці ў лес. Хто там у цябе надзейны з людзей? Зразумей — ні аднаго чалавека не ўключай, у кім хоць трохі сумняваешся. Ён можа загубіць усю групу. І не толькі групу.

— Я падумаю, Раман Платонавіч.

— Падумай.

— А са зброяй як жа?

— Зброі ў нас трохі ёсць, мы яе... Хаваем. Падзелімся потым, калі не раздабудзеш сам.

— Як жа я яе раздабуду, Раман Платонавіч?

— Раздабудзеш, патрэба прымусіць. Дзе падбярэш тую, што нашы салдаты, адступаючы, згубілі, дзе ў немцаў украдзеш ці адваюеш.

— Ясна, Раман Платонавіч.

— І яшчэ. Завод у Гудове...

— Ну?

— Наш, можна сказаць, з табою завод. Я даў заданне ўсё каштоўнае, што там ёсць, дэманціраваць. Астатняе, што астанецца, трэба будзе спаліць.

— Як — спаліць? Ды Раман Платонавіч...— Голас у Івана Дарошкі сарваўся ледзь не на крык.— Хіба можна?..

— Усё можна,— сцяўшы зубы, жорстка, вельмі жорстка адказаў Раман Платонавіч.

— Рукі не падымуцца. Ды там жа... Амаль кожны шрубок, кожная гаечка намі абмацана, абгледжана... Можа, немцы ненадоўга? Можа, яны праз дзень-два назад адступяць?

— Самі немцы не адступяць. Іх прагнаць трэба. І колькі немцам быць тут... І ад нас залежыць. Хачу, каб ты зразумеў гэта.

Раман Платонавіч падняўся з-за стала, задумліва прайшоўся па кабінеце. Вярнуўся да стала, пастаяў, паглядзеў у акно. Сказаў цвёрда, быццам пераконваў не толькі Івана Дарошку, але і самога сябе:

— Багата чаго давядзецца рабіць такога, на што рукі падымацца не будуць. Ды нідзе не дзенемся — загады выконваць трэба. Інакш... Мы не салдаты. Зразумей — мы ворагу не павінны нічога пакінуць, што б ён мог спажыць ці скарыстаць супраць нас...

— Але ж... Каб сваімі рукамі... Завод... Хлеб...

Раман Платонавіч нагнуўся, высунуў са стала шуфляду, дастаў кіпу газет:

— На́,— падсунуў газеты Івану Раман Платонавіч.—

Пачытай. Тут і выступленне Молатава, тут і прамова таварыша Сталіна... А потым я дырэктывы ЦК КП(б)Б пакажу... І табе многае стане зразумела...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

З Ельнікаў у Вялікі Лес Іван Дарошка вяртаўся надвячоркам. Вяртаўся зусім іншым чалавекам. На падводзе ў яго, пад сенам, загорнутыя ў прамасленую мешкавіну, ляжалі дзесяць вінтовак, дзве скрынкі патронаў; кішэню пінжака адцягваў новенькі, зараджаны і пастаўлены на засцерагальнік наган...

## XVI

*З дзённіка Тасі Несцяровіч*

Татачка!

Мы з мамай усё яшчэ ў дарозе. Здаецца, мінула цэлая вечнасць, як пакінулі Вялікі Лес, выправіліся дадому, у Мінск, да цябе. І бачыш — дабрацца не можам. Ты даруй, татачка, што я даўно з табою не размаўляла. Ведай — я пра цябе не забывала і не забываю ўсе гэтыя дні. Проста не было дзе прысесці і расказаць пра тое, што бачыла і перажыла. А бачыла і перажыла я такое, пра што і ўспамінаць не хочацца. Гэта — быццам непраўдападобны, страшны сон. Нас па некалькі разоў на дзень бамбілі і абстрэльвалі нямецкія самалёты. І не толькі на шашы, а ўсюды, куды б мы ні памкнуліся, нават на звычайнай вясковай дарозе. Аж не верыцца, што мы з мамаю яшчэ жывыя. Асабліва калі паглядзелі, колькі жанчын, дзяцей, мужчын ляжыць скрозь паўз дарогі забітых. І ніхто іх не хавае — няма калі, кожны ўцякае, ратуецца, як можа, сам ад смерці. Раней хоць па начах можна было смела ісці. Цяпер жа і гэта нельга — па дарогах усюды нямецкія парашутысты. І яны, гады, без усякага папярэджання страляюць з аўтаматаў і кулямётаў па кожным, хто адступае. І па нас з маці некалькі разоў стралялі. Добра, што мы ніколі не ідзём першыя, стараемся трымацца ў сярэдзіне людскога натоўпу. Як толькі што — падаем і адпаўзаем убок, хаваемся за дрэвы, пні, купіны ці ў разоры... Собіла ж нам у такую развалюху выбрацца ў дарогу. І назад, у Вялікі Лес, ужо не вернешся, і наперад ісці, калі ўсюды, куды ні паткнешся, немцы... Словам, мы спыніліся. Не ведаю, ці надоўга, але спыніліся. Натрапілі на пустую хату — нам сказалі:

жыхары гэтай хаты падаліся ў бежанцы — і вырашылі далей не ісці, чакаць. Чаго чакаць — мы і самі не ведаем. У вёсцы гэтай — вёска называецца Запясочча — гавораць, што немцы ўжо ўзялі Мінск, баі ідуць пад Смаленскам. Але мы з маці не верым гэтаму.

Як ты там, татачка? Мы ж пра цябе не маем ніякіх звестак. Думаем толькі, гаворым іншы раз з маці — а калі і праўда немцы ўзялі Мінск? Што тады з табою яны зробяць? Ды і дзе ты? Што жывы — мы не сумняваемся. Не можаш ты загінуць, не пабачыўшыся з намі. Не можаш! Ты павінен гэта ведаць і жыць, жыць, жыць! Як і мы жывём, жывём дзеля цябе. Бо маглі сто, тысячу разоў ужо загінуць. А бачыш жа — не загінулі, жывём, хоць і згаладаліся надта ж, падбіліся ў дарозе. Ног не чуем — ад стомы адымаюцца яны ў нас. Валімся, дзе стаім, і засынаем.

Не ведаю, колькі мы прабудзем у Запясоччы. Мама кажа, пачакаем, можа, трохі схлынуць немцы. Ды і адпачнём. А я... Не хачу чакаць, ісці хачу ў Мінск...

Людзі ў Запясоччы добрыя, душэўныя. Ніколі не думала раней, што ў нас усюды такія харошыя людзі. І ў Вялікім Лесе, і ў дарозе, і ў Запясоччы. Кожны спачувае, памагае чым можа, дзеліцца апошнім. І тут вось людзі і малака нам прынеслі, і хлеба. І ніхто платы ніякай не патрабуе. Ды ў нас... І плаціць няма чым. Усё, што захапілі ў дарогу, ці пакідалі, ці пагублялі.

Не развітваюся, можа, сёння ўдасца з табою яшчэ пагаварыць. Мы ж, як-ніяк, у хаце. Ёсць дзе і ад дажджу схавацца, і паспаць. Маці дык вунь на ложак упала і сцішылася, мусіць, спіць. Стамілася яна вельмі ж за дарогу. А я... Вось адпачыла трохі і зноў магла б ісці. Але, татачка, пакуль пачакаем. Можа, і сапраўды трохі схлынуць немцы. Не магу глядзець я на іх — паўзуць, як вусені, і паўзуць. На машынах, танках, матацыклах і проста пехатою... Самазадаволеныя, упэўненыя...

Толькі цяпер я ацаніла, што значыць мір, быць у хаце, нічога не баяцца. Якое гэта вялікае шчасце! Нават калі хата тая і чужая... Вось выцягнула я на лаве ногі, схілілася над сталом — і адчуваю, як падбіраецца да мяне, ахоплівае ўсю, спавівае дрымота, сон. Бывай, татка, бо я ўжо амаль сплю... Усё ж і я стамі...

## XVII

Размова з Іванам Дарошкам толькі на першы погляд быццам ставіла ўсё на сваё месца. На самай жа справе яснасці яна ні ў што не ўносіла, наадварот, уносіла разлад, буру ў думкі і ў душу Апанаса Харчэні, пераварочвала з ног на галаву тое, што адклалася, усталявалася за гады і ўжо нават здавалася, што будзе вечна такім, як яно было і ёсць. Дзён колькі Апанас Харчэня не выходзіў са свайго двара. Калупаўся ў гародзе, памагаў маці акопваць і палоць грады, папраўляў плот, ставіў падпоры пад яблыні ў садзе. І думаў, думаў пра ўсё, што здарылася, так нечакана яго напаткала. Не, ён не рваўся да пасады сакратара, не імкнуўся, чаго б гэта ні каштавала, утрымацца,— яму незразумелы быў яшчэ смак улады, ён не адчуваў ад свае пасады вялікай радасці. Кранала за жывое іншае — ён, аказваецца, не такі, як усе, у яго ёсць тое, чаго ў большасці людзей няма і што не толькі сёння замінае яму, а будзе замінаць і ў будучым, можа, нават усё жыццё. А ён жа, Апанас, марыў, папрацаваўшы некаторы час у сельсавеце, паступіць вучыцца. Нават факультэт выбраў сабе — гісторыка-філалагічны. Гісторыя вабіла Апанаса, каб яе вывучаць і ведаць, бо надта ж яна цікавая. Проста аж не верыцца, што на зямлі да нас жыло столькі людзей, было гэтулькі самых розных дзяржаў, улад і ўладароў. І ўсяго таго няма. Дзяржавы распаліся, узніклі новыя. Тыя народы, якія ўладарылі, самі падпалі пад прыгнёт. Што ўжо казаць пра розных каралёў, цароў — былі яны жывыя, перад імі ўсе падалі на калені; памерлі ж — і забыліся, што яны былі... Гэта — калі браць наогул гісторыю, даўніну. А калі звярнуцца да больш блізкага, Беларусі, напрыклад, ці нават свайго палескага краю, той вёскі, дзе жыў і жывеш. Колькі чаго тут адбывалася да нас? І як мала гэта вывучана, як мала мы пра тое, што было нават сто, пяцьдзесят гадоў таму назад, ведаем. Андрэй Макаравіч, дырэктар школы, пасеяў у душу яго, Апанаса, зерне любові да гісторыі, і ён, Апанас, бачыў, адчуваў: не можа ўжо жыць, каб не вывучаць мінулага. Бо толькі супастаўляючы з мінулым, можна па-належнаму ацаніць сучаснае, без мінулага нельга ведаць, уяўляць будучыні. Дый... Па зямлі ж, па якой мы ходзім, хадзілі да нас людзі. Што яны думалі, адчувалі, куды, да чаго імкнуліся?..

Было і яшчэ адно жаданне ў Апанаса, што гнала яго менавіта на гісторыка-філалагічны факультэт. Апанас даў-

но, хаваючыся ад сваіх равеснікаў, складаў вершы. Вершы тыя былі не зусім яшчэ дасканалыя, гэта Апанас і сам ведаў, а ўсё ж... Гэта былі вершы. Яны нараджаліся неяк неспадзявана і клаліся, здаецца, самі на паперу. Узнікала невядома адкуль музыка, потым тая музыка сама сабой вылівалася ў словы. Словы нізаліся ў радкі, узнікаў малюнак, малюнак набываў закончанасць і сэнс. Аднекуль раптоўна ўспыхвала думка, пранізвала наскрозь толькі што народжаную музыку. Лішняе адпадала, як усё адно гліна, калі што-небудзь лепіш. І... верш гатовы. Ахапляла радасць — глядзі, я напісаў верш... Вядома, не такі, як у Пушкіна ці Купалы, а ўсё ж... верш. «Каб паехаць, падвучыцца трохі... Тады б... Можа б, і ў мяне лепшыя вершы складіся...» — думаў Апанас. Думаў і чытаў, упарта чытаў то гісторыю, то падручнікі па літаратуры і мове — рыхтаваўся паступаць у інстытут ці ва універсітэт. І раптам... Ананімка гэтая, дзядзька... «Ды калі... У райком напісалі, дык і ў іншае месца напісаць могуць. І знайшлі ж чым папракаць... Дзядзькам... А дзядзька той, як загінуў у лесе бацька, і носа ў хату іхнюю не паказаў. Быццам і не родны бацькаў брат быў, быццам і не пляменнік яму ён, Апанас... Чужыя людзі памагалі, а дзядзька... Ніколі і на сваім полі надта не шчыраваў. Хлебам яго не кармі, дай паразважаць, паказаць асабліва перад новым, прыезджым чалавекам, які ён разумны, начытаны, як многа ўсяго ведае. Вось язык і нарабіў ліха. І не толькі дзядзьку самому, а і іншым. Ды калі нельга мне за сакратара ў сельсавеце быць, то... Ці дазволяць вучыцца ў інстытуце, універсітэце?»

Думкі, што ўзнікалі ў галаве, клапацілі, трывожылі Апанаса; не разагнала, не развеяла іх нават вайна. Бо вайна — гэта для Апанаса было нешта далёкае, яго, усю іхнюю сям'ю яна мінала. Ісці ў войска з іхняй хаты не было каму, а што да немцаў... Дык Апанас упэўнены быў, перакананы — Чырвоная Армія разаб'е немцаў. І тыдня не пройдзе — вайна скончыцца. І перамога не хто-небудзь, а мы, савецкія людзі, Савецкая дзяржава.

У Апанаса было сваё гора, і яно, тое гора, засланяла гора іншых...

Ішлі дні, і боль у Апанаса то ўлягаўся, то зноў выбухаў з новай сілай. Часамі здавалася: ніякай трагедыі не адбылося. «Нельга працаваць у сельсавеце? Ну дык і што... Хіба іншай працы няма?.. А ў інстытут... Раптам прымуць? Адкуль я ўзяў, што не прымуць?.. Тым больш паступаць я збіраюся на завочнае... На дзённае матэрыяльна

не выцягну, бо памагаць няма каму... А не паступлю — жыць і без інстытута можна. І гісторыю можна вывучаць, і вершы пісаць...»

— Нічога, мама, як-небудзь пражывём,— суцяшаў, супакойваў Апанас у такія хвіліны не так сваю маці, якая ўсё глядзела і глядзела на сына журботнымі, поўнымі слёз вачыма, як сябе.— Не прападзём!..

Але хвіліны спакою змяняліся хвілінамі роспачы. Узнікала жаданне ні дня не быць больш у вёсцы, з'ехаць адсюль. Куды з'ехаць — Апанас не ведаў, толькі адчуваў — трэба з'ехаць. «Там, куды я паеду, ніхто пра дзядзьку ведаць не будзе, ніхто дзядзькам не папракне...»

Няўдачы Чырвонай Арміі, наступленне немцаў устрывожылі, занепакоілі Апанаса. «Так, чаго добрага, немцы і сюды, у Вялікі Лес, прыйдуць. А што — Мінск вунь, кажуць, ужо ўзялі, баі ідуць недзе пад Смаленскам. А прыйдуць немцы сюды, у вёску, што, што тады рабіць мне? Камсамолец жа я і ў сельсавеце працаваў. Што мяне прымусілі пайсці з пасады — гэта... Гэтым не апраўдаешся...»

І Апанас, нічога не гаворачы маці, пачаў рыхтавацца да таго, каб пакінуць Вялікі Лес. «Па-першае, не буду пад немцамі. Па-другое... І выпадак быццам зручны — пайсці ў бежанцы, а там... Відаць будзе, як быць і што рабіць? Шкада, вядома, пакідаць маці, вёску. Але ж... Не аставацца ж вечна тут, у занядбанні, ды яшчэ калі немцы...»

Жаданне пакінуць вёску, пайсці ў бежанцы спела з кожным днём, набывала акрэсленасць і накіраванасць. «Там ніхто мяне ведаць не будзе. Я буду такі ж, як і ўсе...» І аднойчы Апанас асмеліўся, сказаў маці:

— Мама, збірай мяне ў дарогу.

— У якую дарогу? — са страхам паглядзела на сына маці.

— Пайду я...

— Куды ты пойдзеш, сынок?

— Куды людзі ідуць.

Адчуваючы, што не пераканаў дастаткова маці, дадаў:

— У бежанцы.

Маці як стаяла пасярод хаты, так і загаласіла:

— Сыночак, у якія бежанцы? З дому, у такі неспакойны час?..

Апанасу і самому не вельмі хацелася пакідаць вёску, родны кут. Але ж і аставацца... І ён сказаў маці:

— Сюды немцы хутка прыпруцца.

— Адкуль ты ета ўзяў? — вырачыла на сына заплаканыя вочы маці.— А раптам іх не будзе?

— Будуць,— упэўнена адказаў Апанас.

— А хоць і будуць — што ты немцам тым зрабіў, каб цябе страляць ці вешаць? — са слабаю надзеяю ў голасе спытала ў сына маці.

— Я ж, мама, камсамолец. Дый у сельсавеце працаваў...

— Цябе ж з сельсавета,— маці хацела сказаць: «прагналі», але не сказала.— З сельсавета цябе ж... Цябе ж...

І не знайшла слова, каб і праўду сказаць, і сына не пакрыўдзіць.

— Гэта, мама, нічога не значыць. Немцы — чужакі, лепш не знацца з імі. А гаварыць, даказваць...

— Чаму ж? Калі трэба, дык трэба і гаварыць. І людзі пацвердзяць...

— Не, мама,— стаяў на сваім сын.— Я пайду. І мне лепш будзе, і табе...

Вечар цэлы прагаварылі сын з маці. Адзін адно даказваў, другі — другое. І не пераканалі: сын — маці, маці — сына. Кожны астаўся пры сваіх думках.

— Нельга мне, мама, быць у Вялікім Лесе. Я гэта адчуваю, ведаю...

Маці таксама ўсведамляла, разумела, што сыну лепш, вядома, не быць тут, пад немцамі, лепш сысці куды-небудзь. Але і адпускаць аднаго сына з дому, ды яшчэ ў такі час... Не хацелася, ой як не хацелася ёй!

— Куды ты пойдзеш? — плакала і плакала яна.— Што было б ужо, тое было б, нават калі немцы прыйдуць... А так... Дзе ты будзеш? Сэрца ж маё крывёю будзе кожны дзень абліваццa, я ж не спацьму, не есціму, усё думацьму, дзе ты, што з табою...

І ўсё ж, пагаварыўшы яшчэ і дзень, і вечар, даказаў, як падалося, Апанас маці, што нельга яму чакаць немцаў, трэба рушыць у дарогу.

— А калі немцы і туды дапнуць, куды ты ісці сабраўся? — пытала, не трацячы надзеі, што пераканае сына, не пойдзе ён з дому, маці.

— Далей пайду. Савецкі Саюз вялікі, хопіць месца...— упэўнена цвердзіў сваё Апанас.

— А раптам і туды дойдуць?

— Не, мама, у немцаў не так багата людзей, каб хапіла іх на ўсю нашу зямлю. Дый ніхто ж самахоць фашысц-

кае ярмо на шыю не надзявацьме, змагацца з навалаччу будуць...

Пашыла, абліваючыся слязьмі, маці Апанасу з новага палатна торбу, наладавала яе рознай ядой. І аднаго дня, досвіткам, правяла сына з хаты за вёску. Доўга глядзела, стоячы на дарозе, як аддаляецца і аддаляецца сын, доўга і сын адварочваўся, азіраўся, глядзеў і глядзеў на маці — тая таксама аддалялася і аддалялася з кожным новым яго крокам. Наперадзе ў Апанаса была невядомасць, яна насцярожвала і разам з тым вабіла. Тое ж, што аставалася тут, у Вялікім Лесе, палохала.

## XVIII

Кароў і коней выганялі з вёскі раненька, яшчэ да ўсходу сонца. Здаецца ж, і не казалі вельмі каму, што пагоняць у тыл, дзе немцаў няма і куды чужынцы, пэўна ж, не дойдуць, каб потым, калі скончыцца вайна, вярнуць іх назад у свой калгас, а вёска аднекуль пра ўсё пачула, даведалася. І дарослыя, і дзеці павыходзілі з хат. Стаялі сем'ямі ля сваіх варот, глядзелі, як брыдуць, капыцяць вясковую вуліцу спярша каровы, потым коні, і кожны адчуваў: не будзе больш бачыць ні гэтых кароў, ні гэтых коней. Апошні, апошні раз іх бачыць. І каровы, коні таксама, мабыць, адчувалі тое самае. Бо раз-пораз каровы рыкалі, выцягваючы далёка наперад і прыпадымаючы галовы; коні ж білі капытамі зямлю, няўцешна і сумна-сумна ржалі. Сёй-той з велікалесаўцаў не вытрымліваў, пытаў у пастуха Хомкі, які гэтак жа, як і заўсёды, ішоў з даўжэзнаю пугаю-смалянкаю ў канцы чарады:

— Ці ж хоць ведаеш, куды гоніш, га?

— Куды скажуць, туды і паганю,— адказваў няпэўна нешматслоўны Хомка.

Услед за калгаснай чарадой ехала падвода, на якой важна сядзела, быццам выправілася на кірмаш, Клаўдзя, Піліпа Дарошкі жонка, і дачка Мацея Тхорыка — Надзя. Кіравала канём Клаўдзя, неяк нібыта звысоку паглядаючы на тых людзей, што павыходзілі са сваіх двароў і праводзілі вачыма калгасных кароў і коней — апошніх гналі табуном услед за каровамі,— седзячы самі верхі на конях, аднавокі конюх Базыль Раманюк і яго памочнік маларослы хваравіты Хведзька.

А яшчэ праз некаторы час стала вядома, што некуды падаліся — ці не ў бежанцы? — і дырэктар школы Ан-

дрэй Макаравіч Сушчэня са сваёй жонкай — настаўніцай Алінай Сяргееўнай. Падаліся, мабыць, уночы, бо ўдзень іх ніхто не бачыў і не мог сказаць, пайшлі яны пешкі ці на чым-небудзь паехалі. Пранеслася па вёсцы чутка, што не відаць, недзе знік з Вялікага Лесу і Апанас Харчэня...

— Уцякаюць. Усё адно як прусы перад халадамі, уцякаюць,— гаварыла, беручы ваду, ля калодзежа Бабаева Сонька жанчынам, і ўсе жанчыны ведалі: не свае словы паўтарае Сонька, а чые — думалі: ці не Яўхімавы?

А жыццё не спынялася — ішло. Штораніцы ўзыходзіла з-за лесу сонца, спявалі, апантана высвіствалі, як і заўсёды ў летнюю пару, птушкі, плылі, мірна беглі па небе воблакі, хмаркі. Людзі палілі ў печах, гатавалі яду, снедалі, абедалі — здавалася, жылі сваімі звычайнымі будзённымі клопатамі. Услед за касавіцай неяк незаўважна падкацілa на бухматым залацістым возе жніво. І людзі, прывыкшы за гады калгасаў працаваць разам, гуртам, хадзілі і цяпер на палеткі ўсёй вёскаю з сярпамі, жалі рослае жыта і каласісты ячмень, скручвалі перавяслы, вязалі тугія, ёмкія снапы, ставілі іх у бабкі, каб падсыхалі. На ні навошта не вартых, нядошлых конях — тых, што не пагналі, пакінулі ў калгасе,— звозілі снапы да гумнаў і адразу ж малацілі — такі быў загад старшыні калгаса Васіля Кулагі.

Па вечарах жа, павыходзіўшы на вуліцу, збіраліся ў купкі, абмяркоўвалі навіны, тое, што ўдавалася каму-небудзь пачуць ці выдумаць; найбольш жа, вядома, гаварылі пра мужчын, каго мабілізавалі і ад каго ніхто пакуль што не меў ніякіх пэўных звестак. Жанчыны, чаго ніколі раней не было ў Вялікім Лесе, прылаўчыліся нават варажыць. Асабліва поспеху дамаглася Тхорыха, бо варажыла і на картах, і на «дыму». Платы за сваю варажбу яна не брала, таму вечарамі ў яе хаце не зачыняліся дзверы — ішлі і ішлі людзі.

Не вытрымала, пакіравалася аднаго дня да Тхорыхі і Параска, дачка Мікалая Дарошкі. Надта ж дакучалі думкі, хацелася хоць што-небудзь даведацца і пра мужа, Хведара, і пра брата, Піліпа: «Дзе яны?»

Да Тхорыхі Параска выбралася пазнавата, падаіўшы карову і паўкладаўшы дзяцей спаць. Балазе — жылі адна ад адной недалёчка, якія дзесяць хвілін хады. Перабегла Параска вуліцу, весніцы, а потым і дзверы ў хату да Тхорыкаў адчыніла — і адступілася, закашлялася:

— Кахі-кахі-ках!..

Усё ж, прыкрываючы нос і рот рукамі, пераступіла парог, сяк-так — у хаце было зусім цёмна — дабралася да лавы, села. Калі вочы трохі прывыклі да цемры, убачыла: хата поўная дыму. Дым вісеў хмараю пад столлю, плаваў ад акна да акна, валам валіў у дзверы, калі тыя то адчыняліся, то зачыняліся — заходзілі і выходзілі людзі. Асвойтаўшыся, Параска ўбачыла і жанчын, што сядзелі на лаве, а хто і стаяў, проста не ведаючы, дзе прыткнуцца. Пазнаць нельга было нікога, бо жанчыны былі быццам у вадзе, плавалі, мільгалі кавалачкі — то рука, то твар. У хаце чырванеў, гарэў на комінку корчык лучыны, і то нясмольнай.

— Ціха, бабы,— камандаваў аднекуль з печы голас Тхорыхі, хоць у хаце і так было зусім ціха.— Загадвайце, хто на каго хоча...

— А як ета — кахі-ках! — загадваць? — спытала, усё ніяк не могучы адкашляцца, Параска.

— Вочы заплюшчы і загадвай на таго, каго хочаш убачыць. А як лямпу я запалю — расплюшчыш вочы. Дым плыве — значыцца, жывы той, на каго ты загадала. Не плыве — значыцца, няма яго, мёртвы...— тлумачыла Тхорыха.

— А глядзець куды, дзе дым той павінен стаяць ці плаваць? — не магла зразумець, як гэта варажыць на «дыму», Параска.

— А во, выберы сабе месца. Можаш у кут глядзець, можаш на акно, можаш на дзверы...

Загадала Параска першы раз на Хведара, мужа.

— Усе загадалі? — пачуўся голас Тхорыхі.

— Усе,— нядружна адказалі жанчыны.

— Палю лямпу! — камандавала Тхорыха.

Расплюшчыла вочы Параска, глянула на тое месца, на якое загадала — на акно! — рухаўся, плыў дым.

— Жыве мой Хведар,— узрадавалася ўголас Параска.

— А майго няма-а,— загаласіла побач з ёю Дзям'яніха, Аўдуля, жонка Дзям'яна Сучка́.

— Не плач, Аўдулечка,— супакойвала Аўдулю Тхорыха.— Ты на што загадвала?

— На кут,— адказала Аўдуля.

— А ты... На акно загадай... На акно куды лаўчэй, ды і выпадае заўсягды лепей...

Загадала Аўдуля на акно — выйшла, жыве яе Дзям'ян. А Параска на дзверы загадала другі раз, на Піліпа, бо на

адно месца двойчы, выявілася, загадваць нельга было. І выпала — не рухаўся дым...

Праветрыўшы хату, папрасілі жанчыны на карты павааражыць Тхорыху. Тхорыха ахвотна згадзілася. Запаліла лямпу, на стол паставіла. Калоду карт з куфра дастала, сапраўдных, куплёных, хоць і старых, замурзаных, пачала варажыць. Карты паказалі — Хведар у дарозе, жывы, здаровы. А Піліпу ўсё чорная карта падала... Тры разы Тхорыха раскідвала карты — і кожны раз чорная масць...

З нялёгкім сэрцам выйшла з хаты ад Тхорыхі Параска. Пастаяла на двары, удыхаючы свежае, настоенае на пахах травы і бульбоўніку паветра, і ўсё ж не прамінула бацькаву хату — зайшла.

У хаце былі бацька, Мікалай, і Хора. Бацька плёў лапці, а Хора нешта мыла, сагнуўшыся над цэбрам,— ага, посуд пасля яды. Косціка дома не было.

Павітаўшыся, Параска прысела на лаву, спытала ў бацькі, дзе Косцік.

— А ліха яго ведае,— адказаў бацька.— Шастае дзесь.

— А так што чутно ў вас? — загаварыла, трымаючы на сэрцы нялёгкі цяжар і не могучы з ім саўладаць, Параска.

— А дзе што пачуеш? А калі і пачуеш — верыць таму? — глядзеў на дачку бацька.— А ты дзе ета была? — спытаў.

— У Тхорыхі.

— Чаго ета ты да яе?

— Паваражыць хадзіла,— прызналася Параска.

— Ну, і што ты выварàжыла? — з цікавасцю падняў вочы на дачку бацька.

— Пра Хведара добрае.

— А пра Піліпа? Не варажыла?

— Варажыла.

— Ну і што?

— Чорная карта падае на Піліпа,— прызналася Параска.

— Чорная? — аж зжахнуўся, перастаў плясці лапаць Мікалай. Пачакаў, падумаў.— Сон днямі сніў,— сказаў сумна, быццам глытаючы нешта.— Таксама нядобры...

— А што ты сніў?

— Па ўюны з Піліпам хадзілі...

— Дак па ўюны ета ж добра!

— Хто табе казаў, што добра?

— Усе кажуць. Ета калі сняцца ўюны, значыцца, на добрае,— павесялела, узрадавалася Параска.

Хора выпрасталася, мабыць, скончыла мыць, падышла да Парасکі.

— З Піліпам усё добра,— сказала яна.— Было нядобра, а цяпер добра.

— Адкуль ты ета ўзяла? — спытаў, як бы спалохана, Мікалай.

— Узяла. Сны не толькі вам сняцца, а і мне...

І пайшла, быццам пакрыўджаная, з хаты...

Пайшла, трохі пасядзеўшы і пагаманіўшы пра тое-сёе, звыклае, будзённае, дадому і Параска. Ноч ужо была на дварэ. Ды такая цёмная, што дарогі пад нагамі не відаць. Ні зоркі нідзе, ні месяца.

Ішла Параска, беручыся бліжэй да платоў, дзе цубчэй было, не так пяску шмат, а думкі яе віліся вакол аднаго і таго ж — дзе цяпер Хведар, што з Піліпам? Ці жывыя яны хоць? Варажба ані не супакоіла Параску, наадварот, пасеяла ў душы яшчэ большую няпэўнасць, трывогу.

«Не пайду больш да Тхорыхі варажыць. І ні да каго не пайду,— вырашыла Параска.— Такая там варажба... Што тая Тхорыха ведае, знахарка знайшлася... От, тлуміць людзям галовы. І мне, бач, затлуміла...»

## XIX

Надышлі часы, калі і Івану Дарошку давялося ўзваліць на плечы двайную ношу. Удзень ён, як і звычайна, бываў у сельсавеце, займаўся будзённымі справамі, да якіх прывык за гады старшынёўства, а ўночы... Падрамаўшы трохі, правільней, пачакаўшы, калі засне вёска, запрагаў коніка і ехаў на калгасны ток. Грузіў там мяшкі са збожжам, якія пакідаў у саломе Васіль Кулага, і кіраваўся то ў Гудоў — там жыло некалькі сем'яў, якім Іван давяраў,— то ў лес. У Гудове збожжа Іван згружаў у хлеўчукі ці хаты, прасіў людзей захаваць да таго дня, калі ён, Іван, не скажа аддаць. А ў лесе... У лесе Іван браў рыдлёўку, капаў, найчасцей на былых паташнях, ямы, абкладваў іх бяростаю, саломаю і ссыпаў туды зерне. Ямы тыя потым, калі яны запаўняліся збожжам, зноў абкладаў бяростаю і саломаю, засыпаў зямлёю, закідваў зверху ламаччам.

Васіль Кулага памагаў Івану. Ён і ямкі хадзіў капаць сам у лес, і, запрогшы калгасных коней, вазіў разам з Іванам па начах збожжа. Не ўсё, не ўсё ведаў Васіль Кулага,

дзеля чаго спатрэбілася раптам хаваць збожжа, але загад райкома партыі выконваў. Дый, мусіць, здагадваўся, адчуваў — значыцца, ёсць такая неабходнасць — хаваць збожжа.

З Іванам Дарошкам Васіль хоць і бачыліся штодзень, але гаварылі мала. А калі і гаварылі, дык не ўвогуле пра ўсё, а пра канкрэтнае, тое, што трэба было зрабіць неадкладна, сёння ж. Толькі неяк, калі вярталіся з чарговай начной паездкі ў лес, Васіль, прывязаўшы сваіх коней лейцамі да біла Іванавага воза, каб ішлі яны ўслед па дарозе, сам перасеў да Івана і загаварыў пра тое, што яго хвалявала:

— Іван, па ўсім адчуваецца — немцы хутка прыйдуць сюды, да нас. Што з сем'ямі рабіць, га?

Іван некаторы час маўчаў, не ведаючы, прызнавацца ва ўсім шчыра Васілю ці... Лепш усё ж пра сёе-тое не гаварыць.

— Сам пра тое ж думаю,— сказаў нарэшце Іван.— Які ўжо дзень думаю...

— І да чаго схіляешся?

— Ведаеш, у мяне прасцей.

— Чаму?

— Бачыш, у мяне жонка не тутэйшая. Не хоча яна ў Вялікім Лесе аставацца. Пакуль я тут — і яна тут. А калі я пайду...

— Выбачай, а куды ты можаш пайсці? — перапыніў Івана Васіль.

— Некуды ж трэба ісці. Не сядзець жа дома склаўшы рукі, не чакаць жа, калі прыйдуць немцы і застрэляць.

— Не таіся, Іван, хоць ад мяне,— нейкім плаксівым голасам зусім апанурана папрасіў Васіль.— Абодвум нам цяжка цяпер. А мне... У мяне жонка яшчэ... Як толькі што, дык і пачынае: «Трэба было табе тое начальства... Трывогі ніякай не мелі б. І ты, і мы... А так...»

— Не таюся я, Васіль. Не, не таюся. А што кажу табе не ўсё, дык ты мяне зразумей. Ёсць рэчы, пра якія не павінен ніхто пакуль што ведаць. Не толькі ты. Ваенная тайна. Разумееш?

Васіль доўга маўчаў.

— Ну калі ты мне не хочаш адкрывацца, дык я табе скажу,— загаварыў зноў таямніча і сцішана Васіль.— Да фронту цяпер далёка... Каб і хацеў, не дабярэшся. Таму, як я разумею, мы будзем аставацца ў вёсцы да апошняга...

— А тады?

— Не ведаю, якое заданне атрымаў ты, а я... У лес пайду.

— І што ты ў лесе будзеш рабіць?

— Напачатку хавацца. А потым... Можа, і пlivaяваць давядзецца. Многае будзе залежаць ад таго, як доўга немцы ў нас будуць. А ты?

— Я... Тое самае, што і ты, буду рабіць. Толькі хавацца не збіраюся. З першага дня ваяваць буду. І заданне такое атрымаў ад райкома — гуртаваць людзей і ваяваць. Каб немцы не адчувалі сябе тут гаспадарамі, каб ім тут горш было, як на фронце...

— Бачыш, заданне атрымаў гуртаваць людзей,— упікнуў Васіль Івана,— і не гуртуеш. Ад мяне нават хаваешся.

— Не хаваюся, Васіль, а прыглядаюся.

— Да мяне, да мяне прыглядаешся? Эх...

Было цёмна, але і ў цемнаце Іван убачыў, як злосна махнуў Васіль рукою — пакрыўдзіўся.

— Не крыўдуй. З табою я пагаварыць збіраўся. Але не цяпер — пазней.

— Дык цягнуць жа няма ўжо куды! Немцы вось-вось тут аб'явяцца.

— Ельнікі ж яшчэ нашы.

— Ельнікі могуць пазней узяць, чым Вялікі Лес. У нас жа... Чыгунка недалёка...

Іван і забыўся — немцы сапраўды маглі ў Вялікі Лес прыйсці і з Гудова, прыехаць па чыгунцы. Васілю ж сказаў:

— Не панікуй.

— Я не панікую. Але ж... Адчуваю — блізка ад нас ужо немцы. І ведаеш, па чым адчуваю?

— Ну?

— Мужчыны дадому вяртаюцца.

— Якія мужчыны?

— Тыя, што фронт кінулі, дадому паўцякалі.

Іван аж прысвіснуў — не паверыў.

— Хіба ёсць такія?

— Ёсць!

— Хто, напрыклад?

— Яўхім Бабай. Хіба ты забыўся? І Тхорыка надоечы бачыў я.

— Тхорыка?

— Ага. Раненька неяк на ферму я па вёсцы ішоў. Бачу — па гародах да лесу нехта крадзецца. «Хто?» Пры-

гледзеўся — Тхорык. Мусіць, на ноч дадому ў хату сваю наведваўся. Аставацца ж у вёсцы на дзень — баіцца. Во па чым і мяркую — немцы блізка.

— Няўжо, што ты гаворыш,— праўда?

— А то я маніў бы,— зноў пакрыўдзіўся Васіль.

— А я ж... Прызнаюся табе, ніколі не думаў, што знойдуцца сярод нашых такія. Лічыў — контраў мы ўсіх каго павысылалі, каго пазнішчалі...

— Гэ-э,— заўсміхаўся па-дзяцінаму дабрадушна Васіль.— Можа, гэта і не контры, як ты іх называеш, а звычайныя баязліўцы. Загінуць не хочуць, вайны спалохаліся.

— І такіх да пазногця трэба!

— Пачакай, не спяшайся. І так вунь колькі ўжо ворагаў былі нарабілі. Разабрацца трэба...

— А што тут разбірацца? Не на фронце, значыцца, вораг.

— Дык і мы ж з табою не на фронце?

— У нас другое дзела,— і, вяртаючыся да ранейшай гутаркі, сказаў: — А што да таго, як ты гаворыш, быццам немцы блізка, дык... Блізка — гэта яшчэ не тут. А таму — падрыхтавацца нам трэба і сустрэць па-належнаму немцаў. Каб нясоладка ім было тут...

— Дык мы ж, па-мойму, і рыхтуемся.

— Пра людзей трэба падумаць, каго б можна было ў лес з сабою забраць. І пра зброю.

— Пра зброю варта падумаць. А вось пра людзей...— Васіль уздыхнуў.— Цяжка нам будзе пакуль што з людзьмі. Бачыш, мае здагадкі пацвярджаюцца — будуць, мабыць, тыя, хто не супраць і пры немцах пажыць, нямецкага, сабачага, хлеба паесці.

— Няўжо і такія будуць?

— Будуць, Іван, будуць. Таму ты тут недзе правільна асцярожнічаеш. Бо ўпэўненым да канца нават у сабе... Нельга быць. А ў людзях... Пачакаем давай, хто як павядзе сябе пры немцах. Тады і падбяром.

— Я асцярожнічаю, а ты яшчэ больш.

— Тое, што мы збіраемся рабіць, патрабуе асцярогі.

— Правільна ты кажаш. І пра сем'і, між іншым, таксама правільна, што клапоцішся. Я сваю сям'ю днямі думаю адправіць...

— Куды? — зацікавіўся Васіль.

Іван зноў задумаўся — казаць Васілю праўду ці... умоўчаць? «Пакрыўдзіцца ж, калі не скажу...» Сказаў:

— Яна родам з Камарынскага раёна. Туды, у вёску, üдаць, і накірую разам з дзецьмі...

— Сапраўды — табе прасцей... А мне што рабіць?

— Можа, у эвакуацыю падаліся б?..

— Не хочуць. Казаў і жонцы, і дзецям — не хочуць. Ды і позна. Немцы далекавата ўжо зайшлі. І пруць далей так хутка...

— Дык хоць бы ў сяло іншае перабраліся?

— Трэба будзе паталкаваць з жонкаю...

Блізка была вёска, і Васіль саскочыў з Іванавай падводы, адвязаў лейцы, перасеў на свой воз.

Ехалі далей кожны на сваім возе, думаючы кожны пра сваё...

## XX

З таго дня, як пачуў Іван Дарошка, што пачалася вайна, адступае Чырвоная Армія і ў Вялікі Лес могуць прыйсці немцы, не-не дый вярталіся яго думкі да сям'і — жонкі, сыноў. Што рабіць з імі? Пакідаць у Вялікім Лесе ці... Куды-небудзь накіраваць у больш бяспечнае месца? Асабліва думкі гэтыя пачалі займаць Івана, калі не паслалі яго на фронт, пакінулі дома ў Вялікім Лесе. Неаднойчы і сам ён, Іван, і жонка, Каця, закраналі ў размовах гэтае балючае для іх абаіх, неаднойчы то горача, часам са злосцю, то спакойна, мірна абмяркоўвалі, седзячы за сталом ці лежачы побач у ложку. Ясна было і яму, Івану, і жонцы, Каці: нельга, на выпадак акупацыі, аставацца ў Вялікім Лесе, трэба некуды адсюль падавацца. Ісці ў бежанцы? Куды? Хто можа сказаць, што туды, куды яны пойдуць, не прыйдуць таксама немцы. А дарога ж... Хіба ж лёгка быць у дарозе ды яшчэ з дваімі малымі дзецьмі? І Каці першай прыйшла ў галаву думка — падацца да бацькоў, у Камарынскі раён. І дабірацца не так далёка, і бацька, маці там, калі што якое — і памогуць, і дзяцей дагледзяць. Лепшага нічога за бацькоўскае кубло, здаецца, няма і не можа быць. І паколькі ён, Іван, згадзіўся з Кацяю, нічога іншага не мог прапанаваць, Каця патроху збіралася ў дарогу. Перабрала небагатыя свае пажыткі, што перамыла, што палатала, і ўсё, без чаго не маглі ні сама, ні дзеці абысціся, спакавала ў клункі; астатняе, не вельмі каштоўнае, грувасткае, што не панясеш, не пацягнеш у дарогу, адлажыла, і аднаго вечара ўдваіх з мужам закапалі ў двары пад яблыняй. Асобна схаваў усё, што магло яму спатрэбіцца з адзе-

жы і абыходку, Іван — ускінуў мяшок, наладаваны жонкаю, на воз і завёз у лес.

Цяпер у хаце было гола і няўтульна. Жылі, быццам дачасна, ведаючы: не сёння-заўтра давядзецца рушыць у дарогу, расстацца з тым, да чаго прывыклі, з чым зжыліся. Сыны — трохгадовы Петрык і Андрэйка, які толькі-толькі пачынаў хадзіць,— неяк прымоўклі, насцярожыліся і ўсё быццам чагосьці чакалі — няйнакш, адчувалі, што ім давядзецца неўзабаве разлучыцца з хатаю, бацькам. А Каця зрабілася ласкавая і гарачная па начах, быццам хацела аддаць і ўзяць тое, што не паспела аддаць і ўзяць за гады сумеснага жыцця з мужам, нават захапіць нешта і з будучага, чаго, пэўна ж, потым не будзеш мець. Яна то раптам абдымала Івана, цалавала шыю, губы, то, упаўшы яму на грудзі, плакала, калацілася ў слязах. Іван, які прывык стрымліваць свае пачуцці, бо лічыў, што чалавек павінен жыць іншым, больш важным і патрэбным, таксама быў расслабіўся, даў сабе волю. Вярнуўшыся з начное паездкі, лез у нагрэтую жонкай пасцель і ў ласках, абдымках забываў пра ўсё да самай раніцы. І хоць адчуваў ён, што пара, пара яму расставацца з жонкаю і дзецьмі, але не расставаўся — трымаў і трымаў іх у Вялікім Лесе. Усё ж кахаў ён сваю Кацю, і Каця таксама кахала яго, Івана. І гэта з асаблівай сілай адчуў ён, Іван, у гэтыя трывожныя, развітальныя дні і ночы.

— Іванка, не змагу без цябе жыць,— шаптала Каця, калі яны аставаліся адны.— Беражы сябе! Беражы, бо... Не будзе цябе — і мне не жыць...

Іван закусваў да крыві губы, яму таксама было не па сабе, калі ўяўляў, як ён будзе жыць, калі не будзе побач Каці, такіх шчабятлівых, заўсёды нечым захопленых дзяцей, потым, каб не заплакаць самому, пачынаў цалаваць Кацю. Ніколі раней не цалаваў ён так часта, да самазабыцця, Кацю, ніколі не аддаваўся так пачуццёвасці і ласцы, як у тыя дні і ночы...

Разважлівасць брала сваё. Быць ім разам з кожнай пражытай хвілінай рабілася ўсё больш і больш небяспечна.

— Трэба ехаць вам! — сказаў аднаго дня Іван Каці.— Цягнуць нельга.

Каця і сама гэта ведала. Аднак сказала:

— Яшчэ адну ноч пераначуем у гэтай хаце.

Іван згадзіўся.

Пераначавалі ноч. Раніцою тая самая размова:

— Ехаць вам трэба! Сёння ж...

І тая самая просьба:

— Яшчэ адну ноч. Адну, толькі адну!..

Не хацелася і Івану расставацца з Кацяю. Тым болей — выявілася: не сабрана, не спакавана яшчэ ўсё.

Перадднявалі, пераначавалі яшчэ адну ноч. А ўранні тое самае:

— Іванка, мы яшчэ адну ночку разам пабудзем. Можа, апошнюю... Не давядзецца ўжо начаваць нам у гэтай хаце...

— Чаму гэта не давядзецца? — спытаў Іван. І адчуў: сэрца ў яго скаланулася.

— Быццам не ведаеш... Немцы ж ідуць.

— Ну і што, як ідуць? Прыйдуць і пойдуць.

— А што пасля сябе пакінуць? Попел. А хата гэтая... Хоць і кулацкая, а сыноў нам двух дала. Ды і жылі мы тут непагана.

— Можна было б, мусіць, і лепш жыць.

— Не хачу лепш. Каб да канца жыцця так — я шчаслівая была б.

Але ён, Іван, не паддаўся на ўгаворы жонкі:

— Збірайся, Каця. Ночку мы разам пабудзем. Але не ў хаце, а ў дарозе. Паедзем. Як змеркнецца, дык і паедзем...

І зрабіў так, як сказаў — на змярканні пад'ехаў да двара, пагрузіў на воз хатні скарб, вузлякі з адзежай. Разаслалі посцілкі, падушкі, улажылі на возе дзяцей спаць. І паехалі. Паехалі не праз Ельнікі, а карацейшай дарогаю — праз лясы, балоты і іншыя, далёкія ад чыгункі і шашы, вёскі... Хату ж, якая столькі гадоў давала ім прытулак і ў якой столькі перажылі рознага, і добрага і трывожнага, нават не замыкалі на замок...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

У той жа дзень, калі Іван Дарошка не прыйшоў, як заўсёды прыходзіў, у сельсавет на працу, нехта прынёс у Вялікі Лес навіну, быццам немцы занялі Ельнікі. Занялі без адзінага стрэлу — тыя нашы вайсковыя часці, што адступалі праз райцэнтр, не затрымліваліся там, спяшаліся хутчэй паспець да Дняпра, на пераправу...

# Частка трэцяя

Спяшаліся хутчэй паспець да Дняпра, на пераправу, не толькі нашы вайсковыя часці, што адступалі пад націскам намнога большых сіл ворага. Спяшаліся хутчэй паспець да Дняпра, на пераправу і іншыя людзі — тыя, хто не хацеў ці не мог аставацца дома і, каб не трапіць у няволю, на здзек і глум акупантам, выбраўся добраахвотна сам у эвакуацыю, хто па абавязку службы ці па загаду вёз у тыл розныя дакументы, дэманціраванае абсталяванне заводаў і фабрык, гнаў калгасных коней і кароў...

Дарогі ў тыя дні нагадвалі рэкі, калі яны выліваюцца з берагоў у бурнае вясновае разводдзе. Здавалася — усё, што толькі магло хадзіць і рухацца, было тады на дарогах. І дарогі, не змяшчаючы ўсіх, хто кудысьці спяшаўся і бег, раптоўна пашырэлі, прыхапілі ладныя палосы поля, лесу і лугу. Патокі, рэкі людзей, жывёлы, машын, падвод з усіх бакоў спачатку паволі, спакваля, потым усё імклівей і імклівей сцякаліся ў адно месца — да Дняпра, на пераправу...

...сцякаліся, не ведаючы ці не верачы таму, што чулі, што было сапраўднасцю — немцы даўно ўжо разбамбілі паром, даўно ўжо цераз Дняпро няма нідзе ніякай пераправы...

## I

«Ну вось, хвала богу, самае страшнае, што мучыла і хвалявала, здаецца, мінула,— падумаў Апанас Харчэня, калі, перш чым увайсці ў лес, схавацца ў гусцяжы кустоў і дрэў, азірнуўся, паглядзеў апошні раз здаля на знаёмую змалку вёску і маці — яна ўсё яшчэ стаяла і стаяла адзінока ля крыжа на дарозе, маленькая, прыгорбленая, і не зводзіла, ні на хвіліну не зводзіла вачэй з яго, сына.— Нічога, нідзе не дзенецца, паплача дый супакоіцца. І я трохі таксама ачомаюся. А то... Слёзы ды слёзы, угаворы, папрокі... А так — і маці будзе лягчэй, і мне...»

Ён, Апанас, надта ж баяўся гэтага расстання. «Раптам

не вытрымаю, заплачу... Ці — што яшчэ горш — разжалюся і наогул нікуды не пайду, астануся ў вёсцы...»

Цяпер, умінаючы абутымі ў чаравікі нагамі сухі, зляжалы дарожны пясок, Апанас быў ледзь не на сёмым небе. Усё ж вытрымаў, не заплакаў, не паддаўся шкадобе, не астаўся ў вёсцы. Быццам крылы выраслі ў Апанаса за плячыма. Ён не ішоў, а нібыта ляцеў. Аж, здаецца, вецер свістаў у вушах. Хацелася быць далей, як мага далей ад дамоўкі, ад усяго таго, да чаго прывык, прырос душою, без чаго не ўяўляў свайго жыцця і што, куды ні паглядзіш, на што ні ўпадзе вока, быццам рукамі яго трымала, прасіла — не пакідай, не ідзі нікуды, будзь, аставайся тут, з намі. І як Апанас ні храбрыўся, як ні харахорыўся, ні цешыў сябе, што рады, а ўсё ж... На сподзе душы, недзе глыбока-глыбока, ляжаў нібыта цяжар, нібыта халадок нейкі ці стрэмка шкадавання, болю — пакідае ж не штонебудзь, а маці, родны кут, ідзе ў невядомасць, у чужы далёкі свет.

«Куды? Што чакае мяне там, на няходжаных дарогах, у невядомых краях?» — не-не дый узнікала, мільгала ў галаве.

Гэты халадок, гэты боль паступова авалодвалі душою і сэрцам, будзілі, апаноўваючы, думкі, сеялі трывогу, перарасталі ў няпэўнасць, страх. У поўдзень, калі Апанас падыходзіў, набліжаўся да Ельнікаў, нарадзіліся, выніклі словы:

«Добра ж, калі будзе добра! А калі...»

Апанас і сам не ведаў, нават уявіць не мог, што можа быць за гэтым «А калі...». І таму... Палохаўся, баяўся таго, што можа здарыцца, быць.

«Гэта ж не дома, у сваёй вёсцы, дзе і мяне ўсе ведаюць, і бацьку майго, і маці, ды і я ўсіх ведаю. А там... Нікога свайго няма... Куды ні кінься — усюды чужое, чужыя. Калі што якое... Хто мяне выратуе, хто паможа?..»

У абед, прысеўшы на абочыне дарогі ў цень пад стары шатрысты дуб — дуб гэты стаяў горда адзін пасярод поля, вабячы ў засень свайго густога зялёнага голля кожнага, хто праходзіў міма,— Апанас і зусім апанураў. Радасць, узнёслы настрой, што былі напачатку, дзе і падзеліся — быццам выпарыліся, выветрыліся.

«Што, што чакае мяне там, куды я выправіўся, іду?» — ужо не напамінала час ад часу, а мучыла, катавала пытанне.

Скінуў з плячэй торбу, развязаў аборку, якой была

акуратна завязана зашмаргам торба, дастаў хлеб, вараныя яйкі, сала, соль — вырашыў падсілкавацца, паабедаць.

І зноў ахапілі, навалiлiся думкі пра дамоўку.

«Як там, у вёсцы, што маці, астаўшыся адна, робіць? Яна ж ніколі без мяне не снедала, не абедала, не вячэрала. Няўжо і цяпер нічога не есць, чакае — я вось-вось прыйду, вярнуся...»

Зажмурыў вочы. І ў вачах... Маці. Яна ў квятастай крамной кофце, цяжкім ваўняным андараку — завіхаецца ля печы, дастае чорны, задымлены чыгун, налівае ў гліняную міску добра ўпрэлую капусту з грыбамі, нясе на стол — капуста смачна-смачна пахне, аж пацягвае жывот...

«Мга-а,— плямкнуў губамі, глытнуў сліну Апанас і, расплюшчыўшы вочы, сумна-сумна паглядзеў на хлеб, яйкі, сала, соль, што падаставаў з торбы, разлажыў на траве.— Хіба не ісці нікуды, вярнуцца назад, дадому?»

Адразу ж рашуча адагнаў ад сябе прывід-уяву, здраду-думку.

«Не, не! Нельга мне вяртацца, нельга быць дома, у сваёй вёсцы. Трэба ісці. Ісці туды, дзе няма і не будзе немцаў, дзе ніхто, ніхто мяне не ведае. Інакш мне... Кепска, вельмі кепска будзе. Немцы прыйдуць — сакратаром сельсавета быў я, камсамолец. Не прыйдуць немцы — дзядзька... Блытацца пад нагамі зноў будзе дзядзька. Ці пнём па саве, ці савою аб пень... Эх!»

Са злосцю адламаў ад спечанага на паду печы бохана хлеба акраец, паднёс да рота, адкусіў, пачаў паволі, не чуючы смаку, жаваць...

## II

Яшчэ калі Васіль Кулага, новы калгасны старшыня, адклікаўшы ўбок, каб ніхто не чуў, неяк надвячоркам сказаў таямнічым голасам амаль на самае вуха Хомку, што давядзецца, мусіць, яму гнаць у тыл кароў — «больш няма каму, з мужчын бадай што ты адзін астаўся!» — так і сказаў: «больш няма каму, з мужчын бадай што ты адзін астаўся!»,— Хомка падумаў быў: нялёгкая выпадае на яго долю работка. Не, не тое каб Хомка ведаў, што гэта такое — гнаць у тыл кароў, але... Здагадваўся. Дзіва што — якніяк, увесь век жа свой, лічы, пратупаў з пугаю за каровамі, то за аднаасобніцкімі, потым калгаснымі і, дзякаваць богу, трохі ведаў, што такое каровы. Ды не ўяўляў Хомка, думаць нават не мог, як цяжка будзе з каровамі ў дарозе,

дзе ўсё чужое, не ведаеш, дзе луг, а дзе вадапой. Ды што луг, што вадапой — не ведаеш, што за тры крокі ад цябе наперадзе. А трэба ж, каб каровы і панапасвіліся, і панапіваліся, і жвачку пажавалі, і паляжалі. Ды і падаіць кожную ў час трэба. Інакш... малако перагарыць, каровы пазапускаюцца. І хоць, здаецца, усё, усё прадугледзеў Хомка, калі выпраўляліся з чарадою з дому, нават жанчын захапіў, каб было каму тры разы на дзень здойваць каровам вымя, але выявілася неўзабаве, усяго ніколі, як бы ні імкнуўся, не прадугледзіш. У першы ж дзень некалькі кароў пазбівалі ці то аб каменне, ці то аб карэнне капыты, паздзіралі да крыві ногі. А мазі ж, мазі Хомка ніякай з сабой не захапіў. Дзве самыя лепшыя каровы — больш за іх малака ў калгасе ні адна карова не давала! — зусім закульгалі, не маглі ісці. Ледзь да вёскі прыдарожнай — звалася тая вёска Манькі — дагналі. І там... Давялося гэтых кароў пакінуць. І як пакінуць! Даведкі і то ніхто ніякай не даў, нават так, без даведкі, кароў не хацелі браць, ледзь угаварылі калгаснае начальства.

«А калі яшчэ каторая закульгае? — думаў Хомка.— Як так, без усякага-якага, пакідаць, то лепш прырэзаць. Што якое, дык хоць шкура будзе на апраўданне. Але ж што рабіць з мясам? Яно ж, непасоленае, адразу ж загніецца, засмярдзіць...»

Былі і іншыя непрадбачаныя нечаканасці, як, скажам, куды дзяваць малако, што надайвалі Піліпава Клаўдзя і Тхорыкава Надзя. Старшыня, Васіль Кулага, калі выпраўляў Хомку гнаць кароў, наказваў, каб не транжырылі, дзяржаве здавалі на прыёмных пунктах. Але ўжо на другі дзень выявілася: малако можна было здаць не ў кожнай вёсцы. Там жа, дзе былі малачарні, ці зусім не прымалі, ці прымалі вельмі ж неахвотна — і з тым, што раней набралі, не ведалі, што рабіць. Давялося раздаваць яго выпадковым людзям, а то і... выліваць проста на дарогу. Клаўдзя дык тая хутка скеміла, прапанавала — як насіць вёдрамі малако ў бітоны, потым выліваць абы-куды, а бітоны і вёдры мыць, дык лепш ужо адразу здойваць у пясок. Хомка абурыўся: «І ета ты мне кажаш такое? Не ведаеш хіба, што такое малако?!» — «Я-то ведаю,— адказала Хомку Клаўдзя.— Але ж ты, мабуць, не ведаеш, як цягаць поўныя вёдры да бітонаў, а потым выварочваць тыя ж бітоны ў пясок, мыць іх».

Наогул, з першага дня ў Хомкі з Клаўдзяй наперакос пайшло. Не кароў глядзець Клаўдзя ў дарогу выправіла-

ся, а, як выявілася неўзабаве, хабаля сабе шукаць. Седзячы на возе, усё зыркала па баках, каб мужчыну дзе якога ўбачыць ды завабіць. Сустрэнецца які нездаляка — Клаўдзя вочкі свае бессаромныя наставіць, слова-другое кіне, быццам вяроўку, каб заарканіць чалавека, да сябе прыцягнуць. Цьфу, аж брыдка глядзець. Бессаромніца, дый годзе. Нічога не скажаш, юрлівая баба. Нават да яго, Хомкі, паспрабавала клінні падбіць. У першы ж вечар, калі не так далёка і ад дому яшчэ адышліся. Спыніліся тады на ноч у ляску, пры лузе. Агонь разлажылі, есці наварылі. Павячэраўшы, адразу ж і спаць укладвацца пачалі. Клаўдзя з Надзяй на возе, а ён, Хомка, трохі зводдаль, ля вогнішча, пасцель сабе намасціў. З голля і лапак сасновых. Наверх, каб мякчэй было, у бакі не муляла,— сена са стажка, што на лузе стаяў, наскуб. Акрыўся світкаю, якую так, на ўсякі выпадак, захапіў, калі з дому ў дарогу збіраўся, лёг, глядзеў нейкі час на зоры, ад якіх аж неба белае было, гэтулькі іх навысыпала, ужо і драмаць быў пачаў, як да яго, з воза злезшы, Клаўдзя прыйшла. «Не спіцца нешта»,— прашаптала яна ціха і села на край яго самаробнай пасцелі. «Чаму ета табе не спіцца?» — здзівіўся Хомка. «І сама не ведаю».— «Хіба не стамілася?» — «Э-э,— засмяялася неяк дробненька-дробненька Клаўдзя.— Куме не тое наўме». І глядзіць, глядзіць на Хомку, бы ўсё адно кошка збродлівая. І вочы ў яе гараць, гараць. Аж адсунуўся ад Клаўдзі далей, далей Хомка — успомніў раптам, што гаварылі ў вёсцы людзі пра Клаўдзю: надта ж паваблівая яна да чужых мужыкоў. А Клаўдзя бліжэй, бліжэй да Хомкі хінецца. Ён адсоўваецца, а яна падсоўваецца. «Здурэла ты, ці што? — не вытрымаў Хомка.— Етак я хутка з пасцелі на зямлю спаўзу».— «А ты ляжы, не спаўзай».— «Як жа я ляжаць буду, калі ты... Сунешся ды сунешся».— «Дык я ж, можа, цябе не з'ем».— «З'ясі — не з'ясі, а ў грэх увядзеш».— «Грэх у мех, а спасенне ў торбу». І рукі выставіла, каб абхапіць, абняць яго, Хомку. Але ён, Хомка, на ногі борзда ўскочыў, сказаў: «Ідзі адсюль, усё адно нічога ў цябе не выйдзе. Я не такі, кеб да чужых баб ахвоту мець. У мяне свая е».— «Дурны, дык дурное і пляцеш. Свая, чужая... Хіба чужая не можа стаць сваёй, а свая — чужой?.. Некалі ж і твая Порка, можа, была табе чужая...» — «Ты Поркі мае не чапай. Мала што была яна чужая. Цяпер — свая! І не прыставай, не хілі на грэх — не схіліш!» — «Я і не прыстаю. Але думала...» — «Што ты думала?» — «Што мужчына ты».— «Не

табе правяраць маю мужчынскую сілу». Пасядзела-пасядзела Клаўдзя на яго, Хомкавай, пасцелі, ды так ні з чым і пайшла. А ён, Хомка, астаўшыся зноў адзін, спаць не мог — так і не звёў да самага світання ні на волас вачэй. А тады, як золакам неба заўсміхалася на ўвесь усход, падхапіўся на ногі, Клаўдзю і Надзю пабудзіў, загадаў кароў даіць — ды ў дарогу.

З таго вечара ці, можа, правільней, ночы і зацялася Клаўдзя на Хомку, амаль не гаварыла. А калі слова якое і скажа, дык не проста так, а з падкусам. «А я верыла, што і праўда крывое дрэва ў сук расце»,— скажа і засмяецца. Абыходзіў Хомка Клаўдзю, стараўся блізка не быць ля яе. Калі што трэба — Надзі загадваў, Надзю прасіў. Толькі ж і Надзя, хоць і дзяўчо зусім, а таксама з мухамі. Як заладзіла была з першага дня — навошта кароў етых гнаць, хай бы дома, у вёсцы, аставаліся,— так і цвердзіць сваё. Спрабаваў Хомка і даказваць, што трэба адагнаць кароў у тыл, каб ворагу не дасталіся, спрабаваў і ўшчуваць, што нельга развважаць так, як развважае Надзя, ды дзе там! Упартае дзяўчо! І сама з дому нікуды ехаць не хоча і не хоча, каб кароў куды-небудзь далёка гналі. І лянівая-лянівая. Дзень цэлы на возе будзе ляжаць, не скажаш, дык і не злезе. Яно, вядома, каб Клаўдзя інакш з ім, Хомкам, сябе паводзіла, дык і Надзя, можа быць, зусім бы не такая была. А то ж... Насміханні, кпіны, ды і не слухаецца ані. Што ні загадаеш — пацвеліцца, перакрывіць. А зрабіць... Як заманецца ёй. Захоча — зробіць, захоча — не. І прымусіць... Як ты яе прымусіш? Упрошваць, сарамаціць... Але каго і перад кім?.. Прыстрашваць... Але чым, чым такую прыстрашыш?..

...Ішоў, кульгікаў услед за чарадою Хомка, і невясёлыя, сумныя думкі апаноўвалі яго. І каб хоць ведаў ён, Хомка, калі нарэшце пакутам яго канец будзе, калі дзень той надыдзе, што не трэба кароў гнаць далей, здасць ён іх пад распіску і можна будзе рушыць на ўсе чатыры бакі, хочаш дадому, у сваю вёску, а хочаш... Хоць чорту на рогі. Ды... Ніхто, нават сам госпад бог, пэўна не скажа, колькі дзён і начэй яшчэ давядзецца так пакутаваць.

Тады, як у дарогу выпраўлялі, Васіль Кулага гаварыў: «Гані. А дзе спыніцца, каму кароў здаць — скажуць».

«Хто скажа?» — думаў, біўся ў здагадках цяпер Хомка.

## III

Нялёгка было Андрэю Макаравічу Сушчэню пакінуць усё, з чым зжыўся, да чаго прывык, і пайсці ў бежанцы. І сам думаў, ночы не спаў, і з жонкай Алінай Сяргееўнай раіўся, можа, сто ці дзвесце разоў, як ім быць, што рабіць. І нічога лепшага, як кіравацца ў бежанцы, не прыходзіла ў галаву. І Андрэй Макаравіч сказаў аднойчы ўголас: «Ну і няхай!» Жонка, Аліна Сяргееўна, ведала, што гэта значыць — прынята Андрэем Макаравічам пэўнае і канчатковае рашэнне. Якое рашэнне — Аліна Сяргееўна не ведала, хоць і здагадвалася. Здагадвалася і чакала, чакала, калі Андрэй Макаравіч скажа, аб'явіць. Магла, вядома, і не чакаць — спытаць. Але не прывыкла Аліна Сяргееўна нешта прыспешваць, залазіць у мужавы думкі. «Скажа, усё скажа». І Андрэй Макаравіч неяк пад вечар сапраўды сказаў:

— Вось што, Аліна Сяргееўна. Даваймa патроху хіба ў дарогу збірацца.

— Усё ж збірацца? — са спалохам паглядзела на мужа Аліна Сяргееўна.

— Так, збірацца. Бо чакаць, калі прыйдуць сюды прыблуды, быць пад імі...— і Андрэй Макаравіч рашуча пакруціў галавою.— Не-е!

Аліна Сяргееўна прывыкла ва ўсім слухацца мужа, ніколі ні ў чым яму не пярэчыла. Быццам віну перад ім заўсёды адчувала. І за тое, што дзяцей не нарадзіла, хоць і не правяраліся яны, не ведалі, хто з іх сапраўды вінаваты ў гэтым. І за тое, што шмат непрыемнасцей прынесла Андрэю Макаравічу — ён быў з небагатай, амаль пралетарскай сям'і, і пры новай уладзе такім, як ён, усюды былі адчынены дзверы, ён мог далёка пайсці; у тым жа, што ён астаўся жыць у вёсцы, працаваў у школе, вінаватай зноў жа Аліна Сяргееўна лічыла сябе. Бо яна... Была папоўская дачка. Бацька яе меў прыход, не выракаўся бога, а яна, Аліна Сяргееўна, не выракалася, не цуралася бацькі, як рабілі некаторыя ў тыя гады. І гэта не-не дый усплывала. І тады воляй-няволяй ім з Андрэем Макаравічам даводзілася мяняць месца працы, пераязджаць з вёскі ў вёску, пакуль нарэшце не прыбіліся яны на Палессе — у самую глушэчу — Вялікі Лес. К таму часу якраз у Аліны Сяргееўны памёр бацька, а праз які год — і маці.

У Вялікім Лесе Аліна Сяргееўна з Андрэем Макаравічам нават абжыліся. Займелі сякую-такую гаспадарку,

накуплялі кніг. Думалі — нікуды і пераязджаць ужо не будуць, тым больш што Андрэй Макаравіч павышэнне атрымаў — стаў дырэктарам школы. І раптам, як снег на галаву,— гэтая вайна, немцы...

Звыклая да частых пераездаў, Аліна Сяргееўна і цяпер упраўна і даволі хутка сабралася ў дарогу. Узяла сёетое з адзежы, каб было ў што пераапрануцца, напакавала яды. Астатняе ўсё... Няхай астаецца. Не назаўсёды ж, не навечна пакідаюць яны гэтую вёску, гэтую хату. Вернуцца сюды. Вось прагоняць немцаў, дык адразу ж і вернуцца. За сцяною сям'я старшыні сельсавета Дарошкі жыць будзе. Прыгледзіць і за хатаю, і за рэчамі, што тут астаюцца.

Перад тым як пакінуць дамоўку, прыселі па старому звычаю на лаву, ля сабраных у дарогу клункаў.

— Нічога не шкада пакідаць,— загаварыў раптам Андрэй Макаравіч.— А вось кнігі... Я ж іх па адной збіраў, дзе быў сам, адтуль і прывозіў. Баюся, каб не расцягалі...

І так паглядзеў на самаробныя, без шкла, паліцы, на якіх акуратна, адна пры адной, стаялі рознага фармату і афарбоўкі кнігі, што ў Аліны Сяргееўны аж сэрца сцялася.

— А ты з Іванам Мікалаевічам дамоўся,— не вытрымала, параіла Аліна Сяргееўна.— Можа, ён прыгледзіць.

Ды гутарка з ім ані не заспакоіла Андрэя Макаравіча, наадварот — навяла на цяжкі роздум. Па-першае, выявілася: Іван Мікалаевіч не вельмі задаволены ім, Андрэем Макаравічам, па ўсім адчуваецца, пакрыўдзіўся, бо ён, Андрэй Макаравіч, выключыў са школы яго брата, Косціка. Па-другое, сам Іван Мікалаевіч таксама не збіраўся аставацца ў Вялікім Лесе. Нават жонку, Кацярыну Антонаўну, з дзецьмі не намерваўся пакідаць тут. «Значыцца, ум-га... Ён ведае нешта такое, чаго я не ведаю. І з хатаю, кнігамі... Ён, бадай што, правільна раіць».

Аж на цэлы тыдзень затрымаўся Андрэй Макаравіч у Вялікім Лесе. Днём яны з Алінай Сяргееўнай адпачывалі, спалі, а ўночы капалі ў гародзе ямы, абкладвалі іх, чым толькі можна было — саломай, сенам,— і загружалі кнігамі. Заўважыў тады Андрэй Макаравіч, што і Іван Мікалаевіч Дарошка не спіць — па начах некуды ездзіць на падводзе, нешта некуды возіць, няйнакш, хавае. «Таксама да прыходу немцаў, мусіць, рыхтуецца».

Без кніг, без усяго таго, што было куплена і нажыта гадамі працы і да чаго прывыклі і вочы, і рукі, і ногі і што

складала частку жыцця і ўтульнасці, хата зрабілася голаю і чужою. Ні дня, ні хвіліны больш не хацелася аставацца ў ёй ні Аліне Сяргееўне, ні Андрэю Макаравічу. І як толькі вынеслі апошнія кіпы кніг, засыпалі зямлёю ямы, тады ж вырашылі рушыць у дарогу.

— Добра, што ноч яшчэ,— сказаў Андрэй Макаравіч.— Ніхто бачыць нас не будзе, ніхто ні пра што не спытае.

Аліна Сяргееўна прамаўчала, падумала: «Ліха ведае, што яно добра, а што — дрэнна. Аднак жа... Затрымлівацца не варта — трэба ісці. І так вунь аж на цэлы тыдзень затрымаліся. Ужо дзе былі б, на колькі б кіламетраў адышліся ад Вялікага Лесу!»

Але па добрай даўняй завядзёнцы вярнуліся разам з Андрэем Макаравічам у хату, пасядзелі ля тых клункаў і торбачак, што сабрала яна, Аліна Сяргееўна, у дарогу. Нават лямпу былі запалілі, каб на хату паглядзець, развітацца з тым, што тут яшчэ аставалася. І, узяўшы клункі і торбы — што за плечы, што ў рукі,— пастаялі моўчкі ля парога — і пайшлі.

Ні ў Андрэя Макаравіча, ні тым больш у Аліны Сяргееўны не было пэўнага плана, не было пэўнай задумы, куды ісці, куды падавацца. Ведалі толькі, адчувалі — трэба ісці, нельга аставацца ім у Вялікім Лесе. А куды — відаць будзе, сітуацыя падкажа. Ды і... Калі не ўсё, дык, ва ўсякім выпадку, многае залежыць ад таго, як доўга немцы тут затрымаюцца, куды дойдуць. А раптам і да Вялікага Лесу не дабяруцца — спыняць іх нашы войскі. Тады... І ісці далёка нікуды не давядзецца, можна будзе праз тыдзень-другі і назад, у Вялікі Лес, вярнуцца.

Да чыгункі яшчэ раней надумалі не ісці — і ў Ельніках Андрэю Макаравічу не раілі гэта рабіць, ды і сам ён добра ведаў: чыгунку немцы часта бамбяць. Куды надзейней будзе дабірацца да пераправы. Калі што якое — схавацца можна, з дарогі сысці, сцежкамі глухімі пятляць. І ногі свае яшчэ нікога не падводзілі.

— Бывай, хата,— сказала ціха ўголас Аліна Сяргееўна, вешаючы на дзверы замок.

— Ну і няхай! — прашаптаў у такт нейкім сваім думкам Андрэй Макаравіч.

І, выйшаўшы з двара, пабрылі паволі ўпобачкі па дарозе на Ельнікі.

## IV

Іван Дарошка, выпраўляючыся з жонкаю і дзецьмі па глухіх дарогах у суседні, Камарынскі, раён, меў на мэце і яшчэ адно, пра што ўголас нікому не гаварыў, але пра што ні на хвіліну не забываў, не выпускаў з галавы — хоць збольшага паглядзець, разведаць лясныя абшары. Бо ці мала што магло здарыцца? Раптам нельга будзе атабарыцца ў сваіх лясах, раптам давядзецца шукаць пристанішча ў нейкім іншым, чужым месцы? Ды і для манеўру лішняя схованьь ці патаемны кут не зашкодзяць.

Свае, велікалесаўскія, ды і гудоўскія, драздоўскія, руднянскія і паташанскія лясы Іван Дарошка ведаў. Калісьці разам з бацькам і паташ рабіць хадзіў, і дзялянкі карчаваць, і па арэхі, грыбы забрыдаў іншы раз далёка ад дому. Знаёмыя дарогі, знаёмыя сцежкі. Уночы — і то не заблудзіш. А вось калі выехалі за Дразды, павярнулі на Дубровіцу (якраз і развідняць тады пачало) — залюбаваўся Іван Дарошка, загледзеўся: нішто сабе пушча, усюды, куды ні кінь вокам, аж гамоняць з небам дубы, ясені, клёны. І гусцеж такі скрозь паўз дарогу — не прадрацца: кусты арэшніку пераплятаюцца з маладым арабіннікам, бярэзнікам, асіннікам, грабняком. Зелянее скрозь і ажыннік, маліннік, папаратнік. І галоўнае — пушча нідзе не перапыняецца полем, чыстым балотам. Значыцца, калі нявыкрутка будзе, можна, асабліва не рызыкуючы, адступіць і сюды. Ды і да жонкі наведацца захочацца, то во і шыбуй сюдою!

Лес даўно ўжо гаманіў, поўніўся птушынымі галасамі. Гугаў, як у парожнюю бочку, голуб, чэкаў дзяцел, заўзята рассыпаў галасісты пошчак клёст-кляновік. Якраз і сонца паказалася, узышло. У імхах, лагчынах і на ўзбалотках закурыўся рэдкі, палахлівы туман — нібыта дым ад начных начлежных вогнішчаў. Прачнулася — ды яна амаль і не спала, толькі драмала — жонка, Кацярына Антонаўна. Гэтак жа, як і ён, Іван, сядзела моўчкі на возе і глядзела, глядзела на лес, нешта думаючы сваё.

— Вось і без хаты мы асталіся. Без усяго-ўсяго,— прашаптала яна раптам нібыта сама сабе, са скрухай.

Іван павярнуўся да жонкі, паглядзеў на яе бледны недаспаны твар. Сказаў:

— Каб толькі жывы былі. А што да астатняга — не шкадуй.

Зноў некаторы час ехалі, трасліся на падводзе моўчкі.

Мінулі зарослую купчастым лазняком балацявіну, павярнулі на чарналессе — дарога, тарфяністая, спавітая густа каранямі, запятляла між тоўстых, у два-тры абхваты, камлёў ясеняў, клёнаў. Наперадзе загусцелі грабняк, алешнік.

— Ці хоць правільна мы едзем? — спытала раптам Кацярына Антонаўна.

— Правільна. За Дубровіцай будзе Карчэўе, за Карчэўем — Паляны. А там ужо і да тваіх Будзілавіч рукой падаць.

— Гэтай дарогай я ніколі не ездзіла,— прызналася Кацярына Антонаўна.

— І я не ездзіў.

— А хто ездзіў?

— Людзі ездзілі. Вёска ж з вёскай звязаны. Заўсёды звязаны. Не можа адна вёска сама па сабе жыць. І чалавек таксама не можа адзін без іншых людзей жыць. Ведаеш, як рассяліліся людзі на зямлі?

— Ну-у? — падрыхтавалася слухаць Кацярына Антонаўна.

— Нічога асаблівага, проста расказаць табе хачу, што сам ведаю. Я нідзе не чытаў пра гэта, але ўяўляю, здаецца мне, было ўсё вось як. Жыла, скажам, сям'я. Бацька, маці, дзеці. Прыходзіў час, дзеці выраслі. Знаходзілі сабе спадарожнікаў ці спадарожніц, жаніліся. І, паколькі кожны да самастойнасці імкнецца — такая ўжо натура ў чалавека! — не заставаліся жыць у бацькоў — ставілі сваю хату. Іншы раз там жа, дзе бацькі жылі, іншы раз на новым, свежым месцы. Але ж жыць зусім адны яны не маглі — хадзілі ці ездзілі да бацькоў, братоў, сясцёр. І пратаптвалі, пракладвалі дарогі. Вось чаму вёскі, нават хутары звязаны між сабою дарогамі, сцежкамі. Уся зямля, быццам стары нядошлы гаршчок дротам, аплецена дарогамі. Ідзі па любой з іх — і ты абавязкова натрапіш на людское паселішча, на чалавека.

Не вытрымаў — усміхнуўся Іван. Усміхнулася і Кацярына Антонаўна. Ды так ветла, шчыра, што аж на душы ў Івана пасвятлела.

— Наіўна ўсё гэта. Але доля праўды, мусіць, у тваіх разважаннях ёсць,— сказала Кацярына Антонаўна не то жартам, не то ўсур'ёз.

— Вядома, ёсць,— ужо зусім засмяяўся Іван.— І, можа, не доля праўды, а ўсё, да слова, праўда.

І нібы цень прабег у Івана раптам па твары, спахмурнеў Іван. Сказаў, сумна хітаючы галавою:

— Пратаптвалі, пракладвалі дарогі, і...

— Пра што ты? — спытала Кацярына Антонаўна.

— Усё пра тое самае, вайну. Ведаеш, што я падумаў? У вайну ж чалавек будзе цурацца дарог.

— Чаму?

— Ды таму, што па іх будуць хадзіць тыя, з кім лепш не бачыцца, не сустракацца. Са зброяй. Яны з чалавекам што захочуць, тое і зробяць. Вось немцаў яшчэ няма, а мы з табою ўжо, бачыш, кудою едзем. Не па бітай люднай дарозе, а нацянькі. А неўзабаве ж і па гэтай дарозе не паедзеш. Давядзецца шукаць звярыных сцежак. І гэта будуць самыя надзейныя дарогі. Чалавек пратаптваў, пракладваў дарогі, каб не адчуваць сябе адзінокім, каб лёгка і зручна было адшукаць другога чалавека. А што з таго?

— Людзі ніколі не будуць баяцца людзей, будуць заўсёды шукаць адзін аднаго. А калі чалавек баіцца чалавека, то не чалавек ужо, каго ён баіцца. То звер. Горш нават за звера. Бо звер розуму ад прыроды не мае. А гэты мае. І накіроўвае яго... Супраць такога ж, як сам,— чалавека... Гэта і агідна, і страшна,— аж сцялася ўся, быццам ад холаду, Кацярына Антонаўна.

— Бачыш, Каця, як я разумею, чалавек па сваёй натуры вельмі багатая і складаная істота. Ёсць у ім дабрыня, закаханасць, жаданне памагчы іншаму такому ж, як сам. Калі бачыць каго ў бядзе — выручае. Але ёсць, на жаль, у чалавеку і злосць, нянавісць, жаданне ўладарыць, бачыць у іншым не сябра, а саперніка. Людзі — як тыя планеты ў небе: між імі існуе і сіла, якая іх прыцягвае, і сіла, якая адштурхоўвае. І жыць адзін без аднаго не могуць, і доўга разам жыць... таксама мірна не могуць. Адны сваю філасофію будуюць якраз на добрым у чалавеку, клічуць людзей да святла. Іншыя, у прыватнасці фашысты, бачаць у чалавеку звярынае. Мы за тое, каб памагаць адзін аднаму, сябраваць, жыць у міры, у згодзе; фашысты — каб забіваць адзін аднаго, варагаваць, ваяваць. Сваю, германскую, нацыю аб'явілі вышэйшай, яны, маўляў, самыя разумныя, яны павінны быць панамі, а ўсе іншыя — рабамі. І вайна, якая пачалася, гэта вайна не толькі краін, гэта вайна ідэалогій, нават больш — вайна чалавека з самім сабою. Але я веру, цвёрда веру — пераможам мы, пераможа лепшае, а не горшае. Як, дарэчы, і заўсёды перамагала. Не можа, не можа быць інакш, бо

чалавек па сваёй натуры яшчэ і летуценнік. Ён верыць у лепшае, заўсёды, у самыя змрочныя часы ён верыў у лепшае. І лепшае перамагала. Бо калі ў чалавеку пераможа горшае... Тады чалавеку канец. І не толькі чалавеку, а чалавецтву, жыццю. А такога не можа быць. Усё, нарадзіўшыся, умацоўваецца, развіваецца, удасканальваецца. І чалавек, чалавецтва таксама. Так што, бачыш, і ты і я сыходзімся ў нашых поглядах,— абняў рукою, абхапіў жонку за плечы Іван Дарошка.— І не мы, дык іншыя дажывуць да таго, калі дарогі зноў будуць тымі дарогамі, якімі яны і былі,— іх будуць не баяцца людзі, а шукаць, яны будуць не палохаць людзей, а радаваць, збліжаць, злучаць. Бо з усяго таго добрага, што чалавек прыдумаў і вынайшаў,— дарогі самае, бадай, выдатнае. Яны служылі і служаць чалавеку і чалавецтву, яны, калі трэба, і ратуюць нас, яны і прыводзяць туды, куды мы імкнёмся...

Ніколі, здаецца, так доўга не гаварыў Іван Дарошка з жонкай, ды яшчэ на такую тэму. І галоўнае — не заўважыў сам, што гаворыць доўга. Сядзеў, засяроджана глядзеў, не спускаючы вачэй з дарогі, якая выпаўзала вужакай не то на чыстае, кімсьці скошанае і парослае ўжо ладнаватай кволай атавай, балотца, не то на лужок, і гаварыў, гаварыў. А жонка гэта заўважыла. Заўважыла і сказала:

— Што гэта на цябе найшло! Зусім філосафам стаў! Разважаеш і разважаеш...

— А што? — як бы схамянуўся, прыняў з цёплай жончынай спіны руку Іван.— Нельга не разважаць. Чалавеку на тое і дадзена галава, каб ён думаў, разважаў... Хіба няправільна я думаю, хіба ты са мною не згодна?

— Можа быць, і правільна ты думаеш, правільна разважаеш. Але ж...

Кацярына Антонаўна ўздыхнула, памаўчала.

— Хто выжыве ў гэтай бойні, у гэтай калатэчы?

— Хтосьці выжыве. Быць такога не можа, каб хто-небудзь не выжыў.

— Ва ўсякім выпадку, мабыць, не той, хто змагацца будзе. А ты ж... Збіраешся змагацца, ваяваць, біць навалач...

Іван Дарошка зноў павярнуўся тварам да жонкі, сказаў:

— Нельга з навалаччу не змагацца. Дый... Думаеш, будуць такія, хто змагацца не будзе, будзе ўбаку стаяць?

— Мусіць, будуць.

— А я думаю, такіх не будзе. Вайна гэтая ўсіх зачэпіць, нікога не абміне. І пастаяць камусьці ўбаку, засу-

нуўшы рукі ў кішэні... Не, не ўдасца! Спачатку, можа, хто і пастаіць. А потым... І сам у бойку кінецца. Не можа не кінуцца. Хоча ён таго ці не хоча, а змагацца таксама будзе. Што ж да таго, хто астанецца жыць, а хто загіне... Тут як каму пашанцуе. Сама ведаеш — celtic рознае бывае. І не ў вайну часам людзі гінуць, і ў вайну, з самага пекла, жывыя дадому вяртаюцца.

— Але мне... Хацелася б, вельмі-вельмі хацелася б, каб ты жыў. Помні, помні пра гэта!..

І Кацярына Антонаўна прыкрыла ражком хусткі вочы, усхліпнула.

Іван Дарошка маўчаў, не супакойваў, не суцяшаў, нічым не абнадзейваў жонку. Толькі спагадзя, калі мінулі вялікі гнілы брод, зноў уехалі ў цёмны, густы лес, сказаў:

— І мне хацелася б, каб ты жыла... Каб і пасля вайны мы былі з табою разам...

І не вытрымаў, зноў абхапіў рукою жонку, прыцягнуў да сябе, пачаў цалаваць у губы, у салёныя ад слёз шчокі, вочы...

Папрачыналіся дзеці — першы Андрэйка, потым неўзабаве і Петрык: трэба было думаць, як іх накарміць. Ды і конь за ноч здарожыўся і прагаладаўся.

І Іван Дарошка пачаў прыглядацца, дзе б спыніцца, каб і каня напасвіць, і агонь раскласці — зварыць дзецям чаго-небудзь на снеданне паесці.

## V

Не ведаў, не думаў Іван Дарошка, што за ім, за ўсім тым, што рабіў ён па начах у лесе, цікавалі вочы. Хцівыя, нядобрыя вочы.

...Тое зусім выпадкова выйшла — Яўхім Бабай, блукаючы без усякай мэты па ласіных і воўчых сцежках, натрапіў на даволі прасторную яму, якую, як яму здалося, нехта выкапаў не дзеля ж забавы на высокім пагорку ў бары паблізу Патапавага стойла. «Хто б ета мог тут етую яму выкапаць? І нашто?» — падумаў Яўхім. Спыніўся, пастаяў, патупаў наўкруг, але, так ні пра што і не здагадаўшыся, пайшоў далей.

Назаўтра, кіруючыся зноў міма Патапавага стойла, знарок збочыў на бор, каб паглядзець на яму, якую бачыў надоечы. І не знайшоў яе — на месцы ямы ляжаў лоўж сухога галля, ламачча.

«Што б ета магло значыць?»

Ссунуў галлё і ламачча ўбок, капануў наском бота яшчэ не зляжалую, мяккую зямлю. Але капаць зямлю нагою было нязручна, і Яўхім Бабай, адышоўшыся, выламаў з сухой старадрэвіны даволі ёмкую патарчаку. Аж угрэўся, узмакрэў, пакуль патарчакай і рукамі разграбаў зямлю.

«Салома? Га?»

Яшчэ больш здзівіўся Яўхім, калі, адгарнуўшы салому, убачыў у ямцы зерне — жыта.

«Хто яго сюды нацягаў? Не сваё ж, вядома, а крадзенае, калгаснае».

Успомніў, як вяртаўся неяк вясною з лесу — яшчэ тады, калі вайны не было,— і ледзь не забурыўся носам, спаткнуўшыся аб мяшок у алешніку. Вылаяўся, памацаў, што ў мяшку — у мяшку было зерне — ячмень.

«Ячмень? Але ж хто яго сюды прывалок?»

Узваліў мяшок на плечы, аднёс мо на цэлы кіламетр далей у лес. Разгроб мурашнік, палажыў туды мяшок. Акрыў, прысыпаў яго мурахавіннем, выйшаў зноў на дарогу. Абабіўся, абтросся ад мурахавіння і мурашак, якія ачыналіся ўжо ад зімняй спячкі, але былі яшчэ сонныя, вялыя. І як ні ў чым не бывала пакіраваўся дадому.

Ужо на выхадзе з лесу сустрэў Мацея Тхорыка — ён кудысьці спяшаўся, аж бег у лес. Без пілы, без сякеры. Павіталіся.

— Ты ета куды, на ноч гледзячы? — спытаў так, на ўсякі выпадак, Яўхім Бабай у Тхорыка.

— Ды, панімаеш, бочку на бярозавік у лес завёз... То во іду, пагляджу, што там...

Яўхім Бабай ведаў: ніякай бочкі на бярозавік у лес Мацей Тхорык не вазіў. Іншыя вазілі, а Мацей Тхорык... Не, ніколі не вазіў... Ды і бярозавік той... Даўно ўжо не цячэ.

«Хоць бы збрахаў, ды гладка»,— падумаў Бабай.

Развіталіся — кожны пайшоў сваёю дарогай: Мацей Тхорык у лес, Яўхім Бабай з лесу.

Але цікавасць, чаму Мацей Тхорык так позна падаўся кудысьці з дамоўкі, брала Яўхіма. Ды і мяшок з ячменем не даваў спакою... «Яшчэ, чаго добрага, напорацца на мурашнік, у які я...»

Незаўважна шуснуў у кусты. І здаля, крадучыся ад дрэва да дрэва, пачаў цікаваць за Тхорыкам — куды ён пойдзе, што будзе рабіць?

А Тхорык, адышоўшыся ў глыб лесу, збочыў да таго

алешніку, дзе Яўхім Бабай спаткнуўся на мяшок ячменю.

«Няўжо ета Мацей мяшок у бераг лесу завалок?»

І не зводзіў, не зводзіў вачэй з Мацея. Мацей жа, патаптаўшыся ў алешніку і не знайшоўшы таго, што схаваў, кінуўся быў на поле, потым праз якую хвіліну зноў вярнуўся ў алешнік. Тупаў, хадзіў то сюды, то туды, але таго, што шукаў, не знаходзіў.

Змеркласе, змрок даволі густа спавіў кусты, камлі дрэў, наваколле. А Мацей Тхорык, не даючы, мабыць, сабе веры, тупаў і тупаў па алешніку, усё шукаў і шукаў тое, што схаваў. Аж смешна Яўхіму Бабаю зрабілася.

«Лоўка ж я яго нагрэў, га?»

Дадому тады Яўхім Бабай вяртаўся позна. Чакаў, пакуль з лесу не пойдзе Мацей Тхорык. Месяц — які там месяц, схадок-змылачак выплыў. Але і ад яго пасвятлела. Ды так, што, калі ён, Яўхім, апынуўся на полі, стала відаць: яно свежаўзаранае і забаранаванае. «Мусіць, Мацей Тхорык ячмень тут сёння сеяў,— здагадаўся Бабай.— І мяшок з насеннем калгасным украў, у алешнік завалок. Думаў, няйнакш, пажывіцца...»

Тады ж, вярнуўшыся дадому і павячэраўшы, Яўхім Бабай узяў з сабою жонку і павёў яе да мурашніку. Адкапаў мяшок, адсыпаў з яго трохі ячменю ў торбу жонцы, і ўдваіх сяк-так прывалаклі зерне ў хату. І ўсю вясну анігадкі былі — таўклі ячмень у ступе, малолі на жорнах і елі як не штодзень то гушчу, то аладкі...

...«Няўжо і цяпер нехта накраў калгаснага жыта, схаваў у яме? — падумаў Яўхім.— Але ж далёка ад вёскі надта? Можна ж было і бліжэй схаваць».

Загарнуў жыта саломаю, прысыпаў зямлёю. І голле, ламачча зноў паўзверх ямы наваліў. Зрабіў усё так, як і было.

«Згодзіцца жытцо. Во, толькі каб перахаваць».

І на другую ноч Яўхім патупаў у вёску, да свайго двара,— трэба было ўзяць рыдлёўку, каб было чым выкапаць новую ямку.

Вёска спала. Ціхата ўсюды была такая, што аж у вушах звінела. Нідзе нішто не стукне, не грукне. Нават брэху сабак і то не чуваць. А цёмна, цёмна як! Ледзь на сцежку ў свой гарод узбіўся.

Па сцежцы, чуйна прыслухоўваючыся, наблізіўся да хлява. Карова пачула яго, завалтузілася, мусіць, падымаючыся на ногі. Рохнуў у свінушніку парсюк. І Яўхім прырос

да паркана — раптам у хаце міліцыя, чакае, калі гаспадар дадому вернецца, і заарыштуе?

Усё ж, пераадольваючы страх, перамахнуў цераз пералаз у двор. Заглянуў у прыгрэбку, узяў рыдлёўку. І кашэль — лёгкі, сплецены з сасновых дранак,— таксама захапіў з сабою. Хацеў, вельмі хацеў зайсці і ў хату, папытаць, даведацца, дзе што робіцца, ці шукаюць яго, Яўхіма, ды і немцы дзе цяпер? Але боязь, што могуць арыштаваць, гнала і гнала Яўхіма з двара. І ён ціхачом, як злодзей, зноў перамахнуў цераз пералаз, адшукаў сцежку і пабраўся, пабрыў па ёй у лес.

Ужо ў полі вуха ўлавіла: недзе зусім блізка ляскочуць колы фурманкі. Аж прысеў ад нечаканасці — хто ў такую пару куды едзе? І каб, не дай бог, хоць яго, Яўхіма, не заўважыў?

Поле было зжатае, скрозь стаялі бабкі. І Яўхім захінуўся, а потым і зусім сеў, пашыўся ў снапы. І добра, што здагадаўся гэта зрабіць. Бо мінула вельмі мала часу — і зусім блізка ад яго па дарозе ў лес праехала падвода.

Высунуў галаву са снапоў, пачаў прыглядацца, хто паехаў. Здзівіўся, убачыўшы на возе мужчыну.

«Хто б ета мог быць? Здаецца ж, мужчын у войска забралі. І што ён павёз на возе?»

Доўга сядзеў у снапах Яўхім Бабай, не асмельваючыся падняцца і пайсці далей — у лес. Самыя розныя думкі стрымлівалі яго, не давалі быць самім сабою.

«Няхай ад'едзецца. Тады пайду... І хто ета? Чаму не на хронце, а тут? Я ўсяго баюся. У двары сваім быў, а ў хату не зайшоў. А ён... бачыш, на падводзе не баіцца ездзіць. Мусіць, з начальства хтось. Етым усё дазволена, усё можна».

Закіпела ўсярэдзіне, пачала падымацца, як гэта здаралася ўжо неаднойчы, быццам учыненае ў дзяжы цеста, злосць. Злосць на ўладу, якая давала ўсё адным і стрымлівала, замінала жыць так, як хацеў, яму, Яўхіму Бабаю, на самога сябе, што быў заўсёды ў загоне, вечна ўсяго баяўся, ад усяго хаваўся, уцякаў, на жонку, якая напладзіла поўную хату дзяцей — колькі чаго ні зарабі, ні прынясі — з'ядуць і не наядуцца...

«Няўжо і да канца жыцця давядзецца так мучыцца, гібець? Апрача лесу ды вечна ненаедных, галодных дзяцей, якія гатовы не толькі мяне, а і саміх сябе паесці,— нічога не бачу. Удзень — лес, увечары і ўранні — дзеці. Ды яшчэ крыклівая, мітуслівая Сонька з дурнымі сваімі

папрокамі, быццам на адной ёй увесь свет трымаецца, адна яна сям'ю глядзіць, адна ўсіх корміць...»

Падвода ад'ехалася ўжо далёка з поля. Можа, нават кацілася па лесе. З-за хмар прарэзаўся востры сярпок месяца — павіднела раптам. Але сярпок месяца гэтак жа нечакана, як і выплыў, нырнуў, схаваўся ў хмару. Зноў пацямнела. Заспявалі ў вёсцы, пачалі пераклікацца, драць горлы пеўні. Можна было ісці, даўно, даўно ісці Яўхіму Бабаю. А ён, ахоплены паняверкай і одумам, усё сядзеў і сядзеў у снапах, не маючы ні сіл, ні жадання куды б там ні было ісці, рухацца.

Падняўся ён, зноў пашыбаваў, паплёўся ў лес недзе перад самым ужо світаннем. З кашалём на плячы, з рыдлёўкаю ў руцэ, на якую апіраўся, быццам на кій. Ішоў, і ісці не хацелася — збрыдзела яму за той час, як пакінуў дамоўку, усяго і ўсюды баяцца, ад усяго, што дзе ні згледзіш, хавацца. Ды і паесці... Забыўся ўжо, калі і еў па-людску. Усухамя, абы-дзе і абы-як. І спаў жа таксама абы-дзе і абы-як, на адно вока, бы заяц, бо зрабіць сабе курэнь і жыць так, як жыў некалі з іншымі хлопцамі ў «зялёных»,— не асмельваўся: а раптам знойдзе хто-небудзь курэнь, заявіць і яго, Яўхіма, асочаць. І таму дзе начаваў адну ноч, там ніколі не аставаўся спаць на другую.

На падводу, якая паехала чагосьці ў лес, Яўхім Бабай зусім забыўся. Хапала, хапала пра што думаць. Аж галава трашчала, кругам ішла. Свайго, будзённага клопату было хоць каму пазычай, дзе там пра нейкую падводу помніць. Бо... Уцячы-то ўцёк ён ад войска. А адказваць жа за гэта... Адказваць давядзецца. Добра ж, як адступяць нашы, немцы сюды, у Вялікі Лес, прыйдуць. А як прагоняць немцаў, не дадуць ім сюды прыйсці, увесь час нашы тут будуць? Што тады рабіць?.. Гэты дый іншы клопат займаў усё часцей і часцей думкі і ўвагу Яўхіма Бабая.

Увайшоў, усунуўся ў лес, і... У першую хвіліну разгубіўся, умярцвеў — пачуў раптам наперадзе тупат капытоў і ляскат колаў.

«Падвода? Адкуль, хто?»

Пад шатамі дрэў яшчэ цемнавата было. І Яўхім Бабай шмыгануў, захінуўся як бач за камель дуба, прырос да кары. А вочы... Вочы пільна сачылі за дарогай. «Ета тая падвода, што ў лес ехала. Аге, аге, тая. Але хто, хто на падводзе?»

Падвода тым часам мінула густыя кусты арэшніку, выкацілася на прагалу, параўнялася з дубам, за якім стаяў,

стаіўшыся, ён, Яўхім. Конь павярнуў галаву, мусіць, пачуўшы чалавека, пырхнуў. І Яўхім Бабай пазнаў таго, хто, звесіўшы галаву, драмаў на возе.

«Іван Дарошка! — аж не паверыў Яўхім.— Чаму ета ён не на хронце! Такі актывісты, і глядзі... Іншых гнаў ваяваць, а сам, бачыш, дома. Дома яно лепей, канешне, чым на хронце. І жонка побач, і ніхто нідзе не страляе...»

Зноў, як учыненае ў дзяжы цеста, пачала падымацца, расці, аж распіраць грудзі, злосць.

«Яму, бачыш, усё можна. І тады, як вайны не было, і цяпер, як вайна. Вайна яму хоць бы што. Вайна для ўсіх астатніх гора, а яму... Заўсёды добра. Добра, бо ён... начальнік. Начальству заўсёды добра,— адкрыў для сябе раптам ісціну Яўхім.— Ум-гу, з лапатнікаў, з мужыкоў таксама ж... Уладкаваліся, нішто сабе ўладкаваліся! Лепш, каб і хацеў, не прыдумаеш. А мне... І тады было... І цяпер...»

Калі злосць трохі схлынула, уступіла месца цвярозасці і развазе, падумаў быў:

«Аднак жа... Куды Дарошка ездзіў? Што рабіў у лесе?»

Пачакаў, калі зусім развіднее, пайшоў па свежых, пакінутых канём і коламі, слядах. І... натрапіў зноў на такі самы лоўжык галля і ламачча, гэты раз не ў бары, а ў арэшніку, ля вывернутай старадрэвіны. Адсунуў галлё і ламачча, капануў рыдлёўкаю рыхлую зямлю. Амаль не здзівіўся, бо ўжо здагадваўся пра ўсё, убачыўшы салому, а пад ёй — буйныя зярняты жыта.

«Во табе і старшыня сельсавета... На сходах выступае, усіх агітуе быць сумленнымі, а сам... Злодзей! Самы звычайны злодзей! Крадзе ў калгасе, у людзей, і хавае ў лесе. А потым дадому перавязе! І так, мабыць, заўсёды рабіў. Дзіва што — етак і жыць можна, і ўладу славіць».

Адышоўшыся ў хвойнік, малады, густы, выкапаў паўзбоч, дзе гнёзды чарапашыя былі, яму. Заслаў яе бяростаю, сенам і перанёс кашалём туды жыта. Акуратна абтаптаў нагамі, заслаў ігліцаю. А каб не згубіць, дзе яма, метку на бліжэйшай сасонцы зрабіў — кару абадраў лязом рыдлёўкі. Тую ж яму, у якую хаваў жыта Іван Дарошка, засыпаў зямлёю, зноў лоўжык галля і ламачча наверх узваліў.

«Няхай думае, што ніхто не знайшоў жыта. Няхай думае, што яно тут, пад галлём, ляжыць. Хе-хе,— аж смяяўся ад свае хітрасці Яўхім.— Зміцер-хіцер, але і Саўка не дурань...»

Ад гэтай ямы Яўхім Бабай падаўся да той, якую знайшоў учора, у бары. І зноў прарабіў усё тое самае, што і на

чарналессі,— выкапаў новую яму і ў яе перанёс жыта з той ямы, у якую быў схаваў яго Іван Дарошка.

«Хоць адзін год, адну зіму пагаладай, хе-хе... А то... Вядома, накраўшы, нахаваўшы жыта, і жыць можна. І хлеб есці, і самагонку піць. А я... Пажыву так, як ты жыў. Памяняемся. Ты будзеш Яўхім, а я — Іван...»

...Больш Яўхім Бабай не спаў па начах — як толькі змяркалася, выходзіў у поле і прыслухоўваўся, чуйна прыслухоўваўся, дзе ляскочуць колы, у які бок едзе па дарозе ў лес падвода. Іншы раз краўся назіркам, каб запомніць, куды Іван Дарошка вязе хаваць збожжа, іншы раз чакаў раніцы і тады шыбаваў па свежых слядах, шукаў схovaнь, дзівячыся, які вялікі злодзей старшыня Велікалесаўскага сельсавета, як багата крадзе ён у калгасе збожжа.

«І, мабуць, кожны год па столькі краў! І ніхто ж яго не злавіў! Скажы, прызнайся каму — не паверыць!»

## VI

От жа часам бывае як — усю ноч нешта сніцца, мучыць чалавека, ды так, што аж крычма крычыш, а прачнешся — і не помніш, што снілася, што мучыла, толькі адчуваеш: не адпачыў ані і на душы пагана-пагана, быццам пасля перапою вялікага ці непрыемнай, брыдкай сваркі. І сэрца ў грудзях тахкае-тахкае, здаецца, вось-вось выскачыць ці разарвецца, і кроў у скронях пульсуе, у вушах звініць, і цела быццам пабітае, баліць усё, за што ні вазьміся, што ні павярні. А сказаць, што ж здарылася, чаму ўсё гэтак у цябе — як ні сілішся,— не можаш.

Якраз такое адчуванне было ў Мікалая Дарошкі, калі ён прахапіўся, ачуўся ад сну неяк аднае начы. Зноў і зноў напружваў ён памяць, сіліўся згадаць, што ж такое паганае яму вярзлося, блюзнілася — і нічога пэўнага згадаць не мог. Не то за ім хтосьці гнаўся і ён уцякаў, не то ён за некім сам гнаўся, а дагнаць таго так і не дагнаў...

«Цьфу, і прыпляцецца ж такое! Цяпер дзень цэлы будзеш думаць, галаву ламаць. І чакаць, чакаць, калі ж тое, нядобрае, брыдкае, нарэшце напаткае цябе...»

Павярнуўся на другі бок, вочы заплюшчыў. Сцішыўся, хацеў заснуць. Але сон не ішоў. Лезла ў галаву чортведама што, быццам ніткі з кудзелі, праліся і праліся думкі, адна за адну змрачней.

«Няўжо з Пілiпам што? — аж халадзела ўсярэдзіне.— Казаў жа, каб пільнаваўся, бярог сябе. А ён...»

«Што ён?.. Можа, і не вінаваты, не ад яго залежала. Вайна ж! — не папракаць, а апраўдваць пачаў Мікалай сына.— Калі самалёты наляцяць, бонбы кінуць... Дзе схаваешся, куды ўцячэш? У зямлю закапайся, і то дастануць...»

Ад Піліпа думкі пераскочылі на Івана. Хоць і нялюбы, а ўсё ж сын. На хронт не ўзялі. Думалася, і будзе ён ужо дома, у вёсцы. Увесь час будзе. Аж не — паехаў. Жонку, дзяцей забраў і, кажуць, паехаў. Куды? Хоць бы слова каму сказаў. Нават яму, бацьку, і то... А здаецца ж, і памірыліся. На праводзінах падышоў ён, Мікалай, да Івана, і потым разоў колькі, калі сустракаліся на вуліцы, спыняліся, гаварылі. Думалася — і чужасці, варожасці ўжо не будзе. А бачыш — паехаў і не сказаў, не прызнаўся, што паедзе. Такі ж ніцы, скрытны, як і быў. А хіба ж ён, бацька, не дабра яму, сыну, жадае? Хіба ж бы выдаў, хіба ж бы сказаў каму, куды і чаго паехаў Іван? Не верыць, значыцца, мне... Быццам я яму не бацька, а ён мне — не сын...»

«Можа, з ім, з Іванам, што? Ці з яго жонкаю, Кацяю, дзецьмі? А можа... З Парасчыным чалавекам, Хведарам? Таксама на хронце... А хронт той... Хто і сказаць можа, дзе цяпер хронт? Кажуць, далёка, далёка зайшоў ужо немец. І Гомель узяў, і Мазыр. Не сёння-заўтра, няйнакш, сюды, у Вялікі Лес, прыпрэцца. То можа... Сон еты якраз на немцаў — прывалакуцца яны, чужынцы, сюды, у вёску?»

Аж перасмыкнула ўсяго Мікалая. Помніў, яшчэ з той, ранейшай вайны, немцаў. Прыехалі верхі на конях — гладкіх, пародзістых. Самі ў цяжкіх дабрэнных ботах, у шынялях, з рагатымі каскамі на галовах. Як усё адно чэрці. І першае, што зрабілі,— людзей з хат на вуліцу павыганялі, акружылі. А самі... Шастаць у куфрах, скрынях пачалі, у куратнікі, у свінушнікі, у хлявы палезлі. І пазабіралі ўсё, што на вочы трапілася. У яго, Мікалая, кабана забралі. Якога кабана! Пудоў, можа, на сем ці восем! Ды і курэй, качак, гусей палавілі... І бараніць сваё, нажытае мазалём, ніхто не пасмеў. Глядзелі людзі, як іх рабуюць, і маўчалі. Бо... Бачылі, чым абарона тая свайго скончыцца можа — на іх вачах шабляю засеклі Сахвею — маці Мацея Тхорыка, калі тая кінулася была ратаваць карову, якую выводзілі з хлява чужынцы-рабаўнікі... Па руках спярша секанулі Сахвею, а потым па шыі — галава так і пакацілася пад ногі, як качан капусты.

«А цяпер... Што чакае мяне, усю вёску цяпер? Погалас

жа ідзе — не толькі рабуюць, але і вынішчаюць немцы людзей. Вешаюць, страляюць, паляць. То камуністаў, то яўрэяў, то... і не ведаеш каго. Як разня пачнецца, ого, не, не спыніш яе. І разабрацца, каму і за што галаву адцялі — не разбярэшся. Не, разбярэшся, кеб і хацеў...»

Ведаў, добра ведаў гэта Мікалай, не раз тое бывала ўжо і на яго, яго памяці і вачах — возьмуцца вынішчаць, расстрэльваюць адных, а кончаць зусім іншымі, часам ані не вінаватымі. Багатыя ды хітрыя адкупяцца, паўцякаюць, а то... на іншых пакажуць, маўляў, во, во тыя, каго трэба вынішчыць...

«Охо-о! — уздыхаў, варочаўся і варочаўся з боку на бок Мікалай.— Ну і часы ж насталі! Чакаеш — і сам не ведаеш чаго. Толькі адчуваеш — добрае ніадкуль не прыйдзе, не, не прыйдзе! Калі і прыйдзе што, напаткае цябе, дык толькі ліхое. Бо немцы тыя... Кеб жа яны прыйшлі і пайшлі. А то ж... І спыніцца на ноч, а то і на дзень могуць. Па хатах расселяцца... Кармі іх. Ды і не толькі кармі, а ўсё, што запатрабуюць, давай. І воўкам не глядзі, усміхайся, рабі выгляд — радуешся, што яны тут. Інакш галавы не зносіш. А паміраць... Каму хочацца паміраць? Жыць, жыць яшчэ трэба! Паглядзець цікава, чым жа ўсё ета скончыцца, да чаго прывядзе вайна... Ды і з калгасамі етымі што будзе? Заварыць кашу заварылі, а расхлёбваць...»

Усё, здаецца, усё перабраў у памяці Мікалай Дарошка, сілячыся даўмецца, чаму на душы ў яго так пагана, неспакойна, што, што можа напаткаць яго ў блізкія дні, а здагадацца, пэўна сказаць што — так і не змог. Бо бяда, гора маглі адусюль прыйсці, з любога боку, з любой дарогі. Нават адтуль, адкуль і чакаць іх быццам не было як. «Дзьмуць вятры з мора. Дзьмуць вятры на мора. А гора дзьме на чалавека з усіх бакоў»,— згадаліся словы са святога пісьма, якое і ён, Мікалай, перапісаў і хаваў у хаце, за абразом.

«Божа, абміні, абміні сваёй карай мяне! — зашаптаў Мікалай у адчаі.— Я ж ніколі цябе, нават у самыя радасныя дні, не выракаўся. І не выракуся. Ніколі, ніколі не выракуся!»

Падняўся з пасцелі, намацаў у цемры пад ложкам шлэмакі-апоркі, усунуў у іх ногі. І раптам яго нібы працяло ўсяго, скаланула, бы локцем хто штурхануў — Косцік, дзе Косцік?

Ліхаманкава павярнуў галаву да ложка, на якім заўсёды ляжаў, спаў уночы Косцік,— Косціка на ложку не было.

«Во ён, сон! Як у руку!»

Прайшоўся, прабег сюд-туд па хаце, вярнуўся да Косцікавай пасцелі — пасцель як заслала ўранні Хора, так да яе ніхто і не дакрануўся, не рассцілаў.

«І не клаўся, дадому не прыходзіў...»

Зазірнуў на палок — Хора, як і заўсёды, уткнуўшыся носам у падушку, скруціўшыся ў абаранак, мерна пасапвала, спала на сваім месцы.

«Хіба яе пабудзіць, спытаць, можа, яна што ведае?»

Падумаўшы, не стаў будзіць Хоры.

«Што яна ведае, адкуль? І мне Косцік нічога асабліва не кажа. А ёй і пагатоў...»

Ціхенька, нібыта баяўся патрывожыць нечы сон, адчыніў дзверы, пакраўся, патупаў на падворак.

«Дзе, дзе Косцік?» — засела ў галаве думка. Нават не думка, а трывога, страх.

## VII

Пасля таго як паехала з Вялікага Лесу Тася (Косцік хоць і са спазненнем, але ўсё ж даведаўся пра гэта), свет для яго перавярнуўся, перастаў існаваць. Нідзе Косцік не знаходзіў сабе месца, ні ў чым не бачыў радасці. Блукаў, сноўдаўся як непрыкаяны па вёсцы, хадзіў у Гудоў. Завод ужо амаль не працаваў — збіраліся туды толькі такія, як Косцік, хто не ведаў, дзе прыткнуцца, за што зачапіць свае рукі. Ды і тыя, хто прыходзіў на завод, больш сядзелі на бярвенні і прастарэкавалі, чым працавалі. Усіх трывожыла адно: немцы наступаюць, нашы адступаюць. Агрызаючыся, з баямі, але адступаюць. Што будзе далей? Спыняць, затрымаюць нашы немцаў ці яны ўсё ж прарвуцца, прыйдуць аж сюды, на Палессе? Калі прыйдуць, што рабіць? А Косціка не займала, не палохала нават гэта. Ён жыў у нейкім уяўным, сваім свеце — хоць хадзіў ён па звыклых вясковых сцежках і дарогах, дзе на кожным кроку былі гразь ці пясок, у думках ён быў увесь час далёка-далёка — там, дзе была Тася. Тася ж, ва ўявах Косціка, была даўно ўжо ў Мінску — тым невядомым горадзе, дзе ўсё-ўсё не такое, як тут, у іхнім Вялікім Лесе ці ў Гудове. Дамы там высозныя, цагляныя, вуліцы выбрукаваныя каменнем; людзі амаль не ходзяць пешкі, а ездзяць на веласіпедах, аўтобусах, трамваях. У магазінах усяго-ўсяго навалам, аж паліцы гнуцца, што хочаш, тое і купляй. Цэлы дзень льецца адусюль музыка, чуюцца песні — іграе

радыё. І ўсюды, на кожным кроку,— людзі. Добра апранутыя, вясёлыя, усмешлівыя, ветлівыя. І сярод гэтых людзей — Тася. Яна, вядома, прыгажэйшая за ўсіх, і ля яе, за ёю — куды паверне яна, туды і яны — цугам хлопцы. Ды якія хлопцы! Маракі, лётчыкі, студэнты... А яна, горда падняўшы галаву, ідзе і на нікога не глядзіць. Каб жа не глядзела! А то ж... Глядзіць! Глядзіць амаль непрыкметна, адным краёчкам вачэй, як гэта ўмее толькі адна яна. Глядзіць на марачка, круглатварага і надта ж стройнага, падцягнутага. У марачка развяваюцца стужкі ад бесказыркі, ён увесь у чаканні, не зводзіць вачэй з Тасі. І Тася... Паварочваецца і пасылае марачку ўсмешку. Усмешку, якая быццам нічога і не значыць, але дае падставы спадзявацца. Спадзявацца і верыць...

«Ум-м,— аж стогне Косцік.— Мяне там няма. А то б... Паказаў бы я марачку».

І рукі ў Косціка міжвольна сціскаюцца ў кулакі.

«Паеду! І я паеду! Паеду туды, у Мінск!» — шэпча сам сабе Косцік.

А то... Уяўляецца Косціку яшчэ і такое.

...Светлы, сонечны дзень. Парк. Алея, спярэшчаная ценямі ад камлёў бярозак, што пасаджаны паабапал. Па ёй, гэтай алеі, ідуць подручкі двое. Ён, той круглатвары марачок, і... Вядома ж хто — Тася! Яна амаль ужо дарослая, станістая, з тугою, закінутай на плячо касою. У касу ўплецена блакітная стужка. Нібыта вялізны, казачны матылёк сеў. Тася і марачок ідуць, пра нешта шчасліва размаўляючы. А ён, Косцік, стаіць, стаіўшыся, пад дрэвам, глядзіць ім услед і...

І стогне, зноў стогне...

«...Як упусціў я Тасю? Трэба было ўсё, усё зрабіць, каб яна... пакахала мяне, каб нікуды не ехала, жыла тут, у Вялікім Лесе».

«Але ж я... Здаецца, і рабіў усё!» — апраўдваўся, быццам перад некім на судзе, Косцік.

«Што рабіў?» — дапытваў Косціка хтосьці.

«Усё, усё рабіў!»

«Ну назаві, што ты рабіў? Га?»

«У школе з пеўнем... Ды і тады, на грэблі...»

«Хе-е,— смяяўся хтосьці нябачны.— І гэта ты называеш рабіў? Гэтым думаў прывабіць да сябе дзяўчыну? Дзівак! Не з таго трэба было пачынаць!»

«А з чаго?»

«З чаго? Вучыцца трэба было добра. Лепш, чым яна.

Каб ніхто ў класе не рашыў задачы, а ты рашыў. Каб ніхто не мог адказаць на пытанне настаўніка, а ты адказаў. Ды і паводзіны былі лепшыя, чым ва ўсіх. Тады б і Тася ўвагу на цябе звярнула, пачала б зайздросціць, бачыць у табе нешта больш значнае. Каб захацеў, ты ж мог вучыцца лепш за Тасю. У цябе ж галава... Кацялок, словам, варыць».

«Мой кацялок варыў, пакуль я Тасю не ўбачыў. А ўбачыў Тасю — і кацялок перастаў варыць. Я проста жыць не магу, каб не бачыць яе. Думаю ўвесь час пра яе, толькі пра яе...»

«Трэба было раней думаць. А цяпер... Позна. Не вернеш...»

Аднойчы, калі Косцік прыйшоў у Гудоў на завод і блукаў паблізу ярусаў бярвення, не ведаючы, куды падзець рукі, што ўзяцца рабіць, яго таўхануў пад бок Ігар.

— Здароў!

— Здароў,— адказаў ваўкавата, насцярожана Косцік.

Павіталіся — і паапускалі ў зямлю вочы, быццам былі адзін перад адным у нечым вінаватыя.

— А хлопцы, сябры твае, дзе? — спытаў Косцік, бо не прывык бачыць аднаго Ігара. Заўсёды, калі б ні сустракаліся, Ігар у кампаніі быў, з сябрамі — Эдзікам і Кузем.

— Эт,— махнуў абыякава рукою Ігар і зноў апусціў долу вочы.

Быў Ігар сёння невясёлы, сумны. І валасы на галаве, караткаватыя, жорсткія, тапырыліся, тырчалі ва ўсе бакі, усё адно бы іголкі на вожыку, хоць Ігар і хацеў мець чубок, зачэсваў іх угору, каб яны ляжалі.

— Здарылася што?

— Прайграўся я. У пух,— прызнаўся Ігар.

— У ачко?

— Ага.

— І багата прайграў?

— Ды яно не так і багата. Рублёў трыццаць. Але грошы не мае. Разумееш? Цётка дала, каб я цукру купіў.

— Дзе ты таго цукру знойдзеш цяпер?

— Ета я знарок цётцы сказаў пра цукар, каб грошы дала. Маўляў, ведаю, дзе цукар прадаецца, дзе ўзяць яго можна. Яна і дала грошы. А я... З грашыма тымі ў карты сеў гуляць. Думаў, выйграю. Ажно прайграў. І сваіх рублёў пяць, і ўсе, да капеечкі, цётчыны грошы.

Ігар пагладзіў чубок на галаве і раптам як бы ажывіўся, пажвавеў.

— Слухай,— падняў ён на Косціка вочы, перасмыкнуў губамі, аж шрам на шчацэ пачырванеў.— А ты б не пазычыў мне?..

У Косціка акурат былі ў кішэні грошы. Даў бацька яму дзве чырвоненькія дзесяткі. Так, на ўсякі выпадак. Раптам убачыць Косцік дзе што-небудзь цікавае ў магазіне і купіць. Пазычыць гэтыя грошы Эдзіку?

— У мяне столькі няма,— сказаў Косцік сумленна.— Усяго дваццаць рублёў.

— Ну дык дай дваццаць.

Косцік разгубіўся.

— Грошы... не мае. Бацькавы.

— Я ж не назусім. Аддам. Можа, нават сёння. Вось пойдзем, дзе гуляюць, я карту зноў вазьму. Выйграю і аддам.

Косцік задумаўся.

— А як прайграеш?

— Ну дык і што? Калі ж небудзь мне і пашанцуе, не вечна ж я прайграваць буду. Ды калі ты... Баішся... Не давай дваццаць рублёў, дай дзесяць...

Косцік муляўся.

— Не бойся, дай колькі можаш. Я выйграю, вось пабачыш. Ета мяне аднавокі падсадзіў. А цяпер я ведаю, як гуляць з ім.

— Які аднавокі?

— Я і сам яго першы раз бачу. Прыблудны нейкі. Амаль усіх у Гудове абгуляў. Поўная торба грошай. З раніцы самай як сеў, дык і не ўстае. Гуляе і гуляе. І ва ўсіх выйграе. Хадзем, паглядзіш. Толькі дай, дай хоць трохі мне ґрошай.

Пазычаць грошы... Ды яшчэ бацькавы... Не хацелася, ані не хацелася Косціку. І за тыя, што тады, першы раз, прайграў, ледзь адкруціўся. А цяпер? Што я скажу цяпер, калі раптам спытае бацька, дзе грошы? Але ж... І тое, што прапаноўваў Ігар,— вабіла. Вельмі вабіла. Паглядзець на таго аднавокага, у якога поўная торба грошай і які ўсіх абгуляў у Гудове. Ды і... Раптам сапраўды Ігар выйграе, верне, аддасць грошы. Ён жа так упэўнены, што выйграе. Быццам ведае, прыгледзеўся да аднавокага, як трэба з ім гуляць, каб не прайграць, а выйграць...

— Я дам табе,— сказаў, глытаючы ад хвалявання перасохлым горлам сліну, Косцік.— Чырвонец. Толькі... І я пайду з табою. Выйграеш — аддасі грошы. Бо яны... Не мае.

— Ну дык мы ж дамовіліся!

Косцік дастаў з кішэні дзве дзесяткі. Навейшую, храбусткую, пакінуў сабе, засунуў назад у кішэню, больш скамечаную аддаў Ігару.

— Ну дзякуй! Дзякуй табе! — горача пачаў дзякаваць Ігар.— І пайшлі са мной,— заспяшаўся ён.

Ішлі, як заўважыў Косцік, у бок ад станцыі, туды, дзе былі дрывяныя склады. Ля хаткі, што стаяла адзінока наводшыбе і была абгароджана шчыльна высокім старым штыкетнікам, спыніліся, зайшлі ў двор. Пераступілі абгрызены свіннямі парог, увайшлі ў цёмныя сенцы, а адтуль — праз невысокія дубовыя дзверы — і ў хату.

Першае, што кінулася ў вочы Косціку,— гэта, што хата поўная людзей. Адны тоўпіліся, стаялі ў парозе, другія сядзелі — хто на лаве ля стала, хто на ўслонах, хто проста на самаробным драўляным ложку, што, засланы клятчатай посцілкай, туліўся да печы. Усюды было брудна, не прыбрана і не падмецена, і вельмі ж накурана — хоць тапор вешай.

Асвойтаўшыся і прыгледзеўшыся, Косцік пазнаў сярод незнаёмых людзей і некаторых з тых, з кім працавалі на заводзе, між іх і Эдзіка, Кузю. Эдзік, заклапочаны, расчырванелы, сядзеў, аблакаціўшыся на падаконнік, ля акна — у расхрыстанай, з дзвюма кішэнькамі на грудзях чорнай вельветавай куртачцы, змятых картовых штанах — і пільна сачыў вачыма за тымі, хто быў за сталом і гуляў у карты. Па ўсім адчувалася, Эдзік прайграўся і цяпер, дакараючы сябе, мусіць, засяроджана абдумваў, дзе ён памыляўся — трэба было ставіць на большую ці меншую суму, а ён зрабіў наадварот. Кузя ж, смокчучы папяросу, якая даўно патухла ўжо, а ён, у зацятасці гульні, гэтага не заўважаў, браў карты, час ад часу моўчкі выграбаў рукою з той купы грошай, што ляжала пасярод стала, і цягнуў да сябе — гэта калі выйграваў, ці адлічваў пэўную суму і сунуў у агульную кучу, калі прайграваў. Там жа, за тым сталом, у самым куце, сядзеў той і аднавокі, пра якога гаварыў Косціку Ігар. Аднавокі быў плячысты, але худы, непаголены, з чорнаю павязкаю цераз галаву. Па абодва бакі каля аднавокага сядзелі і яшчэ нейкія два дзядзькі — адзін стары, з барадою, другі значна маладзейшы, вастраносы, у салдацкім шынялі.

Ігар, увайшоўшы ў хату, ні з кім не вітаючыся, не спыняючыся, папраставаў да стала. Папрасіў пасунуцца Кузю, сеў побач з ім.

— Карту мне! — ледзь не закамандаваў ён.

Банкаваў якраз аднавокі.

— Грошы на стол! — сказаў ён сіпата грубаватым басам.

— Ёсць грошы! — адказаў нібыта з выклікам Ігар і, засунуўшы руку ў кішэню штаноў, дастаў пазычаную ў Косціка скамечаную дзесятку.

— Адразу на чырвонец?

— На чырвонец!

Аднавокі даў Ігару карту. Адну, потым, счакаўшы трохі, другую. Відаць, карты Ігару трапіліся не вельмі каб, неважнецкія, бо, падумаўшы, ён моўчкі працягнуў руку да аднавокага зноў — папрасіў яшчэ адну карту. Узяўшы яе, доўга не пераварочваў, трымаў, накрыўшы рукою.

— Не марудзь, хутчэй! — нецярпліва падагнаў Ігара аднавокі.

Ігар нібы чакаў гэтых слоў — перавярнуў карту. І, загнуўшы на ўсю хату мацюка, пляснуў на стол і астатнія дзве карты — быў перабор. Кузя накрыў сваёю здаравенную лапаю пазычаную ў Косціка дзесятку, пасунуў яе ў агульную кучу, а Ігар, падняўшыся з-за стала, шуснуў за дзверы — нават не паглядзеў на Косціка.

«А казаў жа, выйграю, грошы аддам. Сёння ж! — мільганула ў Косціка ў галаве.— Што бацьку я скажу, калі спытае пра грошы, загадае вярнуць іх!»

Косціка нібы токам электрычным праняла. Не, не таму, што баяўся ён бацькі. Але... Косцік і сам не ведаў, не мог у тую хвіліну сказаць чаму.

«А што, калі мне паспрабаваць? Раптам выйграю. Бо ўсё адно... Аддаваць бацьку няма чаго...» — падказала яму нейкая думка.

«А калі прайграю?..»

— Давай сюды,— павярнуўшыся тварам на хату, Кузя шырокім жэстам рукі запрасіў сядаць на Ігарава месца Косціка.

Думка адставала ад таго, што рабілі ногі. Косцік, таго не заўважаючы і сам, пакіраваўся да лавы, сеў побач з Кузем на месца, дзе зусім нядаўна сядзеў Ігар.

— Хлопец, га, пасунься трохі, ета нешчаслівае месца, бачыш — дзірка,— шаптаў, падказваў Косціку нехта збоку.

— Сапраўды,— пасмялеў і Косцік.— Пасунься...

І таўхануў рукою ў плячо Кузю.

Кузя пасунуўся. Не надта, а акурат, каб Косцік не

сядзеў на дзірцы. (У дзірку, мусіць, устаўлялі прасніцу, калі пралі кудзелю.)

— Ну, а ты як гуляеш? — спытаў, не зводзячы вока з Косціка, нібы працінаючы яго навылёт, аднавокі.

— Я?.. На рубель,— як не крыкнуў, не могучы саўладаць з сабою і сваім голасам, Косцік.

— Х-хум, на рубель дык на рубель,— прастагнаў, нібыта незадаволены, аднавокі. І даў карту Косціку.

Косцік, не гледзячы на яе, папрасіў яшчэ адну. Перавярнуў дзве карты адначасова — прыйшлі туз і дзесятка.

— Ачко!

Калоцячыся ад хвалявання, амаль ліхаманкава пацягнуўся рукою да купы, узяў сабе рубель.

«Дарэмна на ўсю дзесятку не стукнуў! — пашкадаваў.— Адразу б вылез з-за стала, больш не гуляў бы!»

Другі раз Косцік таксама выйграў — зноў рубля, бо ставіць на больш не асмеліўся. І зноў папракнуў сябе: «Дурань, трэба было на больш ставіць!»

Трэці раз Косцік паставіў на пяцёрку — і выйграў.

«Хлопец, табе карта ідзе! — зашаптаў нечы голас збоку.— Не гарачыся, гуляй спакойна».

Косцік азірнуўся — збоку, на ўслоне, сядзеў з папяросаю ў зубах пажылы дзядзька, мусіць, з мясцовых, гудоўскіх.

— Стаў на дзесятку! — шаптаў дзядзька.

Косцік паставіў на дзесятку — і выйграў.

«Во!» — як не ўсхапіўся з месца дзядзька.

Косцік дзесятку палажыў у кішэню.

«Няхай ляжыць. Бацьку дваццаць рублёў. А на астатнія... Пагуляю...»

Зноў узяў у аднавокага карту — і зноў выйграў. Прычым банк.

Цяпер Косцік сам раздаваў карты, сам пытаўся, на колькі хто ставіць. Усе, за выключэннем аднавокага, гулялі асцярожна, ставілі хто на рубля, хто на два. А аднавокі кожны раз біў па ўсім банку. І не выйграваў. Так што, калі Косцік скончыў банкаваць, у яго сабралася даволі ладная сума грошай — рублёў, мусіць, сто.

На Косціка, якому шанцавала, ішла карта, была скіравана ўся ўвага. Той дзядзька, што сядзеў збоку і падказваў, аж прыўстаў.

— Ты сачы за аднавокім. Ён махляр,— шаптаў дзядзька.— А лепш кідай гуляць. Выйграў — і даволі.

Косцік сачыў, пільна сачыў за аднавокім. Асабліва за

яго рукамі. Калі бачыў, як соваў той непатрэбную, лішнюю карту ў рукаво ці ў кішэню, крычаў:

— Э, дзядзька! І не сорамна вам?

Аднавокі злаваўся, пырскаў слінаю, адмаўляўся ад карты, казаў, што яна не яго. Але, па ўсім адчувалася, аднавокага ў гэтай кампаніі не любілі, спачувалі ўсе Косціку і рады былі, што не аднавокі, а ён, Косцік, выйграе. Таму на аднавокага мацюкаліся, прымушалі, каб ён дастаў карту з рукава ці кішэні, далучыў да раней узятых, сваіх.

Дачакаўшыся, калі аднавокі зробіць «стук», Косцік «стукнуў» па ўсіх — і выйграў банк.

Збанкаваў рублёў сто, зрабіў сам «стук». І зноў выйграў — гэты раз рублёў трыста.

— Хлопец, уцякай! — шаптаў і шаптаў дзядзька збоку.— Бо ета... Прахвост! Ён з нагі падэшву на хаду адпора. І прайграваць не прывык. Не даруе табе. Забіць можа за грошы, га!

Апошнія словы спалохалі Косціка. Ён падняўся з лавы, сказаў:

— Хопіць! Мне пара дадому...

Ужо змяркалася, і Косціку сапраўды пара было ісці дадому. Ён гэта адчуваў, ды і выйграў ладнавата.

— Не! — стукнуў кулаком па стале аднавокі.— Ніякіх дамоў няма. Гуляем, пакуль ёсць грошы!

Запалілі святло — прынеслі аднекуль лямпу і паставілі яе на тое месца, куды ссоўвалі прайграныя грошы.

Косцік зноў сеў на лаву. Той дзядзька, што падказваў і быццам спачуваў, прашаптаў: «Папаўся ты, хлопец. Выкручвайся, як знаеш. Я — дадому. А ты глядзі, каб еты аднавокі нож у спіну табе не ўсадзіў!»

Гульня пачалася з новай сілай і новым азартам.

## VIII

*З дзённіка Тасі Несцяровіч*

Татачка, зноў мы з мамаю ў дарозе. Ідзём у свой горад, у Мінск. Можна было пажыць яшчэ ў той вёсцы, дзе мы былі спыніліся,— у Запясоччы. Але я настояла, упрасіла маму — трэба ісці. Бо сядзець у вёсцы, чакаць... Чаго чакаць? Калі схлынуць на дарогах немцы? Але ж яны, мабыць, ніколі не схлынуць — паўзуць і паўзуць на ўсход. І ўсе такія самазадаволеныя, самаўпэўненыя, ваяўнічыя, што хоць ты... морды паганыя фашыстоўскія ім панабівай. Ідуць пеша, едуць на матацыклах, машынах, тан-

ках. Пазакасвалі рукі па локаць, гарлапаняць песні — словам, адчуваюць сябе зусім як дома.

Можа б, маці і не згадзілася ісці, можа б, мы і аставаліся яшчэ ў Запясоччы, але вярнуліся з уцякацтва гаспадары хаты, у якой мы спыніліся. Зайшлі яны, кажуць, далёка, але ўсюды ўжо немцы. І ў Мінску таксама. Няўжо гэта праўда, тата? Калі немцы занялі Мінск, то дзе ты? На волі ці ўсё яшчэ... Ой, татка, нарабілася, бачыш, у нашым жыцці такое, што як і разблытаць усё. Тут і гэты твой арышт, і нашы ўцёкі на Палессе, і гэтая зусім недарэчная вайна. Адно за адным. Жылі-жылі як людзі, і... Раптам усё закруцілася, завярцелася...

Ага, дык вярнуліся гаспадары хаты, і нам... Нас, вядома, ніхто не выганяў, мы маглі і далей жыць у той хаце, у гаспадароў жа дзяцей ужо дома няма. Ёсць толькі ўнучка, сынава дочка. Сын служыў у войску недзе пад Мінскам, ён — камандзір. Як пачалася вайна, старыя, узяўшы ўнучку, кінуліся былі ў той вайсковы гарадок. Але ні сына, ні маці ўнучкі, свае нявесткі, там ужо не засталі. Таму і вярнуліся назад, дахаты. «Тут хоць страха над галавою ёсць і яда. А што рабіць, як жыць, і гэтага не маючы, недзе сярод усяго чужога?» — гаварылі яны нам з маці.

І мы, наладаваўшы ядой дзве сумкі — адну нясе мама, другую я,— рушылі з Запясочча. Людзей цяпер на дарогах не так шмат. Не тое, што было некалькі тыдняў таму назад. Тыя ж, што сустракаюцца, рэдка ідуць на ўсход. Часцей вяртаюцца ў свае гарады і вёскі, назад, дадому. Бо ўцякаць ад немцаў, кажуць, няма сэнсу — немцы на машынах і наступаюць надта імкліва. Адны гавораць — дайшлі да Масквы. Раней мы з мамай не верылі таму, што чулі. А цяпер і мы пачынаем верыць. Даўмецца толькі ніяк не можам — што ж здарылася, чаму наша Чырвоная Армія не стрымала немцаў на граніцы, чаму яна адступіла?

Ідзём мы, татка, і ўдзень, і ўночы. Як калі і дзе. І выбіраем не бітыя шляхі, а маленькія, глухія, прасёлкавыя дарогі. На бітых шляхах — фашысты, сустракацца з імі, бачыць... Ой, татка, гэта не тое што непрыемна, а страшна, жахліва. Яны ж, гадаўё, што хочаш могуць з намі зрабіць. І пастраляць, і... На што мы нагледзеліся, чаго наслухаліся! Пісаць пра тое і то... Жудасна! А бачыць, чуць... Ніколі б раней не паверыла, што на такое здатны, такое могуць рабіць... Хто б мог падумаць — людзі!

Мама надта ж баіцца за мяне, а я баюся за маму. Бо калі, не дай бог, не будзе побач са мною мамы, куды я падамся адна, што буду рабіць? Я ж нават да Мінска ці дабяруся. А ў Мінску што? Дзе шукаць цябе. Я ж нічога зусім не ведаю. Нават куды пайсці, дзе, у каго спытаць?

На глухіх, прасёлкавых дарогах немцаў мала. Часцей яны там, дзе вялікія, бітыя шляхі. І калі мы з маці набліжаемся да вялікіх шляхоў, то ўдзень не пераходзім, чакаем ночы. Уночы рух па шляхах амаль спыняецца і мы без асаблівай рызыкі мінаем небяспеку. Але небяспека падсцерагае нас усюды, на кожным кроку. Бо не толькі немцы нападаюць на людзей, але і свае, такія ж, як і мы з маці, людзі. Можа, яны і не такія, як мы, можа, іншыя, але свае, нашы. Маці кажа, што гэта турэмнікі. Турмы разбамбілі, і турэмнікі паўцякалі, паразбягаліся. Такім таксама забіць чалавека ці абрабаваць — раз плюнуць. Некалькі разоў нас з маці перапынялі. Але што ў нас возьмеш? Пакапаюцца ў нашых сумках — і пайшлі. А мы з маці пасля гэтага... Чалавека ўбачым, што ідзе насустрач, і з дарогі зварочваем, каб не сустракацца, каб далей ад ліха быць...

Цяпер і я згадзілася з маці, што не трэба было нам выбірацца з Вялікага Лесу, кіравацца ў Мінск. Трэба было сядзець там, у вёсцы, і ўсё. Але ж надта хацелася цябе, татка, пабачыць. Ды і... Хто ж мог ведаць, што такое здарыцца, такое будзе, напаткае нас у дарозе?

Але, нягледзячы на нішто, мы ўсё ж ідзём. Ідзём не так хутка, як нам бы таго хацелася, але ідзём. За дзень, бывае, і па трыццаць, і па сорак кіламетраў мінаем. Здараецца, нас і падвозяць, як вось сёння. Едзе нейкі дзядзька на конях, запрэжаных у воз. Мы хацелі з дарогі сысці, схавацца ад яго. Але спуск з дарогі быў абрывісты, круты, пясчаны, а лес, кусты — далекавата. Мы ж пастамляліся, ледзь ногі валаклі. І дзядзька дагнаў нас, распытваць пачаў, хто мы і куды ідзём. Мы з маці і сказалі яму, маўляў, вайна ў дарозе нас захапіла і мы дадому, у Мінск, кіруемся. Аказваецца, дзядзька едзе таксама ў той бок. І пашкадаваў нас — прапанаваў падвезці. Мы з маці з радасцю селі ў воз на сена... І паверыш — кіламетраў з пяцьдзесят праехалі. Хто той дзядзька? Не ведаем і самі, але нехта, мусіць, з начальства. Бо і гаварыў з намі надта ж добра, а потым, калі расставаліся, і дзякаваў нам. За што дзякаваў? Ды за тое, што мы ратавалі яго. Калі нас затрымлівалі немцы, то дзядзька, паказваючы галавою на нас з маці, тлумачыў: ён, маўляў, з сям'ёю едзе, вяртаецца ў сваю вёску.

А аднаго яго, дужага, здаровага, можа б, немцы і затрымалі, не пусцілі б далей ехаць...

Шкада, што дзядзьку таму трэба было, як ён сказаў нам, «у адно месца заехаць», і ён збочыў з дарогі. А то б да самага Мінска даехалі б... Цяпер вось у ляску ляжым. Надвячорак якраз, сонца заходзіць. І неба такое прыгожае за полем, малінавае, з палосамі хмар. І ціха-ціха навокал, толькі птушка нейкая ценькае. Цень-цень, цень-цень... Радавацца б, а настрой у мяне, бачыш, паганы. Бывай, татка, можа, апошні раз я гэтак з табою размаўляю, можа, ужо наступны раз пагаворым па-сапраўднаму, уголас, як мы і гаварылі з табою калісьці. Чаму я так думаю? Ды таму, што не заўсёды хвіліна бывае, калі можна затуліцца за камель дрэва і пісаць. Ды і... Мінск, кажуць, не так і далёка ўжо...

Так што, татка, бывай, да сустрэчы!

## IX

Усё часцей і часцей, астаўшыся адзін, Васіль Кулага думаў пра сваю жонку, дзяцей — што чакае іх, што можа напаткаць у недалёкім будучым? Лёс жонкі і дзяцей трывожыў, хваляваў Васіля больш, чым усё астатняе, што рабілася ў Вялікім Лесе, і наогул навокал у свеце. Можа, таму так хваляваў і трывожыў лёс сям'і Васіля, бо ён, будучы чалавекам разважлівым, разумеў: тое, што рабілася ў Вялікім Лесе, і наогул навокал, мала, а то і зусім не залежала ад яго, Васіля, там былі свая логіка і свае законы; лёс жа жонкі, дзяцей залежаў, вельмі нават залежаў. І быў быццам яшчэ час, каб ураТаваць сям'ю, зрабіць нешта такое, каб потым не шкадаваць: можна было, а не зрабіў... Не трэба было мець вялікага розуму, каб, зазіраючы ў будучыню, не бачыць, як будзе замінаць,вісець кайданамі на нагах сям'я, калі ён, Васіль, скажам, не пойдзе на фронт, астанецца недзе паблізу, тут, у Вялікім Лесе. З аднаго боку, яно і добра, што сям'я побач — заўсёды можна зайсці дадому, у сваю хату, паглядзець, што і як, ведаць усё пра жонку і пра дзяцей. З другога ж боку... увесь час думаць будзеш не пра нешта іншае, важнае, а пра сям'ю — як яны там, што ў іх? Дык гэта ж, як немцы сюды не прыйдуць. А як прыйдуць? Што тады будзе? Аднаму лацвей — сабе ён знойдзе, усё знойдзе — і дзе пераначаваць, і што з'есці. А сям'я як? Пакінуць яе ў вёсцы? А немцы, што зробяць з жонкаю, дзецьмі немцы? Ён жа, Васіль, як-ніяк,

а начальства, сакратар сельсавета, а потым і старшыня калгаса, камуніст. Немцы такіх... Не шкадуюць. І забраць сям'ю з сабою... Куды забраць? Аднаго яго кожны кусцік пераначаваць пусціць. А сям'ю? З сям'ёю ўсё будзе куды складаней, цяжэй...

Некалькі разоў Васіль і так, і гэтак спрабаваў загаварыць з жонкаю, Поляю, пра тое, што яго хвалявала, клапаціла. Але жонка, упартая і валявая, не хацела, не згаджалася нікуды з Вялікага Лесу ехаць.

— Я дома буду. Нікуды са свайго селішча не паеду,— цвердзіла, паўтарала яна сваё.

Усе спробы Васіля пераканаць жонку, даказаць ёй, што аставацца ў вёсцы нельга, небяспечна, разбіваліся, быццам хвалі аб камень.

— І не думай мяне нікуды адпраўляць — не паеду!

— Чаму ты не паедзеш?

— Не паеду, і ўсё.

Васіля гэта злавала, выводзіла з сябе.

— Ва ўсім павінна быць логіка, разумнасць. Але ў гэтым... У тым, што ты збіраешся рабіць, ні логікі, ні разумнасці няма,— гаварыў ён жонцы.

— Хопіць і таго, што ты надта разумны. У партыю ўпісаўся, старшынёй калгаса стаў...

— Ды не мог я інакш,— апраўдваўся Васіль.

— Мог. Каб хацеў, пра сям'ю больш думаў, усё, усё мог бы.

— Што значыць — мог бы? — дапытваўся, яшчэ больш нервуючыся, злуючыся, Васіль.

— Тое і значыць, што працаваць, як іншыя, на полі ты не хацеў. Лёгкага хлеба шукаў. А хлеб той... Бокам вылезе.

— Перастань, як ты можаш гаварыць такое? Знайшла лёгкі хлеб! Хіба не бачыш, як даецца той хлеб — ні ўдзень ні ўночы спакою не маю.

— Спакою, можа, і не маеш, але і пуп, жылле не рвеш, як некаторыя. У канторах цёплых усе зімы праседзеў, на марозах не калеў, у дождж не мок...

— І гэта кажаш мне ты, жонка?

— Бо ніхто іншы табе таго не скажа. А я скажу. Даўно, заўсёды табе гаварыла — не лезь у начальства, хлеб зарабляй мазалём. І тады... Не баяўся б нічога, нішто б ні табе, ні сям'і не пагражала. Убачыш на свае вочы, што нарабіў ты, якую пятлю на шыю мне і дзецям накінуў... А цяпер хочаш, каб пятля тая не зацiснулася на шыях

нашых? Заціснецца яна, нікуды не дзенемся, нікуды ад яе не ўцячом...

Жонка пачынала плакаць. Пачыналі ўслед за маці румзаць і дзеці — васьмігадовая Аленка і трохгадовы Якуб.

Каб не расстройваць яшчэ больш жонку і дзяцей, Васіль выходзіў з хаты, падоўгу сядзеў у двары на дрывотніку ці кіраваўся куды-небудзь у поле, у лес. Думкі пра жонку, дзяцей не пакідалі ні на хвіліну, з новай і новай сілай апаноўвалі яго. Ніяк не мог змірыцца Васіль з тым, што жонка, самы, здавалася б блізкі чалавек, не разумее яго, папракае тым, чым нельга папракаць, асабліва ў гэты, такі неспакойны, няпэўны і трывожны час. А здаецца ж, і згода між імі была, і жылі душа ў душу, дзялілі і хлеб, і пасцель, ночы і дні. Праўда, і раней, здаралася,— жонка не разумела яго, Васіля, не хацела і каб ён у партыю паступаў, і ў начальства сельсавецкае — а тым больш у калгаснае — ішоў. Але ён, Васіль, не надаваў гэтаму асаблівага значэння. Ці мала што здасца ці захочацца жонцы? Дык і слухаць яе, паддавацца? А дзе ж мужчынская цвёрдасць, дзе характар? Дый... Неяк так ці то сталася, ці то зрабілася, што назад яму, Васілю, дарогі няма. Падхапіў яго вецер часу і нясе, нясе на крылах сваіх. Яшчэ калі вучыўся ў царкоўнапрыходскай школе, сарваў са сцяны партрэт цара. Сарваў, бо гэта не хто іншы, а цар забраў у яго бацьку, пагнаў у салдаты, на фронт, дзе той і злажыў «смерцю храбрых» галаву. Так гаварылі ўсе ў вёсцы, і так яно, як потым пераканаўся Васіль, і было на самай справе. Потым, калі перамаглі чырвоныя, перамагла рэвалюцыя, ён, Васіль, быў пісарам пры сельсавецкім начальстве. Дзялілі панскую зямлю, то ён, Васіль, хадзіў услед за начальствам і запісваў, колькі каму той зямлі і дзе адмерана. Уступіў адным з першых у камсамол, а потым і ў партыю. Памагаў Івану Дарошку праводзіць калектывізацыю, раскулачваў кулакоў і іх падпявал. І ў сельсавеце за сакратара таксама працаваў. Не з усім, праўда, што рабілася, Васіль пагаджаўся, не ўсё, што трэба было, рабіў ахвотна, з душой. Было і такое, чаго яму рабіць не хацелася. Але адкрыта сказаць пра тое... Не, не хапала ў Васіля смеласці. «А раптам я чагосьці не разумею? Дзе мне, з маёй граматай, дайсці адразу вось да таго, што разумныя людзі прыдумалі? У іх жа — галовы... Не мая». І сваёй галавою, сваім розумам намагаўся Васіль разабрацца ва ўсім, дайсці да сутнасці той ці іншай пастановы, таго ці іншага рашэння. Таму ніколі асабліва Васіль не вылазіў наперад, мала калі выступаў з трыбуны,

а больш ціхенька, моўчкі працаваў, рабіў тое, што яму загадвалі ці патрабавалі ад яго рабіць. І з жонкаю, Поляю, сышоўся таксама неяк быццам нават выпадкова. Прывёў у хату да Полі — яна адна жыла, тыф усю Поліну сям'ю — і маці, і дзвюх сясцёр — выкаціў — упаўнаважанага, што калгасы прыязджаў арганізоўваць, пераначаваць. А Поля, тады ўжо дзяўчына на выданні, не пусціла ўпаўнаважанага да сябе ў хату, сказала:

— Кеб ты сам, Васіль, папрасіўся пераначаваць, то я... Можа б, і пусціла. А яго,— паказала яна вачыма на ўпаўнаважанага, хілага, перахлябістага, з акулярамі на носе,— не, не пушчу...

І зачыніла за сабою дзверы...

Давялося весці начаваць упаўнаважанага ў іншую хату, да іншых людзей.

Некалькі дзён думаў Васіль над тымі словамі, што сказала Поля. А потым, сустрэўшы неяк Полю на вуліцы, сказаў не то жартам, не то ўсур'ёз:

— Дык я помню, Поля, твае словы. І калі-небудзь папрашуся пераначаваць.

— А ты не прасіся, ты прыходзь,— смела сказала Поля і пачырванела ўся, успыхнула, бы макаў квет.

Зноў некалькі дзён хадзіў Васіль як сам не свой. Ведаў ён: некаторыя хлопцы начуюць у дзяўчат. Спачатку ў пуні, на сенавале, каб ніхто асабліва не ведаў, а потым і ў хаце. Праўда, гэта калі ўжо да жаніцьбы блізка...

«А што замінае мне жаніцца з Поляю? Дзяўчына яна... Хоць куды. І з твару, і гаспадарлівая, і так... Словам, калі да жаніцьбы дойдзе, дык і жаніцца можна».

І аднаго вечара, калі свята нейкае было і ён трохі быў выпіў самагонкі, ідучы міма Полінай хаты, збочыў Васіль у двор да Полі. Доўга таптаўся ля дзвярэй, не асмельваючыся пастукаць. Але ўсё ж не вытрымаў — пастукаў.

— Хто? — спытала з-за дзвярэй Поля — яна, мусіць, чула, як нехта зайшоў у двор, і стоена чакала, калі яе паклічуць, абзавуцца.

— Не пазнаеш? Гэта я, Васіль.

Поля адчыніла сенцы, правяла яго ў хату.

— Што, і праўда пераначаваць хочаш? — сказала, не запальваючы святла, з радасцю, як здалося Васілю, Поля.

— Хачу,— прызнаўся Васіль.

— Дык распранайся, кладзіся ў ложак.

Васіль не верыў таму, што чуў. Думаў, Поля жартавала... Аж... Адступаць не было куды і як.

Васіль распрануўся, лёг у нязвыкла мяккую, яшчэ цёплую Поліну пасцель.

— Што, хочаш, каб і я да цябе легла? — спытала, быццам са смяшком, Поля.

— Хачу,— адказаў Васіль.

— Тады хвіліну пачакай...

Поля выйшла ў сенцы. Чаго — Васіль здагадаўся потым, калі Поля легла да яго ў пасцель. Бо, як толькі Поля легла, Васіль палез яе абдымаць, лапаць рукамі. І здзівіўся — Поля была ў портках, мусіць, бацькавых, прычым надзетых задам наперад...

Амаль усю ноч правалтузіўся Васіль з Поляю ў ложку. Але таго, да чаго імкнуўся, так і не дамогся. Поля дазваляла і абдымаць, і цалаваць сябе, сама цалавала яго, Васіля, а калі Васіль, узбуджаны, хацеў большага, астуджала:

— Жаніся — і тады што хочаш рабі са мною.

Можа б, каб Васіль не выпіўшы быў у той вечар, усё інакш бы ў іх з Поляю было і працягу ніякага далейшага не мела б. А то ж...

Мусіў Васіль, каб неяк усю справу да канца давесці — а ён не любіў, штосьці пачаўшы, не даводзіць да канца,— жаніцца. Толькі ж... Поля новую ўмову паставіла. Жаніцца не паводле савецкіх законаў, а як бацькі жаніліся, па-старому звычаю, праз царкву.

Васіль, як пачуў гэта, і зусім быў апанураў. Ісці да папа ў царкву вянчацца... Не, не мог Васіль. І разам з тым... расставацца з Поляю... Прывык да Полі ўжо. Дый Поля таксама прывыкла да Васіля.

Не адзін вечар, не адну ноч спрачаўся Васіль з Поляю, пераконваў, даказваў, што папы — цемрашалы, што рэлігія — опіум для народа, што царкву і бога выдумалі багацеі, каб трымаць людзей у вечнай пакоры, зручней каб было абіраць і прыгнятаць. Але Поля не паддавалася на ўгаворы Васіля. Макам перад ёю рассыпся, яна — сваё:

— Без вянчання — то не жаніцьба!

Праўда, змаганне з тымі порткамі закончылася нарэшце перамогай, і Васіль падраў тыя порткі на дробныя шматкі і ўкінуў у печ. Поля зацяжарала, але афармляць шлюб паводле новых савецкіх законаў усё адно не хацела.

І Васіль, будучы ўжо сам сакратаром сельсавета, не гаворачы нічога жонцы, аформіў жаніцьбу...

«Можа, Поля думае, што і жыве яна з ім, Васілём, не распісаная? Дык калі што — скажа: з Васілём нічога агуль-

нага ў іх не было, ён толькі ў яе спаў? На гэта, мабыць, яна і спадзяецца?»

Вяртаўся дадому, клаўся ў пасцель. І зноў пачыналася размова з жонкаю. Але на ўсе просьбы і доказы ў Полі адказ быў адзін:

— Нікуды з дому я не паеду.

Аднойчы Васіль загаварыў пра тое, да чаго быў дадумаўся, пра што здагадваўся сам — ці не спадзяецца яна, Поля, што не зачэпяць яе акупанты, бо яна, маўляў, замуж быццам і не выходзіла — і ў царкве не вянчалася, і ў сельсавеце не распісвалася.

— Так, і на ета я спадзяюся,— прызналася шчыра Поля.

Хацеў Васіль сказаць, што ён сам, без яе, Полі, афарміў іхнюю жаніцьбу, даўно афарміў, калі яшчэ Поля хадзіла першым дзіцем, але, падумаўшы,— не сказаў. «Няхай хоць нейкая надзея ў яе будзе. А то... Дый не даруе яна, што я, не паведаміўшы, сам, на сваю волю афарміў жаніцьбу? Не хапала і гэтыя, можа быць, апошнія дні пражыць з сям'ёю ў сварцы, у мітрэнзе. Няхай думае, што ў нас усё так, як і было, нічога ані не змянілася».

А дні, тыя дні, калі можна было яшчэ ўратаваць сям'ю, нешта зрабіць — схавацца, адступіць ці з'ехаць куды-небудзь,— між тым беглі, імкліва, вельмі імкліва беглі, нават не беглі — ляцелі...

## X

Мінуў ужо цэлы тыдзень, як Апанас Харчэня быў не дома — у дарозе. За гэты час давялося яму спаць проста на зямлі пад адкрытым небам, мокнуць на дажджы, смягнуць пад спякотным паўдзённым сонцам, галадаць і есці тое, чаго б раней ніколі, нізашто не еў. Тры разы ён трапляў пад бамбёжку нямецкіх самалётаў, разоў пяць па ім і іншых такіх жа, як ён, выгнаных вайною з дамоўкі гаротніках,стралялі з кулямётаў і аўтаматаў з кустоў. Хто страляў,чаму — Апанас не ведаў. Ды ўсё б гэта было яшчэ нічога, калі б не разбурана была пераправа, калі б хоць нейкая іскра надзеі аставалася на тое, што ўсё ж удасца пераправіцца, будзеш на другім, украінскім, беразе Дняпра. Але надзеі такой... Не, яна яшчэ была, але з кожным новым днём адыходзіла, аддалялася, затухала... Паром немцы разбамбілі, цяпер абстрэльвалі, закідвалі бомбамі з самалётаў тыя месцы, дзе збіраліся каля ракі людзі. Нават не міналі,

ганяліся за плытамі і лодкамі, у якіх сёй-той спрабаваў паспытаць свайго шчасця. У тых, хто хацеў, каму абавязкова трэба было пераправіцца на другі бераг Дняпра, асталіся яшчэ ночы. Па начах немцы не лятапі над ракою, а хоць бы і лятапі — нічога не бачылі б. І людзі, пахаваўшыся на дзень у кусты і пад дрэвы, вязалі плыты, латалі, канапацілі старыя і прастрэленыя лодкі — рыхтаваліся да ночы. А ледзь толькі змяркалася, цемра ахінала зямлю, рушалі да ракі. Пераправіўшыся на другі, украінскі, бераг Дняпра, не ўсе думалі пра тых, хто таксама прагнуў уцячы ад фашысцкае навалы,— спяшаліся хутчэй быць далей ад ракі: лодку ж, плыт кідалі, забываючы, як трэба яны тым, хто яшчэ аставаўся там, не беларускім беразе шырокага і паўнаводнага Дняпра.

Раніцою, калі сплывала ноч, узыходзіла сонца і зноў прыляталі бамбіць і абстрэльваць пераправу нямецкія самалёты, Апанас Харчэня разам з іншымі, такімі ж, як сам, уцекачамі-няўдачнікамі з зайздрасцю і надзеяй глядзеў на той, украінскі, бераг ракі, які аж чарнеў ад плытоў і лодак. Потым, счакаўшы трохі, адыходзіўся ў лес. Думка, што ўцячы ад фашысцкае навалы наўрад ці ўдасца, усё часцей і часцей наведвала яго.

І разам з тым вяртацца дадому, у сваю вёску... Не, не тое што не хацелася. Проста было неяк быццам няёмка, сорамна — выправіўся ў дарогу і так, ні з чым вярнуўся.

Успаміналася балючае, крыўднае. Там, у вёсцы, ведаюць, усё-ўсё ведаюць пра яго, Апанаса, і, якая б ні была ўлада, савецкая ці нямецкая, яму ходу няма: Саветы не даруюць дзядзьку, немцы — што быў камсамольцам, працаваў у сельсавеце.

І таму, лежачы ў кустах, у лесе,— пакутаваў, мучыўся, не бачачы, не знаходзячы выйсця з той пасткі, з таго нерату, у які так неспадзявана трапіў.

«Усё было так добра... Я скончыў школу, мяне ўзялі на працу ў сельсавет... Марыў паступіць у інстытут, вывучаць гісторыю, пісаць вершы... І раптам... Гэты дзядзька... Вайна...»

Да Апанаса падыходзілі людзі, спрабавалі загаварыць. Але ён быў не ў тым стане, каб быць разам з людзьмі, размаўляць з імі, расказваць, што ў яго на сэрцы, на душы, чуць і ўспрымаць чужое гора, чужую бяду. Ён увесь быў засяроджаны ў сабе, перапоўнены сваімі думкамі-развагамі. І стараніўся людзей, імкнуўся быць не з імі, а далей ад іх.

Апанас думаў:

«Ну, пакінуў я Вялікі Лес, падаўся ў бежанцы. Але ж... Што, што чакае мяне наперадзе, там, куды я іду?.. Уцяку ад немцаў — то праца нейкая знойдзецца, з голаду не памру. Нават, можа, паступлю ў інстытут вучыцца. Ага. Але ж... Зноў рана ці позна ўсплыве дзядзька. І тады... Утаіў, не прызнаўся, пралез... Пераҗыць усё тое... Добра ж, як даруюць. А як не даруюць?.. Гэта як уцяку ад немцаў? А не ўцяку, тут, пад імі астануся?.. Што немцы зробяць са мною? Расстраляюць як камсамольца, сельсаветчыка? А можа... Мяне ж з сельсавета... Ды і не працаваў я надта доўга ў сельсавеце. Зла ніякага людзям, здаецца, не зрабіў... І ўсё ж... І ў камсамоле быў, і ў сельсавеце працаваў... Значыцца, адказваць давядзецца... І ніхто за мяне не заступіцца, кожны пра сябе будзе дбаць, сябе ратаваць. Як і тут, на пераправе...»

І выходзіла: куды ні кінь — усюды клін. Наперадзе, там, куды імкнуўся, куды ўцякаў Апанас,— не было ў яго нічога асабліва радаснага, светлага; і там, адкуль уцякаў,— таксама нічога светлага, радаснага не было і не магло быць.

«Там, куды я імкнуся, куды іду,— свае ходу не дадуць. Тут, дома, калі пад акупацыяй астануся,— немцы... Гэтыя не даруюць, не толькі ходу, але і жыць не дадуць».

Думаў, разважаў Апанас — і не бачыў, не ведаў, дзе яму лепей быць, а дзе — горш.

## XI

Чым далей адыходзіўся з чарадою кароў ад дому Хомка, тым большала ў яго клопатаў. І самі каровы пападбіваліся ў дарозе, кульгалі, каторая на пярэднюю, каторая на заднюю нагу, ды і паганятыя таксама пастамляліся. Дзіва што — увесь час, і ўдзень, і ўночы, пад адкрытым небам, у дарозе. Сонца свеціць, пячэ — ідзеш. Вецер, дождж сячэ — ідзеш. І каб жа хоць ведаў — куды, дзе канец дарогі той будзе? Дык жа не ведаеш. І ніхто не ведае, сказаць нічога пэўнага не можа.

«Не трэба было мне ўстраваць у етае дзела,— думаў Хомка.— Хай бы іншых пагоншчыкаў пашукалі».

«Іншых? Каго іншых?»

«Ну, каго-небудзь здаравейшага. А ў мяне нага...»

«Дык жа здаравейшыя на хронце, мабілізаваліся!»

«Але і мне... Не трэба было ў пагоншчыкі ісці. Дома,

у сваёй вёсцы, можа, я і пастух, можа, чаго і варты... А тут, у дарозе, ды яшчэ з етымі бабамі...»

Не было ў Хомкі ладу з «бабамі». Даіць кароў па тры разы на дзень не хацелі. Шукаць, дзе б можна было малако здаць,— не хацелі. З воза злезці, карову якую, што ад чарады адстала, заняць — і то не хацелі. Цэлымі днямі ляжалі на возе. То спалі, то песні нейкія надта ж нудныя самі сабе пад нос спявалі. На што ўжо — паесці чаго-небудзь зварыць ленаваліся.

— Яно калі вельмі не робіш, то і есці не цягне,— казалі яны Хомку, калі той спрабаваў сарамаціць, прасіў згатаваць што-небудзь на абед ці вячэру.

Хто не рабіў, а Хомку работы хапала. І не прысядаў цалюткі дзень — кульгікаў і кульгікаў за чарадою. Бо каровы неахвотна ішлі па пыльнай дарозе, кожная так і наравіла ў шкоду залезці. Асабліва як не напасвіш, вадою не напоіш. Рыкаюць тады каровы, быццам рэзаць іх хто збіраецца, не ідуць, нікуды не ідуць. І Хомка разматваў даўжэзную сваю пугу-смалянку, ляскаў, бы пярун, над галовамі беднай жывёлы, а то і апяразваў каторую, што аж пісяг на поўсці аставаўся. І гнаў, гнаў, сам не ведаючы куды і чаго.

На чацвёртыя суткі, недзе пад поўдзень, сяк-так і да Дняпра, на пераправу дабраліся. І тут Хомка зусім разгубіўся, не ведаў, што і прыдумаць. Бо кароў тут і коней было столькі, што каб і хацеў злічыць — не злічыш. І ніхто не збіраўся іх прымаць ад пагоншчыкаў ці перапраўляць на другі бераг. Самі людзі пераправіцца не маглі, па беразе, як непрытульныя, сноўдаліся. А нехта яшчэ пра кароў думаць будзе? Паразбрыдаліся яны, дзе толькі не было іх — і ў лесе, і ў кустах, і на полі ў бульбе, і каля ракі, на лузе. Рыкалі, быццам чалавечымі галасамі прасілі,каб ім хоць хто сказаў, чаго іх сюды прыгналі, чаму трымаюць, не дазваляюць назад, дадому, вяртацца, дзе іхнія хлявы, цяляты, пашы. Аж слёзы нагарнуліся на вачах у Хомкі, калі ўсё гэта ён убачыў і пачуў.

Кінуўся быў Хомка начальніка хоць якога шукаць на пераправе, каб не адказваць больш за кароў, даведку ўзяць, што, маўляў, прыгнаў ён іх на пераправу, здаў таму, каму і трэба было здаць. Але начальніка таго нідзе не было. Спрабаваў Хомка ў людзей пытацца, але людзі нічога не ведалі — пацiскалі плячыма, а то і смяяліся:

— Уцякай, пакуль не позна, дахаты... А то... Наляцяць вось самалёты, дык будзе табе начальнік...

Самалёты наляцелі. Колькі — Хомка і злічыць не паспеў. Бо раптам недзе, здалося, зусім блізка, здрыганулася зямля і так вухнула, што Хомка як бач паваліўся, упаў на зямлю. І каб зямля была не такая цвёрдая, утрамбаваная людскімі нагамі, то пашыўся б, палез бы ў яе, абы толькі не чуць, як гудуць, аж, здаецца, звіняць самалёты над вухам, абы не чуць выбухаў бомб, крыку, ляманту людзей.

Самалёты як нечакана наляцелі, так нечакана і схлынулі.

Падняўся Хомка з зямлі, шапку сваю пашукаў — дзе і калі згубіў яе — не заўважыў. І так, не знайшоўшы шапкі, пайшоў з пераправы, пайшоў туды, дзе непадалёку ў ляску пакінуў кароў, даручыўшы наглядаць за імі Клаўдзі і Надзі.

Але і адышоўшыся ад пераправы, радасці і спакою Хомка не займеў. Немцы, выявілася, бамбілі не толькі пераправу, а ўсё, што і перад пераправай было. І не глядзелі — а можа, з самалётаў і не відаць было,— куды бомбы сыплюць. Яміны ад бомбаў, забітыя і параненыя і людзі, і каровы былі ўсюды, куды ні патыкаўся, куды ні спрабаваў ісці Хомка.

«Собіла ж мне якраз у еты час начальніка таго шукаць. Ета ж і мяне маглі б забіць...» — аж уставалі дыбка валасы на галаве ў Хомкі, калі бачыў акрываўленых, бледных людзей, што курчыліся ад болю ці ціха, упруцянела ляжалі тут і там на траве, у пяску.

Яшчэ ў той дзень налятаді бамбіць пераправу нямецкія самалёты. І кожны раз знянацку, нечакана, як толькі зноў пачыналі варушыцца на пераправе людзі. І сыпалі, сыпалі, не шкадуючы, бомбы.

Ледзь цемры, ночы Хомка дачакаўся. Думаў — не дажыве. Калі не ад бомбы ці асколка загіне, дык ад страху. Бо самалёты нізка-нізка над полем і лесам лятаді, і не толькі бомбы кідалі, але і з кулямётаў страчылі. І на той лясок, дзе Хомка з сваімі каровамі быў атабарыўся, натрапілі. Сем кароў насмерць забілі і восем паранілі. Ды так, што рэзаць кароў трэба было — не выжывуць. А зарэзаўшы іх, дзе мяса дзяваць?

Пахадзіў Хомка па чарадзе ды так, не павячэраўшы нават, прысеў пад сасонкаю, каб падумаць, і з каровамі тымі паранёнымі што рабіць, і наогул куды яму кінуцца, куды падавацца далей. І не заўважыў, як вочы стуліў — задрамаў. Блюзніцца пачало нешта такое мілае і добрае, што на ўсё, на ўсё Хомка забыўся. Быццам за пастуха

наняўся ён. І прыйшоў у першую хату, каб накармілі яго — заўтра ж раненька кароў гнаць трэба. А ўмова такая была — па чарзе начаваць у кожнай хаце, чыю карову пасвіць будзе. І карміцца таксама па чарзе. Гаспадыня, маладая, вясёлая, наліла яму поўную міску капусты ўпрэлай, аж пар з яе валіць. Хлеба добры воберцень адкроіла і сама да стала прысела. Хомка хацеў нагнуцца над міскаю, каб есці... І дзіва, дый годзе — вачэй ад гаспадыні адарваць не можа. Надта ж яна ладная, вясёлая і ўсмешлівая. «Ну, еш, еш,— кажа гаспадыня ласкава.— А то капуста астыне, нясмачная будзе». А ён не можа есці. Рукой паварушыць не можа, каб лыжку нават узяць. Зусім зачаравала яго гаспадыня...

— Хомка, дзядзька Хомка,— кажа гаспадыня.

— Які я табе дзядзька,— смяецца Хомка.— Я ж... Ты што, забылася, хто я... Ах, Порка, Порка...

— Ды не Порка я. Я — Надзя.

— Хто-о?

І Хомка расплюшчвае вочы, ачынаецца ад сну.

Ля яго і сапраўды — Надзя. Тхорыкава Надзя.

— А-а,— палохаецца Хомка і ўскоквае на ногі, становіцца поруч з Надзяю.

— Клаўдзя... Нейкага рыжага прывяла,— як не плача Надзя.

— Куды прывяла, якога рыжага? — пытаецца Хомка.

— Ды... На воз...

— На воз? Што яна, здурнела хіба?

У лесе ўжо цёмна. Але ён, Хомка, хутка асвойтваецца. Кульгаючы, мінае кусты, дрэвы, ідзе туды, дзе, ведае, стаіць іхняя падвода, пасвяцца, прывязаныя за аглоблю, коні. Услед за ім ідзе, крадзецца мышкаю і Надзя.

— Дзядзька... Дзядзька Хомка? — шэпча наўздагон Надзя.

— Што табе? — адгукаецца Хомка.

— А можа... Не трэба ісці цяпер туды?

— Чаму ета не трэба? — не разумее, злуецца Хомка.

— Ды яны... там яны...— не рашаецца, не асмельваецца, а можа, не ведае, як і сказаць, Надзя.

І ў гэты час і Хомка, і Надзя — ды, мабыць, і не толькі яны — чуюць як бы ўздых, глыбокі, адчайны ўздых. І голас:

— О-о! Так! Так! Яшчэ-э!

Хомка пазнае голас. І спыняецца ў нерашучасці, здагадваецца пра ўсё.

— На-зад! — як не раве, крычыць Хомка на Надзю.— Заўтра, заўтра я з ёю пагавару...

І першы паварочваецца, ідзе ў той бок, дзе толькі што сядзеў пад сасонкаю, бачыў такі неспадзяваны, малады і смачны сон.

## XII

Здаецца ж, і быў Іван Дарошка падрыхтаваны да гэтага расстання, даўно, даўно падрыхтаваны, а ўсё адно млела, сціскалася сэрца, калі думаў, уяўляў, як абдыме, апошні раз абдыме жонку, пацалуе дзяцей і пойдзе назад, у Вялікі Лес, а яны... Яны астануцца без яго, адны. І чым далей ехалі, чым бліжэй пад'язджалі да Будзілавіч, тым часцей млела, аж халанула сэрца. Трэба было прывыкаць не бачыць штодня мілых дзіцячых тварыкаў, не чуць любых галаскоў, не ведаць, што каго сёння турбавала, чаго хацелася і што замінала быць радаснымі, шчаслівымі. Дый... Пра яду, самую звычайную яду, самому ж давядзецца дбаць, думаць пра чыстую кашулю, начлег. Раней, дзе б ні быў, што б ні рабіў,— вяртаўся дадому, у сваю хату. Яда была зварана, кашуля памыта, пасцель паслана. А цяпер пра ўсё, усё давядзецца дбаць самому.

— Ты хоць не забывай, хоць зрэдку наведвайся да нас,— шаптала, мусіць, думаючы пра тое самае, што і ён, Іван, жонка Каця.

— Буду старацца. Але ж... Не заўсёды, мусіць, і можна будзе...

— Я ведаю. І ўсё ж... Не адрывайся ад сям'і, прыходзь.

І жонка прыціскалася бліжэй да Івана, лажыла сваю галаву яму на плячо. І глядзела, глядзела, не зводзіла вачэй з Івана.

— Запомніць... Кожную рыску на твары тваім хачу запомніць,— шаптала яна.— Бо калі... Калі мы зноў убачымся?..

І з вачэй у яе здрадліва паказваліся, беглі, каціліся на шчокі слёзы.

Іван, гледзячы на жонку, думаў:

«Дзіўная істота — чалавек! Вось жылі-жылі, адно аднаго не ведалі — і абаім добра было. І раптам сустрэліся, пазнаёміліся, пажаніліся. І сталі радней роднага. Што прычынай таму? Супадзенне поглядаў, душэўная блізкасць ці, можа... Проста добра быць абаім разам. Але ж... Маглі і не сустрэцца, маглі не пазнаёміцца і не пажаніц-

ца. Вельмі звычайна нават — Каця паехала б працаваць у іншую вёску і там выйшла б замуж за іншага. Няўжо і з тым, іншым, яна была б такая шчаслівая? І ён, Іван, быў бы шчаслівы таксама, жаніўшыся з іншай? І што гэта — заканамернасць ці выпадковасць, што яны ўсё ж сустрэліся з Каццяй, пазнаёміліся і пажаніліся?»

— Ведаеш, Каця, а мы ж маглі і не сустрэцца, не пазнаёміцца, не пажаніцца,— сказаў Іван тое, пра што думаў.

— Маглі,— згадзілася з ім адразу ж Каця.— А можа, і не маглі,— папраўілася праз хвіліну яна, дапоўніла сябе.— Можа, тое, што мы разам, усё ж не выпадковасць, а заканамернасць?

— Я вось думаю над гэтым,— прызнаўся Іван.

— І я пра гэта неаднойчы думала.

— І да якога вываду прыйшла?

Каця адказала не адразу — некаторы час маўчала, глядзела не на Івана, а кудысьці ўбок, на той лес, тыя дрэвы, міма якіх ехалі. Потым падняла галаву з плячэй Івана, прамовіла з роздумам:

— Вывад у мяне адзін, хоць, можа, і няправільны. Там, дзе ў сям'і лад і парадак,— людзі знайшлі адзін аднаго, ім добра. Там жа, дзе няма ні ладу, ні парадку,— выпадкова сышліся. І ён мучыцца, і яна, бо паспяшаліся, выпадковае прынялі за сапраўднае. Не пашанцавала, можна сказаць, людзям, шчасця і радасці мець яны не будуць. Што, ты хіба не згодзен са мною? — убачыўшы, мабыць, што Іван сціскае губы, быццам запярэчыць хоча, насцярожылася Каця.

— Не, не тое што не згодзен, а проста дзіўна ўсё гэта. Зусім чужыя людзі — і раптам... Сустрэліся, пазнаёміліся... І радней роднага...

— У прыродзе сапраўды шмат чаго загадкавага. Правільней, неспазнанага, таму і загадкавага,— уздыхнула Каця.— Але ў чалавечых адносінах... Тут нічога нібыта загадкавага няма. Сыходзяцца ж людзі не на дзень-два, а на ўвесь век свой. І перш чым сысціся, доўга прыглядаюцца адно да аднаго, прывыкаюць. І то, бывае, памыляюцца.

— А ты лічыш, што мы з табою, пажаніўшыся, не памыліліся?

— Не, не памыліліся...

І Каця зноў падсунулася бліжэй да Івана, палажыла сваю галаву яму на плячо.

— А ты, ты хіба так не лічыш? — глядзела і глядзела Івану ў вочы Каця.

— Я?.. Я таксама так лічу... Прынамсі, да сённяга лічыў,— неяк паспешна, хутка адказаў Іван.

— Чаму лічыў? Чаму да сённяга? — устрывожылася Каця.

Іван не адказваў, маўчаў.

Каця паўтарыла сваё пытанне:

— Чаму ты маўчыш, чаму не адказваеш?

— Бо падумаў быў — добра нам так разважаць, калі мы ўвесь час разам. Як пажаніліся, дык і разам. Адно без аднаго і тыдня не жылі. А вось расстанемся...

— Сціхні,— аж пакрыўдзілася Каця.— Хіба расстанне аддаліць нас, хіба мы перастанем кахаць? Наадварот, расстанне ўзмацніць нашу блізкасць, цягу адно да аднаго, наша каханне.

— Можа, і так. Правільней — я хацеў бы, каб было так, а не інакш.

— Так і будзе!

— Добра б, каб так было.

— Ты сабе не верыш?

— Сабе-то я веру.

— Што, ва мне сумняваешся?

— І ў табе не сумняваюся.

— Тады... Я цябе не разумею.

— Зразумееш... Потым зразумееш.

— ?!.

— Лепш не гаварыць, не думаць пра тое, што можа быць...

І зноў змоўк, задумаўся. Задумалася пра нешта сваё, таемнае, і Каця. Так, моўчкі, не кажучы адно аднаму ні слова, ехалі доўга, вельмі доўга. Першая маўчанне парушыла Каця.

— Вядома, яно сама лепш было б, каб мы не расставаліся, каб усё жыццё, увесь век былі разам,— сказала яна нібыта сама сабе.

— І я таксама гэтак жа думаю. Але нічога не зробіш — расставацца давядзецца. Як бы таго мы не хацелі,— дадаў праз хвіліну Іван і абняў жонку, прыхінуў мацней да сябе, пачаў сваімі вуснамі шукаць яе вуснаў...

На выездзе з лесу, дзе за невялікім абсягам засаджанага бульбай поля відаць былі ў лагчыне стрэхі і каміны

хат родных Каціных Будзілавіч, Іван звярнуў з дарогі, спыніўся пад высозным старым клёнам.

— Ну вось, здаецца, мы і прыехалі,— сказаў нібыта сабе, нібыта жонцы.

— Дык што, далей ты не паедзеш? — спытала са страхам Каця.

— Не паеду.

— А можа, усё ж паехалі б? Пабылі б яшчэ разам, пераначавалі б,— як не папрасіла Каця.

— Не, Каця. Хай ніхто не ведае ў тваёй вёсцы, што я астаюся тут, у лесе. Хай думаюць, што я на фронце. Дзе і ўсе мужчыны. Так і бацькам тваім, і табе будзе лепей.

Відаць было: у думках Каця згаджалася з мужам. Сапраўды, так будзе лепей. А ў душы... Не згаджалася. Не магла, не магла пагадзіцца. Не хацелася, ой як не хацелася ёй расставацца з Іванам!

— Давай ночы пачакаем. Як змеркнецца, тады ў вёску ўедзем? — са слабай надзеяй прапанавала яна.

— І ўночы не ўсе спяць. Навошта рызыкаваць? Кажуць, не наеўся, дык і не наліжашся.

— Яно-то так. І ўсё ж...

Іван саскочыў з падводы, падышоў да каня. І Каця не адставала, ні на крок не адставала ад Івана — таксама саскочыла з падводы, пайшла разам з Іванам да каня.

— Змарыўся за дарогу,— сказаў Іван, паглядаючы на ўпалыя бакі каня.— І прагаладаўся.

— Во, і конь за ноч адпачне,— як за саломінку, ухапілася Каця.— А развідняць пачне— і паедзеш.

— Не, не, Каця, не ўгаворвай. І так вунь колькі мы яшчэ разам з табою пабылі. Іншыя даўно ўжо на фронце. І я мог бы з імі быць, ты ж гэта ведаеш... А конь? Не трэба ён мне. Няхай у вас дома будзе. Бацьку скажаш, каб даглядаў. Спатрэбіцца, прыйду, забяру.

— А як жа ты?

— Я? Прывыкаць хадзіць пешкі буду.

— На кані хутчэй бы да Вялікага Лесу дабраўся.

— Ведаю. Але далей што мне з ім рабіць? Я ж нават начаваць не ведаю, дзе буду. Можа, у стагах...

— Чаму ў стагах? Хіба хат мала?

— Хат хапае. Толькі месца не ў кожнай хаце цяпер такім, як я, будзе.

— Гаворыш ты неяк...

— Рад бы весялейшае гаварыць, але яго пакуль няма. Хоць веру — будзе! Вось толькі калі — сказаць не магу...

Вярнуўся да падводы, спыніўся, доўга-доўга, не зводзячы вачэй, глядзеў на дзяцей — яны моўчкі сядзелі на вузлах, ціха, насцярожана зіркалі то на бацьку, то на маці, не разумеючы нічога, але, мусіць, здагадваючыся, што адбываецца зараз нешта надзвычай важнае ў іхнім дасюль такім спакойным, бесклапотным жыцці.

— Ну што ж, будзем хіба развітвацца,— сказаў Іван і, адчуваючы, як набрынялі слязамі вочы, сціснулася, аж захаланула, сэрца, пайшоў, не бачачы перад сабою нічога ад слёз, да воза, да дзяцей...

## XIII

Да самай раніцы, не кладучыся ў пасцель, прачакаў Мікалай Касціка. Чаго толькі не перадумаў, чаго не ўявіў, тупаючы, снуючы сюд-туд па хаце.

«Можа, дзе пад бонбу якую трапіў? Ці на немцаў напароўся — кажуць жа, дэсантаў паскідвалі ўсюды? А то... Мо нож хто ў спіну ўсадзіў? Цяперашнім светам...»

Трывога мянялася злосцю на сына. «Разбайбусаваўся, разбалаваўся. Трэба будзе дзягай па спіне пахадзіць, як вернецца. Ыч ты яго, смаркач! Ні перад кім адказу не мае, куды хоча, туды і ідзе. Думай цяпер пра яго, шукай, дзе хочаш. Няма таго, кеб сказаць, спытаць у бацькі, можна туды ісці, куды сабраўся, ці не можна. Не, з распустай трэба канчаць. Інакш... Да дабра яна не давядзе!»

І зноў злосць пераходзіла ў трывогу.

«Дзе Косцік? Мусіць жа, нешта здарылася, калі дадому начаваць не прыйшоў? Раней дзе б ні быў, а начаваць усё адно дадому, у бацькаву хату, вяртаўся. А ета не вярнуўся. Няйнакш, не пусціла яго нешта. А што? Што магло не пусціць?»

Усё-ўсё перабраў у галаве Мікалай, што Касціка магло затрымаць, не пусціць дадому, у бацькаву хату, начаваць, а каб сказаць пэўна што — не мог, не здагадваўся, не ўяўляў. І прыходзіў Мікалай да аднаго вываду, сумнага, але пэўнага, чым толькі мог растлумачыць, што няма дома сына — нечаканая хвароба альбо смерць.

«Аге. Бо інакш... Дома быў бы Косцік. Не асмеліўся б дзесьці ў чужых заначаваць. Аге, не асмеліўся б...»

Касціка Мікалай любіў. Мо з усіх сыноў найбольш любіў менавіта меншага. На яго ўскладаў свае надзеі. Мусіць, таму, што два старэйшыя сыны аддаліліся ад бацькі, не слухаліся, сталі ледзь не чужыя. А гэты, меншы,

быў увесь час навідавоку, каму ж, як не яму, Косціку, выказваў ён свае бацькоўскія крыўды на старэйшых, непаслухмяных сыноў. Ды і рос Косцік без маці, без належнага догляду і ласкі. Рос не так, як тыя, большыя... І яго, Косціка, было шкада цяпер больш за ўсіх, да слёз шкада.

«Вярніся, толькі дадому вярніся! — шаптаў у адчаі Мікалай.— І я... Усё, усё дарую, дзе б ты ні быў, што б ні рабіў... Пальцам не крану. Толькі вярніся. Вярніся жывы і здаровы».

Упаў перад абразамі на калені, пачаў маліцца.

«Божа, аддай, аддай мне сына! Аддай маю ўцеху і радасць. Бачыш жа сам, як пакутую я, як мучаюся, што яго дома няма. Малы ён яшчэ і неразумны. Ветрагон, можна сказаць. І калі ён напаскудзіў дзе табе, нарабіў таго, што нельга было рабіць, даруй, даруй яму, неразумнай галаве яго. Выправіцца ён яшчэ, налюдняе. Бо без яго... Горка, цяжка мне будзе без Косціка. І без Піліпа вунь як цяжка, не ведаючы, што з ім. А без Косціка...»

Прачнулася, спаўзла з палка Хора. Дзікавата павяла вачыма па хаце, не ўбачыла на пасцелі Косціка.

— А Косцік дзе? — са страхам спытала яна ў Мікалая.

Мікалай падняўся з падлогі, сказаў апанурана:

— Я ў цябе хацеў спытаць. Ён што, не казаў, куды ісці збіраўся?

— Не, не казаў,— пахітала галавою Хора.

— Га-а,— ледзь не зароў Мікалай.

Хора заслала пасцель, спярша сваю, на палку, потым яго, Мікалаеву. Выйшла на падворак, прынесла бярэма дроў. Гупнула іх ля печы, адчыніла засланку. Улажыла ўсе, па рубанцу, у печ, дастала з шыйкі лучыну-падпалу, пашукала ў загнетцы чырвонага вугалю, доўга дзьмула на яго, пакуль не загарэлася лучына. Падпаленую лучыну асцярожна панесла ў печ, пад дровы.

— Ты б кароў ішла даіць,— прыкрыкнуў на Хору Мікалай.— А з печчу... Управілася б.

— І з каровамі ўпраўлюся, не падганяй...

Хора адышлася ад печы, пачала наліваць вадою чыгуны, мыць бульбу — спяшалася, пакуль не разгарэліся дровы, паставіць у печ варыцца свінням.

Выйшаў — не мог больш трываць у хаце — на падворак Мікалай. Прыпаў да шыбы акна Піліпавай палавіны хаты, паглядзеў — ці не вярнулася Клаўдзя? Клаўдзі дома яшчэ не было, і Мікалай, акінуўшы вачыма падворак — усё на

месцы, ніхто нічога не пачапаў,— пайшоў, пакіраваўся да хлява.

Вароты ў хляве былі не на зашчапцы, хоць шчыльна і прычыненыя.

«Няўжо я ўчора не зашчапіў? — падумаў Мікалай.— А мо Хора? Не, здаецца ж, не маленькая, ведае».

Прыпадняў вароты — нешта апаў бягун, трэба, мусіць, паладзіць,— адчыніў. Каровы — і іхняя, рыжая Манька, і Піліпава, чорна-белая, плямістая Дунька,— былі на месцы. Нават паўставалі ўжо, чакалі, калі Хора прыйдзе даіць іх.

«Аге, хто ж вароты не зачыніў?»

Зайшоў у хлеў, зазірнуў у сяннік — там ляжала вазы два сена, якое нанасіў Мікалай з поплава вязкаю. «На восень, пакуль падмёрзне і можна будзе ў балота ўлезці, на санях прывезці сена». І... у першую хвіліну аж вачам сваім не паверыў: на сене ў сянніку сядзеў Косцік.

— Ты што ета тут? — спытаў не то са страхам, не то з радасцю Мікалай.

Косцік нічога не адказаў, толькі неяк палахліва зіркнуў на бацьку і схаваў, патупіў у сена вочы.

— Ану злазь, моду дзіўную ўзяў, нікому нічога не гаварыць. Дзе ты ноч быў, што рабіў?

Мікалай наступаў на сына, напускаў і выгляду, і голасу строгасці, хоць у душы радаваўся — хвала богу, сын жывы і здаровы. І дома, вярнуўся.

— Каму я кажу!

Косцік ссунуўся з сена, стаў, хаваючы за спіну рукі, ля загародкі.

— Дзе ты ноч усю быў?

— У Гудове.

Сказаў Косцік — і зноў ніякавата патупіў долу вочы, не глядзеў на бацьку — няйнакш, баяўся.

— І што ты там рабіў? — наступаў і наступаў бацька.

— Я... Я...

І толькі цяпер Мікалай згледзеў: кашуля на Косціку тапырыцца, нешта напхана за пазуху. І кішэні штаноў таксама адтапыраны, поўныя.

— Што ета ў цябе там? — паказаў вачыма на пазуху і кішэні.

— Грошы.

— Што-о?

— Грошы.

— Грошы? Якія грошы? Дзе ты іх набраў? Абрабаваў каго, украў? — не даваў Косціку апамятацца, засыпаў пытаннямі Мікалай.

— Не, я выйграў.

— Выйграў? Як выйграў?

— У карты, у ачко...

Зноў Мікалай не паверыў таму, што чуў. Сын, яго сын Косцік, аказваецца, карцёжнік, гуляе ў ачко... Божа, што ж ета робіцца!.. І дзе, у каго ён мог выйграць столькі грошай?

— З кім ета ты гуляў у ачко?

— Не ведаю,— не падымаў вачэй, не глядзеў на бацьку Косцік.

— Як ета — не ведаючы з кім, садзішся ў карты гуляць?

— Мяне... Ігар завёў.

— Які Ігар?

— Мы з ім тырсу на заводзе ў Гудове вазілі.

— Куды, да каго той Ігар цябе завёў?

— У хату, ля станцыі, што за штабелямі дроў...

— І хто ў хаце быў?

— Багата людзей. Незнаёмыя. І аднавокі нейкі. Ён усіх абгуляў. А я... Яго. Тысяч, мусіць, з восем выйграў.

— Восем тысяч!

— Ета не ўсе. Тысячы тры я на стале пакінуў.

— Як ета — пакінуў? — хацеў ведаць, нічога не прапусціць міма вушэй Мікалай.

— Аднавокі той... Баяўся, каб я не ўцёк.

— Чаму ета ён баяўся?

— Ну, як выйграў я багата, то гуляць хацеў кінуць. А мне аднавокі і сказаў: «Пакуль е грошы, датуль і гуляем...» І я... спалохаўся, каб мяне з-за етых грошай не забілі. І на двор, за хлеў, папрасіўся. А каб не падумалі, што я ўцячы магу, грошай на стале трохі пакінуў. Чорт з імі, тымі грашыма. Добра, што ўцёк. За хлеў выйшаў — і драла, лататы...

— І за табою гналіся?

— Не ведаю. Я не азіраўся...

— Ай-я-я-яй! — круціў галавою, не мог прыйсці ў сябе ад таго, што пачуў, Мікалай.— А я думаю, чаму мне сон такі сасніўся?.. Аж яно вунь што!

Рыпнулі вароты — у хлеў з даёнкаю ў руцэ зайшла

даіць кароў Хора. Убачыўшы ў хляве Мікалая і Косціка, усміхнулася.

— Ой, а я ўжо бог ведае што падумала,— выказала ўголас яна сваю радасць.

— Пайшлі адсюль,— загадаў Косціку Мікалай і сам першы рушыў з хлява.

Косцік, не падымаючы вачэй, вінавата падаўся ўслед за бацькам.

На падворку спыніліся.

— Кеб нікому нідзе ні слова. Ні шэп! — змераў з ног да галавы бацька сына.— Бо грошы тыя могуць быць крадзеныя. Зразумеў?

Косцік нічога не адказаў, толькі моўчкі кіўнуў галавою.

## XIV

Не так і далёка ад Вялікага Лесу Ельнікі, усяго якіх васемнаццаць кіламетраў, а з непрывычкі хадзіць на вялікія адлегласці, ды яшчэ з цяжарам, з клункамі на сабе, пастамляліся і Андрэй Макаравіч, і Аліна Сяргееўна, ледзь ногі перастаўлялі. А не прайшлі ж яшчэ і паловы дарогі.

— Можа, прысядзем, адпачнём,— прапанавала Аліна Сяргееўна, калі мінулі Рудню, увайшлі ў чысты, парослы невысокаю сакаўною травою дубняк.

— Умгы, прысядзем,— згадзіўся з Алінаю Сяргееўнай Андрэй Макаравіч і першы збочыў з дарогі, пакіраваўся да тоўстага пня, што чарнеў, узвышаўся над травою.

Скінулі з сябе клункі, прыселі на пень. Кожны з краю, спінамі адно да аднаго.

Якраз развідняла — бледнае, не зусім яшчэ пэўнае святло цадзілася аднекуль зверху, разганяючы суцінкі, агаляючы дрэвы, кусты. Заценькала сініца, ёй адгукнуўся — зарагатаў — удод. Затрашчала дзесьці ў кустах сарока. Падзьмуў ветрык, і з лісця дрэў, нібыта са жмені, сыпанула, рассеялася раса. І было навокал ціха-ціха, нават чуваць было, як выпроствалася, цягнулася ўгору прымятая іхнімі нагамі трава.

Не гаворачы адно аднаму ні слова, доўга моўчкі сядзелі на пні, думаючы кожны сваё.

Андрэй Макаравіч успамінаў, як такімі досвіткамі, калі быў яшчэ маладзейшы, хадзіў па грыбы. У лес прыбягаў іншы раз так рана, што цёмна было, і сядзеў вось

так, як і цяпер, на пяньку, чакаў, калі развіднее і можна будзе, не баючыся патаптаць, шукаць грыбоў. Уявілася — ён, Андрэй Макаравіч, рухавы і дужы, зноў, як тады ў лесе, зноў чакае світання. Хвіліна, яшчэ хвіліна — і ён сарвецца з пня, пабяжыць, запятляе між камлёў дрэў і кустоў, выглядаючы кожны натапыраны лісцік, кожны бугарок — ці не баравік гэта там галаву падняў?..

Аліна ж Сяргееўна думала:

«Пастарэла я... Колькі прайшла — і стамілася ўжо, прыстала. Ледзь ногі валаку. А гэта ж трэба ісці ды ісці. Можа, некалькі сутак, а можа, і некалькі тыдняў, месяцаў. Дый... Куды ісці? Лёгка сказаць — ісці туды, дзе немцаў няма, куды тыя не дойдуць. А дзе немцаў няма, куды яны не дойдуць? Калі сюды дабраліся, дык хіба не дабяруцца і туды, куды мы з Андрэем Макаравічам выправіліся?..»

І яшчэ:

«Чаму жыццё такое? Ледзь абжывешся, абсталюешся, пазнаёмішся з усімі, да цябе прывыкнуць людзі — трэба кідаць абжытае, некуды перабірацца, ісці. Ох, як абрыдла, як надакучыла гэта! Не адно, дык другое, а гоніць і гоніць з дому... Думалі ўжо — хоць тут, у глушэчы, у Вялікім Лесе, да старасці дажывуць. Аж не!.. Вайна гэтая, немцы... Зноў з дому выбірайся, зноў ідзі. Куды? Чаго? Няўжо да самай смерці давядзецца вось так з месца на месца з клункамі валачыцца, прыстанішча сабе шукаць?..»

Узышло, паказалася над лесам сонца — яркія промні прабіліся праз густыя шаты дрэў, заблішчалі тысячамі агнёў у расе. З зямлі дыхнула парнасцю, запахла прэллю, гнілым, зляжалым лісцем. Заспявала, заіграла, абуджаючы наваколле — мусіць, у Рудні,— берасцяная пастухова труба.

— Можа, пойдзем? — прапанаваў, ачуўшыся ад сваіх успамінаў-уяў, Андрэй Макаравіч.

— Ды ўжо ж...

Паўставалі з пня, узвалілі на сябе клункі, узялі ў рукі торбы, торбачкі.

Моўчкі, не кажучы адно аднаму ні слова, выкіраваліся зноў на дарогу, пайшлі далей.

У поўдзень, калі дабраліся да поля, за якім відаць былі Ельнікі — бязладна чарнелі, чырванелі ўдалечы стрэхамі і камінамі хат,— і спыніліся на ўзлеску, каб адпачыць, уба-

чылі: па дарозе з мястэчка нехта імкліва набліжаецца да іх — не то бяжыць, не то едзе на веласіпедзе.

Хвілін колькі і Андрэй Макаравіч, і Аліна Сяргееўна не зводзілі вачэй з дарогі.

— Ага, на веласіпедзе едзе,— парушыў насцярожанасць і маўчанне Андрэй Макаравіч.— І ведаеш хто? Кухта Сцяпан Радзівонавіч...

— Кухта? — здзівілася Аліна Сяргееўна.— А хіба ён не ў войску?

— Бачыў яго, як у Ельнікі хадзіў. Кажа, белабілетнік...

Сапраўды, яздок на веласіпедзе быў Сцяпан Радзівонавіч Кухта, настаўнік з Паташні. І Андрэй Макаравіч, і Аліна Сяргееўна яго ведалі, сустракаліся неаднойчы на раённых канферэнцыях ды і дадому разам з Ельнікаў разоў колькі хадзілі — балазе, акурат па дарозе было. Сам Кухта асаблівым аўтарытэтам сярод мясцовых ушынскіх не карыстаўся, хоць, казалі, і пісаў вершы, апавяданні, п'есы і нават раман. Вершаў і апавяданняў тых нідзе не друкавалі, п'ес не ставілі, тым не менш Кухта лічыў сябе пісьменнікам і часта скардзіўся на сваіх мінскіх сяброў, якія самі павыбіваліся ў людзі, а яго, раённіка, не пускаюць на старонкі газет і часопісаў. І скаргі свае заўсёды канчаў словамі: «Нічога, мы ім усім нос яшчэ ўтром!»

Кухта, наблізіўшыся і згледзеўшы знаёмых людзей, ды яшчэ тут, ля Ельнікаў, спыніўся, злез з веласіпеда. Перацягнуў, перанёс амаль на руках веласіпед праз раўчук, які аддзяляў лес ад дарогі, падышоў да Андрэя Макаравіча і Аліны Сяргееўны. Убачыўшы ля іх ног клункі, торбы і торбачкі, здзівіўся:

— Куды гэтта вы сабраліся? — сказаў ён, як і заўсёды, знарок падкрэслена вымаўляючы «гэтта», якое ў тутэйшай мясцовасці людзі вымаўлялі па-свойму: «ета».

— Ды... У бежанцы надумалі ісці,— прызнаўся Андрэй Макаравіч.

— У бежанцы? — яшчэ больш здзівіўся іхні калега, аж вочы, вялікія, навыкаце, як у рыбіны, вырачыў.— Чаго гэтта раптам?

— Ды не раптам. Даўно збіраліся, але ўсё неяк... Словам, не рашаліся,— з роздумам выдавіў з сябе Андрэй Макаравіч.

— І куды ж вы, калі не сакрэт? — дапытваўся Кухта.

— Куды людзі, туды і мы.

— Дык людзям, можа, трэба. А вам?

Андрэй Макаравіч пацiснуў плячыма.

— Разбярыся, каму трэба, каму не,— сказаў няпэўна.

— А што тут разбірацца? — не выпускаючы з рук руль веласіпеда, гаварыў Сцяпан Радзівонавіч.— Быў у начальстве пры бальшавіках, камуніст ці сельсаветчык — уцякай. А калі не быў... То чаго ж баяцца? Немцы не дурні, ім таксама працаўнікі трэба...

— Дык ён жа,— павярнула галаву ў бок мужа Аліна Сяргееўна,— таксама быццам у начальстве быў.

— У якім начальстве? — вырачыў зноў вялікія, навыкаце, вочы Сцяпан Радзівонавіч.

— Ну-у, дырэктарам школы быў...

— Якое гэтта начальства — дырэктар школы... І я настаўнікам быў. Дык і што? Дзяцей заўсёды вучыць трэба было і трэба будзе. Усё залежыць ад таго, як далей сябе чалавек паводзіць будзе. Бо што хлеб зарабляў... А душа, душа да чаго ў чалавека ляжала? Во, во што галоўнае! Ды і калі шчыра гаварыць... Я ж пра вас усё ведаю. Вы,— глядзеў проста ў вочы Аліне Сяргееўне Сцяпан Радзівонавіч, аж непрыемна было,— папоўскага роду, наколькі я асвядомлены. Ды і Андрэй Макаравіч усё жыццё з месца на месца пераязджаў... Гэтта нядаўна да яго такая міласць, дырэктарам паставілі... А раней...

Сцяпан Радзівонавіч быццам нешта яшчэ ведаў, але не казаў.

— Так што... Як хочаце, так і рабіце... Але я... Не, не раіў бы вам нікуды з Вялікага Лесу ісці. Ды, калі шчыра прызнацца, і няма ўжо вельмі куды ісці. Немцы ўсюды.

— Як — усюды?

— Так, усюды. Куды ні паткніся — там і немцы.

— І ў Ельніках? — насцярожана дапытваўся Андрэй Макаравіч.

— Цю-ю, і не ведалі? — зрабіў выгляд, што не верыць, Сцяпан Радзівонавіч.— Два дні ўжо...

— Два дні? — аж жахнулася Аліна Сяргееўна.

— Ну, але, два дні,— гаварыў, як пра самае звычайнае, усім вядомае, Сцяпан Радзівонавіч.— Так што... Куды вы пойдзеце? На пераправу, у Лоеў? Але ж і там таксама ўжо, мусіць, немцы... Кіеў у іх руках, Мінск і Смаленск даўно... Словам, самі рашайце... Не мне вас угавор-

ваць, што вам рабіць, а што не... Людзі вы вопытныя, пры розных уладах пажылі...

І Сцяпан Радзівонавіч, не развітваючыся, пакаціў веласіпед зноў на дарогу. Як толькі мінуў канаву, стаў адной нагою на педаль, другую борзда перакінуў праз раму, сеў, умасціўся сваім тоўстым азадкам на сядло і пачаў круціць педалі, аддаляючыся.

Андрэй жа Макаравіч і Аліна Сяргееўна, збітыя з панталыку разважаннямі і паведамленнямі іхняга былога калегі Кухты, асталіся сядзець на ўзлеску, не ведаючы, што ім далей рабіць, куды падавацца — ісці ў Ельнікі, дзе ўжо два дні гаспадараць немцы, а мо... Пакуль не позна, вярнуцца назад, у Вялікі Лес?

## XV

*З дзённіка Тасі Несцяровіч*

Татачка!

Думала, не пісаць больш. І не ўтрымалася, бачыш, зноў пішу. Ведаеш, радасць вялікая ў нас з мамаю — мы ўжо ля самай дамоўкі, нават бачым горад наш. Уяўляеш? Праўда, мама не падзяляе маёй радасці, паказвае на дым, што стаіць над Мінскам,— нешта, мабыць, гарыць. «Можа, і дом наш?» — кажа маці. Можа, татка, і дом наш, я не ведаю, а ўсё адно... радасна. Усё ж прайшлі мы сотні кіламетраў, усё ж дабраліся да дамоўкі. Хоць і перажылі — не раскажаш.

Змардаваліся — не пазнаеш ты нас, татка. Маці схуднела, толькі вочы блішчаць... Самая звычайная вясковая кабета. І адзенне на ёй... Таксама вясковае. І я павясковаму апранутая. Наша, гарадское, што былі захапілі з сабою, даўно падралася. І чаравікі падраліся. Так што пляцемся, ідзём босыя. Ногі крывавяць — пазбівалі аб каменне, аб карані дрэў. І брудныя-брудныя мы. Цела — аж брыдзіць, ірваць яго проста пазногцямі хочацца. Не мы вінаватыя, вінавата вайна, немцы. Дзе толькі мы не хаваліся ад бомбаў і куль, дзе толькі нас не было! А некалькі сутак вось ужо ідзём паўз дарогу, па абочыне, і міма нас едуць, спяшаюцца кудысьці на ўсход немцы. На машынах, матацыклах. Вязуць гарматы, сваім ходам ідуць танкі, танкеткі. І немцы ўсе чысценькія, вясёлыя. Не тое, што нашы людзі, мы з мамаю...

На нас, правільней, такіх, як мы з мамаю, немцы нават не глядзяць. Нагледзеліся, мусіць, за гэтыя некалькі

месяцаў вайны. Бо такіх, як мы... Сотні, тысячы. І ўсе некуды ідуць, паўзуць і паўзуць. Скранула людзей з абжытага месца вайна, і кожны некуды імкне, некуды спяшаецца. Мы дадому, у горад, іншыя — з горада, у вёску. У кожнага свой клопат, свае турботы. Каго ні спыніш, у каго ні спытаеш, ёсць чалавеку куды ісці, куды спяшацца. Мы прывыклі за дарогу бачыць розных людзей. Да аднаго прывыкнуць не можам — гэта калі дзеці адны без дарослых некуды ідуць. Раней маці іх спыняла, пытала, чаму дзеці адны. А цяпер і пытаць перастала. Бо ведаеш, што дзеці тыя адказваюць? «Мамку бонбаю забіла...» — «А куды ж ідзяце?» — «І самі не ведаем. Куды ўсе, туды і мы».

Страшная, татка, вайна! Страшней, мабыць, нічога на свеце не бывае. Вось учора мы з маці сведкамі выпадку такога былі. Ішоў поплеч з намі мужчына. Мабыць, салдат, бо на ім галіфэ чырвонаармейскае было. А можа, і не салдат, а надзеў чалавек тое галіфэ. Рука ў яго забінтаваная. Немцы з шашы, мабыць, згледзелі чалавека, спыніліся, хоць і на машыне ехалі. Падбеглі да яго, пачалі пытаць, хто ён і адкуль. А чалавек той ні слова па-нямецку не разумее. І яны, немцы, чалавека таго... Там жа, на абочыне, і застрэлілі... Селі зноў у машыну і паехалі... А сёння... Спынілася машына крытая. З кузава два немцы вылезлі... Стаялі на шашы, глядзелі на тых, хто міма ішоў, быццам вачыма кагось шукалі. Жанчына маладая, з дзіцем на руках, ішла. Дык яны... Ох, татачка, аж паверыць цяжка. Яны дзіцятка ў жанчыны адабралі, проста на абочыну, як нешта нежывое, кінулі. А жанчыну самую... За рукі, за ногі — ды ў кузаў. Жанчына вырываецца, крычыць, галосіць, а яны, гады, рагочуць: «Гут, гут, русішэ фрау». А дзяўчат колькі вось гэтак пералавілі ды ў кузаў пазацягвалі!.. Маці за мяне баіцца, да жывата мне падушку падвязала, маўляў, хай думаюць, што цяжарная я... І я, татка, іду так, з падушкаю на жываце...

Хутчэй бы ўжо дома, у Мінску, быць! Адпачыць бы! І цябе, татка, убачыць. Бо дзе ты, што з табою — мы нічога ані не ведаем.

## XVI

Праўду людзі кажуць: ніхто не чуе, дзе бяда начуе. І Мікалай Дарошка таксама не чуў. Сядзеў дома на лаве, глядзеў на тыя грошы, што сын, Косцік, прынёс, з-за па-

зухі і кішэняў падаставаў, не ведаючы, што рабіць з грашыма тымі, дый заадно і з Косцікам, сынам, караць ці даравацъ, і гадаць не гадаў, што ўжо пра іншае, іншае яму трэба думаць. У хату, падаіўшы кароў, з поўнаю даёнкаю малака Хора зайшла.

— Тхорык вярнуўся,— кінула яна з парога навіну.

— Тхорык? — паволі адвёў валасаты свой твар ад грошай Мікалай, яшчэ добра не цямячы, пры чым тут Тхорык.

— Аге,— кіўнула галавою Хора.— Сама бачыла, з хлява ў хату бег...

Толькі цяпер нарэшце дайшло да Мікалая, чаму пра Тхорыка Хора гаворыць — Тхорык жа разам з усімі мужчынамі з іхняга Вялікага Лесу ў войска ішоў. І ў каго ж, як не ў Тхорыка, спытаць, даведацца хоць што-кольвечы пра Піліпа?

Пачухаў кулаком патыліцу Мікалай, сказаў да Косціка грозна:

— Схавай... Грошы етыя схавай... Ды...

І змоўк — не ведаў, што яшчэ сказаць свайму самаму меншаму: надта ж сэрца нешта закалацілася, аж забалела, быццам цесна яму ў грудзях стала.

«Чаму б ета?»

Падняўся з лавы, пастаяў. Потым, падумаўшы, падаўся моўчкі на падворак.

«Хіба... Да Мацея схадзіць, распытаць, як там і што?..»

Патупаў да вясніц. Ад вясніц вярнуўся назад да свае хаты. Спыніўся, зноў патупаў да вясніц. Паглядзеў на вуліцу і, нікога там не ўбачыўшы, спакваля пакіраваўся да Тхорыкаў. Ішоў, а ногі ані не хацелі ісці.

«Чаму б ета? — дзіваваўся Мікалай.— Няўжо, што я Тхорыкаў не любіў і не люблю? А мо... Мо...»

Дзверы адны, другія адчыніў, у сенцы, а потым і ў хату зайшоў. Перш чым павітацца, на кут, дзе стол стаяў, вачыма кінуў. Сапраўды, Тхорык быў дома — сядзеў за сталом, снедаў. Чорны, што грак, непаголены, абраслы шчацінаю. Там жа, за сталом, сядзела і Тхорыха, Мальвіна, і дачка іхняя меншая, Люда. Ля стала, трохі збоку, сядзела і Куляшова Анюта — Грышкі-брыгадзіра жонка. «Мусіць, таксама прыбегла, каб нешта пра чалавека свайго пачуць»,— падумаў пра Анюту Мікалай і, выцершы аб анучу, што паслана была ў парозе, ногі, папраставаў да стала, да Мацея.

— Го, рады суседа дома зноў бачыць!

Мацей падняўся, працягнуў — гэта Мікалай адразу ж

заўважыў — неяк насцярожана, быццам баязліва, Мікалаю руку.

— Да стала просім,— прашамкала бяззубым ротам Тхорыха — нешта балелі ў яе з маладых гадоў зубы, тытунь з рота не вымала кабета. Вось зубы, мусіць, ад тытуню і пакрышыліся, павыпадалі.

— Дзякую, суседка. Няхай іншым разам, лепшым часам. Цяперака ж дай на Мацея паглядзець, пачуць, дзе быў ён, што бачыў. Ды, можа, заадно і пра Піліпа майго ўспомніць, слова скажа. Як-ніяк, а разам жа з сяла выходзілі, разам у войска ішлі...

Гаварыў, сыпаў словы — адкуль толькі яны і браліся — Мікалай і адчуваў, здагадваўся — добрага нічога пра Піліпа Мацей яму не скажа. Не, не скажа. Па вачах Мацеевых здагадваўся. Нешта надта ж хутка схаваў іх Мацей, у стол утаропіў.

— Ты прысядзь, дзядзька,— сказала Тхорыха глухім, нейкім несамавітым голасам.— Тутака во і Анюта прыйшла, таксама пра чалавека хоча пачуць...

Мікалай, не спускаючы вачэй з Мацея: («А не пахудзеў ані на хронце, толькі шчацінай зарос!») — прысеў на лаву.

— Во, то ён, можа, і пра Піліпа столькі ведае, колькі пра Грышку майго,— прамовіла Анюта, паварочваючыся тварам да Мікалая.

— А што пра Грышку твайго? — паглядзеў на Анюту, пацікавіўся Мікалай.

— Кажа, як завялі іх у Ельнікі, дык і рассталіся... Мой у адну каманду, Мацей — у другую...

Мацей між тым саўладаў з сабою, узяў сябе ў рукі. Палажыў лыжку, з-за стала вылез.

— Ты б, Мацей, снедаў,— сказаў Мікалай да Тхорыка.— А я... Пачакаю. Во, з Анютаю пагаманю...— адцягваў, не хацеў верыць таму, што прадчуваў ужо, што павінен быў вось-вось даведацца, Мікалай.

— Дык я... Можна сказаць, і наснедаўся ўжо... Тхорыкава жонка, Мальвіна, і дачка Люда таксама паўставалі з-за стала. Адна на адну не гледзячы, не падымаючы вачэй, моўчкі пачалі збіраць лыжкі, міскі...

«Нешта і яны ведаюць,— насцярожваўся ўсё больш і больш Мікалай.— Бач, і снедаць раней часу скончылі, маўклівыя ўсе, неразгаворлівыя».

А Мацей, галаву сваю чорную, як дзягцярны квач,

нізка апусціўшы, уздыхнуў раптам цяжка-цяжка. І гэта яшчэ больш насцярожыла Мікалая.

— Кажы ўжо, што ведаеш, не муч,— наструніўся, выдавіў з сябе Мікалай.

— Скажу, усё чыста скажу, нічога не ўтаю,— не глядзеў на Мікалая, а ў падлогу Мацей.— Няма, дзядзька, Піліпа... Бонба яго... Бонбай забіла...

Загайдалася пад Мікалаем лаўка. Уваччу цёмна, як уночы, зрабілася. Але сабраўся з сілаю Мікалай, выдыхнуў:

— Як тое было?..

Мацей яшчэ раз, шырока, нібыта рыба тая, якую на бераг пясчаны з ракі выкінулі, пазяхнуў.

— Дзядзька, мы з Піліпам у адну каманду трапілі. І ішлі аж да пераправы, да Дняпра. Ён ногі вельмі намуляў, боты на плячах нёс... Ну, а там...

Мацею нешта замінала гаварыць, перасядала ў горле.

— Там ля ракі мы з Піліпам сядзелі. Меркавалі, як на той, другі, бераг пераправіцца. А самалёты наляцелі, бонбы кідаць пачалі... То я падхапіўся, пабег... А Піліп... Ат, бонба ў яго, небараку, проста і пацэліла... Ямка... Ямка там, дзе Піліп сядзеў... Нічога, можна сказаць, ад чалавека не асталося...

У той жа вечар сабраў Мікалай стол жалобны. Усю радню сваю склікаў. Доўга стаяў перад абразамі, маліўся. Потым наліў чарку гарэлкі, паставіў на кут — Піліпу. І закусіць таксама палажыў — скібку хлеба, агурка кіслага і сала скрылік. І сабе чарку наліў. Сказаў да радні ўсёй, што за сталом сядзела:

— Памянём раба божага Піліпа... Кеб яму на тым свеце лёгка было...

І выпіў, перакуліў да самага дна чарку.

Сеў, апусціўся на лаву, аберуч галаву ашчаперыў. «Быў Піліп — і няма».

На вочы набеглі, засланілі свет слёзы, у грудзях схлупіла — не прадыхнуць. Параска першая не вытрымала — усхліпнула, загаласіла. І Хора ціхенька — ых-ых, ых-ых, — румзаць пачала. Яшчэ цяжэй ад плачу іхняга Мікалаю стала. Падняўся з-за стала ён, на паветра, на падворак выйшаў. На плот грудзямі наваліўся, павіс. Зашаптаў, як і заўсёды, калі цяжка было:

«І за што ты, божа, мяне караеш? Чым я правінава-

ціўся перад табою? Скажы, скажы мне, божа,— чым?»

Застагнаў, заскрыгітаў зубамі. З гора, ад болю, адчаю...

## XVII

Вечарэла. Нізкае чырвонае, як жар, сонца паволі хавалася за хмару, што вісела за вёскаю на даляглядзе. «На дождж»,— падумаў Іван Дарошка, седзячы на ўзлеску.

Даўно ад'ехала, знікла за пагоркам падвода з жонкаю і з дзецьмі, а ён, Іван, нікуды так і не ішоў. Нібыта прывязала яго штосьці тут, пад галлістым кашлатым дубком, які быццам выбег аднойчы на поле ды так і застыў, астаўся стаяць, заварожаны наваколлем.

«А мо Каця праўду казала — трэба было заехаць у вёску, пераначаваць? — мільганула ў галаве.— Усё ж яшчэ ноч пабыў бы з сям'ёю. Пагледзеў бы, як уладкаваліся, даведаўся б, што новага ў Будзілавічах, як жывуць Каціны бацькі...»

Рашуча адагнаў ад сябе гэтыя думкі.

«Ці мала што? А так — ніхто мяне не бачыў, ніхто не ведае, дзе я. «Як і ўсе мужчыны, у войску». І ўсё. Жонцы, дзецям лягчэй, мне — спакайней. Потым як-небудзь зазірну. Уночы».

Каб больш не спакушаць сябе, падняўся, пабрыў у лес.

«Ёсць мне пра што думаць. А сям'я... Пажыве пакуль адна. Там відаць будзе. Час пакажа... І мне што рабіць, і ім.Аставацца тут, у Будзілавічах, ці забраць, завезці іх у нейкае іншае месца...»

У лесе быў зусім ужо вечар. Суцінкі, морак краліся з-пад кожнага куста, дрэва. Панылa і нудна звінелі, цягнулі і цягнулі сваю адвечную, сумную песню камары — ім ніколі няма нідзе ні ўтомы, ні спачынку. Плаксіва ценькала сініца, трывожна крычала дзесьці збоку сойка.

Іван Дарошка выкіраваўся на дарогу, пайшоў па ёй у глыб лесу.

«Вось і адзін я,— думаў ён.— Без дому, без сям'і. Іду — і сам не ведаю куды. А ўсё ж быццам ладзілася. І блізкая сэрцу работа, і жонка, дзеці... Што ж здарылася?»

«Вайна»,— быццам падказаў, аглушыў нехта.

«Вайна... Але ж яе чакалі. Людзі вунь калі пра вайну гаварылі! І я адчуваў, можна сказаць, нават верыў — будзе вайна. І лектар, што з Мінску прыязджаў, Лапіцкі,

таксама ўпэўнены быў: вайна немінуча. Ды і доктар, муж Веры Сымонаўны... Ага, прозвішча яго Несцяровіч... Тодар Пракопавіч Несцяровіч... Таксама пра вайну гаварыў. І немец, што праз мяжу перабег... Значыцца, ведалі, што вайна будзе. А калі ведалі, то, напэўна ж, і рыхтаваліся, чым немцаў-фашыстаў спаткаць...»

«У Гітлера сіла вялікая».

«А ў нас... Хіба не сіла?»

«Не паспелі, мусіць, сабраць сваю сілу ў кулак, у адзін моцны, надзейны кулак».

«Гэта можа быць. Краіна вялікая, дзе ты за некалькі месяцаў сабярэш усю сілу ў адзін кулак. Адмабілізавацца — і то час трэба. А ўзброіцца? Кожнаму ж вінтоўку ў рукі даць... Ды і зрабіць вінтоўку тую... Страляць навучыць... А і пра танкі, гарматы, самалёты падбаць жа варта... Ды і дагавор жа з Гітлерам аб ненападзе быў. Верыў, мусіць, сёй-той Гітлеру. А ён не спаў у шапку, рыхтаваўся. Адмабілізаваўся, узброіўся, планы распрацаваў... І скарыстаў сваю перавагу. Цалкам, напоўніцу скарыстаў».

«Але мы таксама з сілаю збярэмся. І спынім ворага, назад пагонім. Ды так, што без агляддкі аж да самага Берліна пабяжыць».

«Калі тое будзе?»

«Будзе!»

«Лёгка гаварыць. А рабіць... Прывыкнуць, што вайна ідзе, і то ніяк не можам. Тры месяцы хутка, а... Так і не прывыклі. І я не прывык, і іншыя, мабыць, не прывыклі. Ва ўсякім разе, пэўна сказаць можна, што не ўсе прывыклі. А да вайны не толькі прывыкнуць трэба, але і рабіць усё дзеля перамогі. Ваяваць навучыцца трэба. Біць ворага там, дзе ён не чакае, што яго паб'юць. І ўсюды, усюды, дзе ён ёсць, біць. Фронт павінен быць на ўсёй савецкай зямлі, дзе толькі ёсць савецкія людзі. Усё дзеля вайны, дзеля перамогі. Тады толькі мы пераможам!»

«Развважаеш, гаворыш... А сам, што ты сам зрабіў дзеля перамогі? З сям'ёй — і то сутак колькі расставаўся».

«Ніякіх жа ўказанняў, рэкамендацый з райкома не было. Тыя, што былі, выконвалі».

«Указанняў і рэкамендацый з райкома можа і не быць. І самога райкома можа не быць! Ён — у падполлі. І яго ў любы час могуць выкрыць, арыштаваць, знішчыць... І ты не чакаць павінен якіх бы там ні было ўказанняў, а ведаць, што рабіць. І сёння, і заўтра, і праз месяц. Пра-

мову таварыша Сталіна чытаў, чытаў пастановы ЦК КП(б)Б. І вывады... Сам рабі».

«У нас ворага яшчэ не было».

«Гэта не апраўданне. Рыхтавацца, як, чым сустрэць ворага,— трэба. Людзей гуртаваць. Сустракацца з імі, гаварыць. Каб ведаць, хто што думае, чым дыхае, чаго чакае... З моладдзю, камсамольцамі... З тым жа Апанасам Харчэнем...»

Укалола, балюча ўкалола ў самае сэрца, калі Іван успомніў Апанаса Харчэню.

«Сапраўды... Я ж ні разу пасля таго так і не сустрэўся, не пагаварыў з ім»,— упікнуў самога сябе Іван.

«Во, бачыш! А то — «ворага не было тут, рабіць не ведаў што». А з людзьмі пагаварыць хіба не работа? З тым жа Апанасам Харчэнем? З Лідай Шавейка? З Нінай Варакса? Дый... Са старшынямі сваіх жа сельсавецкіх калгасаў — Максімам Варывончыкам, Петрусём Хамёнкам... Колькі разоў ты з імі сустракаўся?..»

«Ды сустракаўся з некаторымі быццам і часта... А вось гаварыць па душах... Так, як з Кулагам... Не гаварыў...»

«А трэба было. Абавязкова трэба было гаварыць. І не толькі з імі, а і з іншымі людзьмі. Каб ведаць, адчуваць, пра што яны думаюць, куды глядзяць і чаго чакаюць. Дзейнічаць трэба! Так дзейнічаць, каб і людзі гарнуліся да цябе, памагалі...»

...Даўно ўжо змерклася, ацямнела зусім. Неба зацягнулася густым полагам хмар, нават зор нідзе відаць не было. Дробна і вусцішна шапацела лісце дрэў — непрыкметна і ціха пачаў сеяцца цёплы летні дождж.

А Іван Дарошка, ахоплены роздумам, ішоў і ішоў, не заўважаючы, што насунулася цемра, ноч, церусіць, сеецца дождж.

## XVIII

Ледзь світання, раніцы дачакаўся ў тую ноч Хомка. Ні на хвіліну, ні на волас вачэй сваіх так і не звёў. То і паспаў, што звечара. Аж калаціўся, кіпеў ад злосці.

«Ета ж трэба... У такі час... Ды такое... І дзе, дзе!.. Тут не ведаеш, што і думаць, рабіць... Жыць не ведаеш, як далей... Галава сівее... А яна, сучка... Вунь што!.. Упамкі ж, не забылася...»

Надзя сядзела таксама пры Хомку. Прыхінулася да камля дрэва і то драмала, а то, прахапіўшыся, слухала ў

цішы ночы бессаромныя, дурныя ўздыхі і крыкі Клаўдзі, якая быццам ніколі ў жыцці і мужчыны дасюль не мела, якая быццам і забылася, што навокал людзі і могуць чуць яе,— смяялася, уздыхала, аж выла, нібыта са сваім каханкам яны адны на ўсім свеце былі, на нейкім неабжытым далёкім востраве.

«Пачакай жа, я табе пакажу...— мармытаў Хомка.— Дарвалася...»

А світанне, дзень, як на тое, марудзілі, павольна ішлі. Ведама, яно ўсё надта ж павольна не ідзе, а паўзе, калі чакаеш. Вось як не чакаеш, дык і не заўважыш, калі час праляціць. Неба зацягнулася хмарамі, дождж сеяцца пачаў. Хоць і летні, цёплы, усё ж дождж. Капае і капае на галаву, мочыць сарочку, штаны, ногі. І не пойдзеш да падводы, каб акрыцца што-небудзь узяць: на падводзе ж...

«Век бы пражыў, а і не ведаў бы, што так некаторыя ета робяць»,— круціць і круціць галавою Хомка.

З цемры ж, адтуль, дзе падвода, дзе ёсць і ватоўкі, і посцілкі, чуецца раз-пораз:

— Іх-ха! Іх-ха!

«А кеб табе горла зарвала,— лаецца Хомка.— Кеб на вас бонба якая ўпала!..»

Сціхла на возе толькі пад раніцу, калі пачало на ўсходзе святлець, усміхацца барваю неба.

«Здаволіліся, змагліся... Ну і сучка, ну і сучка!.. І ён жа!.. Ноч усю!.. Трэба ж вытрымаць! І адкуль толькі бяруцца такія? Сораму ані не маюць...»

І зноў на Хомку навальваецца злосць.

«Яны там... А ты мокні на дажджы!»

Падняўся на ногі.

«Вы мне спаць не далі, то і я вам... не дам».

Разматаў скручаную пугу-смалянку, адышоўся на прагалу, ляснуў. І раз, і другі. Ды так гучна, быццам са стрэльбы пеканув. Аж засмяяўся ад радасці — усё ж недарэмна пастухоўскі хлеб еў, чаму-чаму, а ляскаць пугаю навучыўся.

Пастаяў, паглядзеў, як павolі падымаюцца на ногі каровы, пачуўшы знаёмы ляскат пугі, і пайшоў, пакульгікаў да воза.

«Я вас... Падыму! Не хапала яшчэ, кеб удзень... А кароў даіць — не хацела!»

Надзя не адставала ад Хомкі, ішла за ім след у след. Нават не ішла, а як бы кралася, быццам баялася чагось.

— Ты смялей, смялей,— павярнуўся тварам да Надзі Хомка.— Вядро бяры, кароў дой! Пара!

Надзя нічога не адказала, бы і не пачула Хомкавых слоў.

— Кароў, кароў даіць! — ужо грамчэй, каб чула яго не толькі Надзя, а і Клаўдзя, закрычаў, загарлапаніў Хомка.

— Й-я цябе зараз падаю!..

Хомка і апамятацца не паспеў, як перад ім — адкуль ён і ўзяўся, быццам за дрэвам стаяў і чакаў,— паўстаў рослы, разы ў два большы за Хомку, плечавень.

— Ты што ета спаць людзям не даеш, усхадзіўся ні свет ні зара! — ледзь варушыў губамі, роў, аж аглушаў густым басам Хомку плечавень. І ішоў, ішоў на яго, наступаў. Кінулася Хомку: галава ў здаравілы пудлатая, твар квадратны, вочы амаль без броваў і нейкія бялёсыя, усё адно што ў парсюка.

— Ой дай, дай яму, Змітро! — пачуўся з падводы, з воза раптам Клаўдзін голас.— Так ужо збрыдзеў за дарогу, так збрыдзеў, проста сілы няма!

Хомка разгубіўся, застыў на месцы.

«Во папаўся дык папаўся! — падумаў.— І назад... Як ты адступіш назад?»

— Чалавеча, я цябе не знаю, хто ты і адкуль,— сказаў, цяжка дыхаючы ад неспадзяванасці, Хомка.

— Не знаеш, дык будзеш знаць! — грымеў над галавою ў Хомкі бас.

І перш чым Хомка зразумеў, як і што здарылася, апынуўся на зямлі. Лёг — і ўсё. Мякенька, лёгенька. Калі плечавень падставіў падножку, калі пíхнуў? Не заўважыў.

— Ой дай, дай яму, Змітро! — аж лямантавала ад радасці, прасіла Клаўдзя.— Кульгач, а такі ўжо ірад, такі ірад!

Але плечавень, паваліўшы Хомку на зямлю, не стаў яго біць ні рукамі, ні нагамі. Мо таму, што Хомка не абараняўся.

— Не хочацца з самай раніцы рук паскудзіць,— не гаварыў, а дыхаў, пырскаў слінаю плечавень.— Але... Ты да мяне не падыходзь... Бо калі я да цябе дакрануся... Парахня пасыплецца... Душа — вон, кішкі — на тэлефон!..

— Дык падвода ж... Мая! — як малы сабачка, не гаварыў, а цяўкаў з зямлі Хомка.

— Была твая, а цяпер мая. Зразумеў? І пра кароў забудзь. Яны ўжо не твае! І не калгасныя!

— А чые ж? — асмеліўся падняць вочы, паглядзець на незнаёмца Хомка. І разгубіўся. Перад ім стаяў не чалавек, а граміла. Ногі тоўстыя, доўгія, жывата амаль няма. Няма і лба. Там, дзе ў людзей лоб, у яго валасы. Валасы і на галаве — рыжыя, аж гарацьь. Твар рабы, паклёваны. Шчака адна крывая, быццам умятая. А нос... Нос з добры крук. І кадык тырчыць, выпірае, быццам скула.

«А нялюдскі ж які,— зарадаваўся, як немаведама чаму, Хомка.— Знайшла Клаўдзя, на каго Піліпа мяняць...»

— Чые? — варушыліся тонкія, амаль сінія губы незнаёмца.— Нашыя! Тых, у каго іх пазабіралі бальшавікі, як раскулачвалі. Ясна?

— Ясна...

Хомку сапраўды цяпер усё было ясна, зразумела — ён больш ні пра што не пытаўся, нічога наогул не гаварыў.

## XIX

Здараецца ж такое! Жыў Апанас Харчэня, школу закончыў, у інстытут ужо рыхтаваўся паступаць, збіраўся вершы пісаць, гісторыю вывучаць і не ведаў, што ён не такі, як усе людзі. Выпадак падказаў яму гэта, вочы на ўсё адкрыў.

І разгубіўся Апанас. За што б ні ўзяўся, што б ні намысліў рабіць — няўпэўненасць адчуваў, боязь: а раптам... раптам...

Гэтая няўпэўненасць, боязь асабліва далі пра сябе знаць, калі пакінуў дамоўку, апынуўся на пераправе.

«Я не такі, як усе. Што можна іншым, мне не можна»,— засела ў галаве ў Апанаса.

І ён думаў, думаў. Ніколі яшчэ столькі не думаў Апанас, як тады, там, на пераправе. І што самае дзіўнае — пэўнасці ні ў чым не адчуваў. Адзін раз яму здавалася: ён правільна зрабіў, што сышоў з вёскі, пакінуў дамоўку, дзе ведаюць усё-ўсё і пра самога, і пра радню яго.

«Во, толькі тут, ля Дняпра, сядзець не трэба, трэба як мага хутчэй пераправіцца на другі бераг, ісці далей. І там, на новым месцы, мяне ніхто нічым не папракне, там я буду вольны. Жыць, як і жыў...»

І Апанас кіраваўся да ракі. Блукаў па беразе, прыглядаўся, шукаў, ці няма дзе якой лядашчай лодкі, плыта. Спрабаваў нават напрошвацца ў кампанію да тых, хто не сядзеў склаўшы рукі, а ладзіў з дошак, бярвення і слупоў самаробную пераправу...

Другі раз усё па-іншаму ўяўлялася Апанасу:

«Глупства я зрабіў, што пакінуў дамоўку. Там мяне хоць ведаюць усе. Калі што — і абароняць, заступяцца, загінуць не дадуць. А на новым месцы, сярод чужых... Што я каму дакажу, хто мне і ў чым паверыць на слова? Дый маною, кажуць, свет пройдзеш, а назад не вернешся...»

І Апанас закідваў за плечы сваю ўжо амаль парожнюю і таму зусім лёгкую торбачку, парываўся вяртацца дадому, у сваю вёску.

«Усё адно на другі бераг Дняпра не пераправішся. А каб і пераправіўся, што там рабіць?»

І кожны раз, падумаўшы, зноў апускаўся на зямлю — нікуды не ішоў.

Чакаў, усё чагосьці чакаў, сам не ведаючы — чаго...

Ды ўсяму на гэтым свеце, што б ні было, рана ці позна прыходзіць канец. Прыйшоў канец і Апанасавай нерашучасці, няпэўнасці. Неяк, на дасвецці, брыў ён берагам ракі — з торбачкай за плячыма, босы, падкасаўшы амаль да каленяў штаны, каб не замачыць — раса была надта шчодрая на траве, дый да Дняпра, да вады час ад часу даводзілася блізка падыходзіць: «А раптам лодка дзе ў кустах стаіць?» Птушкі, як апантаныя, усюды спявалі, горлы свае дралі. Туманок рэдзенькі дзе-нідзе над лагчынкамі кудзеліўся. І хоць сонца яшчэ і не думала з-за лесу паказвацца — хараство незвычайнае навокал было. Зачаравалі прыгажосць і птушыныя спевы Апанаса, ды так, што забыўся на хвіліну, дзе ён і чаму тут, па беразе ракі, блукае. А тут яшчэ і ручаёк-канаўка дарогу перабегла. Вада хоць і балотная, густая, рыжая, што чай, але імклівая-імклівая. Спыніўся Апанас, меркаваць пачаў, як бы гэты ручаёк-канаўку пераадолець? Уброд перайсці? А мо пераскочыць? Пад кустом лазы кладачку ўбачыў. Ступіў на яе і ў вадзе лазовы кош-венцер згледзеў.

«Нехта, мусіць, на рыбу паставіў?»

Нагнуўся, падняў з вады венцер, выкінуў на бераг — у венцеры амаль як напалову было рыбы — уюны, плоткі, шчупакі і нават адзін вялікі — мо на кілаграм — лінь.

«Няўжо за ноч столькі налезла? А мо чалавек паставіў венцер даўно ды... Мала што з ім магло здарыцца...»

Міжвольна залюбаваўся, як б'ецца ў зялёнай роснай траве жывое срэбра рыбы.

«Забраць з сабою? Але што я зраблю з ёю?»

Рыба захліпалася на беразе, падскоквала, шукала вады.

Уюны ж усё адно што вужы, лезлі, шыліся ў траву.

Нага, здаецца, сама пачала зграбаць рыбу, ссоўваць яе ў ваду. І, як дзіця, радаваўся Апанас, калі рыбіна, трапіўшы ў ручай, раптам жвавела, міг — дзе і дзявалася, як бач нырала, знікала...

«Бо ў сваёй стыхіі... Дома!»

Абмыў нагу, пайшоў па беразе далей...

За лужком — чысценькім, акуратна скошаным — стаяў нават пасярэдзіне абвешаны апоўзінамі прысадзісты стог сена — пачуў плёскат вады і галасы людзей, ядраныя, зычныя.

«Вёска, мабыць, блізка. Ну, але, калі венцер стаіць, рыбу ловяць, то і вёска павінна быць недалёка»,— падумаў.

Завагаўся — ісці ў вёску ці лепш не паказвацца людзям на вочы? Усё ж пайшоў... Праўда, нерашуча, павольна.

Сцежачка, звіваючыся па траве, вывела яго да купчастага куста лазы. Спыніўся, затуліўся за куст, паглядзеў на раку — у рацэ купаліся людзі.

«Адкуль яны ўзяліся? Вёскі ж не відно».

Зрабіў крок, яшчэ крок наперад — і паволі, паволі, задам, адступіў назад, за куст: купаліся, плёскаліся ў вадзе не проста людзі, а мужчыны.

«Можа, чырвонаармейцы?»

Дружны вясёлы рогат абарваў раптам думкі Апанаса, прымусіў застыць, урасці ў куст.

«Наўрад ці смяяліся б так бесклапотна чырвонаармейцы... Адступаюць жа... Тады...»

Пахаладзела ўсярэдзіне.

«Няўжо немцы?»

Ліхаманкава перавёў вочы на бераг: там, на пагорку, пад невысокім раскідзістым дрэвам, стаялі... Адзін... Два... Тры... Пяць... Пяць матацыклаў і тупарылае з рогам-гарматай страшыдла — танк. На вежы ў танка чарнеў фашысцкі знак — крыж...

Ад нечаканасці, ад страху Апанас прысеў.

«Глядзі, аж сюды ўжо дапялі... І я... Ледзь сам у рукі да іх не трапіў!»

У наступную хвіліну вопрамеццю кінуўся назад, туды, адкуль толькі што ішоў.

«Уцякаць адсюль трэба!» — мільгала ў галаве, білася ў скронях думка.

«Куды ўцякаць?»

«Як — куды? Дадому, у Вялікі Лес!»

## XX

— Ну і няхай,— не сказаў, а хутчэй выдавіў з сябе Андрэй Макаравіч і падняўся, паволі ўстаў на ногі.

— Што, пойдзем? — са страхам паглядзела на мужа Аліна Сяргееўна.

— Пойдзем! — рашуча сказаў Андрэй Макаравіч.

— А куды?

— Назад, у Вялікі Лес.

Сказаў гэта — і самому лягчэй стала. Аж уздыхнуў.

Уздыхнула, падымаючыся з травы, і Аліна Сяргееўна. Сказала не то з роздумам, не то з радасцю:

— Пазнавата ў дарогу мы выправіліся. Ды і... Не з нашымі, мусіць, сіламі ўжо хадзіць, з месца на месца перабірацца...

— Ну але,— згадзіўся з Алінай Сяргееўнай Андрэй Макаравіч.— Што ж, што міру, тое і бабінаму сыну...

Аліна Сяргееўна пачала супакойваць мужа:

— А што можа такое быць? Сцяпан Радзівонавіч, па-мойму, правільна разважае — нам баяцца няма чаго. Ласкі вялікай ні ад каго мы ніколі не мелі. Няхай немцаў іншыя баяцца, а нам... Што нам трэба? Кавалак хлеба ды каб страха над галавой...

Андрэй Макаравіч не падтрымаў гэтай размовы — не падабалася яна яму. І Аліна Сяргееўна гэта адчула. Адчула і змоўкла. Пачала хуценька ладаваць свае клункі, торбы і торбачкі, браць іх каторыя на спіну, каторыя ў рукі, асабліва калі ўбачыла, што Андрэй Макаравіч ужо сабраны, нарыхтаваны ў дарогу — калі ён толькі і паспеў?

Выйшлі з лесу, пастаялі, паглядзелі здаля на Ельнікі — ужо чужыя, акупіраваныя немцамі,— завярнуліся — і моўчкі падаліся назад, у Вялікі Лес.

Вяртацца дадому заўсёды лягчэй, чым ісці з дому. Не заўважылі, як і лес мінулі, у Паташню ўвайшлі. Апомніліся толькі тады, калі знаёмую постаць настаўніка Сцяпана Радзівонавіча Кухты перад сабою зноў убачылі.

— Я рад, шчыра рад,— усміхаўся, расцягваў на ўвесь вялікі круглы твар свае тоўстыя губы Сцяпан Радзівонавіч.— Іншага я ад вас і не чакаў. Ды не стойце пасярод вуліцы, у хату, у хату да мяне...

Андрэй Макаравіч паглядзеў на Аліну Сяргееўну, Аліна Сяргееўна — на Андрэя Макаравіча.

— Зойдзем, зойдзем, чаго ж,— надта ж ужо ласкава ўпрошваў Сцяпан Радзівонавіч.— Жывём, можна сказаць, па-суседску, а ніколі адзін у аднаго і ў гасцях не былі.

І Сцяпан Радзівонавіч, аблапіўшы сваімі вялікімі, сапраўды мужычымі ручышчамі за плечы і Андрэя Макаравіча, і Аліну Сяргееўну, як не сілаю павалок за сабою.

Ісці было недалёка. Адразу ж, за калодзежам, што быў як не на самай вуліцы, і збочылі ў весніцы.

— Хата гэтта,— паказваючы галавою на хату — звычайную вясковую хату, мажа, хіба трошкі навейшую за іншыя ды крытую не чаротам, а дранкаю,— гаварыў Сцяпан Радзівонавіч,— не мая. Я на кватэры жыву. Халасцякую. Ды вы не бойцеся — акрамя мяне, нікога няма. Падаліся мае гаспадары ў бежанцы... Раней, як толькі пачулі, што вайна пачалася. Ну і абрусам дарога. Я цяпер тут адзін раскашоўваюся.

Хата была вялікая, прасторная. І даволі светлая — на чатыры акны. Падлога амаль новая, пагабляваная. Сцены абклеены фатаграфіямі і малюнкамі з газет і часопісаў.

Убачыўшы, што і Андрэй Макаравіч, і Аліна Сяргееўна, як толькі зайшлі ў хату і селі на лаву, што цягнулася з кута ў кут, узяліся разглядваць малюнкі і фатаграфіі, Сцяпан Радзівонавіч аж з твару змяніўся.

— Ой, добра, што вы звярнулі ўвагу на гэтую мазню,— закруціў галавою ён.— Гэтта ж... Як я і забыўся... Паздзіраць усё трэба было даўно.

— Навошта? — здзівілася Аліна Сяргееўна.— Гэта ж цікава!

— Цікава-то цікава, а калі немцы ў хату зойдуць?

— Ну дык і што? — не разумела яшчэ нічога Аліна Сяргееўна.

— Як што! Тут жа партрэты... Вось хоць бы гэтты...

І Сцяпан Радзівонавіч як не коршунам падляцеў да сцяны, пазногцямі ўчапіўся ў газеціну, ірвануў.

— Во папаўся б дык папаўся! Тлумач тады, што хата чужая, што не ты тут гаспадар, не ты клеіў...

Твар у Андрэя Макаравіча аж перасмыкнуўся. Няёмкасць адчувала і Аліна Сяргееўна.

«Вось госці дык госці»,— падумала.

А Сцяпан Радзівонавіч, апрытомнеўшы ад страху, палагоднеў раптам, стаў гасцінным гаспадаром. І гаспадыняю заадно — адкрыў засланку, узяў вілы, пачаў, адставіўшы тоўсты, як у жанчыны, азадак, вымаць з печы чорныя, што вугаль, абкуродымленыя чыгуны.

— Вы скідайце з сябе клункі, ды абедаць будзем. У мяне сёння на першае капуста, а на другое... Бабка. Любіце?

Завіхаўся Сцяпан Радзівонавіч хутка. І дзесяці хвілін, мабыць, не мінула, а на стале ўжо стаялі і капуста, налітая ў гліняныя міскі, і парэзаная кавалкамі бабка на сподачках. Быў там і хлеб, было і сала, і кіслыя агуркі. І запацелая паўлітэрка самагонкі таксама заняла сваё ганаровае месца.

— Я не надта люблю ўжываць гэттае зелле,— гаварыў, беручы ў правую руку паўлітэрку і наліваючы самагонку ў шклянкі (не вельмі чыста памытыя, што заўважыла адразу ж Аліна Сяргееўна).— Але выпадак, такі выпадак!..

Андрэй Макаравіч і Аліна Сяргееўна ўзялі ў рукі шклянкі, прыгубілі. Сцяпан жа Радзівонавіч выпіў сваю гарэлку ўсю. І яшчэ шклянку перавярнуў, дно пацалаваў.

— Во так, во так! — сказаў.— Піць дык піць...

І, не зважаючы, як п'юць і закусваюць госці, падсунуў бліжэй да сябе міску з капустай, пачаў сёрбаць, есці.

— Не ведаю, чаго людзі хочуць, чаго баяцца? — гаварыў ён, гучна плямкаючы губамі і чаўкаючы.— Па мне няхай Саветы, няхай немцы, няхай хоць сам чорт лысы. Абы толькі мяне не чапалі, мне жыць давалі...

Апаражніўшы міску капусты, зноў пацягнуўся рукою да паўлітэркі.

— О, дык вы ж і не выпілі, можна сказаць, нічога! — убачыўшы шклянкі Андрэя Макаравіча і Аліны Сяргееўны, усклікнуў Сцяпан Радзівонавіч.— Чаму гэтта вы так?

— Я ніколі яе не піла,— прызналася Аліна Сяргееўна.— Ну а ён,— павяла вачыма яна на мужа.— Таксама не ахвотнік...

— То і я не вялікі ахвотнік, я ўжо вам пра гэтта казаў,— ікнуў Сцяпан Радзівонавіч.— Во, шклянку выпіў, дык і захмялеў, бачыце... Яно, я вам скажу, можна было б і выпіць, ды няма калі, нават, каб і хацеў. У школу

вучыць дзяцей пад чаркай не пойдзеш, на інспектара ці яшчэ на каго напароцца можаш. Дый часу няма. То сценгазету выпусці, то агітатарства гэттае... Бяжы і бяжы. А я ж... Акрамя ўсяго, яшчэ і пішу. Во, во колькі напісаў...

І Сцяпан Радзівонавіч жвава падхапіўся з-за стала, падбег да ложка, што стаяў, засланы клятчастай коўдрай, ля акна. І пачаў увішна выцягваць чамаданы, нейкія пакункі, папкі паперы. Усё запыленае, абчаплянае павуціннем.

— Гэтта і п'есы, і апавяданні, і аповесці, і нават раман... І вершы, вядома, ёсць. Але я не люблю вершаў пісаць! Словы гвалціць трэба, у рыфму ды ў рытм заганяць. А плацяць за вершы...— Сцяпан Радзівонавіч грэбліва скрывіўся.— Во, проза, гэтта іншае. Тут разгон, і, калі надрукуюць... адразу багач!

Гэтак жа жвава, увішна, як і падаставаў, Сцяпан Радзівонавіч пазапіхваў нагамі чамаданы, папкі і пакункі парыжэлай ад часу паперы пад ложак. І ўжо зноў быў ля стала, выліваў сабе ў шклянку тое, што асталося яшчэ ў паўлітэрцы.

— Ну што ж, вып'ем, каб я ўсё надрукаваў, што панапісваў, седзячы тут, у глушэчы...

І сам першы, не чокаючыся ні з кім, зноў выпіў, перакуліў да дна шклянку.

Закусваў цяпер павольней ужо і неяк бязладна — браў проста рукою то бабку, то сала, то агурок, то хлеб. І, пхаючы ў рот, жуючы, не змаўкаў, гаварыў і гаварыў:

— Упэўнены я, уцяру багата каму нос сваёю прозаю. За пояс пазатыкаю! Бо ў мяне... У мяне... Лепшае, чым у вас,— быццам спрачаўся з некім, даводзіў сваё Сцяпан Радзівонавіч.— Забраліся на сталічны Алімп, таленавітых пісьменнікаў пазнішчалі, у Сібір пассылалі, а сябе багамі аб'явілі... А на самай справе... Аднадзёнкі. Во, во што вы пісалі! Зад уладзе лізалі...

Аліна Сяргееўна, каб не адчуваць сябе зусім чужой, перапыніла Сцяпана Радзівонавіча, спытала:

— А вы... Пасылалі... Ну тое, што пісалі... У часопісы, у газеты?

— А як жа — пасылаў! Дык мне... Адказік на паўстаронкачкі. «Паважаны таварыш Кухта! Вашы творы друкаваць нельга — яны слабыя, маламастацкія. Чытайце Пушкіна, Коласа, Горкага, вучыцеся...» Во і ўсё. Але я стрэлены верабей, мяне мякінаю не падманіш! Ведаю, усё ведаю! Бо

калі б надрукавалі мае творы... Усе ўбачылі б, хто пісьменнік, а хто... Хе-хе! Я лепш за ўсіх пішу, таму мяне і трымаюць, не пускаюць. Пусці мяне, дык самім дзе дзецца?.. Але ўсё, скончылася іхняе, пачынаецца маё, маё!

І Сцяпан Радзівонавіч раптам грукнуў кулаком па стале.

— Вам, вам адным прызнаюся. Быў я ў немцаў сёння, у каменданта самога іхняга. Лагодны, культурны чалавек, хоць з выгляду і грозны. І ведаеце, што ён мне сказаў? Немцам трэба людзі, якія б іх падтрымлівалі, шчырыя працаўнікі трэба. Беларусаў яны любяць. Адразу пасады прапаноўваюць. Хочаш рэдактарам газеты ідзі, хочаш на ніве асветы, хочаш у паліцыю... Словам, выбірай! Але я... Падумаю! У Мінск, у Мінск мне трэба! Сыты я, па самае горла сыты глушэчай! Прастор мне патрэбен! Выдавецтвы, часопісы, тэатр! Я хачу такое месца, каб і я далёка бачыў, і мяне каб бачылі. Таму я і не прыняў ні адной камендантавай прапановы, сказаў: «Я падумаю. Падумаю, гер камендант!» Вось так! А вы, вы ўцякаць сабраліся? Ды жыццё ж, жыццё пачынаецца! У бібліі, у святым пісанні, сказана: «І прыйдзе дзень...» Вось ён, той дзень, і прыйшоў...

І арлом паглядзеў на Андрэя Макаравіча і Аліну Сяргееўну, звысака акінуў іх вачыма.

— Пачуеце, яшчэ пачуеце, хто такі звычайны вясковы настаўнік — Сцяпан Радзівонавіч Кухта!

Андрэй Макаравіч, а за ім і Аліна Сяргееўна пападымаліся з-за стала, адчулі: пара пакінуць гэтую хату, выйсці на свежае паветра.

## XXI

*З дзённіка Тасі Несцяровіч*

Татачка, вось мы і ў Мінску. Але радасці ў нас няма. Дом, у якім жылі,— у руінах. Кажуць, у першыя дні вайны ў яго трапіла бомба. Нічога нам з маці не шкада з таго, што ставалася ў кватэры. Ліха з ім, з усім. Маці кажа: жылі б толькі мы самі, было б здароўе, а астатняе ўсё... Будзе, нажывём! Баімся толькі аднаго: а раптам ты, татка, быў у доме, у кватэры нашай, калі трапіла туды бомба? А магло ж такое быць. Цябе, скажам, выпусцілі напярэдадні вайны, і ты начаваць дадому, у сваю кватэру... Страшна нават падумаць!.. Ой! Што заўгодна, толькі не тое!..

Наогул мы з маці адчуваем сябе ў Мінску, як не ў род-

ным горадзе. Мо таму, што ўсюды, на кожным кроку, разбурэнні, цэгла, сляды агню і пажару. На месцы пединстытута — каробка з выбітымі, задымленымі вокнамі. У руінах і універсітэт. На слупах, скрыжаваннях вуліц — розныя нямецкія загады, распараджэнні, напісаныя па-руску, па-беларуску, па-польску і па-нямецку. І за ўсё, за самую дробязную правіннасць,— расстрэл. Твары ў людзей зямлістыя, закамянелыя. Але ёсць і радасныя. Апошняга ніяк мы з маці зразумець не можам — чаму сярод нашых людзей ёсць задаволеныя, радасныя? Няўжо былі такія, што чакалі немцаў?.. Не паверу, не магу паверыць у гэта!..

Зусім іншае — немцы. Ім ёсць чаму радавацца. Адчуваюць сябе як заваёўнікі. Ходзяць, шпацыруюць на вуліцах, усміхаюцца, рагочуць. І з імі... Татка, ты можаш мне не паверыць, але гэта праўда, ведаеш, хто ходзіць... Нашы дзяўчаты. Подручку ходзяць. Нямнога такіх, але ходзяць. Апускаюць долу вочы, калі сустракаюць каго-небудзь з нашых людзей,— сорамна, але... Трымаюцца подручку, не адыходзяць, не аддаляюцца ад немца. Якая ганьба! Як можна дажыць да такога, як можна так нізка ўпасці!..

У горадзе шмат пустых кватэр. Людзі пакінулі сваё жыллё, усё, што было нажыта, і паўцякалі. Але ёсць і такія, што асталіся, жывуць у горадзе. І вось удзень быццам ўсё нармальна, калі толькі можна назваць нармальным тое, пра што я толькі што табе гаварыла. А як змяркаецца... Ажывае горад. Чуюцца тут і там стрэлы, выбухі. У пакінутых людзьмі дамах шнырацюць зладзеі. Зрываюць замкі, ломяць дзверы, шастаюць па кватэрах, валакуць на сабе хто шафу, хто адзежу, хто кніжкі... І гэта — гэта нашы, нашы людзі! Для адных вайна — гора, для другіх — нажыцца б!

Залез уночы і да нас у кватэру, дзе мы з маці асталяваліся жыць, нейкі зладзюга. Маленькі, шчупленькі і... п'яны. Узламаў дзверы і залез. Убачыў перапалоханых нас і разгубіўся. «А я думаў, гаспадароў няма! Выбачайце!» І знік. Бачыш — нават сумленне ёсць, культурны. А мы з маці да самай раніцы не спалі. Ды і як заснеш! Дзверы ж незамкнутыя, а раптам яшчэ які нечаканы начны госць завітае! Што захоча, тое і зрабіць можа. І ты маўчаць будзеш, не пікнеш нават нідзе. Міліцыі не выклічаш, у суд не падасі... Вось да чаго мы дажыліся, татка! Страшна, жудасна, як падумаеш, уявіш!

Уночы мы на кватэры, а ўдзень па горадзе ходзім, цябе шукаем. Раптам сустрэнемся выпадкова, раптам ты нас таксама шукаеш? Можа ж, можа ж такое быць! Ох, каб было! Я так, так хачу гэтага. І маці таксама хоча. Ды і ты напэўна ж!

Перабралі мы ўсіх тваіх знаёмых, у многіх пабывалі на кватэрах. Некаторых няма ў горадзе, тыя ж, хто ёсць, нічога, кажуць, пра цябе не ведаюць. Не бачыў ніхто з іх цябе ні перад вайною, ні ў першыя дні вайны. Няўжо, татка, цябе так і не выпусцілі, няўжо пагналі дзе-небудзь на ўсход? Не, не магло, не магло такога быць! Ты ж невінаваты, ані невінаваты. У гэта я верыла і веру, як верыла і веру ў тое, што разабраліся з табою. Павінны былі разабрацца! Справядлівасць і праўда заўсёды бралі верх.

Сёння маці ўспомніла пра Лапіцкіх. Вось хто павінен больш чым хто ведаць пра цябе. Ды і пра нас Лапіцкі ведаў, дзе мы. Ён жа ў Вялікім Лесе лекцыю чытаў, і маці яго бачыла. І ён тады праз іншых людзей перадаў, што ты, татка, у Мінску, цябе нікуды не вывозілі. Але ці дома Лапіцкія? Ці ў Мінску яны? Заўтра ж пойдзем да іх. А раптам яны ведаюць хоць што-небудзь пра цябе, раптам скажуць, дзе ты. Вось бы ўжо была радасць! А то... Столькі прайшлі мы, столькі напакутаваліся, і што... Дарэмна? Не, не, татка, хочацца спадзявацца, верыць — недарэмна! Сёння б, сёння б да Лапіцкіх пайшлі, не адкладвалі б на заўтрашні дзень. Але нельга — каменданцкі час ужо. І з дому на вуліцу... Лепш не патыкацца. Зловіць патруль — канец. Ды і лавіць не будзе — стрэліць, і гатова. Вось так, татка.

Пакуль жа бывай!..

## XII

Дождж сеяўся, церусіў усю ноч і амаль увесь наступны дзень. Перашчук, аціх толькі пад вечар, калі Іван Дарошка падыходзіў да Вялікага Лесу. Адразу ж распагодзілася, неба агалілася ад хмар, выбліснула сонца. Быццам перарадзілася, ажыло ўсё навокал — птушкі, раса на траве, ды і сама трава зазелянела, нібыта вясною.

«Вось нешта б такое жыватворнае, гаючае і людзям цяпер... Каб абнадзеіліся, у сябе паверылі зноў!» — падумаў Іван.

Але менавіта што б такое даць ці зрабіць людзям, каб

яны абнадзеіліся, паверылі ў сябе, Іван нічога прапанаваць не мог. Ведаў — такім дажджом, такім жыватворным гаючым бальзамам магла быць толькі перамога над ворагам, выгнанне яго з роднай зямлі, канец вайны.

«Пакуль жа гэтага няма, нішто не абнадзеіць людзей. І таму... Трэба набліжаць перамогу, змагацца за светлы, радасны дзень...»

Яшчэ шпарчэй закрочыў па сцежцы, што, звіваючыся між куп'я, вяла да людскіх гародаў, а там, нырнуўшы ў кусты, і на выбоістую, каляіністую дарогу.

«Куды я спяшаюся?» — спытаў раптам сам у сябе Іван.

Спыніўся, падняў галаву, паглядзеў на вёску. Родную, знаёмую змалку вёску, дзе нарадзіўся і вырас, дзе спазнаў столькі ўсяго добрага і горкага, радаснага і крыўднага. Аж слёзы нагарнуліся на вочы, сціснулася сэрца, калі падумаў:

«Жыла ў вёсцы жонка, сям'я — і думкі нават такой не ўзнікала, куды падацца, да каго ісці. А няма іх... І... што, няўжо няма да каго ісці?» — аж спалохаўся Іван.

Вёска, асветленая познім, амаль ужо вечаровым, але ўсё яшчэ зыркім, хоць і нізкім, сонцам, ляжала, гарбацілася на пагорку, уся ў зяляніне садоў, вялікая і... чужая. Ніхто ў ёй не чакаў Івана, ніхто не прасіў, каб ён спяшаўся.

«Як, няўжо няма ні аднаго блізкага мне чалавека, ні адной душы?» — пытаў і пытаў у сябе Іван.

І цёр у бяссіллі лоб даланёю Іван, капаўся і капаўся ў закарвашах памяці, сілячыся даўмецца, да каго б можна было зайсці, хто б чакаў яго ў вёсцы.

«Да бацькі не зойдзеш... А...»

Не было, не было да каго заходзіць Івану.

«Як жа я адзінока жыў!.. Ні аднаго сябра, ні аднаго блізкага чалавека! Усё заняты і заняты, праца і праца...»

І тут жа адчуў: няпраўду сам сабе кажа, маніць.

«Праца ніколі не аддаляе людзей. Наадварот, збліжае... Проста не туды глядзеў. Багавік, Гудоў цягнулі ўвесь час да сябе. Рабочы клас... А сялянства... Сялянства — уласнікі. Патэнцыяльна новыя эксплуататары. Дай ім магчымасць, і яны могуць горшымі яшчэ стаць за тых, што былі, якіх прагналі, скінулі са сваёй шыі... Дый... Як чалавек я... Мала ў мяне, мабыць, таго, што людзей прываблівае, не ўмею, каб да мяне гарнуліся... І мне трэба было сказаць пра гэта. Шчыра сказаць, прызнацца...»

«Каму сказаць, каму прызнацца?..»

«Таму, хто пакідаў тут... Багавіку».

«Багавіку? Але Багавік мяне ведае...»

«Багавік ведае як кіраўніка, які не схібіць, які заўсёды праводзіў і правядзе лінію партыі... А на чыста чалавечыя якасці... Не зважаў. А я... Адарваўся ад людзей... Нават са сваім спадручным, Васілём Кулагам...»

Успомніўшы Васіля Кулагу, павесялеў Іван Дарошка.

«Не, з Васілём Кулагам якраз у мяне і не благія адносіны. Не сяброўскія, але тым не менш... Ды і са старшынямі калгасаў... Максімам Варывончыкам... Петрусём Хамёнкам... Здаецца, паразуменне было. Васіль жа за апошнія дні, здараецца, і душу раскрывае...»

Да яго, Васіля Кулагі, і пакіраваўся Іван Дарошка. Не дадому, у хату, а ў калгасную кантору — Васіль Кулага меў звычку заседжвацца таксама на працы позна.

Іван не памыліўся — Васіль Кулага быў у канторы. Сустрэліся як даўнія сябры. Паціснулі адзін аднаму рукі, ледзь не абняліся.

— Дзе ты быў? — пытаў Васіль, не спускаючы з Івана сваіх глыбокіх, праніклівых вачэй.

— Жонку, дзяцей вазіў.

— Да яе бацькоў?

— Ага.

Васіль, пачуўшы гэта, апусціў долу вочы.

— А мае... Нізашто не хочуць нікуды ехаць адсюль,— прызнаўся. І ўздыхнуў. Цяжка, скрухліва.

Каб хоць трохі суцешыць Васіля, Іван сказаў:

— Яно не ведаеш, дзе лепей будзе. Там ці тут. Ніколі не ведаеш наперад.

— Яно-то так,— згадзіўся з Іванам Васіль.— І разам з тым... Можа б, спакайней на сэрцы было, каб яны кудынебудзь з'ехалі...

Памаўчаў, сеў за стол, за якім толькі што сядзеў, калі ўвайшоў Іван у кантору, пачаў спахапліва збіраць са стала, засоўваць у шуфляду нейкія ведамасці.

— Што ты тут робіш? — спытаў Іван, каб перавесці размову на іншае.

— Ды вось, спісы праглядваў.

— Якія спісы?

— Ды-ы... Ведаеш...—не падымаў на Івана вачэй, глядзеў у стол Васіль.— Вырашылі калгас распусціць.

— Як распусціць? — здзівіўся Іван.— Хто вырашыў?

— Ды-ы,— усё не глядзеў на Івана, не падымаў вачэй Васіль.— Праўленне. Тыя, хто астаўся з праўлення,— удакладніў Васіль праз хвіліну.— Толькі ты,— падняў нарэшце вочы Васіль на Івана, паглядзеў чакальна,— выслухай. Усё адно немцы не сёння-заўтра будуць тут, у нас. Навошта ж каб ім дабро наша дасталося? У інструкцыях тых, што мы з табою чыталі, сказана, каб ні аднаго зерня ворагу не трапіла...

— Там сказана: паліць, знішчаць усё трэба,— паправіў Іван Васіля.— Каб тая зямля, на якую ступіць вораг, мёртвая была...

— Але ж мы пакідаем ворагу не мёртвую зямлю. Астаюцца людзі. Нашы, савецкія людзі. Ім трэба будзе з нечага жыць, нешта есці. Дый... Мы з табою астаёмся. І нам трэба будзе нешта таксама есці. Дзе мы што возьмем? Вораг нас не накорміць. Хіба толькі... Свінцом. А людзі, свае людзі, калі, вядома, у іх саміх хоць што-небудзь будзе, падзеляцца. Усім падзеляцца. Дык... Зыходзячы з усяго гэтага, я сабраў сёння праўленне і склалі спісы. Размеркавалі, каму даць колькі авечак, каму колькі свіней, каму наогул што даць... Прычым даць з наказам: пойдуць адсюль немцы, прагонім мы іх — зноў у калгас усё вярнуць. Разумееш? Калгас распускаем на час... Толькі на час, пакуль тут вораг, немцы... Нават не распускаем, а як бы... Новую форму яму надаём...

У словах Васіля была логіка.

— А з бульбай як жа? З тым, што не абмалочана?

— Бульбу па сотках таксама падзялілі. Каму колькі скапаць... А з неабмалочаным? Малоцім пакуль што...

Бачачы, адчуваючы, што Іван, не вельмі задаволены рашэннем праўлення, Васіль узяўся горача пераконваць, зноў даказваць сваё:

— Разумееш? Калі мы гэта не зробім, людзі самі пачнуць хапаць... Што хто... Стыхія! Навошта нам гэта? А не паспеюць людзі гэта зрабіць, немцы ўсё забяруць... А так мы самі, Савецкая ўлада...

— Знішчыць, спаліць трэба!

— Іван, дык навошта ж знішчаць, паліць народнае дабро? Можна ж раздаць, схаваць. Што мы, не гаспадары хіба, не разумеем, як даецца кожнае зерне, як яно трэба!

Іван задумаўся. Была, была логіка ў Васіля!

— І калі ты думаеш пачаць гэтую... раздачу? — спытаў Іван.

— Заўтра ж! З самай раніцы...

— Ну што ж, паспрабуй зрабіць так,— не ўхваляючы рашэння праўлення, але і не адмяняючы яго, сказаў Іван.— Толькі...

— Ну? — падняў зноў вочы на Івана Васіль Кулага.

— Толькі спісы гэтыя... Ты з сабой забяры. Беражы, як зрэнку вока. Хавай. Да самай нашай перамогі хавай.

— А як жа! Я іх у зямлю закапаю. У слоік шкляны — і ў зямлю! — натхнёна сказаў Васіль.— І папярэджу ўсіх, сурова, каб бераглі тое, што бяруць, яно, маўляў, народнае, калгаснае!

## XXIII

Агульнага сходу вырашылі не склікаць. І часу не надта — немцы ж былі ў Ельніках! — ды і навошта галас падымаць, мітрэнгу лішнюю рабіць. Дамовіліся, узяўшы з сабой спісы, прайсціся ўсім праўленнем па хатах, пагаварыць з вока на вока з кожным. А раптам хто-небудзь не захоча браць да сябе калгаснае, раптам у чалавека нейкія іншыя меркаванні і планы?

Праўленцы сабраліся ля канторы. Ён, Васіль Кулага, старшыня, Аўдотка Дудава, даярка-перадавік, саламяная ўдава, якую пакінуў муж гадоў дзесяць таму назад з трыма дзецьмі, зусім маладая Дар'я Панасюк, звеннявая на льне, і два брыгадзіры — Ігнась Дранік і Рыгор Бяда.

— Адкуль, з якога канца пачнём? — спытаў, абвёўшы ўсіх вачыма, Васіль Кулага.

— Ды яно... Адусюль можна,— сказаў, зацягваючыся самакруткай, памяркоўны, заўсёды згодлівы на ўсё Ігнась Дранік. (Сапраўднае прозвішча ў Ігнася было Кудрыцкі. Але ў вёсцы ўсе, і дарослыя, і дзеці, звалі яго Дранікам — ад бацькі сыну мянушка перадалася. Кажуць, надта ж любіў той паўтараць, іншы раз без усякай патрэбы, словы: «Мяне, брат, за два дранікі не купіш, не-е, не купіш».)

— А я думаю, пачнём з маёй брыгады. З Зайчыкаў,— не згадзіўся з Ігнасём Дранікам другі брыгадзір, нядаўні старшыня, каржакаваты, стары ўжо, пры раскошнай сівой барадзе, Рыгор Бяда.

— Чаму ета з тваёй брыгады? Ды яшчэ з Зайчыкаў? — запытала, гнеўна ўставіўшыся ў Рыгора сваімі казінымі вачыма, сухарлявая Аўдотка Дудава.— Як працаваць, дык іх не выганіш. А як што даваць... Дык першым?

Рыгор Бяда ўсёй пяцярнёй пагладзіў сваю пакладзістую бараду, сказаў з годнасцю:

— Па-першае, ніхто не дае, а просяць узяць на захаванне, так сказаць, урэменна,— любіў Рыгор Бяда гаварыць не так, як у вёсцы, а хоць трохі, ды па-інакшаму.— Па-другое, калі Зайчыкі згодзяцца, дык па астатніх хатах і хадзіць няма чаго... Астатнія не адмовяцца, астатнія сазнацельныя...

У словах-разважаннях Рыгора Бяды была свая праўда. Ды і... З нейкай брыгады, з кагосьці пачынаць усё адно трэба было.

Вырашылі пайсці да Зайчыкаў.

Жылі Зайчыкі ў самым канцы вёскі, амаль на хутары, ля калгасных гародаў. Можна было трапіць да іх па вёсцы, але можна было і полем. Полем было зручней — дарога лепшая. Ды і ўсім праўленнем цягнуцца па вёсцы...

— Людзей раней часу насцярожваць не будам,— сказала Дар'я Панасюк.— Падумаюць бог ведае што...

— І то праўда,— згадзіліся з ёю.

Пайшлі полем.

Сонца, падняўшыся над лесам, біла проста ў вочы. Зямля пасля дажджу дыхала парнасцю, волкасцю. Як усё адно вясною. Чырыкалі вераб'і, шчабяталі, ганяючыся адна за адной у паветры, ластаўкі.

Дарога бегла спярша міма роўных загонаў бульбы, ужо месцамі пачарнелай і пажаўцелай, потым вывела на рыжую, залацістую пожню — ячменішча.

Ішлі ўсе моўчкі, быццам з могілак, з пахавання. І толькі Рыгор Бяда ўсё ўздыхаў і ўздыхаў. І чым далей ішлі, тым уздыхаў мацней, гучней.

— Што ета ты рассопся, не раўнуючы, як кузнечны мех? — азірнуўся, сказаў маладзейшы, а таму і больш вёрткі, увішны Ігнась Дранік — ён ішоў як не першы.

— Ты не засапеш,— аж пакрыўдзіўся Рыгор Бяда.— Табе абы клопат з галавы хутчэй збыць.

— Чаму ета мне клопат з галавы кеб хутчэй збыць? — аж спыніўся, паглядзеў прыжмураным вокам на Рыгора Бяду Ігнась Дранік.

— А таму, што ты і не хацеў етага клопату,— Рыгор Бяда гаварыў, што думаў: сапраўды, калі ў войска забралі Грышку Сапуна, Ігнась Дранік упіраўся, не жадаў прымаць брыгаду, быць, хоць і часова, брыгадзірам.

— Затое ты... Цябе хлебам не кармі, а дай людзьмі

пакамандаваць. Узрадаваўся. Забыў, што здымалі ўжо. Са старшынёўства. Хіба не помніш?

— Не здымалі, а папрасіўся я... Сам. Бо гады...

— Гады! А цяпер што — памаладзеў? Хі-хі...

— Не памаладзеў, а сазнацельнасці больш, як у цябе. Разумення...

Васіль Кулага паглядзеў на брыгадзіраў — то на аднаго, то на другога, маўляў, не трэба, і так у кожнага на душы... Хоць галасі.

Рыгор Бяда па-іншаму зразумеў старшыню.

— Я... Я, Васіль Цімохавіч,— пачаў ён, нібыта апраўдваючыся.— Я ўздыхаю во чаму... Зямля лемяха просіць, зерня... Жыта сеяць трэба. Паміраць збірайся, а хлеб... сей...

— Індывідуальна... Індывідуальна пасеем,— з падкусам, бо Рыгор Бяда любіў незвычайныя словы, сказаў Ігнась Дранік, выплёўваючы з рота і расціраючы абцасам бота недакурак.

— Індывідуальна, кажаш? — зразумеў па-свойму падкус Ігнася Рыгор Бяда.— Індывідуальна да баб... добра хадзіць. А сеяць... Сеяць трэба калектыўна... Талакою...

Васіль Кулага нічога не адказаў. Толькі галавою пакруціў, маўляў, не пачынайце зноў, сціхніце...

Сабіна — жонка Адама Зайчыка (сам ён, як і ўсе астатнія мужчыны, па мабілізацыі пайшоў у войска, на фронт) — была каля сажалкі, карміла гусей. Так што і ў двор, абнесены з усіх бакоў высокім, шчыльным парканам, з дубоваю брамаю, бы ўсё адно крэпасць, не трэба было заходзіць. Убачыўшы ля свайго двара столькі людзей, усё калгаснае начальства, Сабіна разгубілася.

— Што ета? — выпусціла яна гліняную міску з мешанкаю, што трымала ў руках.— Можа, Адама майго?..

Жанчына скрывіла твар, гатовая вось-вось загаласіць.

— Ды не бойся,— супакоіў жанчыну Ігнась Дранік.— Калгас раздаём.

— Як раздаём? — не зразумела Сабіна.

— А так... Немцы ідуць, то кеб не яны пазабіралі сабе, дык лепш сваім людзям,— тлумачыў ёй Ігнась. Сабіна павесялела.

— Што мне там? — падалася яна адразу ж бліжэй да Дар'і Панасюк — у руках у Дар'і была ведамасць.

— Тры авечкі, адно парася... І хлеба сто кеге,— прачытала хутка Дар'я Панасюк.

— Чаму так мала? — усклікнула Сабіна.— Як браць, дык забралі і пару валоў, і дзве каровы, і шэсцера авечак. А даваць...

— Ды ніхто табе нічога не дае,— астудзіў жанчыну Рыгор Бяда.— Проста даручаюць, просяць, кеб ты дагледала, што табе намецілі. А прагонім немца — вернеш назад у калгас...

— А-а! — расчаравана выдыхнула Сабіна. Пастаяла, падумала.— І ўсім будуць даваць етак, толькі на час немцаў? — спытала.

— А ты б хацела — назусім?

Аўдотка Дудава не любіла Зайчыкаў і не хавала гэтага.

— А калі немцы забяруць етых авечак? Ці падохнуць яны? — спытала Сабіна.

— Тады... Заяву на праўленне падасі, разбяром,— сказаў Васіль Кулага.— Выявім, па чыёй віне.

— Дык яно можа і віны не быць нічыёй, а тым часам...

— Не хочаш — не бяры! — каб спыніць усякія размовы, адрэзала Аўдотка Дудава.— Гандаль, базар тут устроіла...

— Ах, так!.. Няхай, я згодна ўзяць...

— А аддаваць згодна будзеш? — зноў уставіла сваё Аўдотка Дудава.

— Аддам. Як усе людзі, так і я. Не думайце, што я горшая за ўсіх. Ета Адам мой у калгас не вельмі хацеў. А я...— пачала апраўдвацца жанчына.

Але яе ўжо не слухалі — кіраваліся да іншай суседняй хаты — да Пархвіра Рыкуля.

— Калі ж прыходзіць? — крыкнула наўздагон Сабіна і, мусіць, здагадаўшыся, што яе не зразумелі, дадала: — Браць калі тыя авечкі?

Праўленцы спыніліся, пераглянуліся. Выручыў усіх Рыгор Бяда — ён ведаў больш, чым хто, людзей сваёй вёскі.

— Калі Зайчышыха згадзілася, то да астатніх можна і не заходзіць. Толькі аб'явіць. Згодзяцца,— сказаў ён.— Зараз і хадзем,— крыкнуў ён Сабіне.

— Дык я хіба пераадзенуся?

— І так пазнаюць. Не ў госці,— не змаўкала злосная на язык Аўдотка.

У астатніх хатах браць на час немцаў на захаванне

калгаснае дабро згаджаліся хутка, без усякіх угавораў. Праўда, некаторыя казалі:

— Чаму ж так мала? Можна і болей.

Іншыя наадварот, прасілі меней, скардзіліся, што даглядаць няма каму.

Ад адных адымалі, другім дадавалі. І ўсе, усе дружна далучаліся да праўленцаў, ішлі па вёсцы бліжэй і бліжэй да калгаснай сядзібы. Людзей вакол праўленцаў большала і большала, нікому і тлумачыць не трэба было, пераконваць — самі адзін аднаму і тлумачылі і пераконвалі...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

К вечару ад вялікай гаспадаркі калгаса «Чырвоны Лес» асталіся толькі будынкі — кантора, кароўнік, стайня, аўчарня, свінарнік...

## XXIV

Сустрэліся, як і дамаўляліся, уночы. На ўзлеску, паблізу дарогі, што вяла з Вялікага Лесу ў Гудоў. Падалі адзін аднаму рукі.

— Ну як твая раздача? — спытаў Іван у Васіля.

— Лепш, чым мы думалі,— адказаў радасна Васіль. Ён і праўда думаў, што раздача пройдзе не так арганізавана. І цяпер быў задаволены і не хаваў таго.— Людзі падабрэлі за вайну, разумеюць многае,— дадаў ён праз хвіліну.

— Так лічыш? — Іван як бы насміхаўся.— Браць заўсёды лягчэй, чым аддаваць. Дый... Кожны, мусіць, мяркуе: аддаваць ці давядзецца, а вазьму, дык будзе...

— Ты селяніна недаацэньваеш, бачыш у ім толькі ўласніка,— не вытрымаў, сказаў, што насіў даўно на душы, Васіль Кулага.

— Сам ведаю сваю слабасць,— ані не пакрыўдзіўся Іван.— Думаў я пра гэта. І пра другое таксама думаў...

— Пра што — другое? — насцярожыўся Васіль.

— Глупства мы, брат, з табою зрабілі.

— Якое глупства?

— Ды з гэтай раздачай.

— Чаму?

— Ды таму, што немцы не такія дурныя, як мы ўяўляем. Хто, скажы, забароніць ім, прыйшоўшы сюды, загадаць здаць усё тое, што ты сёння раздаў, га?

Васіль зніякавеў. Пра ўсё, пра ўсё, здаецца, думаў, з усіх бакоў абмазгаваў, перш чым рабіць. І раптам...

— Пра гэта я не падумаў.

— Не падумаў, кажаш? А і не трэба было думаць. Там,— паказаў ён рукою на ўсход, не то на Мінск, не то на Маскву,— людзі з галовамі сядзяць, яны пра ўсё падумалі. І нам... Думаць няма чаго. Выконваць трэба, што загадваюць.

Васіль пакруціў галавою. Засоп.

— Выконваць, можа, і трэба. Але думаць таксама трэба.

— Ты што, яшчэ сумняваешся? У чым ты сумняваешся?

— У правільнасці... Загаду таго... Дзе... Усё знішчаць, паліць,— шчыра прызнаўся Васіль.

— Я таксама спачатку... Не тое каб сумняваўся, а не паверыў... А потым... Не-е, тыя, хто аддаваў загад, усё ведаюць. На сто гадоў наперад ведаюць. І нам... Не самадзейнасць трэба разводзіць, а слухаць, выконваць, што разумныя людзі раяць, кажуць...

Памаўчалі.

— Гэта... Што немцы могуць забраць усё калгаснае... У людзей... Пра гэта ты сам, сам дадумаўся? Ці падказаў табе хто? — спытаў раптам, нібы апамятаўшыся, Васіль.

— Якая розніца? Сам ці падказаў хто?

— Не, розніца ёсць. Ёсць! — як не закрычаў Васіль.

— Ну калі ёсць, дык скажу: сам я дадумаўся...

— Тады ў цябе галава... Варыць... Так, праўду ты кажаш. Каб людзей супраць сябе не настройваць, іх спачатку не будуць абіраць. А калгаснае аддай... Усё чысценька, што узяў, аддай...

Нейкі час стаялі зноў ціха — маўчалі. Толькі цяжкацяжка абодва дыхалі.

— Усё раздаў? — парушыў гэты раз першы маўчанне Іван.

— Ды... Бадай што... Калі не лічыць чатырох сціртаў. Абмалаціць не паспелі...

— Давядзецца іх... Спаліць...

— Спаліць? Што ты! Мы іх... абмалоцім...

— І хлеб што — зноў раздасі людзям?

Было цёмна, але Васіль убачыў, як блікнулі ў Івана вочы. Ведаў: у Івана заўсёды блішчаць вочы, калі ён злосны.

— А што ты прапануеш?..

— Ды не я прапаноўваю. Радзіма, партыя прапаноў-

ваюць. І не прапаноўваюць — загадваюць. Спаліць, знішчыць...

Зноў доўга стаялі, стоена маўчалі.

— І завод трэба спаліць. Гэтым я займаўся. Сёння цэлы дзень. І заўтра буду займацца. Гатовыя вазы, дошкі, абады, панарады... Яны згружаны ў адно месца, згараць. Катлы, трубы сталёвыя... З гэтым цяжэй... Маракуем вось, як і іх заадно вывесці са строю. Пакуль немцаў тут няма яшчэ. Бо як прыйдуць... Тады цяжэй усё рабіць будзе...

Іван гаварыў паволі, з роздумам.

— Таксама, як і ты, я намеркаваў сёе-тое людзям надзейным раздаць, каб схавалі. А вартаўнік і кажа мне: «Схаваць-то мы схаваем. А як немцы шукаць пачнуць, га?» Вось тады я і пра калгаснае дабро ўспомніў... Могуць немцы назад пазабіраць у людзей тое, што ты параздаваў? Могуць, га?

Іван глядзеў проста ў вочы Васілю, дыхаў яму ў твар — адчувалася, і сам не быў да канца ўпэўнены ў тым, пра што гаварыў.

— Могуць! — выціснуў з сябе Васіль.

— Вось бачыш! А ты малаціць яшчэ збіраешся! — І вусны ў яго дробна-дробна задрыжалі.— Ды калі да райкома, да Багавіка дойдзе...

І не дагаварыў. Сам перапыніў сябе:

— Ды не ў Багавіку, не ў райкоме справа... Справа ў ворагу, у немцах. Кожную нашу памылку яны скарыстаюць супраць нас жа. Вырашаецца лёс краіны, улады нашай. А мы?..— Іван сціснуў зубы, не ведаў, што і казаць.

— Калі ты завод будзеш паліць? — спытаў Васіль, каб пазбыцца цяжкага маўчання.

— Заўтра ўночы. У дзве гадзіны ночы, каб быць дакладным. А ты... У гэты самы час сцірты падпаліш. І сыдземся зноў тут, на гэтым месцы...

І, не развітваючыся, не падаючы Васілю рукі, Іван павярнуўся і пайшоў. Пайшоў некуды да Гудова, не па дарозе — па лесе.

Цемра хутка паглынула яго між ствolля дрэў.

## XXV

Як ні добра жыць у лесе, а ў вёсцы, дома, у сваёй хаце,— лепш. І ядa вараная, смачнейшая, і пасцель цёплая, мяккая. Ды і жонка, дзеці побач: калі што якое — і пачуюць, і папярэдзяць. А ў лесе што? Ні паесці, ні паспаць.

Ды і ад камарэчы проста паратунку няма. Восень хутка, а гнюсі гэтай як усё адно хто знарок напладзіў — вочы засыпае. І каб жа толькі вочы засыпала. А то ж... І кусаецца, ліха на яе. Так кусаецца, што месца жывога на целе проста нідзе няма. Зудзіць, брыдзіць, хоць ты скуру з сябе пазногцямі здзяры. І Яўхім Бабай паступова перабіраўся зноў жыць у вёску. Спярша прыходзіў толькі па харчы, потым начаваць, а з тыдзень ужо і зусім дома, у сваёй хаце асталяваўся. Яшчэ, вядома, пабойваецца выходзіць на людзі, ліха ведае як хто паставіцца да гэтага, пытаць будуць, дзе быў, чаму на мабілізацыю не з'явіўся. А сказаць... Што ты скажаш людзям? Міліцыі, улады быццам няма, а тым часам хто ведае, як яно можа ўсё павярнуцца. Асцярожнасць нікому яшчэ не пашкодзіла. Лепш перачакаць, не паказвацца, пасядзець непрыкметненька, ціхенька. І так хвала богу, што пранесла, абышлося. А магло ж, магло... Ой, што магло быць! За тое, што ён, Яўхім Бабай, ад мабілізацыі збег, па галоўцы не гладзяць. Не, не гладзяць!

У той ранак Яўхім таксама быў дома, сядзеў, паснедаўшы, ля акна, надта не набліжаючыся, і прыглядаўся, што на вуліцы робіцца. І ў першую хвіліну не зразумеў, якія гэта людзі ля Зайчыкавага двара стаяць, чаму яны там сабраліся. У хату не ўбегла, а ўляцела перапалоханая Сонька — хадзіла на гарод траву цяляці жаць.

— Хавайся! — як не залямантавала яна спалоханым голасам.— Шукаюць!..

— Каго шукаюць?

— Мусіць, Зайчыка. Васіль Кулага, з панятымі...

Думаць не было калі. Бегчы... Але куды, куды бегчы? На гарод, у лес? Убачаць. У хлеў? Таксама можа хто-небудзь згледзець — дзень жа на двары. У сенцы? На гарышча? А можа... Пад печ?

Адну, здаецца, адну хвіліну быў у нерашучасці, раздумваў Яўхім Бабай. А колькі чаго перабралася, пранеслася ў галаве! Усё мільгала перад вачыма, як у калейдаскопе,— гарод, хлеў, сенцы, гарышча... Не, лепшай схованкі, як у хаце, у падпеччы, усё ж няма...

Шуснуў пад печ. А ўжо адтуль, з падпечча, Соньку папрасіў, каб яшчэ і лаз засланкаю прыкрыла.

Пад печчу — цёмна. І даволі няўтульна, смуродліва — куры, каб на іх халера, панапаскуджвалі, калі зімою, у маразы вялікія бралі ў хату начаваць. А тут яшчэ дзеці ўсхадзіліся — па хаце бегаюць, пытаюць у маці, чаму бацька пад печ палез.

— Што, ён курэй там ловіць?

А маленькая Танька да лаза падышла і:

— Татка, агу!

Закрычаў з-пад печы Яўхім Бабай як рэзаны:

— Сонька, дзяцей з хаты павыганяй! Бо як зойдуць... Прапаў...

Павыганяла, павыводзіла з хаты дзяцей Сонька, хоць тыя нікуды з домуісці і не хацелі.

А Яўхім, пачакаўшы трохі, зноў крычыць з-пад печы як рэзаны:

— Сонька-а! Сонька-а!

— Чаго табе? — адзываецца Сонька.

— Ты што ў хаце сядзіш? З дзецьмі куды-небудзь пайдзі. У лес ці на гарод. Бо калі на вуліцу пакажуцца — разбрэшуць, параскazваюць усім, дзе я...

Пабегла Сонька з хаты, дзяцей пасклікала, некуды сышлі з двара. А Яўхіму пасля гэтага і яшчэ цяжэй. Чортведама што думай! Бо і запытаць няма ў каго, дзе той Васіль Кулага з панятымі, да каго яшчэ ў двор ці ў хату заходзяць, што шукаюць, каго ці што бяруць.

Хвіліна гадзінай доўжыцца. І сэрца... Тук-тук, тук-тук... Ніколі яшчэ так не білася ў Яўхіма сэрца. Ад страху гэта ці мо... што паветра ў падпеччы такое застаялае, смярдзючае.

Дзверы ў хату адчыніліся, крокі па падлозе — масніцы рып-рып. Умлеў Яўхім, затаіўся, да зямлі прыпаў. Не дыхае, здаецца.

«Хто? Няўжо Кулага?»

— Яўхім, Яўхім?

Голас, здаецца, жонкі, Сонькі.

— Што табе? — прамовіў са страхам.

— Міма нас прайшлі, не заходзілі,— адказвае таксама таямніча, шэптам жонка.

— А шукаюць чаго, не ведаеш?

— Не, не ведаю. На вуліцу не выходзіла, не пытала.

— Ідзі папытай.

Пайшла Сонька, дзверы за сабою ціхенька зачыніўшы.

А Яўхіму зноў чакай, зноў хвіліна гадзінай доўжыцца.

Аж во, нарэшце, весніцы зарыпелі, крокі пачуліся. Спасцярожлівыя, знаёмыя. Соньчыны. Бліжэй, бліжэй. Вось ужо ў сенцах. Клямка клямкнула, дзверы...

— Ну што? — шэпча, пытаецца з-пад печы Яўхім.

— Калгас раздаюць.

— Што-о?

Уміг вылез з падпечча. Брудны, увесь у пяску, курыным памёце, пер'і.

— Як раздаюць?

— Каму авечак, каму парасят... А каму... І бычка, цялічку...— тлумачыць мужу Сонька.

— А нам?..

— Нам нічога.

— Чаму ета нічога?

— Таму што мы не калгаснікі.

— Як? — ледзь не раве Яўхім.— Дык як не калгаснікі, дык і нічога не даюць?

— Ты не мне крычы! Ты на іх, на іх накрычы,— ківае, паказвае галавою на вуліцу Сонька, таксама злосная, што нічога не перападае з раздачы калгаса, і выходзіць з хаты, ляскае дзвярыма, аж шыбы ў вокнах трымцяць.

А Яўхім — да акна. Сядзіць, не зводзіць вачэй з вуліцы. Бачыць, як бягуць спачатку да калгаснага двара ўзбуджаныя людзі, потым, спагадзя некаторы час, вяртаюцца адтуль, хто з мяшком збожжа, хто вядзе на вяровачцы бычка, хто цялічку, хто гоніць авечак, свіней. І ўсе сабе ў двор. А яму, Яўхіму? Нічога, ані.

«Етак яны ўсё расцягаюць, размятуць... Нічога не астанецца. І дзе немцы тыя, чаму ў Вялікі Лес не ідуць? Кажуць жа, у Ельніках яны даўно. Бо як разбяруць усё з калгаса, тады... Не пажывішся. Выведзі што з людскога хлява?.. Ці з каморы вазьмі?.. Г-га!» — бурліць, аж гарыць усё ўсярэдзіне ў Яўхіма. І пытанне адно, адно мучыць: «Чаму немцы не ідуць?»

Ледзь вечара, ночы дачакаўся. А тады... Шапку на галаву, ды — ходу з хаты.

— Куды ты? — спытала, крыкнула наўздагон жонка, Сонька.

— Куды трэба,— буркнуў, адказаў Соньцы, каб адчапілася, не прыставала, Яўхім.

І пайшоў, як здань знік з двара.

## XXVI

Ведаў, адчуваў Васіль Кулага — нялёгка, нялёгка будзе зрабіць тое, што прасіў, загадваў Іван Дарошка, што трэба было, абавязкова трэба было зрабіць да прыходу ў Вялікі Лес немцаў. Але не ўяўляў, не ўяўляў Васіль, што зрабіць тое будзе так цяжка. Шосты ці сёмы раз даставаў ён, затуліўшыся за сцірту з таго боку, дзе быў лес і адкуль

быццам падзімаў, дыхаў ветрык, карабок з запалкамі, і кожны раз палохаўся таго, што трэба было рабіць.

— Ай-яй,— шаптаў Васіль сам сабе.— Гэта ж столькі збожжа! Каб змалаціць, людзям раздаць...

«А немцы забяруць у людзей!» — чуў ён, гучаў у вушах Іванаў голас.

Зноў і зноў даставаў Васіль з кішэні запалкі, зноў і зноў браў у рукі карабок. І зноў, пачакаўшы, падумаўшы, хаваў, засоўваў яго ў кішэню.

Над лесам, над полем, над вёскаю, над усім наваколлем плыла ноч. Цёмная, чорная, як сажа. І ціха-ціха было, нават быццам трохі вусцішна — усё спала, спала моцна, беспрабудна, толькі мышы пішчалі, шасталі ў саломе.

«Да чаго дажыліся?.. Сеялі, даглядалі, жалі, збіралі... А цяпер... Палім... Самі, сваё палім...»

Усплыло ў памяці чамусьці даўняе, чытанае яшчэ некалі ў школе. «Усяму свой час, і час усякай рэчы пад небам... Час нараджацца, і час паміраць; час садзіць, і час вырываць пасаджанае...»

Ніколі, ніколі Васіль Кулага не згадваў гэтых слоў, а цяпер вось згадаліся. Самі сабой згадаліся. І зніякавеў, засаромеўся Васіль.

«Знайшоў мудрасць... І дзе?.. Не дзіва, што шкадаваць пачаў... Усяго, усяго шкадаваць — і людзей, і жывёлу, і вось збожжа...»

«Але і не шкадаваць нельга»,— супраціўлялася, не хацела згаджацца з ім нейкая як бы чужая думка.

«Шкадаваць можна. Але не так, як ты шкадуеш. І не ўсё, усяго?»

Не мог, не мог Васіль Кулага сабе дараваць, што паслухаўся не розуму, а сэрца, паддаўся на ўгаворы праўленцаў, раздаў людзям калгаснае дабро.

«А раздаваць не трэба было. Ні ў якім разе»,— да такога вываду прыходзіў Васіль Кулага пасля размовы з Іванам Дарошкам, чым больш і больш думаў над тым, што зрабіў.

«І як гэта я даў такога маху?» — дакараў ён сябе.

«Але ж і паліць... Паліць дабро...»

Таксама не мог, не мог Васіль...

«Тут нешта не тое... Не так, не так».

Што — «не тое», «не так» — Васіль не ведаў. Таму і пакутаваў, таму і мучыўся...

— Пачакаю... Яшчэ пачакаю,— шаптаў ён час ад часу

і не зводзіў, не зводзіў вачэй, глядзеў на лес, туды, у той бок, дзе быў Гудоў, завод.— Вось як узаўецца, зачырванее зарыва над лесам, як запаліць Іван завод, тады і я... Сціρты падпалю... Бо паліць першаму... Не, не...

Зарыва над лесам узвілося. Нечакана, раптоўна і адразу на ўсё неба. Нават асобныя дрэвы на фоне зарыва таго былі відаць. Стаялі чорныя, быццам абвугленыя, і пакалыхваліся. А мо то зарыва пакалыхвалася, шугала? Аж адхіснуўся ад сціρты Васіль Кулага.

— Ужо! Гарыць! — прашаптаў, выдыхнуў з сябе.— Ды калі я прамаруджу... Людзі ў Вялікім Лесе папрачынаюцца. Мяне пад сціртаю ўбачаць... І тады? Што рабіць тады?..

Хутка-хутка, калоцячыся ўвесь ад невядомага нутранога ўтрапення, дастаў запалку, нават не адну, а адразу дзве, чыркнуў аб карабок — запалкі ўспыхнулі, загарэліся. Прыставіў іх да гузыра снопа, пад адну саломіну, пад другую, пад трэцюю. Язычкі агню заскакалі па гузырах, пабеглі вышэй, далей, глыбей. Чорныя, перагарэлыя ніткі саломы пачалі бяссільна звісаць, падаць долу.

«Гарыць? Гарыць!» — не паверыў, не то спалохаўся, не то ўзрадаваўся, Васіль.

Не помнячы, што робіць, выцягнуў са сціρты пук саломы, прыставіў да агню, запаліў. І так, з тым агняным пукам, нібы з паходняй, пабег да другой сціρты, што стаяла крокаў за дваццаць ад першай. Азірнуўся.

Першая сціρта палала ўжо, ахопленая доўгімі языкамі полымя. Вецер хапаў тыя языкі, абкручваў іх вакол сціρты, падымаў угору, зноў заварочваў, закручваў...

— Гарыць! Гарыць! — шаптаў Васіль і бег, імчаў з агнём да новай сціρты...

Сухая салома ўспыхвала ўмомант, ледзь толькі дакранаўся да яе агонь...

Сціρты скончыліся, не было іх больш у цемры, не натыкаўся на іх Васіль. Выпусціў з рук салому, адскочыў, пабег у лес...

...Іван Дарошка быў на ўмоўленым месцы, на ўзлеску, калі дабраўся, прыйшоў туды Васіль. Іван быў усхваляваны, узбуджаны.

— Ну, ну, руку дай,— шукаў у цемры Васілёву руку Іван.— Зрабілі, хоць нешта ды зрабілі! Паглядзі, святло якое навокал! Гарыць! І там, і там гарыць!

А Васіль... Стаяў перад Іванам, вялы, бездапаможны, і плакаў, як малое дзіця, наўзрыд.

— Чаму радуемся? Сваё, кроўнае, палім... І яшчэ... Радуемся!

Не ўстояў на нагах, паваліўся на зямлю, пачаў біцца, калаціцца ў роспачы, заходзячыся ад несуцешнага, вялікага, як сусвет, гора...

## XXVII

Пасля таго як Мікалай Дарошка пабываў у Мацея Тхорыка і даведаўся, што няма сына, Піліпа, забіла яго «бонбаю» на пераправе ля Дняпра, ён быў у жалобе. Сноўдаўся з кута ў кут па хаце, выходзіў на падворак, заглядваў у хлеў. Але нідзе не знаходзіў, што б узяцца рабіць. Дый ахвоты брацца за што-небудзь не было ніякай. Піліп, як жывы, перад вачыма стаяў — малады, яшчэ не жанаты, у ботах, што купіў быў, прывёз з Ельнікаў, з базару, ён, Мікалай, сыну,— стройны, плячысты, з усмешкаю радасці на твары...

«Хіба ўзяць ды на пераправу з'ездзіць? Паглядзець, дзе пахавалі Піліпа. І на свае могілкі перавезці...» — думаў Мікалай.

Схадзіў яшчэ раз да Мацея Тхорыка, распытаў, дзе «бонба» тая ўпала, дзе шукаць Піліпа.

— Дзядзька, не едзьце дарэмна,— астудзіў Мацей Тхорык Мікалая.— Усё адно нічога не знойдзеце. Там ямка. Толькі ямка. І больш нічога...

І гэтыя словы яшчэ большым каменем леглі на сэрца Мікалаю.

«Нават магілы няма... Не як чалавек быдта...»

Нішто, нішто не магло супакоіць, суцешыць Мікалая. Бо Піліпа таксама любіў Мікалай. Піліп быў першы, самы большы яго сын, ён павінен быў заняць месца бацькі, быць гаспадаром...

«Ды і жонка такая паскудная трапілася яму. Не жыў, а мучыўся... Дзяцей — і то не асталося...» — думаў і думаў пра сына Мікалай.

Са стану гора, жалобы не вывела Мікалая нават дзяльба калгаснага дабра. Безуважна выслухаў ён прачытаныя Дар'яй Панасюк словы, што павінен узяць сабе і захаваць, пакуль не вернуцца зноў нашы, пакуль не будзе зноў арганізаваны калгас. З усім згадзіўся Мікалай, адзінае, што папрасіў, дык гэта бычка.

— Бычка дайце мне,— сказаў Васілю Кулагу.

— Нашто табе той бычок? — спытаў Васіль.

— З бычка волік вырасце. Хоць дроў будзе на чым прывезці. Дый поле пераараць. Бо сам я... Стары, нездаляшчы... Піліпа ж, сына, чулі, мусіць...

І адвярнуўся, не вытрымаў — заплакаў.

Васіль Кулага ўважыў, даў Мікалаю бычка. І не аднагодка, а трацячка. Так што яго можна было хоць сёння ў барану ці ў плуг запрагаць. З ім, гэтым бычком, і важдаўся ўсё часцей і часцей Мікалай Дарошка. І не толькі сам, але і Косціка да бычка прывучаў.

— Хопіць табе абы-дзе валэндацца, байбусаваць, за дзела бярыся,— казаў бацька сыну.

Косцік слухаўся бацькі, нікуды з дому не адлучаўся — ведаў: і так вінаваты, добра, што за тое — за карты і грошы — не ўляцела. Ды і смерць Піліпа ўразіла, гняла...

Вывела з сябе, узлавала Мікалая, што сцірты неабмалочаныя нехта ўночы падпаліў.

— От жа скажы, якія кальвіны е! Кеб людзям не аддаць, дык лепш у глум, у агонь ды ў дым! — лаяў ён тых, каго і сам не ведаў, водзячы за паналыгач бычка па двары — сам па адзін бок, Косцік па другі.— Во так усё папаляць. Не агледзішся, як папаляць...

Бычок тузаўся, не хацеў хадзіць на паналыгачы. Круціў галавою, пароў паветра рагамі, шукаў вачыма, каго б баднуць...

— Ац, ац! — камандаваў Мікалай.— Кса, кса, кеб цябе!..

Адчыніліся весніцы — у двор зайшоў Яўхім Бабай. У ботах, белай вышыванай кашулі, без пінжака.

— Эй,— крыкнуў Мікалаю.— Кеб заўтра стол на вуліцы ля брамы стаяў, ручніком засланы. І на ім хлеб-соль...

— Чаму ета? — адвёў вочы ад бычка, паглядзеў, быццам здзіўлены, на Бабая Мікалай: адкуль, маўляў, ты ўзяўся, чалавеча?

— Немцы прыедуць. І ў каго стала ля брамы не будзе з хлебам-соллю, таго страляцьмуць.

Мікалай памаўчаў, патупіў у зямлю вочы. Усё ж не сцярпеў — яшчэ адно пытанне Бабаю кінуў:

— А чаму ета ты загадваеш? За брыгадзіра хіба ў іх?

Яўхім Бабай успыхнуў:

— Таму... Таму што кончылася вашае, Дарошкавае... Хопіць вам камандаваць, пакамандую цяпер я...

І пайшоў, грукнуўшы весніцамі, з двара.

Косцік чуў усю размову Бабая з бацькам. І маўчаў. Але калі бацька, завёўшы бычка ў хлеў, зняў паналыгач і разбурчаўся, пачаў з апошніх слоў лаяць Бабая, не стрываў, сказаў:

— Не бойся, тата. Калі што якое... Дык я цябе абараню.

— Як ты абароніш? — падняў вочы на сына бацька.

— А я... Як і Бабай... Да немцаў пайду...— сказаў Косцік.

— Што?! — аж зароў, закрычаў Мікалай.

Косцік спалохаўся бацькавага крыку, кінуўся з хлява. І... у пярэпалаху ледзь з ног Параску, сястру, не збіў: яна, аказваецца, была ў іхнім двары, стаяла ля хлява, слухала, пра што гаварылі бацька з сынам.

— Не крычыце, супакойцеся,— сказала прымірэнча яна.— Калі яшчэ немцы тыя прыйдуць.

— Заўтра. Бабай кажа — заўтра,— паведаміў Мікалай.

— Ну заўтра — гэта не сёння...

Параска была вясёлая, давольная. Нават усміхалася.

— Чаго ета ты такая? — спытаў бацька ў дачкі.

— Навіну добрую пачула. Дык і радуюся.

— Скажы нам, можа, і мы парадуемся,— усё яшчэ не адпускаўся ад гаворкі з Бабаем і сынам, Косцікам, не дабрэў Мікалай.

— І скажу... Пілiп...

— Што Піліп?

— Піліп... Піліп наш жывы!

І заплакала раптам Параска, хустку з галавы сарвала, пачала слёзы з вачэй выціраць.

— Жывы? — не паверыў Мікалай.— Дык ты... Толкам, па парадку ўсё раскажы.

— Пойдзем у хату, раскажу...

І Параска, з хусткаю ў руках, рушыла ў хату.

За ёю, ледзь не бегма, заспяшаліся бацька і Косцік.

## XXVIII

*З дзённіка Тасі Несцяровіч*

Татачка, і я, і мама плачам. Самі не ведаем чаму — ці то з гора, ці то з радасці. Уяўляеш, мы знайшлі Лапіцкіх. Яны, аказваецца, у Мінску, толькі жывуць не ў сваёй кватэры, а перабраліся ў нечы прыватны дамок, на Камароўку. Самога Пятра Пятровіча няма, і, дзе ён,— ніхто ў сям'і не ведае. Ён паехаў у Брэст чытаць лекцыі. І там, мабыць, заспела вайна. Сям'я чакала яго ў Мінску, нікуды

не асмельвалася падацца. А ён так і не з'явіўся. Што з ім? Жывы ці, можа... Ой, татка, што нарабіла гэтая вайна! Усюды, куды ні пайдзі, з кім ні сустрэнься,— гора. Лапіцкія на сваёй кватэры жыць баяцца, баяцца, каб іх не выдаў хто-небудзь немцам. Таму і перабраліся ў той драўляны дамок на Камароўку, гаспадары якога, мусіць, пайшлі некуды ў бежанцы. Там начуюць, а ўдзень прыходзяць па чарзе з дачкою Лізаю да былой сваёй кватэры, дзяжураць — раптам з'явіцца адкуль-небудзь Пятро Пятровіч? Там, ля былой іхняй кватэры, мы і сустрэлі жонку Лапіцкага — Юлю Змітраўну. Яна надта пахудзела, зблажэла з твару — проста не пазнаць.

Юля Змітраўна ўзрадавалася, кінулася абдымацца, цалавацца, распытваць, як да Мінска мы дабраліся. А потым, татка, і пра цябе расказала, што ведала. Яна цябе, кажа, бачыла, заходзіў ты да іх перад самай вайною. Кажа, ты зусім не змяніўся — такі ж, як і быў. Ага, дык Юля Змітраўна сказала, што ты і начаваў у іх дома і ўсё гаварылі, гаварылі з Пятром Пятровічам. Пятро Пятровіч быццам прызнаўся, расказаў табе, дзе мы жывём, бо бачыў маці, калі прыязджаў у Вялікі Лес чытаць лекцыю. І быццам ты збіраўся да нас паехаць... Але ці паехаў — Юля Змітраўна пэўна не ведае. Пятра Пятровіча неўзабаве камандзіравалі ў Брэст, а ты... Больш не заходзіў. Не было як, мусіць, заходзіць, вайна пачалася...

І вось мы з маці цяпер у одуме вялікім. Дзе ты, татка? А што, калі пакуль мы да Мінска дабіраліся, ты тым часам на Палессе, у Вялікі Лес, выправіўся. І мы... Размінуліся ў дарозе... Магло ж такое быць. Што рабіць нам? Ні я, ні мама сказаць не можам, бо не ведаем. Вяртацца назад, на Палессе, у Вялікі Лес? Але ж якая гэта доўгая і пакутлівая дарога! Дый... Пакуль мы будзем ісці, дабірацца да Вялікага Лесу, ты можаш пайсці адтуль, чаго табе быць у чужым, незнаёмым месцы, калі нас там няма? І чакаць цябе тут, у Мінску... Гэтак, як чакаюць Лапіцкія Пятра Пятровіча? Не ведаем, нічога не ведаем... І ніхто параіць што-небудзь путнае не можа. Таму і плачам...

Бывай, татка, бо пісаць больш не магу. Сэрца аж разрываецца ад крыўды і болю. Столькі прайшлі, столькі напакутаваліся... І не ўбачыліся, не сустрэліся з табою... І ці ўбачымся, ці сустрэнемся хоць калі?..

# Вялікі Лес

*Раман у трох кнігах*

**КНІГА ДРУГАЯ**



# Частка першая

Пачатак тае восені на поўдні Палесся — у міжрэччы Прыпяці і Дняпра — выдаўся пагодлівы, надзіва сухі і цёплы. Сонца, падняўшыся рана, не хавалася да самага заходу — грэла, пякло, зусім як улетку. Дні стаялі светлыя, ясныя, бы крышталь, а ледзь вечарэла — высыпалі зоры. Зор высыпала столькі, што ад іх аж бялела неба.

І ціха-ціха навокал было — нідзе ні грымне, ні вухне, ні застугніць.

Ліха быццам абмінула, абышло бокам гэты край.

І ўжо здавалася: так тут і будзе, нішто ніколі не зменіцца.

Ды не — усхадзіўся, закружыў, завіхурыў, падзьмуў калашмай-вецер, нагнаў хмар. Пасыпаўся дождж — дробны, нудны, халодны. Нейк ураз пабурэла трава, пажоўкла лісце на дрэвах; балоты, лясы, палі набрынялі вадою; на дарогах зачвякала гразь...

Паказалася, зіркнула з-за хмар сонца, але не ранейшае, лагоднае, ласкавае, вясёлае, а нібыта астуджанае, нечым напалоханае.

Пацягнуліся, пацягнуліся ў вырай птушыныя чароды, кліны...

Плыло, ляцела і ляцела павуцінне бабінага лета...

І сумна, невыносна сумна было тое бачыць, праводзіць развітальным паглядам: куды ўсё імкне, чаму пакідае аселасць, родны кут?..

Зноў насупілася, пазмрачнела раптам, дзе і дзявалася цяпло. Сонца схавалася. Цяпер надоўга. Ніхто і сказаць не мог, калі яно засвеціць, ветла, радасна ўсміхнецца...

## I

Ноч, якая бясконцая, зморна-пастылая ноч, калі не спіцца, не ідзе, што ні рабі, сон. І па хаце тупаў, снаваў сюд-туд Мікалай, і на падворак, узуўшы ногі ў шламакі-апоркі, разы два ці тры выбягаў, і ў пасцелі, сцішыўшыся, ляжаў, накрываўся і раскрываўся, а ўсё дарэмна: спакою,

забыцця як не было, так і не было. Лезлі і лезлі — не адкаснуцца, аж, здаецца, галава пухла,— сляпіцаю думкі, перабіралася і перабіралася ў памяці, нібыта перажоўвалася, то адно, то другое: новае, свежае і даўняе, амаль забытае...

«Піліп... Піліп жывы!»

Радасць гэтую прынесла Параска. Прынесла ад Зайчыкаў — вярнуўся Адам, як і Мацей Тхорык, да сям'і і, кажа, Піліпа бачыў. І не на лоеўскім беразе Дняпра, а на другім, украінскім. Жывы Піліп, не, не забіла яго «бонбаю» на пераправе, зямлёю толькі прысыпала. Не паверыў Парасцы Мікалай, сам у хату да Зайчыкаў, быццам на крылах, злётаў. Адам — згаладалы, схуднелы, аж не пазнаць,— паўтарыў і яму, Мікалаю, тое самае, слова ў слова, што і Парасцы казаў — жывы Піліп, але дадому, у Вялікі Лес, вяртацца не захацеў, далей, некуды на ўсход, падаўся, хоць ён, Адам, і ўгаворваў не даганяць, не шукаць сваю каманду — «ета ж усё адно што вецер даганяць, голку ў стозе сена шукаць». Не паслухаўся Піліп, услед за іншымі такімі ж, як сам, няшчасны, павалокся. «А я,— расказваў са скрухай, душэўным болем Адам,— паглядзеў на неразбярыху і безлад, плюнуў, ды — дадому. Уночы, кеб ніхто вельмі не бачыў, не запыніў...»

Не асуджаў, ані не асуджаў Мікалай сына, Піліпа, што той не паслухаўся Зайчыка, дадому, у сваю вёску, не вярнуўся.

«Там, на вайне, не мёд, але і тут... Хто ведае, сказаць можа, дзе яно лепей, а дзе горай. Жывы Піліп, і то хвала богу. Бо я... Пахаваў яго ўжо, нават жалобу справіў. А ета... Значыцца, доўга будзе Піліп жыць...»

Радасць, што не загінуў, жывы сын, Піліп, хоць і вялікая была, не засланяла, не магла засланіць адвечных будзённых клопатаў, таго, што хвалявала, вярэдзіла думкі і сэрца. Гняло, мучыла, як, здаецца, ніколі яшчэ, бяссілле, няможнасць супрацьстаяць, быць у баку ад усяго, што дзеелася навокал і што — гэта Мікалай адчуваў — незаўважна, але настойліва, прагавіта ўцягвала, укручвала ў свой кругазварот, вір і яго, Мікалая...

«І кінуцца куды?.. Дзе паратунку шукаць, грунту таго, стаўшы на які — чалавекам, гаспадаром можна сябе пачуць?..»

Хтосьці невідочны быццам за спіною стаяў, у патыліцу дыхаў, на вуха шаптаў, дыктаваў, навязваў яму, Мікалаю, як здаралася гэта неаднойчы ўжо, сваю волю, патрабаваў,

каб ён, Мікалай, падпарадкоўваўся, жыў не так, як хацелася самому, а так, як хацелася таму, каго ён, Мікалай, не бачыў, але адчуваў, ведаў: ён ёсць... Гэты Ён не меў свайго раз і назаўсёды дадзенага імя і твару, ён быў шматаблічны, выступаў у розных асобах, але гэта быў Ён, адзін і той жа, той самы, хоць Мікалай і не здагадваўся, доўга, доўга не здагадваўся пра гэта. Як правіла, Ён з'яўляўся нечакана і ў вельмі важны момант жыцця, на крутым зломе ці згібе, і дыхаў, холадна, уладна, аж да нахабнасці ўладна дыхаў у патыліцу, а то і ў твар... Першы раз яго дыханне Мікалай пачуў гадоў сорак таму назад, на грэблі, сваёй вялікалесаўскай грэблі, калі вяртаўся з дзялянак дадому. Была восень, грэбля распаўзлася ад частых, шчодрых дажджоў, ды так, што сухога месца нідзе нельга было знайсці, каб нагу паставіць. А тут, як на тое,— дзе коратка, там і рвецца! — насустрач пан Халявін у таратайцы, запрэжанай у парку стаеннікаў, кудысьці імчаў. Зазяваўся Мікалай, не саступіў у час дарогі. І стаеннікі, захропшы, ледзь не збілі, не ўтапталі яго, Мікалая, у багну, у гразь. «У-ух, хамула!» — прастагнаў пан... І гэта, як пасля пераканаўся Мікалай, і быў Ён — Паганы Дух... За панам стаяў цар з усімі слугамі і стражнікамі, гэта была сіла, якой усе баяліся. І ён, Мікалай, таксама баяўся. Інакш бы... Хіба б дараваў Халявіну, хоць той і пан быў, знявагу, хіба б аддаваў ні за што ні пра што ўробленае поле — раскарчаваныя, адабраныя ў лесу крывавым мазалём, потам паляны?..

Скінулі цара з трона, прагналі пана. Думалася: вечна воля будзе, ніхто ніколі ўжо над каркам не стаяцьме, не дыхацьме,— рабі, жыві, як хочаш, як заманецца. Не-е! Паганы Дух зноў аб'явіўся, угаворваць, прымушаць пачаў, каб ён, Мікалай, з аднаасобніцтвам канчаў, у калгас уступаў, заяву падаваў. «Вышлю!» — пагражаў тады яму, Мікалаю, сын, Іван. Але то... не сын, Іван, пагражаў, а Ён, Паганы Дух. І за ім зноў сіла была, яшчэ большая, як раней, за панам... І ён, Мікалай, змушаны быў падаць заяву ў калгас. Але не — не пакарыўся. Толькі зрабіў выгляд, што пакарыўся. Нязгоду ж сваю, злосць глыбей у сябе загнаў, схаваў, затаіў... І чакаў, чакаў, калі зменіцца ўлада, лепшыя часы прыйдуць...

«А цяпер Бабай... Не-е, не выпадкова сустрэўся ён на маёй дарозе, не выпадкова... І тады, на паляне ў Качайбалоце, і потым, у двары... Ета ж дадумацца трэба — хлебам-соллю, як дарагіх, доўгачаканых гасцей... Няўжо Бабай — новае аблічча Паганага Духу?»

«Але ж Бабай — адзін, якая за ім сіла?..» — не верыў яшчэ сабе, мучыўся ў здагадках Мікалай.

«Адзін не быў бы такі аж да нахабства смелы: «Кончылася вашае, Дарошкавае... Хопіць вам камандаваць, пакамандую цяпер я!..» Сказаць так — сілу трэба чуць».

І раптам Мікалая нібы апякло, апаліла:

«На немцаў, няйнакш, спадзяваецца... Немцы — во тая сіла, што за Бабаем!»

«Немцы — чужынцы. Прыйшлі і пайшлі!»

«Кеб жа так! А то ж, мабуць, не пойдуць. А калі і пойдуць, такіх, як Бабай, за сябе пакінуць камандаваць. Давядзецца зноў згінацца, рабіць, што загадаюць. Во, няма яшчэ іх, а ўжо загадвае, ужо ідзі — хлебам-соллю сустракай...»

«А дулі не хацелі? Так я і паслухаюся, пайду, пабягу сустракаць... Дачакаецеся... Хутчэй папруцянееце...»

«У каго стала ля брамы не будзе з хлебам-соллю, таго застрэляць...»

«Не павінна б, кем з етага пачыналі. Ласкаю заўсягды болей можна ўзяць, чым гвалтам. Кось-кось ды ў аглоблі... Во так, так у разумных...»

«Гэ-э, адкуль ты ведаеш, які ў немцаў розум? Помніш, як некалі наехалі? Шабляю мах — і галавы ў Сахвеі нібыта і не было... А цяпер... Хто скажа, чыя галава долу зляціць... Можа... І твая?..»

«Чаму ета мая?»

«Таму, што стол выносіць упарцішся, хлебам-соллю паганцаў сустракаць не хочаш. Ды і сын у цябе, Іван... Начальнік сельсавецкі, камуніст... Што, хіба забыўся?»

«Не, не забыўся. Але стол выносіць, хлебам-соллю прыблудаў сустракаць... Бабая слухацца...»

«Яно-то так. Ды... Вылучацца з грамады... Сам разумееш...»

«Кожны за сябе адказвае. Я ж, можа, не авечка, кеб услед за чарадою бегчы: куды чарада, туды і я...»

«І галаву падстаўляць ні за што ні пра што? Па-дурному...»

Думаў, думаў Мікалай, сіліў і сіліў памяць, а выйсце, што зрабіць, каб і загаду Бабаевага не паслухацца, і лішне не вылучацца, не настырняцца, не кінуцца адразу на вочы чужынцам,— не знаходзіў.

«Не вынесеш стол з хлебам-соллю — калі не застрэляць, запомняць. І прыгадаюць... Ды яшчэ як, як прыгадаюць!.. Вынесеш...»

Не, не мог, не мог вынесці стол з хлебам-соллю да брамы Мікалай. Усё ўсярэдзіне гарэла, пратэставала, было супраць, каб слухацца Бабая, чужынцаў, заваёўнікаў хлебам-соллю сустракаць.

«Лепей у вёсцы не быць, сысці куды-небудзь... Во-во, сысці... Што якое, дык мяне дома не было, не ведаў я нічога...»

«Але ж Бабай... Папярэджваў...»

«Мала што... Сказаць можна: недачуў, не зразумеў...»

Ледзь світання, раніцы датрываў Мікалай. А тады... Твар вадою асвяжыў, сякеру з-пад лавы ўзяў, за пояс заткнуў. І, не чакаючы, калі прачнецца, спаўзе з палка Хора, запаліць у печы, згатуе чаго-небудзь на снеданне, нічога нікому не кажучы, падаўся ціхачом гародамі ў лес.

«Што будзе, тое будзе, а сустракаць прыблудаў хлебам-соллю — не-е... Не буду!..»

## II

Яўхім Бабай і сам не помніў, як гэта яму прыйшла ў галаву думка бегчы ў Ельнікі, шукаць немцаў, прасіць, каб тыя не бавіліся — хутчэй наведаліся ў Вялікі Лес. Злосць, вялікая злосць, няйнакш, думку тую нарадзіла, падказала: марудзіць ні дня, ні хвіліны нельга — разбяруць, расхапаюць, расцягаюць па сваіх хатах, хлявах і клецях усё калгаснае. Тады не пажывішся, нічым не пажывішся. Локці на сабе кусай, а праваронііш — не вернеш.

Начальнік нямецкі, да якога хоць і не пускалі, але трапіў, дзякуючы сваёй настойлівасці і настырнасці, Яўхім Бабай (начальніка таго ўсе ў Ельніках звалі «гер камендант Курт Апфель»),— тоўсты, лысы і, як падалося, зусім не строгі, а дабрадушны,— доўга смяяўся, калі перакладчык — не з вайсковых, а з цывільных, малы і шустры, з глюгастым носам і вялікімі, адтапыранымі вушамі — пераказаў па-нямецку тое, што мучыла, не давала спакою, прыгнала аж сюды, за васемнаццаць кіламетраў, ненавісніка бальшавікоў і савецкіх парадкаў.

— Корошо, корошо,— хацеў абысціся без перакладчыка, паказаць, што ён не лыкам шыты, умее гаварыць па-руску, камендант.— Мі буду ў Вялікі Лес... Наутро... Но! Чтобі клеп-соль біль. Фарштэйн?

— Каб з хлебам-соллю сустрэлі, разумееш? — дапамог правільна данесці загад каменданта перакладчык.

— Добра, будзе хлеб-соль,— паабяцаў Яўхім Бабай.

Паабяцаць — паабяцаў, а вось ці будзе хлеб-соль, ці выйдуць велікалесаўцы са сталамі на вуліцу — ані не ўпэўнены быў Яўхім Бабай, хоць, вярнуўшыся з Ельнікаў, і абабег ад двара да двара вёску, кожнаму загадаў, што патрабуецца, каб сустрэць па-належнаму немцаў. «Ад нашых людзей усяго можна чакаць»,— думаў Яўхім Бабай. Думаў і падганяў, падганяў жонку, Соньку, ходзячы, снуючы сюд-туд па хаце.

— Ты хлеб учыніла?

— Учыніла. Казала ж ужо, што ўчыніла,— бурчала, як і заўсёды, нечым незадаволеная Сонька.

— Глядзі, кеб глёўкі не быў, кеб скарынка ад мякішу не адстала. Ды і не перакіс кеб — сама ведаеш, каму хлеб, хто есці яго будзе.

— Зжаруць. Які спяку, такі і зжаруць. Дароваму каню ў зубы не глядзяць,— не сунімалася Сонька.

— А калі ведаеш, дык думай, што гаворыш. А то... Не агледзішся, як шампалоў усыплюць.

— Чаго ета мне шампалоў усыплюць? Хай табе...

— У мяне задніца не такая тоўстая, як у цябе.

— Знайшоў тоўстую! За табою надта растаўсцееш.

— Лепшага можаш сабе пашукаць. Але ета... Не цяпер... Цяпер пра хлеб думай, за дзяжою пільнуй, глядзі, кеб усё добра было. Устаць трэба ранелька, ні свет ні зара, у печы выпаліць. Ды хлеб пасадзіць, кеб спёкся. Як хутчэй спёкся...

— Спячэцца, нідзе не дзенецца. Пакуль прыедуць з Ельнікаў, і паесці можна.

— Табе б толькі есці, трыбух набіваць. Пра іншае не думаеш.

— Ты ж за мяне думаеш. А мне толькі рабі. Рабі, што ты загадаеш...

— А ты як хацела? Жыць — і нічога не рабіць?

— Я аднаго хацела б — кеб змоўк ты, не падганяў, аконамам нада мною не стаяў...

Не ўлягалася, не ўлягалася трывога, не было спакою на душы ў Яўхіма Бабая. І ўночы разоў колькі прачынаўся, на вокны спахапліва глядзеў — ці не світае, ці не пара Соньку будзіць, каб уставала, у печы паліла, хлеб пякла. І потым, калі развіднела, сонца з-за лесу паказалася і ён, Яўхім Бабай, на вуліцу выйшаў, зноў па вёсцы ад двара да двара пабег — праверыць, паглядзець, ці паслухаліся людзі, ці рыхтуюцца немцаў сустракаць. Здзівіла Яўхіма Ба-

бая, напалохала: выявілася ж вельмі хутка — ніхто ўсур'ёз яго загад не ўспрыняў.

— Дык жа пастраляюць... Як курапатак, пастраляюць,— страшыў ён кожнага, каго сустракаў.

— Усіх не пастраляюць. Патронаў не хопіць,— адказвалі кпліва, быццам з насміханнем, самыя смелыя.

А Мацей Тхорык, калі Яўхім Бабай у двор да яго зайшоў, прапанаваў:

— Нашто ўсім сталы выносіць? Можа б, аднаго стала хапіла?..

— Як ета — аднаго? — зацікавіўся Яўхім Бабай.

— Ну, кеб адзін стол з хлебам-соллю вынесці... Ад усіх... Скажам, за вёску, да крыжа... І сустрэць там немцаў...

Як за саломінку тапелец, так і Яўхім Бабай ухапіўся за прапанову Мацея Тхорыка.

— А ты... Да крыжа пойдзеш? — спытаў.

— Я... Я...— разгубіўся, зніякавеў Тхорык.— Мне няёмка... Не з рукі.

— Чаму ета табе няёмка, не з рукі?

— Немцы ж... Маці маю...

Успомніў, згадаў тое, даўняе, Яўхім Бабай. На свае ж вочы бачыў — маці Тхорыкава, Сахвея, акрываўленая на траве ляжыць, а галава... у пяску, побач... «Га-а, як жа тут быць?» — падумаў. Тхорыку ж сказаў:

— Калі тое было...

— Яно-то так... Але ж было... І лепей... Хай бы без мяне... Хіба людзей няма?.. На мне канча свет клінам сышоўся?..

— Ну, а хто пойдзе?

— Кеб са старэйшых, паважаных... З барадою...

Аж гарачыня прыліла да твару Яўхіму Бабаю. Бараду насіў Мікалай Дарошка. Ці не на яго, суседа, намякаў Тхорык? Але... Каб побач з ім, Яўхімам Бабаем, у такую ўрачыстую хвіліну стаяў Мікалай Дарошка?..

— І без барады абыдземся,— сказаў даволі ўпэўнена, рашуча.

— Можна і без барады. Але кеб са старэйшых хто, паважаных...

Пачалі раіцца, каго са старэйшых запрасіць сустракаць немцаў, хлеб-соль ім падаць.

— Рыкуля хіба... Пархвіра Рыкуля,— параіў Мацей Тхорык.

— Нос не закапыліць?

— ?! — паціснуў плячыма Мацей Тхорык.— Сын-то ў яго... Міхась... Камсамолец... Ды ён у войску.

— Хадзем пагаворым...

— Можа, без мяне? — асцярожна папытаў Мацей Тхорык.

— Чаму ета без цябе? Я адзін пра ўсіх дбаць павінен, га? Што, хіба мне больш за іншых трэба? Ісці да крыжа ты не можаш, ісці да Пархвіра Рыкуля зноў жа...

— Не, чаму ж...

Хоць і не хацелася, вельмі не хацелася, а давялося Мацею Тхорыку пайсці разам з Яўхімам Бабаем да Пархвіра Рыкуля.

Пархвір Рыкуль якраз ваду з калодзежа браў. І Яўхіма Бабая, і Мацея Тхорыка з увагай выслухаў. А выслухаўшы, зазначыў глыбакадумна:

— Ета, мабуць, правільна, што не трэба кожнаму са сваім сталом на вуліцу выходзіць. Ды і не ўсе выйдуць. Адзін выйдзе, а другі... Збаіцца ці не захоча. Шанаваць людзей трэба, навошта так адразу пад кулю ні за што ні пра што падстаўляць. І, канешне, лепей некалькім чалавекам усё на сябе ўзяць...

— А ты... Да крыжа пойдзеш? — грубавата, гледзячы проста ў вочы Пархвіру Рыкулю, спытаў Яўхім Бабай.

— Я? — аж рот ад нечаканасці разявіў Пархвір Рыкуль.— Чаму ета я?..

— Некаму ж трэба...

— Каму трэба, той няхай ідзе.

— Мы думалі... Каб са старэйшых хто,— уставіў свае тры грошы ў размову Яўхіма Бабая і Пархвіра Рыкуля Мацей Тхорык.

— Хіба маладзейшых няма?

— Маладзейшыя е. Але добра, каб і старэйшы хто,— узяўся нясмела даказваць сваё Мацей Тхорык.

— Самы старэйшы ў Вялікім Лесе Ахрэм Кулеш. То яго і пазавіце.

— А ты, значыцца, не хочаш? — не спускаў белазорых вачэй з Пархвіра Рыкуля Яўхім Бабай.

— У мяне-е... Акурат жывот разладзіўся. Во стаю з вамі, а мяне за хлеў гоніць...

І Пархвір Рыкуль, пакінуўшы ля калодзежа вядро з вадою — вялікае, акутае жалезам,— мітнуўся як не подбегам у свой двор, за хлеў.

Доўга стаялі Яўхім Бабай і Мацей Тхорык ля калодзежа, чакалі Пархвіра Рыкуля. Але ён не ішоў, не вяртаўся.

— Дарэмна час трацім,— урэшце не сказаў, а выціснуў з сябе са злосцю Яўхім Бабай.

— Ды ўжо ж,— патаптаўся на месцы, згадзіўся і Мацей Тхорык.

Ісці на Замосце да Ахрэма Куляша ні Яўхіму Бабаю, ні тым больш Мацею Тхорыку не хацелася. Ды і хто такі Ахрэм Кулеш, каб яго ўпрошваць, клікаць немцаў сустракаць? Глухі, згорблены. Ні паглядзець на яго, ні паслухаць.

— Абыдземся. І без старэйшых абыдземся,— зрабіў вывад Яўхім Бабай.

І, не чакаючы, што адкажа Мацей Тхорык, пашкандыбаў, патрухаў па дарозе кудысьці далей — ці не да Адама Зайчыка?

— Ідзі, ідзі,— крыва ўсміхнуўся сам сабе Мацей Тхорык.— Абы ад мяне адчапіўся. А то... Прыстаў, як ліст у лазні. Не, пакуль можна, лепей на вочы немцам не паказвацца... Ага, лепей не паказвацца...

І таксама падаўся ад калодзежа, як не пабег, угнуўшы ў плечы галаву, толькі не да Адама Зайчыка, а дадому, да свайго двара.

## III

Думку — разбурыць, а мо нават і зусім спаліць масты, што перакідвалі дарогу праз Балацянку і Старчанку і злучалі Вялікі Лес з Ельнікамі,— Іван Дарошка доўга выношваў у сваёй галаве. З аднаго боку, шкада было гэтых мастоў, будаваліся ж яны не адзін год, ды, лічы, і ўсімі вёскамі сельсавета, талакою. З другога ж боку... Калі масты ліквідаваць, у Вялікі Лес ніяк не дабярэшся з Ельнікаў. Хіба толькі праз Гудоў, па чыгунцы. Але ж цягнік даўно ніадкуль не ходзіць, а хоць і пойдзе, то... На чыгунцы ж таксама ёсць масты. І з імі можна зрабіць тое самае, што і з мастамі праз Балацянку і Старчанку,— разбурыць, спаліць. І як бы гэта ўдалося, немцы ў Вялікі Лес і носа не паказалі б да самых халадоў, пакуль рэкі не замерзнуць. А там... Відаць будзе... Можа, к таму часу і пералом у вайне наступіць, нашы спыняць немцаў. Ці зусім назад, на захад, пагоняць...

Падзяліўся, калі зноў неяк надвячоркам сустрэліся на ўзлеску, сваімі думкамі-меркаваннямі з Васілём Кулагам. І дзіва дзіўнае — Васіль не тое што падтрымаў, а нават быццам узрадаваўся.

— Светлая ў цябе галава, Іван,— пахваліў ён старшыню сельсавета.— Я ніколі б да такога не дапяў.

— Кпіш? — не паверыў Васілю Іван.

— Якія кпіны? Ты дзела гаворыш!

— Але ж масты... Без іх нам... Словам, адбудоўваць давядзецца,— сумна паківаў галавою Іван.

— Адбудуем. Абы жывы былі, ворага з зямлі нашай прагналі.— Іван усміхнуўся. Усміхнуўся сам сабе,аднымі куточкамі губ.

— Гм...

— Чаго ты?

— Дзіўна. То я цябе ўгаворваў, ледзь не сілаю прымушаў, каб сцірты падпаліў. А цяпер...

— І ты, і я — сялянскія дзеці,— разважыў стала, памужчынску Васіль Кулага.— Мы ведаем цану акрайцу хлеба, кожнай рэчы, што зроблена людскімі рукамі. І паліць, знішчаць, што б там ні было... Нязвыкла. І цяжка. І разам з тым... Не паліць, не знішчаць... Таксама нельга. Гэта мы ўсведамляем. Розумам, вядома. А сэрцам... Сэрцам гэтага не прымаем. І прыняць не можам. Адсюль і раздваенне. То адно, то другое верх бярэ...

— Няхутка, мабыць, будзем мы салдатамі,— уздыхнуў Іван Дарошка.— Каб не думаць, не дратаваць сябе... Што загадана зрабіць — зрабіў. І, як кажуць, з плеч далоў...

Цяпер усміхнуўся ўжо Васіль. Дабрадушна, на ўвесь рот, як умеў усміхацца толькі ён.

— Не, такіх салдат з нас, мабыць, ніколі не будзе!

— Чаму?

— Ды таму што... Мы не з тых, што не помняць, хто мы і адкуль. Нам усё, усё дорага. І тое, што пакінулі бацькі нашы, і што зрабілі, чаго дасягнулі мы самі. Нам неабыякавы лёс зямлі, улады нашай. І давай радавацца, што мы такія, а не іншыя. Што ж да таго, будзем мы салдатамі ці не будзем... Будзем! Там, каля ваенкамата, калі мабілізацыя ішла, помніш, хтосьці вельмі правільна сказаў: ці ты апярэдзіш ворага забіць, ці вораг заб'е цябе...

Нейкі час і Васіль і Іван маўчалі — кожны думаў, перабіраў у памяці сваё.

— Ну, дык як — будзем паліць масты? — парушыў першы маўчанне, падняў вочы на Васіля Іван.

— Спалім,— быў, як ніколі яшчэ, катэгарычны, упэўнены ў сабе Васіль Кулага.

— А з чыгункай?

— З чыгуначнымі мастамі будзе цяжэй. Яны ж не драўляныя. Але і ім рады можна даць, можна прыдумаць нешта такое, каб вывесці са строю, цягнікоў не пусціць. Калі, вядома, захацець...

— А адказваць за дыверсіі не давядзецца? — глядзеў неяк дзівакавата на Васіля Кулагу, быццам не верыў таму, што чуў, Іван Дарошка.

— Тады і за сціірты, за завод...

— Не, там заданне райкома было — спаліць. Заданне выканалі, за што ж адказваць?

— Але ж ты казаў — у тых інструкцыях, што ў райкоме чытаў, і пра масты, дарогі гаварылася — падрываць, паліць, выводзіць са строю...

— Нешта ты сёння надна ж рашучы,— пакруціў галавою Іван Дарошка.— Аж не верыцца.

— Некаму трэба быць рашучым. Асабліва калі побач з табою нерашучыя...

— Ты пра мяне?

— Ага. Ролямі сёння мы з табою памяняліся. Не ты мяне, як звычайна, а я цябе ўгаворваю, натхняю, пераконваю...

— Ну і... Лягчэй што — сумнявацца ці пераконваць?

— І адно трэба, і другое. Гэта як бы два бакі медаля, аднаго без другога не бывае. Сумняваючыся, мы ў нечым і пераконваемся. І калі шчыра сказаць... Ні ты, ні я ва ўсім, што робім і што трэба рабіць, да канца не ўпэўнены. Так яно ці не так... Потым, пасля ўбачым. Але і не рабіць нічога, сядзець склаўшы рукі, чакаць, калі прыйдуць немцы... Нельга! Асабліва мне.

— Чаму асабліва табе?

— У мяне жонка, дзеці у Вялікім Лесе. Дзеля іх, дзеля таго, каб ад іх небяспеку адвесці, я што заўгодна гатовы зрабіць. Пералом ва мне наступіў. Пасля ночы тае, як сціірты паліў... Цвёрдасць, рашучасць я ў сабе пачуў.

— А я... Наадварот,— прызнаўся Іван.— Размяк, пачаў сумнявацца...

— У чым ты пачаў сумнявацца?

— Ва ўсім. Ты вось гаворыш, масты трэба спаліць, а я... Не ўпэўнены, што гэтым мы ад немцаў уратуемся, не пусцім іх у Вялікі Лес. Ды і мастоў тых шкада. Выгада вялікая ад іх людзям. Трэба ў Ельнікі — паехаў. А калі масты спалім... Як, калі трэба будзе, праз рэчкі перапраўляцца?

— Па вадзе.

— Вада халодная ўжо.

— Човен знойдзем, кладкі пакладзем. Мы пераправімся. І людзі нашы, каму трэба, пераправяцца. А вось немцы... Не ведаючы броду, не суньея ў ваду. А броду яны якраз і не ведаюць...

— Ты думаеш, падказчыкі не знойдуцца?

— Падказчыкі, можа, і знойдуцца. Але не адразу. Пакуль тое-другое... Мы час выйграем! І... Абедню гітлераўцам сапсуем. Сунуцца яны да нас... А тут... Мастоў няма — спалілі. Хай ведаюць, куды прыйшлі, што мы не пакарыліся, змагаемся.

— Праўда, усё, што ты кажаш,— праўда,— Іван Дарошка закусіў губу, падумаў.— Значыцца, ты за тое, каб спаліць масты?

— Ага.

— Калі гэта зробім?

— Чым хутчэй, тым лепш. Кажуць жа, адклад ніколі не ідзе на лад.

— Гм, дык, можа... І заплануем на заўтра. Сустрэнемся вось такою парою і...

— Давай,— згадзіўся адразу ж без лішніх слоў Васіль Кулага.— Скажы толькі, дзе ты будзеш мяне чакаць...

— На ўзлеску па дарозе на Ельнікі,— пацепнуў плячыма, нібы раптам холадна яму стала, Іван Дарошка.— Як змеркнецца, так і прыходзь. Я ў кустах, пад дубамі, буду. Свіснеш — я выйду.

Падалі адзін аднаму рукі — і расталіся.

## IV

Клаўдзя не ведала, сказаць не магла, ці кахала яна калі хоць каго-небудзь. Ды і што такое каханне? Усе гавораць, быццам ёсць яно, а што гэта значыць — кахаць, якое яно — каханне — хто бачыў, хто пакажа — во яно, во як трэба жыць, кахаць... Здаецца, з адным чалавекам табе добра, усё люба рабіць, можна не саромецца нічога. А паспрабуеш з другім... Яшчэ лепш, не параўнаеш нават, як лепш! Бо адзін на словы надта ж мілыя шчодры, ад якіх аж млееш, другі ласкаю хмяліць, а трэці... Трэці — і сказаць не можаш, чым даражэй за ўсіх астатніх. І слоў прыемных гаварыць не ўмее, і ласкі асаблівай у яго няма, і з выгляду не вельмі каб, а рад-

ней роднага. Што ні папросіць — зробіш, куды ні загадае — пойдзеш. Бо сілу, уладу над табою мае. Яшчэ ў дзявоцтве, калі ў маці, дома, жыла, спазнала гэта Клаўдзя. Не было ў Вялікім Лесе хлопца, з якім бы яна хоць вечар не пастаяла, з якім бы не абдымалася, не цалавалася. Іншы раз здавалася — прапанавалі б замуж пайсці, за першага, хто пасватаўся б, і пайшла б. Але прапаноў такіх не было — хлопцы хоць і хадзілі цугам, проста адбою не было, а каб замуж браць... Не было ахвотнікаў...

Прапанаваў выйсці за яго замуж Пілiп Дарошка. Піліпа Дарошку Клаўдзя ведала мала, з ім менш, чым з кім-небудзь іншым, бавіла вечары. Але хлопец ён быў дужы, плячысты, не з беднай сям'і, да таго ж спакойны, ціхмяны. І Клаўдзя згадзілася выйсці за Піліпа замуж. Згулялі вяселле, Клаўдзя перабралася жыць да Дарошкаў. І тут выявілася — не па-бацькоўску прыняў нявестку стары Дарошка — Мікалай, усё нешта касавурыўся, бурчаў, няйнакш, незадаволены сынаваю жаніцьбаю быў. Думалася — гэта ад таго, што ў цеснаце, у хаце адной жывуць. Таму і настойвала, прасіла Піліпа старацца як мага хутчэй на куток свой узбіцца. Піліп і сам разумеў: каб быць самастойным, незалежным, трэба асобна ад бацькі жыць. Тыя зрубы, што ставіў ля глінішчаў, гарэлі. А тут якраз з калгасам усхадзіліся, абагульваць, абразаць зямлю ўзяліся. Угаварыў бацьку, пакуль што якое, дык чатырохсценку прыбудаваць. «Калі я тут жыць не буду, Косціку астанецца». Бацька згадзіўся, лесу сыну памог навазіць. І ў гародчыку, бліжэй да вуліцы, пры старой хаце пабудавалі зруб. Перабраліся Клаўдзя з Піліпам жыць туды, думалася, на лад у іх усё пойдзе. Аж не! Мікалай як не любіў Клаўдзі, так і не любіў. Мала таго, і з сынам, Піліпам, пасварыўся. І яе, Клаўдзю, і Піліпа быццам поедам еў... Што прычынай таму было — даўмецца Клаўдзя не магла. Думала спярша — да яе, нявесткі, бо чужая, люты такі свёкар. Але хутка пераканалася — нікога асабліва не любіў стары Дарошка, нават дзяцей сваіх. З Іванам — пасварыліся, і не размаўлялі нават, з Піліпам таксама злагады не было, ды і з меншым, Косцікам, жылі не як бацька з сынам, а як кот з сабакам — гыр ды гыр... «Проста чалавек такі... Каторы год адзін, без жонкі... А тут калгас яшчэ, поле абрэзалі, кароў абагулілі... Вось і злосць у старога...» Навучылася Клаўдзя не зважаць на бурклівасць свёкра. Сустрэнецца іншы раз на двары ці ў

сенцах — адвернецца, зробіць выгляд, што не ўбачыла. А то, калі свёкар у добрым настроі, быццам падштурхне яе хто, падкажа — выведзі старога з раўнавагі, пазлуй яго. Паспрабавала разы два-тры — атрымалася. І гэта натхніла Клаўдзю, узрадавала — не ён, стары, хай настрой ёй псуе, а яна яму настрой псаваць будзе. Змаганне нібыта пачалося між ёю і свёкрам, зацятае, жорсткае. Свёкар так тое ці іншае зрабіць хоча, а яна, Клаўдзя, насуперак яму, старому, па-свойму, на свой лад зробіць... Ад свёкра нянавісць пасгупова і на мужа, Піліпа, перайшла, неўзлюбіла і яго Клаўдзя. Ды і за што надта было яго любіць? Абыходлівасці, чуласці ў яго няма, ласкі таксама... Самае цікавае і тое рабіў, бы ўсё адно пад прымусам, без ахвоты. Каб не ведала Клаўдзя, як іншыя тое робяць, можа б, і цярпела. А то ж... Ведала, яшчэ да замуства, калі ў маці жыла, з хлопцамі ў пуні начавала. І з Грышкам Сапуном, і з Мішкам Саваццеем, ды і з іншымі некаторымі. Паспрабавала зноў былых сваіх кавалераў да сябе прывабіць. Хоць і жанатыя яны ўжо былі, але памілавацца з ёю, Клаўдзяю, зноў так, як раней, не адмаўляліся. Параўнала яна, Клаўдзя, тое, што ў яе з Піліпам, мужам, было, і... Не тое што халоднасць — чужасць, нянавісць да Піліпа ўзнікла. «Чаму я, дурніца, замуж за яго пайшла?» З'явілася жаданне не жыць з Піліпам, кінуць, пайсці ўпрочкі. Маці пра тое сказала, прызналася, што нялюба жыць у Дарошкаў, уцякаць ад іх, куды вочы глядзяць, хочацца. Але маці астудзіла: «А дзе яно, дочка, лепей? Доля наша такая ўжо жаночая — што б хто ні казаў, што б ні рабіў — цярпі, маўчы...» Цярпела, маўчала Клаўдзя. Нават калі Піліп нахапляў, лавіў яе з мужчынамі, біў, таптаў нагамі — цярпела, не крычала, не плакала. Ведала, адчувала: вінаватая яна перад мужам, Піліпам. Ведала, адчувала, але і не магла, каб хоць зрэдку волі сабе не даць, стрымаць сябе, калі мужчына блізка быў, душа да яго гарнулася. Піліпа клапаціла, проста жыць не давала, што дзяцей у іх не было. Прасіў, маліў Клаўдзю — з жанчынамі пагавары, выведай, як паводзіць сябе трэба, на што не забываць, помніць, калі з мужам у ложку, каб зацяжарыць. А яна, Клаўдзя, і без жанчын, без размоў з імі ведала — мужчына добры ёй трэба, і ўсё ў яе будзе, як у людзей. Была, была думка ў Клаўдзі — зацяжарыць, нарадзіць не ад мужа, Піліпа, дзіця. «Кеб не думаў, што бяздзетная, кеб не папракаў...» Калі і стрымлівала што ад такога рашучага кроку, дык гэта

сорам. «Дзіця ж падобнае будзе на мужчыну таго, з якім я... Кожны пазнае, ад каго яно... І цвеліцца будзе, пацяшацца. І з мяне, і з Піліпа... Ды і з дзіцяці...» Жыла, тлела ў душы і надзея — налаўчыцца Піліп, пачне рабіць тое так, як іншыя мужчыны, і зацяжарыць яна, Клаўдзя, народзіць дзіця... Ды надзеям гэтым спраўдзіцца не суджана, мабыць, было. Ішлі месяцы, гады, а блізкасці, любасці між імі, Клаўдзяю і Піліпам, так і не ўзнікала. Наадварот, раслі адчужанасць, варожасць. І дзецца дзе было Клаўдзі? Да маці вяртацца? Але ў маці і без яе, Клаўдзі, яшчэ трое дзяцей. І жылося ім там... Э-э, ведама ж, якое жыццё, калі ў хаце ўдава ды дзеці...

Вайна, тое, што Піліпа ў войска забралі, абнадзеілі Клаўдзю. «Цяпер адна я... Што захачу, тое магу і рабіць. Ніхто замінаць не будзе». Паспрабавала ў Гудоў неяк схадзіць, прывяла адтуль да сябе кавалера. Нейкага не тутэйшага, прыблуднага, аднавокага. Але ён... Хілы, зусім няздатны да любошчаў быў, і ночы не вытрымаў — збег. Ды і — трэба ж! — свёкру, Мікалаю, на вочы трапіў. Не спіцца ж чорту старому, носіць яго нячыстая сіла цёмначы па двары...

Чакала, чакала Клаўдзя, што зойдзе свёкар да яе ў хату сварыцца, ушчуваць, сарамаціць. Чакала і рыхтавалася. Хацелася, як хацелася выказаць ёй усё, што на душы сабралася, накіпела. Ды свёкар не зайшоў — ні ў тую ноч, ні ўдзень, ні потым, назаўтра. Ці то ён адумаўся, не пажадаў ускладняць і без таго складаныя адносіны з нявесткай, ці то іншыя падзеі захліснулі цалкам яго. А мо не паспеў — Васіль Кулага неяк сустрэў яе, Клаўдзю, на вуліцы, прапанаваў, каб кароў гнала на пераправу. І яна, Клаўдзя, згадзілася. З радасцю згадзілася. Хоць на край свету, каб хто сказаў, згадзілася б пайсці, абы дома, у Вялікім Лесе, не быць. Абрыдла надта ж увесь час, усе гады тут, пад наглядам то маці, то мужа, то свёкра, знебывацца. «Хоць некалькі дзён, а пажыву, як самой хочацца». Праўда, пераканалася неўзабаве Клаўдзя, у дарозе жыцця свайго так, як хацелася б, не наладзіш. Хомка — дзівак, спаць уночы з ёю, як з жонкаю, не захацеў. Больш таго — пачаў прымушаць кароў даіць, бітоны з малаком на воз і з воза цягаць. Узлавалася была Клаўдзя. А тут яшчэ неразбярыха гэтая, адступленне... І мужчын быццам шмат, то сюды, то туды ідуць. Але ўсе яны занятыя сваім клопатам, не да таго, каб з выпадковай жанчынай пазнаёміцца, ноч разам прабавіць. На пе-

раправе толькі і пашанцавала — Змітра Шламака сустрэла. Хоць з твару ён не кідкі, але такі ж ужо вынослівы, што Клаўдзя і не думала, што ёсць на свеце такія мужчыны. І што-што, а як спадабацца жанчыне — ведаў. Усяго адну ноч прабыла з ім на возе Клаўдзя, а ўжо без яго жыць не магла, гатова была ісці за ім, куды ён скажа, куды павядзе. Хто ён быў, гэты Змітро Шламак — не ведала Клаўдзя. Ды і не вельмі цікавіла яе гэта. Важна, што мужчына ён быў, умеў з жанчынамі абыходзіцца. Умеў, як ніхто. І нястомны, нястомны быў. Ці то згаладаўся так, ці то быў наогул ад прыроды такі мацак. І яе, Клаўдзі, слухаўся. Сказала, каб Хомку напалохаў, прагнаў, бо збрыдзеў за дарогу, проста бачыць яго не можа, Змітро не аднекнуўся — умомант уціхамірыў кульгача.

— Малайчына ты, малайчына,— хваліла Змітра Клаўдзя, калі той вярнуўся, зноў залез пад посцілку на воз.— Ета ж каб не сустрэла цябе, і не ведала б, што такія мужчыны е.

— Е ўсякія. І горшыя, і лепшыя,— задаволены пахвалой, аблізваўся, як памаўзлівы кот, Змітро.— Хочаш лепшага?

— Не, ні лепшага, ні горшага не хачу,— круціла галавою, лежачы на саломе, засланай посцілкай, задаволеная Клаўдзя.— Цябе, аднаго цябе хачу...

І вочы ў яе гарэлі, гарэлі...

— Ды ты ж, мусіць, мела мужчыну? — пытаў, паглядваючы на Клаўдзю, Змітро.

— Мела. Але не мужчыну — мужа,— усміхалася томна Клаўдзя.

— Што, слабачок быў?

— Слабачок.

— І дзе ж ён?

— На хронт забралі.

— Ты адна цяпер?

— Адна.

— Без дзяцей?

— Без дзяцей.

— І далей як жыць будзеш?

— Не ведаю, нічога не ведаю,— жмурылася, круціла і круціла галавою Клаўдзя.

— Хата ў цябе е?

— Е. Праўда, свёкар праз сенцы жыве.

— Паганы?

— Паганенны. Мо раз і сябе ў гаду любіць. Кеб і яго

хто етак жа, як і Хомку, прыструніў, можа б, палепшаў, палагаднеў.

— Ета можна,— задаволена крывіў ва ўсмешцы губы Змітро.— У мяне рука... Адзін раз прыкладуся — на ўвесь век чалавек запомніць. За ета я... І ў турму трапіў...

— Ты ў турме сядзеў? — спалохалася, аж адсунулася ад Змітра Клаўдзя.

— Сядзеў. Раскулачваць нас прыйшлі. Я злосны, як леў, быў. Схапіў аднаго загрудкі. А ён — хілы, кірхлявы. Адразу ў штаны напусціў, абмяк. Мяне і заарыштавалі. Думаў — канец, расстраляюць. Не — пашкадавалі, працаваць прымусілі. Мучыўся б, каб немцы не вызвалілі...

— І што ты рабіць цяпер будзеш? — пытала, ужо са спачуваннем, Клаўдзя.

— Не думаў яшчэ. Не было калі думаць — некалькі дзён усяго, як на волі я. Радуюся, што над каркам ніхто не стаіць, ісці магу, куды захачу... А то ж... Не жыццё было — катарга.

Дождж даўно перашчук, выбліснула, паказалася з-за хмар нават сонца — няйнакш, распагоджвалася. Рыкалі нядоеныя, няпоеныя каровы, іржалі коні. Пачуўся і гул самалётаў — ляцелі, мусіць, зноў на пераправу — бамбіць.

— Уцякаць трэба,— падымаючыся з воза, сказала насцярожана Клаўдзя.— А то, калі бонбы сыпаць пачнуць...

— Куды ўцякаць? — спытаў Змітро.

— Бліжэй к дому, канешне.

— А дзе твая дома?

— У Вялікім Лесе. Чуў, можа, сяло такое?

— Не, не чуў. Ды я сам і не адсюль. Я з-пад Камарына.

— А-а, дык ета ж не так і далёка... І адсюль, і ад нас. Мужа майго братавая недзе родам таксама з-пад Камарына...

— Праўда? — здзівіўся Змітро.— А я думаю, адкуль ты пра Камарын чула...

Клаўдзя злезла з воза, расчасала грабянцом валасы, абцягнула, папраўіла на сабе спадніцу. Пастаяла, паглядзела на Змітра, які ўсё яшчэ, выпрастаўшыся, ляжаў на возе, нібыта нечым задуманы, апанураны, і пайшла да коней, каб адвязаць іх ад аглоблі, запрэгчы ў воз.

Трэба было, пакуль не позна, уцякаць адсюль.

## V

З цяжкім настроем пакідалі хату, выходзілі пасля неспадзяванага пачастунку ад Сцяпана Радзівонавіча Кухты Андрэй Макаравіч і Аліна Сяргееўна. Асабліва Андрэй Макаравіч. Ён аж не стрываў, адмахнуўся, як ад надакучлівай мухі, ад Сцяпана Радзівонавіча, калі той наважыўся праводзіць іх:

— Што мы, хіба дарогі не ведаем, заблудзім?

— Ды неяк жа гэтта быццам і няёмка. У гасцях былі — і не правесці, гы-гы,— гыгыкаў, п'яна, асалавела глядзеў то на Андрэя Макаравіча, то на Аліну Сяргееўну Сцяпан Радзівонавіч.

— Штаны праз галаву няёмка надзяваць. А ўсё астатняе ёмка,— гаварыў, не хаваючы раздражнення і злосці, Андрэй Макаравіч.— Хіба рабіць вам няма чаго? Са стала прыбярыце... А не... Раман пішыце...

— Ды яно... Работа, вядома, ёсць,— стаяў пасярод хаты Сцяпан Радзівонавіч, не ведаючы, ці то праводзіць знаёмых настаўнікаў, ці то і праўда нікуды не выходзіць, аставацца дома.

— Дык і рабіце сваю работу... І так вунь колькі часу патрацілі!..

— Гэтта не трата... Дзеля сябе... Дзеля паважаных, дарагіх гасцей...

— Дзякуй вам,— адчуваючы настрой мужа, умяшалася ў гаворку мужчын Аліна Сяргееўна.— За ўсё дзякуй! І пакланілася Сцяпану Радзівонавічу, трохі быццам па-старамоднаму, манерна, але каб відаць было — ад душы.

А Андрэй Макаравіч ні дзякуй, ні да пабачэння не сказаў. І рукі Сцяпану Радзівонавічу не падаў на развітанне. Як стаяў з клункамі, так і рушыў, пайшоў, угнуўшы галаву ў плечы, з хаты. Ды так шпарка, хутка, што Аліна Сяргееўна ледзь за вёскаю, пры ўваходзе ў лес, яго дагнала.

— Што гэта ты? — папракнула яна мужа.— Ледзь не грубіць пачаў.

— Дык жа свіння... Свінтус грандыёзус! — усё яшчэ не мог апамятацца, супакоіцца Андрэй Макаравіч.— Каб хвіліна — мяне б званітавала... І разважае, думае як! Цесна, бачыш, яму, Мінск, прастор трэба... Тэатры, выдавецтвы... Каб яму далёка відаць было і яго ўсе бачылі! Да каменданта нямецкага на паклоны паспеў збегаць... Інтэлігент, нічога не скажаш.

— Што табе да таго? Кожны жыве, як умее, як розум

падказвае,— не абараняла, але і не давала надта нападаць на Сцяпана Радзівонавіча Аліна Сяргееўна.

— Як гэта — «што табе да таго»? — азірнуўся, зыркнуў вачыма на жонку Андрэй Макаравіч.— Ды ён... Каб толькі разважаў так, служыць сам да немцаў ішоў. Дык жа... I іншых уцягвае, а потым — пачакай! — яшчэ і прымушаць пачне. О, гэта тып! Нікога, нічога не пашкадуе, будзе дамагацца свайго. Прызнанне, веліч! На ўсё пойдзе, любога закапае, на той свет адправіць, хто на дарозе яго стане. «Немцы не дурныя, ім таксама працаўнікі трэба». Знайшоў, з кім хаўрусаваць!

— Няхай,— ніяк не магла падладзіцца пад настрой мужа, трапіць яму ў тон Аліна Сяргееўна.— Савецкая ўлада яго не ацаніла і не прызнала — новая, нямецкая, ацэніць і прызнае.

— Дык жа такога куды ні пастаў, на якое месца ні прызнач — усё адно мала яму, будзе здавацца, што яго паналежнаму не ацанілі, не прызналі. У думках, у сваім уяўленні ён перарос любую пасаду. А самаўпэўненасці колькі! О, не зайздрошчу я тым, хто з ім сутыкнецца, хто паспрабуе праўду яму сказаць, спыніць яго.

— Можа, ён выпіў лішняе і балбатаў, чаго і не думае,— умервала гнеў мужа Аліна Сяргееўна.

— Што ў цвярозага ў галаве — у п'янага на языку. А ціхі ж, непрыкметны быў. Не, не дарэмна кажуць: у ціхім балоце чэрці плодзяцца. Часу свайго чакаў! Святое пісанне ўспомніў. Ведае, хто якога роду, каму ход давалі, каму не давалі. І нас ледзь не сябрамі лічыць. Недзе, значыцца, і мы прамашку далі, калі за сваіх прыняў... I ў спакоі не пакіне.

— А што ён можа ад нас патрабаваць? — спытала, насцярожылася Аліна Сяргееўна.

— Каб такімі, як ён сам, былі. Каб з немцамі супрацоўнічалі, на паклон да іх бегалі.

— Не ў нашыя гады бегаць. Ды і немцы тыя... Сёння прыйшлі, а заўтра пойдуць...

— Калі б твае словы ды богу ў вушка! А то ж... Хто ведае, колькі яны прабудуць, што чакае нас.

Прайшоў яшчэ трохі наперад і — спыніўся раптам. Сказаў, нібыта сам сабе, нібыта Аліне Сяргееўне:

— І вяртацца ў Вялікі Лес нам... Не трэба...

— Чаму раптам ты так? — паглядзела на мужа са страхам Аліна Сяргееўна, таксама спыняючыся.

Андрэй Макаравіч нічога не адказаў. Унурыў галаву

ў шыю і стаяў засяроджаны, нешта пакутліва думаючы, няйнакш, шукаючы адказу на тыя пытанні, тыя сумненні, што ўзніклі ў яго ў галаве.

— Не, не трэба,— паўтарыў ён праз некаторы час.

— А дзе ж нам дзявацца? — разгублена пытала, не зводзячы з мужа палахлівага позірку, Аліна Сяргееўна.

— Дзе? А гэта варта памеркаваць... Але вяртацца ў Вялікі Лес нам... Не, не трэба!

Збочыў з дарогі на лес, спыніўся ў маладым, беластволым бярэзніку. Проста на траву паставіў клункі, сумачкі, прашаптаў сам сабе:

— Ну і няхай!

І сеў, зморана апусціўся на дол.

## VI

Свядомасць да Піліпа вярталася паволі. Ён усё некуды быццам не то ляцеў, не то падаў, аж, здаецца, шумела, свістала ў вушах. І было невыносна цяжка дыхаць. Так цяжка, што Піліп урэшце не вытрымаў — павярнуўся, узмахнуў рукамі. Адразу палягчэла, знікла ўява ці то палёту, ці то падзення. Рэзкае сонечнае святло паласнула па вачах, асляпіла.

«Дзе я? Што са мною?» — жахнуўся Піліп.

Хацеў падняцца — і не змог: ногі былі як бы прыкуты, нешта трымала іх, незразумелы цяжар сціскаў, давіў на ўсё цела. Зноў няўцямна загрэбаў рукамі, затрос галавою — дыхаць стала яшчэ цяжэй.

«Што, што са мною?» — мучыла пытанне.

Некаторы час яшчэ ляжаў — не то спаў, не то быў у бяспамяцці...

Ачуўся ўжо ад холаду. Аж калаціла, трасло ўсяго, зуб не пападаў на зуб.

«Эс-с-с!» — сцяўся, расплюшчыў вочы. І тут жа заплюшчыў — вочы не глядзелі, былі нечым нібыта запарушаны.

Падняў руку — з рукі нешта сыпалася.

«Пясок?.. Ды ета ж я... Ці не паранены?»

Павярнуўся — не, усё, здаецца, цэлае, нідзе нічога не баліць. Вось хіба толькі ў правым баку...

Абмацаў рукою бок — крыві не было.

«Мусіць, ударыла нечым... А мо... Сам ударыўся... Як ляцеў, падаў...»

«А куды я ляцеў, куды падаў?»

Зялёны, парослы травою, бераг ракі... Пераправа... Абчапляны людзьмі паром... Чорны, як грак, Мацей Тхорык... Гул самалётаў... Усё, усё гэта хутка-хутка праносілася, мільгала ў галаве, нібыта асвятляючы свядомасць.

«Бамбілі... Пераправу бамбілі... І мяне, мусіць...»

«А Тхорык? Дзе Мацей Тхорык? Ён жа сядзеў побач са мною. Няўжо яго...»

Расплюшчыў вочы. Здзівіўся, што было цёмна — чорная, як сажа, ноч ахінала наваколле.

«Ета ж я... Так доўга ляжу... Чаму?»

Страшэнная стома, слабасць і нейкая як бы мляўкасць былі ва ўсім целе. Але ён, Пілін, сабраў апошнія сілы, падняўся, стаў на ногі.

У галаве і вушах звінела, гуло, нібы нехта нябачны біў молатам па кавадлу і ўдары молата балюча адгукаліся ў скронях.

Убачыў, разгледзеў у цемры вялікую яму, што чарнела проста пад нагамі, на краі якой ён, Піліп, і стаяў.

«Ета ад бонбы...»

Інстынктыўна мітнуўся, падаўся ўбок, радуючыся: гэты раз пашанцавала, астаўся жывы, нават не паранены...

«Выбуховай хваляю мяне, мусіць, адкінула... І пяском, зямлёю прысыпала... Інакш бы... Нічога ад мяне не асталося б... Як ад Тхорыка...»

Нібы п'яны, кілавата перастаўляючы ногі, пайшоў, патупаў, спатыкаючыся, сам не ведаючы, не ўяўляючы, куды і чаго.

Потым, зноў і зноў вяртаючыся ў думках да таго злашчаснага дня і тае не зусім уцямнае ночы, Піліп кожны раз не пераставаў здзіўляцца, як гэта магло здарыцца, што яму адабрала памяць, ды так, што, колькі ні намагайся, колькі ні сілуй сябе, ніяк, ніяк не згадаеш, не ўзновіш асобных момантаў — поўныя правалы. Адзін з такіх момантаў — усё далейшае, што было, калі ён падняўся на ногі, пайшоў, патупаў ад тае ямы, якую выкапала бомба і дзе яго прысыпала зямлёю і траха не забіла. Як доўга ён ішоў? Што думаў і бачыў? Не помніў, нічога ані не помніў...

Цяпер прахапіўся ад нейкага нутранога ўтрапення. Ён ужо не ішоў, не ляжаў, а сядзеў. Ля самых яго ног плёскалася, як бы ўздыхала, гонячы па шырокай роўнядзі хвалі, рака. Світала — мутнае, не зусім яшчэ пэўнае святло

разганяла суцінкі, агаляючы зяляніну дрэў, кустоў. Дзесьці, прачнуўшыся, азвалася сарока. Цёхкалі, спявалі так, мусіць, і не ўкладваючыся спаць, не засынаючы ўсю ноч, салаўі.

Нейкі час Піліп слухаў спевы птушак, не разумеючы, не цямячы ані, дзе ён і што з ім. Потым усё ж успомніў, здагадаўся...

Паволі, як бы нехаця, але даволі ўважліва, прыдзірліва, агледзеў сябе. Адзенне было цэлае, нідзе не падранае, але ўсё ў пяску. Падняўся на ногі, хвілін колькі атрасаўся. Ні ботаў, ні торбы з правіянтам, ні світкі, якую быў захапіў з сабою ў дарогу, не было. Ісці шукаць іх? Але дзе іх знойдзеш?

Пачуў усплёск вады, стоеныя, устрывожаныя людскія галасы...

Пабрыў, адчуваючы непамерны цяжар ва ўсім целе і нясвежасць, затуманенасць у галаве, берагам ракі. Пабрыў туды, дзе чуліся ўсплёскі вады, людскія галасы...

Ніколечкі не здзівіўся, апынуўшыся зноў на пераправе. Людзей цяпер было тут няшмат, усе яны, хто з клункамі, а хто і проста так, без нічога, тоўпіліся ля прычала, чакаючы парома. Ён, Піліп, таксама ўліўся ў гаманлівы, рухомы людскі натоўп.

Калі наблізіўся да прычала, прыплыў паром — ён, мабыць, перапраўляў людзей усю ноч,— Піліп разам з іншымі, такімі ж, як сам, без асаблівай штурханіны ўзабраўся на шурпаты, абабіты коламі і людскімі нагамі, памост. І... Яшчэ і сонца не ўзышло з-за лесу, а Піліп ступіў на другі, украінскі, бераг Дняпра.

У галаве было нясвежа і муціла, ногі слаба трымалі нязвыкла цяжкае, зняможанае цела. Але Піліп не сеў на зялёную, росную мураву, якая надта ж зваблівa цягнула, нібы магнітам, да сябе. Успомніўшы, што начальнік каманды Капуцкі назначаў збор пад шатрыстым дрэвам, хацеў папраставаць туды. Ды ў час спахапіўся — мінулі ж з таго часу амаль суткі і хто будзе чакаць яго, Піліпа, пад тым дрэвам?

«А адставаць ад каманды нельга, нельга... Папярэджвалі ж... Там, ля ваенкамата...»

Падаўся ўслед за іншымі людзьмі. Куды ішлі яны — туды валокся і ён...

У поўдзень Піліп сядзеў на абочыне дарогі — без шапкі, босы, у кашулі ды штанах. Міма яго, шаркаючы нагамі

і ўздымаючы пыл, ішлі і ішлі людзі. З клункамі, дзецьмі, мужчыны і жанчыны. І ўсе як адзін ад Дняпра, з пераправы. Піліп на іх не глядзеў — схіліўшы да каленяў галаву, ён не то пра нешта думаў, не то драмаў. Ды і людзі, што праходзілі міма, таксама не звярталі асаблівай увагі на незнаёмага ім чалавека, які паводзіў сябе дзівакавата,— прывыкалі ўжо рознае бачыць у дарозе. Можа, кепска чалавеку? Можа, стаміўся і прысеў адпачыць?

Дзесьці там, ля Дняпра, гулі самалёты, чуваць было, як бухалі, ірваліся бомбы — мусіць, бамбілі пераправу. Тут жа, на абочыне дарогі, было зусім ціха. Сакаталі, сычэлі і сычэлі ў траве конікі, звінелі, бзыкалі чмялі, авадні, мухі. Грэла, пякло, аж, здаецца, папяліла ўсё навакол, сонца.

Ці не яно, сонца, і прымусіла Піліпа падняцца на ногі, пашукаць вачыма наўкруг хоць якога-небудзь ценю, дзе можна было б захінуцца, схавацца ад спёкі. Крокаў за дваццаць ад дарогі ў густым — хоць прыстаў барану — жыце зелянела, вабячы да сябе, прысадзістая, галлістая груша-дзічка. Падняўся, папраставаў, блытаючыся ў рослых сцяблах, да яе...

Але да самой грушы-дзічкі Піліп не дайшоў, спыніўся, убачыўшы ніцма распластанага чалавека, што ляжаў, падклаўшы пад кудлатую русявую галаву рукі і раскінуўшы шырока, як толькі можна, ногі, абутыя ў падраныя, запыленыя чаравікі.

«Хто? І чаму ён тут ляжыць? Мо... Забіты, нежывы?..»

Асцярожна ступіў крок, яшчэ крок наперад — не, чалавек, здаецца, дыхаў, няйнакш, спаў. Непадалёку, на ўзмежку, ля камля грушы-дзічкі, ляжала і палатняная, амаль парожняя дарожная торба.

Нешта не зусім блізкае, хоць быццам і знаёмае, было ў чалавеку. Але менавіта што — Піліп ніяк, ніяк не мог здагадацца, уцяміць.

«Няўжо хто...»

Мабыць, пачуўшы блізка людскія крокі, чалавек спахапліва падняў галаву, паглядзеў заспанымі вачыма на Піліпа. І Піліп пазнаў, хто перад ім — га, ды ета ж Адам Зайчык!

— Як ты тут апынуўся? — усклікнуў — і сам не ведаў, ці то ад радасці, ці то ад нечаканасці,— Піліп.

— А-а, ета ты,— круціў галавою, мусіць, не могучы яшчэ ачуцца, прагнаць сон, Адам Зайчык.— Сядай...

І сам першы борзда перавярнуўся, падкурчыў пад сябе

ногі, сеў. Апусціўся на зямлю, амаль што ўпаў паблізу Адама і Піліп.

— Во не думаў, што цябе тут сустрэну,— усё не мог апамятацца ад нечаканае сустрэчы Піліп.— Во не думаў...

І ўсміхаўся, усміхаўся — быў па-сапраўднаму рады...

Адам жа Зайчык, адчувалася, не надта каб быў усцешаны сустрэчай з аднавяскоўцам.

— Ты... Куды ідзеш? — спытаў урэшце Адам Зайчык.

Сказаць, прызнацца шчыра, Піліп і сам не ведаў, куды ён ідзе. Так, мусіць, коціцца, ляціць камень з гары. Ляціць, коціцца, не могучы спыніцца, а каб сказаць, куды, чаго — не ведае.

— Дык жа... Трэба ісці... Ты сам чуў там, ля ваенкамата... Вайсковец гаварыў,— прашаптаў ледзь чутна засмяглымі губамі Піліп, не вельмі, як і сам разумеў, пераканаўча.

— А-а,— пазяхнуў, як рыба, выкінутая з вады, Адам Зайчык.— Але ж ты... Не з камандаю ідзеш, а адзін.

— Я адстаў ад каманды,— прызнаўся Піліп.

— Адстаў?..— паглядзеў неяк загадкава, прыжмурана на Піліпа Зайчык.

— Да пераправы дайшлі... Камандаю... Я нагу нацёр... З Тхорыкам на беразе ракі сядзелі. А самалёты наляцелі, бамбіць пачалі... Мяне... Зямлёю і прысыпала...

— Цябе... Зямлёю? — не паверыў, рот разявіў Зайчык.

— Ага, зямлёю... Да самай ночы ляжаў... А тады ачуўся, на еты бераг пераправіўся. Ды во, іду...

— А я гляджу на цябе, нейкі ты... не той... Аж яно вунь што!

— Хвала богу, жывы астаўся. А Тхорык... Не ведаю нават, што з ім. Можа, яго і забіла там,— уздыхнуў, перахрысціўся Піліп.

— І куды ж ты цяпер? — спытаў, памаўчаўшы, зноў Адам Зайчык.

— Каманду... Трэба было б каманду сваю дагнаць.

— Каманду сваю дагнаць? — непаразумела паглядзеў на Піліпа Адам Зайчык.— Пасля таго, як цябе прысыпала зямлёю, ты яшчэ пра нейкую каманду думаеш, даганяць яе збіраешся?

— А што рабіць? Сказана ж было.

— Слухай, што табе хто скажа. Язык без касцей, можна чортведама чаго нагаварыць. Дык і рабіць? — глядзеў, не зводзіў вачэй з Піліпа Зайчык.

— Але ж і не паслухацца...

— Слухайся, слухайся,— быццам згаджаўся з Піліпам, натхняў Зайчык,— нехта ацэніць.

— Ацэніць не ацэніць, а трэба.

— Каму трэба?

Сядзеў Піліп на ўзмежку, слухаў, што гаварыў Адам Зайчык, і дзіўна — здавалася яму: тое самае ён ужо аднойчы чуў. «Дзе? Калі?» — сіліў ён сваю памяць, хочучы даўмецца, здагадацца.

А Зайчык не змаўкаў, гаварыў і гаварыў:

— Хоць... Можа, каму і трэба. Толькі ні табе, ні мне. Паглядзеў я — няма, скажу табе, нідзе парадку. І не будзе... Прайгралі мы вайну. Прэ немец — не спыніць. Галаву толькі скласці ні за што ні пра што можна...

«А-а,— урэшце цюкнула Піліпу,— дык ета ж тое самае і Тхорык мармытаў, калі на беразе сядзелі... Там, ля Дняпра, на пераправе...» Сказаў, каб не маўчаць, сказаць што-небудзь:

— Галаву ўсюды скласці можна. І на хронце, і вось так, як я ледзь ужо не склаў...

— Не кажы. У сваім сяле, дзе ты ўсіх знаеш і цябе ўсе знаюць, не тое, што на хронце ці ў дарозе... Не-е, ты як хочаш, а я дадому буду кіравацца. Бо ісці чортведама куды і чаго, вочы вылупіўшы... Ахвоты ніякай няма...

Не было вялікай ахвоты і ў Піліпа куды б там ні было ісці, пакідаць родную дамоўку. Але і вяртацца назад... Таксама не было, не было ахвоты, не вабіла, не цягнула. Каб там хоць жонкі, Клаўдзі, не было... А то ж... Ды і брат, Іван, папярэджваў, казаў: «Не падвядзі, не схіб...»

Думаў, разважаў Піліп — і прыходзіў да аднаго пэўнага і яснага вываду: нельга яму назад, у вёску, вяртацца. Каму, можа, і можна, а яму... Нельга...

— Рабі, як ведаеш,— не падымаючы галавы, мрукнуў сумна Піліп.— А я... Пайду...

— Куды ты пойдзеш? — пытаў, спрабаваў адгаворваць Піліпа Адам.

— Куды ўсе мужчыны ідуць.

— Глядзі, каб не пашкадаваў.

— Можа, і пашкадую. Але і назад, у Вялікі Лес... Не, таксама дарогі мне няма...

— Што ты — украў што-небудзь ці забіў каго? Чаму ета табе дарогі назад няма? — здзівіўся Зайчык.

— Няма, Адам, няма...

І падняўся на ногі, паволі папраставаў у рослае жыта — да дарогі. Крокаў праз колькі раптам спыніўся, азірнуўся, крыкнуў да Адама Зайчыка:

— Маіх убачыш, скажы пра мяне... Хай ведаюць, дзе я і што са мною...

І пайшоў, пайшоў, ужо не азіраючыся, далей і далей ад Адама Зайчыка. Быццам уцякаў, баяўся, што спакусіцца можа, паддасца на ўгаворы...

## VII

Да Балацянкі дабраліся апоўначы. Спыніліся на мосце.

— Ніколі не думаў, што дажывем да такога,— скрухліва ўздыхнуў, прызнаўся Васіль Кулага.

— І я не думаў,— ціха прашаптаў Іван Дарошка.

Абапёршыся на парэнчы, стаялі некаторы час, глядзелі на ваду, што бруілася, бегла недзе там, унізе, у цемры, і якой не відаць было адсюль, з моста.

— А ты ведаеш,— сказаў, памаўчаўшы, Васіль Кулага,— што Бабай па вёсцы бегаў, загадваў, каб немцаў хлебам-соллю сустракалі...

— Няўжо? — не паверыў Іван.

— Кажа, быццам збіраюцца наведаць Вялікі Лес. І хто стол з хлебам-соллю не вынесе з хаты на вуліцу — таго застрэляць...

— Ах, аж та-ак? — усклікнуў, быццам здзівіўся, Іван Дарошка.— Значыцца, не вельмі спадзяюцца, што нашы людзі самі іх хлебам-соллю сустракаць будуць...

— Можа, чалавек колькі і знойдзецца такіх.

— Думаеш, усё ж знойдзецца?

— ? — пацiснуў плячыма Васіль Кулага.— Пабачым.

Памаўчаў, потым дадаў праз хвіліну:

— Бабая трэба папярэдзіць.

— Правільна! Хай ведае, не забывае: Савецкая ўлада была тут, ёсць і будзе. І яму... За дзезерцірства адказваць давядзецца. А яшчэ калі з немцамі знюхаецца...

— Ды ён, відаць па ўсім, ужо знюхаўся.

— Гм, пра каго-каго, а пра Бабая я лепш думаў. З беднякоў жа, нікога ў яго не раскулачылі, не пасадзілі...

— Дзікі, дрымучы чалавек. Увесь час у лесе, сам-насам. Вось і выспела ў галаве ў цішы лесу. Недарэмна ж кажуць: у ціхім балоце чэрці плодзяцца...

— Гм-м, і Тхорык дома?

— І Тхорык, і Адам Зайчык...

— Тхорык — баязлівец. А вось Адам Зайчык...

Зноў некаторы час маўчалі, слухаючы, як у цішы ночы булькоча дзесьці ўнізе, пад мостам, вада.

— Што ж, мусіць, пара,— адарваўся ад парэнчаў, паглядзеў на Васіля Кулагу Іван Дарошка.

— Ды ўжо ж,— выдыхнуў, згадзіўся Васіль Кулага.

Патапталіся, прайшліся сюд-туд па мосце. Мост гэты і Іван Дарошка, і Васіль Кулага ведалі як свае пяць пальцаў. Ён быў сухі, пасланы з тоўстага, абчэсанага з усіх чатырох бакоў сасновага бярвення, туга, цесна падагнанага адно да аднаго. Бярвенне нават не рыпела, не гайдалася пад нагамі.

— Ці загарыцца? — спытаў быццам сам у сябе Іван Дарошка.

— А мы сянца прынясем. І падкінем на мост і пад мост,— сказаў дзелавіта Васіль Кулага.

— А гэта ідэя!

Спусціліся з насыпу, адышліся на лужок да таго стога, што чарнеў, грувасцеў бліжэй да моста. Зноў некаторы час стаялі, насцярожана слухаючы цішыню цёмнай вераснёвай ночы. Потым моўчкі, ні слова адзін аднаму не кажучы, пачалі скубці, цягаць са стога сена...

Калі схадзілі да стога разоў па дзесяць, абклалі мост сенам і знізу, і зверху, аблілі газай — падпалілі. Падпалілі адразу з некалькіх бакоў і, схаваўшыся ў кусты, стоена глядзелі, як языкі полымя імкнулі насустрач адзін аднаму, зліваючыся ў суцэльны ярка-чырвоны пук агню, і чакалі, чакалі, ці не прачнецца хто-небудзь у Паташні, не загарлапаніць, не закрычыць, не пабудзіць людзей і тыя не пабягуць тушыць пажар. Але час ішоў, а ў вёсцы ніхто не прачынаўся, ніхто не падымаў крыку, ніхто не бег...

— Гарыць, як гарыць! — не вытрымаў, сказаў, яўна любуючыся агнём, Іван Дарошка.

— Ноч ціхая, нявертраная,— ледзь чутна прашаптаў Васіль Кулага.— Ды і сена ж нанасілі.

— У Рудні, здаецца, блізка стагоў няма. А так бы...

— У Рудні калі і не згарыць мост датла, не бяда. Гэты б добра згарэў. Тады немцы далей і носу не сунуць.

— Гм,— не пагадзіўся з Васілём Іван.— Трэба, каб і той, і гэты датла згарэлі. Праз адзін пераправяцца, другі спыніць.

— Яно, можа, і так. Для надзейнасці...

Мост усё больш і больш угараўся, ярка-чырвоныя языкі полымя ахаплівалі шырэйшую прастору, падымаліся высока ўгору, лізалі чарнату ночы. Трашчала, ламалася

бярвенне — снапы іскраў раз-пораз узвіваліся ў цемру.

— Ці не пара нам у Рудню? — спытаў, не зводзячы вачэй з агню, Васіль Кулага.

— Не, пабудзем яшчэ тут.

— Думаеш, хто-небудзь прачнецца, мост прыбяжыць тушыць?

— І гэта, ды і... Не шкодзіла б паглядзець на сваю работу.

— Усё адно перарабляць не будзеш. Як згарыць, так згарыць.

— Можа, іншае што перарабляць не варта. А гэта... Варта, трэба. Калі дрэнна згарыць — бярвенне расцягнем, у ваду пакідаем. Палі, легары газай абальем, яшчэ раз падпалім...

— А-а...

Васіль памаўчаў, падумаў і дадаў:

— А ты, Іван... Нават разбураць і то... Не цяп-ляп...

Цвёрдасць, дзелавітасць была сёння і ў словах, і ва ўсім, што рабіў, у Івана Дарошкі. І яна, гэтая цвёрдасць, дзелавітасць, перадавалася і Васілю Кулагу.

— З табою пабудзеш, пагаворыш — паверыш, што правільна робіш, жывеш. А адзін астанешся... Одум бярэ. Будавалі, стваралі, расцілі — а цяпер знішчаем, палім...

— Гм,— усміхнуўся сам сабе Іван Дарошка.— Мы з табою... І сказаць не ведаю... Як я ў чым сумняваюся — ты ўпэўнены... Я ўпэўнены — ты пачынаеш сумнявацца...

— Бо і ты, і я — думаем. А гэта... Не самае горшае. Куды небяспечней рабіць — і не думаць, што робіш... Як калісь у калектывізацыю было. Ды і пазней...

— Давай не ўспамінаць... Было і сплыло...

...Таго, чаго баяўся Іван Дарошка, не здарылася — ніхто не прачнуўся ў Паташні, не падняў галасу, не прыбег тушыць пажар. А можа, хто і прачнуўся, бачыў, што гарыць мост, але падымаць крык, будзіць людзей не стаў.

Мост гарэў гадзіны паўтары і згарэў увесь, датла. Так што калі Іван Дарошка і Васіль Кулага падышлі зноў да ракі, дык былі задаволены сваёй работай. Асабліва Іван.

— Так бы і далей,— не стрываў, сказаў ён, аглядаючы яшчэ чырвоныя ад агню галавешкі і па́лі, што сіратліва і непатрэбна тырчалі з вады, дымячы і смуродзячы.

Васіль Кулага нічога не адказаў. Толькі засоп па звычцы ў нос...

Мост на Старчанцы падпалілі, калі на ўсходзе пабялела ўжо неба — пачынала світаць. І з гадзіну стаялі ў кустах, чакалі, пакуль той не ўгарыцца. Тады, паапускаўшы нізка галовы, не падымаючы адзін на аднаго вачэй, нібы саромеліся таго, што зрабілі цёмнаю начною парою, паволі падаліся, пабрылі туды, дзе прачынаўся, жыў сваімі турботамі і клопатамі іх родны Вялікі Лес.

## VIII

Яшчэ калі там, пад Гомелем і ў самім Гомелі, пачаліся першыя бамбёжкі, засумнявалася Вера Сымонаўна, ці трэба, ці варта было кідаць Вялікі Лес і ісці, кіравацца ў Мінск. Выказала сваё сумненне Тасі, дачцэ, папытала ў яе рады, можа, пакуль не позна, вярнуцца з дарогі на абжытае селішча. Але Тася... («Ведама, дзяўчо... Дзіця горкае...») і слухаць не хацела пра вяртанне назад, у Вялікі Лес. У Мінск, туды, дзе родны дом, дзе бацька. Надта ж замарконілася, засумавала яна па бацьку, надта ж імкнулася, прагнула як мага хутчэй яго ўбачыць. І сваёй прагай, сваім жаданнем натхніла і Веру Сымонаўну.

Але чым далей адыходзіліся ад Вялікага Лесу, чым часцей і часцей абстрэльвалі і бамбілі нямецкія самалёты, тым усё больш і больш пераконвалася Вера Сымонаўна, што яна зноў пагарачылася, памылілася, пакінуўшы Вялікі Лес і рушыўшы ў такі неспакойны, трывожны і няпэўны час у дарогу. І тое, што яна не настояла на сваім, не вярнулася,— гэта надзея, вялікае жаданне спаткаць, убачыць мужа, Тодара Пракопавіча.

Ды і яна, гэтая прывідная надзея, знікла, як толькі дабраліся з Тасяю да Мінска. Акупіраваны горад жыў ужо нейкім сваім, незразумелым пакуль што, мусіць, нікому жыццём. Тыя, хто аставаўся ў горадзе, былі разгубленыя, кожны чакаў, сам не ведаючы, не ўсведамляючы, чаго. Як бывае нацягнута цеціва на луку перад тым, як запусціць стралу, так напята была людская цярплівасць. Вось-вось павінен быў выбухнуць народны гнеў. Гневам і помстаю, здавалася, было наэлектрызавана ў горадзе ўсё — людзі і дамы, вуліцы і скверы. І гэта адчувалі ўражлівыя натуры. Адчувала гэта і Вера Сымонаўна.

«Што рабіць, куды кінуцца? — неадступна мучыла пытанне.— Аставацца тут, у Мінску?.. А калі ісці — то куды?..»

Набліжалася восень, за ёю — зіма, халады. І трэба было

не марудзіць, вырашаць, думаць, дзе і як з дачкою жыць. У горадзе, дык у горадзе. Калі ж ісці, дык трэба было ведаць, куды, не затрымлівацца, не бавіцца.

Але ніякай пэўнасці ні ў думках, ні ў дзеяннях Веры Сымонаўны не было. Адзін раз здавалася: ісці ім няма чаго і куды, трэба аставацца ў горадзе, неяк абжывацца, быць тут. Другі раз раптам апаноўваў страх. Жыць у горадзе? Але дзе? Кватэры ж сваёй няма. Там жа, дзе спыніліся, асталяваліся... Вернецца гаспадар, і ім хоць на вуліцу выбірайся. Ды і есці што? Нідзе ж нічога не купіш, бо і не прадаецца нідзе нічога. А хоць бы і прадавалася, то за што купляць?..

Але і пакідаць Мінск, ісці... Надта ж нялёгка далася ім дарога. І ад тае яшчэ не адпачылі, ног не пагаілі. Ды і куды ісці? Зноў на Палессе, у Вялікі Лес? Далёка, вельмі ж далёка гэта. Калі б ведалі, што там Тодар Пракопавіч, што менавіта туды ён пайшоў, і дня, і гадзіны не былі б у Мінску, рушылі б на Палессе. А калі яго там няма? Можа, ён зусім у другі бок падаўся? А калі і ў Вялікі Лес, дык хіба ён там склаўшы рукі сядзіць, іх чакае, калі яны вернуцца, прыйдуць да яго? Там жа, напэўна, сказалі яму, што іх няма, яны пайшлі ў Мінск. Як вайна пачалася, дык і пайшлі. Што зробіць ён? Астанецца там, у Вялікім Лесе, ці будзе назад, зноў у Мінск, прабірацца?

«А я... Што б я, быўшы на яго месцы, зрабіла, як бы паступіла? Асталася б там, у Вялікім Лесе, ці назад, зноў бы ў Мінск пайшла?»

Думала, ночы не спала Вера Сымонаўна, а сказаць пэўна, як бы зрабіла яна сама, як мог зрабіць муж, Тодар Пракопавіч, здагадацца, уявіць так і не магла. То ёй здавалася — не будзе муж там, у Вялікім Лесе, сядзець, пойдзе назад, у Мінск. То, наадварот: не, чаго ж гэта ён сюды-туды хадзіць будзе, хіба яму рабіць няма чаго, як толькі іх з Тасяю шукаць. Ды ён, можа, і не пайшоў у Вялікі Лес, можа, на ўсход падаўся, адступіў разам з войскам нашым...

Дзялілася сваімі думкамі-развагамі і з дачкою, Тасяю, і з жонкаю Пятра Пятровіча Лапіцкага Юляй Змітраўнай. Але ні адна, ні другая параіць што-небудзь карыснае, путнае не маглі. Тася і ў горадзе не хацела аставацца, але і ісці... Куды ісці? Раптам пойдуць яны з горада, а сюды бацька вернецца?.. Юля ж Змітраўна нікуды з горада ісці не збіралася.

— Пятро Пятровіч пакінуў нас з Лізаю тут, тут нас і шукаць будзе. Ды і куды ісці?

— А нам... Што рабіць? — пытала з роспаччу ў голасе Вера Сымонаўна.

Паціскала плячыма Юля Змітраўна і не ведала, што параіць.

Не ведала, не магла прыдумаць, колькі ні намагалася, як далей ёй быць, жыць, і Вера Сымонаўна. Аж галава разламвалася, кругам ішла, калі спрабавала ўявіць, што чакае і яе самую, і Тасю і заўтра, і паслязаўтра, і ў неаглядным будучым у гэтым быццам сваім і ўжо не сваім, а чужым, няўтульным, галодным, халодным горадзе. І галоўнае — каб хоць дзе прасветліна якая наперадзе была, прамень сонца ці хоць бы іскра надзеі на лепшае. А то ж — нідзе нічога, цёмна, чорна, як уночы. Сказала, прызналася неяк, калі асабліва цяжка, невыносна на душы было, Тасі:

— Трэба было нам не ісці сюды, назад у Вялікі Лес вярнуцца. Як раіла я. Не паслухалася ты мяне тады.

— Мамачка, хто ж ведаў, што так будзе? На лепшае спадзяваліся ж,— ледзь не заплакала Тася.— Ды і ў Вялікім Лесе што? Думаеш, лепей? Тыя ж немцы, тая ж акупацыя...

— Не, дачушка, можа, там і немцы тыя ж, і акупацыя тая ж, але там бы не галадалі, знайшлі б, чым пракарміцца.

— Дык і тут жа знаходзім.

Сапраўды, пакуль што яны надта не галадалі. Раскошы вялікай не мелі, але і не галадалі. Капалі ў пакінутых дварах бульбу, выбіралі з град агуркі, памідоры. Ды людзі паступова вярталіся да сваіх абжытых селішчаў, пустых двароў аставалася ўсё менш і менш. І загады ж дужа грозныя расклеены былі ўсюды на сценах дамоў і на слупах — усе дарослыя жыхары павінны зарэгістравацца ў нямецкіх камендатурах, атрымаць нямецкія пашпарты і ўладкоўвацца на працу. Хто не паслухаецца нямецкіх улад — таго чакае расстрэл.

— Эх, дачушка, дачушка,— журыла маці дачку.— Зіма ж блізка, халады... І думаць трэба, як жыць далей...

Тася не маленькая была, усё сама разумела. Але і пайсці з горада...

— А куды мы можам пайсці? — пытала Тася ў маці.

— Хоць куды, абы тут не быць.

— А раптам бацька сюды вернецца?

Думала, і пра гэта думала Вера Сымонаўна. І калі што і трымала яе яшчэ ў Мінску, не пускала нікуды ісці, дык гэта надзея, што ўбачыць Тодара Пракопавіча, вер-

нецца ён да іх. А інакш бы... Ні дня, ні гадзіны, здаецца, не была б, не жыла б тут, у горадзе.

— Юля Змітраўна з Лізай чакаюць Пятра Пятровіча. А мы...— казала між тым Тася.

— Дык і мы ж пакуль што нікуды не ідзем, чакаем,— суцяшала маці Тасю.— Дзеля яго ж, бацькі, мы і Вялікі Лес пакінулі, ішлі, дабіраліся вунь з якімі цяжкасцямі аж сюды, за свет. Але ж бачыш... Нешчаслівыя мы з табою. Ні бацькі, ні кватэры... Да таго ж гэтыя немцы, акупацыя...

Вера Сымонаўна не вытрымлівала, пачынала плакаць. Адкрыта ўжо, не хаваючыся ад дачкі.

Тася таксама разгубілася, не было ў яе ўпэўненасці, цвёрдасці ўжо ў тым, што яна гаварыла, рабіла.

— Мама,— сказала яна аднойчы,— давай... Пачакаем яшчэ трохі бацькі. Але калі яго не будзе, ну праз тыдзень... Ну праз два... Тры... То мы пойдзем...

— Куды, дачушка, пойдзем?

— Ды хоць куды. Толькі Юлі Змітраўне скажам, куды пойдзем. І там будзем чакаць бацьку. Чакаць, пакуль ён не аб'явіцца, не знойдзе нас.

Думала, зноў доўга думала над прапановай дачкі Вера Сымонаўна. Недзе ў душы і згаджалася з дачкою, і разам з тым... Не згаджалася.

Было ў прапанове дачкі і слушнае, было і наіўнае, дзіцячае. Ды пярэчыць...

— Добра, добра, дачушка,— ківала згодліва Вера Сымонаўна галавою.

І паколькі нічога іншага, лепшага, прапанаваць не магла, жыла, аставалася ў Мінску, нікуды з горада не ішла...

## IX

Мінуўшы вясковыя гароды, Мікалай шуснуў у кусты, што бучна раскашоўваліся блізка за поплавам. І замарудзіў, запаволіў раптам хаду, спыніўся.

«А куды я іду, куды спяшаюся?» — падумаў.

«Хавацца».

«Хавацца?»

«Аге, ад немцаў, кеб хлебам-соллю не сустракаць. Ад Яўхіма Бабая...»

Аж скалануўся, рукі ў кулакі сашчапіліся, калі ўспомніў Яўхіма Бабая. «Гніда. І камандавацць будзе, а мне

слухайся... Не-е, не дачакаецца таго, хутчэй здохне, ногі выцягне, апруцянее, чым тое будзе. Не на таго нарваўся...»

Не заўважыў, як зрушыўся з месца, пайшоў, ледзь не пабег далей па сцежцы.

«Да лесу дабяруся,— віліся і віліся ў галаве думкі.— А там... Знайду, куды пайсці, чым заняцца...»

Сцежка вывела Мікалая на выцвілае, пабялелае жытнішча, за якім пачыналіся паросльыя касцярухай і лебядой загоны бульбы. Далей, як ахапіць вокам, распасціралася балота з купамі густога зялёнага алешніку і лазняку і пагоркамі-палянамі — на іх тут і там чарнелі прысадзістыя, бухматыя стагі сена. Усё было знаёма Мікалаю, усё абгледжана і абтупана, кожны кусцік, кожная лапінка лугу і поля. Сюды, будучы малым, бегаў па лотаць і шчаўе, тут пасвіў свіней і кароў, потым, памужчынеўшы, карчаваў пні, араў, сеяў, касіў; сюдою, па аднаму яму вядомых сцежках, хадзіў у лес па грыбы і ягады, насіў арэхі і жалуды... І цяпер ішоў усё адно як па сваім двары, па сваёй хаце, хоць і не глядзеў, ані не глядзеў сабе пад ногі — самі ногі помнілі, адчувалі кожную разорку, кожны пагорачак, нідзе не маглі ні спатыкнуцца, ні зачапіцца.

Паказалася, выкацілася з-за лесу сонца, і поле, луг, балота ажылі, павесялелі. Заблішчала раса на траве і лісці, цеплынёю і парнасцю дыхнула зямля. Туман, што быў дзенідзе завалок лагчынкі, заварушыўся, папоўз бліжэй да кустоў. Рыкнула недзе ў вёсцы карова, заекатаў, заліўся брэхам сабака. Цэлая чарада чэкавак — старыя і маладыя — шумна сыпанула з-пад ног — няйнакш, латашылі спелую касцяруху.

«Ніхто так і не прапалоў сёлета бульбы. Не да таго было,— падумаў са шкадаваннем Мікалай.— Пасеецца зелле, не выведзеш пасля. Гады трэба...»

Не так, не так, як павінна б, як хацелася, усё ішло і рабілася. То калгасы, а цяпер... Вайна. «Бачыш, немец ужо аж сюды дапяў... Сустракаць трэба... І кеб жа прыйшоў і пайшоў. А то ж... Не, не пойдзе так адразу. Пабудзе тут. Колькі пабудзе? Кеб тыдзень-два, можна б было і схавацца, у лесе пераседзець, перачакаць. Але ж... Можа і затрымацца. На восень усю... А то і на зіму... І жыць як, калі такія людзі за камандзіраў, як Бабай?..»

Аж перасмыкнула, затрасло ўсяго Мікалая.

«Еты... Дабра не зычыць... Чакаць ад яго можна... Хіба пакасці... А бараніцца?.. Як ад яго абаронішся? Во, заявіць, што загадваў немцаў сустракаць, а я не сустракаў, і... Капцы, капцы мне...»

«Але ж я... Няўжо з усёй вёскі толькі я такі, няўжо астатнія вынесуць з хаты сталы з хлебам-соллю?»

«Што ты сябе раўняеш да астатніх? У астатніх сына такога няма, Івана...»

«Усе ж ведаюць, як я з Іванам жыў... Дый не адзін у мяне сын Іван. І дачка, Параска, і Косцік, Піліп ёсць...»

Палягчэла, быццам адлягло ад сэрца, калі згадаў Піліпа.

«Жывы Піліп,— агортвала, расплывалася радасць.— І, бачыш, дадому не захацеў вяртанца... Далей, далей пайшоў. Добра ета ці дрэнна?»

Задумаўся, зноў задумаўся Мікалай.

«З аднаго боку... Быццам добра. Во няма яго тут, то і клопату няма. Немцаў не трэба сустракаць... З Клаўдзяю сварыцца... Ды і... Клаўдзі ж самой няма... Як пагнала кароў, дык і няма, не вяртаецца. Кеб Піліп дома быў, пэўне б, трывожыўся. А так няма яго — і клопату няма... З другога ж боку... Быў бы Піліп у вёсцы, на вачах увесь час... І яму, бацьку, можа б, лягчэй было. Не думаў бы кожную хвіліну: «Дзе, дзе Піліп? Што з ім?» Ведаў бы пра сына ўсё. А так... Ды і калі што якое, абараніў бы Піліп яго, бацьку... І ад немцаў, і ад Бабая...»

Не ўтрываў — плюнуў сабе пад ногі, вылаяўся:

— Поскудзь! І трэба ж яму было на хронт не пайсці, тут, дома, у Вялікім Лесе астацца...

Паддаў кроку, шпарчэй нагамі пачаў перабіраць.

«Іван... Мяне не абароніць. Кеб сам як-небудзь абараніўся. Сям'ю, бачыш, некуды звёз, а самога... Кажуць, бачылі яго людзі, па лесе, як воўк, сноўдаецца. А есць дзе, дзе начуе?.. Жонкі ж, сям'і тут нямашака. І да Парaскі не заходзіць. Папаўся Іван. Адказваць давядзецца. І што ў начальстве быў, што камуніст, у партыю ўпісаўся... Во, прыедуць немцы — і адказвай...»

Скрабанула між лапатак, халадок прабег па ўсім целе.

«Застрэліць жа могуць. А што? Хіба ён родны ім, хіба шкада? Як Тхорыкаву маці, Сахвею, некалі... Махнуў ірад шабляю — галава і зляцела...»

Пацямнела ўваччу. Хвілін колькі ішоў, як уночы, не бачачы нічога перад сабою, не чуючы ног.

«Але ж немцы могуць і не прыехаць сёння...»

«Бабай жа казаў...»

«Мала што казаў. Надта ведае ён, знахар етакі...»

Спыніўся, хвілін колькі стаяў у нерашучасці, разгубленасці.

«Хіба вярнуцца, не ісці нікуды?»

«Але ж тады... Стол на вуліцу трэба выносіць, хлебам-соллю чарцей лазатых сустракаць... Бабая слухацца...»

«Не, лепей у лесе быць. А кеб ведаць, прыедуць немцы ці не прыедуць, да дарогі блізка падыду. Лягу ў траву ці за камель дрэва захінуся... І глядзецьму, вачэй з дарогі не спускацьму. Мяне не ўбачаць, а я... Убачу... Усё, усё ўбачу».

Ногі, здаецца, самі збочылі са сцежкі, зашасталі па пакошы, па мяккай сакаўной атаве — напрасткі па лузе Мікалай пакіраваўся да лесу, бліжэй да той дарогі, што вяла з Ельнікаў у Вялікі Лес.

## X

Як ні бегаў, як ні шчыраваў Яўхім Бабай, не ўдалося яму знайсці тых, хто б згадзіўся сустракаць хлебам-соллю немцаў. Усе рашуча не тое што адмаўляліся, а неяк хітравалі, знаходзілі розныя прычыны, каб убаку быць, не паказвацца чужынцам на вочы, лішне не вытыркацца. Нават Адам Зайчык не паддаўся на ўгаворы.

— А чаму ета іх трэба сустракаць? — запытаў ён, калі Яўхім Бабай пераступіў парог хаты і сказаў, чаму ён завітаў.— Ну, прыйдуць, дык хай ідуць. А сустракаць... Ды яшчэ хлебам-соллю...

— Сказалі, хто не сустрэне, таго застрэляць,— кінуў сваю казырную карту Яўхім Бабай.

— Ого,— усклікнуў Адам Зайчык.— Што ж, тады ты адзін на ўвесь Вялікі Лес жыць астанешся. Радуйся.

І так паглядзеў на Яўхіма Бабая, што таму нічога не аставалася, як моўчкі пайсці, зачыніць за сабою з другога боку дзверы.

Дадому, у сваю хату, Яўхім Бабай вярнуўся, як бура,— насуплены, злосны. Крыкнуў яшчэ з парога жонцы, Соньцы:

— Ну, дзе хлеб твой?

— У печы, пячэцца,— адказала не надта прыветна тая.— Сядзь паснедай, а то гойсаеш, як сабака, ад двара да двара...

— І ты б... Гойсала,— узарваўся, вызверыўся Яўхім.— З такімі людзьмі хіба зробіш што!

— А што ты зрабіць хацеў? — пытала, быццам нічога не ведала, Сонька.

— Як?! Немцаў жа сустракаць трэба.

— Сустрэнеш. А не сустрэнеш, таксама добра будзе. Не вялікія паны.

— Што-о? — зароў, затупаў Яўхім.— Ды ты... Уяўляеш, што яны зробяць? Яны ж усіх, да чалавека, пастраляюць.

— Глядзі, каб цябе першага не застрэлілі.

— Чаму ета яны мяне застраляць? Ды яшчэ першага? — насцярожыўся, паглядзеў са спалохам на Соньку Яўхім.

— Бо паперад бацькі ў пекла лезеш. Сядзі ціха і не бойся ніякага ліха...

— Вумная вельмі, не мянці языком вато.

Але задумаўся, задумаўся Яўхім над словамі жонкі, да стала прысеў. Сонька парашыла: снедаць будзе. Булёну картаплянага ў міску наліла, пад самую пысу мужу падсунула. Лыжку, фартухом абцёршы, на стол палажыла, хлеба лусту ад бохана ачарсцвелага адкроіла. Але Яўхім не еў, не дакранаўся да яды. Сядзеў, падпёршы рукою галаву, і быццам не бачыў, што перад ім міска з булёнам стаіць.

— Сонька,— адарваўся раптам ад думак Яўхім.— Давядзецца, мабуць, нам з табою ўдваіх немцаў ісці сустракаць.

— Чаму ета нам з табою ўдваіх? Хіба людзей няма? — запытала здзіўлена Сонька.

— Няма,— не падымаў галавы, глядзеў некуды ў падлогу Яўхім.

— Дык пашукай.

— Шукаў.

— І што?

— Кожны хітрыць, схавацца хоча.

— А я пра што? Сядзі ціха і не бойся ніякага ліха. А ты...

— Сонька! — грукнуў кулаком па стале, аж булён лінуўся з міскі, Яўхім.— Не вучы вучонага!

— А я і не вучу. Я раю, перасцерагаю,— ані не баялася, не палохалася Сонька, звыклая да мужавага гневу.

— Позна раіць і перасцерагаць. Цяпер сустракаць трэба! Разумееш, суст-ра-каць! — падняў вочы на жонку, ледзь не з плачам вымавіў Яўхім.

Не хацелася і жонцы, Соньцы, ані не хацелася ісці сустракаць немцаў. Не толькі таму, што тыя былі зусім незнаёмыя, чужакі, але і таму, што не прывыкла яна выстаўляцца наперад іншых, паказвацца на людскія вочы.

Ды і аслухацца мужа, не зрабіць таго, што ён кажа, загадвае... Не, не магла, не магла Сонька.

— А ці нельга... кеб і нам не сустракаць? — спытала асцярожна ў Яўхіма.

— Нельга.

— Чаму нельга?

— Калі кажу нельга, значыцца, нельга,— грукнуў зноў кулаком па стале Яўхім.

З хаты выйшлі ў позняе снеданне. Са сталом, засланым чыстым палатняным абрусам, на якім, акрыты ручніком, ляжаў круглы, толькі што выняты з печы бохан яшчэ цёплага, духмянага хлеба. Сонька была апранута пасвяточнаму — у белую вышываную кофту, андарак, нават фартушок падперазала. Яўхім таксама паднядзеліўся — пагаліўся, боты дзёгцем наквэцаў, ды і штаны чорныя, кашулю крамную, куплёную, надзеў. Ішлі з жонкаю, быццам на вяселле, несучы кожны са свайго боку стол. Адчувалі, бачылі: за імі сочаць, цікуюць вяскоўцы. З вокан хат, з-за шулаў, парканаў. Была ў людскіх вачах і звычайная цікаўнасць, быў і страх, была і нянавісць, агіда.

— Нічога,— шаптаў Яўхім Бабай жонцы, Соньцы.— Наша верх возьме. Не памыляўся яшчэ той, хто да ўлады гарнуўся...

— Разбярыся, дзе цяпер тая ўлада,— бурчала ціха сама сабе пад нос Сонька.

— А што тут разбірацца? Дзе сіла, там і ўлада.

— Дык сіла ж... І ў тых, і ў етых ёсцека.

— У каго ета — «тых» і «етых»?

— Ды і ў бальшавікоў, і, мабуць, у немцаў.

— У бальшавікоў была сіла, але пагула. Разбілі немцы бальшавікоў.

— Калі немцы разбілі бальшавікоў, дык чаго ж тады Іван Дарошка і Васіль Кулага ў нас камандуюць?

— Адкамандавалі ўжо Іван Дарошка і Васіль Кулага. Скончылася іхняе,— вёў сваё, пераконваў жонку Яўхім Бабай.

— Як жа адкамандавалі, калі яны і цяпер камандуюць?

— Немцы прыйдуць — новае начальства паставяць.

— Каго?

— Адкуль я ведаю?

— Думаеш, цябе?

— Можа, і мяне,— выставіў каралём грудзі Яўхім Бабай.

— А калі не цябе? — пытала — хацела ведаць Сонька.

— Можа, і не мяне,— лёгка згаджаўся з жонкаю Яўхім.— Знойдуць, каго паставіць. Ім не загадаеш.

— Значыцца, з тых, хто іх не сустракае,— разважала па-свойму, па-жаночы, Сонька.

— Можа, і з тых.

— Дык навошта тады нам... Лепей дома сядзець, як і ўсе.

— Сам ведаю, што лепей,— адгыркнуўся Яўхім.— І змоўкні, хопіць зубы паласкаць...

— Ты ж сам пачаў.

— Я пачаў, я і скончыў.

— Скончыў ты, скончыла і я.

Сонька спынілася, паставіла стол проста на дарогу, у пясок.

— Чаго ета ты? — зыркнуў злосна спадылба на Соньку Яўхім.

— А таго... Рука забалела...

— Гы-ы,— засоп у нос Яўхім.

Але сварыцца, падганяць жонку не схацеў. Сам спыніўся, паставіў свой край стала ножкамі на дарогу, у пясок: стол быў дубовы і сапраўды цяжкі.

— А соль... Соль ты ўзяла? — успомніў раптам, спытаў Яўхім у Сонькі.

— Соль? Не, я не брала,— пакруціла галавою Сонька.

— Разява,— накінуўся на жонку Яўхім.— Вечна ты што-небудзь забудзеш.

— Я забуду, дык хай бы ты ўспомніў. Ходзіш толькі ды крычыш, камандуеш. А кеб самому зрабіць што...

— З табою нешта надта зробіш. Лахудра,— кінуў ён на жонку абразлівае, крыўднае.

— А ты таўкач,— не асталася ў даўгу перад мужам і жонка.

— Сціхні! — зашыпеў Яўхім.— Лепш вярніся соль вазьмі. Разам з сальніцаю.

Пабегла, папыліла андараком Сонька назад да сваёй хаты. Вось яна наблізілася да двара, схавалася на хвіліну ў сенцах, потым паказалася з вялікаю, зробленай з бяросты, сальніцаю ў руках зноў на вуліцы. Ужо не бегла, а ішла, запыхаўшыся, праўда, хутка-хутка, да мужа. Ля стала прыпынілася, паставіла на абрус сальніцу — запэцканую бруднымі рукамі, заседжаную мухамі.

— Хоць бы памыла,— пакасіўся на жонку Яўхім.

— Кеб ты менш камандаваў, я б усё зрабіла,— агрыз-

нулася жонка.— Дык... Правяраеш, аконамам, цівуном нада мною стаіш.

Узяла са стала сальніцу, хацела назад зноў у свой двор вяртацца.

— Куды ты?

— Сальніцу мыць.

— Няма калі,— спыніў Соньку мужаў вокрык.— Спяшацца трэба. А то прыедуць, а нікога нідзе няма, ніхто не сустракае...

Узяліся кожны за свой край, панеслі стол далей. Ужо моўчкі, не размаўляючы, не сварачыся.

## XI

Толькі цяпер па-сапраўднаму адчуў Хомка ўвесь цяжар той ношы, якую ўзваліў сабе на плечы, згадзіўшыся гнаць у тыл кароў. І скінуць як з сябе ношу тую, дзе паратунку, абароны шукаць, рабіць што, каб і самому жыць астацца, і кароў абы-каму не аддаць, без нагляду ўсялякага не пакінуць? Не стрэмкай, а ўжо цвіком сядзела ў галаве: што Васілю Кулагу ён, Хомка, скажа, як людзям у вочы паглядзіць, калі спытаюць, што з каровамі, дзе яны?

Пачынала распагоджвацца, выбліснула нават з-за хмар сонца, цёплае, іскрыстае. Але не радавала, ані не радавала яно Хомку.

«Ета ж так трапіў... І выблытацца, як выблытацца?.. А тут яшчэ Клаўдзя етая... З бамбізам, Змітром...»

Аж закалаціўся, калі ўспомніў Клаўдзю, Змітра...

«Ета ж добра, што так усё абышлося... А то ж... Забіць мог, знявечыць... Такі не пашкадуе. Што захоча, тое і зробіць... Галаварэз... І знайшла ж... Падабрала, што другія абыходзілі, міналі...»

Павярнуў галаву, з нянавісцю, агідай паглядзеў туды, у той бок, дзе стаяла падвода, дзе зусім нядаўна пераўжыў і ганьбу, і страх, дзе былі яны — Клаўдзя, Змітро. Адчуў, як ніколі раней не адчуваў, сваё бяссілле, няможнасць знайсці ўправу, даказаць, што нельга рабіць так, як яны, нахабы, робяць, што за ўсякае зло і прымус трэба адказваць. Калі не перад людзьмі, дык перад богам.

«Пайсці хіба начальства ці міліцыю пашукаць?..»

Але праз хвіліну астудзіў сябе, прыглушыў гнеў — успомніў, які няпэўны цяпер час і дзе ён, Хомка, знаходзіцца.

«Не дома ж я... Нават калі знайду каго-небудзь з на-

чальства, ці захочуць умешвацца, займацца Рыжым...»

«Але ж і даравацъ...»

Не мог, не мог даравацъ Хомка здзеку, ганьбы, таго, што так неспадзявана перажыў зусім нядаўна.

«Кеб нейкі прыблуда, прайдзісвет ды так абыходзіўся са мною... Не!»

Падхапіўся на ногі, пакрочыў, пакульгікаў, сам яшчэ добра не ведаючы, не цямячы куды.

— Дзядзька! Дзядзька-а! — пачуў ён раптам знаёмы голас.

Спыніўся, азірнуўся. Крычала, клікала яго Надзя.

— Чаго табе? — спытаў быццам раздражнёна.

— Куды вы?

— Я...

І папярхнуўся, не ведаў, што адказаць.

— На пераправу...

— Чаго?

«І праўда, чаго мне на тую пераправу?»

— Начальніка пашукаю... Спытаю, што далей рабіць... І з каровамі, і з...

І не сказаў, з кім яшчэ.

— А мне... Што рабіць мне? — пытала, па ўсім відаць, зусім разгубіўшыся, Надзя.

— Табе?

Задумаўся, задумаўся Хомка.

— Ты... Можа, тут, ля кароў, аставайся.

— А з вамі... Нельга?

— Са мною?

Зноў задумаўся Хомка.

— А чаго табе са мною? — спытаў.

— Баюся адна тут аставацца.

— Чаго ты баішся?

— Рыжага.

Надзя, босая, у чорнай змятай крамнай спадніцы, накінутым на плечы лёгкім квятастым сачыку, стаяла ля раскідзістага куста арэшніку і сціналася, калацілася — ці то ад страху, ці то ад холаду. І была яна нейкая маленькая, напалоханая — не дзяўчына, а зусім-зусім дзяўчо. Шкада Хомку зрабілася Надзі.

«Ды калі што якое здарыцца з ёю... Увесь век каяцца будзеш, папракаць сябе... Ды і перад Мацеем, Мальвінаю... Не, нічым не апраўдаешся...»

Хоць і злавала, неаднойчы выводзіла з сябе Надзя ў дарозе, але адчуў Хомка раптам — ані не было ў яго

крыўды на яе. «Неразумная яна,— падумаў.— Калі што і рабіла насуперак, дык не таму, што мяне ненавідзела ці знарок прыкрасць хацела зрабіць, а таму, што побач з ёю Клаўдзя была, вучыла яе не слухацца, на паскудства штурхала...»

— Ладна, хадзем са мною,— сказаў Хомка прымірэнча, ужо больш лагодна, мякка.

Надзя мігам дагнала Хомку, пайшла з ім амаль поплеч. Крокаў праз колькі прызналася:

— А я спалохалася... І цяпер яшчэ дрыжыкі б'юць...

— Чаго спалохалася? — паглядзеў на Надзю Хомка — і праўда, Надзя ўся траслася, калацілася, аж белая, як палатно, была.

— Ну, калі Рыжы загрудкі вас схапіў, на зямлю кінуў. Я думала, біць будзе, нагамі таптаць. А тут яшчэ Клаўдзя етая: «Ой, дай, дай яму, Змітро». А ён, еты Змітро... Праўда ж, не чалавек, а звер. І твар у яго нялюдскі, і сам...

Хомка ўнурыў у плечы галаву, нічога не адказаў. Ды і што было адказваць? Прызнавацца, што і ён спалохаўся, што і ён тое ж думаў, што думала і Надзя?

— Рыжы — ета не самае страшнае,— вымавіў нарэшце Хомка.

— А што самае страшнае?..

— Самае страшнае — вайна,— панура, як бы з роздумам, адказаў Хомка.— Яна, праклятая, хавае з вачэй людзей добрых і выкідвае на паверхню, на свет божы такіх во... І такія во суд свой над людзьмі несправядлівы вяршаць, парадкі свае несправядлівыя наводзяць... І заступіцца... Няма каму, няма дзе абароны шукаць. Во, во што самае страшнае...

Выйшлі на луг, парыты кратамі, скапычаны да чарнаты коньмі і каровамі. Напрасцяк падаліся да Дняпра, што шырокай звілістай падковай люстраваўся, святлеў удалечы.

Але да Дняпра не дайшлі — аднекуль з-за лесу нечакана вынырнуў самалёт, за ім — другі, трэці, чацвёрты... Аглушаючы сваім ровам і свістам, самалёты пранесліся нізка-нізка над пераправаю, вярнуліся і закружылі, як каршуны. Вухнула дзесьці збоку, і раптам усё навокал уздыбілася, напоўнілася выбухамі, стралянінаю.

Ногі не ўтрымалі Хомку, падагнуліся, і ён, міжвольна, зняможана паваліўся на зямлю. Закрычаў апантана, убачыўшы паблізу сябе Надзю, якая ўсё яшчэ стаяла і, як бы зачараваная, не зводзіла вачэй з неба, з самалётаў.

— Падай, на зямлю падай!

— Што? — не зразумела, а мо не пачула Надзя.

— На зямлю, кажу, падай!

І, не чакаючы, калі Надзя зразумее, пачуе, падпоўз да яе, схапіў за нагу, пацягнуў да сябе. Надзя як стаяла, так і пляснулася, упала на зямлю.

І добра, што Хомка здагадаўся зрабіць гэта. Бо ў наступную хвіліну зусім, здаецца, побач вырас чорны куст зямлі. Вухнула, а потым і страсянула так, што Хомка ажно ўхапіўся рукамі за траву, бы ўсё адно за грыву каня, калі той занатурыцца, спрабуе скінуць з сябе седака.

— Божа, даруй грахі мае! — прастагнаў, хрысцячыся і як бы каючыся.

Са свістам нешта праляцела над галавою, гучна чмякнулася.

— А-а! — пачуўся ў той жа міг немы крык Надзі.

Хомку як ветрам здзьмула — падхапіўся на ногі, спытаў:

— Што з табою?..

Надзя была жывая. Нават не параненая. Ляжала з перасмыкнутым ад страху тварам і з жахам глядзела на тое, што толькі што ўпала, чмякнулася вобземлю зусім побач з ёю.

Гэта была нага... Акрываўленая чалавечая нага... У чаравіку, са шкарпэткай...

У Хомкі аж мову адняло, хвілін колькі ён стаяў і ўсё глядзеў, глядзеў на акрываўленую чалавечую нагу, не ў змозе ні слова сказаць, ні вачэй адвесці.

Вухнула, страсянула зямлю зноў і зноў, ужо далей,— ці не ў тым ляску, дзе пакінулі кароў?

— Дзядзька, дзядзька-а! — раўла нема, не магла супакоіцца Надзя.— Уцякайма!.. Уцякайма адсюль!

— Куды-ы ўцякаць? — авалодаўшы сабою і голасам, запытаў Хомка.

— Куды-небудзь. Абы тут не быць...

— А з каровамі... Як жа? — адвёў нарэшце вочы ад акрываўленай нагі, паглядзеў на Надзю Хомка.

— З каровамі?.. Хай яны падохнуць, тыя каровы... Загінуць праз іх... Можам...

Спрачацца з Надзяю, даказваць нешта сваё Хомка не стаў. Не да таго было — самалёты маглі з хвіліны на хвіліну вярнуцца і зноў пачаць бамбіць. Трэба было, пакуль не позна, уцякаць, ратавацца. І Хомка, яшчэ раз зірнуўшы на голую, абутую ў стары, паношаны чаравік акрываўленую

чалавечую нагу, як не бегма кінуўся далей ад пераправы, туды, дзе, ахутаны смугою, сінеў удалечы, звабліва цягнуў да сябе лес.

## XII

І раз, і два, і тры, і... Ды хто палічыць, колькі разоў спыняўся ні з сяго ні з таго раптам Апанас Харчэня, ахоплены нечаканай думкай, і зноў, зноў вяртаўся назад, да Дняпра.

«Можа, немцы не ўсюды падышлі да ракі, можа, можна яшчэ як-небудзь пераправіцца на другі бераг?»

Абыходзіў здаля дарогі, дзе па лесе, а дзе па полі, па лузе краўся назад, да Дняпра.

«Ну і што, як не ўсюды ля ракі яшчэ немцы, ну і што, як перапраўлюся на другі бераг? Прайду дваццаць, трыццаць, няхай нават сто кіламетраў. Але ж немцаў ніхто не спыніў, яны наступаюць і рана ці позна мяне дагоняць. Што тады рабіць? Ісці, вяртацца назад у Вялікі Лес? Калі так, дык навошта ж перапраўляцца, толк які з маёй пераправы?..»

І Апанас спыняўся, стаяў нейкі час у нерашучасці. Потым паварочваўся, зноў кіраваўся ў супрацьлеглы бок, у сваю вёску...

І зноў, адмахаўшы кіламетраў колькі, спыняўся.

«А раптам усё ж удасца ўцячы ад немцаў, не дагоняць яны мяне?»

Крута паварочваў, браўся назад, да Дняпра...

Харчы ў Апанаса даўно скончыліся, у торбачцы за плячыма ў лепшым выпадку матлялася некалькі пячонікаў ці яблык, сарваных выпадкова ў чым-небудзь садзе. Апанас пахудзеў, штаны ледзь трымаліся на ім, з'язджалі, як з калка. Яго цкавалі сабакамі, калі ён залазіў, шукаючы, чаго б паесці, у людскія гароды, ганяліся, як за злодзеем.

«Не, годзе мне валэндацца, як непрыкаянаму, па свеце. Дадому, у вёску сваю, кіравацца пара. Там хоць яды будзе хапаць, галадаць не буду,— думаў, казаў сабе Апанас.— А то ж... Быццам астрожнік я, быццам дамоўкі ў мяне няма. Ды і мучыць столькі навошта сябе, у чым я перад кім правінаваціўся?»

«Але ж і дадому, у вёску сваю, ісці? — спыняла яго спасцярожлівая, палахлівая думка.— Там жа таксама, мусіць, ужо немцы. Дзе быў я? Чаму ўцякаў ад іх? Давя-

дзецца, мусіць, тлумачыць. І немцы... Ці даруюць мне? Каб хоць не ўцякаў я ад іх, а то ж... Невінаватыя не ўцякалі, дома сядзелі. А я ўцякаў, баяўся...»

Адчуваў, разумеў Апанас: нельга яму быць такім нерашучым, пэўнасць нейкая быць павінна. Ці на той, другі, бераг Дняпра перапраўляцца, ці... Вяртацца, нягледзячы ні на што, дадому, у сваю вёску.

«А дзе мне лепш будзе?»

І не ведаў, не ведаў даўно ўжо Апанас Харчэня, дзе яму лепш будзе — у выгнанні ці дома, у сваёй вёсцы.

«Мабыць, усюды аднака. Там добра, дзе нас няма»,— прыходзіла на памяць чутае, і Апанас згаджаўся з народнай мудрасцю.

Аднаго дня ён ледзь не напароўся зноў на немцаў. Яны — на машыне-грузавіку і трох матацыклах з калясамі — ехалі кудысьці па дарозе і прыпыніліся на ўзлеску — ці не на перакур, а ён, Апанас, нічога пра тое не ведаючы, краўся да поля, каб накапаць бульбы. І аж самлеў, убачыўшы крокаў за колькі ад сябе немцаў — яны, седзячы на траве, гучна смяяліся, рагаталі, слухаючы, што расказваў ім, мусіць, афіцэр, бо быў не ў пілотцы, як усе астатнія, а ў высокай, з выгнутым верхам, фуражцы. Апратаўшыся трохі ад нечаканасці і страху, Апанас захінуўся за камель тоўстага карыстага дуба і цікаваў за гэтымі чужымі і незразумелымі яму людзьмі, што не выпускалі нават у час адпачынку са сваіх рук аўтаматаў, трымалі іх напагатове.

Калі немцы пазалазілі ў кузаў машыны-грузавіка, паселі на матацыклы і паехалі некуды далей па дарозе, Апанас, счакаўшы трохі, наблізіўся да таго месца, дзе яны рабілі прывал, пахадзіў па ўзлеску. Знайшоў кавалак газеты — не сваёй, а чужой, нямецкай,— доўга ўчытваўся ў надрукаваныя чорнай фарбай словы, намагаючыся зразумець ці хоць бы здагадацца, пра што там пішуць. Спыніўся разоў колькі на словах «Smolensk», «Moskau».

«Няўжо немцы і праўда Смаленск узялі, да Масквы дайшлі?»

Аслупянела, як аглушаны, стаяў, не зводзіў вачэй з кавалка газеты, сілячыся зразумець, даўмецца, што там было надрукавана.

«Можа, пакуль я па лесе сноўдаюся, пакуль хаваюся, і вайна ўжо скончылася»,— цюкнула яму.

«Не, не можа таго быць! — пратэставала, не згаджалася ўсё Апанасава нутро.— Надта ж імкліва, хутка ўсё гэта».

«Хутка? Дык жа на самалётах, танках, машынах, матацыклах немцы. Гэта ж не пешкі, не на конях...»

«Усё адно. Дый... Нават калі Маскву возьмуць, вайне не будзе канца. Вунь Напалеон Маскву браў... А потым што было?»

«Раз на раз не выпадае. Тады так было, а цяпер усё інакш можа быць. Нішто не паўтараецца двойчы...»

«Ведаю».

«А калі ведаеш, дык навошта супакойваеш сябе, цешыш тым, што калісьці было? Было — і няма».

«Што ж рабіць?»

«Зноў тое самае! Ды зразумей, уцям, нарэшце,— ніхто за цябе думаць і вырашаць нічога не будзе. Сам думай і вырашай. А то — ні сюды, ні туды. Быццам прывязаў цябе хто да гэтай ракі. То адыдзешся, то зноў назад вернешся».

Неяк, седзячы ў кустах, убачыў, як праязджала па дарозе непадалёку падвода і на ёй, той падводзе, плячысты дзяцюк абдымаў грудастую маладзіцу, і тая не ўхілялася, не выкручвалася, а гулліва, бесклапотна смяялася. І падвода тая доўга-доўга была ў вачах, душу вярэдзіў вясёлы, бесклапотны жаночы смех.

«Бачыш, жывуць людзі і пры немцах. І ездзяць кудысь, і абдымаюцца, смяюцца».

«Яны ў камсамоле не былі, у сельсавеце не працавалі».

«Адкуль ты ведаеш? Наадварот, можа, і ў большых начальніках, чым ты, хадзілі».

Рашуча, ужо не азіраючыся назад, на раку, пакрочыў напрасткі да лесу — там, у лесе, была дарога, якая — Апанас пра гэта здагадваўся, нават ведаў — вяла дадому, да маці.

## XIII

Ішоў, непрыкметна набліжаўся надвячорак, а Андрэй Макаравіч і Аліна Сяргееўна ўсё сядзелі ў бярэзніку, не ведаючы, што ім далей рабіць. Адчувалі, разумелі: нельга вось так больш сядзець, трэба рушыць у дарогу, ісці. А куды?

У бярэзніку, асветленым нізкім, але яшчэ даволі спякотным сонцам, якое ўжо даўно паволі падавалася, хіліла на заход, было зацішна, суха, цёпла. Нягледзячы на недалёкую восень, лес жыў тым актыўным, багатым жыццём,

якое заўсёды бывае ў канцы лета. Ляталі, пырхалі раз-пораз цэлымі чародамі-сем'ямі птушкі, мітусіліся, беглі то сюды, то туды, няйнакш, шукаючы спажывы, мурашкі. Ныў, цягнуў і цягнуў танюсенькім плаксівым галаском сваю надакучлівую, сумную песеньку адзінокі камар. Чэкаў недзе ў верхавінні дрэў дзяцел, ценькала сініца. Падзьмуў, дыхнуў ветрык — і бярозы загайдаліся, зашапталася лісце.

— Андрэй, га Андрэй,— азвалася, падняла галаву раптам, паглядзела на мужа Аліна Сяргееўна.— А калі нам... У вёску тую вярнуцца, дзе мы ў школе працавалі...

— У школе мы ва многіх вёсках працавалі,— выдыхнуў з сябе, прамовіў Андрэй Макаравіч.

— Ну, што каля Прыпяці! У Нараўлянскім раёне. Помніш?

— Кабашнікі?

— Ага.

Задумаўся, засяродзіўся ў сабе Андрэй Макаравіч.

— Што цягне цябе туды, у Кабашнікі? — спытаў праз некаторы час.

— Многае. І вёска надта ж ціхая, і людзі там добрыя, гаспадыня хаты, дзе мы жылі... Помніш, сама есці не сядзе, пакуль нас не пачастуе...

— Але ж там... Немцы ўжо.

— Адкуль ты ведаеш, дзе немцы, а дзе іх няма?

— Калі Ельнікі занялі, то, пэўна ж, занялі і Нароўлю. А хацелася б як можна далей ад іх быць.

— І мне таго б хацелася. Але дзе, скажы, тое месца?

— Недзе ж ёсць. Не можа быць, каб не было. І калі ісці, дык ісці не на захад, а на ўсход. Не да Прыпяці, а да Дняпра.

— А Ельнікі... Там жа немцы?

— Ельнікі і абысці кружной дарогай можна. Неабавязкова туды заходзіць.

— Тады трэба на Лоеў ці Камарын падавацца. Але і там... Таксама будуць ужо немцы.

— Будуць, дык будуць. А ў Нароўлі і Ельніках яны ўжо ёсць!

— То, можа, і ў Лоеве, Камарыне яны ўжо ёсць?

— Паглядзім. Калі там немцы, нешта прыдумаем. Нельга будзе праз Дняпро пераправіцца, знойдзем вёсачку глухую, паселімся ў ёй.

— І што?

— Навалу перабудзем, пажывем. Не вечна ж немцы будуць на зямлі нашай, прагоняць жа іх.

— Дык і ў Вялікім Лесе мы маглі пажыць, пачакаць, пакуль немцаў прагоняць.

— Маглі, вядома. Але Кухта гэты... Не падабаецца ён мне. Адчуваю — не дасць нам ціха, непрыкметна сядзець.

— Што ён нам зробіць?

— Можа, нічога і не зробіць, але лепей далей ад ліха быць. Ён прыслужваць немцам збіраецца, навідавоку хоча быць, то і нас у спакоі не пакіне. Бачыш, біяграфіі вывучыў, ведае, які ў каго бацька... Сам у яму лезе і іншых з сабою пацягне.

— Не пацягне, як не захочаш.

— Дык ніхто ж нашага хацення і пытаць не будзе. Не забывай, што гэта заваёўнікі, фашысты. Добра ж, як яны доўга не затрымаюцца, прагоняць іх. А як астануцца? Ды не на тыдзень, а на месяц, паўгода, год? Уяўляеш?

— Уяўляю,— сцепанулася, як ад холаду, Аліна Сяргееўна.

— Дай бог, каб не было таго, пра што я кажу. Але і быць можа, трэба быць да ўсяго гатовым. І ў Вялікім Лесе... Лепш не быць нам...

— Але ж і ісці — куды?

— Не ведаю. Ведаю толькі, адчуваю — ісці адсюль трэба. У гэтым я ўпэўнены, перакананы.

Падняўся, пастаяў.

— Вось што,— сказаў, трохі счакаўшы.— Давай усё ж паспрабуем да Дняпра, да пераправы дабірацца. Калі нельга будзе пераправіцца на другі бераг, падумаем, дзе нам спыніцца, пажыць. Свет не без добрых людзей.

Унурыўшы ў зямлю вочы, не адказвала, доўга не адказвала Аліна Сяргееўна. Сядзела на траве і глядзела, глядзела перад сабою, мабыць, нічога не бачачы, паглыбіўшыся, засяродзіўшыся ў свае думкі-развагі.

— Што ж,— нарэшце прашаптала яна зусім ціха, шэптам.— Калі ты так лічыш... То я... Гатова...

І адвярнулася, заплакала...

— Што, вось зараз і пойдзем? — спытала.

— Не, калі змеркнецца. З Кухтам не хочацца яшчэ раз сустракацца. Няхай думае, што нас угаварыў, што мы назад вярнуліся, у Вялікі Лес пайшлі.

— Але цемнатою, уночы? — пацепнула плячыма Аліна Сяргееўна.— У нашы гады, з нашым здароўем?

— Нічога не зробіш,— развёў рукамі Андрэй Макара-

віч.— На тое вайна. І не спаць, і не есці давядзецца, і цемнатою, уночы тэпаць. Іншага выйсця няма. Няма,— паўтарыў ён і зноў сеў, апусціўся на траву, задумаўся.

Перастала плакаць, задумалася над тым, што чакае іх з мужам наперадзе, у дарозе, і Аліна Сяргееўна.

А сонца між тым заходзіла, падала ніжэй і ніжэй на лес, сцелючы ўсюды па доле доўгія, худыя цені.

## XIV

Аж вочы, здаецца, праглядзеў Яўхім Бабай, чакаючы, што вось-вось, з хвіліны на хвіліну пакажуцца, выедуць з лесу немцы. І тады... Не разгубіцца б, не прамарудзіць. Схапіць у рукі хлеб-соль на палатняным ручніку, што ляжыць на засланым абрусам стале, выпнуць наперад грудзі, падняць высока галаву і сказаць гучна, натхнёна тыя словы, што так і вярцеліся на языку:

«Госцейкі дарагія, калі ласка, просім. Рады, бязмежна рады, што вы нарэшце прыехалі, завіталі да нас...»

«Не збіцца б, не забыць чаго-небудзь патрэбнага, важнага. Ды і голас кеб не як у пеўня недарэзанага быў...»

«Трэба было вады бутэльку з сабою захапіць... Горла б прапаласкаў. А то перасыхае...» — думаў Яўхім Бабай, глытаючы сліну, і не зводзіў, не зводзіў вачэй з дарогі, што шызым пакручастым паскам выбягала з лесу.

«А калі спытаюць, чаму адзін сустракаю, а не вёска ўся?» — халадзіла думка.

«Скажу — вёска ў нас дзікая... Звычаю такога не ведаюць людзі, кеб хлебам-соллю сустракаць...»

«Ці паверацъ?.. Я ж... Звычай ведаю, чаму іншых не навучыў?»

«І прызнацца, праўду сказаць... Нельга, нельга... І не сказаць... Таксама ж...»

«Трэба было не ўстраваць у етае дзела... Не пабег бы тады ў Ельнікі, з камендантам не ўбачыўся б... І сустракаць не трэба было б...»

«Але і не бегчы ў Ельнікі... Калі ўсё і ўсім даюць, усе валакуць, цягнуць сабе ў хлявы, у хаты... А табе няма... Нічога, ані няма...»

«А можа, немцы не прыедуць сёння ў Вялікі Лес, можа, іх не будзе?» — закралася, прыйшло, як супакаенне.

«Не павінна б... Сам камендант сказаў, што прыедуць... Каму ж тады верыць...» — адагнаў ад сябе гэтую нечаканую думку Яўхім.

«А раптам... І не прыедуць,— лезла і лезла настырна ў галаву.— Ці мала што магло здарыцца? А ты... Толькі шчыра скажы — хочаш ці не хочаш, кеб яны прыехалі?»

«І хачу, і не хачу...» — прызнаваўся, як на споведзі, Яўхім.

«Як ета — і хачу, і не хачу?..»

«Не хачу, бо адзін я тут... Ніхто з аднавяскоўцаў не выйшаў са мною... А хачу... Бо калі немцы не прыедуць... Я не сустрэну іх... Сораму ж не абярэшся потым. Давядзецца ісці са сталом зноў праз усю вёску, хлеб-соль несці... Бегаў, загадваў, прыстрашваў, і раптам...»

Аж пот халодны выступіў.

«Да скону, да самай смерці смяяцца, кпіць будуць. Пацяшацца...»

«Мга-а... І прыедуць немцы... І не прыедуць... Усё адно...»

«А ўсё ж... лепш, калі прыедуць ці калі не прыедуць?..»

Задумаўся, глыбока задумаўся Яўхім Бабай. І, можа б, здагадаўся, адказаў бы сам сабе, што лепш, каб не жонка, Сонька. Разнервавалася, рассепалася раптам ні з сяго ні з таго, ну проста не ўтрываць. І ўжо не пад нос бурчыць, а рукамі махае, крычыць. І на каго? На яго, Яўхіма. Лае з апошніх слоў немцаў, лае вайну, свет увесь...

— Змоўкні! — павярнуўся тварам да жонкі, вызверыўся Яўхім.— Тутака і так галава ад думак пухне, а ты...

— Не змоўкну! — аж тупала нагамі Сонька.— Дома работы столькі, а ты, як ёлуп, стой, чакай немаведама каго. Ды і ці прыедуць тыя чэрці лазатыя.

— Яшчэ раз кажу — змоўкні! — насупіў бровы Яўхім.— Язык распусціла. Яшчэ пачуе хто...

— Няхай чуе... Няхай ведае, што я ненавіджу...

— Каго ты ненавідзіш? — зашыпеў Яўхім.

— І немцаў, і цябе.

Даў бы, па мордзе даў бы за такія словы Яўхім жонцы, калі б гэта дома, у хаце, было. Але біцца тут, ля крыжа... Ды яшчэ ў такі час, калі вось-вось павінны былі паказацца, выехаць з лесу немцы... Толькі кулакі сціснуў, засоп, як звер, у ноздры Яўхім:

— І ты... Таксама абрыдла мне.

— Лепшай пашукай,— агрызнулася Сонька.

— Пашукаю.

І Сонька нейкім шостым ці сёмым пачуццём раптам

адчула, здагадалася, што не проста так сказаў Яўхім гэтыя словы, што за імі, гэтымі словамі, тоіцца сур'ёзны, надта сур'ёзны намер. Сказала, ужо мякчэй:

— Нехта пойдзе за цябе... Пабяжыць. Ёсць на што кваліцца...

— А што — няма?

— Няма,— як прысуд, зноў смела адказала Сонька, падумаўшы сама сабе: «А хай хвост не задзірае вельмі, не зазнаецца. А то, бач, наструніўся!»

— Калі я табе прыеўся... Дык...— не на жарт узлаваўся Яўхім.— Ведай — не заўсёды я такі буду...

— А які ж ты будзеш? — зацікавілася Сонька, радая, што нарэшце даняла, зачапіла за жывое мужа.

— Пабачыш вось... Няхай толькі...

Адчуў, як ніколі яшчэ, Яўхім, што трэба, трэба, каб як мага хутчэй у Вялікі Лес прыехалі немцы. Тады ён...

Не ведаў, не ўяўляў Яўхім, менавіта што зменіцца ў яго жыцці, калі ў Вялікі Лес прыедуць немцы, але што зменіцца штосьці — у гэтым перакананы быў, цвёрда верыў.

— Што «няхай толькі»? — дапытвалася Сонька.

Не стаў Яўхім тлумачыць, нешта казаць Соньцы. Адвярнуўся, зноў на дарогу, што ў Ельнікі бегла, пачаў пільна глядзець, падумаў сам сабе, нават вырашыў, цвёрда вырашыў: «А Соньку я кіну. Як толькі змены ў жыцці будуць, так і кіну. Новую вазьму сабе жонку. Аге, аге, вазьму. Лепшую».

«Ета каго ж?» — папытала ў яго нейкая цікаўная думка.

«Знайду каго,— рашуча адказаў Яўхім.— Мужчыны ўсе на хронце, хапае етага дабра. І дзевак, і маладзіц...»

Немцаў на дарозе не было — не паказваліся яны, не ехалі з лесу, хоць даўно, даўно поўдзень быў, пякло, аж смаліла, сонца. І парыла, парыла, усё адно што ўлетку, у сенакос.

«Кеб хоць навальніцы якой не нагнала. Бо варыць... Як у катле».

І, быццам пачуўшы Яўхіма, з-за лесу пагрозліва пачала выплываць, хутка-хутка набухаць, закрываць неба цёмна-сіняя, папялястая, аж чорная, хмара. Кашлянуў, грымнуў гром. Аднекуль падхапіўся вецер, запыліў, панёсся, як шалёны, па полі. Бліснула маланка, разрэзала агністым пісягом хмару, што ўжо схавала, закрыла сонца і клубілася, пухла над галавою. Ляснула так, што аж у вушах

зазвінела. І адразу ж лінуў дождж. Нават не дождж, а лівень — буйны, спорны, свету белага не стала відаць.

Думаць, што рабіць, каб не намокнуць, не было калі. Сонька, падхапіўшы рукамі андарак, кінулася, памчала з усіх ног у вёску. Яўхім гэта згледзеў, калі Сонька была ўжо далёка ад яго, ля канцавых платоў. Закрычаў, як ашалелы:

— Сонька-а! Куды ты?

Але Сонька нават не азірнулася — ці то не пачула, ці то не захацела азірацца — спяшалася схавацца ў чыю-небудзь хату ці хоць захінуцца пад страху.

А дождж ліў. Ліў як з вядра. І бліскала, бліскала раз-пораз, грымела. Ды так, што зямля пад нагамі стугнела, калацілася:

«Го-о! Го-го-го-о!..»

«Ай-я-яй, ета ж трэба!»

Схапіў са стала бохан хлеба, загарнуў, закруціў у ручнік, засунуў пад паху. Сарваў са стала абрус, накінуў на сябе, акрыў галаву, плечы.

Ды абрус мала ратаваў ад абломнага, раптоўнага ліўня. І Яўхім, упаўшы на калені, палез, папоўз наўколенках пад стол...

Навальніца шугавала ўсяго некалькі хвілін. Ветрам яе адагнала, аднесла на вёску, потым і зусім на балота. Выглянула зноў сонца, прыпарыла.

Яўхім выбраўся з-пад стала, агледзеў сябе. Штаны мокрыя, у гразі. Мокрая, у гразі і кашуля, ужо не гаворачы пра абрус, ручнік. Намок і бохан хлеба. Сальніца ж і зусім ляжала на зямлі — ці то са стала яе змяло ветрам, ці то сам Яўхім скінуў, калі хапаў бохан, акрываўся абрусам: соль з сальніцы высыпалася, перамяшалася з пяском. Вылаяўся са зла:

— І адкуль яе прынесла, етую навальніцу? Цяпер што хочаш, тое і рабі...

Не ведаў, хоць плач, Яўхім, як яму далей быць.

«Чакаць немцаў... Але ж сустракаць, як сустракаць іх цяпер?.. Мокры, брудны, ды і хлеб-соль... І дадому пайсці?.. Людзі ж засмяюць...»

Агледзеў, гэты раз больш уважліва, зноў сябе. Плюнуў са злосцю пад ногі:

— Цьфу! Сіраце жаніцца — ноч малая...

Соньці чакаць не стаў. Перавярнуў дагары нагамі, узваліў на плечы стол і, шырока расстаўляючы ногі — стол быў дубовы, цяжкі, ды і намок яшчэ,— паплёўся ў вёску,

бачачы, адчуваючы амаль усім сваім целам, нутром, што за ім сочаць людзі і, вядома ж, пацяшаюцца, смяюцца...

Але што рабіць было? Нічога іншага не аставалася, як ісці, вяртацца дахаты, несці, валачы на гарбу гэты — хай ён гарыць! — стопудовы стол.

## XV

Да дарогі, што вяла з Ельнікаў у Вялікі Лес, Мікалай дайшоў хутка. Спыніўся, пастаяў, паглядзеў у адзін, у другі бок — было яшчэ рана і свежых слядоў нідзе не відаць было, ніхто не паспеў пайсці ні туды, ні назад.

«Ды наўрад хто з Вялікага Лесу куды і пойдзе,— падумаў Мікалай.— Немцы ж сёння прыедуць. Калі хто і будзе адкуль ісці, дык хіба з Ельнікаў... Ці з Паташні, Рудні...»

Пераходзіць на другі бок дарогі не стаў, пабраўся па ўскрайку хвойніку далей, у глыб лесу, дзе было чарналессе, дубняк.

«Там схавацца лацвей... А тут, у хвойніку... Могуць мяне ўбачыць...»

Аж не па сабе зрабілася, калі падумаў:

«Як злачынец ці злодзей усё адно... Хаваюся... І дзе — дома, у сваім лесе, на сваёй бацькаўшчыне... Што я зрабіў такога, кеб хавацца? Не прыехалі яшчэ сюды немцы. А як прыедуць, абжывуцца?..»

Перахрысціўся, прашаптаў:

— Божа, даруй грахі мае, абміні, абнясі карай...

З хвойніку спусціўся ў лагчынку, што была перад самым дубняком. Лагчынка ўся густа зарасла маладым асіннікам, бярэзнікам, алешнікам, тут і там плёўся яшчэ зялёны, нідзе не пажоўклы ажыннік. Стаяла і некалькі старадрэвін — купка выносістых, медностволых соснаў і рэдкія, тоўстыя, у два-тры абхваты, дубы.

«А можа, далей нікуды і не ісці», — падумаў.

Сапраўды, месца, каб назіраць за дарогай, было зручнае. Лепшага, як бы і хацеў, не знойдзеш. І дарога добра відаць, праглядалася далёка наперад, і самому можна за дрэва захінуцца, схавацца. А то, калі нявыкрутка, і пабегчы, уцячы — па гушчары надта не дагоніш.

Наблізіўся да дарогі, пастаяў, паслухаў цішыню лесу. Нешта за спіною амаль нячутна зашамацела, прабегла. Інстынктыўна павярнуўся, схапіўся рукамі за сякеру. Усміхнуўся, убачыўшы вавёрку — яна лезла, узбіра-

лася па кары сасны ў галлё. Хутка, лёгка, толькі мільгаў пышны агністы хвост. Падумаў:

«Я хаваюся, дык скарджуся, праклінаю вунь усіх... А яна... Увесь век свой так жыве...»

Пайшоў да соснаў. Паволі, не спяшаючыся,— не было куды надта спяшацца. І раптам спыніўся, уражаны,— перад ім, у яміне, якую некалі выкапалі, насыпаючы дарогу, і якая ўся западала ліснем і ігліцай, сядзеў баравік. Вялікі, бы рэшата. Побач з гэтым баравіком вытыркаўся яшчэ адзін, меншы, а збоку, бліжэй да верасу, расло адразу некалькі, маладых, крамяністых, з чорнымі, аж дымнымі, галовамі.

«Глядзі, баравікі пайшлі, а ў вёсцы ніхто не ведае...»

Падышоў да самага вялікага, таго, што ўбачыў першага. Нагнуўся, вырваў. Дастаў з-за пояса сякеру, абрэзаў корань лязом. Корань быў не чарвівы, чысты. Край шапкі баравіка нехта надкусіў, на ім знаць былі тонкія зубы.

«Вавёрка, няйнакш, ласавалася...»

Задраў галаву, паглядзеў угору, у голле соснаў. Вавёркі нідзе відаць не было.

«Няўжо яна пераскочыла на іншыя дрэвы? Але ж тыя дрэвы ад соснаў далёка...»

Убачыў у адным са ствалоў дупло і здагадаўся пра ўсё — вавёрка ў ім і схавалася. Напэўна, тут і жыла...

Пахадзіў, патупаў наўкруг сасны; пазбіраў, пазносіў у кучу баравікі — іх, калі палічыў, было каля сарака. І амаль усе белыя, маладыя.

«Кашаля з сабою не захапіў. А то б... Баравікоў назбіраў»,— пашкадаваў Мікалай.

Ссек тры тоненькія, хлёсткія бярозкі, абцерабіў. Нанізаў на іх баравікі.

«А можа, па лесе прайсціся, грыбоў пашукаць?»

Ступіў крок, другі — і спыніўся.

«Што рабіць буду з імі, тымі грыбамі? — падумаў.— Ды і не таму, не таму прыйшоў я сёння ў лес...»

Сумота, глыбокая, як сусвет, сумота агарнула, спавіла раптам Мікалая.

«Шчыраваў... Дбаў... Вольнае хвіліны ніколі не меў... Хацеў, кеб і зямлі болей было... І ў хлявах кеб не пуста... І дзеці кеб добрымі, гаспадарлівымі выраслі... Жонку ў магілу ўвагнаў... З сынам, Іванам, пасварыўся... І што з усяго таго?.. Хаваюся во ў лесе, як злодзей, як злачынец... Дык ета ж вайна толькі сюды дакацілася... А як немцы прыйдуць?.. Што тады будзе?»

Як заўсёды, у хвіліны адчаю і паняверкі, пачаў маліцца:

«Божа, вярні спакой, упэўненасць і лад у душу. Вярні ўсё, што страціў, без чаго нельга жыць. Вярні Івана, Піліпа. Вярні Косціка, кеб ён быў такі, як раней, да таго, як прагналі яго са школы. І парадкі тыя ранейшыя вярні. Абы дзеці дома былі, абы я нічога і нікога не баяўся, смела, куды захачу, хадзіў...»

Зашасталі па дарозе крокі, пачулася сцішаная людская гамана.

«Немцы!»

Упаў, лёг на зямлю. А вочы... Вочы пільна, насцярожана глядзелі на дарогу.

«Кеб хоць... Мяне не ўбачылі...»

Пакраўся, папоўз да соснаў. Падняўся на ногі, захінуўся за камель.

Здзівіўся, убачыўшы на дарозе двух мужчын. Большага і меншага. У цывільным. З-за плячэй і ў аднаго, і ў другога вытыркаліся рулі вінтовак.

«Хто ета?..»

Калі мужчыны падышлі бліжэй, узрадаваўся: былі гэта Васіль Кулага і Іван, сын.

«Значыцца, праўду людзі казалі... Тут Іван. І з вінтоўкаю...»

Сцішыўся, стаіўся Мікалай, глядзеў, не спускаў вачэй з Васіля Кулагі і Івана, сына.

«Адкуль яны ідуць, дзе былі? Твары зямлістыя, змораныя, адзенне ў сене, у расе...»

У лагчынцы, непадалёку ад тых соснаў, дзе стаяў, стаіўшыся, Мікалай, мужчыны спыніліся. Іван працягнуў руку Васілю Кулагу, сказаў:

— Я далей не пайду.

— Што, у лесе астанешся? — спытаў Васіль.

— Пагляджу,— пацікнуў плячыма Іван.

Васілю, па ўсім відаць было, Іванаў адказ не спадабаўся.

— Ты б, Іван, хоць перада мной не таіўся. А то... Робім агульную справу — і баімся адзін аднаго, не давяраем.

— Не, не тое,— пакруціў галавою Іван.— Не крыўдуй... Проста... Сам не ведаю, дзе буду... Правільней, дзе мне быць...

— Абжываўся б ты як-небудзь.

— Не вельмі абжывешся, астаўшыся адзін. Без хаты,

без жонкі, без дзяцей. Ды яшчэ ў такой няпэўнасці...

— Няпэўнасць пакуль што астанецца. Але жыць... Трэба.

— Я і жыву,—усміхнуўся Іван.

І, павярнуўшыся, збочыў з дарогі ў хвойнік. Зрабіў некалькі крокаў, спыніўся.

— А з гэтай,— паказаў Іван на вінтоўку,— што ты рабіць будзеш?

— Не думаў яшчэ,— адказаў Васіль.

— Можа, схавай у лесе.

— А раптам спатрэбіцца?

Памаўчаў, падумаў Васіль Кулага і дадаў:

— Я ж таксама цяпер жыву... Не так, як жыў. Кожную хвіліну немцы прыехаць могуць... Ты ў лесе. А я ж...

— Разумею,— апусціў галаву Іван.

Пастаяў, потым раптам падняў вочы на Васіля.

— Сам глядзі, як табе лепей. І заўтра... Сустракаемся, як дамовіліся, на ўзлеску. Толькі ты...

Апусціў долу вочы, але ўсё ж сказаў:

— Яды якой з сабой захапі... Бо я, можна сказаць, галадаю...

І пайшоў, пакрочыў хутка-хутка ў хвойнік.

Васіль яшчэ некаторы час стаяў на дарозе, адчувалася, нешта, мабыць, хацеў сказаць Івану, але чамусьці не сказаў. Потым і ён, спярша паволі-паволі, пасля хутчэй, шпарчэй, падаўся далей па дарозе — няйнакш, дадому, у вёску.

«Вось дык «немцы»,— не ведаў, што думаць і рабіць, Мікалай.

Пастаяў, пачухаў кулаком патыліцу, узяў у рукі бярозавыя дубцы з нанізанымі на іх баравікамі і таксама пайшоў у хвойнік, заспяшаўся ўслед за Іванам.

«Яды якой з сабой захапі... Бо я, можна сказаць, галадаю»,— калола ў самае сэрца, гучала ў вушах прызнанне — пачутыя напаследак сынавы, Іванавы, словы.

## XVI

Не была, ніколі, здаецца, не была яшчэ такою шчаслівою Клаўдзя! Усё, што гадамі давіла, гняло, замінала жыць так, як хацелася, раптам дзе і падзелася, знікла. Быццам вызваліў хтосьці нябачны Клаўдзю, павалоку з

вачэй зняў. Стала ва ўсе бакі далёка-далёка і ясна відаць. Радасць, якая дагэтуль нізкім асеннім сонцам выблісквала калі-нікалі, і то на хвіліну, раптам запаланіла, перапоўніла — так, мабыць, б'е з падземных глыбінь вада. Ды і воля, воля, па якой засумавала Клаўдзя, была ў яе ўпершыню ў жыцці. Ніхто не стаяў над ёю, ніхто не камандаваў, нічым не папракаў. Што хочаш, тое і рабі, як хочаш, так і жыві. Наадварот, камандаваць — нават не камандаваць, а распараджацца — вучылася яна. Іншы раз адчувала сябе царыцай, каралевай, і ўяўлялася: варта толькі чаго пажадаць, папрасіць — яно будзе. Змітро, які з усімі быў жорсткі і суровы, перад ёю лагаднеў, рабіўся мяккі, як воск. І не было яшчэ таго, каб ён нешта адмовіўся рабіць, не паслухаўся Клаўдзі. Яму быццам нават прыемна было зрабіць ёй нейкую ласку, выканаць яе жаданне.

— Змітро,— шаптала яна час ад часу, млеючы ад шчасця,— і чаму я не сустрэла цябе раней?

— Раней? — перапытваў Змітро і задумваўся, змрачнеў.— Раней я далёка адсюль быў.

— То хай бы і я там была. З табою,— шаптала, заплюшчваючы вочы, Клаўдзя.

— Са мною? А ты хоць ведаеш, дзе быў я?

— Ты ж казаў — у зняволенні.

— А там... Уяўляеш, што там?.. Холад, голад. З аднаго месца ў другое пераганяюць. І кожнаму падчыняйся, што ні загадаюць, рабі. Немцы, дзякаваць богу, вызвалілі, а то б... І капыты задзёр.

— Чаго б ета ты? Такі здаравіла! Ды і выпусцілі б цябе, не век бы трымалі.

— Такіх, як я, не выпускалі. Я «сацыяльна шкодны элемент». І мне пра ета гаварылі, не хавалі.

— Мала што хто гаварыць мог. Адседзеў бы сваё — і выпусцілі б.

— Гы-ы, калі б так. А то ж... Тэрмін канчаўся, новы набаўлялі.

— Так ні за што ні пра што і набаўлялі? — здзіўлялася Клаўдзя.

— Не, чаму ж. Я казаў табе — рука ў мяне... Дакрануся да чалавека — той і...

— І што — у турме, у лагерах дакранаўся? — смяялася Клаўдзя.

— Не хацеў, а даводзілася. І да свайго брата, турэмніка, і пару разоў да канвойных...

— Чаму ж ты так?

— Бо ратунку не было. Каб баяліся, на шыю ніхто надта не садзіўся. Інакш... Заклююць... А я... Чалавек рашучы. Калі хто гладзіць супраць шэрсці, ваўком глядзіць... Не цярплю. Сказаў што — закон. Па-мойму будзе ці... Ніяк не будзе. Кажу, каб і ты ведала, не гнявіла ніколі мяне...

— Я? Ды хіба можна... Такога, як ты, не паслухацца? Ці пакрыўдзіць? Не, мне людзі рашучыя падабаюцца... Слімакоў не люблю. І нядошлых, кірхлявых. Свет толькі запаскуджваюць. А карысць з іх, толк які? І, як правіла, такія ўсіх і ўсё ненавідзяць. Кеб прымелі, кеб сіла і ўлада ў іх была... Ого, колькі б зла нарабілі.

— Трапіўся мне адзін такі. Там, у зняволенні. Не чалавек — верабей. Дробненькі, худзенькі, як хлопчык. Усё трэцца і трэцца. Што мы ні надумаем — начальства ведае. Адкуль? — гадаем. Няйнакш, хтосьці выдае. Прыглядацца пачалі, розумам раскідваць. Потым выявілася: ён, гніда, выдаваў. Давялося прыдушыць. Як жа ён мяўкаў, прасіўся, аж брыдка ўспамінаць. Ды ў нас закон цвёрды — вінаваты, прадаў каго — адказвай...

Кацілася, ехала па дарозе падвода. Ад лесу да лесу, ад вёскі да вёскі. Спынялася на ноч, спынялася, калі трэба было, і ўдзень. І на ёй, гэтай падводзе, запрэжанай у парку коней, на мяккай жытняй саломе, акрытай пасцілкай, то сядзелі, то, расслабіўшыся, ляжалі мужчына і жанчына, якіх прымалі сустрэчныя за мужа і жонку.

— А куды мы едзем? — быццам спахапляўся час ад часу, пытаў Змітро.

— А мне ўсё адно,— адказвала радасная, задаволеная Клаўдзя.— З мілым рай і ў будане.

— Ну, а ўсё ж? — пытаў, хацеў ведаць Змітро.

— Куды скажаш, туды і паедзем,— згодная была на любыя прапановы Клаўдзя.

— У мяне нідзе нічога няма. Была некалі хата, была зямля, была гаспадарка. Але нас раскулачылі. Бацьку і маці выслалі. Вядома, можна паехаць у маю вёску. Але што там? Ад бацькі і маці я не маю ніякіх звестак, з вёскі таксама...

— Давай хіба паедам да мяне.

— А ў цябе што? — пытаў Змітро.

— У мяне? Муж у арміі, я адна ў хаце. Праўда, праз сенцы свёкар жыве.

— Паганы, ты казала.

— Паганенны. Але ж ты... Прыструніш, пужанеш яго. Кеб шаўковы быў. Цішэй вады, ніжэй травы...

— Гы-ы, ета я зраблю,— смяяўся Змітро.— Ах-вотна зраблю, гы-ы...

— Ну, а што нам яшчэ трэба? Карова ў мяне е, е і свінчо. Бульбы накапаем, жыць будам...

— Але ж мне і да сябе ў вёску наведацца хочацца,— прызнаўся Змітро.

— Хто там у цябе? Можа, краля?

— Не, нікога ў мяне няма. Але там, у вёсцы... Напэўна ж, і сёння жывуць тыя, хто бацьку і маці высылаў... Аж рукі свярбяць... Трэба было б сяго-таго за шолудзі ўзяць, правучыць... Каб і дзесятаму заказаў...

— Дык і наведаешся ў сваю вёску. Пазней. Як немцы прыйдуць, парадак нейкі ўсталюецца. А цяпер... Ні тое ні сёе. Не то Саветы, не то немцы...

Набычыў галаву, думаў, моршчыў свой валасаты лоб Змітро. І згаджаўся, згаджаўся з Клаўдзяю.

— Можа, ты і праўду кажаш...

— Не сумлявайся,— радавалася Клаўдзя.— Пажыві трохі, акрыяй... А тады відаць будзе, што рабіць. Ды і я хоць аджыву. А то сохла, як на дрэве ліст. І паскардзіцца... Не было каму.

— Хіба ты сірата, хіба ў цябе радні няма?

— Не, радня е. І маці, і сёстры...

— Далёка жывуць?

— Там жа, у Вялікім Лесе. Але ім усяго не раскажаш, душу не раскрыеш.

— Чаму?

— Ды таму, што... Эх, Змітро, Змітро! Пакуль цябе не сустрэла, я не ведала, чаго мне не хапае, чаму я жыла і жыць не хацелася.

— Няўжо я так да душы табе прыйшоўся? — смяяўся, трос ад радасці вогненна-рыжым чубам Змітро.

— Як ніхто, ніхто на свеце,— прызнавалася Клаўдзя.

— Але чым я табе так спадабаўся?

— Усім, усім.

І гарнулася да Змітра, абдымала яго рукамі, цалавала.

— Не зразумееш вас, баб,— мякчэў, не ўхіляўся ад жаночай ласкі Змітро.

— Нас і разумець няма чаго,— млела ад шчасця Клаўдзя.— Нас кахаць трэба. І з тым, хто нас кахае, мы гатовы куды заўгодна ісці...

— Аднак жа... Не хочаш да мяне ў вёску ехаць, да

сябе цягнеш,— паглядваў скоса, нібыта крыўдаваў Змітро.

— Бо ў маёй вёсцы лепей нам будзе,— ані не крыўдзілася Клаўдзя.— Ета ты ўбачыш... А ўрэшце... Я магу паехаць з табою і ў тваю вёску. Мне ўсё адно. Абы толькі ты са мною быў.

— Ладна, няхай ужо. Паедзем да цябе. А там відаць будзе,— трос і трос галавою, быццам мух адганяў, як наравісты конь, Змітро.— Не спадабаецца мне ў цябе — дадому, у сваю вёску, уцяку.

— Ды спадабаецца, спадабаецца табе, пабачыш вось,— пераконвала Змітра Клаўдзя.— Людзі ў нас добрыя. І вёска ў лесе, глухая. Ад раённага цэнтра кіламетраў васемнаццаць. Калі і вайна скончыцца, баяцца табе не вельмі трэба, што ты з турмы ўцёк. Пакуль дойдзе на начальства, пакуль разбяруцца...

— А ты думаеш, бальшавікі перамогуць? — перапыніў Клаўдзю, не даў ёй дагаварыць Змітро.

— А хто ж?

— Немцы перамогуць. Ды яны ўжо, можна сказаць, і перамаглі. Засталося толькі бальшавікоў вынішчыць, калгасы распусціць, зямлю зноў людзям аддаць. Пабылі бальшавікі панамі, хопіць, годзе...

...Кацілася, ехала па дарозе падвода, і гэтак жа непрымушана чаплялася слова за слова, плыла, цякла размова...

## XVII

Адбегшыся ад пераправы і шуснуўшы ў хмызняк, за якім — відаць было — густа зелянеў лес, Хомка на хвіліну прыпыніўся, перавёў дыханне.

«А Надзя, дзе Надзя? — успомніў ён.— Я ж нічога ёй не сказаў...»

Азірнуўся на поле — Надзя, трохі прыадстаўшы, бегла ўслед за ім.

«Хвала богу, а то б...»

І сам не ведаў, што б магло здарыцца, быць, каб Надзя не пабегла за ім, асталася там, на пераправе.

Пачакаў, калі Надзя наблізіцца да хмызу, дагоніць яго. Тады, ні слова не кажучы, хутка-хутка пашыўся, пакульгікаў далей, углыб.

— Куды вы, дзядзька? — азвалася, задыхана спытала Надзя.

І праўда: «Куды?»

Спыніўся.

Самалёты, здаецца, ужо не гулі над пераправаю — няйнакш, адляцелі. Але ці не прыляцяць яны зноў, ці не вернуцца з хвіліны на хвіліну, ці не пачнуць страляць, бамбіць?

— А ты... Што ты хочаш? — спытаў, азірнуўшыся на Надзю, Хомка.

— Я?.. Нічога...

Ад перапалоху і бегу Надзя цяжка дыхала, аж рот разявіла. Вочы яе сюд-туд міргалі, не маглі ні на чым засяродзіцца. І сама яна неяк зблажэла з твару, мо таму, што ноч амаль не спала. Ды і змардавалася ў дарозе. Дзіва што — які дзень без дамоўкі, без нармальнага сну і яды.

— Трэба нам дадому дабірацца, у вёску,— ледзь варушачы губамі, прашаптала Надзя.

— А з каровамі, чарадою як жа? — выказаў Надзі свой клопат Хомка.

— Кароў усё адно не ўратуем... Ніхто не ўратуе...

— Чаму ета — ніхто не ўратуе?

— Бо немцы не дадуць... Бачыце, бамбяць і бамбяць...

— Але ж і кідаць... Так, без ніякага-якага? Хоць бы здаць каму, даведку ўзяць?

— Дык жа няма каму здаваць. Дый... Рыжы ж кароў ужо сабе прысвоіў.

— Рыжы?..

Зноў аж затрасло ўсяго Хомку, калі ён успомніў Рыжага.

«І дзе толькі Клаўдзя знайшла яго? І ўправы... Да каго звярнуцца, каб праструніць, да парадку прызваць такога?»

«Папаўся я, так папаўся»,— пакруціў галавою, сказаў сам сабе Хомка.

— Рыжы адкажа... За ўсё адкажа... Во, начальніка толькі б знайсці, міліцыянера... Заяўлю! Ураз заарыштуюць.

— Не звязваліся б лепей вы, дзядзька, з етым Рыжым,— параіла Надзя.

— На мяне, бы звер, накінуўся, падводы, кароў не дае... І не звязвацца?..

— Ліха з ім усім... Нам бы дадому, у вёску сваю, дабрацца! Жыць бы астацца!

Праўду, чыстую праўду казала Надзя. І адчуваў,

разумеў Хомка — яшчэ дзень-два такога жыцця, і ён тое самае будзе гаварыць, пераконваць усіх будзе, што нічога іншага зрабіць і нельга было, як пакінуць кароў, а самому кіравацца дадому, у сваю вёску. Ды і што, што можна зрабіць? Кароў ён да пераправы дагнаў. І не ён вінаваты, што начальніка на пераправе няма, што кароў здаць няма каму. Перапраўляць самому іх на той, другі, бераг? Але ж як? Людзі пераправіцца не могуць — не да кароў. А тут яшчэ бамбёжкі етыя. Хіба... Узяць ды назад, у сваю вёску, кароў пагнаць? Колькі іх асталося непараненых? Ды і ў тых, што асталіся, капыты пазбіваны, крывавяць...

Стаяў Хомка ў хмызняку і не ведаў, даўмецца не мог, што яму далей рабіць, куды кінуцца, дзе паратунку шукаць, у каго пытаць хоць якое рады.

«Самалёты етыя... Бамбёжкі... А то б я... Нешта прыдумаў бы, знайшоў бы каго з начальства... Рыжага прагнаў бы... Ыш ты, рукам волю даў...»

— А калі нам зноў на пераправу вярнуцца? — спытаў хутчэй сам у сябе, чым у Надзі, Хомка.

— На пераправу? — спалохалася Надзя.— Чаго?.. Самалёты ж зноў наляцець могуць...

Задумаўся, задумаўся Хомка. Самалёты, вядома, маглі наляцець. І добра ж, як пашанцуе жывому з-пад абстрэлу ды бамбёжкі выбрацца. А як...

Акрываўленая чалавечая нага — тая, што ўпала, ляжала там, непадалёку ад ракі, дзе выбухнула, разарвалася бомба,— паўстала раптам уваччу. Аж скаланула, затрасло Хомку.

— Тады... Хіба да кароў вернемся,— сказаў Надзі.

— А туды чаго?

— Паглядзім, што там пасля бамбёжкі...

І, не чакаючы, што Надзя адкажа, пайшоў, пакульгікаў да дубоў, да таго ляску, што зелянеў удалечы за лугам. Пайшла, хоць і без асаблівай ахвоты, услед за Хомкам і Надзя.

Поле, лужок мінулі хутка, спяшаючыся, ледзь не подбегам. Мо таму, што баяліся, каб не заспелі, не нахапілі на голым, чыстым месцы самалёты. У дубняку ж, пад арэшнікавым кустом, Хомка прыпыніўся.

— Во што,— сказаў Надзі.— Схадзі паглядзі, ці падвода наша стаіць.

— А вы? — спытала Надзя.

— Я тут пабуду.

Надзя сцеханула плячыма, сцялася ўся.

— Я баюся,— прызналася яна.

— Чаго ты баішся?

— Рыжага.

— Дык ён жа... Ета ж вы яго з Клаўдзяю знайшлі, адкапалі дзесь,— не стрываў, закрычаў Хомка.

— Не шукала я яго... Ета Клаўдзя...

— Клаўдзя, Клаўдзя...— разбурчаўся Хомка.— І сама ты добрая цаца. Трэба было мяне слухаццa, а не Клаўдзі. А то з першага дня, як Вялікі Лес пакінулі, насуперак, быццам назло... А цяпер і ты: «Баюся...»

Пайшоў, пакульгікаў да таго месца, дзе стаяла падвода. Надзя, хоць і нясмела, нерашуча, але таксама падалася за Хомкам: яна цяпер не адставала нідзе ні на крок ад Хомкі — куды ішоў ён, туды ішла і яна. Як нітка за іголкай. Хомка быў злосны, не так, мусіць, на Надзю, як на сябе: трэба было адмовіцца, не згаджацца тады, як упрошваў Васіль Кулага гнаць кароў, а ён не адмовіўся, пагнаў. І во... Гойсай, як Марка па пекле... І каб жа толк які быў. А то ж... Толькі мітрэнга, мітусня.

Абагнуўшы дрэвы, кусты, выйшаў на прагалу. Здзівіўся, спалохаўся — падводы там, дзе раней стаяла, не было.

«Дзе яна?»

Акінуў вачыма прагалу, агледзеў дрэвы, кусты — падводы нідзе не відаць. І Клаўдзі, Рыжага таксама няма паблізу. Блукалі, паразбрыдаўшыся па дубняку, каровы. Скублі маларослую росную траву, рыкалі, падымаючы час ад часу галовы.

«Нядоеныя... З учарашняга нядоеныя... А я...» — як самому сабе, прагучаў папрок.

— Надзя! Надзя! — закрычаў у наступную хвіліну Хомка, азірнуўшыся.— Не будзь без дзела, кароў дой...

— Дык жа... Вёдраў няма, няма ў што даіць,— праказала хутка, стоячы збоку, Надзя.

— У траву дой... А вёдры... Я тым часам пашукаю, дзе падвода...

— Дзе вы шукаць будзеце? Хіба не бачыце — няма. Клаўдзя з етым Рыжым... Мусіць, паехалі.

— Куды паехалі?

— Адкуль я ведаю. Можа, дадому, у Вялікі Лес. Куды захацелі, туды і паехалі.

— Як — куды захацелі, туды і паехалі? А мы? Без падводы?..

Надзя пацiснула плячыма, пайшла даiць кароў. А Хомка, пастаяўшы, падумаўшы, усё ж абабег, абскакаў блiжэйшыя кусты, паляны, згойсаў на луг. Але падводы нiдзе не было. Не было нiдзе i Клаўдзi, Рыжага. Нават след iх прастыў.

«Няйнакш, i праўда некуды паехалi, уцяклi,— аж калацiўся, вар'яцеў ад злосцi Хомка.— Во, вазьмi з сабою такую ў дарогу. А яна табе... Што хочаш, тое цяпер i рабi...»

Вярнуўся на прагалу, знайшоў Надзю — яна сядзела на траве i, прыкрыўшы твар рукамi, плакала.

— Чаго ты? — спытаў непаразумела Хомка.

— Ды... Ды...— аж заiкалася, не магла гаварыць Надзя.— Каровы... Як жа даiць, калi яны... Даходзяць...

I Надзя, падняўшы галаву, паказала, кiўнула на кусты арэшнiку, што зелянелi, купчасцелi тут i там пад дубамi.

Пакульгiкаў, паскакаў Хомка туды, куды паказвала Надзя. Пад кустамi i праўда ляжалi каровы. Параненыя. Некаторыя яшчэ дыхалi, падымалi галовы, калi да iх наблiжаўся ён, Хомка, нiбы паратунку прасiлi, некаторыя ж апруцянела выцягвалi ногi, ашклела глядзелi вачыма i нiчога ўжо не бачылi. Бездапаможныя, з пакалечанымi, акрываўленымi нагамi, з вывернутымi трыбухамi... I кароў такiх налiчыў Хомка больш за дзесяць.

«Ета ж трэба... Кеб так... I за што, за што iх?..»

Вярнуўся да Надзi, сказаў са слязамi ў голасе:

— Во што! Трэба ўцякаць адсюль.

Надзя адняла ад вачэй рукi, перастала плакаць.

— Куды?

— Дадому, у сваю вёску... I кароў тых, што яшчэ жывыя, непараненыя, пагонiм.

— Дадому? — здзiвiлася, аж вочы заплаканыя вырачыла Надзя.— Дык... Навошта ж было iх сюды, на пераправу, гнаць?

Не сказаў, нi слова не сказаў у адказ Хомка. Толькi ўнурыў галаву ў плечы i пайшоў, пакульгiкаў у дубняк.

## XVIII

Як нi спяшаўся Мiкалай, дагнаць Iвана не змог — той надта ж хутка бясследна знiк, нiбыта растварыўся ў гушчары хвойнiку.

«Крыкнуць? Пазваць?»

Удыхнуў, набраў поўныя грудзi паветра, нават рот быў

ужо разявіў, каб азвацца, але нейкая невядомая сіла стрымала Мікалая.

«Не варта, мабуць, ета рабіць... Бо ці пазнае Іван мяне, ці адгукнецца на мой голас?.. Толькі напалохаю...»

І разам з тым хацелася, хацелася, як ніколі яшчэ раней, убачыць сына, пагаварыць. Пра ўсё, усё пагаварыць. Як з самым родным, блізкім чалавекам. Расказаць, што ў самога ў яго, Мікалая, на душы і ў думках, і распытаць, чым жыве Іван, на што ён спадзяецца, калі астаўся тут, у Вялікім Лесе, і, галоўнае, даведацца, дзе што на свеце дзеецца, як наогул жыць далей. Іван сёе-тое ведае, быць таго не можа, каб не ведаў. Як-ніяк, а ў начальстве ж сельсавецкім столькі гадоў быў. Ды і цяпер, мабыць, не проста так, без дай прычыны туляецца па лесе...

«Яды якой з сабой захапі... Бо я, можна сказаць, галадаю»,— гучалі і гучалі ў вушах словы, сказаныя Іванам напаследак Васілю Кулагу, калі расставаліся.

«І кеб жа яды не было. А то ж... Хапае»,— думаў Мікалай.

«Трэба будзе з Васілём Кулагам пагаварыць,— прыйшло ў галаву раптам Мікалаю.— Ён-то, напэўна, ведае, дзе жыве і начуе Іван. Сказаць, кеб не саромеўся, не баяўся... Хай Іван заходзіць. І паесці, і спаць...»

«А як хто ўбачыць, высачыць?»

Пахаладзела ўсярэдзіне, дух на хвіліну заняло.

«І такое ж можа быць. Злодзей крадзе, а лес бачыць. І тады... Калі што якое, адказваць давядзецца. І не камунебудзь, а мне... Мне!.. І так невядома яшчэ, чым усё скончыцца... Етакая неразбярыха... І перад тым, як рабіць штонебудзь, думаеш, і зрабіўшы — таксама думаеш, і ўсё адно не заўсёды ўгадаеш, зробіш тое, што трэба было б зрабіць...»

Павярнуўся, паволі пабрыў назад ад дарогі, да тых соснаў, што стаялі купкаю пры дубняку.

«Можа, і добра, што не дагнаў Івана... А то б... Ці даведаўся б што-небудзь ад яго, ці сказаў бы ён мне новае, а я... Папрасіў бы і заходзіць па харчы, і начаваць...»

«Але ж Іван... Сын»,— пачуў ён папрок, дакор.

«Сыны бацькоў слухаюцца. А ён... І вухам не вёў, не шманаў нават, хто б і што яму ні гаварыў. Са мною, бацькам, як з чужым чалавекам, жыў, страшыў, пагражаў... І не гаварыў, не размаўляў гадоў колькі...»

«І ўсё адно Іван... Сын...»

«Дык я ж і не забываю, што ён — сын... І кеб дагнаў...»

Адчуваў, разумеў Мікалай, што нядобра так думаць, як думае ён, а зрабіць нешта з сабою, перайначыць не мог, ніяк, ніяк не мог. І ад таго мучыўся, упікаў, дакараў сябе, дратаваў і дратаваў душу.

«Бацька, называецца... А памагчы сыну...»

Сеў, апусціўся на дол, на ігліцу, палажыў побач, у ягаднік, дубцы з нанізанымі грыбамі. Зноў пачаў пільна, ні на хвіліну не зводзячы вачэй, глядзець на дарогу.

«На немцаў не трэба забываць... А то я... Пра ўсё думаю, толькі не пра немцаў... А яны ж... Во-во тут павінны быць, ісці па дарозе...»

Аж спіна пахаладзела, мурашкі пабеглі па скуры, калі ўявіў, як будуць ісці, сунуцца па дарозе немцы, усяго за некалькі крокаў ад яго, Мікалая, а ён будзе сядзець вось тут, ля соснаў...

«Мяне ўбачаць... Што яны зробяць?»

Упаў, лёг на зямлю. Хвілін колькі нават не дыхаў. Потым папоўз, папоўз назад, глыбей у гушчар, схаваўся за стары дубовы пень.

«І не варушыцца трэба... Асабліва калі немцы блізка будуць, па дарозе ехацьмуць...»

Ляжаў некаторы час, ператварыўшыся ўвесь у слых і ўвагу. І не зводзіў, не зводзіў вачэй ні на хвіліну з дарогі.

«Во, во немцы павінны быць тут...»

Паволі-паволі гайдаліся, шумелі над галавою сосны, шапацела лісце дубоў. І нейкая своеасаблівая музыка, гуд лесу напаўнялі наваколле, настройвалі на думнасць. І Мікалай думаў:

«Да старасці дажыў... А шчасця, радасці быццам ніколі так і не меў. Вечна нейкія згрызоты, клопаты, усё некага ці нечага баішся, не верыш у тое, што ёсцека, і чакаеш, чакаеш... Чаго — і сам не ведаеш, сказаць не можаш. Ці то чалавечая натура такая, ці то чалавечае жыццё такое, ці то ва ўсім вінаваты час, тыя крутыя змены, што ідуць наваратам адна за адной. Асэнсаваць, усвядоміць як след не паспяваеш адно, а ўжо навальваецца, захліствае ўсяго цябе другое, яшчэ больш незразумелае, жахлівае. І ты... Ні пра што іншае не думаеш, няма калі табе думаць — выратавацца б, ацалець, да берагу б якога цвёрда прыбіцца, зноў грунт пад нагамі адчуць. Зашыцца б, схавацца б, кеб нічога не бачыць, не ведаць. Дык не ж, не даюць. Укруцяць, уматаюць, ды так, што і не выкруцішся. І кеб жа дбалі сапраўды пра агульнае дабро дзеля ўсіх. А то ж кож-

ны шчыруе толькі дзеля сябе, свае інтарэсы ставіць вышэй за інтарэсы астатніх. І не ў дурнях хоча астацца, а выйграць. Дробная чалавечая натура! І ўсё ў свеце быццам знарок так уладкавана, што не можа чалавек быць шчаслівы, кеб не зрабіць нешчаслівым кагось, не абяздоліць яго. Ты хочаш мець больш зямлі... Але дзе яе ўзяць? Забраць у суседа. Нават калі ты не забіраеш гатовага поля, а карчуеш новае, усё адно потым выявіцца — тую паляну, што аблюбаваў ты, нехта ўжо таксама быў сабе аблюбаваў, а ты ў яго перахапіў, апярэдзіў. І так ва ўсім, што б ты ні ўзяўся рабіць, куды б ні памкнуўся. Завіднае, зайздроснае чалавечае вока! І кеб жа хоць калі і чым задаволіўся чалавек. Дык не ж — даможацца аднаго, наперадзе замаячыць, пачне цягнуць да сябе, вабіць іншае, яшчэ лепшае. І забываеш ужо на ўсё — дацягнуцца б, завалодаць тым, тым! А завалодаеш — не супакоішся ўсё адно, зноў да нечага будзеш імкнуцца, зноў цябе нешта будзе вабіць. І так усё жыццё, так увесь век свой. Кідаешся то да аднаго, то да другога, б'ешся, як рыба аб лёд, усё табе чагось мала, усё чагось хочацца. А прыйдзе смерць, выявіцца: нічога табе не трэба. Голы прыходзіш на зямлю, голы і пакідаеш яе, нічога з сабою не забярэш. І ўсё тваё старанне, дбанне, клопаты і згрызоты, сваркі і выбухі гневу — дзеля чаго, дзеля чаго яны? Навошта накаляць сябе, даводзіць іншы раз да шаленства, ночы не спаць, навошта так ірваць жылле, хацець усяго болей, болей? Няўжо толькі дзеля таго, каб знасіць сябе, хутчэй загнаць у магілу, на той свет? А войны етыя, мітрэнгі, заварухі розныя? Навошта яны? Хай бы, нарадзіўшыся, і жыў чалавек, як яму хочацца, як яму падабаецца. Хочацца ваяваць — ваюй. Але мяне... Не чапай. Дай мне жыць так, як я хачу. Дык не ж! Сам ваюе і цябе прымушае, кеб і ты ваяваў. Скачы пад чужую дудку, рабі, што табе кажуць, што табе загадваюць. І кеб жа век чалавечы доўгі быў. А то ж... Здаецца, толькі-толькі на свет нарадзіўся, на ногі свае стаў, гаварыць навучыўся... І не жыў, здаецца, збіраўся толькі жыць, а глядзіш — састарыўся, на той свет пара. Не жыццё, а міг, усяго адзін міг! І ўспомніць няма чаго, апрача звадак, мітрэнгі ды непрыемнасцей... Дзеля чаго тады нараджацца было? Няўжо толькі дзеля пакуты?.. І хто вінаваты, што жыццё ў чалавека так неўладкавана? Бог? А можа, сам чалавек? Надта ж хцівы ён, багата яму ўсяго хочацца. Задаволіць свае жаданні, памкненні ніяк не можа... І галоўнае — жаданні ў кожнага адмысловыя, яны не такія,

як у іншых. І кожны лічыць, што яго жаданні — самыя лепшыя, самыя правільныя. І не ведае ж, не ведае чалавек, чаго ён жадае. Сёння аднаго, заўтра — другога, часам супрацьлеглага таму, чаго раней жадаў. Неразбярыха тая, што навокал, мітрэнга... Ці не ад таго, што сам чалавек такі неўтаймоўны, не можа ён не толькі над светам быць, але саўладаць і з самім сабою! І да чаго, да чаго ўсё гэта прывядзе? Людзей з кожным годам большае, большае і неразбярыхі, мітрэнгі... А цяпер... Выплываюць на паверхню Бабаі... Што етыя закамандуюць, да чаго давядуць людзей?.. А тут яшчэ немцы, чужынцы... Што будзе, што чакае і мяне, і ўсіх людзей наперадзе?..»

Задумаўшыся, Мікалай не бачыў, як з сасны збегла па кары вавёрка, прашастала па ігліцы, знайшла нанізаныя на дубчык баравікі. І адзін, і другі грызанула, потым прысела на заднія лапкі, быццам паспрабавала зняць з прутка баравік. Баравік не здымаўся. Вавёрка пераскочыла на другі канец прутка, страсянула галавою, падняла ўгору агніста-рыжы, з чарнатою хвост, завярцелася, закруцілася на адным месцы. І гэтым прывабіла да сябе Мікалая.

«Глядзі ты, якая смелая,— залюбаваўся на хвіліну вавёркаю Мікалай.— Сабраныя мною грыбы знайшла. Цікава, што ж ты з імі зробіш?»

Але вавёрцы, мабыць, надакучыла важдацца з баравікамі, што былі паднятыя з зямлі чалавечымі рукамі і нанізаны на пруток. Яна шмыганула зноў да соснаў, хутка-хутка паднялася па камлі самай тоўстай з іх у голле. Пераскочыла, перабегла з галіны на галіну — толькі рыжы хвост агнём мільгаў у зеляніне,— мітнулася на той бок, дзе быў хвойнік. Апусцілася на самую ніжнюю галіну, доўга прыглядалася сваімі быстрымі і чорнымі, як вугольчыкі, вачыма да нечага. І скочыла долу.

Толькі цяпер Мікалай убачыў, што там, куды скочыла вавёрка, сядзеў яшчэ адзін баравік, якога ён, Мікалай, быў не заўважыў. І не абы-які, а вялікі, рослы, з тоўстым белым коранем і шырокаю, трохі загнутаю зверху чорнаю шапкаю, прысыпанаю рыжаю сухою ігліцаю. Побач з гэтым баравіком сядзеў і яшчэ адзін, меншы і, мабыць, маладзейшы. Да яго і памкнулася вавёрка.

«Аге, ну-ну,— зацікавіўся Мікалай.— Бачыш, здагадлівая якая. Мае грыбы забраць не ўдалося, дык іншыя сабе знайшла...»

Вавёрка грызанула шапку меншага баравіка, села на заднія лапкі, быццам пажавала. Баравік, няйнакш, быў смачны, бо вавёрка зноў і зноў падбягала да яго, зноў і зноў кусала.

«А далей, далей што?» — нібыта падганяў, нібыта не меў часу больш чакаць, што будзе рабіць з баравіком вавёрка, Мікалай.

У лесе нечакана пацямнела, неяк адразу знікла, схавалася сонца. І не паспеў Мікалай падумаць, што ж здарылася, як грымнуў над галавою, пакаціўся глухім раскацістым рэхам па лесе гром.

«Навальніца, няйнакш... Етага толькі і не хапала...»

Вавёрка з усіх ног кінулася да соснаў, умомант схавалася ў дупло.

Насцярожана загулі, загайдаліся, зашумелі дрэвы.

«Дождж зараз ліне...»

Падняўся на ногі, хацеў схавацца, пабегчы пад дубы. Але — цяпер ужо не грымнуў, а ляснуў гром.

«Нельга пад дрэва... Раптам маланка пацэліць...»

Пайшоў, заспяшаўся ў хвойнік.

«Хіба там, у гусцяжы, перачакаю...»

Яшчэ больш пацямнела, зіхнула маланка, і загуў, загаманіў лес — лінуў такі шквальны, абломны лівень, што свету божага не стала відаць.

«І ў хвойніку ад дажджу не схавань, і пад дубы не пойдзеш...»

Угнуў галаву ў плечы, пабег, патрухаў да поля — там, перад лесам, быў малады густы бярэзнік, асіннік. Але і бярэзнік, асіннік мала ратавалі ад дажджу. Вачыма акінуў гусцеж, пачаў шукаць, дзе б схавацца. Убачыўшы на ўзлеску, амаль на полі, рачкаватую грушу-дзічку, мітнуўся да яе.

Ды і груша-дзічка сваім голлем і лісцем не магла стрымаць усёй вады, што лілася як з вядра з неба. Шукаць больш надзейнае месца, дзе можна было б схавацца, Мікалай ужо не спрабаваў — стаяў у засенні шатаў нягеглага, галлістага дрэва і глядзеў, глядзеў на дарогу — каб хоць не паказаліся, не выехалі з лесу немцы...

Перавёў вочы на вёску, якая хавалася, цямнела за густою сцяною дажджу ўдалечы. Падумаў:

«Няўжо і ў дождж людзі са сталамі, хлебам-соллю чакаюць немцаў?»

І засумняваўся, адказаў сам сабе:

«Наўрад...»

Больш, як звычайна, затрымаў свой позірк на крыжы, што вытыркаўся пры ўездзе ў вёску. Мо таму, што заўважыў нешта не зусім звыклае — быццам хтосьці стаяў там, мітусіўся.

«Хто?» — брала цікавасць.

Пайшоў, пакраўся ўскрайкам поля, па бярэзніку бліжэй, бліжэй да вёскі.

Дождж між тым неяк адразу, як і пачаўся, аціх, бліснула з-за хмар сонца — навальніца адыходзіла, цягнучы за сабою палосу ліўня, водбліскі маланак і грымоты. Ажылі, павесялелі птушкі — затрашчалі сарокі, зачэкалі чэкаўкі. Прыпарыла — аж не было чым дыхаць. З поля ў бярэзнік папоўз нізкі, павіласты туман.

«На грыбы годзіць»,— падумаў Мікалай.

Успомніў, як напароўся сёння на чарэнь, як браў крамяністыя баравікі, нізаў іх на пруток.

«І забыўся з сабою ўзяць...»

Праз нейкі час супакоіў сябе:

«Калі добра ўсё будзе, нічога не здарыцца, заўтра ў лес па баравікі схаджу... За ноч іх яшчэ нарасце».

Ішоў Мікалай і не зводзіў ні на хвіліну вачэй з крыжа, з таго, што рабілася, дзеелася там. Вылучыў чалавечую постаць, стол...

«Няўжо хтось аж сюды вынес стол з хлебам-соллю? Але хто?»

І пазнаў, пазнаў, нарэшце, таго, хто тоўкся, быў ля крыжа.

«Бабай... Яўхім Бабай... Чаго ета ён не ля свайго двара стаіць, а аж сюды выйшаў? Але ж... Чакай, чакай, што ж ета ён робіць? Стол на спіну ўзваліў, назад у вёску падаўся... Чаму?»

Доўга стаяў Мікалай у хмызняку, праводзіў вачыма Бабая, здзіўлены ўбачаным. Нават калі Бабай схаваўся за платамі і хатамі ў вуліцы, не зрушваўся, нікуды не ішоў — стаяў і стаяў.

«Калі Бабай прыходзіў сюды сустракаць немцаў, дык чаму, не сустрэўшы, назад у вёску падаўся?.. Хіба пачуў што, даведаўся? Але што ён пачуць мог? Ад каго?.. Ніхто ж, здаецца, акрамя Васіля Кулагі, не ішоў па дарозе з Ельнікаў. Можа, немцы не прыедуць сёння ў Вялікі Лес? І я... Дарэмна хаваюся, сноўдаюся па лесе?..»

Але дадому, у вёску, усё адно не ішоў Мікалай, аставаўся ў бярэзніку чакаць. Каго, чаго — не ведаў...

## XIX

Здараецца часам: пачне чалавек песню — і не выцягне, захліпнецца. А то ў скокі, бывае, пусціцца — і кульгець-кульгець, з круга выходзіць. Чаму? Ды таму, што не з той ноты песню пачаў, не з той нагі ў скокі пайшоў. І ў жыцці прыкладна тое самае. Варта нешта зрабіць не так, добра не падумаўшы, — і ўсё, лічы, прапала. Аўтарытэт заваёўваецца гадамі, а траціцца за адну хвіліну, міг адзін. І таму, каб не апынуцца ў смешным становішчы, каб не шкадаваць потым, што трэба было тое ці іншае пачынаць так, а ты пачаў не з таго, Васіль Кулага думаў і думаў, ночы іншы раз не спаў. Але ніколі яшчэ раней столькі не думаў Васіль Кулага, як у дні, калі немцы занялі Ельнікі і павінны былі вось-вось прыйсці, наведацца ў Вялікі Лес. Было пра што думаць Васілю Кулагу, было за што хвалявацца! Лацвей Івану Дарошку — ён адзін. Пайшоў у лес — і ўсё яго з ім пайшло. А што рабіць яму, Васілю? Кінуць-рынуць усё, як ёсць, і пайсці таксама разам з Іванам Дарошкам у лес? А жонка, дзеці як? Што зробяць з імі немцы, прыйшоўшы ў Вялікі Лес? Добра ж, як жыць пакінуць. Але ж... Могуць і не пакінуць жыць. І каб жонка, Поля, гэта разумела. Дык не ж — узяла нешта сабе ў галаву, нічым, нічым не выб'еш. А можа, яна ўсё і разумее, толькі прытвараецца, робіць выгляд, што не разумее? «Ад божае кары нідзе не схаваешся,дык няхай яна, тая кара, дома, у сваёй хаце, спасцігне. Хоць на магілках разам з маці, братамі і сёстрамі ляжаць буду». Што гэта — пустыя словы ці прадчуванне непазбежнага?..

І за прапанову Івана Дарошкі — спаліць масты і тым самым затрымаць да маразоў прыход у Вялікі Лес немцаў — Васіль схапіўся, як хапаецца за саломінку тапелец. «Галоўнае, каб немцы не наляцелі цяпер, адцягнуць іх прыход. А там нешта прыдумаецца. Быць таго не можа, каб не прыдумалася»,—разважаў Васіль. Разважаў і пераконваў не так Івана, калі той раптам расслабіўся, засумняваўся ў правільнасці сваёй прапановы, як сябе, што масты спаліць трэба, абавязкова трэба. І калі нарэшце пераканаў Івана, што зробяць правільна, калі спаляць масты, і яны разам з Іванам прыйшлі ўночы да тых мастоў — шчыраваў, цягаючы сена, абліваючы палі газаю, хоць дзесьці на самым сподзе душы і была, расла трывога, варочалася, напаміналась ўвесь

час пра сябе: «Нічога гэта не дасць, немцы новыя масты збудуюць. Ці так як-небудзь наладзяць пераправу». Але не прызнаваўся, не прызнаваўся Васіль Івану ў сваіх сумненнях, хаваў іх і ад Івана, і ад самога сябе. Сумненні гэтыя з новай сілай выбухнулі ў душы, калі Васіль расстаўся з Іванам Дарошкам, пайшоў адзін у вёску і даведаўся, што раніцою бегаў па вуліцы Яўхім Бабай, загадваў зноў, каб выносілі людзі сталы, сустракалі хлебам-соллю немцаў, бо тыя, маўляў, сёння прыедуць, наведаюцца ў Вялікі Лес. «Пабачым, ці прыедуць?» — думаў Васіль Кулага. Думаў і сядзеў, сядзеў ля акна ў сваёй хаце, не зводзіў вачэй з вуліцы. «Калі ўбачу, што едуць... На гарышчы схаваюся. А можа... За хлеў кінуцца, у лазняк?» Яшчэ праз хвіліну падумаў: «За хлеў, у лазняк, бадай што, лепей. Але ж у вёсцы астанецца сям'я — жонка, дзеці? Без усякай абароны. Што хочаш, тое з імі і рабі. Не, нельга мне, ніяк нельга ўцякаць. Буду дома».— «Дык жа... Немцы і сям'ю могуць знішчыць, і цябе»,— падказвала, ацверажала думка. «Не, я так лёгка ў рукі ім не дамся. А вінтоўка нашто?» — «Адной вінтоўкай ні сям'і не абароніш, ні самога сябе».— «Няважна. Хоць некалькі, а ўтрупяню чужынцаў».

З акна відаць было, што ніхто з суседзяў вельмі не рупіўся сустракаць немцаў. Праўда, час ад часу выходзілі з двароў, паглядвалі то ў адзін, то ў другі канец вуліцы — ці не вынес хто-небудзь да варот стол з хлебам-соллю? — і, задаволеныя, зноў знікалі, хаваліся.

«А малайцы, малайцы вяскоўцы,—радаваўся Васіль.— Каб і далей так...»

Жонка, Поля, завіхалася па гаспадарцы — то даіла, выганяла на пашу карову, то ў печы есці варыла, то карміла свіней. І ўсё моўчкі, надзьмутая — да мужа, Васіля, ёй быццам і клопату не было. А ён, Васіль, чакаў, калі яна не стрывае — абзавецца. Бо і раней, яшчэ калі яны з Іванам Дарошкам па начах у лес ездзілі, збожжа хавалі, не-не дый успыхвалі сваркі. Поля ніяк не магла прывыкнуць, зміршцца з тым, што муж, Васіль, дома не начуе. «Што, кралю сабе знайшоў? — пытала яна.— А што ж, цяпер маладзіц хапае, да любой ідзі — не прагоніць». Горш за ўсё было тое, што ён, Васіль, не мог праўды жонцы сказаць, дзе ён па начах бывае, даводзілася маўчаць, не прызнавацца. І гэта выводзіла з сябе жонку. «А-а, прызнацца, сказаць не хочаш, дзе, у каторай быў?» Спрабаваў Васіль тлумачыць жонцы, што

цяпер ідзе вайна, усе мужчыны на фронце, ваююць. А ён, Васіль, пакінуты тут. І пакінуты таксама дзеля работы. «Якой работы?» — пытала жонка. «Ды не магу я табе сказаць».— «А-а, сказаць не можаш? Дык я сама табе скажу. Па бабах па начах хадзіць».— «Як ты можаш такое? — абураўся Васіль.— Столькі гадоў жылі з табою — і ні па якіх бабах я ніколі не хадзіў. А цяпер, што цяпер змянілася?» — «Ты ж сам казаў — вайна, мужчыны ўсе на фронце. Вось ты і рассмялеў, у блуд кінуўся».— «Не смяшы людзей,— знаходзіў у сабе сілы ўсміхнуцца Васіль.— Ніколі не думаў, што ты ў мяне ў дадатак да ўсяго яшчэ і раўнівая».— «У дадатак да чаго — усяго?» — натапырвалася жонка. «У дадатак да іншых добрых якасцей».— «Ты яшчэ і здзекуешся!» — успыхвала жонка. І ўжо нічым, нічым нельга было яе супакоіць. Асабліва ўзлавалася жонка ў тую ноч, калі сцірты, завод у Гудове палілі, калі дадому, у вёску, Васіль дабраўся толькі на світанні, стомлены і неразгаворлівы. Упаў на пасцель — і быў усё адно што нежывы. Чаго толькі жонка не гаварыла, чым толькі яго не папракала! Нават тым, што сцірты згарэлі, не абмалацілі іх, збожжа людзям не раздалі. І каб жа хоць пра што здагадвалася! Дык не ж — быццам не галава ў яе на плячах, а...

І сёння Васіль чакаў, што доўга жонка маўчаць не будзе — гнеў прарвецца: як-ніяк, а ўсю, усю-ўсенькую ноч не быў ён дома, вярнуўся толькі раніцою. І жонка... Не стрывае, выкажа, выкажа ўсё, што накіпела на душы, што перадумала за ноч адна.

Тым часам падымаліся з пасцелі дзеці,— першая, як заўсёды, Аленка, за ёю сын, Якуб; умываліся, лезлі за стол — чакалі, калі маці падасць снедаць. Поля ўправілася ўжо і з каровай, і з свіннямі, і з печчу, падмяла і хату. Моўчкі, нікому нічога не кажучы, наліла ў міску булёну, паставіла на стол. Дастала з паліцы і хлеб, лыжкі. Палажыла перад кожным, села сама. Павярнулася да Васіля, сказала:

— А табе што — асобнае запрашэнне трэба?

Хацелася Васілю аджартавацца, сказаць: «Я сёння снедання не зарабіў». Але не сказаў гэтага, падумаў: «Не зразумее майго жарту. Яшчэ скажа: «А калі ты што зарабляў?..» І зноў — каторы раз — пачнецца сварка. А гэта — не пажадана. І так вунь дзеці — як ваўчкі. Устаюць — і хоць бы слова. Сядзяць моўчкі, быццам баяцца бацькі і маці.

Падняўся Васіль з лавы, пайшоў да вядра, набраў, зачарпнуў карцом вады, памыў рукі, апаласнуў твар. Выцерся насуха шорсткім палатняным ручніком, сеў на сваё звыклае месца да стала, дзе ўжо таксама ляжалі яго лыжка і добры воберцень хлеба.

— І дакуль ты па начах будзеш чортведама дзе валачыцца? — падняла вочы на мужа жонка, Поля.

Васіль паглядзеў на дзяцей, якія моўчкі сёрбалі вялікімі драўлянымі лыжкамі з міскі булён, сказаў:

— Можа, пазней пагаворым?

— Пазней ты зноў з дому сыдзеш.

— Але пры дзецях?

— Хай дзеці ведаюць, які ў іх бацька, як глядзіць, як клапоціцца.

— Я не хачу сварыцца,— быў, як рэдка калі, спакойны Васіль.

— А я хачу,— з выклікам устала з-за стала Поля.— Хопіць. Ці жыві, ці...

Ёй, мабыць, цяжка было сказаць тыя словы, бо яна запнулася, раптам змоўкла. Але ўсё ж вымавіла, выдавіла іх з сябе:

— Пакінь нас.

Ён, Васіль, не чакаў пачуць таго, што пачуў, а таму таксама падняўся з-за стала. Прайшоўся сюд-туд па хаце, сказаў задумліва:

— І так, і гэтак усё адно я павінен вас пакінуць. Рана ці позна. Але я не хацеў бы пакідаць вас так.

— А як ты хацеў? — аж крычала, непрыгожа разяўляла рот Поля.

— Ну-у, не так. Тым больш што я перад табою, Поля, і перад дзецьмі ні ў чым не вінаваты. Тое, што раблю я па начах... Зусім не тое, пра што ты думаеш... Ідзе вайна, я — камуніст. І я... Не маю права хавацца, я павінен, як і ўсе, ваяваць.

— Ну і ваюй, але нас не муч!

— Жорсткая ты, Поля. Жорсткая і неразумная. Далей свайго носа нічога ніколі не бачыла. І не хацела бачыць.

— Затое ты вельмі відушчы, далёка ўсё бачыў і бачыш. Так далёка, што...

— Ведаеш, Поля,— перапыніў жонку, не даў ёй дагаварыць Васіль,— я казаў ужо табе — я не хачу сварыцца. І ты, калі ласка, супакойся, змоўкні.

— Не супакоюся, не змоўкну!

Ведаў, добра ведаў сваю жонку Васіль. Чым больш быў спакойны ён сам, тым больш злавалася, аж вар'яцела яна. Аставалася адно — не быць у хаце, сысці з вачэй. І ён, Васіль, вырашыў скарыстаць гэта. Нацягнуў на галаву сваю кепку-шасціклінку, узяў вінтоўку і памкнуўся быў да дзвярэй.

— Ідзі-і! — крыкнула ўслед яму жонка.— Але... Не вяртайся... Не вяртайся больш у маю хату!

Рука неяк сама адскочыла ад клямкі, млява павісла. Міжвольна Васіль азірнуўся, прабег вачыма па дзіцячых тварыках, што маўкліва-насцярожана сачылі за бацькам і маці, паглядзеў на жонку.

— Эх ты,— паківаў ён са шкадаваннем галавою.— Ідзе такая вайна, рушыцца тое, чым столькі гадоў жылі, пра што марылі... А ты...

І рашуча піхнуў ад сябе дзверы, выйшаў у сенцы. Пастаяў, закінуў за плечы вінтоўку. А вось ісці далей куды — не ведаў, не ўяўляў.

«У лес? Але ж тут дзеці, яна, Поля. І немцы вось-вось могуць у вёску прыехаць... Аставацца тут, дома? Але дзе? Лезці на гарышча? Ці лепш у хляве схавацца?»

«Усё, усё не тое»,— падказвала яму, калола думка.

«А што тое?»

«Тое — гэта каб з жонкаю лад быў, каб разумела цябе, як сябе. Каб з хаты не выганяла, а калі што — дапамагала, падзяляла і погляды, і справы».

«Але пра гэта трэба было раней думаць, калі жаніўся. Не спяшацца трэба было, а выбраць у жонкі сапраўдную спадарожніцу...»

— Эх,— уздыхнуў, прамовіў уголас са шкадаваннем Васіль і пацягнуўся рукой да дзвярэй, выйшаў з сенцаў. Утаропіўшы долу вочы, пабрыў па звычцы на дрывотнік. Сеў, апусціўся на абцюканы сякерай чурбан-калодку, на якім заўсёды сядзеў, калі на душы не было злагады, калі не ведаў, як і што далей рабіць, задумаўся...

## XX

Не ведала яшчэ ніколі гэткага ўзрушэння, не жыла так бурна Паташня, як у той дзень. Ледзь толькі развіднела, па вёсцы пранеслася чутка — нехта ўночы спаліў мост праз Балацянку. Усе, хто быў на нагах, беглі да ракі — паглядзець, ці праўда, ці не мана тая чутка. Жан-

чыны не завіхаліся ля печаў, не варылі есці; мужчыны — іх у Паташні асталося толькі некалькі, і то нездалякі, белабілетнікі — забыліся пра свае клопаты, таксама сышліся да маста. Сабралася да ракі і дзятва. Хадзілі па беразе, глядзелі на згарэлыя ледзь не да самай вады палі, на чорныя, абвугленыя галавешкі, што валяліся і ў траве, і ў гразі, і кожны лічыў сваім абавязкам нешта сказаць, падзяліцца тым, што ён думаў, ведаў.

— Я ўночы бачыў, як мост гарэў,— гаварыў, трасучы сівою казлінаю барадою, сухарлявы Казімір Камша.— Выходзіў на двор і бачыў...

— Чаму ж ты людзей не пабудзіў? — пытаў гэтакі ж нядошлы, толькі што без барады, бяззубы Яўсей Лашак.— Патушылі б.

— Хе-е,— быццам пасміхаўся ў бараду Казімір Камша.— Патушылі б. А ты ведаеш, што мост не сам па сабе гарэў. Яго падпалілі...

— Хто падпаліў? — пыталі ў Казіміра.

— Кеб жа я ведаў,— паціскаў плячыма, хітравата ўсміхаўся Казімір.

— Хіба нікога не было ля маста?

— Чаму ж, не сарокі ж агонь прынеслі,— мяўся, не хацеў усяго гаварыць Казімір.

— Каго ты там бачыў? — насядалі з усіх бакоў людзі.

— Ноч жа была, цёмна. І я... Не пазнаў.

— Хто — бабы ці мужчыны?

— Мужчыны. Двое. Са стрэльбамі.

— Са стрэльбамі? — жахаліся паташанцы.— І адкуль яны прывалакліся, куды потым, як мост згарэў, пайшлі?

— Чаго не ведаю, таго не ведаю,— ухіляўся ад адказу Казімір Камша. А мо і сапраўды больш нічога і не ведаў?..

Пачалі людзі строіць здагадкі, хто ж былі тыя двое, ды яшчэ са стрэльбамі. Такіх людзей, хто меў стрэльбы, у іхнім сельсавеце раз-два і палічыў, іх усе ведалі. Але, як узяліся ўспамінаць, выявілася неўзабаве: тыя, хто меў стрэльбы, пайшлі па мабілізацыі, у армію.

— А Яўхім Бабай? — згадаў нехта.

— Яўхім Бабай?..

Доўга абмяркоўвалі — мог Яўхім Бабай падпаліць мост ці не мог. Адны схільныя былі згадзіцца, што Бабай мог падпаліць мост.

— Етаму нічога не шкода. Кеб яму хто даў права, свет бы ўвесь падпаліў...

Другія — наадварот — не згаджаліся, што Яўхім Бабай мог падпаліць мост.

— Рахубы ніякай няма яму мост паліць. А без рахубы ён і пальцам не паварушыць. Ды і не адзін жа, Казімір вунь кажа, чалавек быў, а двое. А з Бабаем... Хто з Бабаем пойдзе. Ды яшчэ мост паліць?

Была, была праўда ў гэтых разважаннях. Яўхіма Бабая ніхто не любіў, і ісці з ім паліць мост... Не, наўрад каб хто адважыўся, згадзіўся.

— З ім не тое што мост паліць, с... ніхто не сядзе,— заключыў спрэчку ўсіх Яўсей Лашак.— Ды і чаму свае людзі будуць мост паліць? Выгада якая?

— А якая выгада чужым ета рабіць? — умяшалася ў гаворку мужчын Алена Здатная — на самай справе прозвішча Алены было Неахайная, але яна памяняла прозвішча, перапісалася на Здатную.

Зноў дружна пачалі абмяркоўваць, каму якая выгада з таго, што мост згарэў, няма яго праз Балацянку.

— Каб выгады не было — не палілі б,— стаялі на сваім адны.

— Але ж дзе, якая выгада? — пыталі другія.— У чым яна?

Спрэчку гэтую спыніў паташанскі настаўнік Кухта, які, адаспаўшыся, пазней за іншых пачуў, што згарэў праз Балацянку мост, і прыйшоў таксама сюды, да людзей. Спыніў сваім недарэчным пытаннем:

— Скажыце, а як гэтта цяпер праз раку перапраўляцца будзем?

— Куды перапраўляцца? — спытаў у настаўніка Яўсей Лашак.

— Як куды? Ды ў Ельнікі, калі каму трэба...

Сапраўды? Ніхто і не падумаў у першую хвіліну пра галоўнае — як, якім чынам праз Балацянку пераправляцца, калі каму-небудзь трэба, тэрмінова прыспічыць у Ельнікі.

— Новы збудуем,— хіхікнуў нехта.

— Новы? Еты гадоў, мусіць, з пяць будавалі,— адказала жартаўніку Алена Здатная.— А новы ўсе дзесяць будаваць будам.

— Пераправляліся ж неяк, калі моста не было,— нагадаў Казімір Камша.

— Як пераправляліся? — накінуўся на Казіміра Яўсей Лашак.— А-а, успомні... Зімою па лёдзе хадзілі і ездзілі... А вясною, як вада разлівалася, дома сядзелі.

Хіба на чоўне перавозілі, калі каму надта пільная патрэба ў Ельнікі была...

— І цяпер перавязём,— не здаваўся Казімір Камша.— Не было б большае бяды...

— Ды бяда звычайна адна не ходзіць, за сабою другую водзіць,— задумліва сказала Алена Здатная, далучаючыся да мужчын, нават закурыла.

— Якая яшчэ бяда? — недачуў, наставіў вуха Парамон Жары, які, нягледзячы на свае гады,— колькі іх ён пражыў, ні сам, ні ніхто ў Паташні не ведаў, але адчувалі, бачылі: багата! — таксама прытупаў сёння да моста, хоць усе апошнія дні амаль і не ўставаў на ногі, ляжаў на печы.

— Не ведаю,— круціла галавою Алена, зусім памужчынску зацягваючыся самакруткай і выпускаючы з ноздраў дым.

— А калі не ведаеш, дык не гавары, не каркай,— астудзіў Алену Яўсей Лашак.

— Гэтта шкодніцтва, паліць мост,— ківаў галавою Сцяпан Радзівонавіч Кухта.— Немцы не пахваляць. Адказваць давядзецца.

— Каму адказваць? — насцярожана глядзелі з усіх бакоў на настаўніка паташанцы.

— Гэтта я не ведаю. Хто вінаваты, той і адкажа.

— А хто вінаваты?

— Прыйдуць немцы, то выявяць, знойдуць,— упэўнена адказаў Сцяпан Радзівонавіч.

— Як ета яны выявяць, знойдуць? — глядзеў проста ў вочы настаўніку Казімір Камша.— Мы нічога не ведаем, а яны ведаць будуць?

— Будуць,— упэўнена цвердзіў сваё Сцяпан Радзівонавіч.— Вось як пастрояць усю вёску ды кулямёты навядуць... Ніхто нічога не ўтоіць, усё раскажаце...

І, горда, бы арол, акінуўшы звысоку людзей паглядам, настаўнік павярнуўся і пайшоў назад у вёску.

Хвілін колькі панавала цішыня. Словы настаўніка ўпалі не на камень. Ніхто і не падумаў, што за спалены мост давядзецца адказваць.

— Хто паліў, няхай той і адказвае,— першая парушыла маўчанне Алена Здатная.— А мы тутака пры чым?

— Калі па-добраму, дык яно і павінна б, кеб так, як ты кажаш, было,— згадзіўся з Аленаю Яўсей Лашак.— Але...

Памаўчаў, падумаў і дадаў:

— Урэшце, мая хата з краю. Я нічога не ведаю, не бачыў...

І, паглядзеўшы шматзначна на Казіміра Камшу, угнуў у плечы галаву і таксама, не спяшаючыся, падаўся ўслед за Сцяпанам Радзівонавічам Кухтам у вёску.

— Быццам я багата чаго ведаю, быццам я багата што бачыў,— зыркнуў на Яўсея Лашака Казімір Камша.

— Ды не бойцеся, можа, усё яшчэ і абыдзецца,— супакоіў палахліўцаў нехта з натоўпу.— Немцы не дурныя, разбяруцца.

— Хай бы разбіраліся, толькі б нас не чапалі,— мрукнула сама сабе пад нос, але так, каб іншыя яе чулі, Алена Здатная.

— Чакай Пятра — сыр з'ясі.

— Не забывайце, што немцы — заваёўнікі, фашысты.

— Ну дык і што? Калі хто невінаваты, дык невінаваты. Заўсёды так было. І будзе!

— Што было — мы ведаем! А во як будзе?..

— Таксама ведаць будам. Не доўга чакаць.

— А і праўда ж. Як дачуюцца немцы, што мост у нас згарэў, дык і прыедуць.

— А яны ўжо і дачуліся, вунь едуць!

Апошнія словы прымусілі ўсіх раптоўна павярнуцца, паглядзець на дарогу, што праставала з Ельнікаў. Сапраўды — уздымаючы шлейф пылу, які ветрам зносіла на яшчэ зялёны абсяг бульбы, па дарозе імчала некалькі матацыклаў, а за імі яшчэ і машына, поўная ўзброеных салдат, што сядзелі ў кузаве паўзбоч бартоў.

Усе, як па камандзе, кінуліся ў вёску. Міг — і людзі зніклі, рассыпаліся па дварах. Але не, не пахаваліся — хто з-за плота, хто з-за шула, хто з акна хаты сачылі за дарогай, не зводзілі вачэй з матацыклаў і машыны, якія надта ж імкліва набліжаліся да Балацянкі. Усіх цікавіла адно — што будуць рабіць немцы, апынуўшыся ля спаленага маста.

А немцы, даехаўшы да ракі, спыніліся. Павылазілі з матацыклаў, пасаскоквалі з кузава машыны. Сабраўшыся ў купу, нешта горача абмяркоўвалі. Потым адзін за адным пачалі падыходзіць да спаленага маста, некаторыя спрабавалі наблізіцца да вады. Але бераг Балацянкі быў рыхлы, тарфяністы, і калі адзін з немцаў неасцярожна аступіўся, дык і пасунуўся ў гразь. Вылезці сам з ракі немец не змог. У адчаі ён закрычаў, да яго падбеглі іншыя немцы. Пачалі падаваць яму рукі, рамяні. Сяк-так немца ўсё ж вы-

цягнулі на бераг, і ён, сеўшы на траву, разуўся, выліваў з ботаў ваду, выкручваў мокрыя шкарпэткі...

Урэшце немцы зноў паселі ў матацыклы, пазалазілі ў кузаў машыны. Пусціўшы густы дым, матацыклы і машына завярнуліся і паехалі назад у Ельнікі. Мінула вельмі мала часу — і немцы зніклі, схаваліся ў лесе.

З двароў, хат высыпалі зноў на вуліцу паташанцы. Адны смяяліся, радаваліся, што немцы так і не даехалі да іхняй вёскі, хвалілі тых, хто здагадаўся спаліць мост і тым самым выратаваў Паташню ад нашэсця чужынцаў. Спрабавалі нават жартаваць, успаміналі, як упаў быў, зачапіўшыся за купіну, Парамон Жары і ляжаў на поплаве, у разоры, не варушыўся нават, аж пакуль не паехалі немцы. Некаторыя ж, разважлівыя, радасці сваёй не выказвалі ўголас, наадварот, астуджвалі тых, хто надта ж весяліўся.

— Пачакайце, ета яшчэ кветачкі... Ягадкі потым будуць! — казалі яны.

Большасць жа людзей былі заклапочаны і насцярожана маўчалі. Ведалі, адчувалі — ненадоўга пазбыліся непажаданых гасцей.

## XXI

Сяк-так, з дапамогай крыку і пугі, кароў, што былі не параненыя, маглі хадзіць, павыганялі на чыстае, на луг. Хомка абабег, абышоў чараду, падкульгікаў да Надзі, не то сказаў, не то спытаў:

— Ну што, рушым з богам?

Надзя ўсё яшчэ не зусім разумела Хомку.

— Сюды мучыліся... А цяпер назад,— сумнявалася, цадзіла яна скрозь зубы.

— А што ж рабіць? — разгневаўся, закрычаў Хомка.— Пакідаць вось так? Не-е, ета не па мне... Калі я за што бяруся — да канца даводжу...

— Дык жа канец той... Дзе? — пытала, глядзела на Хомку Надзя.

— Кеб жа я сам ведаў,— бездапаможна пацікнуў плячыма, увесь сцяўся, аж, здаецца, паменшаў Хомка.

— А калі не ведаеце... Дык... Навошта ета?

— Што — ета?

— Ну, то сюды кароў гналі... А цяпер назад?

Сам, сам ведаў Хомка, што толку ў тым, што ён загадваў

рабіць, ніякага не было. Але і быць, аставацца далей з каровамі тут, ля Дняпра, чакаць невядома чаго...

— Во што,— урэшце сказаў, выціснуў з сябе Хомка.— Давай адгонім хоць адсюль трохі ўбок кароў.

— Куды — убок?

— Куды-небудзь, далей ад пераправы. Можа, там самалёты не лятаюць, не бамбяць...

Згадзілася, аж павесялела Надзя.

— Ета правільна. Даўно трэба было так зрабіць.

Занялі кароў, пагналі па лузе ўзбоч Дняпра далей ад пераправы.

— Можа, на вёску якую натрапім,— гаварыў, кульгаючы непадалёку ад Надзі, Хомка.— То я начальства пашукаю. Спытаю, як нам быць. Раптам кароў здаць каму можна. Здалі б — і дадому, дахаты... Кеб не сучка етая — паехалі б...

— Якая сучка? — перапытала Надзя.

— Ды Клаўдзя.

— А-а,— успомніла, што адбылося зусім нядаўна, Надзя.— І праўда ж — уцякла ад нас, нічога не сказаўшы.

Аж зубы сцяў, набычыўся Хомка.

— Ад людзей нікуды не схаваешся,— сказаў разважліва, але ўпэўнена Хомка.— Ета мне бацька яшчэ казаў. І чым болей я жыву, тым болей пераконваюся: праўду казаў. Маною свет пройдзеш, а назад не вернешся. І адкажа чалавек за ўсё, што б і дзе калі ні рабіў. Калі не перад людзьмі, дык перад богам. Кары за грахі свае пазбегнуць нікому не ўдавалася. І што наканавана — таму быць, ад таго, як бы ні хацеў, не ўцячэш. Запомні ета!

Апусціўшы долу вочы, слухала Надзя Хомку, не пярэчыла. А Хомка, рады, што яго слухаюць, гаварыў і гаварыў, быццам хацеў выказаць усё, што было ў яго на душы, што сабралася за ўсе тыя дні, калі маўчаў, нікому нічога не гаварыў.

— Ты маладая яшчэ — і добраму вучыся. Канешне, жыццё не гладзіць па галоўцы, жыццё жорсткае. Але паглядзі, як дрэва хоць бы смерць сваю прымае. Падыходзіць чалавек з тапаром да яго — а яно стаіць. Сячэ, пілою рэжа, а яно ні з месца. Толькі слязу — сок іноды пусціць. Ці тварына тая ж... З нажом, касой да горла, а яна рыкне ці завішчыць. Бо ведае, адчувае — нікуды не ўцячэш, што мае быць, тое будзе. А чалавек... Чалавек хоча абхітрыць самога сябе, бога хоча абхітрыць.— Хомка сумна ўсміхнуўся.— Як мы во з табою. Замест таго каб чакаць,

што павінна быць, напаткае нас, мы мітусімся, нечага шукаем, бегаем, уцякаем, нібыта выратавацца можна ад таго, што здарыцца, што непазбежна будзе...

Памаўчаў.

— Ходзячы за каровамі, я неаднойчы пра чалавека думаў. Шмат добрага пра яго сказаць можна. Але шмат і благога. Надта ж хціўы чалавек, хоча ўсіх і ўсё заняволіць, сабе падпарадкаваць, кеб яму ўсё служыла. І ні перад чым не спыняецца. Адбірае жыццё ў тварыны і дрэва, абы самому лепей жыць, абы цяплей ды сытней было. Пра сябе вельмі багата думае. Дзеля сябе і свайго дастатку гатовы каго заўгодна знішчыць. Нават такіх, як сам, людзей... Да дабра ета не прывядзе. А цяпер яшчэ вайна етая ўсчалася... Колькі каго і чаго яна вынішчыць, агнём пякельным спаліць! І ета, мабуць, кеб адумаўся чалавек, менш грахоў браў на сваю душу, кеб разумнейшы, ашчаднейшы быў, шанаваў усё жывое. Калісьці Ісуса Хрыста зусім невінаватага распялі на крыжы. І я доўга думаў: «Чаму такое здарылася, чаму ніхто не абараніў — ні людзі, ні бог». А цяпер ведаю — так трэба было. Людзям усім трэба, кеб помнілі, ведалі, што невінаватага пакаралі — распялі на крыжы. І кеб больш ніколі нічога падобнага не рабілі. Толькі ж... Людзі вельмі хутка пра ўсё забываюць. Не ўсе, вядома, а некаторыя. Вось вайна і напомніць...

Адчуўшы, што гаворыць доўга і не зусім тое, што трэба гаварыць, раптоўна змоўк, паглядзеў на неба — яно было чыстае, яснае, зусім без хмар. І самалётаў нідзе не было відаць — ні над пераправаю, ні так дзе.

— Сціхла ўсё,— сказаў Хомка ўголас.

— Ета толькі здаецца так. Пачакайце, зараз зноў прыляцяць, зноў усё пачнецца,— аглядаючыся з насцярогаю па баках, са страхам прамовіла Надзя.

Але самалёты ў той дзень больш не прыляцелі. Ды і чаго ім было прылятаць — пераправу недзе апаўдні занялі немцы. І пра гэта Хомка з Надзяй зусім выпадкова даведаліся ад людзей, што беглі, уцякалі ад Дняпра.

— І нам трэба ўцякаць,— прамовіў, задумаўшыся, Хомка.— Але каровы... Не кінеш жа іх проста так, на лузе, без усялякага нагляду.

— А гнаць?.. Куды ж гнаць, калі ўсюды немцы? — глядзела непаразумела на Хомку Надзя.

## XXII

Усе гэтыя дні Іван Дарошка жыў чаканнем вялікага пералому, што павінен быў вось-вось наступіць у вайне з немцамі. Не сёння, дык заўтра нашы войскі, сабраўшыся з сіламі, павінны былі даць рашучую бітву, пасля якой гітлераўцы без аглядкі пабягуць назад аж да Берліна. Так Івану Дарошку хацелася, так яму і мроілася. І чаканнем гэтай рашучай бітвы ён жыў, увесь час думаў і думаў пра яе. Успамінаў факты з гісторыі, калі рускія войскі давалі такія бітвы і тэўтонам, і шведам, і французам... «Не, не дарэмна адступаюць нашы... У галовах нашага камандавання, мусіць, спее генеральная бітва, і, відаць, камандаванне сцягвае сілы, каб спыніць наступленне, разбіць немцаў. Інакш і быць не можа, не адступалі б нашы. Ды яшчэ так...»

Але час ішоў, бег за днём дзень, а пералому ніякага не было. Мяркуючы па тых звестках, што даходзілі з фронту, немцы ўсё наступалі і наступалі, а нашы адступалі. І гэта неяк нядобра трывожыла, халадзіла думкі і душу. Асабліва ў тыя хвіліны, калі аставаўся адзін, калі не было з кім ні пагаварыць, ні параіцца. А такія хвіліны здараліся чым далей, тым усё часцей. А ён жа, Іван, не прывык да адзіноты. Колькі помніў сябе, заўсёды з людзьмі быў. І дома, у вёсцы, і ў Гудове, на заводзе, і потым у сельсавеце... Нават увечары, уночы і то не аставаўся адзін, бо сям'я была — жонка, дзеці. А цяпер... Дзень і ноч адзін і адзін. Добра, што Васіль Кулага хоць зрэдку побач бывае... А так бы і зусім здзічэў у лесе...

«Дык гэта ж немцаў яшчэ ў Вялікім Лесе і ў Гудове няма. А як прыйдуць яны сюды...— думаў Іван Дарошка.— Тады, што будзе тады?»

Адчуваў, усведамляў Іван Дарошка: нельга быць яму ўвесь час аднаму, чакаць невядома чаго. З людзьмі трэба сустракацца, гаварыць. З райкомам варта як найхутчэй звязацца, з Багавіком пабачыцца... Багавік бы... Калі не супакоіў бы, дык хоць бы яснасць унёс... Хто-хто, а ён-то напэўна ведае, дзе цяпер фронт, куды адступілі нашы. І рабіць што тым, хто пакінуты ў тыле ворага, таксама ведае...

Але як сустрэцца з Багавіком, дзе шукаць яго — не ведаў Іван Дарошка.

«Хіба ў Ельнікі самому падацца?.. Ці паслаць каго-небудзь? — думаў Іван.— Але ж... Дзе цяпер райком, дзе

шукаць Багавіка?.. Паходзіш па вуліцах, ды так ні з чым і вернешся назад... Ого, гэта яшчэ добра, як вернешся. А можаш жа і не вярнуцца... У Ельніках жа даўно акупанты...»

«Усё адно трэба ў Ельнікі схадзіць, хоць паглядзець, даведацца, што там цяпер... Не ўвесь жа час хавацца...»

Здавалася, уяўлялася Івану Дарошку: варта трапіць яму ў Ельнікі, і ён знойдзе райком, сустрэнецца з Багавіком. І пагаворыць, пра ўсё, усё пагаворыць.

«Багавік — гэта галава. Ён калі і не ведае чаго, дык здагадаецца. І наперад на дзесяткі гадоў бачыць... Пагаварыць з ім — гэта розуму набрацца, упэўненасці, смеласці... Ды і ўказанні Багавік навейшыя дасць... Ці правільна мы робім, што масты палім? Ці не месніцтва гэта... Пра сябе, сваю вёску думаем. А трэба пра ўсіх людзей думаць, пра краіну ўсю...»

«Пра краіну ёсць каму думаць. А нам пра свой сельсавет трэба клапаціцца і дбаць».

«І пра краіну таксама...»

Зноў, зноў — каторы ўжо раз! — балюча ўкалола ў самае сэрца, калі Іван згадаў краіну, тое, што так нечакана абрынулася на яе, на ўсіх савецкіх людзей.

«Як магло здарыцца, што не затрымалі ворага на граніцы, прарваўся ён, топча нашу зямлю? І спынім яго калі, дзе мяжа тая, дайшоўшы да якой паверне вораг назад?»

І тут жа адчуў Іван, што сам вораг назад не паверне, прымусіць ворага зрабіць гэта трэба. А дзеля гэтага сіла, сілішча павінна быць...

«Дык жа ёсць, ёсць у нас такая сіла...»

«Сіла ёсць, а, бачыш, вораг усё наступае і наступае...»

«Нічога, і адступаць яшчэ будзе...»

«Калі тое?.. Дажыць бы, убачыць бы...»

«Дажывем, убачым... Толькі не сядзець склаўшы рукі трэба, а змагацца, рабіць усё дзеля перамогі... Пра групу баявую паклапаціцца. Каб не ўдвух з Васілём усё рабіць, а і іншыя каб памагалі. Вочы, вушы мець усюды... Хто як сябе паводзіць, куды немцы едуць, колькі іх... І планы іхнія ведаць. Каб своечасова, каго трэба, папярэдзіць, абясшкодзіць, а то і знішчыць саміх немцаў яшчэ да таго, як зробяць яны тое, што задумалі. Бо вайна — гэта яшчэ і хто каго абхітрыць, абдурыць. Ды і зацягваецца яна. І калі скончыцца — ніхто сказаць не можа. Таму гатовым да ўсяго трэба быць... Наперадзе ж — восень гнілая, зіма. І не

ў Васіля яду трэба прасіць, а самому наладзіць харчаванне. І начлег таксама. Ці ў знаёмых у Гудове, ці ў лесе. Зямлянку выкапаць. У заглушы, куды і людзі не вельмі забрыдаюць...»

...Ішоў, брыў Іван Дарошка па лесе, і віліся, віліся ў яго галаве думкі, што ні крок — то ўсё новыя...

## XXIII

Амаль да самага вечара прасядзеў Мікалай Дарошка ў кустах, не асмельваючыся, не рашаючыся пайсці, вярнуцца ў вёску. «Пойдзеш, а там... Немцы... Не, лепей у кустах лішнюю гадзіну пасядзець, затое клопату ніякага мець не будзеш. Не было мяне дома — і ўсё... Потым, далей, відаць будзе, што і як... А цяпер лепей у баку ад усяго пабыць, паглядзець, падумаць, не спяшацца... Ды і Бабая слухацца... Не-е, не дачакаецца таго ён!.. Хай Бабая іншыя слухаюцца, а ён, Мікалай Дарошка... Слухацца Бабая не будзе... І сын, Іван, яшчэ тут, і Кулага Васіль... Іх пакуль што ніхто не здымаў з пасад, яны ўсім кіруюць... І бачыш, пры зброі абодва, з вінтоўкамі...»

«А чаму яны з вінтоўкамі?.. Ды і адкуль ішлі так рана?.. Змораныя, стомленыя?..»

Успомніў, як у тую, яшчэ ранейшую, вайну, калі чырвоныя ваявалі з белымі, пайшоў быў ён, Мікалай, аднойчы раненька ў лес і напаткаў Багавіка. Амаль на тым самым месцы, што і Васіля з Іванам. «Не хадзі далей, вярніся»,— папярэдзіў тады Багавік яго, Мікалая. «Чаму?» — спытаў быў ён, Мікалай. «Потым даведаешся, а цяпер вярніся!» Паслухаўся ён, Мікалай, вярнуўся. І добра, што зрабіў тое, бо і з лесу не паспеў выйсці — страляніна ўсчалася. Расказвалі потым — перастрэлі на дарозе Багавік са сваімі хлопцамі атрад, што ў Вялікі Лес ехаў, і чалавек з сем забілі...

«А мо і Іван з Васілём немцаў хочуць перастрэць, не пусціць іх у Вялікі Лес?»

Халодныя мурашкі пабеглі між лапатак.

«Івана ж забіць могуць...»

Падняўся, хацеў ісці, вярнуцца ў лес.

«Адгаварыць трэба Івана, кеб не звязваўся з немцамі, у бой не ўступаў. У Багавіка і то тады чалавек з дваццаць было. А ўдвух з Васілём... Хіба стрымаеш немцаў?.. Іх жа можа і сто, і дзвесце ехаць...»

«Але ж Іван з Васілём рассталіся,— згадалася рап-

там.— І адзін дадому, у Вялікі Лес, пайшоў, а другі ў хвойнік... Нават паесці яму прынесці Васіля Іван папрасіў. «Яды якой з сабой захапі... Бо я, можна сказаць, галадаю»,— прагучала ў вушах.

Апусціўся, сеў у траву.

«Наўрад ці перастракаць Іван з Васілём немцаў будуць... Дый... Хіба знойдзеш Івана ў лесе... Нават калі засаду наладзяць на немцаў...»

Як і заўсёды ў хвіліны душэўных пакут і разладу, пачаў маліцца: «Божа, зноў звяртаюся да цябе. Даруй, што так часта. Даруй і памажы... Бо ета ж чортведама што робіцца... Сын, Іван, з вінтоўкай па лесе сноўдаецца, а Бабай немцаў, нелюдзяў, загадвае сустракаць. І чым, божа, усё ета скончыцца?.. Хоць смярцей не дапусці. Хай і Іван, і Піліп, і Параска, і Косцік — усе, усе жывуць... Ты ж ведаеш, божа, мяне, я ніколі не схіблю, быў і астаюся вечна тваім, верным табе... Аднаму, аднаму табе...»

На самым заходзе сонца, калі пара была і кароў гнаць з пашы, убачыў Мікалай — па дарозе з Ельнікаў нехта ідзе ў Вялікі Лес. І яшчэ здалёку пазнаў — ішла, абапіраючыся на кій, абчапляная з двух бакоў палатнянымі торбамі, Варка — старчыха. Дзе і калі яна нарадзілася, дзе жыла — ніхто пэўна сказаць не мог, бо Варка рухавая была, аселасці не мела, хадзіла ад вёскі да вёскі, па ўсім раёне, забрыдала калі-нікалі і ў Вялікі Лес. І спытай у яе, дзе што робіцца,— усё, усё ведае. Не вытрымаў Мікалай, выйшаў на дарогу, перастрэў Варку, спытаў:

— Адкуль ты?

Варка спынілася, пазнала Мікалая. Усміхнулася.

— Ой, Мікалайка, я думала, і не дабяруся ўжо да вас... Ета ж масты нехта папаліў... І праз Старчанку, і праз Балацянку... Сёння ўночы, кажуць...

«Ета, няйнакш, Іван з Васілём,— цюкнула Мікалаю.— І ішлі раненька, а я заспеў іх у лесе...»

— І як жа ты дабралася? — спытаў Мікалай.

— А так, па вадзе... Як і раней, калі мастоў не было. А немцы не пераправіліся. Расказвалі ў Паташні, нібыта прыехалі яны да ракі, паглядзелі на мост спалены, ды назад, у Ельнікі, падаліся.

— Дык яны, мусіць, сёння ўжо і не прыедуць у Вялікі Лес? — вырвалася ў Мікалая міжволі тое, што было ў яго ў галаве, пра што думаў.

— Як жа яны прыедуць, калі мастоў нямашака. Немцы — ета не мы. Ім дарогі трэба добрыя, па гразі яны не прывыклі. Ды і не на конях, не пеша яны, а на машынах... Пешкі канаву можна перайсці, а на машынах жа не пераедзеш...

Як гара звалілася з плячэй у Мікалая. Падумаў сам сабе: «А Іван з Васілём малайцы, здагадаліся ж масты папаліць. Малайцы...»

Не заўважыў Мікалай, як зрушыўся з месца — ногі быццам самі паняслі яго ў Вялікі Лес, дадому. Толькі тады апомніўся, як пачуў збоку:

— Ты б, Мікалайка, хіба памалей ішоў, а то не паспяваю я...

Прыцішыў ходу, спытаўся:

— А так што чуваць на свеце?

— Ой, Мікалайка, добрага нічога не чуваць. Усюда немцы... І не шкадуюць яны нашых людзей — страляюць, забіваюць. У Ельніках ужо чалавек, мусіць, з сорак забілі. І ў іншых вёсках таксама...

— За што яны забіваюць? — насцярожыўся Мікалай.

— А і не скажаш, за што. Бяруць і страляюць.

— Так ні за што ні пра што? — здзівіўся, не паверыў Мікалай.

— Ні за што ні пра што. То што яўрэй ці цыган, то што ў начальстве савецкім быў... Во, да вас хавацца іду, а то і мяне застрэляць.

— А цябе за што?

— Што старцую. Яны такіх не любяць. Усе працаваць павінны. А я ж хіба б не працавала? Але здароўя няма, таму і старцую. А так бы... Ой, Мікалайка, надоечы ў Навасёлкі наехалі. А там нейкі знайшоўся ды немца забіў. Дык за аднаго немца дзесяць чалавек расстралялі... А ў Ельніках кантору адкрылі, куды звозяць людзей з усяго райвону. І мучаць там, дапытваюць. А потым у хвойнік, дзе гліну на цэглу капалі, і страляюць. І за што, кеб ты толькі ведаў? Той паглядзеў на іх не так, як трэба было, той не зрабіў нешта, што яму загадвалі... Погалас пайшоў, што ўсіх пастраляюць, хто неахрышчаны. Дык папа ельніцкага цяпер аж рвуць, усе прыязджаюць, просяць, кеб у сяло прыехаў ды пахрысціў няхрышчаных... А то... Камуністаў, камсамольцаў, сельсавецкае і калгаснае начальства... О-ё-ёй, да чаго мы дажыліся!..

Варка заплакала, ціхенька, як сабака, заскуліла, загаласіла.

Слухаў Мікалай Варку — і халадзела, нямела ў яго ўсярэдзіне.

«Дажыліся... А дажывемся... Да чаго яшчэ дажывемся?» — думаў, ідучы, вяртаючыся разам з Варкай, дадому, у Вялікі Лес.

## XXIV

Ведаў Хомка, адчуваў, што нічога добрага не прынясе яму гэтае валацужніцтва-блуканне з каровамі па незнаёмых, чужых дарогах і пашах, але што так усё скончыцца — не думаў, не ўяўляў... Ды і як было думаць, уявіць такое!.. Мала, што заданне старшыні калгаса Васіля Кулагі не выканаў — не адагнаў глыбока ў тыл кароў, не пераправіў іх цераз Дняпро, не здаў у надзейныя рукі, дык яшчэ і... Эт!..

І рабіць, што цяпер рабіць, кінуцца куды, дзе паратунку шукаць? Бо гэта ж... Разбой. Самы што ні ёсць разбой — вось так, ні за што ні пра што, забралі кароў, а калі ён, Хомка, засупраціўляўся, хацеў даказаць, што каровы не яго, а грамадскія, калгасныя, яго штурханулі, ды так, што ён аж носам у пясок зарыўся. І хто, хто? Прыблуды, чужынцы!..

Ды каровы, хоць і шкада іх, гэта... Нажыўное. А вось Надзя, Надзя... Бо і яе, хоць зусім дзяўчо, не прамінулі прыблуды. Заўважылі. І пальчыкам, усё адно што сабачку, паманілі, паклікалі да сябе. «Не ідзі!» — паказваў, міргаў вачыма Надзі ён, Хомка. Пайшла. Не магла не пайсці, бо бачыла, як яго, Хомку, у пясок шпурнулі, і баялася, што і яе гэтак жа шпурнуць... Ды што шпурнуць!.. І забіць могуць. У кожнага ж зброя, і кожны ж сябе ледзь не за пана лічыць. Ён — гэта ўсё, а ты... Ты нішто, гразь, казяўка... Пайшла Надзя, а ці вернецца, ці прыйдзе яна?.. Ды і калі вернецца, калі прыйдзе, то... Што зробяць яны, прыблуды, з дзяўчынаю?.. Маладыя ж усе, дужыя — жарабцы. І згаладаліся ж, мусіць, па жанчынах... Клаўдзю ім бы...

Плюнуў, успомніўшы Клаўдзю.

«Цьфу, паехала... Знайшла сабе нейкага валацугу, астрожніка... І паехала. Ды Клаўдзя... Ліха з ёю, яна жанчына, замужам была... А Надзя...»

Сядзеў на абочыне дарогі Хомка і ўсё глядзеў, глядзеў на лясок той, куды немцы і кароў пагналі, і Надзю, пасадзіўшы ў каляску матацыкла, павезлі.

«Кеб выпусцілі хоць, кеб не забілі! Бо як не выпусцяць, заб'юць — што тады... Ісці, вяртацца аднаму ў вёску, дадому?.. Але ж... І Мацею, і Мальвіне што сказаць? Ды і людзям?.. Ды што сказаць — самому як усё тое перажыць? Да скону самага вінаваціць сябе будзеш, не даруеш, нізашто не даруеш, што не выратаваў дзяўчыну, даў насмяяцца прыблудам... Хоць... Што мог зрабіць? Наляцелі невядома адкуль, як груганнё, акружылі чараду... Перш чым паспеў апамятацца, уцяміць, што і да чаго,— ні кароў, ні Надзі... Але ж... Людзям, а тым больш Надзіным бацьку і маці, таго ўсяго не раскажаш... Ды і не зразумеюць яны, што ім ні кажы, як ні тлумач. Падумаюць — збаяўся, не заступіўся, не абараніў... Ды так яно і ёсць... Бо кеб кінуўся на іх, з кулакамі, пугаю...»

І тут жа Хомка астудзіў сябе:

«Кінуцца, яно, можа, і трэба было... Але ці абараніў бы Надзю... Мусіць, не, не абараніў бы... Самога ж забілі б... Эх! Не трэба было мне згаджацца кароў гнаць, не трэба было... Жыў бы ў сваёй вёсцы і анігадкі быў бы. А так...»

Не вытрымаў, на ногі падняўся. Пастаяў, паглядзеў на поле дзікае, пясчанае, палыном ды бур'янам зарослае, дзе немцы з чарадою яго перахапілі, і пайшоў, пакульгікаў да лесу, што сінеў, зеляиеў удалечы і куды паехалі, схаваліся разам з Надзяю і каровамі немцы.

«Можа, хоць чым памагу Надзі... А не памагу — сумленне чыстае ў мяне будзе... Хацеў, стараўся памагчы... А можа, і памагу... Адкуль ета я, з чаго ўзяў — што не памагу... Паспрабаваць трэба...»

Ішоў, кульгікаў Хомка і адчуваў — ногі не слухаюцца яго, падгінаюцца, назад, назад хочуць павярнуць. А тут яшчэ сонца гэтае — на самы лес апала і свеціць, свеціць проста ў вочы, аж слепіць, нічога ані праз яго не відаць.

Да кустоў, лесу сяк-так дабраўся. Далей, далей па дарозе пайшоў. Балотца, потым паляну, хвойнік малады мінуў. І на ўзбочыне, непадалёку ад дарогі, пад раскідзістым кустом арэшніку, Надзю ўбачыў. Ляжала яна... Божа, амаль голая...

«Згвалцілі?.. Забілі?..»

Кінуўся з усіх ног да Надзі, упаў, як не паваліўся на траву.

— Надзя, Надзя-я! — закрычаў у адчаі.

Жывая, жывая была Надзя. Галаву павярнула, ачулася. Рукою павяла, ногі свае голыя спадніцаю прыкрыла. І заплакала, загаласіла, уткнуўшыся тварам у іглiцу.

Ён, Хомка, доўга не ведаў, што рабіць, як суцяшаць, чым супакойваць дзяўчыну. Сядзеў, апусціўшы рукі, і сам... Плакаў... Плакаў і не адчуваў, не ведаў, што плача.

— Надзя, Надзя,— шаптаў ён.— Добра, што не забілі, жывая ты... А на ета... Забудзь... Забудзь сама, і я забуду... І нікому не гавары, не прызнавайся... І я... Не скажу...

Адчуў: не тое, не тое гаворыць...

«А што, што «тое»?» — пульсавала, пакутліва білася ў галаве думка.

## XXV

Ішлі дні, і страх, што не сёння, дык заўтра ў Вялікі Лес наведаюцца немцы і скончыцца тое жыццё, якім жылі дагэтуль, мінаўся. Асабліва пасля таго, як нехта навіну прынёс, быццам спалены масты не толькі па дарозе на Ельнікі, але і разбураны на чыгунцы, і за Гудовам, і перад Гудовам. Цяпер ясна стала — пакуль не адбудуюць мастоў, немцы ў Вялікі Лес не пакажуць і носа. Зноў, нібыта так і трэба, на працу ў сельсавет штодзень, як і бывала, пачаў прыходзіць Іван Дарошка. Працавала і кантора ў калгасе, хоць гаспадарка была і размеркавана па людзях. Васіль Кулага разам з брыгадзірамі Рыгорам Бядой і Ігнасём Дранікам памаглі людзям і жыта пасеяць, і бульбу выкапаць. Надвор'е таксама акурат спрыяла — было суха і цёпла. І хоць прыходзілі адусюль трывожныя весткі, як паводзяць сябе на акупіраванай зямлі немцы, як здзекуюцца з людзей — забіваюць, вешаюць, паляць,— многім у Вялікім Лесе пачынала ўжо здавацца — гэта далёка, у нас такога няма і, можа, дасць бог, і не будзе...

На добры лад людзей настройвала не толькі тое, што ў Вялікі Лес не маглі прыехаць немцы, але што ў вёсцы працавалі сельсавет, праўленне калгаса — словам, была Савецкая ўлада. Калі што якое — ёсць куды звярнуцца, ёсць каму заступіцца і абараніць. Івану Дарошку і Васілю Кулагу людзі верылі. Ды і як ім было не верыць, калі бачылі, самі на свае вочы бачылі, як смела хадзілі тыя па вёсцы з вінтоўкамі, заглядвалі то да аднаго, то да другога ў хату. І гаварылі, гаварылі з людзьмі. Пра што? Не ўсе, далёка не ўсе ведалі, пра што яны маглі гаварыць з тым ці іншым чалавекам, але здагадваліся. Ды і на людскі раток не накінеш платок — з вуха на вуха перадавалася, пра што, напрыклад, гаварылі старшыня сельсавета і старшыня калгаса з Адамам Зайчыкам і Мацеем Тхорыкам, як па-

пярэджвалі і нават пагражалі судом Яўхіму Бабаю, што не з'явіўся, як усе, на мабілізацыю, што бегаў немцаў хлебам-соллю сустракаць, прычым і іншым загадваў, прымушаў тое самае рабіць...

Разнягодзілася, пачаліся зацяжныя асеннія дажджы, з ветрам і холадам. Дарогі раскіслі, расчвяклі, вада стаяла нават там, дзе, здавалася, ніколі яе не было. Што ўжо казаць пра грэблю на Замосце. І ў сухія, пагодлівыя асеннія дні яе ледзь-ледзь пераходзілі людзі. Цяпер жа — адна чорная жыжа была, гразь. Хоць ты плыт вяжы і на ім перапраўляйся. Калі раней сёй-той яшчэ сумняваўся, што, нягледзячы на разбураныя, спаленыя масты, немцы ўсё адно прыедуць, наведаюцца ў Вялікі Лес, дык цяпер усе, літаральна ўсе паверылі — пакуль не ўзыраць маразы, пакуль не падмерзнуць дарогі, ворагаў можна не чакаць. І хоць чуткі з вайны прыходзілі не радасныя, Вялікі Лес жыў надзеяй... Надзеяй на лепшае.

Аж пахудзеў, учарнеў ад злосці Яўхім Бабай... Ды і Адам Зайчык, Мацей Тхорык — не відаць было, каб вельмі радаваліся. Мацею Тхорыку дык быццам і прычына была не радавацца — дачка, Надзя, вярнулася разам з Хомкам, аж, казалі, аднекуль з-пад Дняпра... І не такая, як туды пайшла за каровамі, а нейкая надта ж панурая, і ўсё плакала, плакала. Але што менавіта здарылася з ёю ў дарозе — ніхто не ведаў, нават бацька і маці. І ў Хомкі спрабавалі распытваць — не казаў, не казаў нічога, кульгач.

Вярнулася ў Вялікі Лес, і не адна, а з мужам новым, і Клаўдзя, дачка Коўдравай Мар'і, жонка Піліпа Дарошкі. І ўсе так і мкнулі да хаты Мікалая Дарошкі, дзе пасялілася Клаўдзя, каб на свае вочы ўбачыць новага Клаўдзінага мужа — надта ж, казалі, нялюдскі ён, няўклюдны і непрыгожы. І ў першы ж дзень, як у вёсцы паявіўся, шпурнуў вобземлю Мікалая Дарошку. Ды так, што стары і на людзі не выходзіць — хварэе. Не пабаяўся новы Клаўдзін муж і сына Мікалаевага, Івана, хоць той і старшыня сельсавета, з вінтоўкай штодзень па вёсцы ходзіць. А мо той новы Клаўдзін муж і не ведаў нічога пра Івана, не расказала яму яшчэ Клаўдзя, не паспела...

Пранеслася чутка, што і Апанас Харчэня вярнуўся дадому. І вельмі ж схуднеў — скура ды косці.

Не было доўга, не вярталіся нешта Базыль Раманюк і яго памочнік Хведзька. Як пагналі калгасных коней, дык і не было, не было іх. Аж аднаго дня і яны з'явіліся

ў вёсцы. І адразу ж да Васіля Кулагі пайшлі, далажылі — заданне выканалі, коней загналі ў глыбокі тыл, недзе пад Тулу. І здалі ў надзейныя рукі, нават даведку маюць. І Васіль Кулага дзякаваў Базылю Раманюку і яго памочніку Хведзьку, маўляў, малайцы, іх не забудуць, будуць помніць. І ўзнагароду дадуць, вось толькі няхай немцаў не будзе на зямлі нашай...

Ведалі людзі, верылі — прыйдзе той час, калі немцаў на нашай зямлі не будзе. Вось толькі калі, калі тое наступіць — пэўна ніхто не мог сказаць.

І ішлі, ішлі, то па адным, то цэлай гурмою, да таго, хто аднекуль з дарогі дадому вяртаўся. І распытвалі, пра ўсё, усё чыста распытвалі — і што бачыў, перажыў, і што ад людзей добрых пра ворагаў — немцаў чуў. Ды і ворагі тыя — немцы, якія яны з сябе, што ядзяць, як апрануты і зброя якая ў іх?

І не забываўся, кожны пытаў: а ці сваіх, аднавяскоўцаў, каго бачыў у дарозе, можа, сустрэў ці брата, ці мужа, ці сына?..

Бо не было, не было ад тых, каго мабілізавалі на фронт, вестак ніякіх.

І вочы свяціліся ў людзей у хвіліну тую, калі пытанне сваё задавалі, надзеяй... Раптам бачыў каго, сустракаў на дарогах, раптам скажа, абнадзеіць?..

Надзеямі на лепшае, чаканнем жыў у тыя дні Вялікі Лес.

Бадай што не было ні аднаго чалавека ў вёсцы, які б чагось не чакаў, на штосьці не спадзяваўся...

Усе, усе чагось чакалі, на штось спадзяваліся.

А яно, тое, чаго чакалі, на што спадзяваліся, бавілася, затрымлівалася, не ішло, не ішло...

# Частка другая

Чаканнем, надзеяй жылі ў тыя дні не толькі Іван Дарошка, Вялікі Лес, Палессе. Чаканнем, надзеяй жылі ў тыя дні ўсе людзі, дзе б яны ні былі, беларуская ды і ўся неабсяжная савецкая зямля...

## I

...Гэтую немаладую, па-вясковаму апранутую жанчыну, што ішла, пералазіла праз гурбы пяску, кіруючыся да сельсавета, Іван Дарошка ўбачыў, калі яна была яшчэ па другі бок вуліцы, ля калгаснай канторы. І, стаіўшыся ля акна, не зводзіў з яе вачэй: «Хто гэта?» Па тым, як забілася, аж захаланула раптам сэрца, Іван здагадваўся: жанчына не проста так ідзе, яна нясе нейкую вестку. Важную, вельмі важную вестку. «Ад каго?.. З жонкаю, дзецьмі што здарылася?.. А можа... Ад Багавіка?..» Не вытрымаў, з-за стала падняўся, за якім, амаль не заглядваючы ў сваю баковачку, сядзеў усе гэтыя дні — балазе сталы былі вольныя, ніхто з сельсавецкіх работнікаў на працу ўжо не хадзіў, ды Іван і не імкнуўся, каб хадзілі,— закінуў за плечы вінтоўку. Хацеў падацца насустрач жанчыне, але чамусьці не зрабіў гэтага — стаяў і стаяў у нерашучасці, не ведаючы, што яму рабіць і як далей сябе паводзіць. Жанчына тым часам наблізілася да сельсавета, адчыніла дзверы ў сенцы, потым, праз які момант,— і ў вялікі сельсавецкі пакой.

— Можна да вас? — спытала яшчэ з парога.

— Чаму ж, можна,— адказаў як мага лагодней Іван Дарошка.

Жанчына пераступіла парог, зачыніла за сабою дзверы, сказала, усміхнуўшыся:

— Добрага дня вам, Іван Мікалаевіч!

І так паглядзела сваімі чорнымі агністымі вачыма на яго, Івана Дарошку, што ён зніякавеў: «Яна мяне ведае, добра ведае, а я... Дзе я мог яе бачыць, дзе мы маглі з ёю сустракацца?»

— Вы мяне, вядома, не пазналі?

— Не, не пазнаў,— прызнаўся, нібы папрасіў прабачэння, Іван.

— І не намагайцеся пазнаваць, бо мы з вамі незнаёмыя. Я працавала дагэтуль у Ельніках, настаўніцай. Завуць мяне Людміла. Людміла Рыгораўна Капуцкая. Ведаю трохі жонку вашу, Кацярыну Антонаўну. І вас разоў колькі бачыла на розных нарадах...

І жанчына — Людміла Рыгораўна — уздыхнула, уздыхнула радасна, з палёгкай.

— Ух, не чакала я, што хутка вас знайду. Не, не чакала...

Развязала хустку-канаплянку, расшпіліла гузікі ватоўкі.

— Вы, відаць, стаміліся. Сядайце.

— Ахвотна, ахвотна сяду...

Людміла Рыгораўна адразу ж села. На першы табурэт, што стаяў бліжэй да яе. Яшчэ раз глыбока-глыбока, з палёгкай уздыхнула.

— У вас тут як бы і не акупацыя. Сельсавет працуе, старшыня на сваім пасту. А я ішла ды хвалявалася дарэмна толькі — дзе я вас знайду?

— А ў вас, у Ельніках, хіба не тое? — усміхнуўся аднымі куточкамі губ не то са шкадаваннем, не то проста так Іван Дарошка.

— У нас?.. У нас фашысцкія ўстановы працуюць. Камендатура, паліцыя... Загады розныя ўсюды расклеены. Хто дасць прытулак чырвонаармейцу — расстрэл. Хто пусціць пераначаваць незнаёмага чалавека і не заявіць уладам — расстрэл. Хто зброю мае і не здае — расстрэл... Словам, за ўсё, за ўсё — расстрэл. Не, не, ілгу, ёсць і іншыя меры пакарання — павешанне, знішчэнне ўсёй сям'і...

— І што — гэта пагрозы толькі ці...

— Што вы, якія пагрозы! Па далёка няпоўных падліках, ужо больш за сотню чалавек расстралялі. Сярод іх ёсць і жанчыны, дзеці...

— У адных Ельніках так лютуюць фашысты?

— Ды не, усюды, ва ўсіх вёсках. Гэта вы шчаслівчыкі. Масты папалілі, адгарадзіліся ад свету і седзіце як у бога за пазухай.

— Маразы пачнуцца, то і ў нас... Надта, мусіць, не ўседзіш,— уздыхнуў са скрухай Іван Дарошка.

— Можа быць... Усё можа быць,— згадзілася з Іванам Дарошкам Людміла Рыгораўна.— А таму... Не сядзець трэба, а змагацца, біць гадаў...

І тут жа пераняла гаворку на іншае.

— Я ад Багавіка,— прызналася яна ледзь чутна.

— Ад Багавіка? — паўтарыў, не паверыў Іван Дарошка.— Дзе ён?

— Ён блізка ад вас, ад Вялікага Лесу,— перайшла зусім на шэпт Людміла Рыгораўна.— І вельмі хоча з вамі сустрэцца.

— І я... Таксама хачу яго бачыць. Даўно хачу. Але як знайсці яго? Ён жа — у падполлі.

— Я ведаю, дзе ён. І вас завяду. Дзеля гэтага і прыйшла сюды, у Вялікі Лес,— глядзела на Івана — вочы ў вочы — Людміла Рыгораўна.

— Калі вы гэта зробіце?

— Хоць зараз... Вядома, калі вы нічым не занятыя, можаце са мною пайсці.

— Калі ласка, я гатовы,— выпрастаў грудзі, прыціснуў локцем вінтоўку Іван Дарошка.

Людміла Рыгораўна паднялася з табурэта, зашпіліла на ўсе гузікі ватоўку, зацiснула, завязала хустку-канаплянку. Сказала, павярнуўшыся да Івана Дарошкі:

— Ну, дык што, можам ісці...

І першая рушыла да дзвярэй...

Калісьці, яшчэ да таго, як скінулі цара, зусім зняверыўшыся ў тутэйшых людзях, пан Халявін дзеля надзейнай аховы сваіх лясоў прывёз аднекуль здалёку — з чужых краёў — трох мужчын-здаравіл, казалі, братоў. Пабудаваў глыбока ў лесе кожнаму з іх хаты, даў па паляўнічай стрэльбе, пары сабак. І загадаў: нікога без яго дазволу ў лес не пускаць: ні па дровы, ні па ягады, ні па грыбы.

Новыя панскія леснікі абавязкі свае ўзяліся выконваць старанна. Не было ў наваколлі чалавека, які б паехаў ці пайшоў у лес і не трапіў на вочы каму-небудзь з братоў-чужакоў. Ды вось бяда: людзі не разумелі, чаму іх затрымліваюць, што ад іх патрабуюць, бо мовы не ведалі: браты-чужакі тутэйшай, а сяляне той, на якой размаўлялі новыя панскія леснікі. Давялося самому пану тлумачом быць пры кожным непаразуменні,— ён, выявілася, адзін ведаў і мову сялян, і мову чужакоў-леснікоў. І калі да сялян нарэшце дайшло, чаго патрабуе ад іх пан, чаму пасяліў у лесе чужакоў-здаравіл, занепакоіліся сяляне. Не прывык жа ніхто, жывучы ў лесе, плаціць і за дровы, і за ягады, і за грыбы. І дзе б хто з кім ні сустрэўся, абмяркоўвалі,

абмяркоўвалі новую панскую прынуку. Вядома, першая рэакцыя ва ўсіх сялян была адна — не слухацца нікога, рабіць усё так, як рабілася спрадвеку. Лес, маўляў, ад бога, і ўсё, што ў ім,— усіхняе, а не панскае. Ці мала што пан выдумае, седзячы ў сваім палацы, дык і слухацца?.. І як хадзілі, ездзілі ў лес па ўсё, што трэба было, так і хадзілі, ездзілі. Але сялянская непакорнасць сутыкнулася з апантанай шчырасцю чужакоў-леснікоў. Не толькі ўдзень нельга было паказацца ў лесе, каб не трапіць на непажаданыя вочы, але нават уночы. Лавілі леснікі і мужчын, і жанчын, і дзяцей, адбіралі сякеры, пілы, кашалі і вёдры, ганялі, як усё адно злачынцаў, праз усю вёску ў панскі двор. Людзі абураліся, лаяліся, плакалі, леснікі злаваліся, што іх ніхто не хоча разумець, пан жа бязлітасна караў кожнага парушальніка. Людская цярплівасць не вытрымлівала панскага гневу. А тут якраз чыгунку ўзяліся ў Гудоў пракладваць, наехала ў навакольныя вёскі securнага люду — і катаржнікаў, і астрожнікаў, і «сіцылістаў», і бог ведае яшчэ каго. Пачулі прыезджыя пра пана Халявіна і яго чужакоў-леснікоў, смяяцца, кпіць пачалі: «Го-о, і не прыдумаеце, што з леснікамі зрабіць? Добра, паможам!» І памаглі — злавілі неяк аднаго, самага старэйшага і самага лютага, дуб тоўсты, у некалькі абхватаў надрэзалі. Пілу дасталі, а ў надрэз клін забілі. І туды, у надрэз той, леснікові мужчынскія доблесці ўпіхнулі, клін жа — выбілі. На ўвесь лес роў ляснік, пакуль ад крыку ды болю не зайшоўся. Два другія браты-чужакі, даведаўшыся пра страшную смерць старэйшага брата, назаўтра ж зніклі з пушчы, быццам іх тут і не было, нават, казалі, платы ў пана ніякай за сваю самаадданую службу не ўзялі.

Больш пан Халявін ніякіх леснікоў з чужых земляў дзеля аховы сваіх лясных нетраў не прывозіў. Наймаў мясцовых, тутэйшых. Збавіў і цану на «білет» па дровы, ягады і грыбы. Сяляне, хто багацейшы быў, выпісвалі панскія білеты, а бяднейшыя па старым, даўнейшым звычаі ездзілі па дровы, хадзілі па ягады і грыбы без усякага «білета». Калі ляснік лавіў каго ў лесе, рэдка вадзіў у панскі двор. Свае ж людзі былі — разумеліся. Выпівалі чарку, з’ядалі скварку — і на тым. Бервяно ў сцяну на хату ці ў хлеў трэба было, неслі лесніку «пудла» — жыта ці ячмень — і шыта-крыта. Здаралася, сам ляснік падказваў, дзе якое дрэва ссячы, каб і яму, лесніку, нішто ніадкуль не пагражала, і чалавеку таксама добра было. Пан, бачачы, што «білетаў» амаль ніхто не выпісвае,

а ў лес як ездзілі і хадзілі, так і ездзяць і ходзяць, мяняў час ад часу леснікоў, набіраў новых. Але і новыя былі свае людзі. Ведалі: панскай ласкі не заслужыш, а з людзьмі адносіны сапсуеш. Ды і лесніком вечна не будзеш. Ці пан прагоніць, ці самі людзі, змовіўшыся, яшчэ зробяць, не дай бог, тое, што зрабілі з леснікам-чужаком... У кожнага тутэйшага лесніка была свая хата, таму ў тыя, што пабудаваў пан, ніхто асабліва не рупіўся перабірацца. Жылі, як правіла, у вёсках. І соль, калі трэба, блізка, і газа, і дзецям у школу не праз увесь лес хадзіць. Ды і ваўкі ў піліпаўку пад вокнамі не выюць, не ідзе «на агеньчык» абы-хто... Хаты ж — вартоўні — так і стаялі ў лесе. І, як выявілася хутка,— не пуставалі. Жыў у гэтых хатах, хаваўся розны бяздомны люд. То тыя, хто не хацеў у царскае войска ісці, то хто з турмы ўцякаў, а то з горада іншы раз паляўнічыя наязджалі і спыняліся ў гэтых далёкіх ад селішчаў хатах. Тутэйшыя людзі і нават леснікі і блізка не падыходзілі да палян, дзе вартоўні стаялі. Вечна на каго-небудзь напорашся там. І добра ж, як на чалавека людскага. А як на астрожніка, катаржніка? Абярэ як ліпку, раздзене ды яшчэ і паздзекуецца... У гады, калі пачалася рэвалюцыя, а потым неўзабаве і грамадзянская вайна, у гэтых лясных хатах хто толькі не хаваўся. На нейкі час знайшоў у адной з вартоўняў прытулак сабе і свайму партызанскаму войску і Раман Платонавіч Багавік. Ледзь не ўсю зіму прасядзеў там, гуртуючы сілы і рыхтуючыся да баёў. Наязджаў і потым, пасля ўжо ўсталявання Савецкай улады, то ў адну, то ў другую з гэтых хат Багавік. І калі бандытаў у тутэйшых лясах лавілі, і калі калектывізацыя пачалася і сынкі кулакоў ды багацеяў розных у лясы падаліся. І нават стаўшы сакратаром райкома партыі, не цураўся вартоўняў Багавік. Спыняўся начаваць, калі на паляванне з абласнога цэнтра госці прыязджалі, і так іншы раз едзе з якога-небудзь калгаса, успомніць, што непадалёку хата пустая стаіць,— і збочыць, пабудзе нейкі час ля яе. Вабілі да сябе гэтыя старыя хаты Багавіка, можа, таму, што многае ўспаміналася. Якніяк, а лепшыя ж гады прайшлі тут, маладосць, лічы, уся. Ды і некаторыя таварышы па барацьбе былі пахаваны ў лесе, спалі вечным непрабудным сном...

Успомніў пра гэтыя хаты Багавік і тады, калі рыхтаваў да эвакуацыі раён, арганізоўваў падполле. І як толькі немцы занялі Ельнікі, перабраўся ў адну з іх — тую, што была паміж Дубровіцай і Гудовам.

Туды, у тую хату, і прыняла Людміла Рыгораўна Капуцкая Івана Дарошку.

## II

Багавік, па ўсім адчувалася, чакаў Івана Дарошку, бо, ледзь толькі ён пераступіў парог, кінуўся да яго, абшчаперыў за плечы, абняў і, не даўшы нават апамятацца, агледзецца,— павёў адразу ж у лес.

— Размова ў мяне да цябе ёсць,— не сказаў, а прашаптаў Раман Платонавіч, калі адышліся даволі ладнавата ў заглуш, паселі адзін пры адным на вывернутае, мабыць, бурай з каранямі дрэва.— Вельмі сакрэтная. Трэба, каб ніхто нас не чуў. Але перш чым прыступіць да гэтай размовы, раскажы, як жывеш і змагаешся, як удалося немцаў у сельсавет не пусціць...

Раман Платонавіч быў вясёлы, усміхаўся, і следу ад былой стомленасці і зажуранасці не асталося. І апрануты быў не ў цывільны касцюм, а ва ўсё вайсковае, з рамянямі цераз плячо і на поясе, з пісталетам у кабуры на левым баку; на нагах — дабрэнныя ялавыя боты. І сумка скураная, камсастаўская, ляжала на каленях у яго, поўная нейкіх дакументаў, папер.

— А вы,— глядзеў, не зводзіў вачэй з Рамана Платонавіча Іван Дарошка,— зусім вайскоўцам сталі, проста не пазнаць...

— Нічога не зробіш, умовы дыктуюць. Уся мая маёмасць цяпер пры мне. Дзе я, там і яна.

— І доўга так будзе?

— Ніхто не ведае, сказаць пэўна не можа. Пакуль што справы нашы... Словам, сам адчуваеш, складваюцца не лепшым чынам...

— Адступаюць нашы?

— Адступаюць...— і ў голасе Рамана Платонавіча пачуўся сум.

— Дзе фронт цяпер?

— Фронт усюды, дзе немцы. І пад Масквою, куды вораг усе сілы свае кінуў і рвецца, як апантаны, і тут, дзе мы з табою асталіся. Увесь, літаральна ўвесь савецкі народ паўстаў на барацьбу з ненавіснымі фашысцкімі захопнікамі. І адчуваю я — пералом у вайне вось-вось наступіць. Самую вялікую, можна сказаць, неацэнную дапамогу Чырвонай Арміі можам аказаць мы, тыя, хто пакінуты ці астаўся па волі лёсу ў нямецкім тыле. Гнеў

на акупіраваных землях расце з кожным днём, вось-вось ён выбухне. І мы павінны быць падрыхтаваны да гэтага. У нас дастаткова павінна быць і зброі, і хапіць умення ўзначаліць усенародную барацьбу з ворагам. Кожны дзень нараджае ініцыятыву, дае прыклады, вартыя пераймання. Вось хоць бы ты... Здагадаўся ж масты спаліць, каб не пусціць акупантаў у сельсавет...

— Гэта не адзін я, а з Васілём Кулагам. Шкадуючы мастоў, баючыся, каб не адказваць за самавольства, сумняваючыся і натхняючы то ён мяне, то я яго,— пакруціў галавою, маўляў, няма ў гэтым нічога гераічнага, Іван Дарошка.

— І іншыя гэтак жа... Хто са шкадаваннем, хто са слязамі на вачах, але і сцірты неабмалочаныя папалілі, і свірны са збожжам. Скажу больш — у некаторых вёсках нашага раёна немцаў не хлебам-соллю сустрэлі, а кулямі, свінцом. Дык гэта наступае вораг. А як адступаць пачне? Уяўляеш, што будзе? Зямля загарыцца пад нагамі захопнікаў, старыя і дзеці падымуцца на змаганне. Народ, які зведаў, што такое воля, нікому ніколі не ўдасца паставіць на калені. Калі б у нас была зброя, мы толькі ў сваім раёне можам хоць сёння ўзяць пад ружжо сто, дзвесце, трыста ды і тысячу чалавек. Дык гэта ж вораг толькі прыйшоў сюды. А пачне свае крывавыя парадкі наводзіць, знішчаць адных і заахвочваць другіх... Не прывыклі ж людзі нашы да прынукі. Ды і мы... Не будзем спаць у шапку. Заклікаць на барацьбу з ворагам людзей будзем, прыклад паказваць, як змагацца, біць акупантаў. І цяпер мы не дрэмлем. Немцы начальства сваё ўсюды ставяць. І ў Ельніках, і ў вёсках. А мы падполле арганізоўваем. Каб усюды, літаральна ўсюды, нават у фашысцкіх установах, нашы, савецкія людзі былі...

— І ідуць... Згаджаюцца ісці на службу да немцаў савецкія людзі? — перапыніў Рамана Платонавіча сваім пытаннем Іван Дарошка.

— Людзі — яны былі і ёсць розныя. І па-рознаму сябе заўсёды паводзілі і паводзяць. Адны з радасцю да немцаў ідуць, служаць шчыра, аддана. Іншага ж нават па нашай просьбе не ўгаворыш да немцаў служыць пайсці. Але што зробіш — трэба! І не ўсе, а некаторыя гэта разумеюць. Наша просьба, наш загад — гэта просьба і загад Радзімы, партыі. Ды і нянавісць да акупантаў, жаданне памагчы народу прагнаць як мага хутчэй ворагаў з роднай зямлі... О, гэтыя высакародныя пачуцці натхняюць людзей... А по-

тым — быць удзельнікам вялікага змагання, прага помсты ворагу за разбураныя гарады і вёскі, забітых, знявечаных братоў, сясцёр... Я чаму так падрабязна табе пра ўсё гэта расказваю? — падняў вочы, паглядзеў на Івана Дарошку Раман Платонавіч.— Бачыш, ідэя выспела адна. З абкомам перагаварыў — ухвалілі. Хачу цябе, Іван Мікалаевіч, у Маскву паслаць.

— У Маскву? — не паверыў, а таму аж адхіснуўся Іван Дарошка.— Чаго ў Маскву?

— Каб расказаў там пра ўсё, чым жывём тут, пра настрой наш расказаў. І, вядома ж, пра патрэбы нашы. Сувязь з Масквою варта як найхутчэй наладзіць. Мы ж можам багата чым арміі нашай памагаць. І цягнікі, што на фронт накіроўваюцца, падрываць, пускаць пад адхон, і масты, дарогі са строю выводзіць, і авіяцыі нашай падказваць, дзе ваенныя аб'екты, бамбіць што... Але дзеля ўсяго гэтага сувязь надзейную трэба з Масквою мець, зброя трэба. Асабліва патроны, гранаты, міны...

— Але ж... Пад Масквою — немцы? — задумаўся Іван Дарошка.— Дый... Ісці, колькі гэта трэба ісці па занятай ворагам зямлі?

— Пад Масквою немцы — гэта яшчэ не ў Маскве. Ды нават калі і Маскву возьмуць — што я не дапускаю! — Савецкая ўлада, кіраўніцтва партыі і дзяржавы будуць. І твая задача — знайсці каго-небудзь з патрэбнага начальства ці камандавання Чырвонай Арміі, расказаць усё, што я табе гаварыў, пераканаць, што мы — гэта таксама армія, фронт і можам быць карыснымі, можам рабіць тое, чаго ніхто не можа... А ісці... Дойдзеш! Іншы хто, можа б, і не дайшоў. А ты... Я ўпэўнены — дойдзеш!

— Дзякуй, Раман Платонавіч,— падняўся, стаў па стойцы «смірна», як салдат, Іван Дарошка.— Хоць я... Прызнацца, не зусім гатовы да такога задання...

— Сядай,— паказаў галавою Раман Платонавіч на камель паваленага дрэва — гэта быў, як прыгледзеўся Іван, дуб.— А хто гатовы? І я не быў гатовы, што давядзецца іншым займацца, не будаваць, не сеяць хлеб... А бачыш... І іншыя не былі гатовы да таго, што рабіць цяпер даводзіцца. Трэба! Дарэчы, тваю кандыдатуру і абком таксама падтрымаў...

Маўчаў, думаў Іван Дарошка, не ведаў, што і адказаць Раману Платонавічу. З аднаго боку, радаваў давер партыі, гонар, што не каму-небудзь, а яму, Івану Дарошку, даручаецца такое важнае заданне. З другога ж боку... Не ха-

целася, ані не хацелася пакідаць родныя мясціны, знаёмых, блізкіх людзей, ды яшчэ ў такі неспакойны, няпэўны час. І каб хоць надзея якая была назад, зноў сюды, да Багавіка, вярнуцца? А то ж... Лёгка сказаць — дайсці да Масквы, знайсці кагосьці з «патрэбнага начальства» ці камандавання Чырвонай Арміі, расказаць, што робіцца ў тыле, пераканаць, як патрэбны тут патроны, гранаты, міны, як неабходна мець сталую сувязь з Масквою. Гэта ж... З такім заданнем за месяц — і то ці справішся?..

— Ісці калі? — спытаў ціха, не падымаючы галавы, Іван Дарошка.

— Калі ісці? Ды хоць сёння. Чым хутчэй, тым лепш.

Зноў маўчаў, засяродзіўшыся на сваіх думках, Іван Дарошка.

— Але ж у мяне... З Васілём Кулагам сёе-тое пачалі, пра групу баявую меркавалі, гаварылі з людзьмі... Ды і жонка, дзеці тут,— прызнаўся, быццам папрасіў рады, Іван Дарошка.

— З Васілём Кулагам мы звяжамся, будзем трымаць яго ў полі зроку. А жонка, дзеці... Дзе яны?

— Я ў Камарынскі раён іх завёз, у Будзілавічы.

— Там што, родныя жончыны жывуць?

— Ага. Бацька і маці. Каб жонцы хоць пісьмо пераслаць... Хвалявацца ж будзе, няма мяне і няма.

— Дык ты ж... Ісці можаш праз Будзілавічы. Зазірні на нейкую гадзіну. Толькі,— Раман Платонавіч прыклаў да вуснаў палец, пакруціў галавою,— пра Маскву, пра тое, што ты ідзеш туды... Ваенная тайна. Скажы, што цябе не будзе нейкі час тут, у нашых лясах,— і ўсё.

— Добра, Раман Платонавіч. Не бойцеся, жонка ў мяне — што трэба. З паўслова ўсё разумее. Вы ж ведаеце яе.

— Яе і цябе я ведаю. Але ж... Што немцы робяць, каб прызнанне вырваць, каб чалавек загаварыў! Жудасць бярэ, аж не верыцца, што такое можна і рабіць, і вытрываць... Таму... Чым менш ведае чалавек, тым яму лепш. І не толькі яму! Помні пра гэта, ні на хвіліну не забывай. І асцярожнасць нікому яшчэ не шкодзіла...

...Зайшло, даўно схавалася, села за лес сонца — кароткі асенні дзень згас, быццам яго і не было. Туман, волкасць, мoракі паўзлі адусюль, прыкрывалі сабою, хавалі дрэвы, кусты. А Раман Платонавіч і Іван Дарошка сядзелі і сядзелі на камлі вывернутага з каранямі дуба, не могучы ніяк развітацца, расстацца. І гаварылі, гаварылі пра ўсё, пра што не паспелі пагаварыць у мітусні і клопатах, жыву-

чы і працуючы побач у тыя ўжо далёкія, амаль прывідныя, але такія прывабныя мірныя дні...

## III

Па сваёй натуры Тодар Пракопавіч Несцяровіч быў аптыміст, ніколі і ні пры якіх акалічнасцях не ўпадаў у паняверку. Што б і дзе ні здарылася, ён успрымаў усё як яшчэ адзін крок наперад, і не да горшага, а да лепшага. Быць аптымістам, глядзець на ўсё з надзеяй прывучыла яго жыццё, тыя змены, што адбыліся і адбываліся на вачах. Ці мог марыць ён, сын бедняка, які да рэвалюцыі і распісацца не ўмеў, што паступіць на рабфак, стане медыкам? А паступіў жа, стаў. Жыве ў горадзе, у сталіцы, працуе ў адной з лепшых клінік, мае жонку, таксама вучоную, дачку. Вядома, не толькі добрае чакае ўсюды чалавека. Хоча ён таго ці не хоча, а мусіць, павінен прайсці праз розныя, часам вельмі непрыемныя і небяспечныя выпрабаванні, якія пасылае жыццё. І выжыць, астацца самім сабою. Быць, як бы цябе і што б ні напаткала, ні мучыла, чалавекам, не страціць дабрыні да людзей. Любіць іх і памагаць, памагаць усім, хто мае патрэбу ў тваёй дапамозе. Менавіта гэта — памагаць усім, хто мае патрэбу ў дапамозе,— і вызначыла выбар прафесіі.

Як лекара, медыка Несцяровіча паважалі — і калегі, і пацыенты. Ён рэдка абыходзіўся без жарту, на ўсё глядзеў весела, нават калі надараліся амаль безвыходныя сітуацыі, не траціў пачуцця гумару. Уважліва сочачы за ўсімі навейшымі адкрыццямі ў медыцыне, ён тым не менш надта не налягаў на хімію, раіў іншы раз не забываць народную медыцыну, розныя ўзвары і зёлкі. І яшчэ ў запасе заўсёды меў ён адны лекі, якімі карыстаўся асабліва шчодра і ўмела,— гэта слова. З чым бы, з якім бы вялікім горам ні прыйшоў да яго чалавек, мінала хвіліна — і гора не тое што забывалася, а неяк быццам аддалялася, адыходзіла на другі план. І бачыў, бачыў чалавек — ёсць нешта большае, важнейшае, чым яго хвароба, гора, і пра тое яму трэба больш думаць. А хвароба, гора вельмі хутка мінуць, забудуцца — на тое ж і бальніцы ёсць, дактары... З кабінета доктара Несцяровіча ніколі ніхто не выходзіў з плачам, часцей за ўсё ўсміхаліся, абнадзееныя, узрадаваныя, што хвароба не настолькі сур'ёзная, як думалася, уяўлялася.

І да немца таго, што неяк уночы прывезлі ў бальніцу

і палажылі ў асобным пакоі, Тодар Пракопавіч ішоў з адным жаданнем: памагчы чалавеку. Надта ж немец стагнаў, войкаў, крычаў. Тодар Пракопавіч няблага ведаў нямецкую мову, таму не мінула і некалькі хвілін, як хворы супакоіўся, паказаў рану на левай назе — чырвонаармеец пацэліў, калі немец пераходзіў граніцу. Рана была не з цяжкіх, і зусім правільна, што немца не затрымалі ў Брэсце, а прывезлі ў Мінск. Тым больш, сам немец патрабаваў, каб яму далі магчымасць пагаварыць з вока на вока з кім-небудзь з вышэйшага савецкага камандавання. Але ў Мінску яму, бедаку, не пашанцавала — у яго разбалеўся жывот, паднялася тэмпература. Давялося хворага даставіць у бальніцу. Тодар Пракопавіч адразу ж распазнаў атручванне ежай, даў хвораму цёплай кіпячонай вады, прымусіў прапаласкаць страўнік. І калі немцу палягчэла, прагаварыў гадзіны дзве. Цікава яму, Тодару Пракопавічу, было ведаць, чаму раптам немец пакінуў сваю армію, перабег да нас, у Савецкі Саюз. Спахапліва, нібы баяўся, што яму не ўдасца, не хопіць часу расказаць усё, што ён хацеў расказаць, немец — звалі яго Пауль Генц — паведаміў: ён камуніст, бацька яго таксама быў камуністам і загінуў, абараняючы Баварскую савецкую рэспубліку. Перабегчы цераз мяжу прымусілі яго тыя звесткі, што пачуў ад свайго сябра, які працаваў у штабе,— атрыманы загад Гітлера напасці на Савецкі Саюз, пачаць новую вайну. Ён, Пауль Генц, хоць і немец, але супраць гэтай вайны, бо вайна прывядзе да вялікіх ахвяр і разбурэнняў. Ён за тое, каб немцы і рускія жылі ў міры і дружбе. І таму палічыў сваім інтэрнацыянальным абавязкам уцячы з гітлераўскіх акопаў, перадаць усё, што ведае, камандаванню Чырвонай Арміі. Каб камандаванне, пакуль не позна, прыняло неабходныя захады, трэба ўсімі сіламі прадухіліць гэтую вайну, вайна не павінна пачацца... Існуе ж дагавор аб міры і ненападзе... Калі ж не ўдасца пазбегнуць вайны, варта так сустрэць на граніцы фашыстаў, каб тыя і дзесятаму заказалі нападаць хоць калі-небудзь на Савецкі Саюз... З гэтымі, толькі з гэтымі думкамі ён, Пауль Генц, рызыкуючы жыццём, і пераходзіў мяжу. Але тут, у Савецкім Саюзе, да вышэйшага камандавання яго ніхто не дапускае. Дапытваюць яго невысокія чыны, называюць ныцікам і ледзь не правакатарам. І гэта надта ж засмучае яго, Пауля Генца. Ён жа камуніст, ён хоча дабра, і толькі дабра, савецкім людзям...

Немец па сваіх поглядах быў надта ж падобны на яго,

Тодара Пракопавіча. І ён, Тодар Пракопавіч, намысліў памагчы немцу, тым больш што тое, што ён хацеў перадаць камандаванню Чырвонай Арміі, мела дзяржаўную важнасць. Раніцою звязаўся па тэлефоне са сваім сябрам дзяцінства Лапіцкім, які працаваў у Цэнтральным Камітэце Камуністычнай партыі Беларусі, і калі праз гадзіну спаткаліся, расказаў яму ўсё, што пачуў ад немца. Лапіцкі зразумеў трывогу сябра, памог яму сустрэцца з некаторымі іншымі кіраўнікамі, якія папрасілі яго, Тодара Пракопавіча, выкласці ўсю сваю размову з Паўлем Генцам на паперу. Ён гэта ахвотна зрабіў, вярнуўся дадому. І тут яму пазванілі з бальніцы, сказалі: у часе яго дзяжурства зніклі некаторыя вельмі дарагія лекі і спірт...

Паехаў у бальніцу.

Дадому вярнуўся ўжо на змярканні. Стомлены, але, як заўсёды, задаволены. Удалося і тое, што немец-перабежчык хацеў паведаміць, выкласці на паперу і перадаць, куды трэба, і з кражаю разабрацца, знайсці вінаватага. Павячэраўшы, заваліўся спаць. Заснуў, ледзь дакрануўшыся галавою падушкі. І снілася яму, як ён, пасвячы гавяду, згубіў карову з цяліцаю, і не чыю-небудзь, а сваю, і ўсё хадзіў па лесе, шукаў і ніяк, ніяк не знаходзіў...

Стук у дзверы пачуў адразу ж. Падхапіўся на ногі, пабег адчыняць...

Сабраўся хутка, бо прывык да розных паспешлівых начных выклікаў. Адно, толькі адно мучыла, вярцелася на языку: «Ці надоўга? І чаму, за што?»

Першая размова з начальнікам, да якога яго прывялі, не супакоіла Тодара Пракопавіча. На яго пытанне, чаму гэтак абышліся з ім, чаму арыштавалі, яму адказалі, што з тым немцам, з якім ён гаварыў у бальніцы, не ўсё ясна, і прасілі памагчы разабрацца.

Мінуў месяц, пайшоў другі, а яго, Тодара Пракопавіча, не выпускалі, хоць з немцам быццам і разабраліся. Ніякі ён не правакатар, сумленны чалавек, і па поглядах, па сваіх паводзінах сапраўдны камуніст. А вось ці верыць таму, што ён казаў наконт нападу Гітлера на Краіну Саветаў, наконт пачатку вайны?.. Па-рознаму можна паставіцца. Магла гэта быць і праўда. А магла быць і няпраўда. Знарок маглі ўвесці ў зман немца-камуніста, ведаючы, што той пабяжыць у Савецкі Саюз, паведаміць камандаванню Чырвонай Арміі пра вайну. Каб у напружанні ўвесь савецкі народ трымаць, каб не займаліся сацыялістычным будаўніцтвам, а рыхтаваліся да вайны. Ды і паніка каб паўзла,

няўпэўненасць. Сам немец-перабежчык не бачыў, не чытаў дакумента, які быў быццам прысланы ў штаб, а толькі чуў пра яго ад свайго сябра. А сябра той хто?.. Можа, агент абвера, СД?.. Немца-перабежчыка, як толькі загаілася ў яго рана, некуды павезлі далей. Нібыта не было прычыны трымаць больш і Тодара Пракопавіча, але кожны раз, калі ён прасіўся, яго ўгаворвалі не спяшацца — маўляў, раптам ён яшчэ спатрэбіцца, і доктар жа, і мову нямецкую нядрэнна ведае. Ды і самому яму лепш пабыць пакуль што далей ад цікаўных людзей, бо калі трапіць, вернецца зноў у бальніцу, сустрэнецца са знаёмымі, на пытанні ж іхнія давядзецца адказваць — дзе быў, што рабіў? Яшчэ скажа не тое, што трэба, прагаворыцца, а гэта... Непажадана. Тое, што паведаміў немец-перабежчык, павінна быць тайнай. Прынамсі, да таго дня, які назваў немец, калі быццам фашысты нападуць на Савецкі Саюз. Ён, Тодар Пракопавіч, папрасіў дазволіць яму пабачыцца з жонкаю. Але тут нечакана выявілася — жонкі з дачкою ў горадзе няма. «Дзе яна?» Гэтага ніхто не ведаў, не мог яму сказаць. Тодар Пракопавіч захваляваўся, сон успомніў, што сніў у тую апошнюю ноч дома на сваёй пасцелі. «Карову з цяліцаю згубіў...» Тыя людзі, ад якіх залежаў лёс Тодара Пракопавіча, паспрабавалі супакоіць яго: маўляў, знойдзем жонку і дачку. Аднак ішлі дзень за днём, а нічога пэўнага, дзе яго сям'я, Тодару Пракопавічу не паведамлялі. Урэшце яго выпусцілі, далі некалькі дзён адпачынку — сям'ю пашукай, табе, маўляў, відней, дзе яна можа быць.

Ні суседзі, ні знаёмыя нічым памагчы Тодару Пракопавічу не змаглі, бо, выявілася, самі не ведалі, куды падаліся яго жонка і дачка. «А можа, яны ў вёску паехалі? Да бацькоў маіх?» Купіў сякія-такія гасцінцы, кінуўся ў вёску, балазе яна была не так і далёка — у Пухавіцкім раёне. Але там, дома, нічога не ведалі пра жонку з дачкою. Вярнуўся назад у горад, да Лапіцкіх зайшоў — старыя Лапіцкія перадалі сёе-тое, каб сыну, Пятру, у горад завёз. І ад Пятра Пятровіча пачуў, дзе сям'я — аж на Палессі, у Вялікім Лесе. Ехаць туды? Але калі, як? Вольныя дні скончыліся, трэба выходзіць на працу. Пятро Пятровіч параіў ліст у Вялікі Лес паслаць. «Атрымаюць — і будуць ведаць, што ты на волі, самі ў Мінск вернуцца». У той жа дзень напісаў ліст...

На працы па ім засумавалі, адны глядзелі на яго са спачуваннем, іншыя з недаверам. І што асабліва амаль

усіх уражвала, здзіўляла — ані не змяніўся, такі ж вясёлы, жыццярадасны, як і раней быў. Каб заглушыць трывогу і боль па сям'і, ён аддаўся ўвесь рабоце, не выходзіў з клінікі ні ўдзень, ні ўночы. Гэта яго і ад смерці вывратавала — у тую ноч, калі нямецкія самалёты бамбілі Мінск і бомба пацэліла ў дом, дзе ён жыў, Тодара Пракопавіча не было на кватэры, ён быў у бальніцы. Назаўтра, даведаўшыся, што яму няма куды хадзіць, дом разбураны, ён і зусім перабраўся жыць у бальніцу — паставіў раскладанку ў пакоі, дзе прымаў хворых, там і начаваў. Ды і пры ўсім яго жаданні, нават калі б і дом быў не разбураны, бомба ў яго не трапіла, хадзіць начаваць дадому не ўдалося б — бясконцым патокам паступалі ўсё новыя і новыя параненыя — мужчыны, жанчыны, дзеці. Даводзілася стаяць і стаяць пры аперацыйным стале, бегаць з палаты ў палату, супакойваць адных, ратаваць другіх. А тут яшчэ гэтыя няўдачы на фронце — немцы надта ж імкліва набліжаліся да Мінска. Успомніўся тады Тодару Пракопавічу немец-перабежчык, тое, што ён казаў, папярэджваў. «А мы не верылі...» Горад быў ужо ўвесь у агні, дыме, руінах — бамбёжкі не спыняліся ні ўдзень, ні ўночы. Гарэлі універсітэцкі гарадок, вакзал, гарэлі заводы і фабрыкі. Людзі хто ўцякаў у бежанцы, хто не ведаў, што рабіць. Пачалася паніка — адны казалі, немцы ўжо ў горадзе, другія — што пад горадам і праз дзень-два будуць у горадзе. У бальніцу паступілі параненыя чырвонаармейцы. Пагаворвалі — трэба рыхтавацца бальніцы таксама да эвакуацыі. Але ніхто не ведаў, што з хворымі, параненымі рабіць — імі ж былі не толькі палаты перапоўнены, але і калідоры. І прыбывалі, прыбывалі ўсё новыя і новыя. Хто прыходзіў сам, каго прыносілі, прывозілі. Пры ўсім аптымізме Тодар Пракопавіч разумеў — робіцца нешта не зусім тое, што павінна б было быць. Быццам неверагодны, кашмарны сон, блюзненне. Да таго ж жонкі, дачкі няма і няма. Добра ж, як ліста яны не атрымалі, асталіся там, у вёсцы, на Палессі. А як атрымалі, у Мінск выехалі?.. Ды і там, у вёсцы, як жыць яны будуць? Без яго, ды яшчэ ў такую неразбярыху, з жончынай палахлівасцю, няпэўнасцю?.. Хацеў разам з іншымі і ён, Тодар Пракопавіч, з Мінска ўцякаць. Але што рабіць з параненымі, хворымі? Пакідаць без усякага нагляду, без усякай дапамогі? Не можа, не мае права ён, доктар, гэта рабіць. Нават калі б не сотні, а адзін, толькі адзін, паранены, ці хворы аставаўся ў бальніцы, ён, доктар, павінен пры ім

быць, што б ні пагражала, якая б небяспека ні навісла.

Горад занялі немцы. Занялі нечакана, ледзь паспелі параненых чырвонаармейцаў ва ўсё бальнічнае ці цывільнае пераапрануць. Праз які дзень заваёўнікі наведалі бальніцу, прайшліся па калідорах і палатах. Тодар Пракопавіч, паколькі ведаў нямецкую мову, таксама не адставаў ад немцаў — хадзіў з імі: куды яны, туды і ён. Паказваў, расказваў. Немцаў цікавіла, не ў якіх умовах знаходзяцца хворыя, ці хапае лекаў, яды, а зусім іншае — ці ёсць у бальніцы сярод хворых камісары, камуністы, чырвонаармейцы, яўрэі. «Не, няма,— набраўся мужнасці сказаць Тодар Пракопавіч,— гэта не вайсковы шпіталь, а звычайная гарадская бальніца». Немцаў гэты адказ цалкам задаволіў. Выйшлі світаю да сваіх машын — паехалі.

А Тодар Пракопавіч, вярнуўшыся ў бальніцу, задумаўся. Раіцца не было з кім — у бальніцы астаўся ён ды яшчэ некалькі ўрачоў, сясцёр. Трэба было вырашаць: і як самому далей быць, і з параненымі, хворымі што рабіць? Былі, былі сярод параненых і камісары, і камуністы, і чырвонаармейцы, і яўрэі. Гэты раз немцы паверылі, але другі раз могуць і праверыць. Што будзе за тое, што праўды не сказаў, схлусіў? Ды і з тымі, пра каго пытаюць, каго шукаюць?

Успомніў: у адной з палат камісар сівы ляжыць, у нагу паранены, Пінчук. Пайшоў да яго, сеў на табурэт, расказаў пра прыезд немцаў. І клопатамі сваімі, трывогай падзяліўся. Выслухаў Пінчук з увагай доктара, сказаў: «Гэта добра, што вы не выдалі нікога з нас, расстралялі б фашысты. А далей што рабіць — давайце будзем разам думаць».— «Але ж няма калі асабліва думаць, немцы могуць кожную хвіліну зноў сюды наведацца».— «І гэта праўда». Памаўчаў Пінчук, а потым сказаў: «Во што, доктар. Няхай сёстры мяне да вас у асобны пакой быццам на перавязку даставяць. Там і пагаворым. Бо тут...» — і Пінчук спасцярожліва агледзеў палату...

Тодар Пракопавіч здагадаўся пра ўсё, зрабіў так, як прасіў Пінчук. Доўга гутарылі яны ў прыёмным пакоі, зачыніўшыся. Вядома, лепш за ўсё было б усіх тых, хто мог хадзіць, хто папраўляцца пачаў, выпісаць з бальніцы. Але куды яны пойдуць? Немцы ж усюды. Трапяць у рукі ворага — і ці на той свет, ці ў лагер, за калючы дрот... Пінчук выказаў здагадку, што не магло так быць, каб савецкія войскі адышлі з горада і нікога свайго тут не пакінулі. Але як знайсці тых людзей, як звязацца з імі? Вядома, тыя людзі падказалі б сёе-тое, памаглі б...

Вырашылі шукаць тых людзей. А пакуль што перапісаць фармуляры ўсіх параненых, замяніць падазроныя даныя. Дакументы таксама схаваць. На гэтую работу мабілізаваць найбольш надзейных і медыкаў, і хворых.

Дзень і ноч карпелі над фармулярамі. Але зрабілі ўсё так, як і належыць. Папярэдзілі кожнага, каму нешта мянялі ў фармуляры. Значна цяжэй было знайсці каго-небудзь з тых людзей, хто быў знарок пакінуты ў горадзе з нейкім заданнем. Але не дарэмна кажуць — чаго шукаеш, тое абавязкова знойдзеш. Неяк, прагульваючыся па вуліцы — хадзіў да дома таго, што разбураны быў і дзе была некалі яго кватэра («Раптам жонка, дачка вярнуліся і я іх убачу там?»), Тодар Пракопавіч зусім выпадкова напаткаў аднаго свайго знаёмага, з якім сустракаўся разоў колькі на кватэры ў Пятра Пятровіча Лапіцкага. Прайшліся сюды-туды, Тодар Пракопавіч расказаў яму пра свой клопат. І сямейны, і бальнічны. «Я таксама, бачыце, астаўся ў горадзе,— прызнаўся Тодару Пракопавічу той знаёмы.— Паспрабую вам памагчы».

І памог. Дні праз два да доктара Тодара Пракопавіча прыйшла пажылая жанчына, сказала яму, што хацела б пагаварыць адзін на адзін. Выйшлі ў скверык, і жанчына прызналася: яе прыслалі, каб яна памагла доктару выратаваць параненых. «Залічыце мяне сястрой у бальніцу,— папрасіла жанчына.— І я зраблю ўсё, што можна зрабіць».

Жанчына — звалі яе Марына Сцяпанаўна Барысёнак — ні хто яна, ні куды накіроўвае чырвонаармейцаў, камуністаў і камісараў — не гаварыла. Прыязджалі на падводах нейкія невядомыя людзі, як правіла, вяскоўцы, забіралі параненых. То быццам мужа, то брата. І вывозілі, выводзілі з горада...

У бальніцы павальнела. Але ўзніклі новыя цяжкасці — канчаўся запас лекаў і правіянту. І хоць немцы пачалі наведвацца як не штодзень — Марына Сцяпанаўна папярэдзіла Тодара Пракопавіча, каб быў з імі вельмі асцярожны, яны чагосьці шукаюць, у нечым падазраваюць яго,— ён гэтак жа гаварыў пра ўсё, пра што ў яго пыталі, весела, з гумарам. Прызнаўся неяк, што карміць і лячыць няма чым хворых. Яму параілі звярнуцца ў гарадскую ўправу. «А хіба такая ёсць?» — здзівіўся Тодар Пракопавіч. «Ёсць»,— адказалі яму. Што было рабіць? Давялося звярнуцца. У гарадской управе не так зацікавіліся бальніцай, як самім Тодарам Пракопавічам. Хто ён, дзе працаваў, ці не сядзеў пры бальшавіках у турме? Тодар Пракопавіч

расказаў пра сябе. Бальніцы нічым ніхто не памог, адзінае, што было зроблена,— гэта Тодар Пракопавіч Несцяровіч быў прызначаны яе загадчыкам, як бы галоўным урачом. Марына Сцяпанаўна ўхваліла гэтае прызначэнне. «Як хто чужы, дык няхай лепш будзеце вы».— «Але ж гэта быццам супрацоўніцтва з фашыстамі?» — «Калі вы так і далей будзеце супрацоўнічаць, як дагэтуль, такое супрацоўніцтва не ім на карысць, а нам... І каб вы не мучыліся, не перажывалі, я звяду вас з некаторымі людзьмі...» І звяла — з тым самым знаёмым, з якім сустрэўся быў выпадкова на вуліцы Тодар Пракопавіч і якога бачыў у гасцях у Пятра Пятровіча Лапіцкага. Ён не назваўся, хто ён, дзе і кім працуе. Адзінае, што ён сказаў, гэта што Тодару Пракопавічу давяраюць і просяць, каб ён згадзіўся ўзначаліць бальніцу. «Нашы людзі ўсюды павінны быць, мы ўсё павінны ведаць. Не забывайце — мы былі на сваёй зямлі гаспадарамі і будзем. Нават пры акупантах, заваёўніках. І служыць вы будзеце не ім, а Радзіме. А калі сказаць больш дакладна — змагацца з фашыстамі будзем разам, біць іх, дзе яны і не чакаюць, што паб'юць».

Працы пабольшала, даводзілася не толькі лячыць параненых і хворых. Ды Тодар Пракопавіч працы ніколі не баяўся, рабіў усё, што трэба, з ахвотаю, весела, як бы гуляючы. Бо ва ўсім, за што б ні браўся, бачыў сэнс. Ведаў: перамога над ворагам сама сабой не прыйдзе. Толькі змаганне, барацьба тысяч і тысяч, барацьба ўпартая, жорсткая і мэтанакіраваная можа прывесці да перамогі. І кожнаму трэба рабіць сваё, тое, што даручана яму, і тым самым уносіць лепту ў перамогу.

Па звычцы, калі надаралася вольная хвіліна, выходзіў з бальніцы, кіраваўся да таго месца, дзе зусім, здаецца, нядаўна стаяў дом, у якім жыў сам, жыла сям'я,— жонка, дачка. Але ні дома, ні сям'і там не было. Дом разбурыла бомба, а сям'я... Хто можа сказаць, дзе цяпер яго сям'я? «Відаць, не паспелі атрымаць мой ліст і нікуды не выязджалі, асталіся жыць там, на Палессі, у Вялікім Лесе? — думаў Тодар Пракопавіч.— І няхай. Там ім будзе не горш, чым тут, у Мінску».

Але чакаць, што сёння-заўтра жонка і дачка прыйдуць, з'явяцца ў горадзе, не пераставаў. Праўда, астуджваў іншы раз сябе: «Так я адзін, вольны, сабою, сваім жыццём толькі рызыкую. А калі побач са мною будуць яны?.. Тады і іх пад небяспеку пастаўлю». Урэшце разважыў, вырашыў: «Як будзе, так будзе. Вернуцца ў Мінск — добра.

Не вернуцца — няхай, пасля, калі жыць будзем, убачымся, сустрэнемся...»

Ішлі дні, набліжалася восень, а ні жонка, ні дачка ў горадзе не з'яўляліся. Так, ва ўсякім выпадку, здавалася Тодару Пракопавічу, бо на вочы яны яму не траплялі... «Калі б у горад вярнуліся, былі яны тут, знайшлі б мяне, убачылі б»,— думаў ён. І паступова спыніў свае паходы да разбуранага дома, перастаў наведвацца туды. Іншыя, зусім іншыя маршруты былі ў Тодара Пракопавіча. Не заўсёды, з кім трэба, можна было ў бальніцы сустрэцца. Даводзілася рабіць «візіты» і на дом. На гэта патрэбен быў час. А яго, часу, якраз і не хапала доктару, каб паспець усё і ўсюды зрабіць...

## IV

Цесна, няўтульна было Косціку ў Вялікім Лесе, ані не сядзелася ў хаце. Душа рвалася і рвалася... А куды — і сам не ведаў. Ці не туды, куды паехала, нічога яму не сказаўшы, Тася — у горад, у той далёкі і такі прывабны Мінск?

І хоць даўно ішла вайна, усё больш і больш ахаплялі людзей неспакой і трывога, Косцік жыў тым самым, чым жыў і раней,— думкамі пра Тасю, пра тое, дзе яна цяпер і што робіць. Іншы раз здавалася яму — яна шчаслівая, закахалася ў кагосьці і бавіць дні і вечары з тым любым ёй чалавекам. Потым раптам успаміналася: ідзе ж вайна і Тасю маглі параніць, а то і забіць фашысты. І тады ён ночы не спаў, думаў і думаў, як ёй памагчы, як выратаваць. «Вёску, Вялікі Лес, не трэба было пакідаць, тут быць. І нічога б ёй ніадкуль не пагражала. А калі б пагражала, я абараніў бы...» Блюзнілася — ён, Косцік, накідваецца з кулакамі на крыўдзіцеля, б'е таго па мордзе, топча нагамі... Ці нясе на сваіх руках акрываўленую Тасю, чуе яе дыханне, цяпло знямоcauseжанага цела... І Тася... Расплюшчвае вочы, бачыць яго, Косціка... Бачыць і не верыць, што гэта ён. «Косцік, Косцік»,— шэпча яна і зноў заплюшчвае вочы. А ён, Косцік, нясе і нясе на руках Тасю, ратуе ад небяспекі, ворагаў...

«Кеб хоць жывая была... Кеб зноў убачыць... Я... Усё, усё б дараваў. Куды б сказала, туды б і пайшоў, што б ні папрасіла, што б ні загадала, усё зрабіў бы. Бо даражэй, мілей — нікога няма. Калі і жыву, раблю што-небудзь, дык толькі дзеля цябе адной. І ты ўбачыш гэта, пераканаешся,

як я цябе кахаю, жыць проста без цябе не магу...»

На нейкі час быццам трохі ацверазілі Косціка, адагналі думкі пра Тасю тая азартная гульня ў карты, калі выйграў у аднавокага і баяўся паказацца на вочы бацьку, смерць брата Піліпа. Але і гэта неўзабаве мінулася — бацька вельмі хутка забыўся на выйграныя ў карты сынам грошы — не да таго яму было! — а Піліп, выявілася, быў жывы. І зноў Косціка апанавалі думкі пра Тасю. «Што рабіць, куды кінуцца, кеб быць побач з ёю, бачыць яе хоць здаля зноў штодзень?»

Дні меншалі, вечары і ночы доўжалі. І не было, зусім не было чаго рабіць Косціку. Ісці ў Гудоў ён не адважваўся, баяўся сустракацца з тым аднавокім, якога абгуляў у ачко і ад якога ўцёк уночы. «Што я яму скажу? Ды і ён што скажа, а то і зробіць са мною? Лепш у вёсцы пабыць пакуль, хай задаўніцца ўсё. Аднавокі той — хто ён? Кажуць, прышлы. То, можа, сыдзе куды, не будзе яго ў Гудове?»

Блукаў Косцік па вёсцы, хадзіў некалькі разоў з бацькам па грыбы. Але грыбы не радавалі, хоць іх і было ў лесе хоць касою касі, не толькі Косціка, але і бацьку. «Пакуль мы тут па лесе ходзім, можа, немцы ў сяло даўно прыехалі»,— скажа раптам ні з сяго ні з таго бацька, калі, бывала, сыдуцца дзе-небудзь на прагале ці ў гушчары. І задумаецца, задумаецца. Ці: «Во ходзім, збіраем етыя грыбы, а есці ці будам іх?» І нявесела, нявесела ўсміхнецца...

Асабліва маркотныя былі вечары, ночы. Святла амаль не палілі — газы не было, а ад лучыны паадвыкалі людзі. Ды і па лучыну трэба ў лес ісці, шукаць асмол ці сасновы смольны пень, петавацца з сякерай, потым несці на сабе, сушыць. Таму часцей людзі па вечарах і ў хатах сядзелі ў пацёмках ці клаліся зусім рана спаць. Але колькі чалавек спаць можа? Ну, выспішся ў адну ноч, у другую, а потым што ні рабі, як ні сілься — не заснеш. Ды і думкі, думкі ў галаву лезуць, не адкаснуцца ад іх ніяк. Бацька ўздыхае раз-пораз, вохкае, па хаце ходзіць; шэпча сабе штось пад нос і Хора — не то богу моліцца, не то хрысціцца. І ён, Косцік, таксама не спіць — варочаецца з боку на бок ці, прытварыўшыся, што сон даўно бачыць, пра Тасю думае: «Дзе яна цяпер?..»

Не вытрымаў аднойчы — не лёг, як заўсёды, звечара ў пасцель, па вёсцы вырашыў прайсціся. «Можа, сустрэну каго са знаёмых, пагавару, даведаюся, дзе і што дзеецца?

А то жывеш, быццам у турме якой — нідзе нічога не бачыш, не чуеш...» На горку падняўся, далей, далей па вуліцы пабрыў. Але людзей нідзе нікога не было, не гарэлі ў хатах і агні. Цёмна ўсюды, ціха. Шмыгалі з падваротняў каты ды гаўкалі час ад часу, таксама, мабыць, ад бяссонніцы, сабакі.

Толькі ля клуба, паблізу сельсавета, чыюсьці адзінокую постаць згледзеў.

«Хто?»

Падышоў, наблізіўся — і пазнаў: гэта была, як яе ўсе ў вёсцы звалі, Шурка, старэйшая гадоў на сем-восем за Косціка маладзіца, хоць з выгляду зусім-зусім дзяўчо. Жыла Шурка адна, і даўно, бо мужа яе, Паўла, забралі ў армію яшчэ ў фінскую вайну, і дадому ён так і не вяртаўся. Яшчэ пры мужу Шурка нарадзіла дзіця, ды яно памерла, не пажыўшы і года. Шурка была вясёлая, гулёвая, хадзіла ў клуб на танцы. Але ў клубе ніколі асабліва не затрымлівалася — адтупаўшы, адвіхурыўшы імклівую полечку, выбягала халадацца. І, як правіла, трапляла ў чыесьці дужыя хлапечыя ці мужчынскія рукі. І паколькі, казалі, Шурка не прывыкла адмаўляць, што б у яе і хто ні прасіў, то вельмі хутка, змовіўшыся, ішла з тым, у чыіх руках апынулася, дадому, у сваю хату, якая была тут жа, побач з клубам, і ў якой жыла Шурка пасля смерці дзіцяці адна.

Косцік ведаў пра Шурку многае ад хлопцаў і мужчын, якія, сабраўшыся дзе-небудзь на поплаве ці на лаўцы, любілі расказваць пра свае поспехі на жаночым фронце. Косцік разоў колькі і сам бачыў, назіраў, як Шурку абшчапервалі рукамі, прыціскалі, лезлі да яе цалавацца. І яна не супраціўлялася, толькі неяк дзіўна, цененька смяялася...

«А што, калі і я абняць паспрабую? — падумаў Косцік, пазнаўшы Шурку.— Можа, не прагоніць, гэтак жа дзіўна, цененька засмяецца...»

І, падышоўшы, наблізіўшыся, не прывітаўшыся, не сказаўшы і слова, абхапіў Шурку за плечы, прыціснуў да сябе.

— Го-о,— засмяялася Шурка,— а я думаю, хто ета... Ажно ета ты, Косцік...

У голасе Шуркі была радасць. І Косцік гэта ўлавіў.

— А ты... Каго чакала? — задыхаўшыся ад нечаканых пачуццяў, блізкасці жаночага цела, якое дзіўна хмяліла, спытаў Косцік.

— Нікога не чакала,— адказала, прызналася Шурка.— Проста дома маркотна быць адной. У клуб прыйшла — думала, можа, танцы будуць...

Косцік не выпускаў са сваіх рук Шуркі, ды тая і не вырывалася. Толькі, як здавалася Косціку, нейк гарачэла, цяплела ўся. І паказвала, паказвала зубы, растуляючы раз-пораз ва ўсмешцы губы.

— Ды ты,— зашаптала яна раптам,— з маладзейшымі, з дзяўчатамі хіба абдымаўся б. А я...

І пацалавала, сама пацалавала Косціка. У губы, а потым і ў шчокі, у шыю...

Усё, усё пахіснулася ў вачах у Косціка, на ўсё, на ўсё ён забыўся. Сам не помніў, што рабіў. Быццам у сне, у трызненні цалаваў, абдымаў Шурку, ішоў з ёю ў яе хату. Не даўшы ёй распрануцца, паваліў на ложак, зрываў, скідваў куды папала з яе адзенне. У вушах звінеў толькі дзіўны, цененькі смех, які перапыняўся зрэдку ціхім, вясёлым шэптам:

— Дурнота, во дурнота!..

І круцілася, звівалася Шурка пад ім уся, усім целам, нібыта ўюн, абдымала яго, гарнула да сябе, перасцерагала:

— Не спяшайся, паспееш... Во дурнота, во дурнота... Маладыя ўсе такія... Ім абы хутчэй, абы здаволіцца... Ух...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Дадому, у сваю хату, Косцік вярнуўся апоўначы. І доўга-доўга не мог заснуць. Успаміналася, як Шурка, разгарачаная, цалавала, абдымала яго, ціснулася голымі грудзямі, прасіла пабыць яшчэ з ёю. А ён адварочваўся, не мог больш быць з Шуркаю, бо сорамна было і нейк непамысна. Ды і расчараванне гняло: «Няўжо ўсё гэта так... Хутка... І... І...» — і сам не мог сказаць як.

«Ета таму, што з Шуркаю... А з іншымі ўсё было б, мабуць, інакш...»

Гарэлі, быццам ад агню, шчокі і вушы, білася, аж, здаецца, грукала ў грудзях сэрца — Косцік усё ніяк не мог супакоіцца, апамятацца.

«А калі хто-небудзь бачыў мяне ў Шуркі... Бацьку раскажа... Ды і з Тасяю... Як я цяпер сустрэнуся з Тасяю?.. Яна... А я, я...»

Хацелася плакаць, біцца галавою аб сцену, выць, рыдаць.

«Собіла ж мне з хаты сёння выйсці, Шурку напаткаць... Тыя, ранейшыя, вечары дома быў, нікуды не выходзіў, і ўсё добра было. А выйшаў... Зноў, зноў абы-чаго натварыў!.. То з пеўнем тым, за што са школы выключылі, то акно пабіў, ледзь у суд не перадалі, то карты, ачко, а цяпер Шурка... Куды нясе мяне, як усё адно ветрам?.. І галоўнае — не супраціўляюся я... Дзе ні павярнуся — у яму ўвалюся...»

## V

І раней, яшчэ да таго, як вайна пачалася, Яўхім Бабай, бывала, не вельмі выходзіў на вуліцу, на людзі. Цяпер жа, пасля няўдалай спробы сустрэць немцаў хлебам-соллю, ён і зусім перастаў паказвацца каму б там ні было на вочы. Быццам пакусаны сабака, што, схаваўшыся ў будку, залізвае раны, Яўхім Бабай таксама ўнутрана гаіўся. «Так апраставалосіцца! І немцы не прыехалі, і змок да рубчыка, у гразь і сам вырабіўся, і хлеб, ручнік вырабіў...» І вінаваціць каго — не ведаў Яўхім Бабай. Ці то каменданта, які абяцаў, што прыедзе, і не прыехаў, ці то навальніцу, што так недарэчы наляцела на вёску. «Можа, немцы навальніцы збаяліся і не прыехалі. Але і людзі, людзі!.. Ніхто не паслухаўся, не пайшоў сустракаць. Ета ж добра, што не прыехалі... А калі б прыехалі?.. Так перад людзьмі сорамна... А то б... Немцам што б я сказаў, як бы ўсё растлумачыў... Цяпер смяяцца будуць з мяне ўсюды, кпіць... Бегаў, загадваў — і ніякіх немцаў не было, ніхто з Ельнікаў не прыехаў... Выходзіць, зманіў я, верыць мне больш ніхто не будзе...»

Ад разладу ў душы, злосці і сябе дакараў, грыз, і жонцы, Соньцы, проста жыцця не даваў, поедам еў.

— Пабегла... Хавацца ад навальніцы пабегла. А як бы немцы ў еты час ехалі? — не-не дый бурчаў ён.

— Дык жа ж не ехалі,— апраўдвалася жонка.

— Шчасце тваё, што не ехалі... Але я не дарую табе. Нічога ані не дарую... І што ўцякла, мяне кінула, і што стол адзін на сабе, як усё адно дурань ступу, праз усё Замосце валок...

— Сам вінаваты! Мог, як іншыя, не ісці да крыжа. Вельмі актывісты стаў, камандаваць усімі захацелася!

— Змоўкні, цыц! — грукаў кулаком па стале, тупацеў нагамі Бабай.— Язык распусціла, плешча, што заманецца.

Не ўседжваў дома — стрэльбу на плячо ўскідваў, у лес

кіраваўся. Хадзіў па дарогах і без дарог пад шатамі па шапатлівым золаце восені, што падала і падала, сыпалася і сыпалася на дол, і думаў, думаў пад манатонны гул дрэў. Вядома, жонку, Соньку, трэба кідаць. Хай петуецца адна з дзецьмі. Вельмі разумная зрабілася! Ні павагі да яго, мужа, ні ласкі ніякай. Быццам парабак які ён у яе. Толькі ў дом усё цягай, насі, сям'ю кармі, а яна яшчэ і пакрыквае, языком абы-што брэша. Не, хопіць! І так колькі гадоў цярпеў. Хіба маладзіц няма? І зграбнейшых, і дабрэйшых.

«Але тады з хаты сваёй давядзецца выбірацца?» — вынікла, падказала асцярожненька думка.

«Ну, дык і што? Хіба хат няма? Можна маладзіцу з хатаю ўзяць».

«Але ж то была свая хата!»

«Свая! Але яна — горшая за чужую. Вато і жывеш, як дома цябе няма, ніхто не тузае, нерваў не рве. Немцы прыедуць, на службу да іх папрашуся і... Соньку кіну. Хай адна пажыве, пабачыць, як без мужа...» — цвёрда, беспаваротна вырашыў Яўхім Бабай.

Збочваў, ішоў да ямак тых, куды папераходваў збожжа, якое вазіў у лес начамі Іван Дарошка. Стаяў, глядзеў, ці быў тут хто — чалавек альбо звер,— ці не знайшоў, не адкраў у яго дабра. Не, здаецца, усё на месцы, як і было, ніхто тут не валачыўся, не хадзіў.

«У вёску б усё гэта перавезці. Але ж Іван Дарошка ды і Васіль Кулага то па вуліцы, то дзесьці поблізу сноўдаюцца. Зловяць — не даруюць. Ды і куды перавозіць? Да Сонькі? Не-е, лепш да новай жонкі. Адразу багач, ні адна ад такога не адмовіцца...»

Вяртаўся назад дадому, зноў па хаце сваёй сюд-туд тупаў, маснічынамі скрыпеў, на жонку, на дзяцей злоснае вока кідаў. І бачыў, як ніколі яшчэ, якая непрыгожая, рабаціністая ў яго жонка, якія мурзатыя, недагледжаныя дзеці, як нячыста, засмечана ўсюды — сцены непабеленыя, печ абкуродымленая, заседжаная мухамі. «Не, трэба ўцякаць адсюль. І чым хутчэй, тым лепш. І так колькі вунь жыву, мучаюся невядома чаго». Свет, увесь свет нямілы Яўхіму Бабаю быў. Зноў, зноў лаяўся, крычаў:

— Ты б... Хоць бы падлогу падмяла, памыла!

— Падмяці, памый... Ты ж нічога не робіш — цэлымі днямі палец аб палец не стукнеш, усё то ходзіш, то сядзіш... А я свету божага ад работы не бачу,— агрызалася жонка, Сонька.

— Што ты надта робіш?

— Паспрабуй ты зрабіць, што я раблю. Навары, накармі... Вядра ж вады і то з калодзежа ніколі не прынясеш.

— Я на вуліцу цяпер не выходжу.

— І раней, калі на вуліцу выходзіў, не насіў. А цяпер... Чаго ета ты на вуліцу раптам зноў не выходзіш? Як масты спалілі, дык і не выходзіш.

Гэта... Гэта новае было. На жонку крычаць перастаў, спытаў насцярожана:

— Якія масты, хто спаліў?

— Ге, а ты і не ведаў? — прытворна смяялася, кпіла з Яўхіма Сонька.— Тыя, што праз Старчанку і Балацянку...

— Калі іх спалілі?

— Тады, як ты па хатах бегаў, загадваў усім немцаў сустракаць...

— Хто спаліў?

— Хто хацеў, той і спаліў. А ты... Не толькі з цябе, а і з мяне людзі смяюцца, маўляў, ну што, сустрэлі немцаў? Немцы ж тыя... Да Балацянкі даехалі — і назад.

Коршунам на жонку наляцеў, ледзь не ўхапіў за плечы:

— Дык яны ўсё ж ехалі?

— Ехаць ехалі, ды не даехалі,— смяялася Сонька.

Зноў некалькі сутак спакою не меў Яўхім Бабай — то па хаце сюд-туд снаваў, то да мастоў, стрэльбу на плячо ўскінуўшы, бегаў. «Дык вось чаму немцы ў Вялікі Лес не прыехалі — масты ж спалілі? Але хто ета зрабіў?» Перабіраў у памяці, згадваў усіх, хто мог асмеліцца на такое. «Мусіць, хтось не з нашых... Бо нашы... Хіба... Дарошка, Іван... Васіль Кулага... Але ім... Нашто ім ета?»

Пабываўшы ж ля спаленых мастоў, пабачыўшы на свае вочы, як акуратна ўсё зроблена было — нават недагаркі, галавешкі ў ваду ўкінуты,— заключыў: «Мусіць, такі яны... Знарок спалілі, каб немцаў затрымаць, у Вялікі Лес не пусціць... Нават калі не яны, то ўсім казаць трэба: «Яны!» Во, во, так, і толькі так... Да немцаў дойдзе, за рэбры Івана і Васіля возьмуць, калатнуць, як трэба. А то... Ходзяць па вёсцы, як і хадзілі. Вінтоўкі пачапілі, каб страх на людзей наганяць... І баяцца ўсе іх, слухаюцца, як і слухаліся. Ага... Паспрабуй не паслухайся!..»

Неяк, калі Яўхім Бабай, паснедаўшы, на лаве ля акна сядзеў, думаў, што яму рабіць сёння, ці то дома ў хаце сваёй быць, ці то зноў на цэлы дзень з дому ў лес сысці, нечакана веснiцы адчыніліся і ў двор... Яўхім аж зжахнуў-

ся, не паверыў... У двор Іван Дарошка, а за ім і Васіль Кулага кіраваліся.

Пахаладзела, пахаладзела ўсярэдзіне ў Яўхіма Бабая, ад акна далей, далей міжвольна адсунуўся. «Чаго яны? Што ім трэба?» — мільганула ў галаве.

Наструнілся, напружыўся ўвесь, чакаў, чакаў, калі ў хату неспадзяваныя госці завітаюць. А яны... У хату не заходзілі, у двары стаялі.

— Гэй, Яўхім! — пачуўся раптам голас. Чый — Яўхім ад хвалявання так і не пазнаў, не здагадаўся.— Выйдзі на хвіліначку сюды!

Як з лавы падхапіўся, як ногі, здаецца, самі на падворак яго вынеслі — не помніў, ані не помніў, як не помніў і таго, як перад старшынямі — сельсавецкім і калгасным — стаяў, галаву апусціўшы, у зямлю глядзеў. А тыя гаварылі, перасцерагалі яго, што, калі і далей ён так сябе паводзіць будзе, не пашкадуюць... Прыстрэляць... Бы сабаку прыстрэляць...

— Ужо за адно, што на мабілізацыю не з'явіўся, ад фронту ўцёк, расстраляць трэба. А калі будзеш бегаць яшчэ немцаў хлебам-соллю сустракаць... І іншым загадваць... Літасці не чакай!

Здаецца, Іван, Іван Дарошка, словы гэтыя сказаў. Злосна сказаў, з нянавісцю. І Яўхім зразумеў — так яно і будзе, зробіць Іван тое, што казаў, не пашкадуе... Словы гэтыя — не пустая пагроза...

Пайшлі старшыні з двара — Іван Дарошка першы, за ім, як і ў двор, Васіль Кулага. А Яўхім Бабай яшчэ некаторы час стаяў, агаломшаны, уражаны пачутым. Потым, у хату заскочыўшы, стрэльбу са сцяны схапіў, у лес падаўся. І толькі там, там апомніўся, зноў думаць, разважаць пачаў.

«І застрэляць, заб'юць... Не пашкадуюць!..»

І пасля размовы той не вяртаўся больш дадому, на роднае селішча, Яўхім Бабай — і ўдзень, і ўночы па лесе сугнеем сноўдаўся. А ўжо ж не цёпла было — восень з начамі халоднымі, вятрамі сцюдзёнымі ды дажджамі зацяжнымі стаяла. І жыць у лесе нясоладка, няўтульна было. І надумаў Яўхім Бабай зноў у Ельнікі падацца, яшчэ раз да каменданта нямецкага завітаць. «А што?.. Немцы ўсюды даўно, парадкі новыя наводзяць... А ў нас усё тыя ж Іван Дарошка ды Васіль Кулага камандуюць. Колькі ж ета можа быць! І цярпець... Годзе! Наўладарылі!»

Ціхачом, не выходзячы на дарогу, па лесе пасоўгаўся

зноў у Ельнікі. «На калені перад камендантам упаду, папрашу: «Паночку, цярпенне ўсякае лопнула... Колькі ж мучыцца, чакаць вас можна».

«А калі пра масты ўспомняць?» — спрабавала астудзіць яго думка.

«Скажу, масты яны, Іван Дарошка і Васіль Кулага, спалілі. Кеб нікога ў Вялікі Лес не пусціць, самім, як і ўладарылі, і далей уладарыць...»

Стрымлівала, перасцерагала, нібыта нават палохала нешта Яўхіма Бабая, не ахвоціла ісці зноў да немцаў, шукаць у іх паратунку. Але і не ісці, у лесе аставацца ўжо цярпення ніякага не было, ды і не валодаў сабою Яўхім Бабай — злосць, нянавісць да Івана Дарошкі, Васіля Кулагі, жонкі — і сам не ведаў, да каго яшчэ,— усякую разважлівасць і цвярозасць даўно з галавы выбілі.

## VI

Ішла, разнягоджвалася гнілая, дажджлівая восень, а Андрэй Макаравіч і Аліна Сяргееўна так і не прыбіліся да пэўнай аселасці, не займелі прытулку — блукалі і блукалі па незнаёмых дарогах і сцежках, невядомых дасюль вёсках і хутарах. І куды ні патыкаліся — усюды былі немцы. Немцы былі ля Дняпра і за Дняпром, ля Прыпяці і за Прыпяццю, ля Сажа і за Сажом; былі яны і ва ўсіх вялікіх людных паселішчах, гарадах — Брагіне, Лоеве, Камарыне, Рэчыцы, Мазыры, Нароўлі. Толькі ў самыя глухія і далёкія вёскі, што параскіданы па лясах і балотах, не паспелі яшчэ дабрацца. Але і такіх вёсак аставалася з кожным днём усё менш і менш — распаўзалася і распаўзалася карычневая чума, і ніхто не мог яе стрымаць: гэтак пажар, бывае, у сухмень ахоплівае новыя і новыя абшары. Дзе толькі не пабывалі Андрэй Макаравіч і Аліна Сяргееўна, спрабуючы вырвацца з акружэння ворага, дзе не спыняліся, мяркуючы абгледзецца і жыць. Але мінаў дзень-два, і зноў даводзілася рушыць у дарогу, бо выяўлялася: немцы зусім побач. І Андрэй Макаравіч, і Аліна Сяргееўна надта ж пастамляліся, ног пад сабою не чулі, ледзь перастаўлялі іх, але не асталіся на адным месцы, ішлі і ішлі. Ды і што рабіць было? Не трапляць жа немцам на вочы, проста ў рукі, і дзе — у незнаёмым месцы, сярод незнаёмых людзей. Расказвай, даказвай тады, што не злачынцы, а звычайныя настаўнікі. Хто заступіцца, пацвердзіць, што так яно і ёсць, праўду яны кажуць? Не-е,

лепш быць далей ад ліха, не выпрабоўваць лёс. Бо гэта ж кожнаму ясна, нават дзіцяці: каб невінаватыя ні ў чым былі, дома б сядзелі, нікуды не пайшлі б з вёскі сваёй. А калі пайшлі — значыцца, баяліся дома аставацца, было чаго баяцца. Ды цяпер, у вайну, надта ніхто і разбірацца не будзе, вінаваты ты ці невінаваты. Няма калі разбірацца. Адвядуць за вёску ці на абочыну дарогі і прыстрэляць. Вось і доказы твае ўсе, збавенне, канец пакутам. І сам Андрэй Макаравіч, і Аліна Сяргееўна мужна пераносілі нягоды выгнання, блукання па чужых, незнаёмых дарогах і вёсках. Гаварылі між сабою мала — адно аднаго разумелі без слоў. І калі казаў адзін, што гэта трэба, другі не супраціўляўся, не адгаворваў — значыцца, трэба. Да гэтага прывыклася за гады сумеснага жыцця, так падказваў ім сямейны абавязак.

Неяк, пасля чарговага пераходу з адной вёскі ў другую, глушэйшую, калі збочылі з дарогі і паселі ў лесе пад дубамі адпачыць і перакусіць,— якраз і сонца з-за хмар выбліснула, прыгрэла,— Аліна Сяргееўна, уздыхнуўшы, сказала:

— Не трэба было нам з дому, з Вялікага Лесу, нікуды ісці.

— Ты так думаеш? — спытаў, павярнуўшыся тварам да Аліны Сяргееўны, зусім зблажэлы, даўно не голены, Андрэй Макаравіч.

Аліна Сяргееўна адказала не адразу. Маўчала, не адымала ад зямлі вачэй. Потым усё ж прамовіла:

— Бачыш, адступаюць нашы... Халады хутка, а пералому ў вайне няма.

— А пры чым тут адно да аднаго? — непаразумела глядзеў на Аліну Сяргееўну Андрэй Макаравіч.

— Ды быццам і ні пры чым... Я думала, да халадоў нашы пагоняць назад немцаў. І мы... У Вялікі Лес зможам вярнуцца...

— У Вялікі Лес мы ў любы час вярнуцца можам. Хто нам забараняе?

Павесялела Аліна Сяргееўна. Вочы на мужа падняла, паглядзела з надзеяй, цеплынёю.

— Дык давай... Вернемся,— сказала.

Цяпер доўга маўчаў, нічога не гаварыў Андрэй Макаравіч. Сядзеў і пра нешта ўпарта, засяроджана думаў.

— Вярнуцца яно, вядома, можна,— сказаў паволі, з развагай.— Але Кухта гэты спакою мне не дае...

— А што табе той Кухта,— паспрабавала супакоіць

мужа Аліна Сяргееўна.— У яго сваё жыццё, у нас — сваё. Што хоча, тое няхай і робіць. А мы... Па-свойму жылі і жыць будзем. Ды калі на тое пайшло, ён жа ў Мінск збіраўся ехаць. Туды, дзе выдавецтвы, тэатры... «Каб далёка наўкруг відаць было — мяне ўсе бачылі і я ўсіх бачыў». Помніш?.. Дык, можа, ён і паехаў ужо туды з Пашні. А не паехаў, дык паедзе...

Задумаўся, яшчэ глыбей задумаўся Андрэй Макаравіч. І паколькі нічога лепшага прапанаваць не мог, згадзіўся з жонкаю, Алінай Сяргееўнай. Сказаў, вымавіў сваё звыклае:

— Ну і няхай!

Аліна Сяргееўна аж з месца свайго наседжанага ўстала. Загаварыла, засакатала сваім ласкавым галаскам:

— А што мы дзе выхадзім лепшае? Ад дабра дабра не шукаюць. У Вялікім Лесе нас усе ведаюць і мы ўсіх ведаем. Калі што — і памогуць і абароняць. Хто мы, каб немцаў баяцца? Што ўсім людзям, тое і нам. Ды і немцы таксама ж... Няўжо яны нас не зразумеюць?..

Улавіўшы злосны пагляд мужа, Аліна Сяргееўна асеклася, змоўкла, зноў села на сваё месца.

Праз які тыдзень і дома, у Вялікім Лесе, былі. Хату адамкнулі, зайшлі ў яе — не вытрымала Аліна Сяргееўна, заплакала, разрыдалася:

— А я думала, не вярнуся ўжо сюды, не ўбачу гэтых сцен, дзе мы столькі ўсяго і перагаварылі, і пражылі.

— Пачакай радавацца,— прамовіў сумна, праз зубы, Андрэй Макаравіч, спыняючыся, быццам не ў сваю хату парог пераступіў, а ў чужую.

— Як жа не радавацца, дома ж мы. І немцаў тут няма. Мы ўцякалі ад іх, а яны... Бачыш, так і не паявіліся.

— Паявяцца,— змрачнеў, суравеў Андрэй Макаравіч — відаць было, перажываў: вырвацца ж, уцячы ад акупантаў не ўдалося.

## VII

Дадому, у сваю вёску, Клаўдзя прыехала надвячоркам. Спыніла падводу ля двара Дарошкаў, спытала, павярнуўшыся тварам да Змітра:

— А з коньмі, возам што рабіць?

— Як што? — не зразумеў, падняў, бы гусак, галаву

Змітро.— У двор кіруй, спатрэбяцца нам яшчэ коні і воз.

— А я думала, ці не назад у калгас падводу загнаць,— прызналася шчыра Клаўдзя.

— Які калгас? — узлаваўся Змітро.— Калгасаў даўно няма. Скончыліся калгасы...

Клаўдзя ціха, давольна засмяялася і злезла з воза, адчыніла браму, заехала ў двор, узялася распрагаць коней.

Пачуўшы, мабыць, нешта нязвыклае ў двары, на ганак выйшаў свёкар, Мікалай. Заклаў за спіну рукі, глядзеў то на Клаўдзю, то на чалавека таго, што прыехаў з ёю, стаяў пры возе.

— Што, вярнулася? — улучыў момант, калі Клаўдзя, не вытрымаўшы позірку старога, сама паглядзела на яго.

— Ага,— знарок весела, як бы з падкусам адказала Клаўдзя. Ведала, добра ведала, што найбольш цікавіць старога свёкра, але маўчала, рабіла выгляд, што не здагадваецца.

Тым часам Змітро, асвойтаўшыся, асмялеўшы, узяў з рук у Клаўдзі вупраж, панёс да Мікалая, падаў, загадаўшы:

— На́, у сенцы нясі.

— Што-о? — абурыўся стары.— А ты... Хто ты?

— Я? — усміхаўся, яўна кпіў са старога Змітро.— Клаўдзя, скажы, хто я,— урэшце кіўнуў галавою да Клаўдзі, зарагатаў Змітро.

— Муж мой новы, Змітро Шламак. Прашу любіць і слухацца,— не то пацяшалася са старога, не то праўду казала Клаўдзя.

— Муж новы? — спалохаўся, адступіўся на крок назад Мікалай.— А Піліп?

— Піліп — да іншай с... прыліп,— ужо зарагатаў на ўвесь двор Змітро.

Зарагатала, залілася смехам і Клаўдзя. Ды так весела, бесклапотна, быццам не пра законнага мужа, Піліпа, з якім пражыла гадоў з дзесяць, гаворка ішла, а пра нейкага дзівака-шалапута.

Аж рукамі замахаў Мікалай, перахрысціўся.

— Пабойся бога. Пры жывым... Новы муж...

— Ага,— зноў знарок весела, здзекліва адказала Клаўдзя.— Пры жывым... Новы.

— А калі Піліп... Вернецца?

— Жэнім Піліпа. З іншай жэнім,— смяяўся, рагатаў на ўвесь двор Змітро. Ды так нахабна, з выклікам, што

Мікалай не вытрымаў — сцяўшы кулакі, пайшоў на прыблуду.

— Хто ты, кеб рагатаць, камандаваць тут, у маім двары? — прахрыпеў.

Змітро як бач змяніўся з твару — кінуў на прызбу вупраж, перастаў рагатаць. І перш чым Мікалай наблізіўся да яго, згроб старога ў ахапку, шпурнуў на зямлю, папярэдзіўшы пры гэтым:

— Ні на крок не падыходзь. Бо калі падыдзеш, руку падымеш — заб'ю!

Засоп, засоп стары. Падняўся, устаў з зямлі, паволі, накульгваючы на левую нагу — стукнуўся, падаючы, аб прызбу,— ні на каго больш не гледзячы, пайшоў, моўчкі падаўся ў сваю палавіну хаты.

Нейкі час на двары панавала цішыня.

— Хі-і,— азваўся першы, усміхнуўся Змітро.— Думаў мяне напалохаць. Не на таго нарваўся. Што-што, а біцца я ўмею.

— Ды ўжо ж,— усміхнулася, задаволеная, і Клаўдзя.— Ну і сіла ж у цябе. Ледзь дакранешся да чалавека — а ён — брык! — ужо на зямлі...

— Дык ета ж не хочучы,— скромнічаў Змітро.— А каб захацеў... Як пушынкі, як мухі разляталіся б. О, на мяне аднойчы ўчацвярых напалі! Паглядзела б, што я з імі зрабіў! І самі больш біцца не будуць, і іншым закажуць.

Коней завялі ў хлеў, вупраж занеслі ў сенцы. І не паспелі ў хату зайсці, як расчыніліся весніцы і ў двор убеглі суседзі — Мацей Тхорык і жонка яго, Мальвіна. Да Клаўдзі кінуліся, распытваць пачалі наўзахапкі — дзе дачка іхняя, Надзя, чаму яна дадому не вярнулася.

— Будзе Надзя дома, пачакайце,— супакоіла Клаўдзя і Мацея Тхорыка, і жонку яго, Мальвіну.

— Калі яна будзе? — хацелі ведаць суседзі.

— Ну, не зімавацьме ж з тымі каровамі, некалі ж вернецца. Не цяпер, дык у чацвер.

— А чаму не разам вярнуліся?

— Таму што ў нас свая дарога, а ў яе — свая.

— А як Надзя? З ёю ўсё добра?

— Добра, не хвалюйцеся. Вось толькі самалёты нямецкія банбяць часта.

— Самалёты... Банбяць? — загаласіла Тхорыха, Мальвіна.— Дык чаму ж яна не ўцякае?..

— Кульгач, Хомка, не пускае. Надта ж пра кароў калгасных дбае. Але нічога, прыпрэ, то і ён уцячэ. Усё кіне і ўцячэ.

— Дык хай бы ўцякалі,— галасіла, аж падвывала Мальвіна.— А то ж і забіць могуць... І нашто было мне, беднай галоўцы маёй, пускаць Надзю гнаць тыя каровы, хай бы, як іншыя, дома сядзела, нікуды з вёскі не ішла-а...

— Яны што, ля Дняпра? — спытаў Тхорык.

— Ага, ля Дняпра.

— То я ведаю, якое там пекла. Сам быў, бачыў...

І, апанураны, угнуўшы ў плечы галаву, пайшоў з Дарошкавага двара. За ім, счакаўшы трохі, падалася, галосячы, услед і Мальвіна.

А Клаўдзя і Змітро пакіраваліся ў хату.

І некалькі дзён іх ужо ніхто не бачыў, бо яны нікуды і не выходзілі. А калі і выходзілі, то па пільнай патрэбе, за хлеў. Толькі чуваць, чуваць было, як выла, заходзілася не то ад плачу, не то ад радасці Клаўдзя і ўночы,і ўдзень, і людзі не ведалі, не разумелі, чаму яна гэтак крычыць — ці то б'е, душыць яе той прыблудны, нікому не знаёмы Змітро Шламак, ці то лашчыць. І дзівіліся, дзівіліся ўсе, бо такога не было яшчэ ў Вялікім Лесе. Падумаць — пры жывым мужы прывесці ў хату чужога чалавека і цэлымі днямі і начамі выць, рагатаць на ўсю вёску!

Старыя людзі хрысціліся, маладыя ўсміхаліся, асабліва калі Порку Хомкаву ля Дарошкавай хаты бачылі — тая, сагнуўшыся, тулялася пад платамі, усё ніяк Клаўдзю злавіць не магла, каб распытаць, дзе муж, Хомка, калі ён дадому, да яе, жонкі, вернецца.

Заходзіць жа ў хату да Клаўдзі не асмельвалася, баялася Порка. Яшчэ і яе гэтак жа таўхане, шпурне на зямлю новы Клаўдзін чалавек, як надоечы, кажуць, свёкра, Мікалая Дарошку, шпурнуў.

## VIII

Мікалай Дарошка, лежачы на пасцелі, чуў, добра чуў, што рабілася за сенцамі ў хаце — не на яго, а на Піліпавай палавіне. І лаяўся, вушы падушкаю затыкаў.

«Ета ж падумаць толькі!.. Каго на селішча прывяла! І маўчы, слова не скажы! Бо... Заб'е! Такі не пашкадуе, не-е! Ды і хто я, кеб мяне шкадаваць? І цярпець? Як такое цярпець? Кеб у маёй хаце, сынава жонка... Вяселле сабачае спраўляла?»

Хрысціўся Мікалай, прасіў, маліў бога: «Божа, справядлівы і адзіны, памажы! Бо хто ж мне паможа, як не ты? Сам бачыш, чуеш, якая распуста на вачах тваіх творыцца?

І гэта на старасці маіх гадоў, калі паміраць пара. Чым я прагнявіў цябе, божа, за што, за якія грахі ты мяне так жорстка караеш?.. Я ж ніколі цябе не выракаўся, ні ў самыя шчаслівыя, ні ў самыя чорныя дні мае. Помніў, заўсёды помніў...»

І зноў, зноў злосць выбухала. Ужо на сына, Пініпа. «Казаў жа — не бяры, не вядзі на селішча хлюндры. Не, не паслухаў. «Ці з ёю жанюся, ці ні з кім!» Ну, жаніўся, паспытаў радасці і шчасця? А цяпер я мучся, што хочаш, тое і рабі... Бамбізу прывяла аднекуль, і ён распараджаецца тут. А ты... Слова яму проці не скажы, не пікні нават. І хто прывёў? Чуж-чужаніца. І заступіцца каму?.. Піліп далёка, а Іван...»

Згадаўшы Івана, задумаўся. «Можа, ён і праўда дабра і мне, і людзям жадаў. Толькі я ды і некаторыя іншыя не разумелі таго. Кожны за сваё трымаўся, старое, звыклае. І калі б не вайна, сцярпелася б, прывыклася б. А так... І я мучуся, і ён з вінтоўкаю сноўдаецца. Хіба яго папрасіць, кеб Клаўдзю і прыблуду-бамбізу ўразоніў? Але ці кінецца, пойдзе ён мне памагаць?..»

Успомнілася, паўстала ў вачах, як Іван з Васілём Кулагам у лесе развітваліся, зноў — каторы раз! — прагучалі ў вушах словы тыя, што сказаў Іван напаследак Васілю Кулагу: «Яды якой з сабой захапі... Бо я, можна сказаць, галадаю...» — «Трэба было мне дагнаць Івана, пагаварыць з ім. Цяпер было б прасцей і сустрэцца з Іванам, і помачы, абароны папрасіць. На сябе, на аднаго сябе я заўсёды спадзяваўся. Не думаў нават, што помач мне спатрэбіцца. А бачыш, бачыш... Сам я... Што я зраблю з нахабамі етымі — Клаўдзяй, Змітром?.. Ганьба, сорам. Кеб у мяне, у маёй хаце, ды такое...»

Крэкчучы — балеў бок, балела нага: ударыўся моцна, як падаў, аб прызбу,— ссоўваўся з ложка, сагнуўшыся, кульгікаў, хадзіў, снаваў сюд-туд па хаце. І думаў, думаў, куды падацца, дзе абароны шукаць...

«І параіцца з кім? З Хораю? З Косцікам? А мо... Дачку, Параску, паклікаць?.. Папрасіць, кеб з Клаўдзяю пагаварыла? Ці з маці Клаўдзінаю — Мар'яю? Хай бы выбралася Клаўдзя адсюль, з майго селішча, не жыла б тут, не сарамаціла на старасць...»

Акінуў вачыма хату. І хоць вечар ужо падыходзіў, змяркалася — не было, як і заўсёды, Косціка дома. Завіхалася ля комінка, распальваючы смалякі, Хора.

— Да Параскі... Да Параскі схадзі,— сказаў, загадаў

Хоры Мікалай.— Няхай сюды прыйдзе, пагаварыць трэба...

Хора пакінула распальваць смалякі, сачак на плечы ўздзела, пакульгікала, пайшла.

Назад, у хату, не адна вярнулася, а з Параскай. Зноў узялася распальваць на комінку смалякі. Дзьмухала на вугаль, трымаючы ў руках лучыну, пакуль тая не загарэлася, не ўспыхнула агнём. Параска ж папраставала адразу да ложка, на якім ляжаў, не распрануўшыся, не акрыўшыся коўдраю, бацька.

— Што, тата? — спытала.

І села, насцярожаная, пакорлівая, на край пасцелі.

Мікалай нейкі час маўчаў, толькі мыляў-мыляў губамі, быццам жаваў штосьці, а яно не жавалася, не глыталася.

— Схадзі... Да сучкі етай схадзі,— урэшце прамовіў ён.— Скажы, хай выбіраецца з селішча. Куды хоча, туды і выбіраецца. Бо цярпець ганьбу такую... Не магу больш я...

Параска сцяла нітачкаю губы, засяродзілася ў сабе на хвіліну. Потым устала, моўчкі пайшла з хаты.

Вярнулася Параска ад Клаўдзі хутка. Сказала, як бы аб'явіла:

— Не пойдзе Клаўдзя нікуды з етага селішча.

— Не пойдзе? — падняў галаву, падхапіўся імкліва з ложка Мікалай.

— Не пайду, кажа, і ўсё. Хата, маўляў, Піліпава і яе. Колькі, кажа, хачу, столькі і жыць буду. І ніхто мне нічога не зробіць.

— Ніхто нічога не зробіць? — абурыўся, закрычаў Мікалай.— Кеб на маім селішчы ды мяне білі, сабачае вяселле спраўлялі? Да Мар'і схадзі, прывядзі яе сюды, я сам з ёй, скажы, пагаварыць хачу! — загадаў Парасцы.

Параска слухмяная была — і слова проці не сказала. Павярнулася — пайшла моўчкі.

Гэты раз давялося чакаць яе доўга. І Мар'я жыла не блізка ад Дарошкаў, ды і, адчувалася, Мікалай Мар'і не ўказ быў, сваю галаву на плячах мела, слухацца нікога не хацела. Натурлівая баба была, дармо што галадранка. Таму, мабыць, і без мужа, адна жыла. Ды і ўгадзіць ёй... Клаўдзя, няйнакш, у маці сваю ўдалася, і крошачкі пабрала. Калі ж нарэшце клямкнулі дзверы, адчыніліся і ў хату зайшла Параска, ні сам Мікалай, ні Хора не здзівіліся, што адна Параска вярнулася, без Мар'і.

— Чаму Мар'я не прыйшла, што яна кажа? — глядзеў на дачку, еў яе вачыма Мікалай.

— Кажа, мне рабіць там няма чаго. Самі разбірайцеся. Свой са сваім бібіся, а чужы не мяшайся,— стомлена сеўшы на лаву, выдыхнула Параска.

— Свой са сваім?.. А яна што — чужая? — зыркаў вачыма на дачку Мікалай.

— Кажа, Клаўдзя не маленькая, няхай сама думае, што робіць. Умешвацца ў яе жыццё, маўляў, яна не будзе. Не хоча з Піліпам жыць, няхай не жыве. А што да хаты, да селішча... Дык яно, кажа, такое ж Дарошкавае, як і Коўдравае. Нечага прысвойваць, на тое і рэвалюцыя была, кеб усякую ўласнасць ліквідаваць...— пераказвала Параска тое, што Мар'я Коўдрава гаварыла.— Ета, кажа, не царскія часы, калі можна было судом кагосьці, па закону, і ссяляць, і праганяць з селішча. Цяпер наогул без усякай улады жывём. Што хто хоча, тое і робіць...

— Аге, мудра-ая,— пакруціў галавою Мікалай.— Нічога не скажаш. Дзе толькі розуму такога набралася?

— Прагнаць етую гадаўку з селішча трэба,— павярнулася раптам да Мікалая тварам, сказала Хора — яна ўвесь час маўчала, падкладваючы на комінак, каб святло не пагасла, смалякі, ды, прадучы, скубучы кудзелю, слухала — слова не прапускала — размову брата, Мікалая, з дачкою, Параскаю.

— Дык прагані, прагані,— як бы кпіў, пасміхаўся з Хоры Мікалай.— Я толькі дзякуй табе скажу!

— І праганю! — паднялася з лавы, устала на адну, даўжэйшую, нагу ад прасніцы Хора.— А не праганю, дык... Атручу! Разам з етым... Прыблудным!

— Чым ты атруціш? — зацікавіўся, паглядзеў на сястру Мікалай.

— Знайду чым.

І Хора, накінуўшы на плечы сачак, выйшла з хаты.

Пасядзеўшы яшчэ трохі, пайшла дадому, да сваіх дзяцей, і заклапочаная Параска. А Мікалай Дарошка зноў астаўся ў хаце сам-насам са сваімі невясёлымі думкамі — як жыць далей, куды падацца, дзе помачы шукаць, каб сораму пазбыцца, прагнаць з селішча, дзедаўшчыны, Клаўдзю з яе нялюдскім прыблудам-мужыком?..

## IX

Хора, як і заўсёды, калі не вытрымлівала, устравала ў размову — устаўляла два-тры свае словы, і цяпер выйшла з хаты, ахопленая цэлым роем самых супярэчлівых думак

і пачуццяў, і, стоячы на падворку ў цішы цёмнага асенняга вечара, доўга-доўга не магла саўладаць з сабою, супакоіцца.

«Што ета я сказала? Ды так, не падумаўшы, уголас? — дакарала яна сябе.— Праўда, у хаце свае былі, Мікалай і Параска, яны мяне ведаюць. І ўсё ж...»

Вядома, Клаўдзю яна, Хора, ненавідзела. Ненавідзела даўно, яшчэ да таго, як тая стала Піліпаваю жонкаю, прыйшла сюды, на іх селішча, жыць. Надта ж была яна не такая, як усе ў Вялікім Лесе, ані не саромелася, з хлопцамі ўсюды, дзе б ні была, зубы скаліла. Дый апраналася так, каб рукі, ногі ці яшчэ што-небудзь лішне агаліць. Сціпласці, цнатлівасці, павагі да старэйшых у Клаўдзі ніколі не было. І тут, у іх доме, стаўшы Піліпаваю жонкаю, Клаўдзя сябе з першага дня павяла так, быццам не людзі Дарошкі, а быдла нейкае. Нават тое, што іншыя ціхенька робяць, непрыкметна, каб ніхто не здагадваўся, яна рабіла са стогнам, крыкам, рогатам — а побач жа яна, Хора, на палку ляжала, Мікалай. І хадзіла па хаце, а то і ў хлеў распатланая, у сарочцы адной, круцячы так клубамі, што аж глядзець брыдка было. Камандаваць ёю, Хораю, хацела, быццам не яна, Хора, пасля смерці Ганны, Мікалаевай жонкі, гаспадыняю ў Дарошкавай хаце была, а яна, Клаўдзя. Зварыць Хора есці, яна пакаштуе і выплюне, нясмачна, маўляў. І пойдзе з-за стала, не еўшы, толькі нос закапыліць. А то крык падыме — лыжкі, міскі нячыста памытыя, у хаце не прыбрана. «Нячыста памыта, не прыбрана — дык чысцей памый, прыбяры, што я, служанка?» — скажа, абурыцца іншы раз, не вытрымаўшы, яна, Хора. Але мыць, прыбіраць — Клаўдзя ніколі не рупілася. Калі і возьмецца што рабіць, дык лягчэйшае. А ўсё астатняе па гаспадарцы ты, Хора, рабі. І дроў, вады ў хату прынясі, і ў печы выпалі, і есці навары, накармі, нагадуй усіх, пасцелі засцялі, хату падмяці...

Збудаваў сабе хату Піліп, думала Хора, вось перабяруцца, то і клопату ніякага ведаць не будзе. Аж дзе там — Хора раненька ўстане, есці наварыць, свіней, гусей, курэй накорміць, а Клаўдзя ў пасцелі з Піліпам усё валяецца, не ўстае. Сядзі, чакай, калі яны ўстануць ды ласку зробяць — есці прыйдуць. Не вытрымаў ужо сам Мікалай — пасварыўся з сынам. Яму, Мікалаю, работу трэба ісці рабіць, ён спяшаецца, а яны ў пасцелі валяюцца, ляжаць. Сама Клаўдзя яду сабе ўзялася варыць. Што яна там і як варыла — адзін Піліп ведае. Сваркі ў Піліпа з Клаўдзяю

пачаліся. Ды і Мікалай таксама Клаўдзю не тое што неўзлюбіў, а зненавідзеў. Люта зненавідзеў. Глядзець на яе, сустракацца проста не мог... «Згубу на селішча Піліп прывёў,— казаў, абураўся ён.— Етакая хлюндра... І выбраў жа сынок!» Мікалай, Піліп не ўсё пра Клаўдзю ведалі, не ўсё бачылі, што тая вытварала. І яна, Хора, не ўсё ведала, не ўсё бачыла. Але і таго, што трапляла на вочы, даходзіла да вушэй,— дастаткова, нават больш чым дастаткова было, каб уявіць, якая гадаўка Клаўдзя. Маючы мужа, Піліпа, яна з іншымі мужыкамі круціла. І дзе? Нават дома, у сваім двары. Ідзе аднойчы яна, Хора, міма хлява, бачыць — дзверы на зашчапку не зашчэплены. «Хто ж бо там мог быць?» Адчыніла дзверы, зазірнула ўсярэдзіну. А там, на сене,— цьфу, цьфу, аж перапалохалася Хора,— Грышка Сапун ляжыць, а з-пад яго голыя жаночыя ногі вытыркаюцца. «Што ты тут робіш?» — закрычала ад пярэпалаху яна, Хора. «А табе што, крыванджа?» — азвалася з-пад Грышкі Клаўдзя. Твар так і абдало гарачынёю, выскачыла як ашпараная тады з хлява. І рабіць доўга потым не ведала што, ці то Піліпу расказаць, ці то змоўчаць... А то неяк проста ля хлява ў снезе, быццам сучка, з некім качалася...

«Цяпер прывалаклася з прыблудам рыжым на селішча,— вяла далей свае думкі-развагі Хора.— І Рыжман той Мікалая — гаспадара збіў, ды так, што ў пасцелі вунь ляжыць. Дараваць такое... Бачыць — і цярпець... І выбірацца ж, гадаўка, нікуды адсюль не хоча, тут жыць мяркуе. О, не, не!.. І прагнаць... Як, хто прагоніць?.. Астаецца і праўда — атруціць і яе, паганку, і Рыжмана таго. Нават калі адну яе атруціць, дык Рыжман не астанецца тут, сыдзе з селішча...»

«Але ж грэх... Ды і чым ты атруціш паганку етую? Сказаць-то я сказала, а зрабіць?..»

Пайшла, грукнуўшы дзвярыма сенцаў, а потым і веснічамі, дадому, да сваіх дзяцей, Параска, агні на вёсцы тухлі то ў адной, то ў другой хаце — людзі ўкладваліся спаць, а Хора стаяла і стаяла ў двары, усё думала, думала, перабірала і перабірала ў памяці нядаўняе і даўно забытае.

«А можа, Клаўдзя правільна робіць, што гуляе? — закрадвалася сумненне.— Пакуль жывы чалавек, то яму трэба ўсё спазнаць. Бо там, на тым свеце... Нічога етага не будзе. Ды і ці ёсцека той другі свет, рай і пекла? Раней казалі — ёсцека. А цяпер кажуць: няма нідзе ніякага свету другога, ёсцека свет толькі еты, адзін. І не пра грэх, кару

божую думаць трэба, а жыць чалавеку, як яму хочацца, жадаецца. І Клаўдзя зразумела ета, ні пра што іншае не дбае, дбае толькі пра сябе, кеб цікавей ды весялей жылося. А я...»

Сумота, маркота, туга агарнулі, спавілі Хору.

«Што бачыла я, што спазнала? Работа, увесь час, работа. Адно скончыш, пачынай другое. Ні замуж ніхто не ўзяў, ні прыгалубіў, ні прыласкаў. Адна і адна я. Жыву, быццам служанка. Кульгавая ўрадзілася, непрыгожая, нікому я не трэба. Усяму жывому бог пару дае, а мне не даў. Чаму, за якія грахі кара мне такая? Бацькі награшылі, а я... Але пры чым я да чужых грахоў? Дый бацькі... Што яны надта награшыць маглі, жывучы ўвесь век у Вялікім Лесе. Тут нарадзіліся, тут і памёрлі. Зямлю аралі, поле сеялі. Праўда, не бедныя былі, і хлеба, і мяса хапала. Але ж і жылле рвалі, працавалі, як валы. Гарэлі два разы, два разы зноў і зноў адбудоўваліся. Аге, хто ж тады, як не бацькі, у горы маім вінаваты? Бог? Дык жа і пра бога рознае гавораць. Адны — што ёсцека бог, а другія — няма яго, маўляў, бога выдумалі папы, каб людзей абіраць лягчэй было. Цікава — ёсцека ўсё ж бог ці няма яго? Калі ёсцека, дык і грэх, і рай, і пекла, пэўне ж, таксама ёсцека. Тады... Ад кары божай нідзе не схаваешся. І ўсе, хто награшыў, адкажуць. І Клаўдзя адкажа. За ўсё, усё адкажа. А я... Праведна пражыла век свой. І ці варта мне на старасці гадоў паганку етую труціць? Бог яе пакарае».

«Калі?»

«І праўда ж — калі? Можа, тады, як на свеце мяне не будзе. А я ж... Атруціць яе сабралася. І пра тое... Уголас сказала... І Мікалай, Параска чулі... Ды і ненавіджу я Клаўдзю. Мала што сама тут жыве, дык яшчэ прывяла сюды прыблуду. Адчуваеш цяпер сябе не як дома. І карову іхнюю даглядай, і коней. Накармі, напаі... Бо самі ні Клаўдзя, ні Рыжы еты надта не рупяцца дагледзець худобінку. Коні ржуць, карова рыкае, калі не ў час сена ці вады падай. Аж душа разрываецца — яна ж, худобінка, не разумее, мовы чалавечай не мае». І яна, Хора, не вытрымлівае, і корміць і поіць. А што, хіба яна абавязана, хіба служанка яна? Не, нешта рабіць трэба, кеб не было Клаўдзі на селішчы, не жыла яна тут... Сама выбірацца не хоча, дык прымусіць трэба, прагнаць.

«Але як?..»

«Аге, як? Не паскардзішся ж нікому, улады ніякай няма ў вёсцы. А без улады... У каго сіла, у таго і ўлада. І ў

Рыжага сіла ёсцека, і ў Клаўдзі. Дужыя абое. А мы з Мікалаем... Ён і я старыя ўжо. Вунь кінуў Мікалая на зямлю — у пасцелі ляжыць, кульгае. І мяне етак жа можа шпурнуць... У любы час, кожны дзень... Побач жывучы, заўсёды можна знайсці, да чаго прычапіцца. Жыць так — не дай божа... І самі яны не-е, не пойдуць адсюль, тут будуць. Праганяць іх таксама няма каму. Астаецца адно — са свету зжыць, атруціць. Хоць і грэх, бог за ета пакараць можа, ды... Нічога іншага не астаецца... Тут так — ці мы іх з Мікалаем са свету зжывем, ці яны нас. Бо разам нам, на адным селішчы, не ўжыцца. І калі я сказала, што атручу, дык... І атручу! Няхай бог мяне пакарае за ета, калі ён ёсцека. А няма яго — перад людзьмі адкажу. Але з гадаўкай паквітаюся. Колькі гора ўсім нам прынесла! І Мікалаю, і Піліпу, ды і ўсім нам, Дарошкам! А прынясе колькі яшчэ! Была адна, а цяпер... З Рыжманом... Прытулілі змяю падкалодную — узялі галадранку, прыгрэлі, адкармілі, дык яна... Бачыш, што вытварае... На шыю, на галаву садзіцца. І смуродзіць, кусаецца... Не трэба было яе на селішча наша пускаць. Піліп ва ўсім вінаваты. І Мікалай. Здавацца не трэба было, трэба было на сваім стаяць, да канца. Не паддавацца на ўгаворы, не адступаць. Усё адно гаспадарку не захавалі, у калгас уступілі. Не выратавала тое, што Піліп жаніўся. Наадварот, яшчэ большыя непрыемнасці пачаліся. І з Іванам Мікалай пасварыўся і з Піліпам. А гадаўцы толькі ета і трэба. Калі ўсе пасвараныя, ёй лягчэй. І, добранька падумаўшы, не з калгасаў мітрэнга пачалася, як Мікалаю здаецца, а з прыходу на іх селішча гадаўкі етай. Свае як чужыя парабіліся, даверу адно да аднаго ў сям'і не стала. А цяпер і зусім з селішча, бацькаўшчыны, зжываюць. Ды вельмі і няма каго зжываць — Піліп на хронце, можа, ужо дзе і галаву склаў. Адзін раз зямлёю прысыпала, а другі раз можа жывы і не астацца. Іван даўно выбраўся, аддзяліўся. Сям'я яго невядома дзе цяпер, а сам таксама ці ацалее, ці выратуецца — камуніст жа, старшыня сельсавецкі. Асталіся яны, Хора ды Мікалай, Косцік. Але ці многа ім трэба з Мікалаем? У гадах абое, ды калі Рыжман еты яшчэ патузае, пашпурляе етак... А Косцік... Дзіця, шалапут. Куды хто пальцам паманіць — і бяжыць. А ў вайну, калі страляюць, калі робіць кожны, што хоча, і не адказвае ні за што, ці ж уратуецца, галаву сваю дурную пад кулю не падставіць... Вось і астанецца гадаўка адна на селішчы, бацькаўшчыне Дарошкавай, раскашоўвацца тут будзе, раяваць... Гаспадарыць,

быццам вечна і належала ім, Коўдрам, селішча етае...»

Запратэставала ўсё ўсярэдзіне ў Хоры, забурліла: «Не, гадаўка, хутчэй у зямлі ты косці свае парыць будзеш, згніеш, чым будзе тое, на што ты наважылася, нацэлілася, рот разявіла. Ночы спаць не буду, а прыдумаю, як цябе са свету зжыць, кеб па селішчы нашым не хадзіла, не таптала сцежак тых, што ўсе мы, Дарошкі, спрадвеку таптапі...»

З нянавісцю, злосцю паглядзела Хора на чорныя, сляпыя вокны хаты, дзе жыла, цешылася са сваім прыблудамкаханкам Клаўдзя і ў якіх так і не гарэла, не запальвалася ні на хвіліну і сёння святло, і пайшла, пакульгікала, як ніколі яшчэ рашучая, ваяўнічая, у сенцы, на сваю палавіну...

## X

Да Будзілавіч Іван Дарошка, як і меркаваў, падышоў, калі зусім змерклася, цёмная асенняя ноч ахінула наваколле. Вёска спала — не чуваць было людскіх галасоў, ніякага руху, нават святло ў вокнах і то нідзе не гарэла. Цішыня стаяла ўсюды такая, што здавалася — не вёска, не людское паселішча наперадзе, а нешта адвечнае, поле альбо луг, дзе замест хат і хлявоў чарнеюць тут і там стагі мурагу, сцірты збажыны.

«Цяпер спаць рана кладуцца,— падумаў Іван.— А калі і не кладуцца, святла не паляць. І газы няма, ды і на святло можа нехта непажаданы нахапіцца. Як, да прыкладу, я ці іншы які-небудзь валацуга...»

Усё ж, хоць і цішыня стаяла ўсюды, вёска быццам спала, Іван не пайшоў да Пісарчукоў — такое прозвішча было Каціных бацькоў — па вуліцы, а збочыў на гароды: балазе з град усё даўно было ўжо звезена, прыбрана, бульба выкапана. Спатыкаючыся ботамі аб груды няроўнай зямлі, блытаючыся ў сухім картапляніку, гарбузніку і кукурузным бадыллі, наблізіўся да знаёмага хлява — ён акурат насупраць сажалкі быў, што, атуленая старымі вербамі, драмала ля самага поплаву,— перамахнуў цераз пералаз у двор. І разгубіўся, зніякавеў — заліўшыся брэхам, на яго кінуўся сабака. Вялізны, калматы і злосны-злосны.

«Як гэта я на сабаку забыўся?»

Не, Іван не баяўся, што сабака яго парве, пакусае. Баяўся іншага — сабака пабудзіць суседзяў. І тыя зда-

гадаюцца — уночы да Пісарчукоў нехта прыходзіў. А гэта было непажадана.

«Гм, і назад адступаць?.. Позна. Усё адно ўжо...»

Пайшоў проста на сабаку, не спускаючы з яго вачэй,— ведаў: сабака ніколі не кідаецца на таго, хто на яго глядзіць,— баіцца. І гэты, хоць і цёмна было, а, мабыць, бачыў уперaны ў яго позірк — яхкаючы, амаль галосячы, але адступаў — задам, задам, да сваёй будкі, што была тут жа, ля хлява. А Іван, асмялеўшы, наступаў і наступаў, ішоў і ішоў на сабаку. Сабака екатаў, як не слаўся па зямлі, ашчэрваў раз-пораз пашчу, але калі Іван схапіў у рукі вілы, што стаялі пры плоце, хуценька шуснуў, схаваўся ў будку. Цяпер нельга было марудзіць ні хвіліны, сабака раз'юшаны, мог выскачыць з будкі, накінуцца, варта было толькі павярнуцца Івану да яго бокам ці спіною. Гэта Іван таксама добра ведаў, бо неаднойчы ўпраўляўся з яшчэ больш заядлымі кулацкімі сабакамі. Не спускаючы вачэй з сабакі, несучы перад сабою вілы, закрыў будку, узяў дзверцы на зашчапку. Сабака змоўк, мусіць, збянтэжаны, пераможаны.

Уваткнуў вілы ў зямлю, схапіўся рукою за вінтоўку, бо ўбачыў: нехта ішоў да яго, нейкая чалавечая постаць — змагаючыся з сабакам, не чуў, калі адчыніліся сенцы і адтуль хтосьці выйшаў. Постаць не набліжалася, спынілася.

— Хто?

Іван пазнаў адразу ж Кацін голас.

— Я,— ціха прашаптаў ён.

У наступную хвіліну кінуліся адно да аднаго, зліліся — цёплая, толькі што з пасцелі, Каця і ён, халодны, начны. І, задыхаючыся ад пацалункаў, Іван адчуў раптам, як нешта мокрае пабегла па яго шчоках. Хто з іх плакаў — ён ці Каця? — Іван так і не зразумеў. Ды і не да таго было яму. Сэрца тахкала, ніколі, здаецца, яшчэ так не білася ў грудзях. Як засумаваў ён па Кацi, як трэба была яму яна, падатлівая, мяккая, далікатная, уся-ўся, усё яе цела! І ён абдымаў, абдымаў яе, гарнуў, прыціскаў да сябе, яшчэ не верачы, што гэта Каця, жонка.

— Ну, як ты тут? — прашаптаў нарэшце.

— Ай, не пытай. Я ўжо не чакала, што ты хоць калінебудзь наведаеш нас, прыйдзеш.

— Я ж ніколі цябе не падманваў. Сказаў — прыйду, значыцца, прыйду.

— Мала што ты казаў... Такое на свеце робіцца!..

— Што, у вас ужо немцы?

— А дзе іх няма?

— І ў вёсцы?

— Не, наязджаюць толькі. У вёсцы паліцыя. Ой, Іванка, здаецца, папалася я. І параіцца няма з кім, добра, што ты прыйшоў...

— Як папалася?

— У хату пойдзем, там і раскажу... Усё раскажу...

— А паліцыя не наскочыць?

— Мы святла паліць не будзем.

— Сабака галасу нарабіў! — азіраючыся на будку, гаварыў усё гэтак жа шэптам Іван.

— Казала бацьку, не купляй сабакі. А ён мне: «Сабака хоць папярэдзіць». І праўда — загаўкае, дык ведаеш, што нехта ідзе, не знянацку ў хаце захопіць. Ты ідзі, а я тым часам выпушчу зноў сабаку з будкі. Трэба ж, загнаў ты яго!

Каця засмяялася, давольная.

— Я і не такіх некалі, у калектывізацыю, заганяў.

— Вопыт маеш. А паліцаі баяцца. Вось мы выпусцім яго — і ніхто ў двор не зойдзе...

Як толькі Каця адчыніла будку, сабака кінуўся зноў на Івана, зацяўкаў, забрахаў.

— Ціха! — прыкрыкнула на яго Каця.— Знайшоў на каго гаўкаць!

І, узяўшы Івана пад руку, павяла ў хату.

Даўно, даўно не бываў у свайго цесця ў хаце Іван. Раней, як толькі пажаніліся з Кацяю, і па два, і па тры разы на год наведваліся ў Будзілавічы. Каця сумавала па бацьках, па вёсцы, а адну яе пускаць куды б там ні было Іван не хацеў. Але нарадзіўся Петрык, потым Андрэйка — з імі, хоць дарога і не вельмі далёкая, ездзіць нязручна. Ды і Каця паступова адвыкала ад Будзілавіч. Праўда, цяпер, калі што якое, самі Кацічы бацькі прыязджалі ў Вялікі Лес адведваць сваю адзіную дачушку. Бацькі ў Каці былі надта ж добрыя, сціплыя, дачушку сваю любілі, любілі і Івана, нават на першым часе спрабавалі яго на «вы» называць. І жылі багата — ехалі ў госці, дык абавязкова поўны воз усякіх дарункаў набіралі — і сала, і мяса, і грыбоў сушаных і салёных, і яблык, груш. Калі Іван супраціўляўся, казаў, што не трэба нічога, яны супакойвалі яго: «Зіма доўгая, з'есца ўсё. Што сабе, што курам, што свінням». І жылі бацькі дружна — маці Кацiна неяк нават хвалілася, што ні разу з мужам і не пасварыліся.

«За трыццаць гадоў жыцця грубага слова мне не сказаў».

Цяпер ішоў Іван у хату да цесця і нібыта нейкую вінаватасць адчуваў. Добра жылося з жонкаю ў Вялікім Лесе — і носа ў Будзілавічы не паказваў. А бяда здарылася, нічога нікому не сказаўшы, жонку з дзецьмі сюды прыслаў, калі ласка, глядзіце і дачку, і дзяцей, унукаў сваіх.

— Як бацька, маці? — спытаў у Каці.— Нічога не казалі, калі ты сюды жыць прыехала?

— А што яны скажуць? Рады — і ўсё...

Зайшлі ў сенцы, з сенцаў — у хату.

— Хто там? — пачуўся з печы, як толькі пераступілі парог, зачынілі за сабою дзверы, голас бацькі — нездаровілася старому Антону, адаграваўся на чарэні.

— Гэта Іван,— адказала ціха, шэптам Каця.

— Іван?!

Стары Антон мігам ссунуўся з печы. Выбегла з бакавых дзвярэй і Маланка — Кацiна маці. І цесць, і цешча кінуліся да Івана цалавацца.

— Оё-ёй, радасць якая!

— Надоўга да нас?

— ...Чула сэрца маё, што госць будзе! Ды і кот зранку мыўся...

Наўкруг Івана ўжо бегалі, мітусіліся.

— Можа, дзяцей пабудзіць? — пытала цешча.— Хай бы на бацьку паглядзелі. Ды і бацька на сваіх дзетак...

— Не спяшайцеся, ноч наперадзе ў нас...

Святла не палілі — селі за стол у цемры. Па даўняй завядзёнцы, хто б і адкуль ні прыйшоў ці прыехаў да Пісарчукоў, пачыналі з застолля. «А як жа,— пярэчылі Пісарчукі, калі хто-небудзь супраціўляўся, не згаджаўся за стол садзіцца.— Вы ж з дарогі. І стаміліся, і, пэўна ж, прагаладаліся». Самі Пісарчукі нядаўна павячэралі, таму амаль нічога не елі. А Іван галодны быў і еў доўга, упарта. Спярша бульбу, якая хоць і ахалодала, але смачная была з сыраквашай, потым сала з хлебам і кіслымі агуркамі. Выпіў конаўкі са дзве сырадою. Пакуль Іван еў, яму ніхто не замінаў — не задаваў ніякіх пытанняў, ніхто ні пра што не пытаў. Бо, мусіць, бачылі, як прагна ўмінаў ён яду.

— Ну, раскажыце, як вы тут жывяце? — абвёўшы ў цемры ўсіх вачыма — жонку, цесця і цешчу,— спытаў, выціраючы рот, Іван.

— Нічога, сынок, жывем,— адказаў за ўсіх бацька.— Не так, як жылі, а ўсё ж... Дрэнна во толькі адно — вестак ніякіх з фронту не маем. Дзе нашы? Бо немцы брэшуць

чортведама што. Быццам і Мінск, і Маскву ўзялі, хутка, маўляў, і вайне канец. А нашы некаторыя і паверылі, да немцаў служыць пайшлі. Хто ў старасты, хто ў паліцаі. З вінтоўкамі па вёсцы гойсаюць, людзей муштруюць. Ды каб толькі муштравалі, а то ж і страляюць. Чалавек, мусіць, з дзесяць ужо застрэлілі.

— Каго? — суха, насцярожана спытаў Іван.

— Ды розных. Яўрэяў дзве сям'і жыло ў нас, дык пастралялі. А то міліцыянера, Ромку. У Камарыне служыў. Да маці наведаўся, а яны яго і прыкончылі тут. І чырвонаармейца аднаго — кульгаў, бедалага, сваіх даганяў...— расказваў спакойна, па-дзелавому, як і заўсёды, цесць.— Рабіць проста не ведаем што з етай паліцыяй. Каб папалохалі яе, ці што...

— Хто ў паліцыі ў вас?

— Ды ты, Іванка, не ведаеш іх,— умяшалася ў гаворку Маланка, цешча.— Сынок кулацкі начальнік над імі. Бацьку выслалі, а ён у цёткі рос. Пашкадавалі яго, на сваю бяду. Прозвішча такое ж, як і ў нас,— Пісарчук. Але мы не радня яму, не...

Расказаў Іван і цесцю, і цешчы, а заадно і жонцы, што робіцца цяпер на фронце.

— Немцы далёка зайшлі, гэта праўда,— прызнаўся ён.— Але Масквы не ўзялі. Ды нават калі і возьмуць, канца вайны не будзе. Канец вайны толькі тады наступіць, калі немцаў з зямлі нашай прагонім. І фронт цяпер не толькі там, куды немцы дайшлі, а ўсюды, дзе людзі нашы ёсць. Расце супраціўленне народа, усе, каму дарага Савецкая ўлада, хто не хоча Бацькаўшчыну заняволенай бачыць, падымаюцца на барацьбу. Ідуць хто ў лес, а хто і яшчэ куды, каб памагаць нашым. І не бойцеся — не немцы нас, а мы немцаў пераможам. Што ж да гэтага шумавіння, што ўсплыло,— паліцаяў, то яны доўга не набудуцца — змяцём іх...

— Можа, яно, Іванко, так усё і будзе. Але ж бяды колькі наробяць яны! — ледзь не загаласіла цешча, Маланка.

— На тое і вайна,— сумна заключыў Іван.— Без смярцей, без крыві, вы самі ведаеце, вайны не бывае...

— Ды ўжо ж,— згадзіўся, цяжка ўздыхнуў і цесць, Антон.— Каб хоць нас, сям'ю нашу, ліха бокам абышло.

— Дай бог...

І цешча, Маланка, першая ўстала з-за стала, пачала прыбіраць міскі, лыжкі, яду.

— Ці хоць надоўга да нас? — спытала Каця, якая ўвесь

час сядзела побач з Іванам, слухала, што ён гаварыў, быццам не верачы, што гэта ён, яе муж, у хаце, ён, а не хтось іншы, гаворыць.

— Сёння ж і пайду,— ціха прашаптаў Іван.

— Сёння ж? — не паверыла Каця.— Не пушчу!

І прыпала галавою да Іванавых грудзей, заплакала, загаласіла.

Іван пагладзіў рукою жончыну галаву.

— Супакойся. Чаму гэта ты мяне не пусціш?

— Ды таму... Таму,— аж задыхалася ад слёз жонка,— што мне расказаць табе многае трэба, параіцца... Калі ж я паспею...

— А ты, дачушка, цяпер і гавары, расказвай,— параіла дачцэ маці.— Не сядзіце вось так, а ідзіце ў святліцу і гаварыце. І так, дай бог, каб ніхто не перашкодзіў. Сабака ж так брахаў...

— Ага, ідзіце ў святліцу,— нібыта спахапіўся і бацька.— А я на печ ужо не палезу, кажух на плечы накіну ды пры акне пасяджу, павартую. Калі што якое — у сенцы выбягай ды на гарышча. Там схавань я зрабіў, пад лежаком. Думаў, як прыйдзеш, сынок, дык там, калі што якое, і перахаваешся ад ліха...

...У святліцы, як толькі туды зайшлі, Іван памкнуўся да дзяцей — яны спалі разам на адным ложку, накрытыя цёплай даматканай коўдрай.

— Можа, я газоўку запалю? — прашаптала Каця.

— Не трэба, напалохаеш.

— Дык ты ж не бачыш іх.

— А мне хоць бы пачуць, як дыхаюць яны, носікамі сапуць.

— Засумаваў і ты, мусіць, без нас?

— А вы без мяне?

— Яшчэ і пытаеш...

І Каця, наблізіўшыся да Івана, абхапіла яго рукамі за шыю, упілася вуснамі ў яго вусны і ўся ўраз неяк абвяла, абмякла. Нібыта хмель ударыў у галаву Івану. Адно аднаго падтрымліваючы, як п'яныя, дайшлі да ложка, што бялеў ля сцяны, трохі далей ад таго ложка, дзе спалі дзеці.

— Іван, Іванка,— ледзь не плакала жонка.— Зацяжарыць хачу, нарадзіць ад цябе яшчэ адно дзіцятка. Дзяўчынку, дачачку, сабе памочніцу...

Іван схамянуўся.

— Ты што? Час цяпер такі, а ты...

— Іванка, ды цяжарнасць сёння для мяне — гэта абарона мая. Бо інакш усё можа скончыцца блага... Вельмі блага... Пашкадуй мяне, зрабі так, як я прашу. Адчуваю — няхутка мы зноў з табою ўбачымся... А нарадзіць дзяўчынку, дочачку хачу... Калісьці, як адна ў бацькоў была, паставіла мэту сабе такую — нарадзіць і вырасціць і сынка, і дочачку. Сынкоў два ў нас, а дочачкі... Няма. А хочацца, каб была... Гэта ж такая радасць — дочачка...

Яна яшчэ нешта гаварыла, але Іван ужо амаль не чуў — хмель жаночага цела, якога ён столькі дзён не бачыў і не адчуваў, родны, жаданы хмель запаланіў яго ўсяго. І ён паплыў, паплыў, як у тумане, адчуваючы толькі яе, Кацю, яе пажадныя рухі, якія не паддаюцца ніякаму кантролю, ніякаму апісанню...

...Потым яны, зняможаныя, амаль голыя, ляжалі на пасцелі і гаварылі, гаварылі. Гаварыла найбольш Каця, а ён, Іван, слухаў, толькі зрэдку ўмешваючыся ў размову, устаўляючы па слову, па два. Каця расказвала, чаму раптам ёй прыйшло ў галаву зацяжараць.

— Разумееш, Іван, акрамя таго, што дочачку мець хачу, паглядзела я, як немцы здзекуюцца з жанчын нашых, патрабуюць ад іх таго, што... Ды ты сам ведаеш... І ўявіла, што так і са мною могуць яны зрабіць, бо я ж нічога яшчэ... А тут і бобікі гэтыя...

— Якія бобікі?

— Ды паліцаі, іх бобікамі завуць, а то яшчэ сабакамі... І яны ж таксама жанчын не прапускаюць. Калі дзе можна ды каб міма прайсці... Вінтоўку наставіць і... Я і вырашыла — прыйдзеш ты, адразу ж і зацяжараю...

— Вайна ж. І ўцякаць, калі што, і жыць, хто ведае дзе — можа, пад адкрытым небам давядзецца?

— Усё, усё, Іванка, быць можа. Але ж на цяжарную жанчыну ніхто не пакваніцца. А нараджу дочачку — вырасце. Бо ты... З табою таксама невядома, што яшчэ будзе. Ведаў бы ты, як перажывала я, што не здагадалася раней зацяжарыць, яшчэ там, у Вялікім Лесе. Плакала па начах. Ой, як я па табе занудзілася!

І Каця паварочвалася да Івана, прыціскалася, абхоплівала яго рукамі, цалавала.

— А ты? Як жыў ты?

— Я? Жыў, нічога...

— Начаваў дзе, хто карміў цябе, кашулі хто мыў?

Іван усміхаўся.

— Не ў жанчын, не жанчыны — не думай. Адзін я ўвесь час, зрэдку, праўда, з Васілём Кулагам сустракаўся. Зрабілі ўсё, каб немцаў у Вялікі Лес не пусціць.

— І не пусцілі?

— Не пусцілі.

— Раскажы, як гэта вам удалося...

Давялося расказваць Кацi, як яны з Васілём Кулагам масты папалілі і немцы так і не змаглі пакуль што да Вялікага Лесу дабрацца, там і цяпер Савецкая ўлада, а не нямецкая.

— Бачыш, а я сюды прыехала, ад немцаў уцякала,— пашкадавала Каця.

— Не шкадуй. Бо немцы ўсё адно прыйдуць у Вялікі Лес. Ад іх, як ад заразы той, не схаваешся.

— Гэта, мабыць, праўда. Прыехалі да нас і адразу: «Хто бальшавік? Камісар хто?» Людзі ўсе свае, нікога ніхто не выдаў, маўляў, няма ў нас такіх. Старасту выбралі...

— Чакай, чакай,— перапыніў Кацю Іван, успомніўшы, што гаварыла яна яшчэ там, ля сабачай будкі, на двары.— Ты абяцала нешта расказаць, у нейкую нехарошую гісторыю ты папала...

— А-а, пра гэта якраз я і расказваю. Старасту немцы прызначылі. Ніштаваты чалавек, брыгадзірам дасюль быў. Вось днямі і прыходзіць да нас у хату. Так і так, маўляў, восень, пара́ дзеткам у школу. Ходзяць да мяне, просяць, ты, маўляў, уласць, забяспеч. Во я і прыйшоў да цябе, Антон, дачка ж твая настаўніца, няхай яна і вучыць дзяцей... А я... Разгубілася. Не згадзіцца?.. Немцам данясе, тыя прыедуць... А я... Што я ім?.. Згадзіцца? Зноў жа — школа не наша, не савецкая. Значыцца, на супрацоўніцтва да немцаў іду... А ты кажаш, навошта цяжарнасць мне тая? Была б цяжарная, дзіцё малое на руках у мяне было б, ніхто б і не прыходзіў, ні пра якую школу не гаварыў бы... А так... Што хочаш, тое і рабі...

Доўга, доўга думаў Іван. З аднаго боку, і праўда — чытаць, пісаць, лічыць дзяцей вучыць трэба, не зашкодзіла б, каб школа працавала. Дзеці пры дзеле, не байбусуюць. З другога боку... Школа ж не савецкая, немцы патрабаваць будуць, каб вучылі дзяцей не так, як нам трэба, а як ім, фашыстам... А Каця ж... Жонка яго, Дарошкі, старшыні сельсавета.

— Можа, пацягні, пакуль можна, з гэтай школай...

— Дык цягну ж, цягну ўжо... Але... Колькі цягнуць можна? Прыстаюць, як з нажом да горла. І стараста, і

людзі. «Не бойся, калі што якое, заступімся, скажам — дзяцей пры любой уладзе вучыць трэба».

— Яно ўсё быццам і правільна. І разам з тым... Не хацелася б, каб ты ішла працаваць у гэтую школу.

— А ты думаеш — мне хочацца? Але бачу, адчуваю — не адстануць ад мяне. Рашуча адмовіцца, наадрэз?.. Таксама небяспечна... І дзеткі, і маці, бацька... Ды і ты ж... Даведаюцца, што старшынёю сельсавета быў, камуніст... Словам, адчуваю я — папалася, ускочыла... І ратунку нідзе ніякага няма... А тут яшчэ ты так доўга не прыходзіш...

«А прыйду... Калі я зноў сюды прыйду?» — думаў Іван, слухаючы шчырую, заклапочаную споведзь жонкі. Сказаў, каб не маўчаць:

— Цяжка што-небудзь табе канкрэтнае раіць. Сама глядзі, каб лепш было. Бо з кім павядзешся, ад таго і набярэшся...

— Таму і зацяжараць хачу... Як толькі што — я, маўляў, не магу...

— А дзеткі як? — пытаў Іван.— Петрык, Андрэйка?

— Нічога. Панудзіліся першыя дні, асабліва Петрык, усё пыталі, дзе бацька. А потым папрывыкалі. Усе дзеці цяпер без бацькоў растуць.

— Ты ім і не кажы, што я прыходзіў.

— Вядома, не скажу. Бо гуляць выбегуць, суседскім дзецям пахваляцца. Так і да бобікаў дойдзе...

— Многа ў вас гэтых самых бобікаў?

— Тры чалавекі. Але, кажуць, і адна шалудзівая авечка ўсю чараду псуе. Каб бобікаў не было, здаецца, і ліха ніякага не баяўся б.

— Хіба мне іх трохі напалохаць?

— Што ты? Не чапай, у іх жа вінтоўкі.

— Дык і ў мяне вінтоўка ёсць. І пісталет.

— Не, не чапай, бо яшчэ люцейшыя будуць. Няхай, можа, другі раз. А сёння... Пабудзь, пабудзь са мною. Ды і адзенне ж перамыць трэба, прасушыць. А ноч хоць і асенняя, але не такая доўгая, як бы і табе, і мне хацелася. Хіба, можа, затрымайся, не ідзі — яшчэ адну ночку пабудзь са мною.

— Нельга мне, не магу.

— А куды ты спяшаешся?

— Куды?

Падумаў, падумаў Іван і ўсё ж не прызнаўся, не сказаў.

— Ёсць, Каця, куды мне спяшацца. Справы вельмі пільныя мяне падганяюць. Марудзіць нельга. Чым хутчэй

я іх зраблю, тым усім нам, усім людзям, і мне, і табе лягчэй жыць будзе...

— Ну што ж, не можаш астацца — не ставайся... І так дзякуй, што не забыўся, прыйшоў. Хоць душу я адвяла, расказала ўсё табе. А калі яшчэ і зацяжараю, дочачку нараджу... Божа мой!

І Каця зноў, абхапіўшы рукамі Івана, заплакала...

...Расстаўся з жонкаю, дзецьмі, цесцем і цешчаю, пакінуў Будзілавічы Іван Дарошка на світанні, так і не сказаўшы, не прызнаўшыся, куды ён выпраўляецца, чаму надоўга пакідае родны край.

## XI

Ужо некалькі тыдняў Васіль Кулага жыў не дома. Начаваў дзе трапіць — у стагах сена, сціртах саломы, а ледзь развідняла, прыходзіў у калгасную кантору. І хоць рабіць асабліва не было чаго, сядзеў там пад страхою і ў цяпле цалюткімі днямі.

Спрабаваў разоў колькі і дадому, да жонкі і дзяцей, наведвацца. Але Поля не пускала яго і на парог — выганяла з двара. Ды яшчэ з гвалтам, так, каб і суседзі чулі.

— Ідзі адсюль, валацуга! — крычала яна на ўсю вуліцу.— Ідзі туды, адкуль прыйшоў! Я сказала табе: ты мне не трэба. І не трэба. Без цябе пражыву! Падумаеш, шчасце вялікае. Валачыся, як і валачыўся.

Васіль Кулага не хацеў сварыцца з жонкаю, ды яшчэ на двары, каб чулі людзі, не хацеў ні ў чым пераконваць яе — моўчкі паварочваўся і ішоў да калгаснай канторы.

Людзі спачувалі Васілю. Клікалі да сябе і снедаць, і абедаць, і вячэраць. Супакойвалі, маўляў, у жыцці ўсякае бывае. І жонка не зразумее, і ты жонку. Але ўрэшце скончыцца ўсё добра, жаночае сэрца адыходлівае. Не хоча яна, каб на вочы трапляў, то і не трапляй, не злуй дарэмна дурніцу. Адхлыне злосць, крыві ятрыць не будзе — тады ў спакоі і злагадзе і пагаворыце, высветліце, хто і ў чым вінаваты.

Васіль моўчкі слухаў людзей, рабіў выгляд, што і сам нічога не разумее, што з жонкаю сталася, чаму яна гоніць яго з дому, у хату не пускае.

— Мо ёй сказаў хто што-небудзь? Цяпер жа языкастыя вельмі, не ведае чаго, дык выдумае,— гаварылі Васілю адны.

— Ге, не бядуй, Васіль Цімохавіч! — суцяшалі дру-

гія.— Маладзіц цяпер хапае. Калі што якое — жэнім. Такую возьмеш, што зайздросціць будуць.

Прыйшла ў кантору неяк, калі Васіль адзін там быў, Алена Курбацкая, маладая, прыгожая ўдава. Муж яе, Яўген, у фінскую вайну недзе пад Выбаргам загінуў. Доўга сядзела насупраць Васіля Кулагі, глядзела на яго. А потым раптам сказала:

— Да мяне пераходзьце жыць, Васіль Цімохавіч. Я ж адна. І накармлю, і абмыю. Хочаце, каб людзі не ведалі,— ведаць не будуць. Уночы прыходзьце, як сцямнее...

— Што ты, Алена,— усміхнуўся Васіль.— У мяне ж жонка, дзеці...

— Жонка не цэніць таго, што мае. А вось пажыла б адна, як я каторы год жыву...

Алена, прыкрыўшы твар рукамі, заплакала, зарумзала. Ледзь супакоіў Васіль жанчыну.

Прыйшлі аднойчы ў калгасную кантору да Васіля Кулагі і былы справавод сельсавета Ніна Варакса, і загадчыца магазіна Ліда Шавейка. Разам прыйшлі, хоць раней, што яны сябруюць, і не заўважалася. Пасталі ў парозе, паглядзелі адна на адну. Байчэйшая, смялейшая Ліда Шавейка сказала:

— Васіль Цімафеевіч, не забывайце, што мы камсамолкі. І калі трэба вам што — на нас разлічвайце. Ведайце — фашыстаў мы ненавідзім і гатовы ўсё зрабіць, што вы загадаеце...

— Дзякуй вам, дзяўчаты,— пакланіўся і Ніне Варакса, і Лідзе Шавейка Васіль Кулага.— Як толькі вы спатрэбіцеся, і паклічам.

Дзяўчаты пайшлі натхнёныя, задаволеныя. І Васіль Кулага таксама аж павесялеў ад такога нечаканага візіту. Падумаў: «Іван праўду казаў — спее людскі гнеў і вось-вось выбухне...»

Прапанаваў свае паслугі і брыгадзір Рыгор Бяда. Сустрэўшы Васіля Кулагу на вуліцы, у хату сваю запрасіў. Бутэльку самагонкі на стол паставіў, сала нарэзаў, бульбу з печы ўпрэлую — «крышані» — жонцы загадаў дастаць. І калі выпілі па кілішку, закусілі, сказаў паважна, з роздумам:

— Я, канешне, з вамі, маладзейшымі, справіцца не змагу. Але калі што якое — ведайце: не схіблю, не падвяду. І страляць я ўмею. Вока ў мяне вострае, не прамахнуся, пацэлю ў фашыста... Так што не забывайце на старога Мар'янавіча...

А Хведзька, памочнік калгаснага конюха Базыля Раманюка, нават з вінтоўкаю ў кантору завітаў.

— Васіль Цімохавіч, залічыце мяне ў каманду сваю. Хачу фашыстаў біць,— сказаў ён, стаўшы па стойцы «смірна» перад Васілём Кулагам.

— А дзе ты вінтоўку ўзяў? — спытаў Васіль.

— Вінтоўку я знайшоў, як з дзядзькам Базылём назад дадому, коней загнаўшы, вярталіся. І патронаў таксама назбіраў, во,— Хведзька палез рукою за пазуху, дастаў цэлую жменю патронаў з доўгімі, вострымі кулямі.

— Пачакай, Хведзька, не спяшайся. І вінтоўку, патроны схавай пакуль што. Надзейна схавай. Трэба будзеш, мы цябе паклічам,— паглядзеў проста ў вочы Хведзьку Васіль Кулага.

— А цяпер што — нельга? — расчаравана спытаў Хведзька.

— Цяпер не тое што нельга, а рана.

— Біць фашыстаў ніколі не рана,— не згадзіўся з Васілём Хведзька.— Ета ў нас яны яшчэ не былі, ніхто не бачыў іх, не ведае, што яны робяць. А мы з дзядзькам Базылём прайшлі шмат кіламетраў і бачылі, ведаем... Многае бачылі і ведаем...

І Хведзька апусціў долу вочы, задумаўся, мабыць, успамінаючы тое, што давялося зусім нядаўна перажыць.

— Што, цяжка было вам? — спытаў Васіль Кулага.

— Цяжка — не тое слова. Яны ж, гады, бамбілі нас усю дарогу, з самалётаў абстрэльвалі. Ці то ім з вышыні не відаць, што ета коні, а не людзі, ці то знарок... А коні спудзяцца — не ўтрымаць. І ржуць... Вы б толькі чулі, як яны ржуць!

Слёзы выступілі на вачах у Хведзькі, выцер ён іх рукою.

— А потым, калі коней загналі, назад дадому вярталіся, колькі разоў яны, гады, запынялі нас, крычалі: «Цурык», ета значыцца, назад. І білі нас, мяне і дзядзьку Базыля...

— За што білі?

— А мы і самі не ведаем. Крычаць нешта нам, гарлапаняць, а мы ж іхняй фашысцкай мовы не ведаем, не разбіраем, чаго ад нас хочуць. Аднойчы нават страляць нас сабраліся, да ямы, што бомбай выкапала, падвялі. Але, на шчасце наша, нейкі мажны фашыст на машыне легкавой пад'ехаў, пагергетаў нешта, нас і адпусцілі... Па начах мы пасля таго ішлі, на дарогі ўдзень не паказваліся. А бачылі б вы, колькі людзей нашых пабілі. І не толькі салдат,

але і жанчын, дзяцей... Усюды, дзе ні ступіш, ляжаць. І на абочынах дарог, і ў полі, і ў лесе...

— Ты, Хведзька, камсамолец?

— Камсамолец.

— Сабраў бы ты калі-небудзь моладзь. Ніну Варакса, Ліду Шавейка, яшчэ сяго-таго, каму давяраеш. Дзядзьку Базыля Раманюка паклікаў бы, ды заадно і сына Базылёвага Юрку. Быццам на пасядзёлкі сабраліся б. І расказалі б усім з дзядзькам Базылём, што вы ў дарозе бачылі і перажылі. Няхай бы моладзь нянавісцю загарэлася да фашыстаў. Дый заадно камсамольскую арганізацыю аднавілі б.

— Ета лічыць — як загад?

— Заўсёды партыя кіравала камсамолам. Я партыйны. Лічы не як загад мае словы, а проста заданне.

— Ёсць! — Хведзька ляснуў абцасамі ботаў, выструніўся зноў па стойцы «смірна».

— А вінтоўку пакуль што схавай,— параіў Васіль.— Каб менш хто цябе бачыў з вінтоўкай, ведаў, што яна ў цябе ёсць...

Пайшоў Хведзька, а дзён праз колькі да Васіля Кулагі Юрка Раманюк наведаўся. Расказаў пра сходку, што ў іхняй хаце была і дзе яго выбралі камсамольцы сваім сакратаром.

— Толькі ж я рабіць не ведаю што,— прызнаўся Юрка.— Я ў школе ўвесь час вучыўся. А цяпер... Калі вайна... Можа, вы што-небудзь падкажаце. Бо сядзець склаўшы рукі, калі немцы навокал, вось-вось і да нас прыйдуць...

На жаль, і Васіль Кулага мала што ведаў, мала што мог падказаць, параіць Юрку Раманюку. Трэба было, абавязкова трэба было з Іванам Дарошкам сустрэцца, расказаць пра ўсё. Але Івана Дарошкі нідзе не было. Знік, нібы ў ваду кануў. І шукаць дзе яго — не ведаў, не ведаў Васіль Кулага.

— Ужо тое добра, Юрка, што вы сабраліся, кіраўніцтва абралі. Камсамольцы ведаць будуць, да каго звяртацца, калі што якое. Ды і нам з Іванам Мікалаевічам Дарошкам... Будзем ведаць, каго шукаць, з кім спаткацца, калі нешта тэрміновае перадаць ці зрабіць трэба...

Сустрэўся Васіль Кулага і са старшынямі суседніх калгасаў — з Максімам Варывончыкам і Петрусём Хамёнкам. Тыя знарок у Вялікі Лес прыйшлі, каб Івана Дарошку ўбачыць. І паколькі Івана Дарошкі ў сельсавеце не было, да яго, Васіля Кулагі, у калгасную кантору завіталі. І Мак-

сім Варывончык, і Пятрусь Хамёнак нейкія надта ж напалоханыя былі. І ў словах, паглядах адно, адно ў іх было — што чакае іх, калі немцы сюды прыйдуць? З гэтым, мабыць, яны і ў сельсавет, да Івана Дарошкі, кіраваліся.

— Неяк жа будзем жыць,— спрабаваў супакоіць старшынь Васіль Кулага.— Нявыкрутка будзе — лес недалёка.

— А не зловяць у лесе? — пытаў маладзейшы, Пятрусь Хамёнак.

— Лес вялікі. Ды і сядзець жа на адным месцы не будзем. А лепей за ўсё змовіцца трэба, разам сабрацца, калі што якое,— раіў Васіль Кулага.

— Дык жа з Іванам Дарошкам мы змаўляліся,— казаў, але, адчувалася, не ўсё, што ведаў, самы старэйшы, хітрэйшы, Максім Варывончык.— Во толькі дзе падзеўся ён? Даўно не заходзіць, не дае пра сябе знаць. Не вытрымалі мы, адзін да аднаго схадзілі, а цяпер разам і сюды да цябе прыйшлі...

— Добра зрабілі, што прыйшлі,— Васіль Кулага і сапраўды быў рады, што да яго завіталі калегі.— Хоць пагаворым, а то сядзім кожны ў сваім кутку, чакаем, самі не ведаючы чаго. А што да Івана Дарошкі... Няма нешта яго, не відаць. Праўда, казалі тут мне — жанчына нейкая ў Вялікі Лес прыходзіла і ён з ёю, нікому нічога не сказаўшы, пайшоў. А куды — не ведае ніхто. Можа, райком, Багавік, паклікаў ці яшчэ хто... Чалавек — не іголка, не згубіцца, пачакаем...

— Ды ўжо ж, нічога не астаецца, як чакаць,— згадзіўся з Васілём Кулагам Максім Варывончык.

Там жа, на той сустрэчы, вырашылі старшыні: калі немцы прыйдуць, нявыкрутка будзе — сабрацца разам. І нават месца збору прызначылі — леснічоўка тая, што ў Качай-балоце.

— Ты і Івану Дарошку ета перадай,— папрасіў Максім Варывончык, калі развіталіся, адыходзілі з Петрусём Хамёнкам па вёсках сваіх, дадому.

...Ішлі, ляцелі кароткія асеннія дні, перагортваліся, усё адно як старонкі цікавай кнігі. І кожны чакаў, хацеў ведаць — што ж далей будзе? Нецярпліва, наструнена чакаў, бо адчуваў — чакаць астаецца ўсё менш і менш. Вось-вось нешта павінна быць, нешта павінна здарыцца. «Што, якое яно?» — думаў кожны. І ішоў, гарнуўся да Васіля Кулагі, каб пачуць, даведацца хоць што-коль-

вечы. З усяго ж начальства ён адзін быў на сваім месцы...

Быў — бо не было яму дзе яшчэ быць, не было куды падацца...

## XII

Вярнуўшыся ад Дняпра дадому — уночы, цемраю, каб ніхто яго не бачыў, у вёску прыйшоў,— Апанас Харчэня не спяшаўся паказвацца на людзі, сядзеў у хаце, адсыпаўся, ад'ядаўся. І, вядома ж, думаў, думаў, як далей яму жыць. «Можа, дарэмна я хваляваўся, мучыў сябе — немцы ж так і не прыйшлі ў Вялікі Лес? Раптам і не прыйдуць? Вайна бокам пракоціцца, дзе дарогі добрыя, гарады. А ў нас... Чаго немцы не бачылі ў нас? Лясоў, балот?..»

Маці, радая, што сын дома, вярнуўся, тупала і тупала ля яго — то смачнае што-небудзь з яды яму прапаноўвала, то пытала лагодненька, каб сына не пакрыўдзіць, не раззлаваць:

— Ты б, сынок, расказаў, дзе хадзіў, што бачыў?

Але сын, Апанас, не хацеў асабліва нічога са свайго вандравання расказваць.

— Ат, мама, цікавага там было мала,— казаў, аднекваўся ён.— Галадаў, па лесе ад немцаў хаваўся.

— А якія яны, немцы? — пытала маці.— Ці такія самыя, як і ў тую, ранейшую, вайну былі?

— Я ў тую, ранейшую, вайну іх не бачыў. А ў гэтую...

— Калі такія, як і ў тую вайну былі...— круціла галавою, уздыхала маці.— Дык лепей бы іх не ведаць...

— Яно-то так, мама,— згаджаўся з маці і сын, Апанас.— Але як прыйдуць у вёску, хочаш — не хочаш, а ведаць давядзецца...

— Ліха б з імі, кеб толькі людзей нашых не стралялі, шаблямі не секлі... А як пачнуць... Божа мой! — хрысцілася, божкала маці.

Змаўкала маці, ішла ці на падворак, ці ў гарод рабіць што-небудзь. Апанас зноў задумваўся, засяроджваўся на сваім: «Хоць і непісьменная маці, а правільна разважае: «Кеб толькі людзей нашых не стралялі...» А будуць жа, мабыць, страляць! І з каго пачнуць? Могуць і з мяне...»

Пахаладзела, пахаладзела ўсярэдзіне, аж дух на хвіліну заняло.

«Апраўдвацца перад імі, прасіцца?.. А можа, хай страляюць. Канец будзе ўсяму, усім пакутам, турботам маім...»

«Але ж тады... Я не зрабіў нічога яшчэ, не паспеў зрабіць і не зраблю. А я ж... Вершы марыў пісаць, гісторыю вывучаць... Я жыць збіраўся... Ды і маці адна астанецца... Мучыцца ж будзе, галасіць па мне...»

Паўстала ў вачах, уявілася на хвіліну — свежы копчык жвіру пад сасонкаю ў хвойніку на могілках, новы дубовы крыж — і маці, распластаная на копчыку тым ля крыжа,— галосіць... «Так было тады, калі хавалі бацьку, так будзе і цяпер. Толькі ў зямлі, у дамавіне, гэты раз ляжаць буду я...»

Не па сабе стала ад уявы, млосць па целе пайшла.

«Не, толькі не гэта... Не, не!»

Забягала ў хату маці, зноў спрабавала загаварыць з сынам.

— А да нас, калі цябе дома не было, Іван Дарошка і Васіль Кулага заходзілі,— паведамляла яна.— Пра цябе пыталі...

— Што яны пыталі? — ажыўляўся, весялеў сын.

— Нічога такога. Проста — дзе ты.

— І ты?.. Што ім казала?

— Казала — у бежанцы пайшоў.

— А яны?

— Яны не ведалі таго, думалі, дома ты... Мабыць, пагаварыць з табою хацелі.

Выходзіла маці з хаты, Апанас зноў, зноў задумваўся, засяроджваўся ў сабе.

«Чаму яны прыходзілі? Пра што пагаварыць са мною хацелі?.. А можа, Івана Дарошку і Васіля Кулагу пашукаць? З імі пагаварыць, расказаць, што на душы ў мяне, якія думкі спакою не даюць? Іван Дарошка і Васіль Кулага астаюцца ж тут, неяк жа жыць збіраюцца... Можа, і мне, калі што якое, у лес пайсці, пахавацца некаторы час?»

«Не спяшайся... Пачакай...»

«Чаго чакаць?»

«Убачыш. Бо... Іншы раз лепш пасядзець, пачакаць, чым мітусіцца, рабіць абы-што. Муха, бачыў, у павуціну трапляе. Чым больш яна выблытацца хоча, тым больш заблытваецца... А раптам неяк усё абыдзецца, уладкуецца... Большых бы грахоў не займець... Бо тады ніхто ўжо не пашкадуе, ніхто не выратуе...»

І Апанас сядзеў дома і нічога ані не рабіў. Чакаў, чакаў усё. А чаго чакаў — і сам не ведаў, сказаць пэўна не мог.

## XIII

Не вельмі шырокая палявая дарога вывела Піліпа на шашу. Па шашы імчалі машыны-палутаркі, гружаныя рознай вайсковай амуніцыяй, ішлі, цяжка равучы, танкі; паабапал жа бясконцым патокам цягнуліся людзі — чырвонаармейцы і цывільныя — мужчыны, жанчыны, дзеці. Чырвонаармейцы былі запыленыя, стомленыя, няслі за плячыма вінтоўкі, ранцы, скаткі шынялёў, а цывільныя гналі кароў, валаклі вузлы, хатулі, чамаданы з хатнім скарбам. Людзі і машыны рухаліся ў адным напрамку — з захаду на ўсход. І перш чым і самому ўліцца ў гэты паток, Піліп прысеў на траву і ўважліва глядзеў здаля на тых, хто кудысьці спяшаўся, ішоў, няйнакш, баючыся, каб не трапіць у рукі ворага.

«Усе ўцякаюць... А куды?» — думаў Піліп.

Надзеі дагнаць сваю каманду ў Піліпа не было ўжо ніякай. Каманда магла пайсці па іншай дарозе, магла затрымацца — трэба ж было і пераапрануцца ў вайсковае, і ўзброіцца. Але ж і не ісці назад, не вяртацца да Дняпра. І Піліп, пасядзеўшы на траве і адпачыўшы — у яго ўсё яшчэ кружылася, балела галава, і ён не ведаў чаму, ці то што ён надта ж хацеў есці і піць, ці то што быў прысыпаны зямлёю на пераправе,— падняўся зноў на ногі. Але далучыцца, як меркаваў, да людскога патоку не паспеў — пачуў раптам над галавою пранізлівы гул самалётаў. Не думаў, чые самалёты — свае ці нямецкія,— упаў, паваліўся, дзе стаяў. Мінула, можа, усяго адна якая хвіліна, і зямля пад ім здрыганулася, закалацілася. Чорныя раскідзістыя кусты — адзін, другі, трэці — выраслі паўзбоч шашы, і тады ж пачуліся адзін за адным тры выбухі. Людзі кінуліся хто куды, урассыпную...

Зноў над галавою пачуўся прарэзлівы гул самалётаў, потым выбухі, свіст асколкаў. На шашы нешта ўспыхнула, загарэлася — ці не машына? Нехта нема закрычаў...

«Няўжо і на шашы етак жа бамбяць немцы, як і на пераправе, ля Дняпра? — зжахнуўся Піліп.— Калі тут тое самае пекла, дык чаго я сюды ішоў?»

«А куды ж ісці? — задаў ён сабе пытанне.— Назад, у вёску, як раілі Мацей Тхорык і Адам Зайчык?.. Але ж там... Клаўдзя... Ды і брат, Іван, казаў: «Не схіб, Піліп. Вайна скончыцца, і не хто іншы, а мы пераможам!»

Самалёты больш не гулі, не паяўляліся ў небе. І шаша паступова набывала ранейшы звыклы выгляд — зноў па

ёй імчалі машыны-палутаркі, ішлі танкі, а паабапал не спыняўся — цёк і цёк паток чырвонаармейцаў і цывільных людзей. Толькі непадалёку ад шашы, як знак нядаўняй бамбёжкі, чарнела некалькі выкапаных бомбамі ямак ды ляжалі, скурчыўшыся, мусіць, забітыя, людзі — іх знеслі ў адно месца, але чамусьці не хавалі.

Вечарэла. Вялізны чырвоны круг сонца вісеў над лесам далёка-далёка, там, адкуль ішлі людзі, машыны, танкі. Спякота прыкметна спадала, рабілася лягчэй дыхаць. І боль у баку і ў галаве як бы тупеў, слабеў.

«Ну што ж, і мне хопіць сядзець, пара ісці»,— сказаў, нібыта падагнаў сябе, Піліп і зноў падняўся, устаў на ногі. Паволі-паволі, спакваля падаўся да шашы...

Яму пашанцавала — у першай жа вёсцы, што трапілася па дарозе, калі падышоў да калодзежа напіцца вады, яго запыніў вайсковец.

— Вы хто? — даволі сурова запытаў ён у Піліпа.

— Я?.. З мабілізаваных,— прызнаўся ён.

— Чаму адзін, не з камандай? — не зводзіў з Піліпа вачэй вайсковец.

— Бамбёжка была... Мяне зямлёю прысыпала...

— А-а,— усміхнуўся вайсковец.— Значыцца, першае хрышчэнне атрымалі, з чым і віншую вас... Адкуль вы родам?

— Тутэйшы я, з Ельніцкага раёна.

— З Ельніцкага? — перапытаў, нібыта ўзрадаваўшыся, вайсковец. Аж вейкамі доўгімі, бялёсымі заміргаў.— А з вёскі якой?

— З Вялікага Лесу.

— Праўда? — здзівіўся вайсковец.— Як прозвішча ваша?

— Дарошка. Піліп Дарошка.

— Вы не брат таго Дарошкі, што на заводзе ў Гудове працаваў, а потым старшынёй сельсавета быў?

— Брат.

— Родны?

— Аге.

— О, то я рад з вамі пазнаёміцца...

І вайсковец — толькі цяпер Піліп звярнуў увагу, што гэта быў не салдат, а камандзір,— падаў руку.

— Будзем знаёмы, мяне завуць Аляксей... Аляксей Заспіцкі. Я таксама нейкі час на заводзе ў Гудове працаваў.

Калі вы такі, як ваш брат, то я ахвотна бяру вас да сябе служыць, у свой узвод... Згодны? — міргаў бялёсымі вейкамі вайсковец.

Піліп пацiснуў плячыма, маўляў, глядзіце самі, а я... Згодзен, вядома.

— У якіх вы войсках служылі? — спытаў ужо трошкі іншым, не камандзірскім, а больш лагодным голасам Аляксей Засціцкі.— У пяхоце? Кавалерыі? Артылерыі?

— Нідзе я не служыў,— прызнаўся Піліп.

— Як — нідзе?

— Ну, здарылася так, што не служыў.

— Чаму?

Піліп зноў пацiснуў плячыма — не гаварыць жа, што адседжваўся, хаваўся ў лесе ад службы.

— Нічога,— супакоіў Піліпа Аляксей Засціцкі.— Навучым несці службу. І страляць таксама навучым, не бядуйце. Гаўрыленка! — крыкнуў ён да групы салдат, што, дастаўшы з калодзежа вядро вады, прагна пілі нагбом па чарзе.

— Я! — падбег да Засціцкага, стаў па стойцы «смірна», невысокі, каранасты, але, адчувалася, увішны, салдат.

— Абмундзіраваць новага нашага таварыша, выдаць зброю. Залічыць на ўсе віды давольства.

— Слухаю, таварыш камандзір! — узяў пад пілотку Гаўрыленка.— Дазвольце выконваць?

— Выконвайце!

І Аляксей Засціцкі, яшчэ раз акінуўшы вачыма Піліпа, нібыта натхняючы, падбадзёрваючы яго, заспяшаўся некуды наперад, у другі канец вёскі.

## XIV

Толькі адну ноч пабыў Андрэй Макаравіч дома, у Вялікім Лесе, і не адпачыў, здаецца, як след з дарогі, а развіднела, дзень пачаўся — уседзець проста не мог у хаце, месца нідзе сабе не знаходзіў. «Што гэта са мною?.. Прывык за час вандроўкі спяшацца, ісці ці... Неспакой нейкі на душы, не разабраць, чаго мне хочацца,— думаў Андрэй Макаравіч, пакуль нарэшце не здагадаўся пра ўсё.— Ды гэта ж восень на двары. Заняткі ў школе даўно. А я... Дома! Вось і цягне мяне... Бывала, як раніца, дык і бягу. Нават у нядзелю, у выхадны, і то ніколі дома не бавіўся. І так колькі гадоў запар. А цяпер... Прачнуўся — і дома. Таму і мутарна, нязвыкла...»

Накінуў на плечы паліто, шапку на галаву нацягнуў. І, нічога не сказаўшы жонцы, Аліне Сяргееўне, якая таксама прачнулася рана і ў печы збіралася паліць, з хаты выйшаў. Пастаяў, нібыта ў роздуме, на ганку, паглядзеў на гарод асенні, голы, на дрэвы, што без лісця ўжо былі, голлем мокрым шасталі, і паволі падаўся ціхай хадою на сцежку тую, што вяла да школы.

Рады быў, што ніхто не сустрэўся, ніхто ні пра што не папытаў, і ён, з якімі думкамі выйшаў з хаты, з тымі і да школы прыйшоў — школа ў Вялікім Лесе стаяла на пагорку трохі здаля, за клубам,— новая, пабудаваная ўжо ў гады Савецкай улады. А думкі ў Андрэя Макаравіча былі тыя ж — як яму далей жыць. Бо спроба пакінуць вёску, не быць тут скончылася няўдала. Нідзе яны з жонкаю так і не знайшлі сабе пристанішча, нідзе не затрымаліся. Толькі ногі дарэмна набілі, нагаладаліся ў дарозе. Не вярнуліся б сюды, быццам і абавязкаў ні перад кім ніякіх не было. Іх ніхто не ведае, і яны нікога не ведаюць. Чужыя і ім усе, і яны чужыя ўсім. А вярнуліся да сваіх людзей, у вёску, дзе і яны ўсіх ведаюць, і ўсе ведаюць іх,— і клопаты, абавязкі вярнуліся. Ды і ад дырэктарства яго, Андрэя Макаравіча, ніхто не вызваляў. Абавязкі па догляду школы, навучанні дзяцей ляжаць не на кім-небудзь, а на ім. Мала што вайна... Ды вайна, калі на тое пайшло, сюды яшчэ і не дакацілася, немцаў тут няма. І трэба не цягнуць, трэба, мусіць, пачынаць вучобу ў школе. І так вунь колькі часу мінула, давядзецца прапушчанае даганяць. Як там і што далей будзе — пабачым. А цяпер тут Савецкая ўлада, і павінна працаваць наша савецкая школа. Як павінна працаваць і бальніца, і ўсё, усё, без чаго не могуць абыходзіцца людзі. Вядома, арганізаваць работу школы ў ваенны час не так лёгка. Будуць нейкія перабоі, не ўсяго будзе хапаць. Ды і дзеці... Не кожны зможа ў школу хадзіць, а калі і зможа, то не штодзень. Але трэба імкнуцца, старацца зрабіць усё магчымае, каб школа працавала гэтак жа, як працавала і раней...

«Ці не будзе гэта супрацоўніцтва з фашыстамі?» — запярэчыла, вынікла аднекуль думка.

«Супрацоўніцтва — гэта калі будзеш рабіць тое, што і фашысты, будзеш з імі заадно. А калі будзеш рабіць, што рабіў і раней, пры Савецкай уладзе...»

«Ці дадуць тое рабіць?»

«Дадуць не дадуць, а паспрабаваць трэба. Ды і быць у баку ад усяго, што робіцца?.. Нельга! Цвёрдасці больш,

мужнасці, смеласці. Памагаць людзям перажыць гора, як і ўвесь час памагаў, вучыў добраму, вечнаму, мудраму. Каб бачылі ўсе, што то не толькі словы мае былі, то было перакананне, упэўненасць. Хітраваць, віляць мне няма чаго. Я жыў навідавоку, нічога ні ад каго не хаваў. Так павінен і памерці...»

«Чаму ты пра смерць успамінаеш?»

«Чалавек не можа пра яе не помніць, не думаць».

«Баішся?»

«Не, не баюся. Здаецца, Леў Талстой дзесьці запіс зрабіў, быццам усё чалавечае жыццё — не што іншае, як падрыхтоўка да смерці. Смерць жа — пераход у новае жыццё. І я думаў ужо над гэтымі словамі. У іх ёсць нешта прарочае, страшнае і разам з тым натхнёнае...»

«А можа, ты і не памрэш, перамогі дачакаешся?»

«Хацелася б, вядома, дажыць да перамогі. Але калі і не дажыву, што ж... Ды і справа не ў тым, колькі хто гадоў пражыве. Галоўнае, як пражыве, што людзям пакіне пасля сябе, памяць якую пакіне. Гэта галоўнае. І ні пры якіх абставінах нельга забываць таго. Не трымацца за жыццё любой цаной, а рабіць, што і трэба рабіць, каб помнілі цябе людзі, каб аблегчыць іхнюю долю, іхнія пакуты. Не ўцякаць, не хавацца, а быць на сваім месцы, працаваць, што б ні здарылася, як бы цяжка ні было. Самому цвёрдасць праяўляць і прыклад іншым паказваць. Няхай бачаць людзі — ёсць такія, хто нічога не баіцца, не губляецца пры любых умовах і акалічнасцях, дбае пра дабро, нешта адвечнае, тое, што не мінаецца, не праходзіць разам з часам, а астаецца, натхняе. Урэшце, можна адкінуць гэтыя высокія словы, забыць іх. Але жыць, рабіць трэба ўсё так, каб нікому за цябе сорамна не было. Ні цяпер, ні потым».

«Мёртваму ўсё адно, што пра яго гавораць людзі. Ён таго не чуе. Ды і не бачыць — ён людзей і людзі яго».

«Жывым не ўсё адно! І кожны павінен перш за ўсё пра гэта думаць, помніць, не забываць. Бо чалавек, калі разабрацца, жыве не так дзеля сябе, як дзеля іншых. І тое, што пра яго гавораць і думаюць людзі... Жывога ці мёртвага... Мае значэнне. Высакароднасць вучыць высакароднасці, ганебнасць вучыць не быць такім, не рабіць таго, што зрабіў слабы духам ці несумленны. Ды і самому мёртваму не ўсё адно. Загінуць з адчуваннем годнасці, высакародства... І зусім іншае — загінуць, як сабаку. «Сабаку сабачая смерць».

На дзвярах школы вісеў замок, і Андрэй Макаравіч нейкі час стаяў ля драўлянага ганка, не асмельваючыся на яго падняцца. Урэшце, падумаўшы, што, можа, і не варта пакуль адчыняць школы, ды і ключ дзе, у каго шукаць,— завярнуў за вугал, пайшоў паўз сцены, час ад часу зазіраючы ў вокны — што там, у класах? Здзівіўся, бо парты стаялі не на месцах, сталы былі ссунуты, перавернуты. І ўсюды на падлозе валялася папера — падраныя сшыткі, кніжкі... Убачыўшы пабітыя шыбы, здагадаўся пра ўсё — няйнакш, у школу залезлі свавольнікі ці злодзеі і пагаспадарылі там.

«Напэўна ж вучні. Я вучыў іх па-гаспадарску берагчы школьную маёмасць, а яны...» — балюча ўкалола ў самае сэрца.

Праз хвіліну супакоіў сябе:

«Заўсёды былі і, мабыць, будуць такія, хто ні пра што не думае, нікога не слухаецца, хто рабіў і будзе рабіць розныя прыкрасці. І як бы мы ні стараліся, ні шчыравалі, яны будуць».

«І ўсё адно старацца трэба, шчыраваць, рабіць усё, каб іх не было. Калі нельга, каб не было зусім, трэба рабіць усё, каб было іх менш... Школа ж вучыць не толькі чытаць, пісаць, лічыць, а і быць чалавекам. Чалавечнасці, дабру вучыць! І трэба не адкладваць, пачынаць работу. Школа павінна працаваць. Няхай дзеці настаўніка слухаюць, чым абы-каго, на ўроку няхай сядзяць, чым займацца чым папала...»

Завярнуўся, пайшоў ад школы назад, дадому.

Жонка, Аліна Сяргееўна, не пазнала мужа, калі ён вярнуўся ў хату,— такі ён быў натхнёны, упэўнены ў сабе.

— Дзе гэта ты быў? — спытала з цікавасцю яна.

— У школе,— адказаў Андрэй Макаравіч.

— У школе? — здзівілася Аліна Сяргееўна.— Чаго ты туды хадзіў?

— Ды, разумееш, сам не ведаю. Пацягнула мяне... І, ведаеш, не шкадую, што пайшоў. На добрыя думкі дарога навяла.

— Якія? — глядзела шырока адкрытымі вачыма на мужа Аліна Сяргееўна, быццам пазнавала ў ім таго, ранейшага, якім ён быў даўным-даўно, у маладосці.

— Заняткі ў школе пачынаць трэба.

— Можа, не варта спяшацца? — няўпэўнена, з розду-

мам прамовіла, засяроджваючыся на тым, што сказаў Андрэй Макаравіч, Аліна Сяргееўна.

— Наадварот, трэба спяшацца, пакуль немцы сюды не прыйшлі, пакуль тут яшчэ Савецкая ўлада... Бо калі прыйдуць, захопяць нас... Хто ведае, як будзе. А пачнём, спыняць ужо... Словам, не так ёмка. Ды і нам... Пачалі ўжо, дык і працаваць будзем. Колькі ж дзеці без школы байбусаваць будуць?..

Аліна Сяргееўна задумалася над тым, што пачула ад мужа.

— А ты ж... Вяртацца назад, сюды ў вёску, не хацеў? — быццам папракнула яна мужа.

— Іншы раз і паблудзіць трэба, каб потым знайсці тое, што згубіў, чаго шукаў. Лічы, што я ўсе гэтыя дні блудзіў. А сёння знайшоў.

І ён урачыста сеў за свой рабочы стол, які стаяў у куточку ля акна і за якім не сядзеў ужо, здавалася, цэлую вечнасць, пачаў адчыняць шуфляды, дзе звычайна ляжалі школьныя планы, розныя паперы, алоўкі, ручкі.

— Ты б хоць паснедаў,— не сказала, а папрасіла Аліна Сяргееўна.

Але Андрэй Макаравіч ужо не чуў жонкі — паглыбіўся цалкам у думкі, што раптоўна нахлынулі, наваліліся на яго — думкі пра школу, пра тое, як пачаць, лепш арганізаваць заняткі, вучобу. Ды і пра сваю бібліятэку, кнігі — іх жа адкапаць трэба, зноў перанесці ў хату, расставіць на паліцы...

## XV

Яўхім Бабай уваходзіў ужо ў Ельнікі, калі раптам яго спыніў грубы, уладны вокрык:

— Стой! Ні з месца!

Ён не адразу ўцяміў, што гэтыя словы тычацца менавіта яго, а таму павярнуўся, як і зазвычай, няўклюдна, хочучы здагадацца, хто гэта крычыць і на каго. Але той самы грубы, уладны голас папярэдзіў:

— Яшчэ адзін крок — і я страляю!

«Мусіць, усё ж мне крычыць,— ёкнула сэрца.— Не трэба было сюды ісці. Жонка хоць і дурная, а праўду казала — не хадзі, бо даходзішся».

Угнуў шыю ў плечы, застыў. І тады ж убачыў, як з-за вугла канцавой хаты, трымаючы напагатове перад сабою вінтоўку, выйшаў нейкі незнаёмы чалавек. Рослы, пля-

чысты, з белай павязкай на рукаве, на што асабліва звярнуў увагу Яўхім Бабай.

«Ці не ўлада якая?» — падумаў.

А чалавек з белай павязкай спыніўся крокаў за колькі, закамандаваў:

— Стрэльбу! Стрэльбу давай!

Яўхім разгубіўся. Як гэта зразумець — стрэльбу давай? Стрэльба ж не чыя-небудзь, а яго, Яўхіма Бабая. Сам яе купляў, за свае грошы. Па капейцы збіраў, ашчаджаў, адрываў ад сябе, ад дзяцей, каб купіць. І раптам... «Давай!»

— Ты што, глухі? Стрэльбу, кажу, давай! — камандаваў, загадваў чалавек з белай павязкай.

— Але ж стрэльба — мая!

— Ты хто-такі, адкуль узяўся? Загадаў хіба не чытаў?

— Якіх загадаў?

— Ды на кожным слупе вісяць!

Яўхім затупаў на адным месцы, павярнуўся — дзе тыя загады? Але той, з павязкай, зноў закрычаў уладна і груба:

— Рукі! Рукі ўгору!

І перш чым Яўхім Бабай апамятаўся, агрэў яго поўху. Ды так моцна, што Яўхім не ўстояў на нагах — паваліўся ў гразь, у лужу. У галаве зазвінела, пацямнела ў вачах. Не так, мабыць, ад болю, як ад злосці. У наступную хвіліну Яўхім падхапіўся з зямлі і, як рысь, кінуўся на чалавека з павязкай. Схапіў яго вышэй пояса, хацеў паваліць. Ды чалавек быў дужы і спрактыкаваны ў бойках — наводмаш ударыў прыкладам Яўхіма Бабая спярша ў грудзі, а потым, калі той зноў зарыўся носам у гразь, у лужу, пачаў мясіць, біць яго па чым папала, люта, апантана, з шаленствам, прымаўляючы час ад часу:

— Во табе! Так! Так! Так!..

Уваччу ў Яўхіма стала цёмна, як уночы, далей ён нічога ўжо не чуў і не бачыў, не ведаў нават, дзе ён і што з ім робяць. Памяць захавала толькі, як яго некуды не то валаклі, не то неслі, ды ў вушах быццам заселі невядома кім сказаныя, незразумелыя словы:

— Куды яго?

— У халодную!

— Думаеш, ачухаецца?

— Палешукі жывучыя.

Яго зноў некуды валаклі, неслі, потым кінулі, шпурнулі на нешта цвёрдае, як камень. Пачуўся стук дзвярэй, бразгат не то засоваў, не то ключоў — і ўсё далейшае паглынулі цемра, невядомасць...

## XVI

Узвод, якім камандаваў Аляксей Засціцкі, адступаў ад самай граніцы. Адступаў з баямі і стратамі. Страт магло быць куды больш, калі б камандзір быў менш вопытны і абачлівы, не шкадаваў кожнага байца, як свайго роднага брата. «Загінуць мы яшчэ паспеем, гэта не так і цяжка. А паспрабуй і ваяваць, і жывым астацца. Гэта куды цяжэй»,— любіў ён казаць чырвонаармейцам, ставячы задачы ці пасылаючы на заданне. І байцы разумелі камандзіра — рызыкуючы, лішне не падстаўляліся пад варожыя кулі. Але і не ўцякалі, калі надаралася спаткацца з ворагам, стаялі на сваіх рубяжах, абараняліся, пакуль можна было. Вышэйшае камандаванне ведала — там, дзе на абароне ўзвод Аляксея Засціцкага, вораг не пройдзе, не прарвецца. Умеў Аляксей Засціцкі і яшчэ адно рабіць — не чакаў, калі прышлюць аднекуль папаўненне — папаўняў страты сам, сам набіраў сабе байцоў. Вядома, рабіць такое забаранялася. Але была вайна, Чырвоная Армія адступала, кожны баец быў на ўліку. Ды і стрымліваць ворага трэба было, абараняць кожную пядзю савецкай зямлі. І на «партызаншчыну» Аляксея Засціцкага вышэйшае камандаванне глядзела скрозь пальцы. «Няхай, абы было каму ваяваць». Сам Аляксей Засціцкі не быў кадравым камандзірам. У армію трапіў напярэдадні вызваленчага паходу ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. Да гэтага вучыўся ў школе, працаваў на заводзе. Бацька яго, патомны рабочы, хацеў, каб і сын еў хлеб з працы рук сваіх. «Гэта мілае дзела — быць рабочым,— казаў неаднойчы ён сыну.— Адпрацаваў сваё — і ты вольны. А цяпер, калі няма цара і капіталістаў, рабочаму чалавеку ўсюды і гонар, і слава. Працуй ды жыві». Але, трапіўшы ў армію, зразумеў Аляксей Засціцкі, што, каб спакойна жылося і працавалася савецкім людзям, трэба камусьці ночы не спаць, пільна стаяць на варце савецкай граніцы. Бо ворагам проста жыцця няма, не могуць яны дараваць, што ў Краіне Саветаў гаспадараць рабочыя і сяляне. І яны куюць зброю, розныя ваенныя саюзы і блокі арганізоўваюць, рыхтуюцца нападаць на Савецкі Саюз. Каб спыніць памкненні ворагаў, Краіне Саветаў трэба мець моцную армію, якая б абараніла мірную, стваральную працу савецкіх людзей. І ён, Аляксей Засціцкі, усвядоміўшы гэта, ужо не думаў пра хуткі зварот у Гудоў, на завод,— аддаўся ўвесь з галавою вывучэнню ваеннай справы. Закончыў школу чырвоных

камандзіраў, трапіў служыць на заходнюю граніцу. І тут, на граніцы, на свае вочы ўбачыў, на што здатны вораг. Не было таго дня, тае ночы, каб вораг не наладжваў нейкай правакацыі. То мяжу хтосьці пераходзіў і яго трэба было лавіць, то раптам ні з сяго ні з таго стрэл з таго, варожага, боку чуўся. А то немцы надумалі трупы салдат і афіцэраў забіраць, што былі загінулі ў сутыкненнях у час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. Цэлымі днямі ездзілі ў закрытых машынах, быццам магіл шукалі. А тым часам... Пільнаваць трэба было, каб каго-небудзь са сваіх людзей на зямлі нашай не пакінулі, дыверсантаў і шпіёнаў. Тут, на мяжы, не зловіш — колькі шкоды там, у глыбокім тыле, наробяць. Спаць амаль не клаўся — усё на нагах і нагах. З адным справішся, другое ўжо чакае, трэба спяшацца, хутчэй яго рабіць. Вораг жа не дрэмле, здаецца, тым толькі і заняты, каб шчыліну якую-небудзь знайсці, пралезці ці правакацыю, дыверсію ўчыніць. Нават калі цішыня на граніцы — не вельмі вер ёй, яна часта бывае зманлівая. І трэба ўсё так рабіць, каб не памыліцца. Бо за кожную памылку пагранічнік разлічваецца, як і мінёр, смерцю.

Напружанне на граніцы расло і расло, пакуль нарэшце не выбухнула вайной. Ён, Аляксей Заспіцкі, у тую чэрвеньскую ноч з суботы на нядзелю якраз службу нёс па ахове дзяржаўнай граніцы. І, мусіць, адным з першых заўважыў, як, папрыгінаўшыся, у кволым ранішнім сутонні, трымаючы напагатове аўтаматы, па-зладзейску краліся адзін за адным усё бліжэй і бліжэй да граніцы фашысцкія салдаты. Адчуваючы, што рыхтуецца нешта незвычайнае, паспрабаваў звязацца з вышэйшым камандаваннем. Але не змог — тэлефонны кабель, выявілася, быў перарэзаны. Паслаў на заставу аднаго з байцоў. Думка — што рабіць, калі раптам немцы пачнуць перасякаць граніцу,— не давала спакою. З аднаго боку, вядома, немцаў трэба затрымаць, не пусціць. З другога ж — не паддацца б на правакацыю, бо тады... Ворагі скарыстаюць памылку, падымуць страшэнны гвалт, абвінавацяць... У чым толькі не абвінавацяць Краіну Саветаў. І разам з тым аж калаціла ўсяго Аляксея Заспіцкага, дрыжыкі білі — мы, як запісана ў дагаворы, захоўваем поўны спакой, не даём ніякіх зачэпак, а яны, фашысты, нахабнічаюць, рыхтуюць зноў нейкую нечаканасць...

Калі на савецкую зямлю паляцелі першыя снарады і кулі, ён, Аляксей Заспіцкі, не маючы на тое ніякай згоды

вышэйшага камандавання, аддаў загад падначаленым — падрыхтавацца да бою. І як толькі фашысцкія салдаты кінуліся да граніцы, ступілі на савецкую зямлю, іх сустрэў дружны залп пагранічнікаў. Немцы залеглі — завязаўся бой. Няроўны бой, бо немцаў было ў некалькі разоў больш. Але неўзабаве пагранічнікам падаспела падмога. Немцы, адстрэльваючыся, адступілі. Другую атаку яны пачалі прыкладна праз паўгадзіны, але зноў змушаны былі адступіць — прарвацца з ходу ім не ўдалося.

Тым часам зусім развіднела, узышло сонца. З заставы прыбег пасланец, паведаміў: немцы прарваліся і злева, і справа, дзе былі дарогі, і наступаюць далей пры дапамозе танкаў і артылерыі. Ёсць падазрэнне — гэта не проста правакацыя, а вайна. Каб не трапіць у акружэнне, камандаванне загадвала — адступаць, ісці на падмогу іншым, тым, хто быў у куды цяжэйшым становішчы. Ды і страляць не было ўжо чым — канчаліся патроны.

Узваліўшы на насілкі параненых — іх было чацвёра, узвод адступіў. Ішлі, краліся па лесе, каб не напароцца на немцаў.

Толькі на трэція суткі ўдалося дагнаць сваіх. Зрабіўшы невялікі перадых, узвод у той жа дзень зноў уступіў у бой. Гэты раз на дарозе, па якой рухаліся наперад нямецкія танкі... І ўжо рэдка надараліся дні, калі не даводзілася ўступаць у бой. З тых пагранічнікаў, з якімі служыў Аляксей Заспіцкі, асталося толькі некалькі чалавек. Астатнія былі забітыя ці параненыя. Тым не менш сам Аляксей не траціў ні аптымізму, ні веры ў перамогу. Ведаў — наступленне немцаў часовае, хоць і не мог, ніяк не мог растлумачыць ні сабе, ні іншым, чаму прарваўся вораг, чаму яго не затрымалі нашы войскі яшчэ там, на граніцы. Здаецца ж, і сілы ў нас не малыя былі, і тэхніка добрая, а бачыш жа... Не затрымалі ворага, адступаем...

Адчуваючы цяжар адказнасці за ўсё, што робіцца навокал, ён імкнуўся ўвесь час трымаць узвод у стане павышанай баявой гатоўнасці. І калі надаралася вольная хвіліна, гутарыў з чырвонаармейцамі, вучыў іх мудрасці ваяваць. І, вядомая ж справа, дбаў пра папаўненне. Па дарозе залічваў у свой узвод тых, хто адбіваўся, адставаў ад часцей, хто вырываўся з акружэння. Іншы раз залічваў нават такіх, як Піліп Дарошка. Чым раней больш людзей уступіць у барацьбу з ворагам, тым хутчэй ён будзе спынены, а то і пабяжыць пад нашым напорам назад — гэта было цвёрдае перакананне чырвонага камандзіра Аляксея За-

спіцкага. З Піліпам Дарошкам ён важдаўся больш, чым з кім-небудзь. Па-першае, той быў зусім не абучаны — нічога не ўмеў: ні страляць, ні нават як да камандзіра звяртацца, чэсць аддаваць. Па-другое, Піліп Дарошка быў зямляк. І, навучаючы яго вайсковай справе, Аляксей Заспіцкі не-не дый распытваў, што там, на радзіме, у родным пасёлку, дзе асталіся яго і бацька, і маці, і сястра Вікторыя, Віка, якую ён, Аляксей, надта ж любіў і якой пасылаў увесь час, куды б ні закінула яго служба, лісты і розныя падарункі. Піліп Дарошка мала што ведаў пра жыццё Гудова, бо рэдка там бываў. Але і тое, што ён ведаў і паведамляў, надта ж грэла душу, выклікала шмат думак і разваг. Часам лёгкіх, добрых, а часам і трывожных. Успаміналася дзяцінства, сябры, лес, які акружаў з усіх бакоў рабочы пасёлак і ў які бегаў калісьці ён і па ягады, і па грыбы, і па арэхі...

«А цяпер немцы прыйдуць туды? Што зробяць яны з маёй маці, бацькам, сястрою? — думаў, трывожыўся Аляксей Заспіцкі.— І, галоўнае, нічым не паможаш. Памагчы можна было толькі адным — не пусціць сюды ворага, затрымаць яго яшчэ там, на граніцы. Маці, бацька, сястра пэўна ж спадзяваліся на мяне, на такіх, як я. А мы... Не стрымалі ворага, адступаем...»

За ўсё, што здарылася, адчуваў вялікую віну ён, Аляксей Заспіцкі. Іншы раз, сустракаючыся з людзьмі цывільнымі, асабліва старымі, дзецьмі, аж галавы ад сораму не мог падняць, паглядзець ім у вочы.

«Дык гэта ж чужыя мне. А каб маці, бацьку, сястру я сустрэў, убачыў?.. Што б я казаў ім, як бы глядзеў у іхнія вочы...» — дакараў, упікаў сябе Аляксей Заспіцкі.

Адзінае, што хоць трохі заспакойвала і суцяшала,— гэта што ненадоўга пакідаюць родныя мясціны, сваіх людзей — хутка вернуцца. Прагоняць фашыстаў і вернуцца.

«Будзе, будзе такое!» — цвёрда верыў Аляксей Заспіцкі. І каб гэта было найхутчэй, вучыў сваіх падначаленых ваяваць, пры кожным зручным выпадку не ўхіляўся ад сутыкнення з ворагам, уступаў у бой, імкнуўся не пусціць фашыстаў далей, затрымаць, як мага больш знішчыць, натхняючы сваім прыкладам на тое самае і іншых.

## XVII

Ачуўся Яўхім Бабай ад холаду. І, мусіць, яшчэ ад таго, што вельмі хацелася піць. З цяжкасцю расплюшчыў павекі — было цёмна.

«Дзе я?»

Як праз сон, успаміналася ўчарашняе — грозны ўладны вокрык пры ўваходзе ў Ельнікі, патрабаванне аддаць стрэльбу, потым бойка проста на вуліцы мястэчка...

«Жонка хоць і дурная, а праўду казала — не хадзі, а то даходзішся,— згадалася.— Цьфу, ета ж трэба...»

Павярнуўся, хацеў падняцца, устаць — і не змог. Балела шыя, балелі рукі, ногі; балела, здаецца, усё цела, што ні павярні, да чаго ні дакраніся.

«Так збілі. І за што?»

У галаве было мутарна, як пасля перапою. У роце — быццам куры начавалі — нясвежа, салёна.

«Каб вады... Конаўку халоднай, як лёд, крынічнай вады... Вады... Вады-ы!» — паўтараў ён, і ўжо не ў думках, а ўголас, услых:

— Вады, вады-ы!

Здавалася: калі б хто-небудзь даў вады, адразу ажыў бы, паздаравеў.

— Вады! Вады-ы! — выў, скуліў ён, усё адно бы сабака, ані таго не саромеючыся, не баючыся.

Але ніхто не чуў яго, ніхто не нёс таго, што яму так трэба было, чаго ён хацеў, прагнуў.

«Дзе я? Куды мяне ўкінулі? Няўжо нідзе няма нікога, хто памог бы, даў бы вады?»

— Вады, вады-ы!

Пачаў лапаць, мацаць наўкруг сябе рукамі, намагаючыся даўмецца, здагадацца, дзе ён, куды яго ўкінулі.

«Цвёрда? Не, ета не зямля...»

«У халодную яго!» — усплылі ў памяці словы, што чуў, калі цягнулі, валаклі яго пасля бойкі.

«Я, мабыць, у халоднай. А дзе яна, халодная? Мусіць, каля міліцыі... Ва-а, ета ж трэба так... І збілі ні за што ні пра што, і стрэльбу адабралі... Ды яшчэ і ў халодную ўкінулі...»

— Вады-ы! Вады-ы! — ужо не скуліў, ціха выў, а прасіў, крычаў Яўхім.

Не вытрымаў — сяк-так павярнуўся, хоць усё і ўсюды балела, папоўз. Але халодная, у якую ўкінулі яго, Яўхіма, была невялікая, куды ён ні падаваўся, рукамі, галавою натыкаўся на сцяну.

«Божа мой, нейкая мышалоўка! Выбрацца б адсюль... І піць...»

— Вады-ы! Вады-ы! Дайце вады-ы!

Спыніўся, хвілін колькі зноў ляжаў.

«Рабіць... Што рабіць?.. Ды калі я не нап'юся, я звар'яцею, зусім дайду тут...»

Зноў папоўз.

«Дзесьці ж павінны быць дзверы...»

Натрапіў на сходкі, палез па іх вышэй, вышэй. Дастаў рукамі дзверы, забарабаніў, што было сілы, кулакамі.

— Вады-ы! Дайце вады-ы! — закрычаў, як рэзаны.

Пачакаў — ці не адгукнецца хто? Ці не ідзе? — і зноў забарабаніў адчайна ў дзверы, закрычаў апантана:

— Вады-ы! Дайце вады-ы!

Але яго ніхто не чуў. А можа, і чуў, ды не адклікаўся. І ён, Яўхім, стаміўшыся, змогшыся, ссунуўся са сходак зноў на цвёрдую, як ток, халодную падлогу, зноў не то страціў прытомнасць, не то заснуў...

— Уставай! Гэй, уставай!

Расплюшчыў павекі — у праёме дзвярэй, на светлым фоне, стаяў, шырока расставіўшы ногі, трымаючы перад сабою вінтоўку, нейкі ягамосць.

— Каму кажу — уставай! — гарлапаніў, драў горла ягамосць.

З цяжкасцю падняў галаву, сеў — ці не сон гэта? І чаму баліць усё цела?

«А-а», — здагадаўся, успомніў нарэшце Яўхім тое, што адбылося ўчора і чаму ён тут, у незнаёмым месцы, у незнаёмай казённай хаце, з тупым, нясцерпным болем ва ўсім целе.

— Колькі разоў казаць табе — уставай! — крычаў, ятрыўся ягамосць. — І на выхад — хутка!

Сяк-так, з дапамогай рук падняўся на ногі. Хістаючыся, няўпэўненай хадою п'янага падаўся да сходкаў, пачаў падымацца, узбірацца наверх, да дзвярэй.

— Што, не навучылі яшчэ, як слухацца?! — бурчаў незнаёмец. — Нічога, во завяду да начальніка, з паўслова ўсё разумець будзеш. Шоўкавым станеш. Ён цябе навучыць! Ды варушыся, варушыся! А то ні жывы ні мёртвы.

Ягамосць адышоўся ўбок, прапусціў наперад Яўхіма Бабая.

— Стой! — гаркнуў на ўсё сваё горла.

Яўхім спыніўся, зажмурыў вочы — надта біла, калола пасля цемры святло хоць і асенняга, але зыркага сонечнага ранку. Падумаў сам сабе: «Той ета, што ўчора спаткаў пры ўваходзе ў Ельнікі і адбіраў стрэльбу, біў ці не той?»

Незнаёмец жа тым часам зачыніў, а потым і замкнуў на замок дзверы, зноў гаркнуў на ўсё сваё луджанае горла:

— Наперад! І не ўздумай уцякаць — прыстрэлю. Як курапатку, прыстрэлю! І рукі, рукі ўгору!

І руляй вінтоўкі варсануў Яўхіма пад бок, падштурхнуў:

— Ідзі, не стой!

Яўхім расплюшчыў вочы, падняў угору рукі, пайшоў па затравелай сцежачцы, спатыкаючыся, быццам п'яны.

— Направа,— камандаваў незнаёмец з вінтоўкай, калі дайшлі, наблізіліся да нейкай будыніны, ababітай дошкамі і пафарбаванай у жоўты колер — ці не міліцыі? І ён, Яўхім Бабай, пазнаваў цяпер — той, той ягамосць вядзе яго, што затрымаў учора, біў, адбіраючы стрэльбу.

— Куды ты мяне вядзеш? — спытаў, не вытрымаўшы.

— Убачыш, усё ўбачыш! Ды рук, рук не апускай, трымай над галавою! — крычаў незнаёмец.— На ганак падымайся! І ідзі проста да начальніка.

Падняўся па мокрых прыступках — відаць, нядаўна мылі — на ганак, увайшоў у цесны змрачнаваты калідор, патупаў па ім. Дзверы з левага боку, дзверы справа. А дзе, за якімі начальнік? Неяк так здарылася, што ні разу і не быў ён, Яўхім, у міліцыі, бог літаваў, хоць і блізка, вельмі блізка хадзіў, неаднойчы здавалася: во цяпер абавязкова заарыштуюць, нішто ўжо не ўратуе. І ўсё ж... Да міліцыі справа не даходзіла. Ні разу, ні разу не дайшла.

— Налева! — камандаваў, праўда, ужо не так крыкліва, цішэй незнаёмец з вінтоўкай, тупаючы ззаду, услед.— У другія дзверы,— бачачы, што Яўхім спыняецца, хоча павярнуць назад, да тых дзвярэй, якія прайшоў, мінуў. Паслужліва забег наперад, адчыніў дзверы, спытаў у некага ціха, з ліслівай усмешкаю на твары:

— Кандрат Астапавіч, можна?

— Давай яго сюды! — рохнуў з дзвярэй голас.

У Яўхіма аж паджылкі затрасліся.

«Куды я трапіў? І мяне, няйнакш, як рыштанта водзяць? А за што? За маё жыта ды мяне і пабіта».

Але пераступіў парог, зайшоў у пакой, спадылба акінуў голыя белыя сцены, вялікі стол насупраць акна, а за ім, тым сталом, і чалавека, што сядзеў, склаўшы перад сабою рукі, быццам нечага нецярпліва чакаў. На момант, на адзін толькі момант, здаецца, спыніліся на чалавеку вочы Яўхіма Бабая, аднак зразумеў ён, што літасці ад гэтага чалавека чакаць не трэба. І скардзіцца на што б там ні было таксама

не трэба. Сагне, скруціць у бараноў рог. І не пашкадуе, нікога не пашкадуе.

— Ну-у? — рохнуў зноў той, што быў за сталом.— Расказвай, хто ты і адкуль?

І падняў на Яўхіма Бабая вочы, прашыў яго навылёт.

Яўхім не прывык бываць у якіх бы там ні было начальнікаў, не прывык адказваць на якія б там ні было пытанні. Збянтэжыўся, затупаў на адным месцы. Усё, што ведаў, здаецца, з галавы выпала. Ні слова нідзе не было, не вярцелася на языку. Не, словы былі, але якое з іх выбраць, што сказаць... Ані, ані не ведаў Яўхім Бабай.

— Прозвішча? З вёскі якой? Куды і чаго ішоў у Ельнікі? — рохкаў і рохкаў, сыпаў і сыпаў новыя і новыя пытанні той, што сядзеў за сталом — Кандрат Астапавіч.

— Я... Я...— урэшце разявіў рот, пачаў заікацца Яўхім Бабай.— Я з Вялікага Лесу...

— З Вялікага Лесу? — вырачыў вочы, аж прыўзняўся Кандрат Астапавіч, і цяпер Яўхім Бабай убачыў, што Кандрат Астапавіч грузны, тоўсты і, мабыць, як падалося, на кароценькіх ножках.— Га, гэта не ты там масты паліў?

— Што вы? — спалохаўся Яўхім Бабай.

— А хто ж, хто паліў? — не спускаў вачэй з Яўхіма Бабая Кандрат Астапавіч.

— Хто?

Хвіліну-другую думаў, а потым сказаў, прызнаўся:

— Ета... Іван Дарошка... І Васіль... Кулага.

— Хто яны? — ужо мякчэй спытаў Кандрат Астапавіч.

— Старшыні... Адзін сельсавета, другі калгаса...

— А яны што — хіба ў Вялікім Лесе, не ў арміі?

— Не, не ў арміі... Па сялу ходзяць, страх на людзей наганяюць. Пагражаюць... І масты спалілі, каб немцы ў Вялікі Лес не прыйшлі.

— Не брэшаш? — не спускаў вачэй з Яўхіма Бабая Кандрат Астапавіч, глядзеў так, што той ніякавеў.

— Чаго ета мне брахаць? — засаромеўся.

— А ты... Сам не з іхняй хэўры?

— Не-е,— закруціў галавою Яўхім Бабай.— Я ляснік, Яўхім Бабай.

— А чаго ты ў Ельнікі ішоў?

— Да каменданта нямецкага... Да немцаў... Кеб не бавіліся, хутчэй у Вялікі Лес прыязджалі...

— Да немцаў, кажаш? — не верыў Кандрат Астапавіч.— А чаму ты са стрэльбаю быў?

— Як у лес заўсёды хадзіў і хаджу, так і ішоў...

— Ты зубы мне не замаўляй. Што ты, не ведаў — нельга цяпер са стрэльбамі хадзіць. Стрэльбы здаць трэба. Хто не здасць — таму расстрэл.

— Не, не ведаў,— зжахнуўся Яўхім Бабай.

— Як гэта не ведаў, калі загады на кожным слупе вісяць?

— Далібог, не ведаў,— пачаў бажыцца Яўхім Бабай.— У нас у Вялікім Лесе пра тое ніхто не ведае. Кеб я ведаў... Ды я... Хіба ж бы асмеліўся... Хіба ж бы парушыў?

— Хр-р,— рохнуў Кандрат Астапавіч. І падняўся з-за стала, прайшоўся сюд-туд: два крокі наперад, два назад. Цяпер Яўхім Бабай убачыў: сапраўды Кандрат Астапавіч невысокі, меншы нават за яго. І тоўсты, з вялікім жыватом, што аж перавешваўся з-за папружкі, якою быў падпяразаны паверсе доўгай суконнай кашулі. Быццам падушку пуховую яму нехта падвязаў. А ножкі... Ножкі былі кароткія, хоць і быстрыя, рухавыя. У ботах. Бліскучых, хромавых.

— Як ты думаеш,— звярнуўся, паглядзеў, гэты раз не на яго, Яўхіма Бабая, а на таго ягамосця, што стаяў з вінтоўкаю ў парозе і моўчкі слухаў іхнюю размову.— Праўду ён кажа?

І паказаў галавою на Яўхіма Бабая.

— Брэша. Прытвараецца і брэша. Не за таго сябе выдае,— гаркнуў, аж аглушыў той, з вінтоўкаю.— Вы б, Кандрат Астапавіч, бачылі, як біўся ён учора, не хацеў нам здавацца... Ледзь скруціў я яго...

— Чаму ты ўчора біўся, не хацеў здавацца паліцыі? — спытаў зноў строга Кандрат Астапавіч у Яўхіма Бабая.

— Я... Стрэльбы не хацеў аддаваць,— шчыра прызнаўся Яўхім Бабай.

— Гэта мы ведаем, што стрэльбу не хацеў аддаваць. А чаму ты стрэльбу не хацеў аддаваць? — зноў глядзеў, не спускаў вачэй з Яўхіма Бабая Кандрат Астапавіч.

— Бо стрэльба... Мая. Я за свае грошы яе купіў.

— Але ж загад ёсць — здаць стрэльбы!

— Я не ведаў пра загад. Я да каменданта ішоў...

— «Кеб немцы не бавіліся, у Вялікі Лес прыязджалі». Чулі ўжо. Іншаму гавары, не нам! — закрычаў раптам, стукнуў кулаком, наблізіўшыся да стала, Кандрат Астапавіч.

— Пабажыцца... Пабажыцца магу. Дзеткамі сваімі паклянуся... Праўду кажу... Як на духу...— залямантаваў Яўхім Бабай.

— А чаму не да каго іншага, а менавіта да каменданта ты ішоў?

— Бо быў я ў яго.

— Калі?

— Раней, як масты цэлыя яшчэ былі. Спытайце. У самога каменданта спытайце. Ён абяцаў, што прыедзе ў Вялікі Лес. Казаў, кеб хлебам-соллю яго сустрэў. Мы б і сустрэлі... Але... Іван Дарошка і Васіль Кулага масты папалілі... І немцы да нас не даехалі... А мы... Чакалі... Як дарагіх гасцей...

— Хр-р,— зноў рохнуў Кандрат Астапавіч. І падняў вочы, сурова паглядзеў на Яўхіма Бабая, быццам верыў і не верыў яму.— Не брэшаш?

— Толк які мне брахаць. У каменданта, у самога каменданта спытайце!

Задумаўся Кандрат Астапавіч. Зноў у крэсла сваё сеў, рукі перад сабою склаў.

— Во што,— сказаў да таго ягамосця, што з вінтоўкаю стаяў у парозе.— Завядзі... Зноў у халодную яго завядзі. Толькі ж...— перавёў раптам вочы на Яўхіма Бабая, прыгразіў Кандрат Астапавіч: — Слова... Адно толькі слова няпраўды — і ты... Ножкамі дрыгаць будзеш! На вісельню, на вісельню, разумееш, не застрэлім, а павесім! Тут жа, у Ельніках, і павесім! — і ўжо зноў да таго, што з вінтоўкаю быў: — Піліпчук, выведзі яго, хай пасядзіць, а я тым часам з камендантам звяжуся... Параюся, што нам рабіць далей...

— Вы... Мяне да каменданта завядзіце,— папрасіў Яўхім Бабай.— Ён не забыўся, помніць... Вось пабачыце, помніць... І я... Не маніў... Ні слова не маніў...

— Праверым! Усё праверым! — рохкаў Кандрат Астапавіч.

Яўхім Бабай яшчэ нешта хацеў сказаць Кандрату Астапавічу — ці не папрасіць у яго напіцца вады,— але не паспеў — той, з вінтоўкаю — Піліпчук, ужо адчыніў дзверы, закамандаваў:

— Рукі ўгору! І наперад — у халодную! Шагам марш!

Яўхім патаптаўся на месцы, павярнуўся, падняў угору рукі і слухмяна пайшоў, куды яму загадвалі ісці.

Камендант, да якога ў той жа дзень прывялі Яўхіма Бабая, пазнаў яго.

— Я, я,— ажывіўся, пажвавеў камендант, убачыўшы ў сваім кабінеце знаёмую каржакаватую постаць.— Но...

І зялёныя, як у змяі, вочы ў каменданта раптам наліліся злосцю, гневам.

— Ві жулік,— закрычаў ён, паказваючы пальцам на Яўхіма Бабая.— Ві прыгласіл нас, а сам мост зжог... Расстраляць!

Яўхім Бабай, як стаяў, упаў на калені.

— Пан камендант, я не паліў мост. Масты спалілі Іван Дарошка і Васіль Кулага. А я не-е, не паліў,— закруціў ён галавою, забалбатаў.— Прысягаю госпаду богу, дзеткамі сваімі клянуся, не паліў я ніякіх мастоў...

— Вас? — павярнуўся камендант да вушастага свайго перакладчыка, што стаяў навыцяжку, крыху збоку перад ім.

— Ён, кажа, не паліў мастоў, дзецьмі клянецца,— пераклаў перакладчык.— Спалілі масты Іван Дарошка і Васіль Кулага.

— Кто есть Іван Дарошка унд Васіль Кулага?

— Хто такія Іван Дарошка і Васіль Кулага? — пераклаў Яўхіму Бабаю перакладчык.

— Іван Дарошка — старшыня сельсавета, Васіль Кулага — старшыня калгаса. Паночку, прыязджайце да нас хутчэй, жыць няможна,— прасіў, маліў, седзячы на каленях, Яўхім Бабай.— Па сяле ходзяць, страх на ўсіх наганяюць. І да мяне прыходзілі, ледзь не застрэлілі... Бо я... У армію па мабілізацыі не пайшоў, у лес уцёк... І немцаў, вас, з хлебам-соллю сустракаць хадзіў... Я ж не ведаў, далібог, не ведаў, што Іван Дарошка і Васіль Кулага масты спаляць... Я хацеў як лепей... І не да каго-небудзь, а да вас зноў прыйшоў. Цярпець больш нельга... А мяне... Збілі, у халодную пасадзілі... А цяпер яшчэ і расстраляць... За што? За што, паночку?

Яўхім Бабай заплакаў. Заплакаў шчыра, адчайна. Здавалася, усё, што накіпела, набалела ў яго душы, выходзіла цяпер слязамі. І камендант... Той камендант, які, мусіць жа, неаднойчы бачыў людскія слёзы і не заўсёды ім верыў, раптам нібыта збянтэжыўся, схамянуўся.

— Вас? — павярнуўся, перавёў свае вочы зноў на перакладчыка ён.

Перакладчык хутка, глытаючы словы, пераклаў каменданту ўсё тое, што гаварыў Яўхім Бабай.

— Рускі хітры, рускі швіння,— крыкнуў камендант, і не пазнаць было, верыў ён усяму таму, што пераказаў яму перакладчык, ці не верыў.

— Навошта мне хітраваць? — па-свойму зразумеў сло-

вы каменданта Яўхім Бабай.— Мяне ж усе ведаюць у Вялікім Лесе. Ведаюць, што і па мабілізацыі я на фронт не пайшоў... І што загадваў усім, кеб хлебам-соллю вас, вызваліцеляў нашых, ішлі сустракаць... І сам з жонкаю аж за вёску да крыжа стол з хлебам-соллю насіў... А масты... Навошта ж масты паліць? Я сам бы таго, хто масты спаліў, шкоду такую зрабіўшы, спаліў бы... Сваімі рукамі ў агонь укінуў бы... Людзі шчыравалі, будавалі, а яны... Спалілі! Цяпер і вам дабрацца да нас, і нам да вас... Па кладках ці на лодках... Інакш не дабярэшся... Але зіма хутка... Замёрзнуць рэкі... І я.. Дакажу, як ненавіджу Івана Дарошку і Васіля Кулагу. І калгасы, Савецкую ўладу... Дакажу!

Яўхім Бабай, седзячы на каленях, пачаў біць сябе кулаком у грудзі, круціць галавою, плакаць і клясціся.

— Вас? — зноў паглядзеў на перакладчыка камендант.

Перакладчык гэты раз доўга, упарта, нібыта не перакладаў, а даказваў нешта сваё каменданту. Камендант не тое што не згаджаўся, а неяк быццам думаў, засяроджваўся ў сабе. Урэшце ён загаварыў, залапатаў па-нямецку, гледзячы зноў зялёнымі, шалёнымі вачыма на Яўхіма Бабая. Калі ён змоўк, перакладчык пераказаў, што гаварыў камендант:

— Камендант кажа, у бліжэйшыя дні будзе ў Вялікім Лесе. І ўсё праверыць сам. Калі ты збрахаў хоць слова — павесяць. І нішто табе тады не паможа — ні твае слёзы, ні просьбы. Літасці не чакай...

— Паночку, як перад богам клянуся — не брашу я, ні аднаго слова маны. Усё, усё праўда. Праверце. І не цягніце — з'ездзіце ў Вялікі Лес, як хутчэй з'ездзіце. І вы пераканаецеся — усё, што казаў я,— праўда,— зноў пачаў бажыцца, біць сябе кулаком у грудзі Яўхім Бабай.

Але камендант ужо не слухаў яго, загадаў:

— Вывесці! І трымаць у турме столькі, колькі спатрэбіцца, пакуль не праверым!

Вартавы — Піліпчук, які моўчкі ўвесь час стаяў навыцяжку перад камендантам, коршунам наляцеў на Яўхіма Бабая і, не даўшы таму і апамятацца, ледзь не сілаю выкінуў, выштурхнуў яго з каменданцкага кабінета.

## XVIII

З нялёгкім сэрцам пакінуў жонку і дзяцей, выходзіў з Будзілавіч Іван Дарошка. А ён жа думаў, калі жонкі і дзяцей у Вялікім Лесе не будзе, завязе іх сюды, да бацькоў,

дык і клопат з галавы спадзе. Аж не, бачыш жа... Там, у Вялікім Лесе, сваё, тут таксама сваё. І галоўнае — параіць нічога не можаш: ісці ёй, Каці, працаваць у школу ці не ісці... Як панацэю, выратаванне, цяжарнасць прыдумала. Уявіла, што калі з жыватом, з дзіцем, то ад яе адчэпяцца, ніхто прыставаць не будзе. І ён, муж, замест таго каб нешта талковае падказаць, параіць... Становішча сям'і яшчэ ўскладніў. І так на руках у жонкі двое дзяцей. А народзіцца трэцяе... Ды пакуль яно народзіцца, колькі чаго пераажыць давядзецца! А кожнае лішняе хваляванне — гэта ж не на здароўе дзіцяці. Ды і ёй, Каці. Зноў жа — размовы пойдуць, плёткі. «Муж на фронце, а яна зацяжарала, дзіця нарадзіла. Ад каго? Ад мужа? Дык, выходзіць, муж дзесьці блізка...» — «Не трэба ёй тая цяжарнасць, не трэба...— круціў галавою, думаў Іван Дарошка.— І мне не паддавацца б на ўгаворы, а адгаварыць бы...»

«Але ж... Каця жанчына. І прыгожая. Яна зразумела, што значыць быць жанчынай, ды яшчэ прыгожай, у вайну. Кожны прыстае, ліпне. А абараніцца... Як абаронішся?» — закралася сумненне ў правільнасці ходу сваіх ранейшых думак.

«І ўсё ж... Не варта было паддавацца, падумаць трэба было. Грунтоўна, уважліва падумаць, прааналізаваць, узважыць усе «за» і «супроць»...»

«Не было калі, часу ж вобмаль. Ноч толькі адна, і тая няпоўная».

«Трэба было яшчэ на ноч астацца...»

«А заданне?»

«Заданне — заданнем, а сям'я ёсць сям'я. Ды і нагнаў бы ў дарозе, хутчэй бы проста ішоў. Калі не паспаў бы — вось і ноч тая».

«Не паспаць і так давядзецца. І не адну ноч. Дый... Каб і ноч, і дзень быў я з Кацяю, хіба прыдумаў бы што, выйсце знайшоў бы?..»

«Але ж Каця, дзеці... Ды калі з імі што здарыцца...»

Спыніўся, пастаяў, паглядзеў у той бок, адкуль ішоў,— цемра, ані нічога не відаць, хоць вока выкалі. Але ведаў, добра ведаў Іван: там, дзесьці ля хлява, стаіць жонка, Каця. Стаіць адна і, няйнакш, плача...

«Хіба вярнуцца? Перадняваць, пераначаваць?»

«Вяртацца з дарогі назад — дрэнная прыкмета»,— успомніў раптам.

Не, не прымхлівы быў Іван Дарошка, не верыў у якія б там ні было забабоны ніколі, але гэты раз... Не тое што

паверыў, а нейк быццам спасаваў, не захацеў лішне выпрабоўваць лёс.

«Як ужо выйшла, так выйшла. Але вяртацца назад... Не буду... І так каб усё добра абышлося. Сабака ж так гаўкаў...»

Скрануўшыся з месца, пайшоў. Пайшоў туды, дзе ўжо бялела, святлела неба, была раніца, дзень.

## XIX

Надвор'е перамагалася — на змену пахмурным, даждждлівым дням усё часцей і часцей прыходзілі ясныя, зорныя ночы. Волкасць і ядранасць асабліва адчуваліся на світанні, калі бялелі, укрываліся інеем балоты, лугі. Дзьмулі халодныя сіберныя вятры, зрывалі з дрэў апошняе жоўтае лісце, неслі, гналі яго па дарогах, па полі, шпурлялі ў гразь, у лужы вады, што стылі, маршчыніліся скрозь, у кожнай ямінe, кожным раўчуку.

Восень развітвалася, адыходзіла — неўпрыкмет падкрадаліся халады.

І Васіль Кулага, як, можа, ніхто, разумеў — не доўга асталося яму быць у Вялікім Лесе, сядзець штодня ў калгаснай канторы, весці самыя розныя гутаркі з людзьмі. Трэба не адкладваць, шукаць іншага сабе прыстанку і схованi.

«Эх, Івана Дарошкі няма! Мы б з ім нешта прыдумалі,— шкадаваў Васіль.— І дзе ён толькі падзеўся? Знік, усё адно што растварыўся, выпарыўся. Быў — і няма. Хоць бы слова, паўслова сказаў. Дык не ж. Быццам і пасябравалі, дзяліцца пачалі ўсім, што ў каго на душы. А бачыш жа — у самую апошнюю хвіліну пакінуў мяне аднаго, знік, уцёк. А мне... Чакаць яго ў вёсцы ці... Без яго аднаму абжывацца, схованку на выпадак прыезду ў Вялікі Лес немцаў шукаць?»

Аднойчы пасля ночы, праведзенай у стозе сена, калі асабліва густа ўкрылася інеем жухлая атава — быццам снег нечакана выпаў,— не вярнуўся Васіль Кулага, як гэта зазвычай рабіў, у вёску, а пайшоў, папраставаў у лес.

Дрэвы ўжо былі амаль голыя, толькі дзе-нідзе гарэлі апошнім сухім лісцем вяршынкі бярозак, асінак, ды зелянелі неяк надта ж цёмна, змрочна іголкі соснаў. Пад нагамі шамацела ўсюды золата восені. І было наўздзіў халадна, няўтульна.

«Дык гэта ж восень яшчэ. А зімою што будзе? — думаў

Васіль.— Дзе ні ступіш — сляды астануцца. А і паесці ж трэба, і з людзьмі звязвацца. Ды і не сядзець жа ў лесе ўвесь час, ваяваць, ворага біць трэба...»

Трапіўся бярозавы пень, які ўвесь — і кара, і карэнне, нават зрэз — аброс апенькамі. І Васіль Кулага, спыніўшыся, стаяў ля яго, зачаравана глядзеў, любаваўся.

«Гэта ж каб раней знайшоў такі пень, кашэль бы поўны нарэзаў. А цяпер...»

Сумна зрабілася на душы — успомніліся жонка, дзеці...

«Быццам чужы я ім, непатрэбны. Я думаю, як ўратаваць іх, а яны...»

Абышоў бокам, каб не патаптаць апенек, пашамацеў, пашастаў па сухім, яшчэ не зляжалым лісці далей.

Ішоў — і не ведаў сам, куды ідзе. Проста, мабыць, каб на адным месцы не стаяць, рухацца.

«Як усё добра было — і бачыш, няма ўжо таго. Распалася, развалілася. Нават сям'я. Адзін я... І чакаць чаго, на што спадзявацца?»

Шамацела, шастала пад нагамі лісце — шчодрае золата спелае восені. І гэтак жа непаспешліва ўзнікалі, віліся ў галаве ў Васіля думкі. Успомнілася, згадалася раптам, як любіў такою вось ціхаю асенняю парою, бывала, хадзіць на паляванне — на рабчыкаў. Рабчыкі за лета і восень так тлусцелі, што ледзь-ледзь падымаліся на сваіх крылах у паветра, пралятаді метраў пяць і тут жа падалі зноў у багуннік. І было іх заўсёды многа, асабліва ў мхах, дзе распявалі журавіны і блізка былі верасовыя паляны. Зойдзеш у махавіну — і ажывае яна: куды ні ступіш — пырх, пырх, як не з-пад самых ног... Стрэліш — абавязкова пападзеш у рабчыка. Цяжкага, тлустага, усё адно што гусь.

Ногі, здаецца, самі збочылі ў Качай-балота, да тых імшарын і мхоў, куды хадзіў паляваць рабчыкаў заўсёды ўвосень. Па кладках мінуў доўгі гнілы брод, выйшаў на паляну, што, акружаная з усіх бакоў дубамі і ясенямі, лысела сярод лесу. І спыніўся, уражаны, вачам сваім не паверыў — уся паляна была застаўлена будамі. Тут і там гарэлі вогнішчы, і ля іх варылі сабе ў чорных, задымленых вёдрах, казанах есці цыганы, цыганкі. Бегалі, гойсалі сюды-туды па паляне дзеці. Мурзатыя, абарваныя...

«Глядзі ты, дзе абжыліся! Няўжо лепшага месца не знайшлі? Хіба падысці, пагаварыць?»

Не спяшаючыся, паволі — не было куды спяшацца — папраставаў на паляну, адчуваючы, як насцярожыліся,

занепакоіліся цыганы і цыганкі, убачыўшы невядомага ім чалавека з вінтоўкай.

— Адкуль ты, бацю, і хто ты? — кінуўся распытваць Васіля пажылы цыган з чорнаю, як квач, барадою, калі ён падышоў, наблізіўся да першага з краю вогнішча.

— Я? — усміхнуўся Васіль.— Я з Вялікага Лесу, старшыня калгаса.

— Гэта блізка адсюль? — са страхам у вачах запытала цыганка, мусіць, жонка,— даволі прывабная з твару і тонкая, перацiснутая ў таліі, што аса.

— Кіламетры чатыры-пяць.

— Божа, а мы і не ведалі, што блізка так вёска! — усклікнула цыганка.— А немцы ў вас ёсць?

— Не, пакуль няма.

— Як, немцаў у вас яшчэ няма? — не паверыла цыганка.

— Няма.

Да вогнішча падыходзілі, збіраліся цыганы, цыганкі, іхнія чарнявыя, даўно не мытыя дзеці. Акружалі з усіх бакоў Васіля Кулагу, засыпалі яго пытаннямі. Цыганоў і цыганак цікавіла ўсё — і дзе фронт цяпер, і ці хутка зноў Чырвоная Армія сюды вернецца, прагоніць немцаў, і чаму ён, Васіль Кулага, адзін па лесе з вінтоўкаю ходзіць, каго шукае? Васіль адказваў, што ведаў. І ў сваю чаргу задаваў цыганам і цыганкам свае пытанні:

— А вы чаму немцаў спалохаліся, у лес пахаваліся?

— Ой, бацю, дык яны ж страляюць нас,— адказваў яму цыган з чорнаю, што дзягцярны квач, барадою.— Без усякага допыту. Дзе злавілі, там і страляюць.

— Як гэта? За што? — недаўмяваў Васіль.

— У іх не спытаеш. Страляюць, дый усё. Адна надзея — Чырвоная Армія разаб'е Гітлера, волю нам зноў прынясе. Ды ты, бацю, не стой, садзіся,— запрашалі цыганы Васіля Кулагу.— Ці ты, можа, спяшаешся куды?

— Не, нікуды не спяшаюся...

Васіль, патаптаўшыся на месцы, сеў на чурбачок, што ляжаў, валяўся тут жа, ля агню. І сядзеў з цыганамі доўга, то расказваў ім розныя навіны, то слухаў іх саміх. Цыганы расказалі яму, як уцякалі ад немцаў ледзь не з-пад самага Брэста, дабеглі сюды, на Палессе, а далей не змаглі — усюды, куды ні патыкаліся, нарываліся на заваёўнікаў.

— Бацю, мы розных людзей бачылі. Але такіх... Не, не бачылі,— круцілі цыганы галовамі.— З любым чалавекам дамовіцца пра ўсё можна, толькі не з немцам... Ды мы

ніколі нічога і не хацелі. Коней панапасваць, самім падсесці... Вось і ўсе нашы жаданні... І за гэта нас страляць, забіваць?

Паспрабаваў быў Васіль Кулага растлумачыць цыганам, што не трэба немцаў атаясамліваць з фашыстамі, расказаць, хто такія фашысты, якія мэты яны ставяць, заклікаў цыганоў не чакаць, калі Чырвоная Армія разаб'е акупантаў, вызваліць зноў усю савецкую зямлю, а і самім браць зброю, ваяваць, біць ворага. Але цыганы не ўспрымалі яго слоў.

— Бацю, мы ніколі ні з кім не ваявалі. Нам абы нас не чапалі, абы нам жыць давалі. А ваяваць... Нас адна жменька, а іх, немцаў, мульёны... Нам бы перахавацца, перачакаць...

— Ды нельга ў такой вайне ўбаку быць,— спрабаваў даказваць, пераконваць Васіль Кулага цыганоў.— Тут ці на баку фашыстаў, ці на баку Саветаў... Іншага няма.

— Не, бацю, не,— круцілі,ківалі галовамі цыганы.— Якія з нас салдаты... Мы і страляць не ўмеем.

Цыганы накармілі Васіля гарачым, толькі што з агню, крупнікам, папрасілі, каб ён нікому іх не выдаваў.

— Ні немцам, ні тым, што ў леснічоўцы...

— А хто ў леснічоўцы? — ажывіўся, узрадаваўся, як немаведама чаму, Васіль.

— Мы не ведаем. Толькі бачылі — з вінтоўкамі ходзяць. Як і ты.

— Гэта ў якой леснічоўцы? — пытаў, хацеў ведаць Васіль Кулага.

— У той,— махалі цыганы рукамі, паказвалі кудысьці далёка, пад Дубровіцу.

Развітаўся Васіль Кулага з цыганамі, зноў па лесе, па лісці пашамацеў, зашастаў.

«Хто ж гэта там з вінтоўкамі каля леснічоўкі ходзіць? Няўжо Іван Дарошка? Але чаму тады ён мне нічога не сказаў? Баіцца хіба мяне, не давярае? А мо Пятрусь Хамёнак і Максім Варывончык? Цікава, цікава...»

## XX

Узвод Аляксея Заспіцкага адступаў разам са сваёй часцю далей і далей на ўсход. Адступаў з баямі, якія чаргаваліся доўгімі, зморнымі пераходамі.

Да новага чырвонаармейца, земляка Аляксея Заспіцкага, Піліпа Дарошкі, хутка ўсе прывыклі. Прывыкаў да

новых сваіх сяброў і Піліп Дарошка. Трохі нехлямяжы, не надта разгаворлівы, ён у цяжкую хвіліну кідаўся на выручку кожнаму, хто меў патрэбу ў дапамозе, ці ўрастаў, як камень, у зямлю, і ніхто, ніякая сіла не маглі яго скрануць з месца — няхай ішлі на яго танкі ці рваліся навокал снарады, бомбы.

Ні ў часе баёў, ні ў часе пераходаў з пазіцыі на пазіцыю Аляксей Заспіцкі не аддаляўся вельмі ад свайго старэйшага па гадах, але менш вопытнага ў вайсковай справе земляка. Ён і падказваў, і дапамагаў, вучыў Піліпа Дарошку і страляць, і поўзаць па-пластунску, непрыкметна наступаць і адступаць.

— Я з вас добрага байца зраблю,— казаў ён Піліпу Дарошку, называючы яго, як і ўсіх байцоў, на «вы».— Жыць не буду, а зраблю. І для саміх вас навука мая прыдасца, і для агульнай нашай справы. Я лічыў і лічу — не мае права паміраць той, хто хоць бы з дзесятак гітлераўцаў на той свет не адправіў...

Піліпу Дарошку апека Аляксея Заспіцкага падабалася. Ён таксама гарнуўся да свайго земляка, бо, як ніколі, можа, яшчэ, адчуваў патрэбу ў добрым чалавечым слове, у спагадзе. Думкі, самыя розныя, не давалі спакою і яму, як толькі заставаўся адзін. «А мо і мне не варта было шукаць, даганяць сваіх, а вярнуцца дадому, у Вялікі Лес, як гэта зрабіў Адам Зайчык? — закрадвалася, прыходзіла ў галаву ўсё часцей і часцей.— Быў бы даўно дома, у сваёй хаце. А так... Адступаем, ідзем і ідзем. А куды? Што чакае нас наперадзе...» У таварыстве ж Аляксея Заспіцкага думкі гэтыя забываліся, адыходзілі на другі план. Хацелася лепш засвоіць тое, што гаварыў камандзір-зямляк, чаму ён навучаў, каб і сам камандзір быў задаволены, і ўсе байцы ўзвода.

— Малайчына, малайчына! — падхвальваў, падахвочваў камандзір час ад часу свайго падначаленага.— Яшчэ трошкі — і вы... Быццам і нарадзіліся ў салдацкім адзенні, быццам усё жыццё служылі ў арміі...

Камандзір узвода смяяўся, смяяліся і байцы, задаволеныя Піліпам Дарошкам.

Але вясёлыя, спакойныя хвіліны выпадалі рэдка. Куды часцей надараліся хвіліны сумныя. Неяк, у часе аднаго з баёў, загінула адразу сем байцоў узвода. І хоць камандзір суцяшаў усіх тым, што немцаў загінула ў некалькі разоў больш, слабая то была ўцеха. Кожнага мучыла і яшчэ адно — не змаглі пахаваць як належыць таварышаў, бо

надта ж ціснулі, імкліва наступалі гітлераўцы, ніяк нельга было іх спыніць.

А там і пайшло. Як бой — так і недалічваліся двух, а то і больш байцоў. Быў паранены ў левую руку, праўда, лёгка, і сам камандзір Аляксей Засціцкі.

— Галоўнае — каб правая рука цэлая была,— не траціў ён пачуцця гумару.— Ёю я ўтрупяню яшчэ некалькі фашыстаў.

А Піліп Дарошка задумваўся, задумваўся над сваім лёсам.

«Іван прасіў: не схіб, Піліп. Мы пераможам, і сорамна будзе, калі схібіш. Але хто ведаць будзе, як вёў я сябе ў цяжкую хвіліну? Адзін за адным сведкі гінуць. І адступаем, адступаем... Вярнуўся б дадому, у сваю вёску, можа б, і жыць астаўся... А так...»

Быццам і не было асабліва нічога прывабнага ў жыцці — праца, клопаты ды згрызоты, а ўсё адно не паміраць, а жыць хацелася.

«Можа б, з часам і з Клаўдзяй наладзілася, юр мінуўся б. А не — кінуў бы Клаўдзю, з кім-небудзь іншым жаніўся б. І дзеткі, глядзі, нарадзіліся б, і так, можа б, на лепшае ўсё пайшло. А то ж... Быццам і не жыў яшчэ, толькі жыць збіраўся. Мітрэнга і мітрэнга. Думалася — наперадзе лепшае жыццё... А бачыш, як павярнулася — нічога лепшага можа і не быць».

Той бой успыхнуў нечакана. Узвод Аляксея Засціцкага — уласна, ужо не ўзвод, а толькі частка, рэшткі ўзвода,— адступаючы, трапіў на нямецкую засаду. Немцы залеглі паабапал дарогі пры ўваходзе ў лес і ўдарылі з аўтаматаў і кулямётаў, падпусціўшы чырвонаармейцаў зусім блізка да сябе. Ззаду, адкуль адступалі, было голае поле, наперадзе — лес і немцы. Колькі немцаў, якая ў іх сіла — ніхто не ведаў. А таму, пападаўшы, залёгшы, байцы пачалі адстрэльвацца. Неўзабаве выявілася — сілы няроўныя, і немцы, асмялеўшы, рыхтаваліся рынуцца ў атаку. Аляксей Засціцкі падаў каманду:

— За мной!

Адыходзілі арганізавана, адстрэльваючыся, даючы адзін аднаму адбегчыся і залегчы. Немцы не адставалі, ішлі амаль на поўны рост, паліваючы ўсё наперадзе сябе агнём з аўтаматаў. Піліп, прывыкшы ўжо да свісту куль, таксама адступаў кароткімі перабежкамі. Адбяжыцца, упа-

дзе на дол, схаваецца за купіну ці пагорачак, стрэліць — і зноў падымецца, пабяжыць. Якраз усё рабіў так, як і вучыў яго зямляк-камандзір.

Рады чырвонаармейцаў радзелі, то адзін, то другі — забітыя, параненыя — аставаліся ляжаць на лужку, што быў перад кустамі. Праўда, раз-пораз ускрыквалі і падалі, таксама забітыя і параненыя, і немцы. Адлегласць скарачалася з кожнай хвілінай, немцы насядалі і насядалі. І каб даць магчымасць адарвацца ўзводу, Аляксей Засціцкі падаў каманду некалькім байцам астацца, прыкрываць адыход сваіх.

Сярод тых, каму загадаў, на каго паказаў пальцам камандзір, быў і Піліп Дарошка. Спярша камандзір, мусіць, не пазнаў, што гэта Піліп Дарошка, а потым, калі пазнаў, адмяняць загад усё ж не стаў; што б маглі падумаць пра яго байцы?

Піліп не крыўдаваў на камандзіра. Нічога лепшага для сябе ён не чакаў і не хацеў. Ён быў такім жа байцом, як і ўсе. Чаму ж камандзір павінен быў аберагаць яго і падстаўляць пад кулі іншых? Што зямляк? Але ж гэта не апраўданне.

Іх было трое, што залеглі, асталіся чакаць немцаў. Піліп ляжаў з краю, ад самага лесу, захінуўшыся за камель старой бярозы. Двое астатніх ляжалі на правы бок ад яго, амаль на самым беразе рачулкі. Не стралялі да самага апошняга. Толькі калі немцы падышлі крокаў на дваццаць, далі залп з трох вінтовак. Немцы залеглі, потым папаўзлі...

Піліп, цэлячыся, страляў метка. Аднаго, потым яшчэ аднаго прышыў куляю да зямлі. Трэці, мусіць паранены, дастаў з-за пояса гранату, шпурнуў у яго, Піліпа. Граната разарвалася збоку. Віскнулі, праляцелі над галавою асколкі...

Піліп прыцэліўся, стрэліў яшчэ раз па тым самым немцы, па якім страляў і які кінуў у яго гранату. Здаецца, папаў, бо немец больш не варушыўся.

Ён не чуў, ці стралялі два астатнія байцы. Ён наогул амаль нічога не чуў — ці то аглушыла яго выбухам гранаты, ці то ўвесь ён быў заняты сабою, боем — не падпусціць бы немцаў бліжэй да сябе, затрымаць іх. І ён, перазараджаючы вінтоўку, раз-пораз страляў, пакуль былі патроны. Калі ж патронаў не стала, скончыліся яны, падхапіўся, кінуўся ўцякаць...

Не зразумеў у першую хвіліну, што ж здарылася. Нехта вялізны, што гара, наваліўся на яго ззаду, пачаў душыць. Ён выкруціўся, шпурнуў таго вялізнага на зямлю. Убачыўшы, што гэта немец, падняў вінтоўку, замахнуўся, хацеў ударыць прыкладам проста ў ашчэраны, зубасты твар... Але ці ўдарыў — не запомніў, бо ў гэты самы час нешта чорнае засланіла вочы, і ён хутчэй адчуў, чым зразумеў, што падае, мяшком асоўваецца на зямлю. Правільней, не сам ён падае, асоўваецца, а зямля хістанулася, паплыла разам з дрэвамі і небам з-пад ног...

## XXI

Лёс быццам злітаваўся над Клаўдзяй, даў спазнаць тое, што рана ці позна спазнае кожная жанчына. Мала таго, што побач быў чалавек, якога яна кахала, які задавальняў усе яе патрэбы і жаданні, дык, у дадатак да ўсяго, яна адчула, што зацяжарала, мае нарадзіць дзіця. Яна верыла і не верыла сабе, усяму таму, што так неспадзявана нехта паслаў, падараваў ёй. «Няўжо бог? Мусіць жа, бо хто ж яшчэ, як не ён. Убачыў, як мучылася, і пашкадаваў. За ўсе слёзы мае, за пакуты».

Аж месца сабе нідзе не знаходзіла ад радасці і шчасця Клаўдзя. Хацелася ёй то смяяцца, рагатаць, то плакаць, галасіць. Цягнула на людзі, паказаць, пахваліцца ўсім, вось, маўляў, якая я, вось... А вы думалі, што няздатная. Але Клаўдзя стрымлівала сябе, нават Змітру не прызналася ні ў чым.

«Няхай, потым ва ўсім прызнаюся, потым раскажу. Калі сама пераканаюся, упэўнюся, што не памылілася, што сапраўды нашу ў сабе дзіця. Каго? Дзяўчынку ці хлопчыка? Во каб хлопчыка! Усе мужчыны хочуць, каб першынец быў хлопчык. І Змітро, мабыць, таксама пра тое ж марыць...»

З любасцю і замілаваннем глядзела на Змітра, які быццам нудзіўся, не ведаў, што яму рабіць, за што ўзяцца.

«Нічога,— думала Клаўдзя.— Хутка я цябе парадую. Пачакай, яшчэ некалькі дзён пачакай».

І ўслухоўвалася, услухоўвалася ў сябе, у жывот свой — раптам ажыве тое, што там, баўтане ножкамі, перавернецца...

«Тады б я і Змітру дала паслухаць. Хай бы і ён парадаваўся. А то Пілiп еты... Мяне вінаваціў, а, выяўляецца, сам ва ўсім вінаваты, ні на што не здатны... А Змітро...

О, еты кахаць умее. На ўсё, усякі сорам забываеш, не помніш, не ведаеш, што робіш. Сама не свая, толькі б разам быць, толькі б не аддаць, нікому не аддаць шчасця...»

Ляжала ў пасцелі Клаўдзя, па хаце хадзіла і ўсё на Змітра глядзела, вачэй не зводзіла. Абдымала, лашчылася.

— Што, яшчэ? — пытаў ён не то з радасцю, не то з няверай.

«Дурненькі, нічога ты не ведаеш, нічога не разумееш», — усміхалася Клаўдзя.

Але не адмаўлялася, ніколі не адмаўлялася ад таго, што прапаноўваў Змітро. Дзівілася толькі іншы раз: «Колькі ета можна?.. І галоўнае — кожны раз з той самай ахвотаю, жаданнем...»

Баялася, трывожылася: «А раптам яму, таму, што ў жываце ўжо, ета зашкодзіць?» Але і стрымаць сябе, не аддацца — не магла, не магла Клаўдзя. Гэта было звыш яе сіл, не падпарадкавацца, не згадзіцца са Змітром, тым больш што і самой ёй...

«Божа мой, як і цярпела я, жыла колькі гадоў і не ведала, што можна жыць зусім інакш! — думала Клаўдзя, успамінаючы ранейшае сваё жыццё з Піліпам Дарошкам. — Ета ж не жыццё было, а чорт ведае што... Да абыкаго хінулася, абы толькі хто паглядзеў на мяне, пажадаў... Але і там... Таксама не было таго, што мне трэба. А ў Змітра... Ёсцека. І нястомны ён, дужы, заўсёды гатовы, абы толькі я пажадала, захацела. І не толькі ў етым, а ва ўсім. Хомку некалі спляжыў, Мікалая, свёкра, пад прызбу шпурнуў... І з кожным тое самае зробіць, абы я папрасіла. Малайчына ён, малайчына! Во кеб і сын такі мацак нарадзіўся, во кеб у яго ўдаўся! І я радая была б, і Змітро таксама, напэўна, радаваўся б. Яшчэ больш мяне кахаў бы, нікуды ад мяне не пайшоў бы. Пажаніліся б з ім, жылі б, як і ўсе людзі. А Піліп... Хай бы з іншай жаніўся. Ды і дзе той Піліп? Можа, і жывога яго даўно ўжо няма, можа, і не вернецца дахаты. А з свёкрам, Мікалаем, паладзілі б. Яшчэ пару раз шпурне яго Змітро, шоўкавым стане, абыходзіць будзе і яе, Клаўдзю, і яго, Змітра. За сем гоней абыходзіць. Як і цяпер абыходзіць. Калі яна, Клаўдзя, на двары ці ён, Змітро, — і носа не патыкае, сядзіць ціхенька ў хаце, што мыш. Дык ета ж раз Змітро з ім пагаварыў... А калі яшчэ пагаворыць?.. Хе, ета не са мною, бывала. Я маўчала, а Змітро не змоўчыць. Ды і хто Мікалай яму, кеб маўчаць? Чужы чалавек. А што ў хаце жыве... Дык хата ж не яго, Мікалаева, а яе, Клаўдзіна. Не, пакуль тут, з ёю, Змітро,

баяцца няма чаго і няма каго. Утрымаць бы толькі Змітра ля сябе, не аддаць бы нікому. Кеб мой ён быў. Заўсёды, заўсёды мой...»

Неяк, калі Змітро надта пакутаваў ад адзіноты, усё ісці кудысьці парываўся, Клаўдзя, каб развесяліць яго хоць трохі, думкі нейкія нядобрыя, што ў галаву яму закраліся, развеяць, прызналася, што цяжарная яна, што ў іх мае нарадзіцца дзіця.

— Праўда? — не паверыў, з цікавасцю падняў вочы на Клаўдзю Змітро.

— А што ты думаў, я няздатная? — падышла бліжэй да Змітра Клаўдзя, села побач на лаву, на якой і Змітро сядзеў.

— Дык ты ж... Сама казала. Жыла колькі гадоў з мужам, і дзяцей не было.

— Бо то муж такі. А ты... Малайчына! Усё ўмееш...

Аж галаву задраў ад пахвальбы Змітро.

— Люблю, калі мяне хваляць! Можа, таму, што ніколі нідзе не хвалілі. Толькі лаялі. А ты во... Хваліш...— быццам засаромеўся Змітро.— Першая...

— Дык як жа не хваліць цябе,— падсунулася бліжэй, паглядзела ў вочы Клаўдзя. І не выцерпела, зажмурылася, прыпала да шырокіх Змітровых грудзей. Не выцерпеў і Змітро — узяў Клаўдзю на рукі, падняў, як пушынку, на ложак панёс...

Доўга яны ў той дзень ляжалі адно пры адным, гаварылі. Змітра тая навіна, што Клаўдзя цяжарная, надта ж усцешыла.

— Гы-гы,— смяяўся ён.— Няўжо дзіця ў нас будзе? Сын ці дочка? — пытаў ён і сам жа сабе адказваў: — Во, каб сын, га? Я тады б... Я тады б...

Клаўдзя аж цвіла.

— Будзе сын! Пабачыш, сын будзе! — гаварыла, пераконвала яна Змітра.

— І што, на мяне падобны? Гы-гы,— гыгыкаў, радаваўся Змітро.

— А на каго ж, як не на цябе? — смяялася ад радасці і Клаўдзя.

— Можа, на цябе?

— На мяне дачка падобная будзе. А на цябе — сын!

— Во каб ета так! Во каб ета так! — усклікаў, аж падскокваў на пасцелі Змітро.— Няхай бы род наш прадаўжаўся, няхай бы жыў. А то бальшавікі вынішчыць хацелі. Каб і звання, карэння нідзе не асталося. Бацьку

з маткаю выслалі, а мяне ў турму запраторылі. Не, я ім не дарую таго!..

— А што ты ім зробіш?

— Як — што? Ды я іх, я іх,— гарачыўся Змітро, і вочы яго наліваліся, наліваліся злосцю.— Як мяне, так і я іх... Не пашкадую. Рукі проста свярбяць, чакаю, дачакацца ніяк не магу, калі ета можна будзе мне праваду сваю ім, галадранцам, даказаць.

— Дакажаш, не гарачыся. Будзе яшчэ час,— супакойвала, суцяшала Змітра Клаўдзя.— Во немцы прыйдуць — і рабіцьмеш, што зажадаецца.

— Калі тыя немцы сюды прыйдуць? — сціскаў кулакі Змітро.— Яма нейкая тут у вас. Усюды даўно немцы, а тут... Ні тое ні сёе...

— Ты ж ведаеш, масты нехта папаліў.

— Я тых бы падпальшчыкаў... Саміх бы ў агонь!

— Паспееш, нікуды яны ад цябе не ўцякуць,— смяялася Клаўдзя.— Са мной пабудзь. Бо тады, як служыць пойдзеш... Не да мяне табе будзе!

— Гы-гы,— гыгыкаў Змітро.— Не бойся. Мяне хопіць. На ўсё, на ўсіх хопіць...

І абдымаў Клаўдзю, гарнуў да сябе...

Аднаго дня, прачнуўшыся ўранні, Змітро сказаў Клаўдзі:

— Слухай: а ці не схадзіць мне ў етыя вашы Ельнікі?

— Чаго? — спытала непаразумела Клаўдзя.

— Папрасіць немцаў, каб не марудзілі, хутчэй у Вялікі Лес прыязджалі. І заадно... На службу да іх наняцца...

Клаўдзя задумалася, не ведала, што і адказаць, параіць.

— Бачыш,— разважаў і далей уголас Змітро.— Баюся, што, пакуль я з табою ў ложку валяюся, нехта апярэдзіць мяне... Астануся тады з носам...

— Навошта табе служба тая? — урэшце нічога не знайшла лепшага, як спытаць, Клаўдзя.

— Каб жыць.

— Дык ты ж жывеш?

— О, не так жыць,— засмяяўся, зарагатаў Змітро.— Жыць так, каб усяго ўдосталь хапала. Каб камандаваць, каб баяліся мяне, слухаліся, што ні скажаш, што ні загадаеш. Во, во пра што я марыў і мару! І там, у турме, і тут... І каб над кожным я мог суд свой чыніць і не адказваць ні перад кім...

— А хіба такая служба будзе ў немцаў? — засумнявалася Клаўдзя.

— А як жа! Павінна быць! Ім жа і бальшавікоў трэба палавіць ды вынішчыць, і парадкі свае новыя навесці. Не, без такіх людзей, як я, ім не абысціся. Я ета адчуваю. Я выслужыўся б у іх, дадому, у сваю вёску, паехаў бы. Ну і паказаў бы я тым, хто мяне і бацьку майго некалі са свету зжываў! Таптануў бы так, як мяне некалі таптаді. Каб ведалі, помнілі Змітра Шламака!

І ўсё ж, нягледзячы на ўсю вабнасць, зманлівасць таго, пра што гаварыў Змітро, Клаўдзя не ахвоціла яго ісці ў Ельнікі. Ці не таму, што дома, у сваёй хаце, не хацелася адной аставацца.

— Пачакай, можа, немцы самі прыедуць.

— Калі яны прыедуць? — гарачыўся, не меў сілы больш чакаць Змітро.

— Некалі ж прыедуць. Бо ісці... Ета ж не блізка, па лесе... А ў лесе цяпер бог ведае хто швэндаецца... Яшчэ перастрэнуць... Нашто табе ета? — адгаворвала Клаўдзя Змітра.— Ды і халады хутка, рэкі замёрзнуць...

— Ладна, няхай,— згадзіўся з Клаўдзяю Змітро.— Пачакаю... Яшчэ тыдзень пачакаю. Але калі не прыедуць прыз тыдзень немцы, пайду да іх сам. І папрашуся, каб на службу мяне да сябе ўзялі. Хопіць мне без дзела сядзець. І так вунь колькі праседзеў.

## XXII

Арганізаваць заняткі ў школе было не проста. Выявілася неўзабаве: акрамя Андрэя Макаравіча ды яго жонкі, Аліны Сяргееўны, у Вялікім Лесе няма больш настаўнікаў. Усе, да чалавека, раз'ехаліся. Хто падаўся ў эвакуацыю, хто яшчэ кудысьці.

— Што рабіць будзем? — вырашыў зноў параіцца з жонкаю Андрэй Макаравіч.

— Можа, не будзем і пачынаць, калі ўсё складваецца так? — асцярожна спытала Аліна Сяргееўна.

— Не, пачынаць трэба! — не згадзіўся з жонкаю, стаяў на сваім Андрэй Макаравіч.

— Чаму ты так лічыш?

— Ды таму, што ў нас пэўныя абавязкі і перад дзецьмі, і перад іх бацькамі ёсць. Ад гэтых абавязкаў ніхто нас не вызваляў. Ды і сама падумай — чаго байбусаваць, дурэць будуць дзеці, займацца абы-чым, калі яны могуць спа-

койна вучыцца ў школе,— разважаў, даказваў сваё Андрэй Макаравіч.

— А калі немцы сюды прыйдуць? — задумвалася Аліна Сяргееўна.

— Што ж, прыйдуць, дык прыйдуць. Школа як працавала, так і працаваць будзе. Не будуць жа немцы школу зачыняць? А нам... Не пры немцах вучыць дзяцей пачалі, а пры Саветах. Апраўданне нейкае быццам будзе.

— Перад кім апраўданне?

— Ды ні перад кім, перад сабою. Куды горш можа стацца, калі немцы ці такія, як Кухта, возьмуцца заняткі ў школе наладжваць, нас прымушаць ісці працаваць...

— Але ж калі мы толькі ўдваіх...

— Ну дык і што, як удваіх? Помніш, калі з табою... Яшчэ пры цары... У вёску прыехалі. Замест школы — звычайная хата. І ўсе вучні — і старэйшыя, і зусім маленькія — разам. І нічога, вучылі. А цяпер школа такая! У дзве змены працаваць можна. З раніцы першы і другі класы, пасля абеду — трэці і чацвёрты...

— А са старэйшымі як жа? — глядзела, заклапочаная, на мужа Аліна Сяргееўна.

— Са старэйшымі пакуль пачакаем. А потым відаць будзе... Можа, што-небудзь і для старэйшых прыдумаем. Скажам, самі старэйшых вучыць будзем, а меншых вучыць будуць васьмікласнікі, дзевяцікласнікі... Ці, можа, хто-небудзь яшчэ і з настаўнікаў вернецца. Падумаўшы, раскінуўшы галавою, усё зрабіць можна. Абы толькі жаданне...

Аліна Сяргееўна — што ёй заставалася рабіць — згадзілася з Андрэем Макаравічам. І самой ёй, калі шчыра прызнацца, не хацелася дома, у хаце, без працы сядзець. Адпачыла з дарогі — і хопіць. Ды і жыць жа з нечага трэба было! Поля яны з мужам не сеялі, жыўнасці ніякай, нават курэй, не трымалі. Елі хлеб, можна сказаць, з зарплаты. Хоць цяпер ніхто зарплаты ім плаціць не збіраўся, аднак жа людзі ёсць людзі: змовяцца, нешта прыдумаюць, калі настаўнікам туга з харчамі будзе. Ды яно і было ўжо туга. Бульбай у асноўным прабаўляліся. Той бульбай, што ўдалося накапаць на гародзе. Але і бульбы было ў іх не так багата. А наперадзе ж зіма доўгая, халодная. І гэта рамантык Андрэй Макаравіч ні пра што іншае не думаў, як пра заняткі ў школе. А яна, Аліна Сяргееўна, думала. Думала пра ўсё, у тым ліку і як пракармiцца, што на снеданне, абед і вячэру згатаваць, на стол мужу падаць.

— Ну, калі ты згодна са мною, дык трэба і не адклад-

ваць, праз які дзень і пачынаць заняткі,— хадзіў па хаце, гаварыў, разважаў уголас Андрэй Макаравіч.— Няхай, ну і няхай!

— З начальствам трэба было б параіцца!

— З якім начальствам?

— Ну, якое ёсць.

— Дык няма ж ніякага начальства. Кажуць, Іван Дарошка да нядаўняга быў, быў і Васіль Кулага. Але яны зніклі недзе. Ды і што раіцца — пачынаць вучыць дзяцей трэба, і так ужо колькі часу прапушчана...

— Ці збяруцца дзеці?

— Збяруцца. Засумавалі ж па вучобе... І самі ў мяне пыталі, і бацькі іхнія. Каго ні сустрэнеш, дык і: «Андрэй Макаравіч, а заняткі ў школе калі?..»

Не памыліўся Андрэй Макаравіч — засумавалі, замаркоціліся дзеці па вучобе. І ў школу сабраліся, як і аб'яўлялася, роўна а дзевятай — усе па-святочнаму прыбраныя, піянеры — з чырвонымі гальштукамі на шыі. Як і заўсёды ў першы дзень заняткаў, пастроіліся на школьным двары пакласна. І трэба было бачыць Андрэя Макаравіча ў тую хвіліну, калі ён падняўся на ганак, зазваніў у званок і сказаў:

— Дзень добры, дзеці! Віншую вас з пачаткам новага навучальнага года!

Усе, хто бачыў яго тады, у тую хвіліну, казалі: быў ён натхнёны і горды, як ніколі.

## XXIII

Доўга стаяў Яўхім Бабай, не ведаючы, куды падацца, калі завялі яго ў падвал нейкага цаглянага дома, адчынілі дзверы і ўпіхнулі туды. Надта ж цёмна было там, дзе ён нечакана для сябе апынуўся. Ды і асвойтаўшыся, аглядзеўшыся, убачыў Яўхім Бабай, што не толькі ісці, але і кроку ступіць нельга — усюды на падлозе сядзелі, ляжалі, стаялі, прыхінуўшыся да сцен, людзі. У асноўным гэтакія ж, як і ён, вяскоўцы — мужчыны, жанчыны.

— Ета ж чаму вас тут столькі? — спытаў, здзіўлены, Яўхім Бабай.

— Не ў нас, а ў іх спытай,— паказаў галавою на дзверы, сказаў нейкі незнаёмец, што стаяў бліжэй да Яўхіма,— з барадою, хоць зусім яшчэ і не стары.— Яны ўсё ведаюць.

Без году тыдзень тут, на нашай бацькаўшчыне, а ўсё ведаюць! І хто калі кім быў, і хто калі каму служыў, і хто калі недаплаціў ці пераплаціў...

— Хваробу яны б што ведалі, калі б самі мы такія языкастыя не былі, не падказвалі,— пачуўся аднекуль з кута чыйсьці разважлівы голас.— Быццам дурні якія, пальцам адзін на аднаго... Той раскулачваў, а ў таго дзядзька старшынёй калгаса быў. Цьфу, як падумаеш!

— Немцам што? — падняла галаву, умяшалася ў гаворку мужчын жанчына, што сядзела над развязанаю торбаю, мусіць, перакусвала.— Ім абы больш нас знішчыць, на той свет загнаць.

— Чаму ета? — пытаў у жанчыны старэчы голас.

— Бо зямля наша немцам трэба. У іх, у Нямеччыне, цесна, не хапае нават дзе хаты ставіць.

— Не мялі глупства,— павярнуўся тварам да жанчыны барадач.— Зямлі і ў нас, і ў Гітлера хапае. Не з-за зямлі Гітлер вайну пачаў, на нас напаўшы.

— А чаму ж? — разявіла рот жанчына.

— Бо хоча, каб немцы ўсе панамі былі, а мы рабамі. Ідэалогія такая фашысцкая, разумееш.

— Ды не,— азваўся нехта зноў з кута.— Гітлер не таму на нас напаў. Гітлер хоча камуністаў вынішчыць, калгасы распусціць. Каб жылі, як некалі, аднаасобна!

— Пачакай, пажывеш! Вось прыстрэляць, аднаасобна ляжаць будзеш,— асадзіў нямецкага падпявалу барадач.

— Каб жа аднаасобна! А то і на тым свеце аднаасобніцтва немцы не дапусцяць. У агульную магілу ўкінуць! Ды і не ў магілу, а ў яму, дзе гліну капалі...

— О-ё-ёй! — заґаласіла, запрычытала кабета, уткнуўшыся тварам у торбу.— І за што пакуты такія?

— За грахі. Не цанілі таго, што мелі, усё лепшага чагосьці хацелі!

— Дык ета ж і правільна! А нашто горшага хацець?

— Не падчыняцца гадам трэба, а біць іх!

— Наб'еш! За аднаго іхняга злыдня нашых вунь па дзесяць чалавек страляюць!

— Усіх не пастраляюць!

— Вешаць будуць, труціць газамі, як прусакоў!

— Кіньце вы! Чаму ета яны нас, а не мы іх?

— І то праўда! Нас больш, мы і пераможам!

— Перамаглі ўжо. Аж да Масквы адступілі!

— І пры Напалеоне адступалі да Масквы. А верх усё

адно не за французамі, а за намі быў! І туга давядзецца тым, хто да немцаў перакінуўся, служыць да іх пайшоў.

— Пакуль ім туга, дык нам ужо невыносна!

— Вынесем! «Вынесем всё, что господь ни пошлет»,— пачаў нехта чытаць на памяць паэта, Някрасава.

— На бога спадзявайся, а сам не плашай!

— А чаго ж нам плашаць? Жылі і будам жыць.

— А як расстраляюць?

— Нічога, дзеці астануцца, унукі!

Падвал гаманіў, людзі выказвалі, што думалі.

— Браткі, браткі, не распускайце языкоў! — перасцерагаў хтосьці больш вопытны.— Фіскалаў бойцеся!

— А хто ета такія — фіскалы?

— Даносчыкі. Во данясуць, пра што мы тут гаворым,— прапалі.

— Ваўкоў баяцца, у лес не хадзіць! Падумаеш, Амерыку немцам нехта адкрые. І так яны ведаюць, без даносчыкаў, што ненавідзім мы іх.

— Ненавідзім-то ненавідзім, а лепш далей ад ліха быць!

— Двойчы не паміраць!

— Яно каб адзін быў, дык і памерці не страшна. Але ж дзеці малыя дома. Як яны там, бедныя?

— Не загінуць дзеці, людзі дагледзяць!

— Людзі так не дагледзяць, як сам бы дагледзеў!

— Ета праўда!

— Праўда-то праўда, але ж і здавацца гадам, маўляў, рабіце, што хочаце, што ў галаву каму ўзбрыдзе, мая хата з краю, я нічога не знаю...

— Хо-хо, хто ета там такі смелы? Во пападзеш да Кандрата Астапавіча, паглядзім, што запяеш.

— А хто такі Кандрат Астапавіч?

— Начальнік паліцайскі.

— Я ведаю, што начальнік паліцайскі. Але хто ён, адкуль узяўся?

— Ды, мусіць, з етых, з кулакоў.

— Ты думаеш? Хе-е!

— А хто ж?

— Немцы з сабою прывезлі. А хто ён — ніхто толкам не ведае. Толькі хіба сам...

— Не, такога не бывае, каб ніхто не ведаў. Жонка ж у яго, дзеці ёсцека.

— У тым і штука ўся, што адзін жыве.

— Да нашага берагу нічога людскага не прыплывае.

— Не наракай. Багавік быў, Раман Платонавіч... Во, ета галава, чалавек!

— Быў, ды сплыў.

— Абы жывы. Не каля нашага берагу, дык каля іншага выплыве, аб'явіцца. Добрыя людзі доўга жывуць. Нават калі і гінуць, усё адно жывуць. У памяці людской...

— Піць, піць! — прастагнаў нехта.

І людзі раптам сціхлі, нібы ўспомнілі тое, пра што забылі. Павярнулі галовы да невялікага акенца, што даволі высакавата было, зарашочанае кратамі,— недзе адтуль, з таго боку чуўся стогн. Яўхім Бабай паглядзеў туды. І зжахнуўся — на падлозе ляжаў, уткнуўшыся тварам у кут, чалавек у зялёным салдацкім галіфэ і белай, мусіць сподняй, акрываўленай кашулі. Некалькі чалавек кінуліся ў кут, пачалі даваць чалавеку ваду, абціраць з твару кроў... Пайшоў ад дзвярэй, каб дзе-небудзь прымасціцца ці прысесці, і Яўхім Бабай. І добра зрабіў, што пайшоў, бо ледзь толькі ён скрануўся з месца, як дзверы адчыніліся і ў падвал не ўвялі, а ўкінулі яшчэ аднаго зусім збітага, акрываўленага, мусіць, без памяці, чалавека. Чалавек не стаяў на нагах, тут жа ўпаў, паваліўся на падлогу.

— Во лютуюць, во лютуюць! — прастагнаў скрозь зубы з нянавісцю барадач.

— А што ж ім яшчэ рабіць, етым галаварэзам! Прывалакліся на пакуту ды згубу!

— Хопіць язык вастрыць! Лепш давайма паможам...

— Ой, можа, і нас тое самае чакае...

Нехта ўсхліпнуў, пачаў смаркацца, шморгаць носам.

— І за што ж ета, за што ж яго? — вохкаў жаночы голас.

— Што немцаў ненавідзіць, не здаецца ім! Во, во за што!

Чалавека абступілі з усіх бакоў, панеслі бліжэй да акна, дзе святлей было, паветра свяжэйшае. Узяліся і мужчыны, і жанчыны абмываць, абціраць з твару кроў, даваць ваду. Але чалавек не піў — толькі чуваць было, як стукала аб зубы конаўка.

— Мо нежывы ён? — усклікнуў нехта.— Паглядзіце, ці дыхае!

— Дыхае! — пачуўся ад акна голас.— Не чапайце, хай паляжыць, адпачне. Ды акна, акна не засланяйце...

«Куды я трапіў? — палохаўся ўсё больш і больш Яўхім Бабай.— І за што? З чыстай душою ішоў, а мяне... Куды ўкінулі? І збілі ж таксама на горкі яблык...»

«Павесім! Ножкамі дрыгаць будзеш! — успомніў ён пагрозу і Кандрата Астапавіча, і каменданта.— Як не пацвердзіцца ўсё тое, што ты казаў,— павесім!»

«І павесяць, не пашкадуюць!»

Сеў, зашыўся ў самы цёмны кут, прыхінуў галаву да сцяны, заплюшчыў вочы. Уявіў на хвіліну — шыбеніца дзесьці на плошчы, пятля, зробленая з канаплянай вяроўкі, і ў ёй, гэтай пятлі, матляецца нежывы ён, Яўхім Бабай...

«Не, што заўгодна, толькі не ета... Не ета! На каленях буду поўзаць, прасіцца... Ды і невінаваты я, ні ў чым невінаваты...»

А падвал жыў сваім жыццём. Адчыняліся і зачыняліся дзверы, прыводзілі адных, забіралі другіх. Не сціхалі людскія галасы — гудзелі і гудзелі, усё нешта абмяркоўвалі, абмяркоўвалі... Што — Яўхім Бабай ужо не слухаў, быў заняты сабою, сваімі думкамі.

«Кеб толькі не марудзілі немцы, хутчэй у Вялікі Лес ехалі! І кеб людзі пацвердзілі ўсё, што я казаў. Можа б, тады мяне і не павесілі, выпусцілі б адсюль, з падвала етага...»

«А калі не пацвердзяць?»

«Не, такога быць не можа!.. Не можа такога быць! Я ж не брахаў. Чыстую, як ёсць, праўду казаў».

## XXIV

Некалькі дзён запар дзьмуў халодны, пранізлівы вецер. Ён ачысціў неба, разагнаў рэшткі змрочных асенніх хмар, падсушыў гразь на дарогах. Было ядрана, і лужы зацягліся за ноч коўзкім, храбусткім лядком. Паказвалася сонца, але не грэла, ані не грэла ўжо яно. Старыя людзі казалі: блізка зіма. І яны не памыляліся. Прачнуўшыся неяк, велікалесаўцы ўбачылі: усё навокал скаваў моцны мароз-галашчок.

Гнілая восень скончылася. Ішла, імчала лютая, завейная зіма.

І тады ж адразу прыехалі ў Вялікі Лес немцы. Прыехалі, калі іх ніхто не чакаў, не ведаў нават, што яны прыедуць. Пранесліся, як віхор, сюды-туды па вуліцы на машынах і матацыклах, акружылі з усіх бакоў вёску. І пачалі бегаць па дварах, выганяць з хат людзей, загадваць, каб усе, і старыя, і малыя, ішлі да клуба, туды, дзе быў сельсавет і дзе заўсёды збіраліся людзі, калі штонебудзь здаралася важнае.

Жанчыны акурат палілі ў печах. Але чакаць, калі яны папораюцца, управяцца, ніхто не стаў: «Вэк! Вэк!» — чулася тут і там. І жанчыны, заліўшы ў печы вадою агонь і ўскінуўшы на плечы якую-небудзь апранаху — першую, што трапляла на вочы, хапалі дзяцей і беглі, спяшаліся, куды ім гаварылі, загадвалі. Паважна, задуменна, таячы ў душы трывогу, ішлі ўслед за мітуслівымі кабетамі і мужчыны, тыя, хто не быў у арміі, падлеткі. На немцаў, што стаялі з аўтаматамі ў кароткіх, па калені, шынялях і ў касках, насунутых на самыя вочы, глядзелі з цікавасцю і страхам.

І гадзіны не мінула, а ля клуба на майдане вёска сабралася ўся. Насцярожаная, спалоханая, а таму незвычайна маўклівая. Кожнага тачыла, мучыла адно: «Чаму сагналі людзей, што задумалі чужынцы?»

З расчыненых нахлашч дзвярэй сельсавета выйшаў тоўсты немец, не ў касцы, як былі ўсе астатнія, а ў шапцы з казырком і загнутым верхам, мусіць, афіцэр; за ім — яшчэ некалькі чалавек, сярод іх і двое цывільных: адзін прысадзісты, круглы, што клубок, у галіфэ, хромавых бліскучых ботах, з белаю павязкаю на рукаве, другі вушасты, з доўгім глюгастым носам. Уся світа паднялася па сходках, што былі прыстаўлены да грузавой машыны, у кузаў, нібы на памост, абвяла вачыма натоўп людзей, што тапталіся, акружаныя з усіх бакоў нямецкімі салдатамі. І ў цішыні, што запанавала раптам, усе пачулі зычны, як брэх сабакі, голас:

— Ахтунг! Ахтунг!

Гаварыў той, што быў не ў касцы, а ў шапцы з казырком і загнутым верхам. Гаварыў не спяшаючыся, гучна вымаўляючы кожнае слова, час ад часу кідаючы на людзей злосныя, іскрыстыя позіркі. Але таго, што ён гаварыў, ніхто не разумеў. І гэта яшчэ больш насцярожвала, палохала людзей. Немец нечакана скончыў, і тады наперад падаўся той, што быў у цывільным, вушасты, з доўгім глюгастым носам.

— Увага! Увага! — перакладаў ён тое, што гаварыў немец.— Перад вамі выступаў камендант. Ён сказаў, што доблесная нямецкая армія фюрэра Адольфа Гітлера вызваліла вас ад бальшавікоў, прынесла вам волю. І вы, усе да аднаго, павінны памагаць немцам наводзіць новы парадак. Хто не будзе слухацца загадаў каменданта і новых нямецкіх улад, таго чакае жорсткая кара. У трохдзённы тэрмін здаць зброю, якая ёсць у каго-небудзь на руках,

радыёпрыёмнікі. Хто не выканае гэтага загаду — расстрэл. Па лясах швэндаецца цяпер шмат чырвонаармейцаў і розных падазроных асоб — бальшавікоў, былых савецкіх служачых. Хто пусціць іх да сябе начаваць, будзе даваць яду альбо будзе ведаць, дзе яны знаходзяцца, і не заявіць, таго спасцігне тая ж кара — расстрэл ці павешанне. Шкодніцтва, сабатаж будуць карацца таксама па законах ваеннага часу. Яшчэ ў верасні месяцы былі спалены масты, з-за чаго ваша вёска, ды і некаторыя іншыя, знаходзілася ў безуладдзі да сённяшняга дня... Мы разбіраемся, хто спаліў масты, і вінаватыя будуць расстраляны...

Глюгасты змоўк, зноў загаварыў камендант:

— Мі не хоча стрэляйт, кто нам служыт. Мі буду стрэляйт, кто не служыт.

Павярнуўся да глюгастага, зноў загаварыў па-нямецку. Глюгасты паслужліва ўзяўся перакладаць:

— Камендант кажа, што вам трэба выбраць сёння сабе старасту. Каго вы хацелі б мець за старасту? Называйце.

Натоўп маўчаў — кожны апусціў у зямлю вочы: хоць бы не я, не мяне...

— А можа, сам хто жадае быць старастам?

Гэта сказаў той, што быў таксама ў цывільным, каратканогі і круглы, што клубок, з белаю павязкаю на рукаве. Сказаў нягучна, нібы баючыся. Глюгасты пераклаў немцу тое, што сказаў цывільны з белаю павязкаю...

— Я, я...— згадзіўся з ім немец.— Кто сам желайт?

І абвёў сурова вачыма натоўп.

Людзі ўсе як адзін маўчалі. Быццам вады ў рот панабіралі.

— Что, нет желайт?..— пытаў немец. І раптам падняў палец, паказаў на кагосьці: — Ты не желает быць староста?

І ў цішыні раптам людзі пачулі грудны, знаёмы ўсім голас Пархвіра Рыкуля:

— Дзе ўжо мне быць старастам, я стары, нядужы... Няхай хто-небудзь з маладзейшых...

— Кто маладзейшых,— быццам усміхнуўся, насцярожыўся немец.

— Апанас Харчэня...

Ніхто не пачуў, хто вымавіў гэта імя. Нават не вымавіў, а выдыхнуў. Выдыхнуў, як збавенне. І натоўп раптам зашушукаўся, загаманіў:

— Аге, ён працаваў у сельсавеце, усё ведае...

— Яму і карты ў рукі, няхай кіруе!

— Кто такой Харчэня? Сюда! — ужо не гаварыў — камандаваў немец, камендант.

Як затраўлены звер, ні жывы ні мёртвы, белы, быццам палатно, увесь трасучыся, калоцячыся, бы асінавы ліст, выйшаў, прабраўся праз натоўп наперад Апанас Харчэня, стаў перад камендантам.

— Ты Апанас Харчэня? — тыкаў, паказваў пальцам на яго камендант.

— Я,— сказаў, праглынуўшы даўкі камяк, Апанас.

— Корошо! Стараста ест. Но... Нам нужен ешчо начальнік паліцыя,— не спяшаўся, гаварыў камендант.— Кто желайт быць сам начальнік паліцыя?..

— Я!

У першую хвіліну ніхто не зразумеў, хто сказаў, выкрыкнуў гэтае слова. Пачалі азірацца, перапытваць адзін у аднаго: хто, хто хоча быць начальнікам паліцыі?

— Сюда! — паказаў пальцам на месца, што было ля Апанаса Харчэні, камендант.

Распіхваючы рукамі і плячыма людзей, наперад да машыны выйшаў той, каго вёска ўжо трохі ведала — па размовах, а хто і бачыў.— Клаўдзі Коўдравай прымак, Змітро. Рыжы, як яго ўсе звалі за вочы.

— Ты желайт быць начальнік паліцыя? — пытаў камендант.

— Так, я жадаю!

— Кто ты ест?

— Я з раскулачаных, у турме пры бальшавіках сядзеў. Завуць мяне Змітро, прозвішча — Шламак.

— Корошо, очэнь корошо! — глядзеў то на Змітра Шламака, то на таго ў цывільным, што быў з белаю павязкаю на рукаве, камендант. І ўжо не пытаючы, ці згодны людзі, каб начальнікам паліцыі быў той, хто сам назваўся, лічы, напрасіўся, камендант закрычаў, загарлапаніў зноў, зрываючыся на брэх, нешта да ўсіх па-нямецку. Калі камендант скончыў, глюгасты пераклаў, што гаварыў камендант:

— Стараста і начальнік паліцыі — гэта новая ўлада цяпер у вашай вёсцы. Нікога іншага не слухацца, слухацца толькі немцаў ды іх. Выконваць усё, што ні загадаюць. За невыкананне загадаў вінаватыя будуць дастаўляцца ў камендатуру і жорстка карацца. Хайль Гітлер! Старасту, начальніку паліцыі астацца, астатнім можна разысціся па хатах!..

Натоўп заварушыўся, загуў — людзі, радыя, што іх адпускаюць, дазволілі вяртацца дадому, імкліва, угнуўшы ў плечы галовы, разыходзіліся, разбягаліся з майдана. Зрэдку, сутыкнуўшыся адзін з адным, пыталі:

— Што ета? — і з апаскай азіраліся назад, дзе асталіся Апанас Харчэня, Рыжы і немцы.

— А то не ведаеш? Ета, брат, фашызм... Акупацыя...

# Частка трэцяя

Фашызм... Акупацыя...

Многае, вельмі многае забудзецца, сатрэцца з чалавечай памяці, нібыта яго і не было, бо і не запісваецца нідзе, ды ўсяго і нельга, нават каб і хацеў, запомніць. Але тое, што рабілася на нашай зямлі ў тыя чорныя, напоўненыя нечаканасцямі і жахам дні і ночы, як, нягледзячы на гвалт, здзек і прымус, жылі і змагаліся з ненавісным ворагам — карычневай гітлераўскай чумой — людзі, будзе помніцца, не забудзецца. Ніколі, ніколі не забудзецца.

## I

Нішто так не губіць чалавека, як боязь, нясмеласць. Ведаў тое ці не ведаў Апанас Харчэня — цяжка сказаць. Ды і не галоўнае гэта — важна іншае: вынік. А вынік якраз і быў самы што ні ёсць сумны: падзеі, жыццё падхапілі Апанаса Харчэню, панеслі, як трэску,— завярцелі, закруцілі ў сваім віры. І што дзівіла: хлопец доўга нічога не разумеў, не адчуваў — быў быццам у здранцвенні, нейкім няўцямным сне, ані не ўсведамляў, куды нясе яго плынь. А калі зразумеў, усвядоміў — позна, па часе было... А мог жа, мог у час спахапіцца, апомніцца, узяць сябе ў рукі, знайсці выйсце з таго становішча, у якое нечакана трапіў, у якім апынуўся. І там, ля Дняпра на пераправе, і тут, дома, у Вялікім Лесе. Нават калі назвалі яго старастам быць, яшчэ не ўсё страчана было. І Пархвіра Рыкуля назвалі, аднак жа не пайшоў той немцам служыць. І ён, Апанас Харчэня, таксама мог адмовіцца, сказаць, што малады, нявопытны, іншае нешта прыдумаць, каб на службу да немцаў не ісці. А раптам і абышлося б, не зачапілі б. А так...

«Навідавоку цяпер я... Пачнуць цікавіцца, хто я, дзе дагэтуль працаваў. І пра ўсё даведаюцца... Што зробяць яны са мною?» — думаў, трывожыўся Апанас. І тады, калі не адпусцілі разам з усімі, а пакінулі ў сельсавеце і распытвалі то пра Яўхіма Бабая, хто ён і ці можна яму верыць,

то пра Івана Дарошку і Васіля Калугу, бо дайшло да Ельнікаў, быццам гэта не хто іншы, а яны, былыя старшыні, масты спалілі, і потым, калі чужынцы паехалі з Вялікага Лесу і Апанас, развітаўшыся з Рыжым — Змітром Шламаком, не дадому, у сваю хату, падаўся, а чамусьці ў поле, у лес пайшоў — можа, таму, што не хацелася ні з кім з людзей сустракацца, цягнула пабыць аднаму, сам-насам са сваімі думкамі.

«І трэба ж акурат у вёску мне вярнуцца. Затрымаўся б дзе-небудзь да халадоў — і ўсё, некага б іншага за старасту прызначылі. А цяпер... Чым, чым усё скончыцца? Данясуць жа, скажуць, хто я...»

«Малады быў адрачыся ад таго».

«Але ж... Ад чаго адракацца? Што кепскае Савецкая ўлада зрабіла?»

«З працы, з сельсавета... Ды і дзядзьку... Во, во, пра гэта, на выпадак чаго, можна ў апраўданне сваё немцам сказаць».

«Ці даруюць, ці павераць? А калі і даруюць, павераць, служыць жа прымусяць. І літасці ад іх не чакай. Калі толькі што якое... Усё, усё ўспомняць, прыгадаюць».

Невясёлыя, сумныя думкі лезлі ў галаву Апанасу. І адчуваў, разумеў ён — не лягчэй, ані не лягчэй яму будзе жыць, як жылося.

«Паспрабаваць адмовіцца?»

«Але як?»

«І старастам жа быць, немцам служыць...»

Не хацелася, ані не хацелася Апанасу быць старастам, служыць немцам. Усё, усё ў ім пратэставала, было супраць гэтага.

«Толькі прызначылі, паставілі, а ўжо і пра Яўхіма Бабая, і пра Івана Дарошку, Васіля Кулагу спыталі... А потым, потым што яшчэ спытаюць? Ды не толькі спытаюць, а і рабіць загадаюць, прымусяць. Не зробіш — адказваць давядзецца...»

«А зробіш — адказваць таксама ж давядзецца... Вось як толькі немцаў прагоняць, нашы вернуцца — так і адказвай...»

Не ведаў, не ведаў Апанас, што рабіць яму, як жыць, каб і немцы яго не зачапілі і не служыць ім, чыстым, незаплямленым перад сваімі быць.

І зноў, як і дагэтуль ужо неаднойчы, шкадаваў Апанас, што ранейшага жыцця вярнуць не можа, так нечакана парушылася яно.

«Ананімка тая... А потым вайна... Закруцілася, завярцелася... І чым далей, тым не лягчэй, а горш і горш... І выйсце дзе, дзе паратунку шукаць?..»

...Ішоў Апанас і не бачыў, куды ногі яго нясуць, куды ідзе...

## II

Цыганы гаварылі праўду — у лесьнічоўцы пад Дубровіцай сапраўды хтосьці жыў. Бо, як толькі Васіль Кулага наблізіўся да паляны, яго аклікнулі:

— Стой! Ні з месца!

Васіль спыніўся.

— Хто ты? І куды ідзеш? — вёў допыт невядомы чалавек, схаваўшыся за камель тоўстага карыстага дуба і наставіўшы на Васіля рулю вінтоўкі.

— Я — з Вялікага Лесу. Старшыня калгаса.

— Куды ідзеш?

— У лесьнічоўку.

— Чаго?

— Мне сказалі, тут ёсць людзі. А я... Шукаю людзей...

— Якіх людзей?

— Івана Дарошку... Ці каго-небудзь з раённага начальства.

— Навошта гэта табе?

— Трэба.

Чалавек за дубам памаўчаў, потым раптам выйшаў на чыстае. Загадаў:

— Ідзіце, я за вамі...

Васіль скрануўся з месца, пайшоў. Пайшоў, не адстаючы ні на крок, услед за ім і той незнаёмы чалавек са зброяй, што нечакана запыніў яго і вёў допыт. Было ў гэтай хадзе нешта непрыемнае, нязвыклае. І Васіль адчуваў гэта не толькі розумам, але і ўсім целам, асабліва спіной, патыліцай. Урэшце не вытрымаў, сказаў:

— Можа, я адзін пайду?

— Не размаўляйце, выконвайце, што вам загадваюць! — быў даволі суровы адказ.

Выйшлі з лесу на паляну, па сцежачцы, што была добра вытаптана ў жухлай асенняй траве, папраставалі да лесьнічоўкі.

Іх, мабыць, убачылі з акна, бо не паспелі пераступіць парог сенцаў, як дзверы лесьнічоўкі адчыніліся і насустрач

ім выйшаў... Васіль у першую хвіліну аж не паверыў... Раман Платонавіч Багавік... Хоць быў ён апрануты ва ўсё вайсковае, нават шынель на плечы наапашкі накінуў, але Васіль, вядома ж, пазнаў сакратара райкома. Па ўсмешцы, вачах пазнаў.

— Раман Платонавіч, добры дзень! — узрадаваўся Васіль.

— Добры дзень, Васіль Цімафеевіч,— падаў, як і заўсёды пры сустрэчы, руку Багавік.

Бачачы, што затрыманы чалавек не выпадковы, той, хто яго запыніў у лесе і цяпер суправаджаў, стаў па стойцы «смірна», прыклаў па-вайсковаму руку да шапкі — звычайнай, паношанай кепкі,— спытаў гучна ў сакратара райкома:

— Дазвольце ісці, несці і далей службу?

— Калі ласка, калі ласка...— усміхаўся — па ўсім відаць, рады — Багавік.

Чалавек пайшоў зноў у лес, а Багавік, абняўшы рукою Васіля Кулагу, вывеў яго з сенцаў.

— Пойдзем, пагаворым,— сказаў амаль шэптам.— У леснічоўцы людзі, таму лепш куды-небудзь у іншае месца падацца. Што там у вас, у Вялікім Лесе?

— Ды быццам нічога.

— Немцы былі?

— Пакуль што не.

— Малайцы вы з Іванам Дарошкам, малайцы. Я і Івану гэта казаў і табе скажу. Здагадаліся масты папаліць.

— Гэта Іван параіў. Дарэчы, ён знік, як у ваду кануў. Вы часам не ведаеце, дзе ён?

— Чаму ж, ведаю,— усміхнуўся Раман Платонавіч.— Ён заданне вельмі важнае выконвае.

— Якое заданне?

— Гэтага я сказаць не магу. Заданне райкома партыі.

— Вы яго кудысьці паслалі?

— Ага.

Раман Платонавіч памаўчаў, потым дадаў:

— А наогул, цяпер ваенны час. І ведаць... Трэба толькі тое, што неабходна. Астатняга лепш не ведаць.

— Вы так лічыце? — аж спыніўся, паглядзеў на Рамана Платонавіча — вочы ў вочы — Васіль Кулага — якраз міналі паляну, уваходзілі ў лес.

— А вы што,— перайшоў на «вы» і таксама спыніўся Раман Платонавіч,— хіба не згодны са мной?

— Не згодзен,— закруціў галавою Васіль Кулага.—

Чалавек павінен ведаць заўсёды як мага больш. Ва ўсякім выпадку, імкнуцца да таго, каб ведаць!

— Гэта не ў ваенны час.

— У любы, у любы час.

— А калі да ворага ў рукі трапіць?

— Гэта ўжо іншая справа. Тайны, вядома, павінны быць. Але нам, хто астаўся ў тыле ворага, хаваць адзін ад аднаго...

— Ніколі ўсяго ведаць не будзеш. Ды і не трэба. Кожны ведаць павінен сваё. І... Э-э...— Раман Платонавіч нешта недагаворваў.— А калі шчыра, дык вайна агаліла нашы недахопы, паказала, што мы часам рабілі не тое, што трэба было рабіць,— сказаў з болем, душэўнай пакутай Раман Платонавіч.

— Нельга ніколі ўсяго прадбачыць, хоць, мусіць, да гэтага трэба імкнуцца,— быццам згадзіўся і разам з тым не згадзіўся з Раманам Платонавічам Васіль Кулага.— Да слова, гэта заўсёды мучыць мяне. Я думаў, адзін я такі,— прызнаўся ён, трохі счакаўшы.— А выяўляецца, і іншыя таксама... Не можа чалавек сваім розумам усё ахапіць, улічыць, узважыць і даць беспамылковае сцверджанне...

— Бо фактаў, якія ўплываюць на тую ці іншую падзею, шмат,— як бы прадоўжыў думку Васіля Кулагі Раман Платонавіч.— Ды і... Жывыя ж людзі. У кожнага свае меркаванні, погляды, характар, магчымасці... Словам, усё сваё. І не ўсе пра справу агульную дбаюць, некаторыя думаюць больш пра сябе, пра свае асабістыя інтарэсы і выгады. А вайна патрабуе іншага — сябе не шкадаваць, ахвяраваць самым дарагім, нават жыццём, у імя справы тых, хто астаецца, будзе жыць пасля нас... І такія ёсць, іх пераважная большасць. Куды ні пашлеш — ідуць, бо ведаюць: трэба ісці, трэба рабіць усё, каб спыніць ворага, а потым, разграміўшы, і прагнаць яго з нашай зямлі...

— Раман Платонавіч, скажыце, а дзе цяпер вораг? — спытаў пра тое, што мучыла, не давала спакойна гаварыць пра іншае, Васіль Кулага.

— Вораг далёка зайшоў,— не падымаючы вачэй, глядзеў некуды ўбок, у зямлю, сакратар райкома.— Па некаторых звестках, ды так яно, мусіць, і ёсць — вораг дайшоў амаль да Масквы. Але нас гэта не палохае. Не павінна палохаць! На барацьбу з ворагам падняўся ўвесь народ. Нічога ніхто не шкадуе дзеля перамогі. І перамога будзе, прыйдзе яна, абавязкова прыйдзе. І не хто-небудзь, а мы, народ наш пераможа.

— У гэтым я не сумняваўся і не сумняваюся,— сказаў як даўно вынашанае, вядомае Васіль Кулага.— Калі што і турбуе мяне, дык гэта калі перамога тая будзе. Ды і страты, ахвяры, якія мы панясём у барацьбе з ворагам.

— Гэта турбуе не аднаго вас, а ўсіх. Што я думаю пра тое, што вы сказалі? Цяжка, амаль немагчыма прадбачыць, як будуць развівацца далей падзеі. Ясна пакуль што адно — вораг моцны, да вайны ён падрыхтаваўся і рвануў бачыш як... Але ўтрымаць захопленую тэрыторыю? Ды яшчэ калі мы тут? Не здолее вораг. І гэта правільна, мудра — на захопленых ворагам землях трэба разгарнуць шырокую, жорсткую ўсенародную барацьбу. Не даваць ворагу падвозіць да фронту жывую сілу і тэхніку, знішчаць яе. Падрываць цягнікі, масты, разбураць чыгуначнае палатно і дарогі. Словам, наносіць удары і шкоду ўсюды, дзе вораг не чакае. Праглынутая ворагам, але не засвоеная зямля будзе раз'ядаць яго нутро. Давядзецца ворагу здымаць вайсковыя часці, кідаць іх на падаўленне народнага гневу. Тады і войскам нашым лягчэй будзе з сілаю сабрацца, спыніць ворага, а потым і пагнаць яго назад да Берліна. Што ж да ахвяр... Яны, на жаль, будуць, бо барацьба ідзе не на жыццё, а на смерць, мы абараняем родную зямлю, уладу нашу, самае дарагое, што мы маем... Абараняем ад глуму, здзеку, знішчэння...

Раман Платонавіч памаўчаў, падумаў, потым гэтак жа непаспешна і ціха, хоць навокал і лес быў, ніхто іх не чуў і не мог чуць, гаварыў, разважаў далей:

— І чым хутчэй на занятай ворагам тэрыторыі зробім фашыстам пекла, тым хутчэй прыйдзе вызваленне, перамога. Гэта я ведаю, у гэтым я перакананы. І каб менш было ахвяр, думаць больш трэба, расставіць нашых людзей так, каб усюды яны былі, каб мы ўсё, кожны крок ворага ведалі і прымалі належныя захады. Менш, як можна менш ва ўсім стыхіі. А калі яна і ўзнікае, кіраваць ёю, падначальваць агульным інтарэсам і задачам, больш ва ўсім арганізаванасці. І ў спалучэнні з народнай ініцыятывай, гераізмам, самаадданасцю, верай у перамогу... Не, не ўтрымаюцца доўга на нашай зямлі фашысты, мы былі і будзем тут гаспадарамі. Але, вядома, гэта ані не павінна нас заспакойваць, расхалоджваць. Вораг каварны, вопытны. І мы павінны рабіць усё, усё дзеля нашай перамогі. Вось вы з Іванам Дарошкам здагадаліся масты спаліць... Учора гэта было выдатна, а сёння... Ужо мала. Вораг усё адно наведае Вялікі Лес. І як бы добра было перастрэць яго на дарозе,

абстраляць, а то і знішчыць! Што чуваць у вас там з баявой групай? — павярнуўся Раман Платонавіч да Васіля Кулагі, паглядзеў яму зноў у вочы.

— Ды, можна сказаць, нічога...— насупіўся, адвёў свае вочы ўбок Васіль Кулага.

— Што значыць — нічога? — не разумеў Раман Платонавіч.

— Прыходзілі да мяне людзі, прасіліся,— прызнаўся Васіль.— Але я... Івана Дарошку чакаў, каб з ім параіцца. А яго... Няма і няма. Вось таму і не вытрымаў, да вас прыйшоў...

— Гэта добра, што прыйшлі. А вось што на кагосьці іншага спадзяваліся, сядзелі, чакалі, гэта... Нікуды не варта. Цяпер ваенны час. І той жа Іван Дарошка можа ніколі не вярнуцца. Як і кожны з нас. Таму вельмі важна самому, без каго б там ні было, праяўляць ініцыятыву, прымаць рашэнні. Асабліва калі размова ідзе пра арганізацыю барацьбы, пра знішчэнне ворага...

— Чуў я, здаецца, пад Навасёлкамі хтосьці перастрэў немцаў, абстраляў, аднаго забілі. Дык, прыехаўшы ў вёску, немцы дзесяць чалавек нашых застрэлілі,— сказаў з сумам Васіль Кулага.

— Ведаю я гэты факт. Але і не перастракаць фашыстаў, не забіваць... Не можам мы!

— Правільна — фашыстаў біць трэба! Але як — вось пра што думаць нам трэба! А калі за кожнага забітага будзе гінуць па дзесяць нашых...

— Гэта знарок фашысты робяць, каб застрашыць людзей, каб баяліся на іх, фашыстаў, нападаць, выдавалі сваіх — тых, хто не скараецца, б'е гадаў. Але сваіх ворагаў людзі нашы ведаюць. Як бы воўк ні маскіраваўся пад зайца, зубы яго ўсё адно выдадуць, не схаваеш іх. І наша задача — растлумачваць людзям фашысцкую тактыку, выкрываць ворага, кожны яго новы манеўр... Ва ўмовах, калі нельга слухаць радыё, калі няма газет, ды і сход не заўсёды правесці можна, гэта нялёгка. І мы ведаем — будуць такія, хто паддасца варожай прапагандзе, будзе выдаваць сваіх людзей. І да гэтага трэба быць гатовым. Будуць і такія, хто служыць да немцаў пойдзе. Ды ўжо некаторыя і пайшлі.

— Што рабіць з такімі?

— Да кожнага выпадку здрады ці прыслужніцтва трэба падыходзіць індывідуальна. І караць паводле зробленага злачынства. Вораг — значыцца, знішчай. А калі за-

блудзіўся чалавек, памыліўся, не разабраўся — на свой бок трэба схіляць, хай, працуючы ў нямецкай установе, нам служыць. Між іншым, гэта вельмі важна мець у кожнай нямецкай установе сваіх людзей. Райком цяпер гэтым вельмі сур'ёзна займаецца, расстаўляе кадры. І ў вашым, Велікалесаўскім сельсавеце трэба было б заняцца. Думаў нават чалавека паслаць, каб вас да мяне сюды прывялі. Аж вы самі прыйшлі. Адкуль вы даведаліся, што мы тут, у леснічоўцы?

— Цыганы падказалі.

— А-а,— і Раман Платонавіч як бы завязаў сабе вузельчык на памяць.— Калі яны сказалі вам, то і яшчэ камусьці сказаць могуць. Трэба будзе ўлічыць. І калі што — на запасную базу...

— А мне як вас шукаць? — спытаў Васіль Кулага.

— А вы... У лес пераходзьце, атрад арганізоўвайце. Пара.

— Жонка ў мяне. І дзеці,— прызнаўся Васіль.

— Жонка і дзеці не ў аднаго вас. Ва ўсіх нас ёсць жонкі і дзеці. І ў тых, хто на фронце, таксама ёсць ці былі жонкі і дзеці...

— Разумею. Але прывыкнуць...

— Трэба прывыкаць. І лепшая абарона — гэта наступленне на ворага, знішчэнне яго. Але вернемся да ранейшай нашай размовы. Я гаварыў пра расстаноўку кадраў. Падумайце, каго б з вашых людзей на службу да немцаў паслаць. Старастам ці ў паліцыю. І скажаце нам, каб мы, на выпадак чаго, ведалі.

— Не кожны, мусіць, згодзіцца на гэта?

— Правільна. Быць у шкуры ворага, а служыць нам... Ды трэба, трэба гэта! Даказвайце, пераконвайце. Пакуль Івана Дарошкі няма, на вас ускладаецца гэты абавязак. І не толькі ў Вялікім Лесе, а ва ўсім сельсавеце.

— А Іван Дарошка хутка вернецца, зноў тут будзе?

— Гэта я сказаць не магу. Не таму, што ведаю, а сказаць нельга, а таму, што якраз сам не ведаю. Іван Дарошка выконвае вельмі важнае заданне. І калі ён вернецца зноў сюды — ніхто сказаць не можа. Усё будзе залежаць ад многіх прычын. Але яго адсутнасць вас не павінна расхалоджваць, расслабляць. Наадварот, яна павінна вас яшчэ больш мабілізаваць. Тое, што раней рабілі ўдвух, давядзецца рабіць цяпер аднаму. Бярыце самых надзейных людзей, ідзіце ў лес. Мы вас зацвярджаем камандзірам

атрада ці групы, гэта залежыць ад таго, колькі людзей у вас. І ваюйце, біце ворагаў. Райком будзе ўвесь час вам памагаць. І зброяй, і боепрыпасамі, і ўсім, у чым патрэба будзе. Вядома, мы ў тыле ворага, і гэта трэба не забываць. Не ўсё і ў нас ёсць, не ўсё і мы можам даць, здабыць.

— Калі б Іван Дарошка быў! — пакруціў галавою, пашкадаваў Васіль.— Удвух бы мы... Хутка б усё арганізавалі.

— Прывыкайце да самастойнасці. І калі дзе можна нашкодзіць гітлераўцам, шкодзьце, не бойцеся. Людзей надта пад кулі не падстаўляйце, беражыце людзей. І не забудзьце яшчэ пра адно — ідзе зіма, халады. Таму ствараййце базу. Выкапайце некалькі зямлянак, пажадана, у маладаступных месцах, перанясіце бліжэй да зямлянак тыя запасы, што вы паспелі нарыхтаваць. І не спяшайцеся ўсіх, хто ворага ненавідзіць, збіраць у лес — пакуль можна каму сядзець у вёсцы, пагрозы над яго жыццём няма, хай і сядзіць. Бо калі вялікі атрад вырасце, пракарміцца як? Ды і зіма ж ідзе...

— Ваяваць лягчэй, калі атрад большы.

— Правільна. Ды нам не толькі ваяваць трэба, але і хавацца. Вось нас ужо заўважылі, трэба перабазіравацца. Восенню, летам — нічога. А зімою? На начныя заданні людзей можна і з вёсак браць. Зрабілі, што трэба, і па хатах разышліся, быццам нікуды ніхто і не хадзіў. Шыта-крыта. Словам, вучыцеся ваяваць у незвычайных умовах, у тыле ворага. І трымайце з намі сувязь. Мы будзем пасылаць людзей да вас, і вы пасылайце... Хоць... Пакуль што нікога да нас пасылаць не варта, самі хадзіце на сувязь... Бо хто ў вашым атрадзе будзе?.. Прыглядайцеся пільна. Недарэка ці баязлівец можа бяды нарабіць. Бярыце ў атрад людзей надзейных, хто не падвядзе, хто хутчэй сам загіне, чым выдасць таварыша.

Ужо даўно змерклася, на небе высыпалі зоры — чырвоныя, міргатлівыя: бралася на мароз. Стаяць на адным месцы было зябка, холадна.

— Даруйце, што я не запрашаю вас у леснічоўку,— адчуўшы, мабыць, няёмкасць, сказаў Раман Платонавіч.— Але мы там так бы не пагаварылі. Ды і канспірацыя не зашкодзіць. У леснічоўцы ёсць людзі, якіх вы бачылі раней, але пра тое, што яны тут, у лесе, лепш, каб ніхто не ведаў. Ды і вас... таксама не варта, каб многія бачылі... Вайна ёсць вайна, мы ў тыле ворага і не ведаем, што чакае кожнага з нас і заўтра, і паслязаўтра...

Уздыхнуў і падаў Васілю Кулагу руку.

— Дзейнічайце. Калі што якое — звязвайцеся з намі.

— Дзякую, Раман Платонавіч!

— Не заблудзіце ўночы ў лесе?

— Што вы, я ж тут вырас,— усміхнуўся Васіль.

— Ну, то поспехаў вам!

Васіль павярнуўся, каб пайсці, але нешта яго затрымала. «Ці ўсё я спытаў, што мяне цікавіла, хвалявала, ці не забыў чаго? — падумаў.— Гэта ж... Калі я зноў убачуся з кім-небудзь з начальства?» Але што яшчэ хацелася спытаць, пра што трэба было б пагаварыць, а не пагаварыў — не прыходзіла на памяць. І Васіль, угнуўшы ў плечы галаву, падцісуў локцем рукі бліжэй да свайго цела вінтоўку, паволі падаўся на дарогу, па якой прыблукаў сюды, на паляну, да леснічоўкі.

Тым часам якраз і пасвятлела — выплыў месяц, круглы, ясны, і было відаць, куды ісці.

## III

Да чаго толькі не прывыкае чалавек! І Яўхім Бабай таксама хоць і неахвотна, але прывыкаў да жыцця ў турме. Да аднаго ніяк прывыкнуць не мог — калі адчыняліся дзверы, ён раптоўна наструньваўся ўвесь, ператвараўся ва ўвагу. «Ета па мяне прыйшлі!» — здавалася яму. Куды яго могуць павесці, што з ім могуць зрабіць — Яўхім Бабай не ведаў. І гэта неяк па-асабліваму яго хвалявала, трывожыла, не давала спакойна ні пра што думаць ці проста ад няма чаго рабіць спаць, драмаць...

«Во ўскочыў, дык ускочыў! — які раз папракаў сябе Яўхім Бабай.— І кеб жа пхаў, штурхаў мяне хто, а то ж сам! Як усё адно гнала, вяло... І не ісці ў Ельнікі, дома сядзець?.. Нельга таксама было! Іван Дарошка ды Васіль Кулага... Мала, што калгаснае дабро раздалі каму папала, дык яшчэ і пагражаць уздумалі. Дэзерцірства ўспомнілі, што немцаў хадзіў сустракаць... Цярпець такое, ды яшчэ калі ўлада новая зусім побач? Не-е!.. Але ж і немцы, улада новая як мяне сустрэлі? З чыстай, шчырай душой я да іх, а яны... Збілі ні за што ні пра што, потым яшчэ і ў турму запраторылі. І колькі я тут буду?.. А калі і выбаўлюся, што мяне чакае?.. Пагражалі ж — павесяць, расстраляюць... Божа, за што?.. Кеб жа я хоць у чым вінаваты быў, а то ж... Ад мабілізацыі ўцёк, у лесе хаваўся, чакаў, як самых дарагіх гасцей... І замест удзячнасці...»

Хацелася падхапіцца на ногі, бегчы да дзвярэй, грукаць у іх кулакамі, крычаць, выць, прасіць, каб адчынілі, выпусцілі на волю. «Я ж не вораг вам! І рабіць буду ўсё, што скажаце, загадаеце! Толькі не трымайце мяне тут, выпусціце на волю. І я... Дакажу, як ненавіджу бальшавікоў, ненавіджу ўсіх, хто быў пры Савецкай уладзе ў начальстве, хто жыў не так, як я...»

Стрымліваў, як мог стрымліваў сябе Яўхім Бабай, не даваў пачуццям сваім прарвацца — адчуваў: не зразумеюць яго ні немцы, ні тыя, хто ў турме з ім разам сядзіць. Ды і не павераць у шчырасць яго слоў. Немцы — бо, мабыць, не прывыклі чуць і бачыць такое, і нашы, тыя, з кім у турме разам сядзеў, таксама не павераць: усе яны, як адзін, ненавідзелі немцаў, інакш і не называлі, як прыблудамі, злыднямі. І каб магчымасць у іх была — білі б, знішчалі б, быццам гэта і не людзі зусім, а звяры, гадаўё. «І чаго такая да немцаў агіда, нянавісць? Няўжо што ў турму пазабіралі, б'юць, катуюць на допытах? Але ж і ў Вялікім Лесе немцаў ніхто не любіць, хоць яны там яшчэ і не былі, нікога ў турму не забралі. Хіба аднаго мяне... Ды пра ета ніхто, мабуць, там не ведае. І ці шкадавалі б мяне людзі? Здаецца, не зрабіў нічога кепскага, а ўсё адно не любяць. Быццам я вораг які ім. Ну лес вартаваў, сяго-таго лавіў, штрафаваў. А што рабіць было? Ды кеб я праз пальцы на ўсё глядзеў, мяне б ніхто за лесніка не трымаў, прагналі б... А мне ж дзяцей трэба было карміць. Шкуры я ні з кога вельмі не драў, задавольваўся тым, што давалі, абы ціха, шыта-крыта... Вядома, я не такі, як іншыя, на людзі мала выходзіў. Усё ў лесе ды ў лесе. Ваўкаватасць мая, мабуць, і адштурхоўвае ад мяне людзей. І тут, у турме, таксама... Але што мне людзі — я пра сябе думаць павінен, сябе глядзець. Выбавіцца б з турмы як-небудзь! Жыць бы астацца, у Вялікі Лес, дадому, вярнуцца!.. Казалі ж — паедуць у Вялікі Лес самі немцы, праверацъ, што я ім казаў, ці не лгаў... Калі паедуць?.. А можа, і ездзілі ўжо, правяралі?.. Добра ж, як ніхто кепскага пра мяне не сказаў. А як сказалі, га?.. Што тады рабіць?.. Было тое ці не было, а скажа, ляпне. Правер, дакажы пасля. Людская душа — пацёмкі. Здагадайся, што ў каго наўме, што хто на каго за пазухай ці ў думках носіць. Вунь я некалі на Мікалая Дарошку разззлаваўся, у райком, Багавіку напісаў. Апанас Харчэня з сельсавета і вылецеў. Як корак з бутэлькі, вылецеў. Тут быў — тут няма. Дык то ж улада іншая была... А цяпер, калі немцы, калі кожны хоча, кеб

яго заўважылі, памаглі наверх выбіцца... Ды і рахункі звесці самы час з непрыяцелем сваім. А я ж... Ці мала каго пакрыўдзіць мог, воўчае сала пад скуру заліць, леснікам будучы?.. Лавіў жа некаторых, пагражаў, штрафаваў, платы за дзяржаўнае, як за сваё, патрабаваў... Вось і ўспомняць, паквітаюцца. Кожны ж стараецца, шчыруе, кеб яму добра было, сабе. А пра іншага... Не думае. А калі і думае, дык не кеб лепш некаму было, а горш. Гэта ўжо, мабуць, натура ў чалавека такая. Хоць... Хто ведае, можа, і не ва ўсіх такая натура... Тут жа, у турме, і памагаюць адно аднаму, і ратуюць, калі каго надта на допытах паб'юць... Але ці шчыра тое робяць, ці не прытвараюцца, сапраўды спачуваюць гору, людской бядзе?..»

Сядзеў, ляжаў у сваім кутку Яўхім Бабай і ўсё прыглядаўся, прыглядаўся да людзей, што былі з ім побач, прыслухоўваўся, пра што яны гавораць між сабою... І ніяк быццам не разумеў іх. Дзівіла Яўхіма: людзі, ледзь пазнаёміўшыся, расказвалі адзін аднаму пра сябе ўсё, нічога не хавалі — і хто ён, і дзе жыў, і сям'я якая ў чалавека, і за што немцы ў турму забралі, і як на допытах з ім абыходзяцца, што выведаць хочуць. Шчырасць, праўдзівасць людзей больш за ўсё ўразіла Яўхіма Бабая. «Ніхто ж нікога за язык не цягне. Хочаш прызнавайся ва ўсім, хочаш не прызнавайся — маўчы ці лухту вярзі. Дык не ж — бачыш, душу адкрываюць, ды яшчэ як!» Не хавалі людзі і сваёй нянавісці да заваёўнікаў, фашыстаў. Чаго толькі не гаварылі пра іх, як толькі не лаялі! І не тое каб адзін хто-небудзь, а ўсе, літаральна ўсе. Асабліва калі адчыняліся дзверы і ў камеру прыводзілі, упіхвалі каго-небудзь з чарговага допыту. Тады камера гула, як вулей. Людзі падымаліся на ногі, беглі да закатаванага. І крычалі, махалі кулакамі, пагражалі. Як заўважыў Яўхім з размоў, вінаватасць у пасаджаных у турму была ва ўсіх адносная. Жанчына, якая надта ж бедавала, як там, у вёсцы, адны дзеці, пусціла пераначаваць мужчыну і нікому пра гэта не паведаміла. Ураннi суседка ўбачыла на двары незнаёмага чалавека і, паколькі суседкі не дружылі, данесла старасту, а той распарадзіўся арыштаваць кабету... У дзядзькі з Тульгавіч — вёскі з-пад Прыпяці — немцы адабралі рыбу, якую ён налавіў у рацэ. Дзядзька са зла загнуў мацюка, бо, выходзіла, дарэмна мок у вадзе, расстаўляючы і дастаючы сеці. І за гэта яго прывезлі ў Ельнікі, пасадзілі ў турму. Былі ў турме і тыя, хто пры Савецкай уладзе працаваў у сельсавеце ці за старшыню ў калгасе. Іх найчасцей і ва-

дзілі на допыты, білі... Сярод арыштаваных знаходзіўся і адзін чырвонаармеец, які адстаў ад сваёй часці і якога злавілі непадалёку ад Ельнікаў. Ён быў зусім малады, непакорны і, як толькі прыходзіў да памяці пасля катаванняў, усё спяваў «Інтэрнацыянал». Так што дні праз тры ўсе ў камеры вывучылі і словы, і напеў, і калі пачынаў чырвонаармеец:

Вставай, проклятьем заклейменный,
Весь мир голодных и рабов,—

яму дружна падпявала амаль уся камера. Вартавым гэта не падабалася, яны адмыкалі дзверы, урываліся ў камеру, загадвалі змоўкнуць. Людзі змаўкалі, але, як толькі ахоўнікі парадку выходзілі з камеры, пачыналі спяваць зноў. Жарты з агнём маглі дрэнна скончыцца, гэта кожны адчуваў і ведаў, але аднойчы пачатае цяжка было спыніць, дый трэба ж было хоць чым-небудзь насаліць фашыстам. Яўхім Бабай ніякага ўдзелу ў агульнай нянавісці да немцаў і іх прыслужнікаў не прымаў. «Няхай вар'яцеюць. А мне... Кеб жыць астацца, кеб выпусцілі мяне зноў на волю...»

І той раз, калі адчыніліся дзверы ў камеру і на парозе з'явіўся паліцай Піліпчук, Яўхім Бабай, як і заўсёды, інстынктыўна падхапіўся на ногі. «Па мяне прыйшлі»,— ёкнула сэрца.

Дзесяткі, сотні разоў памыляўся, не адгадваў, а гэты раз не памыліўся. Піліпчук, абвёўшы ўсіх заспанымі, а мо п'янымі, прыпухлымі вачыма, гаркнуў раптам:

— Яўхім Бабай. З рэчамі!

Усе ў камеры, і Яўхім Бабай таксама, ведалі, што гэта значыць — «з рэчамі». Было ўжо такое — як аб'яўлялі каму ісці з рэчамі, чалавек больш у камеру не вяртаўся. Дзе дзяваўся ён, толькі здагадваліся. Адных адпускалі дадому, другіх жа — і гэта не было ні для каго сакрэтам — вывозілі ці выводзілі ў хвойнік ці да тых ям, дзе капалі раней гліну, і расстрэльвалі. Звычайна, выходзячы з камеры, людзі развіталіся, жадалі дабра ўсім тым, хто заставаўся яшчэ ў турме. А Яўхім Бабай... І сам не ведаў, куды яго павядуць і што з ім зробяць. І развітацца з людзьмі... Таксама, таксама не ведаў як. Ды і людзі, тыя, хто з ім сядзеў, жыў гэтулькі дзён разам, не ведалі, чаго гэтаму дзіваку ці то жадаць, ці то не жадаць. Так і не

прызнаўся, не сказаў Яўхім Бабай, адкуль ён родам, хто ён такі, за што пасадзілі ў турму. І прозвішча яго пачулі ўпершыню ад Піліпчука. Таму і маўчалі, чакалі, што скажа сам Яўхім Бабай, калі будзе пакідаць іх, выходзіць з камеры. Бо і па адным слове часам меркаваць можна, што за чалавек жыў, быў побач з імі.

Яўхім Бабай угнуў у плечы галаву, прайшоўся моўчкі да дзвярэй.

— Я сказаў — з рэчамі! — агледзеўшы Яўхіма Бабая, гаркнуў Піліпчук.

— У мяне няма ніякіх рэчаў,— сказаў ціха Яўхім Бабай.

— А-а,— быццам нешта ўспомніўшы, зарагатаў Піліпчук і першы выйшаў з камеры.

За ім сугнеем, нікому нічога не сказаўшы, выйшаў і Яўхім Бабай.

— Ну і чалавек! — не вытрымаў, прамовіў яму хтосьці — ці не барадач? — услед.— І дзе ён толькі вырас!

Дзверы грукнулі, і Яўхім Бабай не чуў, што яшчэ і хто казаў пра яго ў камеры. Але здагадваўся — добрага не казалі, не спачуваў ніхто яму. Ды і не трэба — усё адно не паможа. Усё цяпер залежыць не ад тых, хто астаўся там, у камеры.

«А ад каго залежыць?» — забілася, затрымцела дзесьці глыбока-глыбока ў галаве думка.

«Ад немцаў... Ды ўжо, калі вывелі з камеры, можна сказаць, усё ясна, вырашана. Асталося толькі пачакаць, пакуль аб'явяць вырак...»

Дзіўна, але боязі ніякай не было. І ногі не падгіналіся, не былі, як гэта здаралася ўжо, ватныя. Толькі на душы быў як бы халадок, неспакой. Ды гэта, мусіць, ад таго, што хацелася як мага хутчэй ведаць, які ж прысуд, што чакае яго, Яўхіма Бабая, там, куды яго вядуць. А вялі яго, як хутка зразумеў, здагадаўся Яўхім Бабай, да начальніка паліцыі — Кандрата Астапавіча Нядзелькі.

— Прама, потым налева! — камандаваў Піліпчук.— У левыя, левыя дзверы...

«Так і ёсць, да начальніка паліцыі»,— стукала ў грудзях сэрца, ці то ад хвалявання, ці то ад таго, што адвык хадзіць, падымацца па сходках.

Кандрат Астапавіч Нядзелька і цяпер, як і тады, першы раз, калі трапіў да яго Яўхім Бабай, сядзеў за сталом. І нават галавы не падняў, калі ў кабінет да яго зайшоў Піліпчук, а з ім — і Яўхім Бабай.

— Кандрат Астапавіч, прывёў я арыштаванага Яўхіма Бабая,— далажыў, стаўшы па стойцы «смірна», Піліпчук.

— Прывёў, кажаш,— не падымаў галавы ад стала, чытаў нейкую паперу начальнік паліцыі.

— Ага, прывёў. Што яшчэ рабіць загадаеце?

— Ідзі, пагуляй. А я адзін на адзін пагаварыць хачу з арыштаваным! — рохнуў Кандрат Астапавіч і падняў свае вочы, працяў быццам навылёт Яўхіма Бабая.

«Што ён са мною зробіць? — аж душа ў пяткі апусцілася ў Яўхіма Бабая.— Няўжо біць будзе?.. А потым... Расстраляюць... Павесяць...»

Піліпчук, стукнуўшы абцасамі ботаў, выйшаў, зачыніў з другога боку дзверы.

Нейкі час у кабінеце панавала цішыня. Потым раптам Кандрат Астапавіч падняўся са свайго крэсла, прайшоўся сюд-туд па кабінеце, сеў сваім тоўстым азадкам проста на стол, на паперы. Сказаў быццам з роздумам:

— Быў я ў тваім Вялікім Лесе. З немцамі...

— Праўда? — шчыра ўзрадаваўся Яўхім Бабай і аж бліжэй да начальніка паліцыі падышоў, крокі два зрабіў.— Ну і што там?

— Ды нічога,— марудзіў, не спяшаўся гаварыць Кандрат Астапавіч.— Начальства выбралі... Старасту, начальніка паліцыі...

— Ета каго ж? — зацікавіўся Яўхім Бабай.

— Каго? За старасту... Пачакай, пагляджу...

Кандрат Астапавіч ссунуўся са стала, пайшоў да свайго крэсла, сеў, паглядзеў у тыя самыя паперы, якія толькі што чытаў.

— За старасту — Апанаса Харчэню. А начальнікам паліцыі папрасіўся Змітро Шламак. Ведаеш ты іх?

— Апанаса Харчэню ведаю. А Змітра...

— Змітро не мясцовы, ён прышлы, з кулакоў.

— Ета, мусіць, што Клаўдзя Коўдрава прывяла! — ледзь не ўскрыкнуў Яўхім Бабай.

— Не ведаю, якая там Клаўдзя. Але чалавек, нам здаецца, надзейны, служыць добра будзе. А Харчэня? Хто такі Харчэня?

— Ён у сельсавеце працаваў.

— Кім? — аж падскочыў Кандрат Астапавіч.

— Сакратаром... Але яго,— усміхнуўся, загігікаў раптам Яўхім Бабай,— выгналі перад самай вайною.

— За што?

— Не ведаю, гы-гы... Дзядзька ў яго...

— Хто ў яго дзядзька?

— Нупрэй Харчэня. Можа, чулі?.. Сталіну званіць хадзіў...

— Ну і што, як Сталіну званіць хадзіў? — Нядзелька быў чалавек не тутэйшы, той даўняй гісторыі, якую ўсе ў Ельніках ведалі, не ведаў.

— Узялі яго.

— Куды ўзялі?

— Ну, пасадзілі. Тады ж, адразу, яшчэ ў калектывізацыю...

Кандрат Астапавіч зрабіў нейкія заўвагі алоўкам на паперах, сказаў:

— Няхай. Бальшавікам паслужыў, цяпер нам паслужыць. Урэшце, усе мы дзесьці працавалі ці служылі. Нават і ты. Лесніком жа пры Саветах быў.

— Быў,— прызнаўся Яўхім Бабай.

— І кажуць — лютым?

— Хто ета кажа? — насцярожыўся Яўхім Бабай.

— Ну тыя, з кім мы гаварылі.

— А з кім вы гаварылі?

— Гэта не мае значэння. Факт астаецца фактам — лесніком ты быў. І што ад войска ўцёк, на мабілізацыю не з'явіўся, таксама праўда. І немцаў сустракаць загадваў усім, а потым і сустракаць разам з жонкаю з хлебам-соллю хадзіў — таксама праўда. А вось адносна таго, хто масты папаліў... Не пацвярджаецца. Ніхто не бачыў, што масты палілі Іван Дарошка і Васіль Кулага...

— А каму ж яшчэ было іх паліць?

— Вось гэта нас і цікавіць. І дзе цяпер Іван Дарошка і Васіль Кулага?

— У Вялікім Лесе былі.

— Былі, ды няма. А іх, калі сапраўды яны масты папалілі, арыштаваць трэба ды ў кутузку. Наўладарылі, хопіць! — грукнуў кулаком па стале Кандрат Астапавіч.

— Калі трэба арыштаваць, дык трэба!

— А як? — глядзеў, не спускаў вачэй з Яўхіма Бабая Кандрат Астапавіч.

— Ну-у, палавіць... Калі, скажам, у вёску, да сям'і, хто з іх будзе ісці.

— А сем'і іх асталіся ў вёсцы?

— Аставаліся.

Кандрат Астапавіч павесялеў, ажывіўся, падхапіўся са свайго крэсла, потым зноў сеў.

— Вось што,— сказаў сурова, гледзячы проста ў вочы

Яўхіму Бабаю.— Цябе трэба было б пакараць... Але... Няхай, на першы раз даруем. Толькі каб ты...

І Кандрат Астапавіч памахаў пагрозліва пальцам:

— ...трымаў язык за зубамі. Нікому не казаў, чаму цябе адпусцілі. Зразумеў?

— Аге,— кіўнуў галавою Яўхім Бабай.

— Дык вось, слухай. Ты павінен высачыць Івана Дарошку і Васіля Кулагу. І нам паведаміць. Дзе яны ходзяць, дзе бываюць, дзе начуюць. Усё, што пра іх пачуеш і даведаешся. Зразумеў? Толькі...— зноў памахаў пальцам перад носам Кандрат Астапавіч.— Не ўздумай каму-небудзь прызнавацца, казаць, пра што мы тут з табою гаварылі. Ці не паслухацца, не выканаць таго, што табе загадваюць. Усюды знойдзем, у зямлі адкапаем. Зразумеў?

Яўхім Бабай кіўнуў галавою.

— Мы цябе трохі праверылі. Чалавек ты быццам надзейны.

— Як праверылі?

— Тут у камеры. У нас там свае людзі! І ўсюды свае людзі, каб ты ведаў. І як ты сябе будзеш паводзіць у Вялікім Лесе, мы таксама будзем ведаць! Не думай, што мы лыкам шытыя, што нас падмануць можна!

І, падняўшыся з-за стала, падышоў бліжэй да Яўхіма Бабая. Сказаў яму ціха, даверліва, як не ў самае вуха:

— Павесіць цябе хацелі. Ды я... Угаварыў, выпрасіў. Толькі ж... не падмані мяне, пад манастыр не пастаў...

— Што вы... Я ўвесь век... Дзякаваць буду... І што вы прасілі... Зраблю! Жыць не буду, а зраблю!..

— Ну, то з богам! Ідзі, ідзі...— памахаў рукою на адвітанне Кандрат Астапавіч, нават усміхнуўся, вокам падміргнуў.

Як з ланцуга сарваўшыся, кінуўся з усіх ног, яшчэ не верачы ў тое, што ён чуе, з кабінета начальніка паліцыі на волю Яўхім Бабай. Бег — і ўсё азіраўся, чакаў, ці не аклікнуць яго, не спыняць, не затрымаюць, не павядуць зноў назад, у цёмны, смярдзючы падвал...

## IV

Васіль Кулага бачыў, як ехалі ў Вялікі Лес немцы. Ахоплены неспакойным одумам, што выклікаsuccessful быў размоваю з Раманам Платонавічам Багавіком, ён якраз падыходзіў да ельніцкай дарогі, калі раптам пачуў гурчанне матораў — яно расло, набліжалася, і даволі хутка, імкліва.

Захінуўся за камель дрэва, а вочы... Вочы пільна сачылі за дарогай.

«Немцы?! Няўжо немцы едуць?»

Мінула вельмі мала часу, і Васіль сапраўды ўбачыў на дарозе немцаў. Паперадзе — першы — ехаў трохкалёсны чорны матацыкл, на якім сядзелі тры салдаты ў касках, сівых, з сінявою, шынялях. Адзін з іх вёў матацыкл, два астатнія, наставіўшы на бакі аўтаматы, насцярожана не спускалі вачэй з лесу. Матацыкл ехаў на малой хуткасці, і Васіль паспеў разгледзець нават твары ворагаў — за рулём сядзеў зусім малады, белабрысы арыец, за ім трохі старэйшы і больш грузны, а ў калясцы і зусім стары, з вострым і вялікім носам.

Услед за матацыклам, на невялікай адлегласці ад яго, ехалі яшчэ два матацыклы з каляскамі, за імі — чатыры машыны-грузавікі. Машыны былі адкрытыя, на іх, цесна прыціснуўшыся адзін да аднаго, сядзелі ўсцяж бартоў, трымаючы ў руках аўтаматы, усе ў касках і шынялях немцы — салдаты. За машынамі каціла яшчэ некалькі матацыклаў, у якіх зноў жа былі салдаты, з панастаўленымі на лес аўтаматамі.

«Дык вось вы якія?»

Аж перасмыкнула Васіля, калі ён убачыў у сваім лесе, на сваёй, не раз ходжанай, знаёмай змалку, дарозе чужынцаў. Хацелася сарваць з пляча вінтоўку, стрэліць. І, бадай, ён бы гэта і зрабіў, каб не разуменне — што ім, такой вялікай, добра ўзброенай хеўры, гэты адзіночны стрэл? Хіба не пусціць, затрымае ворага?

«Багавік праўду казаў. Баявую групу трэба збіраць... Вось зрабілі б засаду... Палажылі б чалавек колькі... Ды і настрой бы чужынцам сапсавалі... А так праехалі, быццам на парадзе...»

Пастаяў за дрэвам яшчэ хвілін колькі — дрэва гэтае было дубам, тоўстым, карыстым, са струпамі нарастаў,— потым паволі падаўся, шастаючы лісцем, паўз дарогу, не выходзячы на яе, на ўзлесак. Неспакой, трывога — што, што немцы зробяць у вёсцы, ці не застрэляць жонку, дзяцей,— усё больш і больш ахаплялі Васіля, завалодвалі яго думкамі і сэрцам. «Проста так яны б не паехалі... У іх мэта нейкая ёсць... Што захочуць, што надумалі, тое і зробяць... Ніхто ім не перашкодзіць... Няма каму...»

Шпарчэй зашастаў па лісці, падаўся, ледзь не пабег бліжэй да вёскі.

«Калі што якое — стрэлю... Пярэпалаху нараблю...»

Дубняк мінуў, выйшаў хвойнікам да поля, пашыўся ў кусты. Пашкадаваў, што апала, паасыпалася лісце — і ўсё навокал свіцілася, далёка праглядалася. Так што і яго, Васіля, маглі ўбачыць з дарогі, калі б па ёй хто-небудзь ішоў ці ехаў.

«Нічога, калі пачую што — упаду... На зямлі не вельмі ўбачаць...»

І глядзеў, не спускаў вачэй з вёскі — што там?..

На выхадзе з кустоў прыпыніўся, а потым і сеў, лёг. І здаля, з кустоў, захінуўшыся за корч, цікаваў за вёскаю. Бачыў, як ездзілі, гойсалі па вуліцы на матацыклах чужынцы, як бегалі, выганялі з хат людзей, некуды вялі, пакінуўшы ля крыжа некалькі вартавых. Вартавыя хадзілі сюд-туд ля канцавых гародаў і кідалі раз-пораз спасцярожлівыя позіркі на лес: мусіць, найбольш немцы і баяліся лесу, адтуль чакалі небяспекі.

«Што яны задумалі рабіць з людзьмі, куды павялі?»

Пашкадаваў, што залёг тут, ля Замосця.

«Можна ж было і ў іншым месцы залегчы. Бліжэй да свае хаты...»

«Але ж там кустоў няма»,— успомніў праз хвіліну.

«І ў разоры схаваўся б... Ці ў капе саломы... А то і за хлявом...»

«Дзівак! Быццам чым-небудзь памог бы... Столькі немцаў, а я... Адзін...»

Усё ж стрымаў сябе, нікуды далей не падаваўся. Мо таму, што разумеў — ні сям'і, ні людзей усё адно не выратуе. Сам жа... Згледзіць які-небудзь гітлеравец і паласне з аўтамата.

Колькі так у чаканні без усякага руху ляжаў Васіль? Мусіць жа, доўга, бо аж рукі, ногі замлелі. Павярнуўся, хацеў падняцца. І зноў прыпаў, урос у зямлю, бо згледзеў раптам, убачыў: людзі вяртаюцца назад, да сваіх селішчаў. Разыходзяцца па дварах, па хатах і быццам нават нічым не запалоханыя, не застрашаныя — пра нешта між сабою гавораць, перамаўляюцца, нават смяюцца... Нібы з вяселля ці пагулянкі ідуць.

«А я хваляваўся, чортведама што думаў... Можа, нічога асабліва і не адбылося...»

«З імі. А з маімі — жонкаю, дзецьмі?..»

Немцы-вартавыя раптам заварушыліся, пабеглі да матацыклаў, што стаялі, чарнелі вялізнымі жукамі пры ўездзе ў вёску.

«Чаму б гэта? Здарылася што?»

Але, запрымеціўшы грузавікі, што ехалі з вёскі праз грэблю, здагадаўся пра ўсё.

«Няйнакш, у Ельнікі вяртаюцца, пакідаюць Вялікі Лес...»

Мінула яшчэ трохі часу, і машыны былі ўжо на Замосці. Не спыняючыся, не збаўляючы хуткасці, параўняліся з тымі жукамі-матацыкламі, што стаялі, гатовыя да ад'езду, ля крыжа, і ўсе разам, зноў выстраіўшыся гэтак жа, як ехалі і сюды — тры матацыклы папераздзе, астатнія — за машынамі, ззаду,— пакіравалі, папылілі, грукочучы і дымячы, да лесу, назад у Ельнікі.

Васіль праводзіў іх вачыма, аж пакуль не схаваліся ў стволлі дрэў. Тады падняўся на ногі, пакіраваўся ў вёску. Па хмызняку, лазняку, бліжэй і бліжэй да вясковых гародаў, хлявоў. Заўважыў неўзабаве: усюды ў дварах ціха, нідзе ніхто не плача, наогул не чуваць людскіх галасоў. Значыцца, немцы нічога дрэннага не зрабілі. Бо калі б зрабілі што-небудзь... Гэта... адчувалася б...

«Чаго ж яны тады прыязджалі?» — брала цікавасць. Аж цягнула хутчэй, хутчэй ісці, бегчы ў вёску, у свой двор, даведацца, чаго прыязджалі немцы, што яны зрабілі. Але разважлівасць зноў стрымала Васіля, не дазволіла спяшацца.

«А раптам асталіся немцы, не ўсе паехалі з вёскі?..»

Спыніўся, пастаяў. Мо таму, што наперадзе была грэбля, узбоч жа яе — дрыгва, гразь. Хоць і марозіла, пякло галашчокам, але ў траве, у кустах рэдка калі, нават у самыя лютыя маразы, замярзала — найчасцей жа лёд праваліваўся пад цяжарам чалавека, ледзь толькі ступала на яго нага.

«Хіба бокам паспрабаваць абысці? Дзе кустоў мала, расцяробы?.. Можа, там замёрзла, не ўгрузну?»

На расцяробах і праўда быў лёд, хоць коўзалку ладзь, на каньках катайся. І трымаў добра, нават не гнуўся, не трашчаў.

Па ім, гэтым лёдзе, Васіль і перайшоў багну.

«Можа, пачакаць?..»

«Чаго?»

«Ды хоць бы змяркання. Дзень жа цяпер асенні, кароткі.. Бо рызыкаваць?..»

«Не, рызыкаваць не варта...»

Паволі, час ад часу спыняючыся і азіраючыся на вёску, пайшоў, агінаючы поле — рыжае, парослае дзікай травою ржэўе,— у лес. Ішоў і думаў, як нялёгка будзе яму жыць

далей, калі вёску зусім займуць немцы, калі прыйсці паказацца тут будзе небяспечна.

«А давядзецца ж прыходзіць. І сям'я, жонка і дзеці, тут... Ды і есці ж трэба... Я не памыляўся, гаворачы Івану Дарошку, калі пакідалі нас з ім, у войска не бралі, што ў нехарошую гісторыю мы патрапляем... Адчуваў ужо тады, што нялёгка нам будзе...»

«А дзе цяпер каму лёгка?» — згадаліся словы Івана Дарошкі, якія сказаў ён на яго, Васілёву, перасцярогу.

«І я і ён не памыляліся. Цяжка на занятай ворагам зямлі. Ды і тым, хто адступіў і адступае, таксама... Не спынілі, не разбілі ворага...»

«Спынім, разаб'ём!»

«Але калі, калі тое будзе?»

Азірнуўся — і прыцішыў хаду, амаль спыніўся, бо чалавека, мужчынскую постаць убачыў. Чалавек таксама ішоў, кіраваўся да лесу. І не адкуль-небудзь, а з вёскі, з Вялікага Лесу.

«Хто б гэта мог быць?»

Прыгнуўся, прысеў, пачаў чакаць, калі постаць наблізіцца, можна будзе пазнаць, хто гэта.

«Ідзе неяк дзіўна... Не па дарозе... Што, сляпы хіба? Спатыкаецца ледзь не на кожным кроку... Але ж сляпых у Вялікім Лесе няма. Хто ж гэта такі?»

Вось чалавек выбраўся з куп'істага, спярэшчанага быдлячымі сцежкамі пагону, узбіўся на поле, пайшоў раўней, амаль не спатыкаючыся. Бліжэй, яшчэ бліжэй... І Васіль пазнаў, хто гэта.

«Харчэня... Апанас... Што здарылася, чаму ён так ідзе, быццам дарогі перад сабою не бачыць?»

Калі Апанас параўняўся, а потым і абагнаў яго, далей да лесу пайшоў, Васіль таксама назіркам падаўся па лазняку ўслед за ім.

«Нешта, няйнакш, здарылася з хлопцам. А што?..»

Пачакаў, калі Апанас увойдзе ў хвойнік, і аклікнуў яго — ціха, амаль ласкава:

— Гэй, куды ты?

Апанас спыніўся, з непаразуменнем паглядзеў, дзе ён. Убачыўшы сябе ў лесе, ды яшчэ Васіля Кулагу побач, з вінтоўкаю, аж галавою страсянуў.

— Я... Староста...— прамармытаў.

— Што? — не зразумеў, здзівіўся Васіль.

— Я — староста...

— Які староста?

— Немцы паставілі,— плямкаў губамі, мармытаў Апанас.

— Немцы паставілі? — адступіўся на крок Васіль Кулага, аж вінтоўку за прыклад рукою схапіў.— І ты... Згадзіўся?

— Яны не пыталі маёй згоды...

— Як гэта — не пыталі? Ды ты толкам, па парадку ўсё раскажы...

— Толкам, па парадку,— гаварыў, нібыта быў не ў сваім розуме, увесь калоцячыся, Апанас Харчэня.— Я сам не ведаю, як тое здарылася.

— Як гэта ты не ведаеш? — глядзеў на Апанаса Харчэню, не мог ніяк яго зразумець Васіль Кулага.

— Немцы прыехалі...

— Ну, а далей што?

— Людзей з хат павыганялі... Да клуба, да сельсавета сказалі ісці... Там... Немец выступаў... Сказаў, што начальства трэба выбраць... Старасту... Пархвіра Рыкуля назвалі... Ён адмовіўся... Тады нехта маё прозвішча выкрыкнуў... Мяне і прызначылі...

— І ўсё?

— Не, яшчэ начальніка паліцыі выбралі.

— Каго, хто згадзіўся быць начальнікам паліцыі?

— Рыжы. Змітро Шламак.

— Хто-о?

— Не ведаю, хто ён. Клаўдзя Коўдрава, Піліпа Дарошкі жонка, яго ў сяло прывяла. Ды яго і не выбіралі. Сам напрасіўся.

— Сам? Што яшчэ немцы рабілі?

— Нічога. Людзям па хатах дазволілі разысціся, а мяне з Рыжым пакінулі... Распытваць пачалі.

— Пра што?

— Ды пра ўсё. І пра вёску, хто з начальства тут застаўся, хто масты спаліў... І пра вас, пра Івана Дарошку пыталі. Ім хтось сказаў, што вы з Іванам Мікалаевічам масты папалілі.

— А ты што на гэта?

— Ну,— памяўся Апанас.— Я не ведаю...

— Што, не помніш, што сказаў?

— Не, чаму ж... «Не ведаю» — так і сказаў.

— А яны?

— Ведаць трэба. І каб наступны раз, як прыедуць, сказаў.

— А калі яны наступны раз прыедуць — не сказалі?

— Не.

— А можа, ты гаварыць, прызнацца не хочаш мне?

— Што вы,— сцепануўся, з недаверам паглядзеў на Васіля Кулагу Апанас.— Я сказаў бы... Каму-каму, а вам...

— Яшчэ пра што пыталі немцы?

— Пра Яўхіма Бабая.

— А пра яго што?

— Ну, ці праўда, што ён на мабілізацыю не з'явіўся, у лес уцёк? А то яшчэ — ці бегаў па хатах, ці загадваў, каб немцаў хлебам-соллю людзі сустракалі?..

— Калі гэта?

— Не цяпер, а тады, першы раз, як немцы збіраліся ў вёску прыязджаць.

— Цікава,— задумаўся на хвіліну Васіль Кулага.— Навошта спатрэбіўся немцам Яўхім Бабай?

— Не ведаю,— пацікнуў плячыма Апанас Харчэня.

— А сам Яўхім Бабай дзе? У Вялікім Лесе, быў там, ля сельсавета?

— Не было яго. Ён дзесьці перад прыходам немцаў сышоў з вёскі. І жонка нават не ведае дзе.

— Праўда?

— Ага. Да маці мае чагосьці пазычаць прыбягала, гаварыла. Як пайшоў, кажа, дык і няма.

Гутарачы з Васілём Кулагам, Апанас Харчэня ўсё больш і больш смялеў, да яго вярталася здольнасць да развагі. Ён быццам забываўся на тое, што адбылося там, у вёсцы, ля сельсавета, дзе яго выбралі немцы старастам. А калі ўспомніў — зноў захваляваўся.

— Васіль Цімафеевіч, што рабіць мне, парайце? — пачаў пытаць ён у старшыні калгаса парады.

— Пра што ты?

— Ды пра старасства гэтае.

— А-а, пра старасства...

Задумаўся, лоб паморшчыў Васіль Кулага.

— Яно лепш было б, каб ты не згадзіўся быць старастам, каб цябе не прызначылі...

— Дык ніхто ж і згоды мае не пытаў.

— Гэта няважна, пыталі згоды ці не пыталі. Важна самім сабою быць, не паддавацца ні на якія ўгаворы. Хто б і што ні гаварыў, як бы ні прымушалі — на сваім стаяць трэба, на тым, у што верыш, у чым перакананы. Ты ж дарослы чалавек, павінен разумець. А калі згадзіўся быць старастам, выбралі цябе — што ж, служы. Немцам служы...

— А вы... Як на гэта будзеце глядзець?

— Пра каго ты? Мяне?

— Вас і Івана Мікалаевіча.

— Мы — гэта мы. Але ёсць нешта большае за нас. Сумленне. І людзі. І перад імі... Давядзецца адказ трымаць. За ўсё, што б ні рабіў, як бы ні жыў...

— Дык што, можа, адмовіцца мне?

— Глядзі і думай сам. Падказваць нешта табе...— Васіль Кулага пакруціў галавою.— Наўрад ці змагу я быць у гэтай справе дарадцам.

— А вы... На маім месцы як бы зрабілі?

— Я?

Васіль Кулага не вытрымаў, з агідай адвярнуўся. Сказаў жорстка, гучна вымаўляючы кожнае слова:

— Я не апусціўся, каб мяне старастам, нямецкім паслугачом, ставілі. І ніколі да таго не апушчуся. Ніколі! Лепш смерць. Пакуль я жывы, пакуль б'ецца ў маіх жылах кроў — я вораг фашыстам, усім чужакам, хто заняволіць нас захоча. І вораг тым, хто ідзе служыць акупантам, робіцца іхнім памагатым. Тут так — ці з імі і, значыцца, процi нас, ці з намі і, значыцца, процi іх... Два полюсы. Сярэдзіны няма. І ты падумай, дзе табе лепш быць... Добранька падумай, каб потым не шкадаваць. Помні: ніхто ніякіх апраўданняў не прыме, калі давядзецца адказваць за ўсё, як ты жыў і што рабіў... Перад сумленнем сваім, людзьмі адказваць!..

Пастаяў, падумаў, ці ўсё, што хацелася сказаць, сказаў, і пашастаў, пашамацеў лісцем, пайшоў, не азіраючыся, у глыб лесу.

Кароткі асенні дзень згасаў. Насоўвалася цемра, ноч.

## V

Снег выпаў нечакана і так, што ніхто не мог сказаць, калі — ці то ў поўнач, ці то на дасвецці. Лёг непрыкметна, мякка і ціха, на поле, на стрэхі хат і хлявоў, прыцерушыў дарогі, прыкрыў белым халодным пухам няроўнасці на зямлі. Пасвятлела, палагаднела навокал, усё набыло новыя абрысы і колеры. Асенняя пахмурасць і змрочнасць дзе і падзеліся. У паветры быццам разліліся звонкая ядранасць і марозная бадзёрая свежасць.

Што на двары нешта змянілася, Мікалай Дарошка заўважыў адразу ж, як толькі прачнуўся, расплюшчыў вочы. Надта ж светла было ў хаце.

«Няўжо заспаў?»

Абапёршыся на локці, падняў галаву, спахапліва зіркнуў на вокны.

«Снег... Мабуць, снег нападаў...»

Босы, у споднiх штанах i кашулі, быццам малое дзіця, пабег да акна, прыпаў да шыбіны. Сапраўды, на двары ляжаў снег. Белы, чысты i пульхны, што вата. Нідзе яшчэ не было i следу, ніхто не ступаў на неруш. Толькі ў голлі ліпы, якое аж пазгіналася ад раптоўнага цяжару, пырхала, то падымаючыся вышэй, то апускаючыся зноў уніз, бліжэй да зямлі, нешта сакавіта сакочучы, сарока ды скакаў па плоце, час ад часу хаваючы то адну, то другую лапку ў пер'е, нахохлены, а таму i нязвыкла тоўсты верабей.

«Скажы ты, зіма прыйшла»,— верыў i не верыў вачам сваім Мікалай.

Адышоўся ад акна, зноў у пасцель лёг, коўдраю акрыўся, бо холадна, зусім холадна ў хаце было. I не ведаў, не ўяўляў, ці то радавацца, што нарэшце восень гнілая, пахмурая скончылася, зіма прыйшла, ці то шкадаваць.

«Восень радасці не прынесла... А зіма... Што прынясе зіма?» — задумаўся Мікалай.

Чамусьці згадалася, як раней жыў, усяго некалькі месяцаў назад, як чакаў, хацеў хоць якіх змен i заўсёды, кладучыся ў пасцель i падымаючыся ўранні, прасіў, маліў госпада бога не марудзіць, як мага хутчэй разбурыць калгасы, вярнуць ранейшае, чым жыў, што лагодзіла сэрца i душу,— аднаасобніцтва...

«I вось збылося тое... Калгасаў ужо няма... I змены, якія змены навокал!.. Савецкая ўлада была, кіравалі ўсім бальшавікі... Сын, Іван, у начальстве хадзіў... Быў дома Піліп... Косцік у школе вучыўся... I Параска з мужам душа ў душу жыла... А цяпер што?.. Вайна каторы месяц ідзе. Чырвоная Армія адступіла. Няма багата чаго таго, што было... Піліп у войску, на хронце. Парасчын Хведар таксама... Ці жывыя яны хоць?.. Іван знік, ніхто не ведае, куды... Косцік хоць начуе дома, але дзе шастае, чым займаецца?.. Не ўсочыш за ім... Немцы ў вёску прыехалі, начальства новае паставілі... I каго?..»

Аж не па сабе стала, сэрца агнём апаліла, як успомніў, што было там, ля сельсавета, калі немцы ў Вялікі Лес прыехалі, начальства новае выбіралі...

«I падумаць людзям не далі... Апанаса Харчэню нехта

назваў, яго і паставілі за старасту... А начальнікам паліцыі... Сам напрасіўся... І хто?..»

Улежаць больш не мог у пасцелі Мікалай. Коўдру з сябе рашуча адкінуў, ногі з ложка спусціў, шламакі-апоркі абуў. Падаўся да лавы, сарочку, штаны верхнія на сябе надзеў. Па хаце сюд-туд хадзіць, тупаць пачаў.

«Тады, як толькі ў двары маім паявіўся, ледзь не скалечыў злыдзень... А цяпер?.. Што будзе цяпер?.. І абароны дзе шукаць?.. Прывяла з сабою хлюндра на селішча маё, у хату тую, што я рабіў... Трэба ж, на старасць яшчэ і з такім спазнацца... А прагнаць?.. Як ты прагоніш? Хутчэй ён мяне прагоніць, чым я яго... На падворак выйсці — і то баішся... Дык ета ж ён у паліцыі не быў, улады не меў... Добра ж, як не чапацьме... А калі прыгадае, што сын, Іван, партыец, старшыня сельсавета... Як толькі што, і прыгадае... Сам не ведае, то людзі падкажуць... Ды і Клаўдзя, змяя падкалодная... Мяне не любіць, ведае, што я не хацеў яе на селішча сваё пускаць, не хацеў, каб Піліп з ёй жаніўся. І адпомсціць... Кожнае слова ўспомніць, што я на яе казаў, кожны пагляд мой, які я на яе кінуў... Божа, і за што мне на старасць кара такая, чым, чым правінаваціўся я перад табою?..»

Упаў на калені перад абразом, пачаў маліцца. Заўзята, апантана, як, здаецца, ні разу яшчэ не маліўся.

— Божа, божа...— шаптаў Мікалай.— Ніколі я не крыўдаваў на цябе, ніколі цябе нічым не папракаў. Толькі прасіў злітавацца, не караць так жорстка. І цяпер зноў аб тым самым прашу. Ты ж, божа, ведаеш мяне, я ўвесь перад табою, як голы, з усімі думкамі маімі, памкненнямі. Калі я чаго і хацеў, дык ета жыць па-чалавечы, кеб усякія жук і жаба не таптаді мяне, на шыю мне не садзіліся. І дбаў пра дабро, толькі пра дабро. Кеб мяне ніхто не чапаў, ніхто не квапіўся на тое, што належыць мне... Макулінкі чужога ніколі не ўзяў, не ўкраў, не прысвоіў... Маё прападала, а кеб дзе што чужое... Не было таго. Жыў, стараўся, шчыраваў... І бачыш — усё адно не ўгадзіў табе. Караеш ты мяне, жорстка караеш... Жонку ў мяне забраў, дзяцей па свеце раскідаў, ці і жывыя яны — не ведаю. А цяпер і на мяне руку занёс. Скажы, скажы, божа, за што я цябе так прагневаў, чым не ўгадзіў?..

Заварушылася на палку, спаўзаючы з пасцелі, Хора. І Мікалай быццам засаромеўся, перастаў маліцца, падняўся на ногі. Не хацелася, каб хто-небудзь чуў, ведаў,

што яго клапоціць. Нават не паглядзеўшы на Хору, накінуў на плечы кажух, шапку-зімоўку на галаву насунуў — і пашлэмаў, накульгваючы — балела нага, яшчэ з таго, як падаў, калі гэты прыблуда шпурнуў аб прызбу,— на падворак.

Стаяў некаторы час, асleплены белізною першай зімовай раніцы, на ганку, быццам не рашаючыся ступіць у снег, потым усё ж, услухоўваючыся ў мяккі, крохкі рып пад падэшвамі шламакоў-апоркаў, падаўся да хлява, заўважаючы на хаду, што снег неглыбокі і, мабыць, растане ўдзень і як ціха, нязвыкла ціха ў вёсцы.

«Спяць, мабуць, людзі. А куды спяшацца? На працу ніхто не гоніць. Даў худобе сена, напаіў — ды на печ».

«А Піліпу?.. Івану?..— згадалася раптам.— Ім як, калі снег, мароз?.. І дзе яны? Былі б тут, у крыўду бацьку не далі б. Не адзін, дык другі заступіўся б, абараніў бы... А так... Хто захоча, той і паздзекуецца. Бо сам... Ужо не абаронішся. Здароўя няма, сіла не тая. Паратунку дзе шукаць?.. Савецкая ўлада была... А етая... Ды і ці ўлада ета, калі нікога лепшага не знайшлося за начальнікаў паставіць, як сухарукага Апанаса Харчэню ды етага Рыжмана-прыблуду... Хто да іх пойдзе помачы прасіць, хто лічыцца з імі будзе?.. Адзін маладзён, малако матчына на губах не абсохла, а другі чужак, яго ніхто не ведае, і ён нікога, нічога таксама не ведае... Не, такой улады ў Вялікім Лесе яшчэ не было, ніколі не было...»

Затуліўся за вугал хлява, зрабіў тое, дзеля чаго і выходзіў на падворак. Паглядзеў на спахабленую белізну снегу, затаптаў непрыгожае месца нагамі. Павярнуўся, каб ісці назад у хату, і раптам пачуў — клямкнулі дзверы, нехта выходзіў з сенцаў.

«Ці не Рыжман ета?»

Каб не сустракацца з непажаданым суседам, не падымаючы галавы, пакіраваўся ў хлеў. Адшчапіў дзверы, зайшоў усярэдзіну хлява. Каровы ўжо стаялі — і яго, Мікалаева, і Піліпава, чакалі, калі ім хто-небудзь падкіне сена, напоіць. Але Мікалай не з тым зайшоў у хлеў — вочы яго пільна сачылі з-за дзвярэй за сваім дваром — хто, хто выйдзе на падворак? «Калі Хора, назад у хату пайду. А калі Рыжы... Клаўдзя?»

Забурліла ўсярэдзіне, гнеў пачаў падымацца, тлуміць галаву, ятрыць кроў.

«У сваім двары — як у чужым...»

Выйшаў на падворак якраз Рыжы. Ва ўсім белым,

споднім, накінуўшы на плечы кажух. Піліпаў кажух... Пратупаў крокаў колькі ад парога і мо з паўгадзіны стаяў, выліваючы з сябе лужу. І, бухнуўшы напаследак так, што аж сарока і вераб'і з перапалоху ў паветра ўзняліся, паляцелі, пайшоў, падаўся назад у хату.

«Божа, што робіцца?! — перахрысціўся Мікалай.— Хамула, свіння, а я... Зрабіць нічога не магу. Хаваюся, баюся, нібыта і не дома я, не на сваім селішчы. А далей, далей што будзе?.. Начальнік жа... Вінтоўку на плечы пачэпіць, тады... Ды і цяпер, без вінтоўкі яшчэ, а я...»

Змёрз, скалеў, стоячы ў хляве,— усё чакаў, пакуль схаваецца ў хаце, ляжа зноў у пасцель Рыжы. Тады, калі здалося, што дастаткова выстаяў, выйшаў з хлява, падаўся ў хату. Зірнуў, ідучы міма, на лужу, якую наліў Рыжы, плюнуў:

«Во бугай... Быццам месца іншага няма... Пад самым парогам...»

Адвярнуўся, пагрукаў шламакамі-апоркамі па ганку.

«Дажыўся... Да чаго я дажыўся?! І праз каго?.. Нейкую хлюндру...»

Злосна піхнуў ад сябе дзверы, папраставаў у сенцы.

## VI

Толькі ў лесе, мінуўшы людныя Ельнікі і голае, як бубен, поле, супакоіўся трохі Яўхім Бабай, перастаў чакаць, што яго вось-вось аклікнуць, спыняць, пагоняць зноў у змрочны і смярдзючы падвал, паверыў, што ён на волі, можа ісці, куды захочацца, рабіць, што зажадаецца.

«Трэба ж было мне так ускочыць? Быў бы, сядзеў бы дома — і ліха ніякага не ведаў бы. А так... Хвала богу, выпусцілі. А маглі ж, маглі...»

Пахаладзеў увесь, з галавы да ног, уявіўшы, што маглі зрабіць з ім немцы.

«І ніхто б не заступіўся, слова б не сказаў. Хто я такі, кеб за мяне заступацца, каму я трэба?..»

Адчуў, як ніколі яшчэ не адчуваў, усю сваю мізэрнасць, бездапаможнасць.

«Багата ўсюды людзей... І сярод іх я... Як мурашка... Затопчуць — і ніхто не заўважыць нават... Кожны ж дбае перш за ўсё пра сябе, яму б добра было, вырваць бы нешта, здабыць, схапіць... А пра таго, хто там, пад нагамі недзе поўзае, хто думаць будзе?.. Жонка — і тая не ўспомніла, не прыйшла ні разу, перадачы ніякай не прынесла...»

Ўсведамленне адзіноты неяк па-асабліваму кранула Яўхіма Бабая.

«І там, у Вялікім Лесе, я быў адзін... І тут, у Ельніках, тое самае. Савецкая ўлада не разумела мяне, і нямецкая таксама не разумее. Я да яе гарнуся, а яна мне... Насцаком пад самае дыхала. І рабіць мне што, кеб неяк па-інакшаму жыць?..»

Па звычцы тузануў локцем, хочучы мацней прыціснуць да сябе стрэльбу, і толькі цяпер успомніў, што стрэльбы за плячыма няма.

«Ай-я-яй! Як ета я забыўся?..»

Спыніўся.

«Хіба... Вярнуцца назад у Ельнікі?..»

«І што, як ты вернешся?» — спытала ў яго нейкая цікаўная думка.

«Да каменданта ці начальніка паліцыі пайду. Папрашу, кеб аддалі стрэльбу...»

«Дзівак! А яны цябе зноў у падвал...»

У падвал не хацелася больш вяртацца Яўхіму Бабаю.

«І так хвала богу, што вырваўся... А калі яшчэ раз пасадзяць. Магу і не вырвацца, загавець там...»

Пайшоў, пайшоў далей па дарозе.

«Але ж без стрэльбы... Хто слухацца мяне будзе?.. Дый абараніцца, калі што якое... Як?»

Не прывык, не прывык Яўхім Бабай хадзіць, дзе б там ні было, без стрэльбы. Быў без яе — быццам без рук. Колькі гадоў вось ужо з таго часу, як леснікам стаў, куды б ні ішоў — за плячыма стрэльба была. І калі не слухаўся хто — зрываў яе з пляча, настаўляў на чалавека, пагражаў.

«Не шанцуе... Ані не шанцуе... І з жонкаю, і з дзецьмі, і наогул у жыцці. Што ні зраблю — бокам потым вылазіць... Думаў, немцы прыйдуць, палягчэе. Аж не. Збілі мяне, у турму ўкінулі. А ў дадатак яшчэ і стрэльбу забралі...»

Зноў — каторы ўжо раз! — задумаўся, глыбока задумаўся Яўхім Бабай над сваім жыццём.

«Здаецца ж, і тое, і етае робіш, кідаешся то сюды, то туды, усё хочаш, каб лепей было. А яно не лепшае — шчасця як не было, так і няма. І хто вінаваты ў етым? Улада? Але ж яна мяняецца, некалькі разоў памянялася ўжо. Была царская, стала савецкая. Цяпер немцы прыйшлі, а ўсё адно... Як быў я ніхто, такім і астаўся. Людзі

вінаваты ва ўсім?.. Але ж таксама... Хацелася і яму, Яўхіму, выпрастацца, галаву падняць. І бачыш — ледзь зусім без галавы не астаўся. Хто ж, хто ва ўсім — шчасці і няшчасці чалавека вінаваты? Ад каго ўсё залежыць?.. Раней казалі — ад бога... Але ж і бог... Якраз пры Савецкай уладзе хто добра і жыў, дык бязбожнікі, ім усё і ўсюды было даступна. А такім, як я, ніколі нічога добрага не перападала. І ў каго таго добрага прасіць, што рабіць, кеб яно прыйшло?..»

Не ведаў, не ўяўляў Яўхім Бабай, ад каго шчасце чалавека залежыць. Ды і не чалавека наогул, а яго, Яўхіма Бабая, шчасце.

«Кеб ведаў, гадзіў бы, як ліхой скуле, маліўся б дзень і ноч, улешчваў бы, служыў бы верай і праўдай... А так... Кінешся да аднаго, а ён табе... Ты з адкрытай, шчырай душой, ты спадзяешся на яго, ён жа... Насмяецца, паздзекуецца з цябе. І так увесь час, усё жыццё. Мяняюцца ўлады, а жыццё маё калі і мяняецца, дык не на лепшае, а на горшае. То ў «зялёных» галадаў, то, ажаніўшыся, з Сонькаю, з дзецьмі мучуся. А цяпер немцы прыйшлі... У турму пасадзілі, ледзь жывы на волю выбавіўся. Але ці надоўга?.. Што чакае мяне наперадзе — заўтра, паслязаўтра?.. Дык ета ж... Калі Саветы сюды не вернуцца?.. А як вернуцца?.. Ад мабілізацыі ж уцёк, бегаў па вёсцы, загадваў, кеб людзі немцаў хлебам-соллю сустракалі. А за ета... Не пахваляць. Вунь Іван Дарошка і Васіль Кулага прыходзілі ў хату, казалі, што за ўсё ета расстраляць можна...»

Успомніўшы Івана Дарошку і Васіля Кулагу, аж ноздры раздзьмуў, засоп Яўхім Бабай.

«Кеб не прыйшлі яны тады да мяне ў хату, я, можа б, і не пабег у Ельнікі. І не збілі б мяне там, стрэльбу не адабралі, у турму б не пасадзілі. А так... Вунь, вунь што праз іх! Не, я ім етага не дарую! Высачу, выцікую, дзе яны ходзяць, дзе начуюць, і паведамлю ў Ельнікі, немцам паведамлю. Хай робяць з імі, што захочуць. А то надта разумныя ды хітрыя. Самі на вайну не пайшлі, а мяне пагнаць хацелі. Пачаплялі на плечы вінтоўкі — і ходзяць, як асэсары».

Забурліла, пачала падымацца аднекуль з сярэдзіны, аж выбухаць, злосць на Івана Дарошку, Васіля Кулагу, усіх-усіх людзей, якія, пакуль ён, Яўхім Бабай, мучыцца, жывуць сабе і гора, бяды не ведаюць.

«Я то па лесе сноўдаюся, хаваюся, быццам звер, то ў турме сяджу, як усё адно злачынца які, а яны жывуць сабе

прыпяваючы. Спяць у чыстых цёплых пасцелях, ядуць смачна, ды яшчэ і іншымі камандуюць, што рабіць альбо не рабіць. Чаму ета так?.. Хто ім права такое даў? Прысвоілі яго самі і карыстаюцца. А ты... Як быў бяспраўны, так і аставайся. Не-е, нешта рабіць трэба, хопіць агінацца, прыслужваць усім. Хоць некалькі гадоў, а пажыць бы... Пажыць так, як не камусьці, а мне самому хочацца. Кеб Соські, дзяцей штодзень не бачыць, не чуць іх галасу і крыку. Адзявацца ў добрае і цёплае. Есці смачна. І не слухацца нікога, а самому б камандаваць. А там... Відаць будзе, што далей рабіць...»

«Дык жыві, хто табе замінае?..»

«Як хто? То Саветы не давалі жыць так, як хацеў. А цяпер... Немцы во... Зноў у турму пасадзіць могуць. Добра ж, як пашанцуе Івана Дарошку і Васіля Кулагу высачыць. А як тыя даведаюцца пра ўсё, схопяць мяне, перш чым немцы іх зловяць?.. Прыходзілі ж і так ужо, пагражалі, што прыстрэляць... Ды і немцы... Не вечна ж яны тут будуць. Прагоняць іх, зноў Саветы вернуцца... Што тады рабіць? Можа, лепей схавацца, наогул не паказвацца на людзі. Па лесе блукаць, дадому толькі ўвечары, як змеркнецца, прыходзіць?»

«А жыць? За што жыць? Зарплату хто плаціць будзе?»

Не ведаў, ані не ведаў Яўхім Бабай, як жыць яму далей, каму служыць. То здавалася — немцам трэба служыць, да іх гарнуцца. То раптам палохаўся немцаў, уцякаць у нетры, у непралазь ад іх хацелася. І, ахоплены роздумам, ішоў, брыў Яўхім Бабай па дарозе і ўжо не радаваўся, што на волі ён. Бо ведаў, адчуваў: воля гэтая можа ў любую хвіліну няволяй стаць. І залежыць — быць на волі ці ў няволі — не ад яго аднаго.

«Ад каго ж?» — пытаў у сябе Яўхім Бабай.

І не ведаў, не мог сказаць — ад каго гэта залежыць.

Дадому, у сваю хату, Яўхім прыйшоў толькі на змярканні — і не заўважыў, калі мінуўся, згас кароткі асенні дзень. Адчыніў дзверы, парог пераступіў — і адразу ж, у тую хвіліну, накінулася, наляцела на яго з крыкам жонка, Сонька:

— Дзе ты валочышся? Моду дзіўную ўзяў — не казаць, куды ідзеш. Я ўжо думала бог ведае што!

Яўхім нічога не адказаў жонцы, паволі пакіраваўся да лавы, сеў. Падумаў сабе: «Кіну Соньку. Хопіць мне з ёю

мучыцца. І так хай дзякуй скажа, што столькі жыў».

Пасаскоквалі, пазлазілі з печы дзеці, акружылі бацьку — думалі, гасцінцаў, ласункаў прынёс. Але, убачыўшы, што таго, чаго яны хацелі, няма, хуценька зніклі, пазалазілі зноў на печ, у цяпло.

— Во пакуль ты валачыўся, у нас немцы пабылі. Начальства новае выбралі,— паведаміла Сонька вясковыя навіны.

— Ведаю,— адказаў стомлены Яўхім.

— А ты ж казаў, што цябе за начальніка паставяць? — вырачыла на мужа вочы жонка.

— Адчапіся, не прыставай,— не хацелася сёння сварыцца Яўхіму з жонкаю.

Але Сонька была настроена інакш.

— А ты... Чаму не адчапіўся, прыставаў, калі я не хацела стала з хлебам-соллю перці, немцаў сустракаць? Як усё адно ведала, што цябе за начальніка не паставяць. Кеб, можа, дома, у вёсцы ў той час быў... Дык жа ты... Усё недзе валочышся.

— Кеб ты ўвесь век свой так валачылася,— кінуў як праклён Яўхім.

Сонька не зразумела мужа.

— А дзяцей... Хто дзяцей глядзець будзе? Яны ж, можа, не святым духам жывуць, іх і накарміць, і напаіць трэба. А чым? Ты падумаў пра ета?

— А чаму ета я адзін пра ўсё думаць павінен? А ты?..

— Я думаю, а хто ж яшчэ думае? Як вайна пачалася, дык адна, толькі адна і пятуюся. То ты нечага баішся, уцякаеш, то чортведама дзе цэлымі тыднямі... А таго не ведаеш, што пуста ў нас у хаце, акрамя бульбы, нічога няма. А наперадзе ж зіма, халады, жыць як?

— Іншыя жывуць, і ты пражывеш.

— Іншыя з калгаса ўсяго нацягалі. І хлеба, і бульбы, і нават худобы панабіралі.

— А ты чаму ж не нацягала, не панабірала нічога?

— Бо ты... У калгас не ішоў, у леснікі падаўся. Па лесе, задраўшы галаву, сноўдаўся. А кеб на полі працаваў, кеб у калгасе быў, і нам бы сёе-тое перапала...

— Калі я ва ўсім вінаваты, замінаю вам жыць, дык я... Аслабаджу вас...

— Як ета ты нас аслабодзіш?

— А так — пайду ад вас. Жывіце, як вам хочацца, без мяне.

— Куды ты пойдзеш? — зацікавілася Сонька.

— Знайду — куды.

— Дык ідзі, ідзі,— быццам падахвоціла Сонька мужа.— Толькі і іх з сабою забірай,— паказала яна на печ, на дзяцей.— Бо адна я... Такую плойму не пракармлю.

— А нашто ты іх раджала, калі не пракорміш?

— Ета я раджала?

— А хто ж? Я?..

— Ты, ты... Як толькі ноч, дык і лезеш, як бугай... І паспрабуй адвярніся... Ты ж... З'ясі тады, жыць не дасі... А цяпер... Я вінавата?..

Сонька заплакала. Пачалі плакаць, румзаць у розныя галасы і дзеці.

«Во яна, воля,— падумаў сам сабе, седзячы на лаве і ўсё яшчэ не распранаючыся, Яўхім.— Я так ірваўся з таго падвала, дадому, у сваю хату хацеў, а тут... Не лепш, чым у тым смярдзючым падвале».

Насунуў на самыя вочы шапку і, ні слова нікому не кажучы, пайшоў з хаты...

## VII

У нядзелю — святы дзень — па Вялікім Лесе разнеслася чутка: у вёску прыедзе з Ельнікаў поп, каб пахрысціць дзяцей, бо быццам немцы аддалі загад усіх няхрышчаных, няхай то дарослыя ці дзеці, страляць. І хрышчэнне тое будзе праходзіць у былой царкве, абсталяванай пад клуб. І таму з самай раніцы з усіх канцоў вёскі пацягнуліся да клуба людзі — хто вёў сваіх дзяцей за рукі, хто нёс ці вёз на саначках-саматужках, ушушкаўшы папярэдне, каб не прастудзіць, у коўдру ці ў кажух, а хто і проста прыйшоў паглядзець, як будзе праходзіць хрышчэнне. Не дзіва — многія і не помнілі, як тое робіцца, ды і на папа хацелася таксама паглядзець — малады ён ці стары, як апранаецца, ці падобен паставай і голасам на тых папоў, што былі некалі, яшчэ да рэвалюцыі.

Поп прыехаў у позняе снеданне, калі вёска ўся ад малога да вялікага сабралася да клуба. Лёгка падкаціў на саначках-вазку, запрэжаных у парку сытых гнедых коней, да сельсавета — цяпер воласці,— у валёнках, кажуху, шапцы-вушанцы. Ніхто і не падумаў спярша, што гэта поп, усе палічылі — так хтосьці прыехаў. Аднак, калі чалавек, прывязаўшы да плота коней, пайшоў у сельсавет і праз нейкі час выйшаў адтуль, пераапрануўшыся, усе ўбачылі, што

гэта поп — у чорным да самых пят, з вялікім крыжам на грудзях і кнігай-бібліяй у руцэ. Схіліўшы галаву, ён прайшоў міма людзей, перахрысціўшыся спачатку сам, потым ахінаючы святым крыжам людзей, а заадно і будыніну — клуб. Поп быў немалады векам, з шырокім скуластым тварам, вялікім мясістым носам і чорнымі быстрымі вачыма.

Калі адамкнулі клуб і зайшлі ўсярэдзіну, поп спытаўся здзіўлена, расчаравана:

— Чаму святы храм не пратапілі? Вы ж дзяцей папрастуджваеце...

Аднак па той прычыне, што ў клубе холадна, адмяняць хрышчэнне не стаў. Загадаў усім заходзіць у клуб, дарослым стаць па адзін бок, малым, тым, каго трэба ахрысціць, пастроіцца ў некалькі радоў па другі бок. Папрасіў поп прынесці і вядро з вадою. Калі ўсё гэта было зроблена, дастаў аднекуль з патайной кішэні бутэлечку «свянцонай» вады, выліў яе ў вядро і пачаў хадзіць між радоў дзяцей, макаючы палец у ваду і ставячы кожнаму тым мокрым пальцам на лоб крыж і даючы пацалаваць той, што быў у яго на грудзях — вялікі, драўляны, з распятым Ісусам Хрыстом на ім. Уся працэдура хрышчэння цягнулася мо з паўгадзіны. Але і за гэты час дзеці паспелі і пасмяяцца, і падурэць — даць адно аднаму кухталя пад бок, а дарослыя — перасварыцца з-за тых жа дзяцей, якія не ўмелі сябе паводзіць. Але поп на ўсё гэта не звяртаў асаблівай увагі — ставіў і ставіў на лбы крыжы, быццам спяшаўся хутчэй скончыць сваю работу. І як толькі скончыў, паставіў крыж апошняму — гэта была Тхорыкава Люда, яна не хацела ісці хрысціцца, саромелася, бо вялікая была, але бацькі прымусілі, ледзь не сілаю прывялі ў клуб,— адышоўся да сцэны, аб'явіў даволі гучным, трубным голасам:

— За кожнага ахрышчанага заплаціць трэба. Я буду сам прымаць плату. У воласці. Там і запішу ўсіх дзяцей. Бо тут прастудзіцца можна. Што ў каго да мяне? — звярнуўся ён напаследак да дарослых.

Пытанні да папа ў людзей былі. І найперш, што ўсіх цікавіла,— гэта якая плата за хрышчэнне.

— Усякая прымаецца,— гаварыў так, каб яго чулі, поп.— Ячмень, жыта, проса, сала, яйкі, масла...

— А грошы? — пыталі з натоўпу.

— Грошы толькі калі царскія, залатыя... Савецкія грошы — бязбожныя, яны не прымаюцца.

— А колькі чаго трэба прыносіць? — цікавіліся людзі.

— Збожжа па паўпуда з дзіцяці. Сала і масла па два з палавінай хунты, гэта значыцца па кілаграму... Яек два дзесяткі...

— А калі хто не прынясе платы?..

— Не прынясе — дзіця будзе не запісана, будзе лічыцца не ахрышчаным... Немцы такіх... Самі ведаеце...

— А з хворымі як жа?

— Хворых я ахрышчу наступны раз, як прыеду.

— Калі ета будзе?

— Цяжка сказаць, бо няхрышчаных шмат,— адказваў поп.— Два месяцы езджу з вёскі ў вёску. А яшчэ і палову не пахрысціў. Ды і да мяне ў Ельнікі, у царкву, можна прыехаць, калі дзіця паправіцца. Я ахрышчу. Толькі платы не забывайце з сабою браць... Немцы на царкву падатак вялікі наклалі, яго плаціць трэба...

Схіліўшы богабаязна галаву, поп падаўся з клуба да сельсавета — воласці. А людзі, пазабіраўшы сваіх дзяцей, пакіраваліся дадому. Але ненадоўга — неўзабаве зноў выходзілі з хат, неслі хто сала, хто масла, хто яйкі, а хто і збожжа ў мяшках і торбачках. Не прывыклыя стаяць у чарзе, тоўпіліся ў сельсавеце-воласці ля стала, за якім сядзеў поп і, не спяшаючыся, запісваў у тоўстую кнігу дзяцей, якіх толькі што пахрысціў.

— Прозвішча? Як прозвішча? — пытаў ён то ў аднаго, то ў другога.— А зваць як?

— Каго зваць? — перапытвалі людзі.

— Таго, каго я хрысціў. І бацьку, маці яго. І яшчэ — дзень і год нараджэння.

— Чый?

— Ды хрышчэнніка, дзіцяці твайго,— злаваўся поп.— І цішэй, цішэй. А то не чуваць нічога,— пакрыкваў поп на людзей.

Злаваўся поп не толькі таму, што людзі паводзілі сябе даволі вольна, смяяліся, рагаталі, але яшчэ і таму, што скупаватыя былі, малавата ўсяго прыносілі. А царскіх грошай — золата, на што вельмі ж спадзяваўся поп, наогул ніхто не прынёс.

— Што гэта за сяло такое? — задаваў ён час ад часу не то сабе, не то яшчэ камусьці пытанне.— Кожны хоча недадаць, не тое каб перадаць. І бога ніхто не баіцца...

Але як ні скупіліся людзі, усё ж нанеслі папу шмат чаго. Так што калі ён ад'язджаў пад вечар зноў у Ельнікі, коні ледзь цягнулі нагружаныя розным дабром сані.

— За дзень зарабіў поп столькі, колькі мы з табой і

за год не заробім,— праводзячы папа, гаварыў Тхорыку Пархвір Рыкуль.

— Ета ж не аднаму сабе,— апраўдваў папа Тхорык.

— А каму ж?

— З немцамі падзяліцца трэба...

— І з богам таксама,— смяяўся, кпіў Пархвір Рыкуль.

Разам з усімі людзьмі вадзіла хрысціць сваіх дзяцей і Параска, дачка Мікалая Дарошкі. Стаяла, мёрзла ў клубе, глядзела, як спяшаўся поп хутчэй управіцца, потым вяла дзяцей праз усю вёску дадому, зноў мясіла растаптаны людскімі нагамі снег, бралася ў сельсавет, несучы папу плату — тры дзесяткі яек і грудку масла, вінавацячы сябе, што не паслухалася бацькі, не пахрысціла дзяцей у царкве раней, калі тыя толькі што нарадзіліся. Не настояла на сваім, а магла ж гэта зрабіць, бо муж, Хведар, хоць і супраціўляўся, але ж угаварыць і яго можна было. Не партыйны быў ён і пасады ніякай не займаў, проста размоў не хацеў, не хацеў адсталым сябе лічыць, за старое трымацца.

Ды не гэта, не гэта займала думкі Парасці, хвалявала яе. З галавы не выходзіла іншае, куды больш важнае. Стоячы ў клубе, пачула яна ад жанчын, быццам непадалёку ад Мазыра ёсць лагер ваеннапалонных чырвонаармейцаў і нібыта немцы аддаюць жанчынам мужоў, калі толькі яны там, за калючым дротам, дадому, да сям'і пускаюць. І не толькі мужоў, але і сыноў бацькам.

«А раптам і мой Хведар у палон трапіў? Ці Піліп? — вось што клапаціла жанчыну.— І калі б пайсці да таго лагера, паглядзець? Ета ж не так і далёка — Мазыр той? Цяпер замёрзла, то і на Ельнікі ісці не трэба. Пайсці праз балота на Глінішчы, адтуль да Юравіч, а ўжо там, кажуць, і Мазыр зусім блізка. За якія двое-трое сутак справіцца можна туды і назад. Дзецям яды наварыць, папрасіць Хору, каб худобу прыгледзела, і схадзіць. А раптам і праўда там Хведар ці Піліп?.. То і выбавіла б, дадому прывяла б. Бо ў лагеры... Хто ведае, як у лагеры ім, бедным. Ета ж, можа, не на волі...»

Падзялілася тым, што сама думала, з Анютай Куляшовай, «брыгадзірыхай», жонкай Грышкі Сапуна, калі сустрэла тую ля сельсавета, дадому разам, плату папу аддаўшы, вярталіся.

— А што, давай сходзім,— згадзілася Анюта.— Можа, і Грышка мой там?

— Удзвюх і пойдам? — спытала, не зусім яшчэ ўпэўненая, Параска.

— Аге.

— А калі мы яшчэ каму-небудзь прапануем? — вагалася Параска.

— Можна. Але... Удзвюх лепей.

— Чаму лепей?

— Вельмі проста. Два чалавекі — ета два чалавекі. І пераначаваць дзе папрасіцца, і там, у лагеры... Дзвюх могуць пусціць, а больш, як навалімся гуртам, усім сялом...

— Ну дык і што? — не разумела Параска.

— Ох, якая ж ты нездагадлівая... Калі да цябе адзін чалавек пазычаць што прыйдзе, дасі. Дасі двум... А больш... На ўсіх не хопіць, не набярэшся...

— Але ж гуртам ісці і ахватней, і смялей.

— А чаго нам баяцца? Што мы — красці ідом? І калі ісці, дык трэба ісці, не адкладваць. Палонных жа і перагнаць у другое месца могуць. Ды і пакуль яшчэ не ўсе ведаюць, не ўсе ідуць... А як пойдуць... Немцы могуць і спыніць етую раздачу...

Параска трохі здзіўлена была разважаннямі Анюты. Але была і пакорана яе рашучасцю.

— Я і не думаю адкладваць. Давай заўтра і пойдам.

— Давай.

— І што — нікому казаць не будам?

— Не, не будам. Калі што, то іншыя і пасля нас схадзіць могуць. Як мы пабудам і вернемся...

З Вялікага Лесу выйшлі раненька, яшчэ на цямочку. Удзвюх, як і дамовіліся. І ў Параскі, і ў Анюты за плячыма былі даволі ладныя хатулі — завязаныя ў хусткі боханы хлеба, кавалкі сала, вараныя яйкі, іншая яда. На нагах у абедзвюх — буркі, на плячах — кажухі: дарога была не блізкая, і абуваліся, апраналіся так, каб і ісці было лёгка, і каб няхоладна было.

— Да мяне Аўдуля Сучкова прыбягала,— расказвала Анюта, калі выйшлі за вёску, павярнулі на тую дарогу, што вяла ў Глінішчы.— Яна таксама пачула ад некага пра лагер і ісці збіралася. Але я не прызналася, што мы з табою ўжо змовіліся, ідом.

— А да мяне Ліда Шавейкава ўчора ўвечары завітала,— сказала Параска.

— Чаго ета яна? — спытала Анюта.

— У кожнага сваё. Мы пра мужыкоў думаем, а яна пра жаніха. Пачула ад некага таксама пра лагер, прыходзіла пытаць, ці не збіраюся я туды наведацца.

— А ты?

— Я маніць не прывыкла. Прызналася, што пайду. Дык Ліда папрасіла, калі буду ў лагеры, паглядзець, хто яшчэ з нашых у лагеры е.

— І пра Міхася Рыкуля не ўспомніла?

— Не.

— А думала ж, напэўна, пра Міхася, калі тое табе казала.

— Можа, і думала.

— Цяперашнія дзеўкі не тое, што ў наш час былі. Самі на шыю вешаюцца.

— Дык жа няма на каго,— не зусім згадзілася з Анютаю Параска.

— Калі захоча, то знойдзе. Твая братавая, Клаўдзя, бачыш, тут не знайшла, дык прыняла сабе чужога.

Задумалася Параска, не адразу адказала Анюце. Толькі калі ў лес увайшлі, прызналася:

— Клапоціць мяне ета. Што Піліпу сказаць, як убачу яго там, за калючым дротам? Тут жа пра жоначку яго, Клаўдзю, усё і выкласці ці змоўчаць, нічога не паведамляць, пакуль у сяло ён не вернецца, сам на свае вочы тое паскудства не ўбачыць? Але як ты, нічога не сказаўшы, ісці разам будзеш? Ды і дома жыць як яму? У бацькі, маючы сваю хату? Сустракацца штодзень з етым нелюдзем? Ды і з Клаўдзяю?.. Галава кругам ідзе, плакаць хочацца, як падумаю. А ён жа, Рыжы, цяпер начальнікам паліцыі, што захоча, тое з Піліпам і зробіць...

Анюта ўсміхнулася.

— А я, як толькі свайго ўбачу, адразу пра Клаўдзю скажу. Хай ведае, з кім ён круціўся, на каго мяне мяняў. Ён, пэўна, думаў, што яна кахае яго. А яна... Проста сучка, хто на яе ўскочыць, таму яна і... Такая, мабыць, ужо ўрадзілася, і дня без мужчыны пражыць не можа.

Нейкі час ішлі моўчкі. Але тое, пра што ўсчалі размову, займала і адну, і другую. Дый умовы, каб шчыра пра ўсё, што хвалявала, пагаварыць, быццам былі, ніхто не падслухоўваў, нікога навокал нідзе наогул блізка не было.

— Век жыву,— прызналася Параска,— а кеб зразумець, чаму баба, жывучы з адным, хінецца раптам да другога ці той жа мужчына, жывучы з адной, бегае яшчэ і да

другой — так, мусіць, і не зразумею. Няўжо не хапае?

— Я ў свайго, Грышкі, неяк пра тое пыталася,— аглядваючыся па баках, таямніча прашаптала Анюта.— А ён жа... Кот... Як толькі дзе спадніцу ўбачыць, дык бы і задраў.

— І цікава — што ён табе на ета?

— Нічога не адказаў, прамаўчаў. Але...— Анюта падышла бліжэй да Параскі, зашаптала ледзь не на самае вуха.— Аднойчы быў папракнуў мяне, што халодная, раблю тое не зусім так, як іншыя робяць.

— А як іншыя робяць? Не казаў?

— І я ў яго прасіла, маўляў, навучы, то і я так рабіць буду.

— А ён?

— Такому, кажа, не навучыш. Яно само, з нутра, павінна рабіцца. А прытворства... Не тое зусім...

— Ліха ведае, кеб і сабе калі паспрабаваў,— хіхікнула Параска.— Можа б, з іншым яно па-іншаму ўсё і было б.

— А я аднойчы паспрабавала,— усміхнулася сама сабе Анюта.

— Праўда? — не паверыла, здзівілася Параска.

— Аге. Ён, мой, усё бегае ды бегае. Дай, думаю, і я хоць разок адведаю таго, што ён амаль штодзень адведвае. Выпадак надарыўся, я і...

— Ну і як? — дапытвалася Параска.

— Не разабралася. Мо таму, што баялася, кеб не нахапіў нас хто-небудзь. Але горш, чым нават з Грышкам. Ва ўсякім разе, смаку я не адчула ніякага. Толькі... Перажывала вельмі ж. Мылася, мылася, а ўсё адно быццам бруд на ўсім целе. Упікала сябе, что паддалася спакусе. Дый баялася надта ж.

— Чаго баялася?

— Ці мала чаго? Раптам да Грышкі дойдзе... Ці... Яшчэ, не дай бог, зачараваецею, дзіця народзіцца, ды не на Грышку падобнае будзе. Дзе ад сораму падзецца тады?.. Думала, звар'яцею, пакуль не пераканалася, што нічога ў мяне няма, ніякай цяжарнасці. Так перажываць, мучыцца? З-за чаго? Кеб ужо мужыка свайго не мела, не ведала, як тое ўсё робіцца, няхай бы, хоць бы апраўданне нейкае было. А то ж пры мужыку ды такім займацца... Не-е! Раз паспрабавала, і годзе.

— І з кім жа тое ў цябе было? Можа, з Хведарам маім? — дапытвалася хітрая Параска.

— Не, што ты...— аднекнулася Анюта. І, бачачы, што Параска неяк быццам насцярожылася, не паверыла, дадала: — З Мішкам Савасцеем...

Памаўчала, а потым спытала:

— А што, хіба і Хведар твой круціўся з кім?

Параска адказала не адразу. Мінула ладна часу, перш чым прамовіла яна:

— Мы з ім жылі душа ў душу, у злагадзе. Але хто іх, мужчын, ведае, не пракантралюеш жа.

— А я свайго была навучылася кантраляваць. Як вяртаецца дадому, я яго да сябе ў пасцель. З ахвотаю тое робіць, значыцца, нічога нідзе не меў, згаладаўся. Без ахвоты... Значыцца, меў нешта, здаволіўся...

— Ну і толк які быў з твайго кантролю?

— Ніякага толку. Хіба толькі ведаеш, здагадваешся, з кім у яго тое магло быць.

— Такое, мабыць, лепш не ведаць, не здагадвацца. Толькі жыццё сабе і яму атручваць.

— Яно-то так...

Некаторы час ішлі моўчкі, кожная занятая сваімі думкамі. Урэшце Параска не вытрымала, сказала:

— Мы тут з табою... Пра такое... А яны, і Грышка твой, і Хведар мой, можа, дзе там... Крывёю, параненыя, сцякаюць ці ў палоне богу душу аддаюць...

— Усё можа быць. Вайна, бачыш, складваецца... Немцы нас б'юць. І кеб... Жывы, здаровы Грышка мой быў, усё б яму даравала. Хай бы жыў, як яму хочацца, абы дома, у хаце сваёй, з дзецьмі, са мною... Я і есці яму б варыла, і абмывала б, і ўсё рабіла б...

— Эх, Анюта, Анюта,— уздыхнула Параска.— Доля наша жаночая такая. Усё дараваць мужчынам, што б яны ні рабілі, абы толькі нас не кідалі, з намі былі. Бо без іх мы... Жыць не можам, вар'яцеем. Ды яшчэ калі ведаем, што з імі можа здарыцца штодзень, кожную гадзіну, хвіліну... Дык ета ж калі жывыя яны... А калі...

Параска ўсхліпнула. Усхліпнула і Анюта.

— Ляжыш іншы раз у пасцелі... Ці робіш штонебудзь,— сказала Анюта скрозь слёзы.— І заплачаш раптам ні з сяго ні з таго. Пашкадуеш, што і сварылася, жыць так, як ён хацеў, не давала. А ён, бедны, можа, адчуваў, што не пагуляеш больш, вато яго і было, што пагуляў. А я, дурная, яшчэ помсціла яму, з Мішкам Савасцеем у капе...

— І я плачу часта. І па начах, і днём,— прызналася Параска.— Хоць і жылі мы з Хведарам быццам доб-

ра, а ўсё ж... Адчуванне іншы раз такое бывае, нібыта недадала я яму чагось, быццам вінаватая ў нечым перад ім. Тады, як спакойна, мірна жылі, не думалася, што таго, што маем, можа не быць, пра нягоды, вайну не думалася. А вось прыйшлі чужынцы на зямлю нашу, пашкадавала пра многае. А далей што яшчэ будзе, як жыцьмам?..

Больш не ўспаміналі ні мужоў сваіх, ні вайны — ішлі моўчкі. А калі і гаварылі пра што, дык пра будзённае — дзяцей, худобу ці апошнія навіны вясковыя абмяркоўвалі, перакідваліся словамі, калі адчувалі ў тым якую-небудзь патрэбу...

За дзень адмахалі кіламетраў, мабыць, з сорак. І яшчэ б ішлі, каб змяркацца не пачало. Якраз і вёска па дарозе трапілася — невялікая, хат мо на трыццаць. Пастукаліся ў першую ж ад канца хату. Дзверы адчыніў зусім стары дзед.

— Што вам трэба, галубкі? — спытаў, не зводзячы з жанчын вачэй.

— Пераначаваць,— у адзін голас адказалі і Параска, і Анюта.

— Пераначаваць? — перапытаў, чухаючы патыліцу, дзед.— Пераначаваць можна, хаты вы не пралежыце. Але немцы, каб на іх трасца, забараняюць пускаць без дазволу ў хату каго б там ні было. Ці ж хоць ведаеце пра ета?

— Не, не ведаем,— разгубіліся, зніякавелі жанчыны.

— І дакументаў, вядома ж, ніякіх пры сабе не маеце?

— Не, не маем.

— Што ж мне рабіць з вамі? — паківаў галавою дзед.— Хіба заходзьце.

Зайшлі жанчыны ў хату. А іх, не даўшы нават распрануцца, і за стол запрасілі — гэта зрабіла ўжо бабка, сагнутая ўся, быццам гарбатая, ад гадоў. Бо, як выявілася, дзед з бабаю вячэраць збіраліся. Жанчыны пераглянуліся адна з адной, з хатулёў, што за плячыма неслі, прыпасы свае даставаць узяліся. Але дзед спыніў жанчын:

— Не трэба, хапае ў нас яды. Абы есці было каму.

Сапраўды, на стале, акрамя варанай бульбы, кіслых агуркоў, стаяла ўжо і патэльня з яечняю — калі толькі і ўправілася яе засмажыць бабка, пузацеў і гладыш малака. Але ўсё адно жанчыны сёе-тое вылажылі і са сваіх прыпасаў — Параска курыцу, спечаную ў печы, Анюта — грудку масла.

— Што вы робіце? — спыняў жанчын дзед.— Вы ж кудысьці ідзяце, спатрэбіцца ў дарозе.

Жанчыны расказалі, куды яны ідуць.

— То вам і не трэба ў Мазыр. Лагер той не ў Мазыры, а ля Мазыра. У полі,— паведаміў дзед.

А бабка заўздыхала, забожкала.

— Божа мой, божа, ета ж трэба, каб гора такое на людзей нашых,— зашамкала яна бяззубым ротам.— Жылі-былі, і раптам... Начаваць людзей пусціць — і то бойся.

— Хай немцы нас баяцца, а не мы іх,— сказаў гучней дзед, каб пачула баба — яна, мусіць, недачувала трохі.— І да іх прыходу жылі мы, і, дасць бог, пасля іх жыць будам. А пазабіваюць — не бяда, пражылі мы сваё, дзякаваць і за тое...

За вячэрай дзед з бабай пахваліліся, што ў іх трое дзетак, усе сыны і ўсе жылі і працавалі ў Маскве: старэйшы — дырэктарам завода, два другія — не начальнікі, але таксама зараблялі і жылі добра, прысылалі штомесяц бацькам грошы.

— Каб не Гітлер, не немцы етыя, хоць на старасці параявалі б. А так спаць кладзешся і не ведаеш, ці ўстанеш. Бяруць людзей немцы, некуды вязуць, страляюць, і ніхто не кажа за што. Надоечы аднаго невядомага забілі. У лагер гналі той пад Мазыр, а бядак аслабеў, ісці не мог. Дык яго прыстрэлілі проста на нашых вачах, царства яму нябеснае,— перахрысціўся дзед.

— Можа, каго з нашых? — насцярожыліся жанчыны.

— Не, не вашага... Армяніна ці турхмена...

Павячэраўшы, і спаць паўкладваліся: дзед з бабаю на печы, а Параска з Анютаю — на палку. І пазасыналі хутка, бо і пастамляліся ж, месячы цэлы дзень снег па розных лясных і палявых дарогах. А ледзь світаць пачало — падаліся з хаты, падзякаваўшы добрым людзям за прытулак і начлег.

Лагер ваеннапалонных — дзед казаў праўду — быў у чыстым полі, на ветравеі. Абнесены з усіх бакоў калючым дротам, ён нагадваў кашару, у якую ў летнія месяцы заганяюць жывёлу. Тут і там над агароджай узвышаліся драўляныя вышкі, на якіх маячылі ўзброеныя вартавыя. Чарнела збоку і нейкая будыніна — не то старая ёўня, не то свіран. Там, ля той будыніны, найбольш і тоўпіліся людзі — і па адзін бок агароджы, і па другі.

— Мусіць, і нам туды трэба падавацца,— сказала Параска, калі выйшлі яны з Анютай з лесу, убачылі яшчэ здалёку лагер.

— Ды ўжо ж,— уздыхнула Анюта.

Ішлі, не спускаючы вачэй з таго, што было перад імі. І чым бліжэй падыходзілі да калючага дроту, тым крокі іхнія рабіліся ўсё павальнейшыя, няўпэўненыя. Бо тое, што адкрывалася вачам, не ўкладвалася ў галаве, не верылася, не хацелася верыць, што гэта праўда, так яно ёсць на самай справе, а не выдумка гэта, сон. Асабліва калі першага палоннага ўбачылі — ён стаяў ля дроту, у адной гімнасцёрцы, да таго ж падранай на грудзях, з забінтаванай галавою і сумна-сумна глядзеў некуды ў поле. І астатнія палонныя былі таксама апрануты не лепш. Рэдка ў каго на плячах быў шынель, а на галаве пілотка. І ўсе худыя, з зямлістымі, пазарастанымі шчаціннем тварамі. І глядзелі на жанчын — а іх, як хутка ўбачылі Анюта і Параска, было нямала ля будыніны — з надзеяй, просьбай, маўляў, вазьміце мяне, выратуйце ад смерці, я век буду вам дзякаваць, буду рабіць, што скажаце, што загадаеце. Можа б, каб палонныя гаварылі што-небудзь, лягчэй было б на іх глядзець. А то ж не гаварылі, а калі і гаварылі, дык аднымі вачыма, бязмоўна, ледзь-ледзь варушачы губамі...

Параска з Анютай спыніліся, нейкі час стаялі сярод такіх жа самых жанчын, як былі і самі, глядзелі на палонных, што таўкліся, сноўдаліся за калючым дротам, у кожным з палонных хочучы пазнаць свайго мужа. Але знаёмай постаці, знаёмага твару не было. А можа, дзе і быў, але не каля дроту, а там, далей, дзе згрувасцілася дзесяткаў колькі чалавек у купу, не то сядзелі, не то ляжалі, грэючы адно аднаго сваім целам. Бо гэта ў лесе, у хадзе, холаду і ветру не адчувалася. А тут, у полі, прадзімала навылёт, да самых касцей прабірала.

— А як ета... У каго б спытаць? — асмелілася, таўханула Параска жанчыну, што стаяла перад ёю.— Пра мужа... Можа, ён у лагеры?

— Наперад прайдзіце. Там немцы, у іх і спытайце...

Параска, а за ёй і Анюта падаліся наперад, штурхаючыся і прабіраючыся праз людскі натоўп. Аж узмакрэлі, пакуль выбіліся да будыніны, якую бачылі яшчэ здаля. У будыніне, мабыць, была нейкая кантора ці канцылярыя, туды то заходзілі, то адтуль выходзілі жанчыны. Вісеў і нейкі загад на сцяне — з вялікім чорным арлом,

пад якім было нешта напісана. Ля таго загаду тоўпілася таксама купка жанчын.

Параска з Анютай наблізіліся да купкі той, папыталі ў людзей, што напісана ў паперы.

— Напісана, што могуць аддаць немцы палоннага, мужа альбо сына,— адказала ветліва жанчына, што стаяла ля самай паперы — маладая, смуглявая.

— Проста так аддаць, і ўсё? — не зразумела, перапытала намнога старэйшая, па-вясковаму апранутая жанчына, што стаяла поплеч, углядалася ў паперу, мабыць, хочучы яе прачытаць.

— Не, не проста так... Тут напісана, якія даведкі для етага трэба з сабой мець... Што заплаціць немцам за мужа ці сына... Выкупіць, словам...

— Але ж перш чым даведкі браць, трэба было б дазнацца, ці тут ён, мой муж? — сказала тая самая па-вясковаму апранутая жанчына.— А як, як тое зрабіць, у каго спытаць?

— А вы туды прайдзіце, у будыніну. Там, кажуць, можна даведацца.

Пайшла жанчына ў будыніну, за ёю і Параска з Анютаю падаліся. У дзвярах немец дарогу аўтаматам перагарадзіў.

— Вас?

Утрох пачалі тлумачыць жанчыны, чаго яны хацелі.

— Гут, гут! — гаркаў немец, але прапускаць жанчын не спяшаўся. Толькі калі паадвязвалі хатулі з-за плячэй, паказалі, што там,— прапусціў. Але не прайшлі жанчыны і некалькі крокаў, як спыніў іх яшчэ адзін, ужо не немец, а нейкі са сваіх, у цывільным, загадаў вылажыць усё, што ў хатулях, на стол. І гэта жанчыны зрабілі, хоць і не разумелі яшчэ, дзеля чаго ўсё гэта.

— Плаціць, плаціць трэба,— сказаў, ласа заўсміхаўся на ўвесь рот той у цывільным.

І, адчыніўшы дзверы, правёў у пакой, закураны ўвесь, брудны, дзе на стале, ля акна, ляжала нейкая абшматаная, узлахмачаная кніга. Да яе, той кнігі, і накіраваў цывільны жанчын.

— Шукайце там сваіх,— махнуў ён рукою.

Жанчыны, згрувасціўшыся, пачалі гартаць кнігу, выглядаючы вачыма знаёмае прозвішча.

— Пісьменныя? — на ўсякі выпадак перапытаў цывільны.

Жанчыны кіўнулі галовамі.

— То шукайце, шукайце...

Усю, да староначкі, перагарталі кнігу жанчыны, учытваліся ў кожнае прозвішча, што было запісана даволі выразна, акуратна фіялетавым чарнілам. Але таго, каго шукалі, хацелі знайсці,— не было. Вачам сваім не верылі, яшчэ раз узяліся гартаць кнігу. Але цывільны не даў.

— Хопіць! І іншым трэба, вы не адны.

І выгнаў жанчын за дзверы.

Параска з Анютай зноў уліліся ў натоўп, што стаяў, тоўкся ля калючага дроту.

— Ну, знайшлі сваіх? — пыталіся ў іх адусюль жанчыны.

— Не,— круцілі галовамі і Параска, і Анюта.

— Абдурваюць спіскам тым людзей,— прашаптала ледзь не на вуха Парасцы маладая дзяўчына, што таўклася ў натоўпе.— Абіраюць ні за што...

— Няўжо? — насцярожылася Параска.

— Ага. То не зусім сапраўдны спісак. Не ўсе палонныя ўнесены ў яго. А тыя, што ўнесены, многія памерлі даўно. Іх немцы не выкрэсліваюць, нават за мёртвых платы патрабуюць, як за жывых.

— Праўда?

— Мне маніць няма чаго! — гаварыла горача, натхнёна дзяўчына.— Калі хочаце свайго каго адшукаць, бліжэй да дроту трэба падыходзіць. І пазнаваць. І яду, што неслі сюды, не немцам аддаваць, а палонным. Яны ўсе не чужыя, а нашыя...

Некалькі жанчын паслухаліся дзяўчыны, падаліся бліжэй да дроту. Але іх спыніў грозны вокрык немца-вартавога з вышкі:

— Хальт![1]

Жанчыны не зразумелі вокрыку вартавога, а мо не пачулі яго, прадаўжалі ісці, набліжацца да дроту. Нехта кінуў праз агароджу бохан хлеба. І палонныя, якія стаялі зводдалі, глядзелі на жанчын, раптам пажвавелі, замітусіліся, спрабуючы злавіць рукамі хлеб. Момант — і жанчыны пачалі кідаць праз плот усё, што было ў каго — хлеб, сала, яйкі, бульбу. Палонныя на ляту лавілі харч, хапалі, што каму даставалася.

І раптам застрачыў кулямёт. Ніхто спярша і не зразумеў, адкуль і хто страляе. І толькі калі ўпала некалькі палонных, акрываўіўшы снег, зразумелі, што страляюць з

[1] Стой!

вышкі. І не абы-куды, а ў людзей. Упала, павалілася некалькі і жанчын...

З крыкам, галашэннем сыпанулі хто куды ад калючага дроту: палонныя ў адзін бок, жанчыны — у другі...

Быццам хваляй падхапіла і Параску, Анюту, панесла іх разам з іншымі ў поле...

Праз нейкі час, убачыўшы, што ля калючага дроту зноў збіраюцца жанчыны, Параска і Анюта вярнуліся таксама туды. Стаялі, але ўжо далей ад агароджы, глядзелі на палонных, што сноўдаліся, як цені, па той бок калючага дроту. Бачылі яны і тых забітых, што асталіся на снезе,— трох палонных і жанчыну ў кажусе, што таксама прыйшла аднекуль з вёскі, каб адшукаць, выбавіць з палону кагосьці са сваіх. Некалькі разоў парывалася Параска пайсці ад лагера, але кожны раз нешта стрымлівала яе — то новы палонны, які аддаляўся ад купы і ішоў бліжэй да дроту («А раптам ета Хведар? Ці Піліп?»), то голас незнаёмай жанчыны, якая расказвала, дзе яшчэ ёсць такія лагеры («А можа, туды пайсці, можа, там Хведар і Піліп?»). Анюта ж ці бачыла што, ці думала — стаяла і ўсё плакала, румзала, прымаўляючы час ад часу:

— Як жа так можна? Яны ж загінуць тут, у полі, усе да аднаго...

Цэлы дзень прастоялі, пратупалі ля калючага дроту Параска з Анютай, але так нікога са сваіх і не ўбачылі, не пазналі. Ды і ці былі такія, хто пазнаў, убачыў сваіх,— сказаць не маглі, бо за дзень ні аднаго палоннага з-за калючага дроту на волю так ніхто і не выпусціў. Затое самі бачылі, як палонныя хадзілі па лагеры, збіралі трупы, зносілі, сцягвалі іх кудысьці за пагорак, у яму... Урэшце, калі нізкае жоўтае зімовае сонца апусцілася зусім на лес, Параска сказала Анюце:

— Тут хоць тыдзень, хоць месяц стой, нічога, мусіць, не выстаіш. Пайшлі.

— Куды пайшлі?

— Як куды? Дадому.

Анюта загаласіла. Але пайшла, падалася ўслед за Параскай.

Пераначавалі ў той самай вёсцы, у той самай хаце. А ледзь пасвятлела ў вокнах — рушылі далей, у свой Вялікі Лес. І ўсю дарогу ішлі ціха, як з пахавання.

## VIII

Прыступаць да працы Апанас Харчэня не спяшаўся. Некалькі дзён пасля прызначэння яго старастам наогул нікуды з дому не выходзіў. Сядзеў у матчынай хаце і ўсё думаў, думаў, як яму далей жыць і што рабіць. Ды, шчыра кажучы, і не ведаў, не ўяўляў, што такое староста, якія яго абавязкі.

«А можа, і не трэба будзе прыступаць да працы? — яшчэ спадзяваўся на нешта незвычайнае Апанас.— Раптам немцаў прагоняць і я... Так да працы і не прыступлю...»

Не выходзіла ні на хвіліну з галавы і апошняя сустрэча ў лесе з Васілём Кулагам, тая размова, што адбылася між імі.

«Не чакаў Васіль Цімафеевіч, што немцы старастам мяне прызначаць. I я таксама не чакаў... А бачыш жа — прызначылі... Што далей будзе са мною?.. Даруюць, што камсамолец я, што ў сельсавеце працаваў... А калі не даруюць, што зробяць?..»

Нават быццам цікавасць нейкая, хоць і змешаная з трывогай, пасялілася ў душы ў Апанаса.

«Га, даруюць ці не даруюць мне немцы?.. Ясна, калі не даруюць, забяруць, у Ельнікі павязуць. Пасадзяць у турму ці зусім расстраляюць... А як даруюць?.. Таксама што будзе? Вядома, немцы патрабаваць будуць, каб я служыў ім. А Васіль Кулага, Іван Дарошка?.. Як я ім у вочы глядзець буду, апраўдвацца, што я не адмовіўся, на службу да немцаў пайшоў?.. Ды каб жа немцы вечна тут былі, ліха б з ім, усім... А прагоняць іх, зноў свае вернуцца, вайна скончыцца?.. Тады што?.. Гэта правільна Васіль Цімафеевіч казаў: «Падумай, дзе табе лепш быць... Добранька падумай, каб потым не шкадаваць. Помні: ніхто ніякіх апраўданняў не прыме, калі давядзецца адказваць за ўсё, як ты жыў і што рабіў...»

З маці Апанас усе гэтыя дні амаль не гаварыў. Ды і што яна магла яму параіць? Толькі ўздыхала, вохкала, гледзячы на сына, радая, што ён дома, што хоць трохі есць, папраўляецца пасля звароту з бежанства. I паддобрыцца ядою імкнулася — падсоўвала ўсё лепшае сыну, гатавала тое, што ён любіў, што раней толькі ў святы гатавала. I час ад часу казала, паўтарала:

— Не бяры, сынок, у галаву ўсяго, што на свеце дзеецца. Авось усё неяк і абыдзецца, міма нас пройдзе, не зачэпіць...

«Кеб жа так і было! Дык не ж! Не праходзіць міма, чапляе, укручвае...»

Неяк, калі Апанас сядзеў за сталом і вячэраў, у хату зайшоў Змітро Шламак — Рыжы. У кажусе, шапцы-зімоўцы, добрых ялавых ботах. І з вінтоўкаю за плячыма. На рукаве была белая павязка.

— Вечар добры ў хату! — гукнуў ён з парога.

Апанас устаў з-за стала, думаючы з трывогай: «Што яму трэба ад мяне, чаго ён прыйшоў?»

А Рыжы, абіўшы з ботаў снег у парозе, тым часам гаварыў, паведамляў:

— З Ельнікаў я толькі што, нават дадому не заходзіў. Во, бачыш,— паказваў ён на вінтоўку і павязку.— Далі. А то не то ўлада, не то не ўлада...

Апанасава маці першая знайшлася, запрасіла распранацца ды за стол сядаць, вячэраць.

— Ахвотна павячэраю, бо прагаладаўся я, як сабака. Нідзе ж нішто не працуе, перакусіць няма дзе. Так цэлы дзень і сноўдаўся галодны. Нават выпіць шклянку самагонкі і то праблема...

Але адчувалася — усё ж вырашыў гэтую праблему Рыжы паспяхова, выпіў. І добра выпіў.

— Дзякаваць богу, сябры новыя выручылі,— здымаючы шапку і кажух і вешаючы іх на вешала, расказваў Рыжы.— А то вінтоўку атрымаў, павязку, а замачыць... Не, ета нікуды не варта, парадак трэба наводзіць. Я так і сказаў новым сябрам...

Прыкметна хістаючыся, Рыжы паволі пайшоў да стала, сеў на лаву.

— А ў вас што? — незадаволена спытаў ён, акінуўшы стол вачыма.— Таксама выпіць няма чаго?

Зноў Апанаса выручыла маці:

— Не, Зміцерка, е, е, што выпіць,— лісліва пакланілася, заківала галавою маці.— Хвіліначку, пачакайце...

І яна мітнулася, выбегла ў сенцы, прынесла з каморы запацелую паўлітэрку, паставіла яе на стол. Да той бульбы, што стыла ўжо на стале, засмажыла сала, яечню, таксама паставіла проста з патэльняю на стол. З'явіліся на стале і дзве гранёныя шклянкі.

— Выпіце, выпіце, мужчынкі,— запрашала маці і госця, і сына, Апанаса.— А то... Нешта нявесела...

— Нявесела, бо жыць не ўмеем,— адкаркоўваючы бутэльку і разліваючы гарэлку па шклянках, гаварыў Рыжы.— Быццам і начальства, а ніхто нас не баіцца. Пай-

шоў я сёння ў Ельнікі і кажу: «Калі паставілі нас за начальнікаў, дык давайце і быць начальнікамі. А то... Прыехалі — і паехалі! А нам што хочаш, тое і рабі...»

— І што яны, Зміцерка, на ета? — пытала маці.

— Там зразумелі мяне. Вінтоўку, павязку далі. Далі і патронаў трыццаць штук. Во! — дастаў з кішэні абоймы, паказаў Рыжы.— І сказалі, каб паліцыю арганізоўваў...

— Паліцыю арганізоўваў? — жахалася, перапытвала маці.

— Ну, каб людзей набіраў, страляць вучыў. І пра нараду папярэдзілі...

— Якую нараду?

— Заўтра ў Ельніках нарада будзе... У дзесяць гадзін раніцы. Трэба будзе паспець нам з Апанасам...

— А мне... Чаго там быць? — спалохаўся, пачуўшы пра нараду, Апанас.

— Як ета — чаго? — аж быццам узлаваўся Рыжы.— Ты ж, можа, начальства, стараста... Давай вып'ем, а то як выбралі, дык і не бачыліся, не гаварылі. А нам жа працаваць разам давядзецца, парадак новы наводзіць.

Рыжы ўзяў у руку шклянку, падняў яе, чокнуўся з Апанасам і тут жа выліў яе сабе ў горла, толькі забулькала там. Прыгубіў сваю шклянку, адпіў з яе некалькі глыткоў і Апанас.

— Во што, хлопец,— казаў, вучыў Апанаса, закусваючы яечняю, Рыжы.— Ты малады, цябе яшчэ жыццё не цёрла... Не бачыў ты яшчэ жыцця, не ведаеш яго...

— Ета праўда, праўда,— ківала галавою, падтаквала Рыжаму маці, седзячы таксама за сталом.— Праўда, Зміцерка, чыстая праўда.

— І людзей таксама ты яшчэ не ведаеш... А я... Гора хапянуў. Быў, як кажуць, на кані і пад канём. І таму... Рука ў мяне цвёрдая, я парадак люблю. І каб розныя хадзілі тут у нас, масты палілі, сцірты... Не дазволю! Ведай — бальшавікоў і розных камісараў я ненавіджу. Давіць буду. І немцы... Дазваляюць рабіць ета. Мала таго, што дазваляюць,— натхняюць, патрабуюць. І мы з табою... Зробім усё, што нам загадваюць зрабіць. Ты чалавек тутэйшы, усё ведаеш. І будзеш падказваць мне, хто тут бальшавік, хто ў калектывізацыю актыўнічаў... Зразумеў?

Апанас маўчаў. Маўчала і Апанасава маці — і ён, і яна напалоханы былі, не прывыклі чуць такое ў сваёй хаце. А Рыжы не змаўкаў, гаварыў, разважаў:

— Начальства ўсе баяцца павінны. То не начальнік,

якога ніхто не баіцца. На шыю, на галаву таму сядуць. Я ведаю ета. У турме нагледзеўся. Ды і так, усюды... Каб з дома свайго яшчэ не выйшаў, а людзей дрыжыкі білі, каб чакаў кожны: «Што са мною начальнік зробіць, калі ўбачыць, на вочы яму пападуся!» Во, тады парадак будзе, тады што скажаш ці загадаеш — усё зробяць. А рабіць нам многае давядзецца. Чуў я сёння там, у Ельніках,— нагнуўшыся бліжэй да Апанаса, амаль што зашаптаў Рыжы.— У лесе падазроныя людзі швэндаюцца са зброяй... Рознае начальства савецкае... Ды і тыя, хто ад войска адстаў. Іх усіх пералавіць трэба, перастраляць. А заадно і тых, хто ім памагае. Во чаму і паліцыю трэба арганізоўваць,— павярнуўся да Апанасавай маці, плямкаў губамі Рыжы.— І чым большая яна будзе, тым лепей усім нам... Не мы павінны баяцца, а яны нас...

Маці, каб перавесці на што іншае гаворку, спытала ў Рыжага:

— А пра хронт што гавораць, дзе немцы цяпер?

— Немцы? — усміхнуўся Рыжы.— Немцы пад Масквою. Праз які тыдзень і вайне канец. Нацаравалі бальшавікі, хопіць.

— І што тады будзе, як немцы Маскву возьмуць? — пытала, хацела ведаць маці.

— Што-о? Жыць па-новаму будзем. Зямлю падзелім, калгасы распусцім. Во заўтра на нарадзе раскажуць. Толькі б не спазніцца,— паглядзеў Рыжы на Апанаса.

— А можа, мне... Не трэба? — са слабай надзеяй у голасе спытаў Апанас.

— Дзівак ты! Сказана ж, загадана мне — самому быць і табе перадаць, каб быў. У немцаў парадак, ета табе не бальшавікі. У іх усё распісана, дзе каму і калі быць, што рабіць. І паспрабуй не паслухацца! Так што... Як мага раней нам трэба з пасцелі ўставаць, дабірацца да Ельнікаў, каб на нараду паспець, не спазніцца.

— Пешкі? — паглядзеў на Рыжага Апанас.

— Чаго ета мы пешкі хадзіць будзем? Нас жа засмяюць — начальства называецца. На конях паедзем.

— Якіх конях, дзе мы іх возьмем?

— Во стараста, дык стараста,— пакруціў галавою Рыжы.— Ета не ты ў мяне, а я ў цябе пытаць павінен, на якіх конях мы паедзем. Ды няхай, на першы раз даруем табе. Я свае коні запрагу...

— Якія свае? — вырачыла вочы на Рыжага, здзівілася Апанасава маці.

— Тыя, што з пераправы прыгнаў. Я селянін і ведаў, што коні спатрэбяцца.

Цяжка падняўся з-за стала, сказаў:

— Няхай, іншым разам больш пасядзім. А цяпер дадому пайду. Каб хоць не праспаць заўтра...

Хістаючыся, падышоў да вешала, надзеў кажух, на галаву — шапку. Закінуў на плячо і вінтоўку. Доўга, як бы збоку, любаваўся на сябе — з павязкаю на рукаве, з вінтоўкаю.

— А нічога сабе начальнік,— сказаў, задаволены сабою напаследак, і пайшоў, не развітваючыся, з хаты.

## IX

Нарада старастаў, начальнікаў паліцыі, супрацоўнікаў розных акупацыйных упраў праходзіла ў былым раённым Доме культуры — вялікім, з калонамі, будынку, што стаяў за плошчаю ў самым цэнтры Ельнікаў. Плошча, быццам у кірмашовы дзень рынак, была ўся запруджана фурманкамі, калі нарэшце дабраліся, пад'ехалі да яе Апанас Харчэня і Змітро Шламак.

Выпрагшы коней і прывязаўшы іх да біла свайго ж воза, Змітро, а за ім і Апанас Харчэня ледзь не подбегам — ці не спазніліся? — заспяшаліся ў залу. Але ў дзвярах іх затрымаў, перагарадзіўшы дарогу вінтоўкаю, паліцай.

— Вы куды? — спытаў ён сурова.

— На нараду,— адступіўся на крок ад нечаканасці Змітро.

— Дакументы!

— Якія дакументы?

— Што вы начальства, на нараду запрошаны.

— У нас няма ніякіх дакументаў.

— Як ета — няма?

— Ну-у, не далі. Не паспелі яшчэ даць,— паправіўся праз хвіліну Змітро.

— Вы адкуль?

— З Вялікага Лесу.

— А-а, вала на дуба цягалі, каб ярмо на шыю прымераць, га-га-га,— зарагатаў паліцай.

— Што? — не зразумеў Змітро.

— Вашы бацькі вала на дуба цягалі, каб ярмо на шыю прымераць,— зноў зарагатаў паліцай, нагадаўшы той жарт, што хадзіў пра недарэкаў-вялікалесаўцаў у раё-

не.— Ідзіце вунь туды,— махнуў рукою, паказаў на столік, што стаяў збоку, як бы ў калідорчыку, і за якім сядзела, накінуўшы наапашкі паліто, немаладая, грудастая і лупавокая, як сава, жанчына.— Там вам дадуць дакументы, а заадно і адзначаць, што вы тут, знацца, прыехалі.

Прозвішчы Змітра Шламака і Апанаса Харчэні значыліся ў спісе. І жанчына, уважліва агледзеўшы з галавы да ног яшчэ двух служак новага, фашысцкага, парадку, грэбліва, быццам з агідай, адсунула да сябе, падала дзве невялікія блакітныя карталюшкі — пропускі, узяўшы якія Змітро і Апанас зайшлі ў залу, знайшлі вольныя месцы і селі. Відаць, вызначаны час набліжаўся, бо зала надта ж імкліва запаўнялася розным вясковым людам, у асноўным мужчынамі. Але былі сярод запрошаных і жанчыны. Небагата, але былі. Мужчыны некаторыя гучна размаўлялі, віталіся са знаёмымі, наогул паводзілі сябе зусім вольна, быццам на нейкай чарговай нарадзе, некаторыя сядзелі ціхенька, маўкліва і толькі зіркалі спалохана па баках — нечага быццам баяліся ці адчувалі нібыта няёмкасць: былі людзі як людзі, а цяпер падаліся ў служкі новай акупацыйнай уладзе.

Але вось раптам усе заварушыліся, насцярожыліся, прыціхлі — на сцэну да стала, які быў засланы белым прасцірадлам і за якім у тры рады стаялі крэслы, пачалі выходзіць з двух бакоў людзі — некалькі чалавек немцаў у форме афіцэраў, за імі — цывільныя, свае, тутэйшыя, апранутыя хто як, але — і гэта відаць было — у лепшае, што толькі ў іх знайшлося, чыста паголеныя, паднядзеленыя. Кіраваліся спаважна, з адчуваннем сваёй годнасці і значнасці — немцы за першы рад, астатнія хто на другі, хто на трэці, а некалькі чалавек, мусіць, самых значных новых начальнікаў, ішлі побач з немцамі за першы рад.

У зале пачуліся воплескі, і паколькі тыя, хто быў на сцэне, за сталом, не садзіліся, усталі, падняліся на ногі і тыя, хто быў у зале. Некалькі хвілін усе дружна апладзіравалі. Але вось лысы, круглатвары і, бадай, самы тоўсты з немцаў наструніўся, ускінуў наперад руку, прагарлапаніў:

— Хайль Гітлер!

Апладысменты, якія былі пачалі сціхаць, выбухнулі з новай сілай. І ўжо трывалі доўга, аж пакуль той круглатвары і тоўсты, які прагарлапаніў «Хайль Гітлер», не перастаў сам біць у ладкі і не сеў. За ім у той жа момант перасталі апладзіраваць і немцы, што былі побач, а потым і

тыя, хто стаяў за сталом на сцэне, і тыя, хто быў у зале. Усе пачалі садзіцца.

Калі ў зале запанавала зноў цішыня, падняўся чалавек у чорным касцюме, пры гальштуку і пры невялікіх вусахматылёчку і гучна абʼявіў:

— Першы на сённяшняй нарадзе выступіць гер камендант Курт Апфель. Просім, калі ласка!

І, павярнуўшыся лісліва тварам да таго лысага, круглатварага немца, што быў прагарланіў «Хайль Гітлер», запляскаў у далоні.

Камендант паволі падняўся з-за стала, важна прайшоў да трыбуны, што была пастаўлена трохі з краю сцэны. За ім падняўся, таксама пайшоў да трыбуны і чалавек у цывільным, глюгасты, вушасты і нейкі мізэрны, як бы замучаны — перакладчык. Не чакаючы, калі змоўкнуць апладысменты, камендант нешта забалбатаў, амаль закрычаў. Усе насцярожыліся, сілячыся зразумець, што ён гаворыць. Але паколькі камендант гаварыў па-нямецку, а нямецкай мовы дасканала ніхто ў зале не ведаў, то ўсе з нецярплівасцю чакалі, калі загаворыць перакладчык, які стаяў, наструнены, амаль побач з камендантам. Камендант, пракрычаўшы некалькі слоў, змоўк. Тады загаварыў, бо чакаў моманту, калі камендант змоўкне, перакладчык:

— Перш, чым пачаць сваю прамову, гер камендант хацеў павіншаваць усіх вас з нагоды вызвалення доблеснай нямецкай арміяй!

Перакладчык змоўк, зноў загаварыў камендант. Цяпер яшчэ больш натхнёна, амаль урачыста. Тое, што ён гаварыў, у перакладзе глюгастага гучала так:

— Мы, немцы, прынеслі на вашу зямлю сапраўдную свабоду. Але Гітлеру і яго вялікай і непераможнай арміі патрэбны людзі, якія б гэтую свабоду — ці як мы ее называем — новы парадак — правялі ў жыццё і абаранілі. Карацей, патрэбны свядомыя памагатыя, барацьбіты. Вось чаму мы сабралі вас сюды, каб расказаць, чаго мы хочам і што вы павінны рабіць, улічваючы, што яшчэ ідзе вайна і вораг цалкам не разгромлены. Днямі будзе ўзята Масква, яна акружана ўжо войскамі фюрэра, і тады прыйдзе мір. Але пакуль міру няма, пакуль ідзе вайна, гонар і абавязак кожнага дапамагчы гітлераўскай арміі прынесці свабоду ўсім тым, хто яе пакуль яшчэ не мае. З намі бог, і мы ўпэўнены, што ён дапаможа ў барацьбе з тымі, хто бога не прызнае, хто выракся яго і прымушаў выракацца іншых...

Далей камендант, не спяшаючыся і ўжо не так гучна,

але ўсё адно даволі выразна і натхнёна, расказаў пра тыя перамогі, якіх дамогся Гітлер і яго армія на палях баёў у Францыі, Бельгіі, Польшчы, Югаславіі, пра тыя перамогі, якія дасягнуты ў барацьбе з Савецкай Расіяй, пералічваў дзесяткі вялікіх гарадоў, што ўжо ўзяты ці акружаны і ў бліжэйшы час будуць пакораны немцамі.

— Але,— прадаўжаў камендант,— не трэба думаць, што бальшавікі склалі зброю. Яны вядуць змаганне з нямецкімі войскамі. І не толькі на франтах, але і ў тыле, на вызваленай ад іх тэрыторыі, у тым ліку і ў нашым раёне. У некаторых вёсках спалены сцірты неабмалочанага збожжа, спалены і амбары, склады са збожжам ці разбураны масты на дарогах, заводы і прамысловыя аб'екты. Маюцца ахвяры і сярод нямецкіх салдат. Цярпець такое нямецкае камандаванне не можа, таму звяртаецца да ўсіх, хто добраахвотна згадзіўся служыць фюрэру і новаму парадку, аказаць нямецкай арміі, нямецкаму камандаванню самае шчырае і непасрэднае садзеянне. У бліжэйшыя дні павінны быць затрыманы, вылаўлены і аддадзены ваенна-палявому суду былыя савецкія начальнікі, бальшавікі і камсамольцы. Мы, немцы, прынеслі свабоду, а вы, мясцовыя людзі, павінны памагчы вылавіць бандытаў, хто не хоча служыць фюрэру і чыніць розныя перашкоды і дыверсіі. Трэба выявіць усіх, хто прытаіўся, хто спачувае Савецкай уладзе і чакае яе звароту. Тых, хто будзе асабліва шчыраваць, хто будзе служыць нямецкай новай уладзе добрасумленна і аддана, мы будзем узнагароджваць — плаціць грошы, даваць зямлю, ордэны і медалі. Нямецкае камандаванне спадзяецца, што мясцовае насельніцтва акажа і іншую дапамогу нямецкай арміі — у прыватнасці, па збору цёплых рэчаў, як кажухі, валёнкі, футры, шапкі-зімоўкі, цёплыя рукавіцы, а таксама прадуктаў — мяса, сала, малака, яек, пшаніцы і жыта. Усё гэта трэба нямецкай арміі, і яно павінна быць пастаўлена. Нашы загады павінны выконвацца ў час і без пярэчання. Далей. Нельга, каб з нашым прыходам людзі перасталі зусім працаваць. У бліжэйшы час павінны быць адноўлены ўсе прамысловыя аб'екты, яны павінны даваць тую прадукцыю, што давалі і раней, ці іншую, якая будзе патрэбна нам. Нямецкае камандаванне вельмі спадзяецца, што сяляне падтрымаюць новы парадак карыстання зямлёй, з якім у бліжэйшы час мы пазнаёмім. Пакуль жа яны павінны працаваць, як і працавалі. Там, дзе ёсць калгасы — у калгасах, дзе іх няма — аднаасобна. Нямецкае камандаванне ўсяляк падтрымлівае прыватны сектар, ака-

занне паслуг насельніцтву і нямецкай арміі. Таму можна адчыняць дробныя майстэрні па рамонту абутку, швейныя майстэрні, гандлёвыя кропкі, папярэдне, вядома, зарэгістраваўшы іх у пэўных установах і заплаціўшы падаткі. Кожны чалавек павінен недзе працаваць. Беспрацоўных нямецкае камандаванне будзе лічыць як сабатажнікаў і з імі будзе паступаць паводле законаў ваеннага часу. І наадварот, тых, хто шчыра будзе за новы парадак, хто не будзе шкадаваць сілы і вопыту дзеля яго ўмацавання, мы будзем усяляк падтрымліваць. Усе мясцовыя ўлады працуюць у поўным кантакце з нямецкім камандаваннем, загады нямецкага камандавання выконваюцца абавязкова і ў назначаны тэрмін. Асобы, якія вінаваты ў невыкананні загадаў нямецкага камандавання, будуць сурова карацца, незалежна, якія б пасады яны ні займалі, аж да расстрэлу ці павешання. Хайль Гітлер!

Адразу ж за камендантам слова было дадзена начальніку раённай паліцыі Кандрату Астапавічу Нядзельку. Ён таксама выйшаў з годнасцю і важнасцю за трыбуну, загаварыў узнёсла:

— Я не ведаю, як і дзякаваць Гітлеру і яго доблеснай арміі, якія, нягледзячы на ахвяры, вызвалілі, нарэшце, усіх нас. Адмучыліся мы, даволі, хопіць. Сам я пабываў і ў турме, і ў высылцы, ледзь богу душу не аддаў. Я не адзін такі, многія з вас таксама зведалі тое самае. Таму ўсе мы надта ж удзячны нямецкаму камандаванню і Гітлеру. І паўтараем: няхай жыве райх, хайль Гітлер!

Пачуліся не вельмі дружныя воплескі з залы. Прамоўца перадыхнуў, хапянуў шырока раскрытым ротам паболей паветра і ўжо не загаварыў, а закрычаў:

— Нам нямецкае камандаванне прынесла свабоду, а мы павінны самі падумаць, як яе абараніць. Таму мы ў бліжэйшы час павялічым усюды колькасць паліцыі, умацуем яе, каб паліцыя магла сама без дапамогі доблеснай арміі фюрэра змагацца з рознага роду бандытамі і парушальнікамі спакою. А яны, гэтыя бандыты і парушальнікі, ёсць. Турма ў нас поўная, хоць і страляем амаль штодзень то аднаго, то другога. Мы ведаем, што частка бандытаў хаваецца ў лесе. Гэта ганьба ўсім нам. Паступаюць да нас звесткі, што некаторыя бандыты вольна разгульваюць па вёсках, тэрарызуюць сумленных працаўнікоў і прыхільнікаў новага нямецкага парадку. І гэта ў той час, калі немцы пад Масквою, вось-вось яе возьмуць. Парадак ніхто нам не навядзе, пакуль мы яго самі не навядзём. І шкадаваць

каго б там ні было няма чаго. Нас не шкадавалі, калі высылалі ў Сібір ці раскулачвалі. Час помсты наступіў, і мы зробім усё, што скажуць нашы вызваліцелі. Не пашкадуем, калі трэба, і жыцця свайго! Хайль Гітлер!

Начальнік паліцыі аж успацеў, выцер хусцінкаю лоб і пайшоў, сеў на сваё ранейшае месца. За ім на трыбуну выйшаў яшчэ нейкі чалавек, лысаваты, са збітым набок гальштукам. Хто — амаль ніхто не пачуў, бо калі аб'яўлялі, у дзвярах закрычалі, завалтузіліся (як потым высветлілася, у залу рваўся нейкі п'яны паліцай, а яго стрымлівалі, не пускалі).

Лысаваты чалавек гаварыў манатонна, ціха, сабе пад нос, і з усяго яго выступлення можна было зразумець, што ён таксама рады, што прыйшлі немцы.

— Трэба ўсяляк падтрымліваць новую ўладу, дапамагаць ёй чым толькі можна. Новы парадак, які ўводзіцца на вызваленых землях,— добры парадак, і яго трэба ўсяляк умацоўваць.

На тым спіс прамоўцаў быў вычарпаны, нарада была аб'яўлена закрытай. У зале заварушыліся, пачалі ўставаць з наседжаных месцаў, кіравацца да выхаду. Падаліся разам з усімі і Апанас Харчэня са Змітром Шламаком. Знайшлі на плошчы сваю падводу, запрэглі коней, паселі на воз.

— Ну што? — падміргнуў, спытаў весела ў Апанаса Змітро.— Чуў, як бяруцца?

— Чуў,— мрукнуў, адказаў, нібыта з неахвотаю, Апанас.

— Немцы людзі дзелавыя. Калі яны сказалі, калі ўзяліся — парадак навядуць. Дый мы таксама драмаць не будзем. І паможам, і падкажам...

— Ды ўжо ж,— прастагнаў, быццам ад болю, Апанас.

І, не чакаючы, пра што яшчэ запытае ў яго Змітро, узяў у руку лейцы, тузануў коней, крыкнуў:

— Но!

— Ты куды? — выхапіў з рукі лейцы, спыніў коней Змітро, не даўшы ім і двух крокаў ступіць.

— Як куды — дадому!

— А па чарцы на дарогу што — не возьмем? — глядзеў, як на дзівака, на Апанаса Змітро.

— Дзе ты тут вельмі што возьмеш? Дый дадому трэба. Пакуль даедзем — змеркнецца.

— І то праўда,— адступіўся, пачуўшы пра змярканне, Змітро.— Швэндаюцца тут па лясах розныя. То сціrты,

то масты паляць. Але нічога, мы хутка іх пераловім, перастраляем...

Апанас не адказаў — яго хвалявала, не давала спакою іншае, тое, што пачуў на нарадзе: немцы нібыта акружылі Маскву і не сёння-заўтра возьмуць... «Калі так, тады... Можа, не слухаць нікога, а... Бо інакш... У зямлю без пары ляжаш... Камендант вунь казаў, што ў бліжэйшыя дні будуць вылаўлены і аддадзены пад суд усе былыя савецкія начальнікі, бальшавікі, камсамольцы... А я ж... Што немцы са мною зробяць, як даведаюцца, хто я?..»

## X

Хоць на край белага свету пайшоў бы Яўхім Бабай. абы не вяртацца зноў дадому, у сваю хату, не бачыць Сонькі, вечна галодных, ненаедных дзяцей.

«Я імкнуўся, іրваўся да іх, а яны... Сварку, плач усчалі, папракаць узяліся. За што?.. Быццам ва ўсім я адзін вінаваты. А самі... Нават не пацікавіліся, дзе быў я. Столькі дзён мінула, а ніхто так і не праведаў, перадачы не прынёс. Расстралялі б — і не ведалі б. Ім усё давай, старайся, а яны... Пра цябе не думаюць, ані не дбаюць. Толькі б ім добра было. Яду давай, адзежу давай, усё-ўсё давай. Мала таго, дык яшчэ і паганяюць. Селі на воз — і вязі, слова нават проці не скажы. І не зробіш нічога, везці трэба, цягнуць воз. Цягнуць датуль, пакуль не скапыцішся, ног сам не выпростаеш. Іван Дарошка з Васілём Кулагам — сваё, жонка і дзеці — сваё, немцы прыйшлі — і тыя сваё. І кожны нечага ад цябе патрабуе, кожны нечага хоча. А ты... Слухайся толькі, рабі, што загадваюць. Бо інакш... Бізуна атрымаеш, накрычаць, насварацца. Ты адзін, а іх... Многа. Многа-многа тых, хто хацеў бы ехаць на табе, упрагчы ў воз і ехаць, паганяць. І едуць, едуць, паганяюць, ды яшчэ як паганяюць. І спыняцца не даюць, не даюць выпрагчыся. Во, не пабыў дзён колькі дома — і ўжо прачуханца далі, зноў патрабуюць, кеб у воз упрагаўся, вёз. І паскардзіцца няма каму. Ды і скардзіся не скардзіся, ніхто табе не паможа, нікому няма да цябе клопату, кожны сваім заняты. Наадварот, імкнецца на табе праехаць, збыць свой клопат, узваліць іншаму на плечы, а самому... Вольнаму быць, ад усяго вольнаму. І я вось таксама... Пра тое ж мару. Ды збыцца таму... Мабыць, ніколі не суджана. Адно з шыі, з плячэй сваіх скінеш, другое, яшчэ цяжэйшае, наваліцца. Адкуль — часам і не ведаеш, не заўважыш. І хто вінаваты ва

ўсім етым? Хто сочыць за чалавекам, кеб улегцы ён не хадзіў, меў заўсёды нейкі клопат, нёс цяжар ці на сэрцы, ці на плячах сваіх?..»

Доўга стаяў Яўхім Бабай, прыхінуўшыся плечуком да хлява свайго, і думаў, думаў пра ўсё, што лезла, прыходзіла ў галаву, і было ніяк, ніяк не адкаснуцца ад яго. Ніколі, здаецца, не думаў Яўхім Бабай так, як тады, там, ля хлява. І ніколі яшчэ не адчуваў сябе такім адзінокім, непрыкаяным і бездапаможным. Хацелася не быць тут, дома, некуды пайсці. А куды — і сам не ведаў, куды яму пайсці можна... У лес? Але ж холадна ўжо было ў лесе. Ды і што там рабіць? Уночы і... Без стрэльбы... Як без рук, адчуваў сябе Яўхім Бабай без стрэльбы...

«А калі сустрэнецца хто-небудзь мне? Чым абаранюся?»

І шкадаваў, шкадаваў, што не стрымаў сябе тады, пайшоў у Ельнікі.

«І стрэльбу ў мяне адабралі. І спакой. Ды дзе там стрэльбу, спакой, ледзь жыцця не рашылі».

І зноў выбухала злосць на жонку, дзяцей.

«Яны тут дома, у хаце, сядзелі, а я... Калаціўся, бога маліў, кеб жыць астацца. Што ім да таго! Яшчэ папракаць узяліся. Не, даволі! Пайду я ад іх, пакіну. І так вунь колькі гадоў мучыўся, свету божага не бачыў».

«Куды ты пойдзеш?» — пытала нейкая цікаўная, упартая думка.

«Знайду — куды. А не знайду — усё адно пайду. Жыць з Сонькаю... Не, хопіць, больш жыць з Сонькаю не буду».

«А дзеці?» — пытала тая ж цікаўная думка.

«Не памерлі з голаду, дык і не памруць. Бо калі думаць толькі пра дзяцей, а пра сябе не думаць... Мучыцца зноў будзеш, як і мучыўся».

Стаяць на двары было холадна. Сіберны вецер прадзімаў да самых касцей. І схавацца ад яго ніяк нельга было, усюды, дзе ні затуліся, ён дастаў.

«Хіба ў хату пайду. Пажыву дзён колькі. А там... Відаць будзе. Як надарыцца зручны выпадак, дык і пакіну сям'ю. Аге, пакіну»,— цвёрда вырашыў Яўхім.

Ды, пераначаваўшы ў хаце, зразумеў Яўхім Бабай, што пажыць спакойна дома хоць некалькі дзён ніхто яму не дасць. Не было чым карміць дзяцей, і жонка аж вар'яцела. Ды і дзеці плакалі, прасілі бацьку, каб ён не сядзеў дома,

а пайшоў куды-небудзь, зарабіў ці пазычыў хлеба. І бачыў, адчуваў Яўхім — нідзе не дзенешся, трэба клапаціцца пра дзяцей, трэба дбаць пра сям'ю. «Інакш з'ядзяць мяне. Такая прорва, ды галодная...» Падумаў быў тады Яўхім: «А як бы яны жылі, кеб з турмы я не вярнуўся, кеб мяне павесілі ці застрэлілі немцы? Ці кеб па мабілізацыі я пайшоў на хронт?..»

Успомніў Яўхім у тыя дні пра жыта тое, што вазіў хаваць у лес Іван Дарошка.

«А што, калі... З лесу дадому пачаць яго патрохі вазіць? Іншага ратунку ў мяне няма. Зарплаты ніхто ніякай не плаціць, лесу таксама нікому не прадасі. А жыць неяк жа трэба. І не толькі жонцы, дзецям, а і самому...»

Пахваліў сябе, падзякаваў выпадку, што на тое, схаванае Іванам Дарошкам, жыта яго навёў.

«А так як бы і жыў я, чым бы і сам карміўся, і дзяцей гадаваў!»

І як толькі, прачнуўшыся аднаго ранку, убачыў, што на зямлю лёг, нападаў снег, злазіў на гарышча, дастаў саматужкі, якія быў зрабіў гадоў колькі таму назад і на якіх заўсёды зімою каталіся з горкі дзеці, ускінуў на іх парожні мех, сякеру, рыдлёўку наверх палажыў і, перахрысціўшыся, паехаў у лес.

Якраз развідняла. Цішыня ўсюды была такая, быццам нідзе ніхто не жыў. Толькі парыпваў пад нагамі мяккі, яшчэ не зляжалы снег, парыпваў свежа, ядрана. І бела-бела навокал, куды ні паглядзі, аж сіне. Снег пазакрываў няроўнасці на полі і на дарозе, папрыгінаў долу сваім цяжарам бадыллё, траву. А ў лесе, у лесе як пахарашэла! Бы ў зачараваным сне, стаялі прыпушаныя холадам зімы дрэвы — асінкі, бярозы, дубы. Вечназялёныя сосны, здаецца, папрысядалі, паменшалі ростам. Снег ляжаў на прагалах, бялеў у ягадніку і верасе, прысыпаў ігліцу і лісце. Нідзе нішто не трэсне, не скрыпне.

Ішоў па дарозе, пракладваючы першую сцежку, Яўхім Бабай, вёз, цягнуў па нерушы за сабою лёгкія саматужкі і дзівіўся: і пражыў жа нямала, дзесяткі разоў вось гэтак жа ў лес зімою раненька хадзіў, а такой прыгажосці ніколі яшчэ нібыта і не бачыў. Аж спыніўся, калі вавёрчыны сляды на снезе запрымеціў. Вочы на камель сасны, што стаяла крокаў за пяць ад дарогі, ускінуў і ў тую ж хвіліну самую вавёрку згледзеў — тая падымалася некуды ўгору па ствале, у голле.

Па звычцы пацягнуўся рукою, хацеў сарваць з пляча

стрэльбу. І ўспомніў раптам — стрэльбы ж няма, адабралі яе ў яго. Там, у Ельніках, адабралі...

«Не трэба было мне ісці туды,— пашкадаваў — які ўжо раз! — Яўхім Бабай.— Наогул, нешта абы-што пачалося. Жыў я, жыў, а потым... Вайна етая, мабілізацыя, немцы... Бывала — хадзіў сабе па лесе і нічога ніякага не ведаў... А цяпер... Туды кінешся, сюды — і нідзе ратунку няма, усюды — апсік... А будзе, будзе яшчэ што?..»

Пайшоў далей па дарозе, павёз, пацягнуў за сабою саматужкі. Заўважыў між тым, што гэта толькі здавалася, што ўсё навокал спіць, нідзе ніхто не жыве. На самай справе ўсё жывое, папрачынаўшыся, апратаўшыся ад першага спалоху і здзіўлення, паступова авалодвала сабою, шукала, што б паесці, дзе б схавацца ад холаду, пагрэцца. І сляды гэтага жыцця і турбот відаць былі скрозь па снезе. Імчаў, робячы замысловатыя, хітрыя петлі, заяц, бегла некуды, замятаючы хвастом сляды, ліса, праставаў, нікуды не зварочваючы, быццам сапраўдны гаспадар лесу, воўк... І вавёрчыны, куніцыны сляды былі відаць то пад адным, то пад другім дрэвам...

«Значыцца, растане снег... Етак заўсёды — сляды звяры пакідаюць на першым снезе, тады растане... Калі снег кладзецца надоўга, тады звяры не спяшаюцца са сваіх бярлогаў вылазіць, сляды на снезе пакідаць...» — падумаў Яўхім Бабай і збочыў з дарогі на бор, пацягнуў за сабою санкі — на бары, пад адзінокаю старою сагнутаю бярозаю была яма, у якую ён, Яўхім Бабай, перахаваў жыта Івана Дарошкі. Без асаблівай цяжкасці адшукаў метку, узяў з саматужак рыдлёўку, згроб ёю, адкідаў снег. Зямля пад снегам была хоць і мёрзлая, але сякера не патрэбна была, каб яе раскапаць. Адхінуў салому, рукамі пачаў насыпаць у мяшок жыта. Зерне было сухое, ад яго ішоў водар свірна, лета.

«Набяру мяшок. А там... Пагляджу... Жыць буду дома, у сваёй хаце,— яшчэ прыеду. А не буду... То і вазіць не буду. Як хочуць, так няхай і жывуць...»

Спацеў, насыпаючы мяшок. Завязаў яго аборкаю, якую там, яшчэ дома, усунуў у кішэню, узваліў на саматужкі. Яму ж з жытам акуратна залажыў саломаю, прысыпаў зямлёю, снегам. Хацеў ехаць зноў на дарогу, але паглядзеўшы на свае сляды, на прытоптаны нагамі снег, захваляваўся раптам:

«Ета ж па слядах маіх кожны дурань сюды, да ямы, трапіць можа... Як ета я не падумаў раней!»

«Дык снег жа растане... Сляды ж звярыныя ўсюды!» — падказала яму даўнішняя прыкмета.

«А як не растане, як не спраўдзіцца тое, што заўсёды спраўджвалася?»

Упрогся ў сані, ад'ехаўся ад таго месца, дзе яма была, дзе браў жыта. Патаптаўся, сякераю дрэва пацюкаў і далей, далей убок паехаў. Там зноў спыніўся, зноў патаптаўся на снезе, нават рыдлёўкаю зямлю быццам капануў.

«Во так, во так,— думаў Яўхім Бабай.— Кеб ніхто не здагадаўся, чаго я ў лес ездзіў».

«Але ж... Мяшок з жытам везці буду — убачаць!»

Гарачыня прыліла да твару.

«Як ета я! Трэба было ўвечары, на ноч глядзячы ў лес ехаць. А я... Уранні паехаў...»

Зноў цэлая бура паднялася ў душы, злосць ахапіла Яўхіма Бабая. Злосць на дзяцей, на жонку, Соньку.

«Яны ва ўсім вінаватыя! Жыцця праз іх няма, думаць ні пра што не даюць. Тады, у Ельнікі, пабег, у турму трапіў, а цяпер... Ледзь схованкі з жытам не выдаў!»

Ад'ехаўся ў малады сасоннік, паставіў саматужкі з жытам, прыкрыў іх галлём, якога наламаў, нассякаў з сасонак. А сам, каб не змёрзнуць, пачаў хадзіць сюд-туд па лесе, але так, каб недалёка ад ямы той быць, дзе жыта схавана.

«Давядзецца вечара ў лесе чакаць, бо інакш... Ці мала хто ісці будзе, ці мала хто збочыць па слядах маіх можа?»

І не пераставаў, не пераставаў папракаць сябе.

«Нешта са мною здарылася. Раней я больш абачлівы быў. А цяпер што ні зраблю, усё не так, не так...»

Зноў думкі апанавалі, одум узяў Яўхіма Бабая — жыць як яму далей, каб не памыляцца, рабіць толькі тое, што трэба рабіць, і так, як трэба?

«З бядоты, галечы выцерабіцца б... Нікога не слухацца, не шманаць нават... Быць самому сабе гаспадаром... Хату б добрую займець... Жонку... Ляжаць бы на печы, у цяпле, ды ў столь паплёўваць. І не баяцца нікога — ні немцаў, ні Саветаў. Хай б'юцца між сабою, хоць насы зрываюць. А мне б... Жыць так, як я хачу. Кеб есці даволі, спакой на душы мець».

Але адчуваў, разумеў Яўхім Бабай, што жыць так, як ён хоча, яму не ўдасца.

«Саветы ў войска бралі, на хронт, пад кулі, пагнаць хацелі. А етыя, немцы, таксама... У турму запраторылі.

Цяпер выпусцілі, але не так, без нічога. Заданне далі — Івана Дарошку і Васіля Кулагу высачыць, данесці, дзе тыя ходзяць, дзе жывуць, што робяць. І я... Паабяцаў, што зраблю ета, выканаю іхняе заданне...»

«А як не ўдасца высачыць, не выканаю задання?»

«Зноў тады за мяне возьмуцца, зноў могуць у турму пасадзіць».

Страх, самы сапраўдны страх апанаваў Яўхіма Бабая.

«А калі даведаецца хто-небудзь, што выдаў я Івана Дарошку і Васіля Кулагу? За ета ж... Па галоўцы не пагладзяць... Прыйдуць да мяне ўночы ці ўдзень, а я... Без стрэльбы нават... Абараніцца — і то няма чым...»

«У паліцыю, мабуць, пастпаць трэба... І чым хутчэй, тым лепш».

«Чаму ета ў паліцыю трэба паступаць?»

«Таму, што паліцаям вінтоўкі даюць. І патроны. А без етага цяпер, калі ў іншых зброя, нельга... І тады, раней, калі вайны не было,са зброяй надзейней было. А цяпер, калі вайна... Трэба мець зброю... І кеб сабе, на выпадак чаго, абараніцца, ды і калі што якое... У іншага стрэліць. Ці хоць напалохаць, прыстрашыць... Вунь тыя, што ў Ельніках, ходзяць з вінтоўкамі — анігадкі, хоць бы што. Кожны з іх — кум каралю... Дык ета ж там, дзе немцы... А тут... Хто з вінтоўкаю, той і гаспадар...»

Зімовы дзень кароткі. Але і ён здоўжыўся Яўхіму Бабаю, чаго толькі не перадумаў за гэты дзень, ходзячы сюд-туд па лесе. А як прысмеркла ледзь-ледзь, дзень на вечар хіліць пачаў, упрогся Яўхім Бабай у саматужкі, пацягнуў мяшок з жытам у вёску, дахаты.

Ды яно як не шанцуе, дык з ранку да самага вечара. Ледзь толькі прывалок Яўхім Бабай жыта ў свой двор, у хату з двара мяшок унёс, жонка, Сонька, налящела, накінулася на яго:

— Дзе ж ета ты быў, чаму раней мяшок з жытам у хату не прынёс?

— А што? — насцярожыўся Яўхім Бабай.

— Поп з Ельнікаў прыязджаў, дзяцей хрысціў. Казаў: няхрышчаных немцы страляюць.

— Ну дык і што? — глядзеў, як анёл, на жонку Яўхім.

— Як — што? Хіба дзяцей табе не шкода?

— Без мяне дзяцей не магла пахрысціць?

— Я пахрысціла.

— Пахрысціла — і хвала богу. Пры чым я тут...

— А пры тым, што заплаціць папу трэба было. Па паўпуда за кожнае дзіця,— паведаміла жонка.

— Дык ён жа, ты кажаш, пахрысціў?

— Пахрысціць пахрысціў, але не запісаў.

— Ета няважна. Галоўнае — пахрысціў.

— Дык не запісаў жа! Немцы прыедуць, правяраць пачнуць,— ледзь не галасіла Сонька.

Але Яўхім быў надзіва спакойны.

— Пахрысціла — і няхай. А што не запісаныя... Дык людзі бачылі, што ты хрысціла. Калі што — пацвердзяць...

— А як не пацвердзяць? — стаяла на сваім Сонька.

— Не пацвердзяць, дык не пацвердзяць. Абы пахрышчаныя былі. Бог жа, можа, сам бачыў, што хрысцілі іх.

— Бог богам, а людзі людзьмі...

Яўхім не меў сёння намеру сварыцца. Мо таму, што не думаў больш жыць з Сонькаю, дзецьмі.

— Хоць бы раз ты чым-небудзь давольная была,— сказаў ён, не гледзячы на Соньку, а некуды паўзверх яе, у кут.— Што ні зрабі, усё адно знойдзеш да чаго прычапіцца.

— Ета я да цябе чапляюся? — не спыняла сваркі, наступала Сонька.

— А хто ж?

— Ты заўсёды чапляешся да мяне. І тое не так, і етае... І з дзецьмі... Чаму я адна думаць пра ўсё павінна, а ты як толькі што — за дзверы шмыгаеш, дома суткамі не бываеш?

— Сціхні! — тупнуў нагою Яўхім, не вытрымаўшы.— Ты каго хочаш да вар'яцтва давядзеш сваім крыкам, сваімі папрокамі...

Але Сонька не сціхала. Быццам радая была, што муж нарэшце дома, што ёсць каму выліць усю крыўду, што накапілася ў душы за той час, як дома яго не было, жыла адна з дзецьмі і нават пасварыцца не мела з кім.

Каб не чуць жончынага крыку, заваліўся Яўхім Бабай на пасцель, прыкрыў вушы падушкаю і так, не распранаючыся, не абедаючы і не вячэраючы, заснуў.

## XI

Калі б хто-небудзь спытаў у Івана Дарошкі, які дзень ён быў ужо ў дарозе,— не адказаў бы пэўна. Ды і не лічыў ён дзён, не гэтым, зусім не гэтым была занята яго галава,

яго думкі. «Дайсці да Масквы! Трэба, што б там ні было, дайсці да Масквы!» — вось што хвалявала, вось што не давала ні пра што іншае думаць. А дайсці да Масквы, як неўзабаве пераканаўся Іван, было нялёгка. Усюды, куды ні паткніся, — немцы, напароцца на іх можна кожную хвіліну і там, дзе і не чакаеш — у лесе і ў полі, на лузе і ля ракі, не гаворачы ўжо пра паселішчы. А і паесці трэба, і дарогу распытаць, і хочаш не хочаш, даводзілася Івану час ад часу выбірацца з лясных нетраў і заглушы, выходзіць да людзей. Людзі ж не аднолькавыя. Адны ненавідзяць акупантаў, гатовы дапамагчы чалавеку, апошняе аддаць; ёсць жа і хцівыя, ды і Савецкую ўладу, як выявілася, не надта любяць. І Іван Дарошка, каб уратавацца, не трапіць у рукі ворагаў, разоў колькі ўцякаў, бег што ёсць сілы, на дрэвы залазіў, у халодную, што лёд, ваду бултыхаўся. Аднак жа, нягледзячы ні на што, ён ішоў і ішоў на ўсход. Не так хутка, вядома, як яму хацелася, але ўсё ж ішоў, пасоўваўся і пасоўваўся. Каб менш кідацца каму б там ні было на вочы, нёс у руках аброць і пугу і, калі сустракаў каго-небудзь, спыняў чалавека і пытаў, ці не бачылі часам буланага каня, маўляў, збег конь і вось ён шукае яго. Трапляўся чалавек добры, разгаворлівы, задаваў яму і яшчэ некалькі пытанняў, неўпрыкмет заводзіў гутарку пра немцаў, распытваў, дзе яны, ці ёсць у бліжэйшай вёсцы, а то іншы раз, калі было поўнае супадзенне поглядаў, ішоў з чалавекам да яго ў хату і падмацоўваўся на дарогу, браў харчы.

Неаднойчы трапляў Іван і на вочы ворагам. Першы раз здарылася гэта на нейкай нешырокай лясной дарозе. Іван ішоў, не думаючы, не чакаючы, што тут могуць ехаць немцы. А яны неспадзявана раптам дагналі яго — чалавек трыццаць, усе на веласіпедах. Думаў Іван, не вытрымае, выдасць сябе. Ад страху хвілін колькі аж гаварыць не мог, глядзеў толькі на ворагаў ды вачыма лыпаў. Яны ж, спыніўшыся, пачалі пытаць у яго пра нейкую Фядосаўку. Ён не ведаў, дзе тая Фядосаўка, не разумеў, пра што ў яго пытаюць, але на ўсякі выпадак наказаў проста рукою наперад і сказаў: «Там, там Фядосаўка». І як толькі ад'ехаліся, схаваліся за паваротам дарогі немцы, шуснуў, плітануў у кусты. І там, аддыхаўшыся, дакараў сябе, што мог і заданне райкома праваліць, і сябе ні за што ні пра што жыцця рашыць. Потым з немцамі ён сустракаўся яшчэ некалькі разоў — то яны яго знянацку даганялі, то ён сам проста ў рукі да іх ішоў, бо ўцячы, збочыць нельга бы-

ло — бачылі яго немцы і яму нічога не аставалася, як рабіць выгляд, што ён не баіцца іх, няма яму, маўляў, чаго баяцца, ён невінаваты ні ў чым. Немцы, мусіць, заняты былі сваім, яны не звярталі асаблівай увагі на чалавека з пугай і аброццю ў руцэ. А калі і спынялі часам, то прымалі за тутэйшага, распытвалі, як правіла, пра бліжэйшыя гарады і вёскі, як даехаць да іх. Іван у такіх выпадках ці згодліваківаў галавою, ці рабіў выгляд, што не разумее, пра што ў яго пытаюць. А як толькі ад'язджалі немцы, хаваўся, знікаў ці збочваў на зусім малаўезджаныя, глухія дарогі і сцежкі, ведаючы, што рызыкаваць сабою і заданнем райкома нельга, а таму трэба быць ад ворага далей, як мага далей. «Яшчэ ж мне праз лінію фронту давядзецца пераходзіць,— думаў, турбаваўся Іван.— А рызыкаваць тут, дзе можна неяк і па-іншаму, хаваючыся... Не, не варта!»

Уцякаючы гэтак ад ворагаў, натрапіў Іван аднойчы на куст каліны, што аж чырванеў, быў увесь, нават лісця не відаць, абсыпаны спелымі, як кроў, ягадамі. І доўга стаяў, зачаравана любаваўся, вачэй не мог адвесці — гэта ж трэба так урадзіць! Згадалася дамоўка, Вялікі Лес, тое, як хадзіў, бывала, па арэхі, грыбы і неспадзявана ў самых нечаканых месцах натыкаўся на кусты спелай каліны...

«Што цяпер там, як жонка, дзеці, Васіль Кулага, бацька, Косцік?..»

Хоць і ўсведамляў Іван, што заданне даручана яму вельмі важнае, што не кожнаму можна яго даверыць, але дзесьці ў глыбіні душы быццам і крыўда ўзнікла на Рамана Платонавіча Багавіка. «Нібыта на мне клінам свет сышоўся, не мог іншага каго падшукаць, у Маскву паслаць... Ды яшчэ ў такі час... І там, у Вялікім Лесе, усё вельмі няпэўнае, ды і жонка ж, Каця... Трэба было хоць сказаць ёй, куды я іду. Думаць жа будзе, перажываць. І са школай той... Як зробіць, выйсце якое знойдзе?.. Быў бы я бліжэй, падышоў бы, параіў бы нешта. А то, калі што якое, і ў іншае месца перавёз бы, каб ніхто не прыставаў, не мучыў яе. А так... Не прыйдзеш, не пагаворыш, не суцешыш, не паможаш. Адна яна. Ды і я адзін... Таксама няма з кім ні пагаварыць, ні параіцца. Каторыя суткі іду — і ўсё адзін і адзін... І колькі яшчэ ісці так давядзецца?.. Фронт аддаляецца і аддаляецца, немцы наступаюць, а нашы адступаюць. Дакуль так будзе, калі пералом у вайне наступіць?..»

Пайшоў ад куста каліны, але куст той ніяк, ніяк не забываўся, у вачах, як наяве, стаяў...

Неяк, выйшаўшы надвячоркам з лесу, убачыў Іван Дарошка ля стога сена чалавек сем-восем чырвонаармейцаў. Яны якраз адпачывалі, хто сядзеў, хто ляжаў.

«Няўжо сваіх я дагнаў?» — падумаў Іван і папраставаў да стога.

Як і немцы прызнавалі ўсюды Івана за чалавека тутэйшага, гэтак і чырвонаармейцы прынялі яго за жыхара нейкай блізкай вёскі, пачалі распытваць пра гітлераўцаў, ці не ведае, дзе яны, кудою наступаюць. Маніць Іван не стаў, прызнаўся, што ён не тутэйшы.

— А хто ж вы? — падхапіўся на ногі рослы камандзір, з перавязанаю, мусіць, параненаю, леваю рукою.

— Я? — усміхнуўся Іван, не ведаючы, што і адказаць.— Я на ўсход іду.

— Адкуль вы ідзяце? — пытаў камандзір.

— Здалёку,— адказваў не зусім пэўна Іван.

— А ўсё ж? — настойваў камандзір.

— Усё ж... Хіба гэта так важна?

— Важна. Вельмі важна.

Іван павагаўся — прызнавацца ці не?

— З-за Дняпра я.

— Значыцца, я не памыліўся. Вы — Дарошка.

Іван аслупянеў — адкуль гэты рослы вайсковец яго ведае? Аслупянеў на хвіліну, бо ў наступны момант пазнаў вайскоўца.

— Заспіцкі... Аляксей?

— Іван...

Яны кінуліся адзін да аднаго, абняліся.

— Як ты тут апынуўся? — пытаў Аляксей Заспіцкі ў Івана Дарошкі.

— Трэба, вось і апынуўся.

— А я, убачыўшы цябе, не паверыў... З братам тваім Піліпам не так даўно рассталіся... А ты тут...— расказваў Заспіцкі.

— Як рассталіся? — аж адхіснуўся Іван.

Аляксей Заспіцкі ніякавата патупіў у зямлю вочы, не рады, што прагаварыўся, з першых слоў усё выдаў...

— Ды, ведаеш, на немцаў мы напароліся. У бой уступілі. А іх — многа. Адступаць давялося. Вось і пакінулі яго прыкрываць...

— І далей што?

Заспіцкі пацінуў плячыма.

— Ні адзін з тых, каго пакідалі, нас не дагнаў,— сказаў ён сумна.— Ці па іншай дарозе адступаюць, ці...

Засціцкі зняў з галавы пілотку, апусціў галаву.

— Разумею,— сцягнуў са свае галавы таксама шапку Іван. Памаўчаўшы ж, дадаў: — Раней звесткі да мяне даходзілі, што яго на пераправе праз Дняпро зямлёю бомба прысыпала...

— Было такое, расказваў ён нам...— прызнаўся Аляксей Засціцкі.— Ён жа нас таксама, як і ты, дагнаў... Мы спыніліся ў вёсцы, ваду пілі ля калодзежа, а ён падышоў... Залічылі яго ў мой узвод і — скажу табе — не памыліліся. Ваяваў добра. Праўда ж, хлопцы? — звярнуўся ён да чырвонаармейцаў, што ляжалі, сядзелі паўзбоч стога.

— Праўда,— ахвотна ўвязаліся ў гаворку чырвонаармейцы.

— А гэта родны брат Піліпа — Іван. Ён старшынёй сельсавета ў нас быў,— знаёміў з Іванам, расказваў чырвонаармейцам Аляксей Засціцкі.— Ты даўно з дому?

— Ды ўжо ніштавата. А што?

— Як што? Я ж ведаць хачу, як там бацька, маці, сястра?..

— Не хвалюйся, пакуль што ў іх усё добра... Немцаў яшчэ, праўда, там не было. Але калі што пагражацьме — у лес пойдуць. Бацька ў цябе сам ведаеш які.

— Гэта мяне якраз і трывожыць.

— Вядома, над кожным з нас небяспека вісіць. Але на лепшае будзем спадзявацца. Нават я... Пра Піліпа такое пачуўшы, усё адно спадзяюся: не загінуў ён...

— Канешне, не загінуў,— узяліся пераконваць Івана і Аляксей Засціцкі, і астатнія чырвонаармейцы.

— А загінуў, ну што ж... Галоўнае — не абы-як загінуць. А ў баі, па-геройску, за маці Айчыну... Дай бог, як кажуць, усім нам так паміраць...

Іван прысеў на пакошу, бо стаміўся, здарожыўся. Ды і есці хацелася, аж у жываце бурчала.

— Дык усё ж куды ты ідзеш? — спытаў у Івана Аляксей Засціцкі.— Можа, нам па дарозе?

— А вы куды ідзяце?

— Ды мы адсталі. Сваіх даганяем.

— Тады, бадай, нам па дарозе. Да самага фронту.

— А там?

— Мне далей трэба...

І, павярнуўшыся да Аляксея, папрасіў пальчыкам нагнуцца, шапнуў ціха, каб ніхто не пачуў:

— У Маскву іду. У мяне — заданне...

— А-а,— як бы здагадваючыся пра штосьці вельмі важнае, усклікнуў Аляксей.

## XII

Піліп не помніў, нават уявіць не мог, колькі ён быў у непрытомнасці. Мабыць жа, доўга, бо, калі расплюшчыў павекі, убачыў над сабою чорнае неба і зорку, што гарэла высока-высока над галавою. Некаторы час углядаўся ў чорнае начное неба, не ў змозе адвесці вачэй ад зоркі, што надта ж прыветна, звабліва міргала, нібыта клікала яго да сябе.

Павярнуўся, хацеў падняцца. Востры боль праняў усё цела, аж разанула сэрца.

«Я паранены,— зжахнуўся Піліп.— У патыліцу».

Дакрануўся рукамі да таго месца, дзе балела. Валасы былі ў крыві, аж закарэлі...

Успомніў той — мабыць, ужо ўчарашні — бой... Як страляў, пакуль былі патроны, з вінтоўкі, як кінуўся быў уцякаць, а на яго наваліўся ззаду здаравіла-немец, пачаў душыць, ды ён, Піліп, не даўся, выкруціўся, шпурнуў здаравілу-немца на зямлю...

«Мусіць, другі падаспеў на выручку... І нечым аглавушыў мяне... Хіба прыкладам?»

З цяжкасцю, абапіраючыся на локці, падняў спіну, галаву, сеў. Неверагодная слабасць была ва ўсім целе. Падцягнуў пад падбародак ногі, абапёрся на калені рукамі. Кружылася, як ад хмелю, галава, да горла падступалі ваніты.

«Другі раз такое са мною... Але там, ля Дняпра... Было лягчэй».

Пашкадаваў, што ані не шанцуе. І там, дома, у вёсцы, і вось тут у дарозе, таксама ж...

«Там Клаўдзя са сваімі жаніхамі... А тут...»

Расплюшчыў вочы, павёў навокал сябе: пад кустамі, на траве, на купінах і кратавінні ляжалі, бы снапы ў жніво на полі, у самых дзіўных позах людзі.

«Няйнакш, забітыя... А я...»

Сяк-так, абапіраючыся на рукі, устаў. Ногі амаль не трымалі яго, трымцелі, гнуліся ў каленях. Але Піліп, перасільваючы боль у патыліцы, зрабіў і адзін, і другі крок. І не ўстояў на нагах — паваліўся зноў на зямлю, забурыўся ледзь не носам у траву...

Гэты раз ачуўся ад холаду. Было так холадна, што аж гнула, сцінала ўсяго. «Бр-р-р...»

Успомніў учарашняе...

Абапіраючыся на рукі, сеў. І ўбачыў чырвонаармейца, што ляжаў, уткнуўшыся тварам у зямлю, нічком.

«Хто ета?»

Падняўся, устаў на ногі, падышоў, наблізіўся да чырвонаармейца. І ледзь не ўскрыкнуў ад нечаканасці:

— Гаўрыленка!..

Па гімнасцёрцы пазнаў Гаўрыленку, бо была яна ў яго на спіне зашыта белымі суравымі ніткамі. Няйнакш, падраў дзесьці ён яе. А можа, у баі, там, яшчэ на граніцы, куляю ці асколкам зачапіла. Менавіта на гэтую зашытую белымі суравымі ніткамі дзірку звярнуў быў увагу ён, Піліп, калі Гаўрыленка вёў яго пераапранацца з цывільнага ў вайсковае.

«Што, ён забіты?»

Павярнуў Гаўрыленку тварам угору, да неба. І лепш бы гэтага не рабіў, бо твар у Гаўрыленкі быў увесь заліты крывёю. Крывёю былі заліты і шыя, грудзі...

«Мусіць, гранатаю, асколкамі яго...» — падумаў Піліп. І пашкадаваў, што так і не сышоўся з Гаўрыленкам, не пазнаёміўся бліжэй.

«А хлопец быў таварыскі. І мяне тады па-добраму сустрэў, прывеціў, і іншых... Хто ён? Адкуль родам? Жанаты? Хто дома ў яго астаўся — маці, бацька, жонка, дзеці?..»

Слёзы нагарнуліся на вочы.

«Не распытаў я ў Гаўрыленкі... А цяпер... Ужо не распытаеш... Ніколі не распытаеш...»

Не па сабе зноў стала Піліпу.

«Ета ж трэба было нам так нечспадзявана напароцца на немцаў... І адкуль яны ўзяліся на дарозе? Кеб не яны — ішлі б і далей на ўсход. І я, і Гаўрыленка, ды і іншыя... А так...»

Як ніколі яшчэ раней, адчуў раптам Піліп, якое недаўгавечнае і кволае жыццё. Раз — і няма яго, быццам і не было. Жывы чалавек — усё яму трэба. Мёртвы — нічога ані не трэба. Глухі, нямы. Быццам зямля.

«І я ж... Мог быць ужо такім... Ды, мабыць, і буду...»

Холадам усяго, з ног да галавы, абдало Піліпа. Павярнуўся, агледзеў уважлівым паглядам густы алешнік, лазняк — там нешта як бы бруілася, цякло, дарогу, што чарнела ўдалечы, і паволі-паволі пайшоў, сам не ведаючы, не цямячы, куды і чаго. Заўважыў, між іншым, што ноч на зыходзе, ідзе, набліжаецца досвітак, світанне. З туманам

ля ракі і на лузе, яснаю барвістаю палосаю на ўсходзе, вялікаю імглістаю зоркаю на даляглядзе над лесам.

На ўсходзе сонца, мінуўшы ладны ўчастак лесу, Піліп выйшаў на поле. Поле было роўнае, чыстае, засаджанае доўгімі радамі бульбы. Удалечы, на пагорку, відзён быў млын-вятрак, а за ім — і вёска, вялікая, уся ў зеляніне садоў.

Глядзеў некаторы час на вёску.

«Можа, туды, да людзей, мне падацца?»

«А калі там немцы?» — не ахвоціла на гэта, спыняла думка.

Патыліца балела, аж тузала. Хацелася піць. Млявасць, бязволле спавівала ўсё цела. Аж нельга было стаяць, проста валіла з ног. І Піліп, не маючы змогі трымацца, апусціўся, сеў на дол.

І ў тую ж хвіліну заплюшчыў вочы і не то задрамаў, не то ўпаў у забыццё...

Уявілася — ён дома, на сваім лузе. Толькі што скончылі кідаць стог, і ён прысеў, каб адпачыць. Побач, таксама на траве, прыселі бацька, маці, Параска, Косцік. Усе стомленыя, вымучаныя — спяшаліся ж управіцца з сенам, каб, не дай бог, не захапіў дождж, навальніца. Маці рассцілае на траве белую хустку, дастае з палатнянае торбы хлеб, сала, гладыш кіслага малака. Бацька падсоўваецца бліжэй да хусткі, кроіць нажом хлеб, сала. І тут жа пачынае, гучна плямкаючы губамі, есці. Бярэ скібку хлеба, скрылік сала ў рукі і маці. За ёю — Параска, Косцік. А ён, Піліп, сядзіць зводдалі і не набліжаецца да хусткі, да яды.

— Чаго ета ты есці не ідзеш? — падымае вочы на сына, глядзіць неяк неспакойна на яго маці.

— Не хочацца нешта,— прызнаецца Піліп.

— Чаму не хочацца? — паварочвае валасаты твар да сына бацька, і ён, Піліп, бачыць, як раптам загараюцца незразумелым бляскам у бацькі вочы.

— Стаміўся, таму, мусіць, і не хочацца,— адказвае Піліп.

— То, можа б, малака выпіў? — прапаноўвае-пытае маці.

— Малака?.. Малака вып'ю, піць я хачу...

І Піліп падымаецца на ногі, ідзе да яды, туды, дзе сядзяць ужо маці, бацька. Нагінаецца над хусткаю, бярэ ў свае рукі гладыш з малаком, падносіць да рота. Але не п'е — у гладышы не малако, а... кроў. Чырвоная, аж чорная кроў!

— Мама,— ледзянее ад жаху Піліп.— Ета ж не малако, а кроў.

— Кроў? — здзіўляецца, не верыць маці.— Не можа быць!

— Паглядзі.

І Піліп набліжаецца да маці, падае ёй у рукі гладыш. І маці падносіць гладыш бліжэй да сваіх вачэй, глядзіць у яго.

— Праўда, кроў,— кажа яна.

— Што вы выдумалі? — злуецца, усхопліваецца на ногі бацька.

— На, паглядзі,— аддае бацьку гладыш маці. Цяпер ужо бацька падносіць бліжэй да вачэй гладыш, пільна ўзіраецца ў яго. І тлустыя бацькавы губы расплываюцца ў павольнай, дабрадушнай усмешцы.

— Хе-е,— смяецца бацька.— Адзін выдумае, а другі верыць.

Цікавасць бярэ Піліпа. Ён амаль што вырывае з рук у бацькі гладыш. Але што гэта? Гладыш падае з яго рук і разбіваецца. На дробныя кавалачкі, чарапкі...

Ад нечаканасці, жаху Піліп расплюшчвае павекі. І палохаецца яшчэ больш — проста перад ім стаіць, наставіўшы аўтамат, рослы, з закасанымі рукавамі і насунутай на самыя вочы касцы немец.

— Хэндэ хох! — крычыць, камандуе немец.

І Піліп, яшчэ не адышоўшы ад сну-ўявы, паволі-паволі ўстае, падымае ўгору рукі. І толькі тады бачыць, што немец не адзін, іх некалькі, яны з усіх бакоў акружылі яго і стаяць, панастаўляўшы аўтаматы, чакаюць, што ён будзе рабіць далей.

— Усё, канец,— прашаптаў ён сам сабе Піліп.

— Вас? — гаркнуў немец і, не чакаючы, што яму адкажуць, падышоў бліжэй і ўдарыў, штурхнуў Піліпа ў грудзі. Ды так моцна, балюча, што Піліп не ўстояў на нагах, упаў, паваліўся.

Кроў прыліла ў галаву. І Піліп, падхапіўшыся на ногі, у наступную хвіліну рынуўся на немца. Ці схапіў яго, як меркаваў, за горла, ці кінуў, чмякнуў на зямлю — не помніў. Бо раптам адчуў — нешта гарачае апякло жывот, ударыла, быццам бізуном, асляпіла, аглушыла і ўсяго яго завярцела, закруціла, нібыта ў вадавароце, віры і кудысьці панесла, павалакло...

## XIII

Яшчэ разоў колькі хадзіў, калі змяркалася, да Шуркі Косцік. І кожны раз пакідаў яе расчараваны, спустошаны. А туды ж, у хату да яе, ледзь не на крылах ляцеў. І як дзень-два не бачыў Шуркі, нудзіўся, сумаваў па ёй. Нудзіўся, сумаваў нават больш, чым па Тасі. Бо Тася — гэта было нават быццам нерэальнае, далёкае. А Шурка жыла тут, у Вялікім Лесе, і заўсёды рада была, калі ён, Косцік, прыходзіў. Адразу ж пачынала неяк дробненька, цененька смяяцца, голас яе зрываўся, то гучаў занадта зычна, то раптам быццам прападаў, і яна пачынала гаварыць так ціха, што было амаль не чуваць. І рукі, за якія Косцік хапаўся, рабіліся то гарачыя-гарачыя, то халадзелі, як лёд. І ён, Косцік, і яна, Шурка, не вытрымлівалі, як бы хмялелі, мінала хвіліна-другая, і яны, таго не заўважаючы самі, апыналіся ў пасцелі. Хутка, спешна адно аднаму памагалі распранацца і забывалі неўзабаве, што яны далей робяць...

Калі праходзіла гарачнасць, наступала супакаенне, Косцік нямеў, яго пёк сорам, пачынала грызці сумленне. «Што ета я?.. А калі даведаецца хтосьці, погалас па вёсцы папаўзе, да бацькі дойдзе?» Шурка, зняможаная і задаволеная, гарнулася да яго, абдымала, цалавала, нешта без усякай сувязі шаптала, была быццам у забыцці. А яму, Косціку, нават ласка яе здавалася нечым ненатуральным і непрыемным. І ён, паляжаўшы нейкі час, вылазіў з гарачай і потнай пасцелі, апранаўся і, ні слова не кажучы, знікаў, уцякаў з хаты. Бы злодзей, выбягаў з двара на вуліцу, ішоў, беручыся бліжэй да платоў, каб яго менш хто бачыў і пазнаваў, і дакараў, дакараў сябе, што і зноў вось не вытрымаў, завітаў да Шуркі. «А чаго, чаго? — білася сэрца.— Каб хоць пагаварыў, расказаў ёй, што на душы, пачуў, чым жыве, што думае яна, Шурка. Дык не ж...» — «З Тасяй усё па-іншаму было б».— «Чаму па-іншаму?» — задаваў ён сабе пытанне. І адказваў: «Таму што Тася не такая, як Шурка. Ды і я з ёю... Хіба б асмеліўся на такое? Не, ніколі! З Тасяй пастаяць, пагаварыць — і таго б даволі было. А з Шуркай... Можа б, і пагаварыў, але пра што з ёй гаварыць. Усе думкі, усе клопаты ў яе — як дроў з лесу прывезці, карову, свіней накарміць, у печы выпаліць... Не тое, зусім не тое ў Тасі. Тася — быццам незямная, яна — як анёл. Загаворыць — і то заслухаешся. Не,

трэба, пакуль не позна, канчаць з Шуркай. Тася — вось да чаго трэба імкнуцца...»

Але мінала ноч, мінаў дзень — і адчуваў Косцік: цягне, зноў цягне яго да Шуркі.

«Што ета са мной? — думаў, засяроджваўся на сваім Косцік.— Кахаю быццам Тасю, а цягне... да Шуркі».

Разумеў: нядобра гэта, не па-людску — кахаць адну, а хадзіць па вечарах да іншай, ды саўладаць з сабою... Не мог, не хапала сілы.

«Няхай, сёння яшчэ схаджу, а больш... Не пайду. Хопіць, годзе!»

Але то толькі словы, пустыя словы былі. Бо калі надыходзіў зноў надвячорак, не вытрымліваў Косцік — апранаўся і неўпрыкмет знікаў з хаты, ішоў да Шуркі...

Бацька быццам пра нешта здагадваўся. Так, ва ўсякім выпадку, здавалася Косціку. І ён чакаў, чакаў, калі той загаворыць з ім пра гэта. І рыхтаваўся, што адкажа. «Скажу, што няпраўда, выдумалі!» — «А як не паверыць?» — «Ну, не паверыць, дык не паверыць». Але бацька ні пра што не гаварыў з Косцікам — думаў сваё, лежачы на ложку. То бок, нага ў яго балелі пасля таго, як кінуў, шпурнуў аб прызбу Рыжы, то так нешта кволіўся, амаль не выходзячы на вуліцу. Разумеў Косцік: ненавідзіць бацька Рыжага. І Клаўдзю таксама ненавідзіць. А што зрабіць з імі — прыдумаць не мог. Не маглі нічога супраць Клаўдзі і Рыжага прыдумаць і Хора, Параска, каб прагнаць з селішча. І Косцік хоць заняты быў і Тасяю, Шуркаю, але нене дый думаў таксама пра Рыжага і Клаўдзю. Не сказаць, каб ён ненавідзеў вельмі ўжо іх, але і прыемнага мала было ў тым, што жылі яны на адным селішчы. Клаўдзя — дык тая быццам заганарылася, звысоку цяпер на ўсіх глядзела. Нават на яго, Косціка. «Вы, маўляў, мяне не цанілі, а я... Вунь хто!» А Рыжы зусім на нікога з Дарошкаў не зважаў, рабіў усё, як хацеў, не пытаючы ні ў кога на тое згоды, быццам вечна жыў тут, на гэтым селішчы, быццам не чужое яно яму было, а заўсёды яго. Калі Косцік не вытрымаў, сказаў яму аднойчы, што неабавязкова кожны ранак ля парога лужу рабіць, можна і далей адысціся, хоць бы пад хлеў, Рыжы так паглядзеў, што Косцік аж у хату ўцёк — збаяўся, што і яго гэтак жа, як і бацьку, шпурне аб прызбу.

«Ні Піліпа, ні Івана дома няма,— думаў Косцік.— І на мне абавязак ляжыць абараніць бацьку і селішча. Хто ён, урэшце, еты прыблуда, каб гаспадарыць, распараджацца,

як сваім? І тая ж Клаўдзя — хто яна такая? Жыла з Піліпам — ета адно было. А цяпер, калі жыве з прыблудам — зусім іншае...»

Прыезд у вёску немцаў, тое, што Рыжы стаў начальнікам паліцыі, і зусім занепакоіла Косціка.

«Ды калі так і далей пойдзе, ён зусім нас зжыве з селішча — і бацьку, і мяне, і Хору. І нідзе ж управы на яго не знойдзеш. Сам жа начальнік паліцыі... Што захоча, тое і зробіць».

Чутка па вёсцы пайшла — быццам немцы загад у Гудове вывесілі: усе, хто працаваў на заводзе і на чыгунцы, павінны ў бліжэйшыя дні зноў приступіць да працы; тыя ж, хто не паслухаецца нямецкага загаду, будуць пакараны.

Не тое каб загад надта напалохаў Косціка. Але ж, падумаўшы, намысліў ён схадзіць у Гудоў. І загад хацелася самому на свае вочы прачытаць — «Ці мала што людзі выдумаць могуць?» — ды і даўнавата не быў нідзе, акрамя вёскі.

«Пагляджу, паслухаю, што ў Гудове людзі гавораць і робяць. А то засеў у етым Вялікім Лесе і нікуды не выходжу, нідзе не бываю».

І неяк, паснедаўшы, з-за стала вылез, шапку на галаву надзеў, кажушок на плечы ўскінуў.

— Ты ета куды? — паглядзеў на сына падазрона бацька.

— У Гудоў схаджу..

— Чаго?

— Загад, кажуць, немцы там вывесілі. Пайду прачытаю...

Бацька, мусіць, і сам хацеў ведаць, што немцы ў сваіх загадах пішуць.

— Ідзі,— дазволіў ён. Але і папярэдзіў: — Толькі не баўся вельмі. І ў карты больш не гуляй...

Напомніў бацька пра карты, і Косцік разгубіўся:

«А-а, я і забыўся. Давядзецца ж, мабыць, з сім-тым убачыцца, сустрэцца?»

Але не, не спыніўся Косцік, выйшаў з хаты, зашпільваючы на хаду кажушок.

«Нічога, я ж не ўкраў грошай,— выйграў... А што збег, дык дадому пара была. Ета ж кожны разумець павінен. Гуляць усю ноч?.. Хто ж вытрымае, не дамаўляліся ж... Мала што каму захочацца...»

Ішоў, топчучы нагамі малады сняжок, і на душы неяк святлела, святлела.

«Вось і зімы дачакаліся. А там, глядзіш, і вясна, зноў лета...»

Чаму пра лета згадаў, чаму чакаў яго — і сам не ведаў, сказаць не мог. Але здалося, уявілася раптам — прыйдзе лета, і ўсё добра будзе, скончацца розныя згрызоты і няпэўнасці. І зажыве, па-іншаму зажыве зноў ён, Косцік.

«Але ж зіма, вясна наперадзе. Іх як перажыць, калі немцы, Рыжы вунь штодзень па двары нашым, як па сваім, ходзіць? І братоў — ні Піліпа, ні Івана — блізка няма... Нешта мне самому рабіць трэба, кеб і селішча не збаёдаць, і бацьку абараніць...»

У Гудове збочыў да завода. Сапраўды, ля прахадной на самым відным месцы вісеў прыклееены да сцяны нейкі нямецкі загад з чорным крыластым арлом. Але прачытаць, што ў тым загадзе напісана, было нельга — хтосьці дзёгцем замазаў усе літары, а зверху, дзе быў намаляваны арол, яшчэ і напісаў: «Пацалуйце нам у с...»

«Не баяцца ж! — падумаў Косцік.— Ёсцека ж атлёты!»

Завод пасля пажару меў не зусім самавіты выгляд. Усюды чарнелі абгарэлыя дошкі, слупы, абкуродымленыя, закапцелыя трубы. Нават снег не прыкрыў, не схаваў слядоў разбурэння і агню. Паламаны былі платы, павыдзіраны дзверы, павыбіваны вокны, а то і павыманы разам з рамамі з тых будынкаў, што былі на заводзе.

«Няўжо немцы аднаўляць завод збіраюцца? Мусіць жа, калі загадваюць да працы ўсім прыступаць».

Пайшоў ад завода далей па пасёлку, бліжэй да чыгуначнай станцыі, падумаўшы:

«Можа, сустрэну каго са знаёмых... Хоць распытаю, што да чаго... А то і загаду нават не прачытаў... Чаго ж тады я ішоў сюды?..»

Гудоў хоць быў падобен на вёску, але вёскаю ніколі не быў. І адрозніваўся ад усіх палескіх вёсак ужо хоць бы тым, што ў ім не было суцэльнай вуліцы. Адна, галоўная дарога як бы злучала некалькі пасёлкаў у адзін. І кожны з гэтых пасёлкаў меў сваю назву — «Завод», «Станцыя», «Склады», «Збрады». Засяленне Гудова ішло стыхійна, а не планамерна, па нейкіх сваіх законах, якія дыктавала само жыццё. Сяліліся людзі ці па знаёмству адзін каля аднаго, ці каб бліжэй было на працу хадзіць — прафесійна. І толькі ў апошнія гады ўсе пасёлкі пачыналі злучацца як бы ў адзін, з цэнтрам якраз пасярэдзіне пасёлкаў, дзе

былі пабудаваны двухпавярховая школа, магазін і вялікі светлы клуб. Менавіта сюды, у цэнтр, і накіраваўся Косцік у надзеі спаткаць каго-небудзь са знаёмых. Тым больш што і дарога ад завода ў цэнтр была добра пратаптана. Не маглі людзі жыць адзін без аднаго, хадзілі і ў госці, і па розных іншых патрэбах.

Магазін быў зачынены, зачынены быў і клуб. А вось школа быццам працавала. Не, дзяцей не было нідзе, не было на снезе відаць і дзіцячых слядоў, але дзверы ў школу былі адчынены. Вісела і нейкая аб'ява на сцяне.

«Можа, загад той нямецкі?» — падумаў Косцік і не мог, каб не збочыць з дарогі, не падысці да школы.

Здалёку здагадаўся, што на сцяне вісіць не загад, а нешта зусім іншае. Яшчэ крокаў праз колькі прачытаў слова «ПАЛІЦЫЯ», што было напісана вялікімі чорнымі літарамі на рыжым кавалку фанеры. Міжвольна, аж зжахнуўся, спалохаўся.

«І тут паліцыю арганізавалі! І я ледзь сам проста ёй у рукі не прыйшоў».

Павярнуўся, пакрочыў прэч ад школы. Але яго, мусіць, у школе ўжо ўбачылі і аклікнулі:

— Гэй, што ты хацеў?

Косцік спыніўся.

«Адказваць ці...»

Усё ж азірнуўся. І ў тым, хто яго аклікаў, пазнаў аднавокага, таго, з кім не так даўно гуляў у ачко і ў якога выйграў шмат грошай. Аднавокі таксама пазнаў Косціка.

— А-а, гэта ты! — усклікнуў ён.— Чаго ж ты збаяўся, не заходзіш? Тут усе свае...

Жадання вяртацца, ісці ў школу, сустракацца, гаварыць з аднавокім у Косціка не было. Але разам з тым і не паслухацца, ды яшчэ калі аднавокі сказаў, што ў школе ўсе свае, не асмеліўся Косцік.

Неахвотна, чужымі нагамі пабрыў назад да школы. Падняўся па прыступках на ганак, увайшоў у калідор. Згледзеў: у аднавокага на рукаве белая павязка, а на плячы — вінтоўка.

— Вы што, у паліцыі? — спытаў Косцік, павітаўшыся.

— А чаму б мне не быць у паліцыі? — пытаннем на пытанне адказаў аднавокі.— Я і з адным вокам страляю лепш, чым некаторыя з двума. Здавалі залік, дык пераканаліся... Хадзем у клас, там і Ігар, і Эдзік, і Кузя...

— Што, яны таксама ў паліцыю паступілі?

— А чаму ж не. Рабіць нічога не трэба, вінтоўку немцы

даюць і плацяць. Хто ж не паступіць, дзе ж яшчэ такая лафа?

Падняліся на другі паверх, зайшлі ў клас. За сталом, які быў расстаўлены пасярэдзіне пакоя — больш у ім нічога не было,— сядзела чалавек з дзесяць падлеткаў і мужчын, сярод якіх Косцік пазнаў і некаторых сваіх знаёмых. Усе былі ў шапках, кажухах ці ватоўках — холадна было ў пакоі,— з белымі павязкамі на рукавах. І гулялі ў карты, у ачко. Побач, непадалёку, стаялі і вінтоўкі, састаўленыя ў козлы.

— Глядзіце, каго я прывёў! — сказаў аднавокі, як толькі зайшлі ў пакой.

Усе, нібы па камандзе, павярнулі галовы да дзвярэй.

— А-а! — ускрыкнула некалькі галасоў.— Давай сюды, паглядзім, ці сёння так пашанцуе, як тады шанцавала!

Косцік ніякавата апусціў долу вочы, шмаргануў носам.

— У мяне грошай няма,— прызнаўся ён.

— Столькі выйграў — і грошай няма? — здзівіўся аднавокі.— Дзе ж ты іх падзеў?

— Дома ў мяне грошы... Не ўзяў з сабою.

— Дома ў нас і жонкі ёсцека! — рагатнуў нехта.

Цікавасць да Косціка прападала. Нават у сяброў яго — Кузі, Ігара і Эдзіка. І толькі аднавокі неяк падазрона ўсё глядзеў, не спускаў вока з Косціка.

— А ты хітрэц,— вымавіў ён урэшце.— І тады з гульні ўцёк... І цяпер не ўступаеш, бо, мабыць, ведаеш, што гуляць няма з кім. Усе абязгрошалі, бедныя, як касцельныя пацукі. Шантрапа, рубель прайграем, два пазычаем.

— Ну-ну, не абражай! — зашыпелі на аднавокага з-за стала.— Вось завод і чыгунку пусцім — будуць грошы.

— Пусціце,— кпіў, смяяўся з тых, што былі за сталом, аднавокі.— Хутчэй рак свісне, чым гэта зробіце.

— Чаму ты так? — адкінуў галаву набок, быццам па-начальніцку, Кузя.

— Ды таму, спадар начальнік, што бачыў, як загад той нямецкі запаскудзілі.

— Яго трэба зняць,— сказаў Ігар.— Бо калі немцы ўбачаць... Нам жа і адказваць.

— Не нам, а тым, хто гэта зрабіў,— адрэзаў Кузя.— У Вялікім Лесе, мабыць, такога няма,— павярнуўся ён да Косціка.

— Чаго няма? — не зразумеў Косцік.

— Ну-у, што ў нас... Сваволля такога няма. Завод спалілі, масты на чыгунцы таксама. Цяпер аднаўляць усё

трэба... І загад ля прахадной вывесілі, дык запаскудзілі.

— А што ў тым загадзе?

— Каб да працы прыступалі. Трэба завод аднаўляць і чыгунку. Ты, мабыць, таксама гульма гуляеш? Давай да нас, у паліцыю?

— Хіба ў Вялікім Лесе сваёй паліцыі няма? — павярнуўся да Косціка тварам цыганісты Ігар.

— Чаму ж, е!

— Я ведаю, што е,— паказаў зубы Ігар.— Але ў нас цікавей.

— Чаму ў нас цікавей? — умяшаўся ў гаворку зноў аднавокі.

— У нас рабіць няма чаго. Сядзі во, у карты гуляй. А ў іх там... Зямлю зараз пачнуць дзяліць, сварка пойдзе, каму лепшае, каму горшае. Міры. Ды і збіраць давядзецца для нямецкай арміі кажухі, валёнкі, яйкі, сала, масла... Хопіць работы паліцыі. А ў нас рабочы клас, нічога таго няма. Што зарабіў, тое спажыў. І ўсё.

— Упрашчаеш,— пакруціў галавою аднавокі.— Калі паліцыю арганізавалі, будзе ёй работа. Пабачыш вось,— быццам ведаў, багата наперад ведаў аднавокі.

— Будзе, дык рабіць будам! — аптымістычна глядзеў на свае абавязкі Кузя.

Пакуль гаварылі, Кузеў сусед — Эдзік прайграў банк. І калода карт перайшла ў рукі Кузю. Ён засяроджана пачаў іх раздаваць, забыўшыся зусім на Косціка. Падсеў да гульцоў у карты і аднавокі. А Косцік, пастаяўшы яшчэ трохі ў парозе, нікому нічога не кажучы, неўпрыкмет вышмыгнуў з класа. Спусціўся па лесвіцы з другога паверха, падаўся на падворак. І больш нікуды не заходзіў — пабрыў проста ад школы дадому, у вёску.

«А можа, праўда — і мне паступіць у паліцыю? — падумаў ён.— Вінтоўка ў мяне будзе. Селішча, бацьку абараню, страляць навучуся. У жыцці згодзіцца... І калі працаваць усіх прымушаць немцы збіраюцца, дык занятак трэба ж мець. Не ісці ж мне зноў калоды качаць на завод... Пакачаў — і хопіць... А тым часам... Можа, праясніцца, відаць будзе, куды што кіруецца, ідзе...»

## XIV

Канчаць пачатае цяжка, але і пачынаць новае бывае не лягчэй. У праўдзівасці гэтай ісціны пераконваўся Васіль Кулага неаднойчы і раней, ды з асаблівай глыбінёй

адчуў яе ў тыя асеннія і зімовыя дні, калі, пакінуўшы дамоўку, сям'ю, блукаў адзін па полі, па лесе. Быццам і ясна ўсё было, што рабіць яму, каб жыць і змагацца з навалаччу, а ўсё ж... Звыклае, хатняе цягнула, вабіла да сябе. «Што там, дома, у вёсцы, як жонка, дзеці?» — сядзела цвіком, не выходзіла ні на хвіліну з галавы. Нешта накшталт крыўды часта запаўняла думкі і сэрца — нібыта і жыў як чалавек, шчыраваў, стараўся, а бачыш жа... Выпалі выпрабаванні на жыццёвай дарозе — і ўсё пабурылася, жонка не вытрымала, не захацела мужна перанесці разам з ім, мужам, нягоды. «А яшчэ і цяжэйшае можа напаткаць... І калі яна так... Нішто не пагражала ні ёй, ні мне — жылі. Небяспека насунулася — выгнала, быццам трутня з вулля. Не патрэбен я ёй стаў»,— думаў Васіль пра жонку. Разам з крыўдай была ў Васіля і адказнасць за сям'ю, асабліва за дзяцей. «Што яны ўмеюць, могуць? І калі я не абараню — хто іх абароніць?»

Ведаў, разумеў Васіль Кулага: менш думаць трэба цяпер пра жонку, сям'ю, а пачынаць жыць па-іншаму, усё адно таго, ранейшага, не вернеш. І разам з тым... Не мог, не мог не думаць, не перабіраць у памяці таго, што было, як жылося раней і як магло такое здарыцца, што ў цяжкую хвіліну жонка не зразумела яго. «Сам ва ўсім вінаваты. Трэба было жонку вучыць, імкнуцца, каб яна больш свядомая была. А я... Варыць жонка есці, даглядае дзяцей, парадак у хаце трымае — і даволі. А жонка ж — сябра, паплечнік... І недарэмна ж жонку завуць палавінаю. Куды іголка, туды і нітка. А ў нас... Першае выпрабаванне — і кожны папоўз у сваю нару. Быццам і не адно цэлае было, не сям'я».

Можа б, менш думаў Васіль пра жонку, дзяцей, не перабіраў бы ў галаве таго, што было, не вінаваціў бы ні жонкі, ні сябе, не шукаў бы дапушчаных памылак, калі б іншае атрымлівалася. А то ж... Быццам і ясна было, што рабіць, асабліва пасля размовы з сакратаром райкома Багавіком, а пачаць тое так і не ведаў з чаго. Ды і гутаркасустрэча з Апанасам Харчэнем закранула за жывое... «Вось ён, выхаванец наш... Сакратаром сельсавета ставілі, а ён... Служыць да немцаў пайшоў, у старасты. І дзе гарантыя, што і іншыя, такія ж, служыць да немцаў не пойдуць. Мы яго ў лес будзем цягнуць, думаць, што ён свой, а ён... Да немцаў хінецца, прадасць у любы час цябе. Вось і павауй з такімі. Возьмеш яго ў атрад, ён разведае ўсё і выдасць...»

І шкадаваў, аж зубы сціскаў Васіль Кулага, што Івана Дарошкі побач няма.

«Мы з ім хоць і спрачаліся, не згаджаліся часта, а да ісціны заўсёды даходзілі. Калі б ён быў тут, разабраліся б з усім і нешта б прыдумалі... Адзін жа я... Памыліцца баюся... Дый... У лес пайсці не штука. А жыць як у лесе? Ды яшчэ зімою?» — спыняла кожны раз Васіля Кулагу думка.

Сапраўды, жыць у лесе было нялёгка. І спаць легчы, і паесці, абагрэцца... Агонь раскласці — і то боязна. Нехта ўбачыць дым, пойдзе на агонь... Добра ж, як не выдасць... А як выдасць?..

Выпаў снег — і першыя дні Васіль Кулага амаль нікуды не хадзіў. Сядзеў у той зямлянцы, што паспеў быў зрабіць — нават не зрабіць, а прыстасаваць пад зямлянку вываратнень старога дуба, паабсякаўшы карані, аблажыўшы яго з усіх бакоў дзёрнам, заслаўшы ўсярэдзіне лісцем і сенам. І думаў, думаў...

«Вядома, весялей, смялей было б, каб не адзін я быў... Але ж сляды... Куды ні пайдзі — сляды... А па слядах і дагнаць, знайсці можна...»

Голад і холад не давалі сядзець пад вываратнем, гналі шукаць цяпла, яды. Ды і з людзьмі трэба было спаткацца.

«Куды ж адкладваць далей? Дамаўляліся ж з Максімам Варывончыкам і Петрусём Хамёнкам... Нават месца збору прызначылі — леснічоўка ў Качай-балоце. Туды і кіравацца трэба!»

Але, перш чым ісці ў Качай-балота, намысліў Васіль Кулага ў Вялікі Лес, вёску сваю, наведацца.

«З Хведзькам... Рыгорам Бядой... Юркам Раманюком... Нінай Варакса... Лідай Шавейка... варта ўбачыцца. Ды і з сям'ёю, жонкаю. Можа, не выганіць. Як-ніяк, столькі ж гадоў жылі разам, дзялілі і хлеб, і пасцель. Дый разуменне быццам было...»

З зямлянкі выбраўся на змярканні. Пакуль з лесу выйшаў — ацямнела зусім. Завея, што ўсчалася і ў лесе амаль не адчувалася, толькі гайдаліся, шасталі голым голлем, гулі дрэвы ды падаў снег, у полі выла, гуляла — дзьмуў, свістаў вецер, нёс, перамятаў з месца на месца снег, аж збіваў з ног. Ні месяца, ні зорак нідзе. Цёмна, няўтульна і дзіка. І холадна-холадна. Дарогі таксама не відаць, нават ногі не намацваюць.

«Сляды замяце, і знаку не астанецца,— радаваўся

Васіль.— Калі жонка і не пусціць у хату, не бяда, назад у лес вярнуся. Толькі б есці дзе чаго захапіць... Ды сустрэцца б з патрэбнымі людзьмі, разведаць, дзе што робіцца...»

Да свайго двара падышоў з гародаў — паказвацца на вуліцу збаяўся. «Яшчэ сустрэне хто-небудзь, пазнае... Не, лепш без гэтага...» Пералез праз паркан, ціха-ціха падкраўся да акна, пастукаў у раму. Тры разы, як стукаў калісьці, калі яшчэ хлопцам быў і прыходзіў да Полі начаваць.

«Пазнае ці не пазнае? — тахкала ў грудзях сэрца.— А калі пазнае, ці адчыніць дзверы, ці пусціць у хату?..»

Поля пазнала, хто стукаў. Нават не перапытвала: «Хто?» Адразу ж, не падыходзячы нават да акна, пабегла ў сенцы, адчыніла.

Ён, Васіль, нязграбна ўзабраўся на ганак, пераступіў парог, яшчэ не ведаючы, як яго тут сустрэнуць, што яму сказаць у сваё апраўданне. Ішоў з апушчанай галавою, быццам вінаваты на кару. І ў першую хвіліну разгубіўся, калі адчуў на сваёй шыі жончыны рукі, адчуў, як яна ўся, цёплая і кволая, павісла ў яго на шыі, зашаптала:

— А я цябе так чакала...

Нешта мокрае пабегла ў яго па даўно няголеных, аброслых шчацінай шчоках.

«Слёзы... А мо снег растаў?»

Зачыніў сенцы, узяў, падхапіў на рукі жонку і пайшоў, стараючыся ступаць як мага цішэй, у хату.

Моўчкі, нічога не гаворачы, быццам п'яныя, захмялелыя ад сустрэчы, туліліся адно да аднаго, цалаваліся. Урэшце, не могучы больш стаяць на нагах, ён, не выпускаючы з рук жонкі, сеў на лаву.

— Чаму ты так доўга не прыходзіў, дзе ты быў? — пытала, шаптала Поля, быццам была яна ў сне, не помніла сама, што гаварыла, рабіла.

— Дык ты ж прагнала мяне,— урэшце асмеліўся, сказаў ён тое, што яго мучыла.

— І ты паверыў?.. Божа мой, якія вы, мужчыны, нездагадлівыя! Ета ж знарок я, на людзях, кеб усе чулі... А ў душы! Кеб ведаў ты, што рабілася ў мяне ў душы, асабліва калі ты паверыў, пайшоў з двара. Я думала, ты ўжо ніколі не вернешся, не пабачу я цябе больш...

Поля зноў заплакала, але не, не ад адчаю, а ад радасці, што Васіль зноў побач, дома.

— Але ж ты... Магла б мне сказаць гэта... А тады ўжо сварыцца, выганяць...— з цяжкасцю вымавіў Васіль.

— Я сама пра ета падумала. Але ўжо калі цябе не было дома, калі ты сышоў ад нас. І ночы амаль не спала...— прызналася яна.— А ты не ішоў і не ішоў...

Яна яшчэ мацней прытулілася да яго, пачала горача, задыхана цалаваць...

Потым яны гаварылі, гаварылі доўга і падрабязна пра ўсё, што думалі, перажылі адно без аднаго.

— Немцаў я вельмі баялася,— расказвала Поля.— А яны прыехалі — і паехалі. Начальства толькі паставілі...

— А дзеці, як дзеці? — пытаў ён.

— Дзеці нічога, толькі без бацькі сумуюць. Паходзяць па хаце дый пытаюць: «Навошта ты, мама, так крычала на татку? Дзе ён цяпер?» Поп прыязджаў хрысціць дзяцей, дык я не павяла іх хрысціць. А калі хто пытаў, чаму не вяду, гаварыла: «Я даўно іх пахрысціла, не чакала, калі ў Вялікі Лес поп прыедзе».

— А мо і праўда пахрысціла? — пытаў Васіль.

— Ды не, што ты... Я табе б сказала. Без твайго дазволу, без цябе я нічога не рабіла і не магу рабіць. Есці вару і то, калі ведаю, што ты есці не будзеш, без цікавасці. І нясмачная яда тая ў мяне варыцца. А ты, ты раскажы, як жыў, дзе быў?

— Я?.. У лесе.

— Адзін?

— Ды бадай што адзін.

— А Іван Дарошка?

— Яго паслалі некуды далёка, не вярнуўся яшчэ.

— Начаваў жа ты дзе?

— Дзе трапіць. У стагах сена, а то апошнія дні пад вываратнем будан сабе зрабіў.

— А еў што, чым харчаваўся?

— Еў? Пёк бульбу, жыта сырое жаваў...

— І цяпер жа, вядома, галодны, есці хочаш?

— Не помню ўжо, калі і еў. Каб не голад, не холад, думаеш, прыйшоў бы я ў вёску?..

— Божа мой! А я...

Поля падхапілася з лавы, пабегла да печы, нешта пачала адтуль даставаць, насіць на стол. Падняўся з лавы, бо і сапраўды есці хацеў, і ён, Васіль.

— Я не толькі есці хачу, але мне і пераапрануцца б... Ды і каб памыцца...

— Пачакай, зараз нешта прыдумаем...

Поля зноў падышла да печы, прыняла засланку, выцягнула з печы вялізны чыгун.

— Я як ведала ўсё адно, што ты сёння прыйдзеш. Вады ў чыгун наліла ды ў печ паставіла, кеб грэлася...— сказала яна ціха.— Вылью ў цэбар, памыйся. А я тым часам і бялізну табе дастану, падам...

Яна выцягнула на сярэдзіну хаты цэбар, выліла туды з чыгуна ваду.

— Цішэй, дзяцей не пабудзі...

— Ну і што, як пабуджу?

— Хай бы не бачылі мяне ў хаце. Я ж прыйшоў і пайду.

— Куды ты пойдзеш? — са страхам у голасе спытала Поля.

— Як куды? У лес.

— Цябе там хто чакае?

— Ды не, ніхто не чакае.

— Калі ніхто не чакае, дык і не спяшайся ў лес. Дома пажыві.

— А немцы?

— Немцы да нас толькі адзін раз прыязджалі.

— А раптам зноў прыедуць?

— Ну дык і што? Схаваешся.

— Дзе я схаваюся?

— На гарышчы. Ці ў сене, у хляве. Галоўнае, кеб не бачыў ніхто, што дома ты, у вёсцы. Хоць адаспіся, паправўся трохі.

Была свая, жаночая, логіка ў словах жонкі. І ён, Васіль, паддаваўся, паддаваўся гэтай логіцы. Тым больш што трэба было сустрэцца з патрэбнымі людзьмі, перагаварыць. І пажыць дома, у вёсцы, не шкодзіла б. Нават не тое што не шкодзіла б, а трэба было.

— Калі ты не баішся. За сябе, за дзяцей...

— Ой, што ты гаворыш? За ўсіх я баюся... І за цябе таксама. Ды не стой ты, вада ж астыне...

Ён хутка раздзеўся, палез у цэбар. Цеснавата ў ім было, каб сесці, і ён апусціўся на калені. І адчуў цеплыню вады, мляўкасць стомленага цела. Поля падала яму ў рукі кавалак мыла, памагла пацерці спіну, а потым і самога яго пачала мыць, шараваць вехцем усяго, усё адно што дзіця.

— Як я адвыкла ад етага! Ад цябе адвыкла,— гаварыла яна, абмацваючы мокрымі рукамі яго спіну, рукі, ногі...

Калі ён, памыўшыся, вылез з цэбра, выцерся шорсткім палатняным ручніком, пераапрануўся ва ўсё сухое і чыстае, сеў за стол, пачаў вячэраць. Еў бульбу, якая, мабыць, асталася ад вячэры, піў малако, жаваў хлеб. І ўсё яму здавалася такім мілым, добрым, смачным, без чаго і

жыць нельга было. «А я ж жыў. Колькі сутак жыў! — думаў ён.— Ну і дурань, што жыў. Мог і не жыць так, мог жыць, як і раней жыў».

— А ведаеш,— сказаў ён урэшце жонцы, Полі.— Я, відаць, астануся дома на сутак колькі. Начаваць буду ў хаце, а ледзь світаць пачне — у хлеў ці на гарышча ўцякаць буду.

— Лепш на гарышча,— падказала жонка.— Ніхто не ўбачыць цябе на двары. Ды і цяплей на гарышчы. Там, пад лежаком, пасцель я табе намашчу. І ляжаць будзеш...

— Толькі дзецям не кажы,— папрасіў ён.

— Чаму не казаць?

— Каб не расказалі каму-небудзь. Дзеці ж не разумеюць, не ведаюць усяго.

— А мы... Хіба разумеем, ведаем усё?

І Поля падсела да Васіля, палажыла сваю галаву яму на грудзі, усхліпнула.

Задумаўся, задумаўся над усім, што ведаў, разумеў і чаго не ведаў, не разумеў у жыцці, і ён, Васіль Кулага. Сядзеў за сталом і думаў, думаў.

— Можа, у пасцель, спаць пойдам? — падказала раптам жонка, Поля.

— Давай...

І ён, асцярожна адхіліўшы рукамі ад сябе жонку, падняўся і першы пайшоў да ложка.

Адчуў: ад цяпла, яды, чыстай адзежы, блізкасці жонкі і ўсяго, што яго акружала, звыклага і хатняга, ён ужо амаль спіць...

## XV

Усе, хто хоць калі-небудзь сустракаўся з Раманам Платонавічам Багавіком, ведалі яго як чалавека цвёрдай волі і глыбокіх перакананняў, да таго ж вельмі ўпэўненага ў сабе, у тым, што ён гаворыць і робіць. На самай жа справе ўсё было не так, далёка не так. І тая цвёрдасць, упэўненасць, з якімі ён выходзіў на людзі, даваліся яму, як,можа, рэдка якому кіраўніку, нялёгка. Бо і яго наведвалі хвіліны сумненняў і неспакойнага роздуму, іншы раз ночы не спаў, каб знайсці развязку той ці іншай задачы ці праблемы, якія ставіла жыццё. Ды інакш і быць не магло — галава ж на тое і даецца чалавеку, каб ён думаў, а не рабіў, што б там ні было, з налёту, з кандачка. Звычка не спяшацца, думаць над усім, што адбывалася і адбываецца навокал,

а потым ужо выходзіць на людзі, выносіць тое, што варта вынесці, дасталася Раману ад бацькі — патомнага рабочага, які ў пошуках хлеба абышоў амаль усю Расію, пакуль нарэшце не прыбіўся на Палессе, у Гудоў. Тут к таму часу сабралася даволі значная група рабочых, якія былі незадаволены парадкамі, што існавалі ў Расіі, дзе рабочаму чалавеку жылося невыносна цяжка, бо толькі мізэрная частачка заробленага трапляла яму, астатняе ж ішло ў кішэні тых, хто сам не працаваў, а навучыўся абіраць рабочых, прысвойваць сабе іх працу. Пажыўшы шмат у якіх гарадах, пабываўшы на самых розных заводах і прадпрыемствах, адведаўшы турмаў і высылак, людзі гэтыя ўжо нічога не баяліся, ніякія запалохванні і страхі на іх не дзейнічалі. Адчайнасць гэтых людзей не ведала межаў, яны гатовы былі пайсці на ўсё. І толькі некалькі чалавек, у тым ліку і бацька Рамана — Платон Багавік — уносілі ў барацьбу рабочых з адміністрацыяй арганізаванасць і парадак. І рабочыя перамаглі — скінулі ненавісных прыгнятальнікаў. Праўда, здарылася гэта не хутка і пачалося, вядома, не з Гудова, а з Пецярбурга, Масквы, іншых буйных прамысловых цэнтраў. Ды Раман ведаў — здарылася, бо ўсюды, па ўсёй Расіі, на кожным нават маленькім заводзіку былі такія рабочыя, як яго бацька,— члены вялікай рэвалюцыйнай партыі, на чале якой стаяў Л е н і н. Шкада, бацька не дачакаўся перамогі працы над капіталам — арыштаваны напярэдадні вайны чатырнаццатага года, ён загінуў недзе ў Сібіры. Памерла і Раманава маці, таксама не дачакаўшыся лепшых дзён. А ён, Раман, уліўшыся ў армію рабочых, стаў свядомым барацьбітом за шчасце працоўных. Хоць адукацыя ў яго была і невялікая, але ён шмат чытаў, сам ці з дапамогай добрых людзей даходзіў да тых ісцін, без якіх нельга жыць на свеце. І ўжо тады зразумеў — дамагаецца перамогі толькі той, у каго ёсць мэта, хто ведае, як яе дамагчыся, аддае таму ўсе свае сілы і веды. Сто разоў адмерай, а раз адрэж; навучыся спярша маўчаць, а потым ужо гаварыць. Слова ж не верабей: вылеціць — не зловіш. Закрануўшы сэрцы людзей, слова можа натхніць і расхалодзіць, павесці і спыніць масы працоўных. І ў гэтым неаднойчы пераконваўся Раман Багавік. І тады, калі трэба было адстойваць заваёвы Вялікага Кастрычніка і ён, сабраўшы самых лепшых і самых смелых рабочых, пайшоў у лес і ваяваў з белапалякамі і рознымі прыхільнікамі старога ладу, і тады, калі аднаўляў завод, а потым і ўзначальваў яго, і пасля, калі

выбралі яго сакратаром райкома, даверылі кіраваць усёй партыйнай арганізацыяй раёна. Таму да свайго, нават быццам выпадкова сказанага слова Багавік падыходзіў вельмі ўважліва, асабліва на пасадзе сакратара райкома, калі яго слова стала словам партыі, быццам законам для ўсіх тых, хто быў ніжэй па службе. Імкнуўся заўсёды менш дыктаваць, а больш разважаць, наводзіць на роздум, развагі і іншых. Бо адна галава добра, а дзве лепш. Шукаючы адказы на многія пытанні, якія ставіла жыццё, ён тым не менш час ад часу склікаў нарады, каб паслухаць іншых разумных кіраўнікоў, яшчэ раз узважыць, у чым ён не памыляецца, правільна робіць, а дзе і не зусім, хібіць. І ў першыя дні, калі пачалася вайна, надта ж перажываў, што няма часу параіцца з сім-тым, сабраць нараду, паслухаць думкі людзей. Ды і людзей тых, каго ён ведаў, ставала ўсё менш і менш — ішлі на фронт, хто па прызыву, а хто і добраахвотна. Праўда, у інструкцыях, што прысылаліся з абкома і ЦК, быццам прадумвалася ўсё, на розныя выпадкі даваліся пераканальныя адказы. І ўсё ж... Ніякія інструкцыі, ніякія ўказанні не маглі ахапіць усяго багацця жыцця, розных сітуацый, якія ўзнікалі і ўзнікаюць кожную хвіліну. Рашэнні даводзілася прымаць хутка і без усякага раяння, абмеркавання. І, як пераконваўся Раман, не заўсёды правільныя. Ужо апынуўшыся ў лесе — Ельнікі занялі немцы і жыць там стала небяспечна (не пра сябе думаў ён, Багавік, а пра тую справу, што даручана яму, а яна, гэтая справа, павінна была перамагчы, прывесці людзей зноў да святла і волі), — Раман імкнуўся як найчасцей сустракацца з рознымі людзьмі, чуць тое, што яны думаюць. Бо ведаў, добра ведаў, што ўсё, любую справу вырашаюць людзі. Але самі людзі толькі тады набываюць велізарнейшую сілу, калі ў іх ёсць кіраўнікі, якія ведаюць, куды весці людзей, і якім людзі вераць, як сабе, і ідуць за імі, часам нават не шкадуючы свайго жыцця. Таму кадрам аддаваў Багавік вялікую ўвагу заўсёды. І, адчуваючы, што барацьба з гітлераўцамі будзе жорсткай і зацяжной, яшчэ да прыходу іх у раён прадумаў добра, каго і дзе са сваіх людзей пакінуць. Цяпер, будучы ў лесе, ён злучаў у адно ўсю сваю сетку, шукаў новых людзей, у прынцыповасць і сумленнасць якіх верыў, пасылаў сяго-таго ў розныя акупацыйныя ўстановы, каб там прыжываліся і дапамагалі, чым толькі можна, падполлю. Супраціўленне акупантам узнікала месцамі стыхійна, людзі, прывыклыя жыць пры Савецкай уладзе, не маглі цярпець

прыгнёту і ўціску і паўставалі, стваралі самі розныя падпольныя арганізацыі. Раман Платонавіч далучаў і іх да свядомай барацьбы, прывучаў да арганізаванасці і дысцыпліны, каб эфект быў большы, а ахвяр было менш. Ён верыў, нават ведаў, што перамога будзе за Савецкай уладай, вось толькі сказаць не мог, калі яна будзе. І чакаў, чакаў моманту, калі можна будзе паставіць пад ружжо ўсіх, хто толькі можа страляць і вызваліць родную зямлю ад непажаданых прышэльцаў. І Івана Дарошку ў Маскву паслаў, каб той пазнаёміў, каго трэба, з планам барацьбы з ворагам, каб наладзіць, мець сталую сувязь. Важнасць такой сувязі сам ён добра ўяўляў, пераканаў у гэтым і абласное кіраўніцтва, з якім сустракаўся даволі часта, бо і знаходзілася яно таксама непадалёку ў лесе. Але чакаць указанняў з Масквы і нічога не рабіць таксама не мог, не мог Раман Багавік. І як толькі паведамілі яму пра нараду, што адбылася ў Ельніках і на якой былі прадстаўнікі амаль з усіх населеных пунктаў, ён пачаў падумваць, ці не склікаць нараду і яму ў лесе, каб даць указанні, як сябе весці і як змагацца з навалаччу. Але, параіўшыся з членамі райкома, усё ж вырашыў нарады не склікаць. Па-першае, на нараду маглі трапіць і не зусім надзейныя людзі, якія пры пэўных акалічнасцях маглі выдаць сяготаго з падпольшчыкаў. Па-другое, і без нарады можна было пазнаёміць з неабходнымі ўказаннямі і інструкцыямі — асабіста, праз сувязных. Тым больш што інструкцыі і ўказанні немнагаслоўныя — не даць ворагу правесці ў жыццё новы парадак, зрываць усё, што б ён ні задумаў ці пачаў рабіць. Не акупанты, а мы, савецкія людзі, былі і астаёмся гаспадарамі на сваёй зямлі. І вораг гэта павінен адчуваць. Адчуваць удзень і ўночы, заўсёды і ўсюды, дзе б ён ні быў, куды б ні памкнуўся.

«А далей жыццё падкажа, што нам рабіць,— думаў Багавік.— Не можа быць, каб забылі на нас, сувязі з намі не наладзілі, не дапамаглі зброяй, іншай вайсковай амуніцыяй. Мы ж таксама армія, хоць і не такая, як тая, рэгулярная. Але тое, што не можа зрабіць армія рэгулярная, можам зрабіць мы. Пакуль сілы збіраем, расстаўляем сваіх людзей, выяўляем, хто куды хінецца. Але гэта пачатак. Неўзабаве мы заявім пра сябе, заявім так, што вораг не рады будзе, што напаў на нас, прыйшоў сюды. Галоўнае — не гарачыцца, не спяшацца, цвяроза глядзець на тое, што спрабуе рабіць на нашай зямлі вораг. І мець усюды вочы і вушы, мець поўную інфармацыю пра ўсё, што адбываецца

навокал. Сачыць, пільна сачыць за ворагам, ведаць яго кожны крок. І біць па руках, спыняць, калі вораг надумаецца нанесці нам дзе-небудзь шкоду, удар. Дзеля гэтага трэба мець сілы, трэба як найхутчэй стварыць партызанскія атрады. У кожным сельсавеце, кожнай нават вёсцы. І біць, біць ворага. Вайна ёсць вайна...»

І Раман Платонавіч, з кім ні сустракаўся, даваў указанні — збіраць сілы, гуртаваць партызанскія атрады і баявыя групы. Праўда, папярэджваў — у лес ісці пакуль што не ўсім, хто ненавідзіць фашыстаў і хоча дапамагаць Савецкай уладзе, а толькі тым, каму нешта пагражае, хто не можа жыць у вёсцы, як жыў раней.

— Чаму так? — пыталі некаторыя.

— Таму, што зіма наперадзе,— адказваў, тлумачыў Багавік.— І пракарміцца, ды і сляды ўсюды, куды ні пайдзі... Берагчы людзей трэба. Вось вясна прыйдзе, тады мы ў адзін моцны кулак збяром сілу нашу. І ўдарым. Пабачыце, як ударым!..

...Багавік, увесь падпольны райком збіраў, гуртаваў і расстаўляў сілы дзеля змагання, барацьбы з ворагам...

## XVI

Рыхтуючыся ў паход на Усход, Гітлер меркаваў да пачатку зімы ўзяць Маскву і закончыць вайну. І дзеля таго, каб гэта збылося, усё, як яму здавалася, улічыў і прадугледзеў. Не падумаў хіба толькі пра адно — савецкіх людзей, якія не хацелі фашысцкага рабства і не шкадавалі нічога, нават свайго жыцця, змагаліся з ворагам усюды, за кожны горад, кожную вёску, кожны дом, кожны лапік поля, лесу, лугу. І сарвалі планы Гітлера, ім так і не суджана было збыцца. Лютую зіму сорак першага года гітлераўскім ваякам давялося спаткаць не ў цёплых маскоўскіх кватэрах, а на палях бітваў. А апрануты ж яны былі лёгка, амаль па-летняму. Каб неяк ратаваць сваё войска, Гітлер аддаў загад — тэрмінова паслаць на фронт цёплае адзенне. А ўзяць, дзе было ўзяць яго, тое адзенне?

І тады некаму прыйшла ў галаву шчаслівая думка: сабраць цёплае адзенне для нямецкіх салдат у тых самых рускіх, каго «вызвалілі», каму прынеслі «свабоду». Паляцелі адзін за адным загады — колькі і чаго павінен сабраць кожны «вызвалены» раён, кожная «вызваленая» вёска. Вялікі Лес, вядома, таксама не быў выключэннем. Недзе на пачатку снежня стараста Вялікага Лесу Апанас

Харчэня атрымаў загад сабраць і ў бліжэйшыя дні дастаВіць у Ельнікі 73 кажухі, 50 пар валёнак, 120 пар рукавіц, а таксама больш за сотню пар ваўняных шкарпэтак і шалікаў.

Думаць асабліва не было калі, трэба было дзейнічаць. І Апанас, напалохаўшыся, што ён не выканае загаду і немцы яго выкрыюць і расстраляюць, пабег да начальніка паліцыі Змітра Шламака.

— Што рабіць будзем? — спытаў, задыхаўшыся, ледзь пераступіў парог хаты,са страхам у вачах і паказаў Шламаку паперку, што прыйшла з Ельнікаў.

— Як што? — здзівіўся Шламак — ён якраз за сталом сядзеў, абедаў.— Збіраць будзем, выконваць загад.

— Калі?

— Ды сёння ж і пачнём!

— Можа, сход склічам?

— Што-о? — і Шламак адклаў убок лыжку.

— Можа, сход, кажу, склічам?

— Навошта табе той сход?

— Размяркуем, каму што здаць, прынесці...

— Кінь, ета не Савецкая ўлада, каб гаварыльню разводзіць. Ды ніхто нічога і не панясе. Наадварот, пахаваюць. Толькі аб'яві. Тут так — знянацку трэба быка за рогі браць, каб ніхто і не апомніўся...

Шламак устаў з-за стала, накінуў на плечы кажух, вінтоўку. Сказаў:

— Пайшлі.

Апанас памяўся.

— Можа б, падумалі, не так адразу,— сказаў яшчэ з большым страхам, нерашуча.

— Ды калі пра ўсё думаць, мазгі згараць.

Клаўдзя, якая таксама сядзела за сталом і абедала, ела падсмажаныя на сале дранікі, падказала:

— Са свёкра майго, Мікалая Дарошкі, і пачынайце...

— А яна праўду кажа,— паказаў вачыма на Клаўдзю Шламак.

— Дык жа Дарошка нічога нікому не дасць,— засумняваўся Апанас.

— А вінтоўка навошта? — кіўнуў галавою на вінтоўку Шламак.— Загадаем. А не выканае... Мы ж улада.

— Ды аддасць, аддасць,— засмяялася Клаўдзя.— Вы сына, Івана, успомніце...

— Што старшынёй сельсавета быў? — зарагатаў Шламак.

— Аге. Нагадайце, як людзей раскулачваў, як падаткі збіраў...

— А табе б самой старастам быць. Ці начальнікам паліцыі,— смяяўся, гыгыкаў Шламак — давольны быў, што Клаўдзя такая панятлівая, разумее ўсё.

Пераканалі ўдваіх з Клаўдзяю Апанаса ці не пераканалі, аднак загад выконваць трэба было. Апанас Харчэня больш не супраціўляўся, пайшоў за Шламаком. А той, грукаючы ботамі, і сапраўды пакіраваўся праз сенцы да Мікалая Дарошкі. Ірвануў на сябе дзверы, у хату зайшоў. І яшчэ з парога, не вітаючыся, пракрычаў:

— З вас кажух, пара рукавіц, пара валёнак і шалік!

І Мікалай, і Хора, і Косцік — яны таксама якраз сядзелі за сталом, абедалі — быццам анямелі.

Мікалай першы апамятаўся, павярнуў валасаты твар да Шламака і Апанаса Харчэні, які стаяў ззаду, амаль за спіною, ля самых дзвярэй, вымавіў:

— Толкам скажы, што ты хочаш?

— Я толкам сказаў — загадана, каб немцам ваша хата здала кажух, пару валёнак, пару рукавіц і шалік,— паўтарыў Шламак.

— А дзе я іх вазьму? — бліснуў вачыма Мікалай.

— Свае аддай.

— А сам што — голы буду хадзіць?

— У хаце і голаму пасядзець можна,— і, ужо не гледзячы на гаспадароў, Шламак павярнуўся да вешала, дзе вісела адзенне, загадаў Апанасу Харчэню: — Часу няма, бяры, што бачыш!

Мікалай падхапіўся з-за стала, кулакі сашчапіў:

— Я табе вазьму!

— Ах, ты так? — зароў Шламак.— Уладзе пагражаеш? — і сарваў з пляча вінтоўку.— Ды калі я немцам скажу, што сын у цябе — старшыня сельсавета... Ты знаеш, што з табою будзе!

Абвяў, абвяў Мікалай. Толькі закалаціўся ўвесь, сеў.

А Шламак ужо не стаяў у парозе, быў ля вешала, гаспадарыў, кідаў на рукі, на плечы Апанасу Харчэню кажухі.

— Во, тры кажухі тут вісяць, усе і забяром.

Косцік, бачачы такое нахабства, падхапіўся з-за стала, як бач апынуўся між Харчэнем і Шламаком. Сказаў са злосцю:

— Ану павесьце на месца!

— Што-о?

І перш чым апомніўся, паляцеў, пасунуўся па падлозе

пад ложак — Шламак піхнуў Косціка ад сябе з усяе, што толькі было ў яго, сілы.

— Ой, забіваюць! — залямантавала Хора і кінулася да Косціка.

А Шламак ужо ні на кога не глядзеў, нікога не слухаў. Узяўшы ў ахапку кажухі, панёс на падворак. Там, на свежым паветры, на белым снезе спыніўся.

— Ух,— уздыхнуў.— Думаў, не вытрымаю, пастраляю...

І, кінуўшы кажухі на рукі Апанасу, сказаў:

— Патрымай. А я коней запрагу. Бо не на сабе ж насіць кажухі етыя будзем. І не міндальнічай, барышняй не будзь. Інакш загад не выканаем... А то... Сход... Бачыш, як аддаюць? Вырываць з зубоў усё трэба!

І пайшоў паволі ў хлеў па коней.

Мінула вельмі мала часу, і сані, запрэжаныя ў парку коней, выехалі з Дарошкавага двара, пакіравалі ў канец вёскі, спыняючыся то ля адной, то ля другой хаты. І як толькі ў хату заходзілі Апанас Харчэня і Змітро Шламак, адтуль чуліся крыкі, галашэнне. Людзі, не звыклыя да рабунку, лямантавалі, нават кідаліся з кулакамі бараніць сваё, нажытае крывавым мазалём. Але Змітро Шламак нікога не слухаў, ні на што не зважаў — трэба было выканаць нямецкі загад, і яго выконвалі: бралі проста з вешала ўсё, што там вісела — кажухі, цёплыя хусткі, шапкі...

...Калі ўвечары вярнуліся, уехалі ў Дарошкаў двор і палічылі, колькі чаго сабралі, выявілася: кажухоў нават больш, чым патрабавалася ў паперцы.

— Нічога, яшчэ ніколі ніхто не адказваў за тое, што план перавыконваў,— радаваўся Шламак. І трос галавою, смяяўся, рагатаў: — Ну і сяло, ну і людзі!

Апанас жа Харчэня маўчаў, не выказваў ні радасці, ні захаплення.

## XVII

Яшчэ не жылося і не пісалася Сцяпану Радзівонавічу Кухту так добра, як у тую восень. Нарэшце, пасля доўгага тулянна па чужых кутках у якасці кватаранта, ён стаў паўнапраўным гаспадаром усёй вялікай хаты — што хо-

чаш, тое і рабі ўдзень і ўночы. Хапала і яды, прычым самай рознай — гаспадары хаты ў бежанцы выбіраліся спешна і нікому нічога не прадавалі — ні каровы, ні свіней, ні таго, што расло на сотках, у гародзе. І Сцяпан Радзівонавіч, пакапаўшы бульбу, прыбраўшы ўсю гародніну, цяпер даглядаў карову, свіней,варыў сабе есці, а ўвесь астатні час сядзеў за сталом і пісаў. Ніхто ж нічога больш ад яго не патрабаваў, нават дзяцей вучыць у школе і то не прасілі, не прымушалі. І ён, перагледзеўшы свае папкі і чамаданы з рукапісамі, выбраў тое, што адпавядала часу. Усё ж астатняе давялося ці перапісваць, ці наогул знішчаць. Затое на паперу паліліся чарнільныя радкі, у якіх асуджалася Савецкая ўлада, паказваўся той прымус, які быў і ў калектывізацыю, ды і пасля, калі без суда і следства бралі, высылалі людзей, высмейваліся парадкі, што былі дагэтуль у гарадах і вёсках, паказвалася невыноснасць таго, што было, і тая радасць, якая нібыта панавала цяпер усюды пасля прыходу немцаў. Сцяпан Радзівонавіч аж калаціўся ўвесь ад нейкага ўнутранага ўтрапення, калі тое пісаў. Іншы раз нават падскокваў, калі знаходзіў удалае слова ці параўнанне, калі мёртвыя словы быццам ажывалі.

Разоў колькі Сцяпан Радзівонавіч, перабраўшыся праз раку, хадзіў, ездзіў на веласіпедзе ў Ельнікі. Пабываў у местачковай управе, сустрэўся з начальнікам паліцыі, іншымі кіраўнікамі. І кожнаму з іх гаварыў:

— Я — пісьменнік, мне трэба шмат ведаць. Зараз, напрыклад, я хачу паказаць, што адбываецца на беларускай зямлі ў сувязі з прыходам сюды новай улады...

Яму расказвалі, а то і вадзілі, паказвалі, што можна было паказаць. Ва ўсякім выпадку, выконвалі той загад, які аддаў камендант гер Апфель, з якім Сцяпан Радзівонавіч быў амаль «вась-вась» і сустракаўся заўсёды, калі б ні пабываў у Ельніках, і якому ўбіў у галаву, як гэта важна, калі ён напіша мастацкія творы, у якіх будзе ўслаўлены подзвіг нямецкіх салдат і тыя парадкі, што яны прынеслі ў вызваленыя ад Савецкай улады вёскі і гарады.

— Разумееце, мастацкія творы выдаюцца ў тысячах экземпляраў, іх чытаюць мільёны людзей. І большасць верыць у тое, што напісана ў кнігах. І пачынае наследаваць таму, заводзіць тыя самыя парадкі, што апісаны ў кнігах. Адна мастацкая кніга бывае важней за ўсе загады, што развешаны на слупах.

— Я, я,— згаджаўся, ківаў галавою камендант.

— Акажыце мне садзеянне, каб я бліжэй пазнаёміўся

з усімі тымі крокамі, што робіць новая ўлада. Не сакрэт, не ўсе яе прынялі, не ўсе і прымуць. Ёсць тыя, хто не разумее важнасці гістарычнага моманту, у які ён жыве. Ды і былыя савецкія служачыя, бальшавікі асталіся дзе-нідзе, яны бунтуюць народ, паляць масты і збожжа...

— Я, я,— падтакваў камендант.

— І калі ўсё гэта паказаць у творы, ён набудзе вялікае сацыяльнае гучанне. І будзе чытацца лёгка, бо падзеі надта ж драматычныя. Тут будуць і забойствы, і пажары, і кроў... словам, будзе сапраўднае жыццё. І першую кнігу, што напішу і выдам, я прысвячу таму, хто і памог мне яе напісаць. Вам, гер камендант...

— Гут. Хорошо. Отчэнь хорошо,— аж весялеў камендант.

І выклікаў да сябе сваіх падначаленых, прасіў, загадваў памагаць «пісьменніку»...

Вяртаўся Сцяпан Радзівонавіч з Ельнікаў натхнёны, упэўнены ў сваіх здольнасці і таленце, зноў садзіўся за працу. Працаваў ён, трэба сказаць, як вол, па дзесяць — пятнаццаць гадзін у суткі. На адпачынак пакідаў хіба толькі ноч ды тыя гадзіны, што заняты быў, даглядаючы карову, свіней ды варачы есці...

Калі ў сярэдзіне снежня немцы аднавілі чыгунку і ў Ельнікі пачаў раз на суткі прыходзіць цягнік, Сцяпан Радзівонавіч наладаваў два чамаданы — адзін харчамі, другі рукапісамі — і вырашыў падацца ў Мінск.

— Ведаеце, я і так пражыў дастаткова на перыферыі,— казаў ён каменданту, просячы ў таго даць яму нейкую паперку, каб да яго ніхто не прыдзіраўся ў дарозе, дазваляў ехаць не ў таварным вагоне.— Ды і напісана шмат, пара друкаваць, кнігі выдаваць. А ў Мінску ж — не тут, там асяроддзе... І газеты выходзяць, і часопісы, аднаўляецца работа выдавецтва і тэатраў. Я там ажыву, куды большую карысць буду прыносіць, як прыношу тут...

— Я, хорошо,— згаджаўся камендант і, адчувалася, зайздросціў: ён не мог пакінуць сваю службу, паехаць туды, дзе ёсць тэатры, іншае жыццё, чым тут.

Але не супраціўляўся, выпісаў Сцяпану Радзівонавічу Кухту нейкі дакумент — просьбу да ўсіх нямецкіх улад не чыніць перашкод, садзейнічаць «пісьменніку», які шчыра прыняў новы нямецкі парадак і хоча прыносіць карысць сваімі творамі, служыць Гітлеру і Вялікай Германіі.

У той жа дзень, папрасіўшы суседзяў даглядаць карову, свіней, назіраць за хатай, Сцяпан Радзівонавіч з двума цяжкімі чамаданамі ад'ехаў з Ельнікаў на Гомель, а ўжо адтуль, перасеўшы на іншы цягнік,— і ў Мінск.

## XVIII

Пасля неспадзяванага рабунку некалькі дзён у хаце Мікалая Дарошкі панавала маўчанне, ніхто ні пра што не гаварыў. Моўчкі падымаліся ўранні з пасцеляў, моўчкі снедалі, моўчкі хадзілі сюд-туд па хаце ці сядзелі, кожны аддаючыся сваім думкам. На душы ў кожнага было пагана, кожны разумеў, што нешта трэба рабіць, не паддавацца Рыжаму, а што — ніхто не ведаў.

Прыйшла неяк, наведала бацькоўскую хату Параска.

— Што ета ў вас, як усё адно пасля хаўтур,— сказала, пасядзеўшы нейкую хвіліну на лаве.

— Не да весялосці,— мрукнуў сумна бацька, Мікалай.— Ты ж, мабуць, чула, як еты Рыжы абрабаваў нас. Усе кажухі забраў.

— Дык жа не ў адных вас,— адказала Параска і, каб хоць трохі суцешыць, супакоіць родных, дадала: — Не варта з-за кажухоў так расстрайвацца. Я вунь ля лагера ваеннапалонных была. Кеб вы бачылі, што там робіцца. Як мухі, гінуць людзі. А вы... З-за кажухоў...

— Кеб жа толькі з-за кажухоў,— умяшалася ў размову Хора.— А то ж і Косціка пад ложак шпурнуў, я думала, заб'е... А яшчэ ж раней яго, Мікалая,— паказала Хора на брата, які ляжаў на пасцелі, і заплакала, зарумзала.

— Прывяла на селішча, чуж-чужаніца, згубу на ўсіх нас прывяла,— працадзіў скрозь зубы Мікалай.— І не супакоіцца, не, не супакоіцца, пакуль нас усіх на той свет не загоніць... І паратунку дзе шукаць?..

— Нідзе не трэба ніякага паратунку шукаць, бо яго і няма нідзе,— спакойна адказала Параска як даўно вядомае, вынашанае, зведанае.

— А жыць як? — ледзь не закрычаў на ўсю хату Мікалай.

— Жыць? — быццам перапытала Параска.— А каму трэба, кеб мы жылі? Калі б трэба было, хіба б так да нас адносіліся?

— Не, дочка, нешта ты не тое, не тое,— пажурыў дачку бацька.— Ета хлюндра вінавата, Рыжы... Калі немцам сказаць, яны... Заступяцца, не даруюць...

— Кінь, тата. Бачыла я немцаў... Яны такія самыя... А можа, яшчэ і горшыя.

— Горшыя за етага? — аж ускочыў з пасцелі бацька.— Такога быць не можа! Горшага за етага няма і не можа быць!

— Тата, ты б пастаяў ля таго лагера, паглядзеў, што немцы робяць. Самі такія, такіх і памочнікаў сабе выбіраюць...

— А еты, сухарукі... Апанас...

— Што Апанас? Загадана — рабі. Бо калі не зробіш... Не паглядзяць, хто ты. Казалі некалі, што ета карычневая чума. Чума і ёсцека, як я паглядзела. І ніхто нікога не шкадуе. Ім абы нас менш было.

— Чаго ета — кеб менш? — зацікавіўся бацька.

— Тады ўпраўляць намі лягчэй будзе.

— Дык такія,— паказаў галавою на сенцы, на Піліпаву хату, Мікалай,— хутка ўходаюць... Дай толькі права — перастраляюць усіх.

— І перастраляюць, нічога не зробіш. Вунь ля лагера таго, пакуль я там была, чалавек, мусіць, з пяць застрэлілі.

— За што?

— Ні за што. Хто хлеб палонным даваў — тых... Палонныя хлеб хапалі, бо галодныя,— і іх...

— Не, дочка,— не згадзіўся з Параскаю бацька.— Нешта ты не тое гаворыш... Быць не можа, кеб управы на галаварэзаў не было. На зямлі няма, дык неба, неба е! А на небе — бог!

— Забыў, мабуць, бог, што на зямлі людзі жывуць,— уставіла зноў некалькі сваіх слоў Хора.

— Не, не забыў,— забегаў па хаце Мікалай.— І не забудзе ніколі! Награшылі людзі, а цяпер... Расплачвацца трэба...

— Дык няхай бы той, хто награшыў, і расплачваўся,— не згадзілася з бацькам Параска.— А то ж... Усім гора. І не ведаеш, дзе каму лепей — тым, хто на хронце, ці тым, хто тут, пад немцамі, астаўся...

Косцік, які ўвесь час маўчаў, толькі слухаў, што гаварылі, седзячы на прыпечку, раптам саскочыў на падлогу, сказаў:

— Ета не гора яшчэ. Гора наперадзе... І кеб не цярпець здзеку... Абараняцца трэба.

— Як, як ты абаронішся? — бліснуў на Косціка вачыма бацька.— Я слова проці сказаў, дык ён мяне. Ты — ён цябе...

— Нічога, бацька, абаронімся...

Пайшоў да вешала, світку на плечы накінуў, шапку на галаву ўздзеў. Сказаў:

— Я ў Гудоў.

— Чаго ета ты ў Гудоў? — пацікавіўся бацька.

— Трэба!

І пайшоў, толькі дзвярыма грукнуў...

Вярнуўся з Гудова Косцік пад вечар. І калі ў хату зайшоў, ні бацька, Мікалай, ні Хора не паверылі таму, што бачылі. А бачылі яны за плячыма ў Косціка вінтоўку, а на рукаве такую самую белую павязку, як і ў Рыжага.

— Ты ета што? — аж спалохаўся бацька.

— Хай цяпер паспрабуе Рыжы чапіцца да нас. Прыстрэлю.

— А-а?!

І бацька, сціснуўшы кулакі, пайшоў, пайшоў на Косціка.

— Кеб мой сын ды ў паліцыі! Вон, з хаты вон!

Косцік не чакаў такога — разгубіўся, хвілін колькі стаяў у парозе, не ведаў, што яму рабіць. Потым, відаць, успомніўшы, які бывае ў гневе бацька, можа што заўгодна зрабіць, адчыніў дзверы і задам, задам падаўся ў сенцы. А бацька ішоў і ішоў, наступаў і наступаў, і не гарлапаніў, не крычаў, а сіпеў:

— Вон! І кеб нагі тваёй на маім селішчы не было! Заб'ю! Як сукіна сына заб'ю!

Хора не ўмешвалася ў сварку бацькі з сынам, толькі палахліва зіркала то на аднаго, то на другога і плакала, усхліпвала наўзрыд.

## XIX

Марозным, ветраным ранкам халоднага снежня па шырокіх, выстуджаных вуліцах прыфрантавой Масквы ішоў невысокі, па-вясковаму апрануты чалавек. Сустракаючы рэдкіх людзей, што кудысьці спяшаліся, як не беглі, чалавек час ад часу спыняўся і пытаў:

— Калі ласка, як прайсці да гасцініцы «Масква»?

Людзі, хто хутка, на хаду, махалі, паказвалі рукою некуды ўбок, хто, сцішыўшы бег, доўга і ветліва тлумачыў, як лепш і карацей дабрацца туды, куды чалавеку рупіла. Чалавек дзякаваў, кіраваўся далей. Але, прайшоўшы трохі,

асабліва калі на дарозе трапляла скрыжаванне, перагароджанае супрацьтанкавымі надаўбнямі і кучамі мяшкоў з пяском, зноў спыняўся, зноў шукаў вачыма таго, каго можна было б запыніць, каб задаць сваё пытанне: «Калі ласка, як прайсці да гасцініцы «Масква»?» Вось ён быццам выбраў таго, каго можна запыніць,— немаладога ўжо веку чалавека, апранутага ў вайсковую форму, што павольна ішоў з партфелем у руках. Калі той, вайсковец, наблізіўся, падышоў крокаў на пяць, чалавек раптам разгубіўся і хвілін колькі не мог слова сказаць, бо пазнаў, пазнаў вайскоўца.

— Лапіцкі... Таварыш Лапіцкі,— вымавіў нарэшце чалавек.

Вайсковец спыніўся, уважліва паглядзеў праз акуляры на чалавека, які, адчувалася, яго ведаў. І, па ўсім відаць было, не пазнаў таго, хто назваў яго прозвішча.

— Адкуль вы мяне ведаеце? — спытаў з насцярогаю.

— Мы сустракаліся з вамі. Вы лекцыю прыязджалі чытаць. На Палессе... Вёска Вялікі Лес... Помніце?

— О! — і Лапіцкі кінуўся да чалавека, абняў яго.— Старшыня сельсавета Дарошка... Як вы сюды трапілі?

— Тое самае я і ў вас мог бы спытаць, Пятро Пятровіч.

— Я з арміяй нашай... Як-небудзь раскажу... З-пад самага Брэста...

— Чаму з-пад Брэста?

— Лекцыі там чытаў, вайна і нахапіла. А вы?

— Я да апошніх дзён у вёсцы сваёй аставаўся. Цяпер вось у Маскву прыйшоў. Кажуць, тыя, да каго мне трэба, цяпер у гасцініцы «Масква».

— Дык нам па дарозе, хадземце...

Гасцініца «Масква», выявілася, была зусім недалёка. Не мінула і дзесяці хвілін, як Лапіцкі спыніўся ля цяжкіх дубовых дзвярэй, пацягнуў іх на сябе, прапускаючы наперад Івана Дарошку.

— Праходзьце, я, можна сказаць, тут старажыл... А вам да каго?

— Ды мне... У мяне заданне... Падпольны райком партыі ў Маскву паслаў.

— Калі так, дык, лічыце, вы трапілі па адрасу...

Падняліся на чацвёрты паверх, прайшліся па калідоры, спыніліся ля адных з дзвярэй.

— Зайдзеце сюды. А потым я правяду вас, куды трэба. Што там цяпер, у Беларусі?

— Немцы там, акупацыя,— працадзіў скрозь зубы Іван

Дарошка.— І людзі нашы там. Ім бы памагчы хоць чым-небудзь.

— Ведаю. У самога жонка з дачкою ў Мінску асталіся. Але памагаць... Немцы ж пад Масквою.

— Я лінію фронту пераходзіў, сам бачыў. Але нам, тым, што асталіся ў Беларусі, зброі б трохі. Мы б шмат шкоды ворагу маглі б зрабіць. І пад Масквою, на ўсіх франтах лягчэй бы нашым было.

— Дзеля гэтага і мы тут. Зараз сазвонімся з кім трэба...

Але Пятру Пятровічу сазваньвацца ні з кім не давялося. Як толькі яны зайшлі ў пакой, на адным са сталоў зазваніў тэлефон. Пятро Пятровіч, нават не распрануўшыся, кінуўся да тэлефона, паднёс да вуха трубку.

— Алё! — крыкнуў.

І застыў раптам, слухаючы нейкае, відаць вельмі важнае, паведамленне. І твар яго святлеў, расплываўся ва ўсмешцы. Урэшце Пятро Пятровіч не вытрымаў, закрычаў:

— Ура-а! Віншую, Панцеляймон Кандратавіч! З перамогай! Добра, я зайду да вас.

І, паклаўшы трубку, Пятро Пятровіч павярнуўся да Івана Дарошкі, прамовіў урачыста:

— Ведалі ж вы, Іван Мікалаевіч, калі да нас прыйсці.

— А што, Пятро Пятровіч? — насцярожыўся Іван Дарошка.

— Навіна, якой мы даўно чакалі. Немцы разбіты пад Масквою і адступаюць. Вызвалены дзесяткі кіламетраў нашай тэрыторыі...

— Ура-а! — закрычаў гэты раз ужо Іван Дарошка.— Я верыў, ведаў нават, што гэта будзе!

— Гэта добра, што збываецца тое, у што мы верылі, чаго чакалі,— сказаў нібыта сам сабе задуменна Пятро Пятровіч Лапіцкі.— Але да поўнай перамогі над фашызмам яшчэ вельмі далёка.

— Але яна прыйдзе, будзе! — упэўнена прамовіў Іван Дарошка.

— Вядома, прыйдзе, вядома, будзе! — усміхнуўся Пятро Пятровіч.— Важна прывучыць сябе, што мы можам перамагаць. Ды і немцаў — што яны ніякія не непераможныя, што мы білі іх на працягу многіх вякоў і ў гэтай новай вайне паб'ём!

Пятро Пятровіч абцягнуў шынель, паправіў рэмень.

— Аднак жа мне да Панцеляймона Кандратавіча Панамарэнкі трэба. Вы пабудзьце тут, пачакайце... Хоць,—

задумаўся на хвіліну і дадаў раптам: — Хадземце са мной і вы. Панцеляймон Кандратавіч будзе рады ўбачыць вас.

Іван Дарошка разгубіўся.

— Ці ёмка будзе, Пятро Пятровіч? — спытаў.

— Ёмка, ёмка, хадземце.

І Пятро Пятровіч ледзь не пад ручку ўзяў Івана Дарошку, павёў паперадзе сябе некуды па калідоры.

# Змест

*Серафім Андраюк.* І лёс пакалення — — — — 5

**ВЯЛІКІ ЛЕС**
Раман

***КНІГА ПЕРШАЯ***

Частка першая — — — — — — — — — — 23
Частка другая — — — — — — — — — — 112
Частка трэцяя — — — — — — — — — — 206

***КНІГА ДРУГАЯ***

Частка першая — — — — — — — — — — 303
Частка другая — — — — — — — — — — 394
Частка трэцяя — — — — — — — — — — 491

**Сачанка Б.**

С22 Выбраныя творы. У 3 т. Т. 1. Вялікі Лес: Раман у 3 кн. Кн. 1 і 2/Прадм: С. Андраюка.— Мн.: Маст. літ., 1993.— 590 с., 1 парт.

ISBN 5-340-01225-5 (Т. 1).

У першы том выбраных твораў вядомага беларускага пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа і Літаратурнай прэміі СП Беларусі імя І. П. Мележа Барыса Сачанкі ўвайшлі І і ІІ кнігі рамана «Вялікі Лес».

**С** $\frac{4702120201-100}{М\ 302(03)-93}$ **100—93** **ББК 84Бел7**

Літаратурна-мастацкае выданне

**САЧАНКА**
**Барыс Іванавіч**

***Выбраныя творы ў трох тамах***

**ТОМ 1**

ВЯЛІКІ ЛЕС

Раман у трох кнігах

Кніга першая і другая

Рэдактар С. Р. Прыгодзіч. Мастак М. А. Апіёк. Мастацкі рэдактар В. А. Ґубараў. Тэхнічны рэдактар М. Ц. Папкова. Карэктары Л. М. Маслоўская, Я. А. Бебель.

ІБ № 3990

Здадзена ў набор 02.10.92. Падп. да друку 23.06.93. Фармат $84 \times 108^1/_{32}$. Папера афс. № 1. Гарнітура звычайная новая. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 31,08 + 0,11 укл. Ум. фарб.-адб. 31,19. Ул.-выд. арк. 34,47. Тыраж 7100 экз. Зак. 2310. Цана 300 р.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 3. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

**Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.**

Барыс
САЧАНКА

1

Выбранае